Алесь Рыбак

# АБПАЛЕНЫЯ КРЫЛЫ

Алесь Рыбак



Алесь Рыбак

# АБПАЛЕНЫЯ КРЫЛЫ

РАМАН
АПОВЕСЦЬ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1994

ББК 84(4Беи)6
Р93
УДК 832.6-31

Р $\frac{8820600000-067}{М\ 302(03)-94}$ 114—94

ISBN 5-340-01262-X

© А. П. Рыбак, 1994

# ТРЭБА БЫЛО ЖЫЦЬ

*Раман*

# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## 1

— Як жа ты так, сынок? Божа ж мой... Трэба ж асцярожненька.

Маці нахінаецца ля Вадзіма, падымае яго босую нагу, падолам доўгай даматканай спадніцы выцірае змешаную з пылам кроў, разглядае ранку на большым пальцы. Ранка, ачышчаная ад гразі, крывавіць яшчэ болей, і Вадзім не ведае, плакаць ці не. Хочацца заплакаць, хочацца, каб яго пашкадавалі. Але, бачачы зблізку стомлены, як не ўчарнелы матчын твар, ён толькі моршчыцца і ўжо сам суцяшае маці:

— Чортавы гэны камень... Зараз ужо меней баліць.

Ён, седзячы на пыльнай траве ўзбоч дарогі, дацягваецца да каменя, аб які параніўся, бярэ ў правую руку і з усяе сілы шпурляе яго далей ад сябе, у канаву, спрэс зарослую лопухамі, быльнягом.

Маці знаходзіць лісцік трыпутніку, у шурпатых далонях расцірае яго, пасля прыкладвае да Вадзімавай ранкі, аднекуль з рукава сваёй яшчэ даваеннай, у гарошынку, блузкі з бліскучымі кругленькімі гузічкамі вымае хусцінку, туга абвязвае палец.

— Пойдзем, сыночак, пойдзем. Трэба ж нам скоранька,— кажа, як не просіць, яна.— А то спознімся. А ты ўжо глядзі пад ногі.

Вадзім спачатку пакульгвае, пасля абвыкаецца і зноў бяжыць, не адстае ад маці. Больш чым палавіна дарогі ўжо ззаду. Хутка і мястэчка пачнецца. Там яшчэ трошкі па брукаванай вуліцы — і будзе сквер, а ля тога сквера, на горцы, царква.

Сонца, хоць яшчэ і не вельмі высока на небе, добра ўжо прыгравае, і думаецца Вадзіму, што, можа, дарэмна ён напрасіўся ў тое мястэчка, во і палец нават пабіў, лепей бы ўжо гнаў на лог свайго парсючка. Там сёння кончаць гаціць, і можна будзе пакупацца, пасля пагуляць у свінку, чыжыка, а то і пікуля. Але ж цяпер ужо думай не думай,

а калі напрасіўся, трэба ісці. Ды, калі праўду казаць, яго ажно распірае цікаўнасць, што ж там, у той царкве, у якой ён ні разу яшчэ не быў.

А вось ужо і першыя местачковыя хаты. Яны амаль такія ж, як і ў іхняе вёсцы, толькі з аканіцамі. Многія аканіцы зачынены, і Вадзіму не верыцца, што нехта там, у хаце, можа аж дагэтуль спаць. Інакш што ж можна рабіць у цемнаце? А можа, думаецца яму, людзі баяцца немцаў, таму і ўдзень замыкаюцца, засланяюцца ад вуліцы, ад усяго свету чым толькі можна...

— Пайшлі, сынок, пайшлі, не адставай надта.— Ціхі, журботны голас маці развейвае яго думкі, Вадзім подбегам даганяе яе, і яны ўжо разам мінаюць скверык, разам ступаюць на ганак царквы. Яшчэ перад тым як адчыніць цяжкія, акаваныя жалезам дзверы ўсярэдзіну, маці хрысціцца, губы яе бязгучна варушацца. Вадзім ведае, што шэпча яна малітву, нешта пакорліва просіць у Бога.

У царкве, асабліва ля ўвахода, не пратаўкнуцца. Вадзім ажно палохаецца, што гэтулькі тут людзей, што можна згубіцца нават. Ён хапае маці за руку, і яна, крэпка трымаючы яго кволую ручку, далікатна, але настойліва цярэбіцца наперад. З-за спін Вадзіму нічога не відно. Аднекуль, зверху, ззаду, наплывае хваляю спеў, ён на хвіліну-другую аціхае, а затым ужо ўнізе, наперадзе, змяняецца адным, больш моцным мужчынскім басам.

Цяпер, калі маці праз людскую гушчэчу выцягвае Вадзіма на вольнае месца, дзе ля ікон зыркаюць язычкамі полымя свечкі, многа свечак, ён бачыць, нарэшце, і самога бацюшку, таго, які быў і спяваў, калі хавалі бацьку. Ён гэткім жа голасам і тады спяваў. Зараз, спакойна, спаважна пахаджваючы ў доўгім чорным адзенні, ён дыміць кадзілам, і з рота яго, гэтак жа, як і тады, вылятаюць такія таямніча-загадкавыя, такія незразумелыя словы.

Маці, пакінуўшы Вадзіма стаяць, хуткімі крокамі набліжаецца да адной з ікон, ад агеньчыка нечае свечкі запальвае сваю, ставіць разам з іншымі і тут жа бухаецца на калені, часта-часта хрысціцца і нізка хіліць галаў да саменькай каменнай падлогі.

Вадзіму ў такую хвіліну шкода маці, шкода самога сябе, шкода і сястру, і братоў сваіх, шкода і ўсіх-усіх людзей, што гэтак во просяць Бога, каб ён памог ім, злітаваўся над імі, не даў прапасці, зрабіў, каб хутчэй кончылася гэтая страшная вайна, каб адвёў хваробы і ўсе другія беды, якіх зараз хапае ўсюды...

Маці асабліва шкода Вадзіму. За тыя месяцы, як забілі бацьку, яна зусім-зусім памянялася: часта плача, неяк паніжэла нават, у валасах, ля вуха, з'явілася белая пасмачка. Цэлыя дні, хоць і робіць ад відна да відна, яна мала што есць, мала гаворыць, пра нешта ўсё думае, цяжка, пакутліва ўздыхае, часта ўсё божкае ды божкае.

Неяк, прачнуўшыся раненька, бо надта захацелася на хвілінку за хлеў, Вадзім пачуў у куце, дзе фікусы, нечы гарачы, з плачам уперамешку шэпт. Спрасонку падумаў, што нехта прыйшоў. Мо зноў Параска? Аднак, зірнуўшы туды, у кут, ён скрозь ранішнюю шэрань згледзеў, што маці адна, нікога болей няма.

Стоячы ля самаробнае, што на сцяне, рамкі з фатаграфіямі, у цэнтры якой вялікая, большая за ўсе іншыя, картка, дзе яны — маці і бацька — удваіх здымаліся ў мястэчку перад саменькай ужо вайной, маці і плакала, і скардзілася адначасова на бацьку, што не пасцярогся, не падумаў, пэўна, ні пра кога, пакінуў і яе, і дзетак сваіх, і што ж яна адна з імі пяцьмі рабіцьме, на каго абапрэцца, ад каго дажджэцца падтрымкі, падмогі ў такі трудны, такі горкі час.

«Мамачка,— хацелася тады крыкнуць Вадзіму,— не плач, мамачка, мы будзем памагаць табе, будзем слухацца. І я, і ўсе мы. Не плач толькі, мамачка... Я і парсючка буду заўсёды пасвіць, а Коля — Лыску. Мы з ім і дроў напілуем, многа-многа. А Верка, яна ж ужо саўсім вялікая, хіба ж яна табе не паможа і Лёву паглядзець, і Славіка, і што другое зрабіць. І дурэць мы болей не будзем, вот пабачыш. Не плач, мамачка... А вайна кончыцца, можа, ужо і скора паб'юць гэтых немцаў, то і саўсім добра стане...»

Але ён тады не рашыўся азвацца, ціхенька ляжаў, цярпеў і душыўся слязьмі...

Слёзы і зараз капаюць і капаюць у Вадзіма з вачэй, ён выцірае іх зашмальцаваным рукавом свайго ваўнянага, яшчэ да вайны вязанага, світэрка, які маці дазваляе надзець хіба толькі куды пайсці, але яны, тыя слёзы, ніяк не канчаюцца, нібы іх тамака цэлае мора.

Вадзім азіраецца: хаця ж бы хто не бачыў, што ён плача, гэта ж, пэўна, брыдка — плакаць пры ўсіх. Але не, нікому ні да яго, ні да ягоных слёз няма клопату, кожны ці то моліцца — адны ўкленчыўшы, другія так, стоячы,— ці то пустымі, нейкімі ўсё адно як шклянымі зрэнкамі глядзіць кудысьці, а куды — і сам не сказаў бы, пэўна, куды.

Вот і маці. Яна паднялася ўжо з падлогі, стала з ім побач, але таксама нібы не бачыць, не прыкмячае ні яго, Вадзіма, ні каго іншага. Вадзіму нават робіцца чамусьці вусцішна, на момант здаецца, што людзі скамянелі, што яны ўжо як бы і не яны, і не на зямлі знаходзяцца, а пераносліся некуды далёка-далёка, у іншы свет, скуль ідзе і гэты спеў, і гэты невядомы працяглы звон. Ён ажно скалануўся, яму стала млосна, і, адчуўшы, што вось-вось падкурчацца ногі, ён ціха, квола ўскрыкнуў.

— Што з табою, сынок, што? — як з-пад зямлі чуецца ўстрывожаны голас маці, і гэты голас вяртае яго з нейкага забыцця, ён моцна, дзвюма рукамі ашчаперваe чамусьці халодную матчыну руку, вісне на ёй.

— Дадому... хачу...— ледзьве выціскае з сябе Вадзім, і маці моўчкі, без аднаго слова, праз зацята-маўклівую людскую сцяну прашываецца назад, да выхаду, ведучы за сабою і яго, Вадзіма.

На вуліцы, хоць і сонца, і горача, як усе апошнія дні, дыхаецца ўсё ж лягчэй, вальней, і памалу, калі яны ідуць праз скверык, да яго вяртаецца ранейшае адчуванне сапраўднасці, усяго таго, што яму знаёмае, звыклае, блізкае, чым жыве, чым жыў дагэтуль. Вунь вераб'і, смешна лапочучы крыльцамі, купаюцца, ажно папіскваюць у пяску; вунь за кустом язміну, напяўшыся, не зважаючы ні на кога, стаіўся, пільна цікуе за вераб'ямі рабы кот. Бач, шкадлівец, як лаўчыцца, як мудруе! Ён чамусьці без хваста, і Вадзіму ўжо шкода гэтага ката, але яшчэ болей шкода вераб'ёў, хочацца, каб кот не злавіў ніводнага.

Пакуль Вадзім азіраецца, зацікаўлены, што ж там будзей далей, маці запыняецца з нейкай цёткаю, яны вітаюцца, пытаюць спачатку адна адну пра жыццё, пасля, хоць нікога паблізу няма, ні немцаў, ні паліцаяў, ні каго другога, яны пераходзяць на шэпт, і ў тым шэпце незнаёмай цёткі, хуткім, усхваляваным, які ідзе з саменькага нутра, згадваецца нешта добрае, радаснае, бо і маці неяк выпростваецца, весялее з твару, усё паўтарае і паўтарае: «Дай жа божачка... Дай жа божачка... І ім папомніцца. І на іх знойдзецца ўправа...»

З асобных пачутых слоў Вадзім здагадваецца, што армія нашая недзе моцна пабіла немцаў, пад нейкім, здэцца, Курскам, і цяпер ужо яны, гады праклятыя, не ачуняюць, так ім і трэба, з усёй-усёй зямлі, з іхняга мястэчка Радава, іншых мястэчкаў і гарадоў, адусюль іх папатураць, таксама паб'юць скора. «Дай жа божачка...

Дай жа божачка...» — маці нават заплакала, але гэты плач ужо не такі, што быў і ўчора, і заўчора, і ўвесь час: у ім не чуецца той горкасці, той чорнай зацятасці, якая прымушала і іх усіх дома стойвацца, зашывацца, бы мышы, у куточкі, не пападацца часта на вочы.

Па дарозе дадому маці зварочвае ў нейкі глухі завулак, на самую ўскраіну мястэчка, дзе відаць ужо поле, а яшчэ далей, у дзённай смузе, і шчотачка лесу. Ля нізкага драўлянага доміка з маленькімі цьмянымі шыбкамі вокан яна ўпэўнена адчыняе весніцы, заходзіць у чысты, акуратны падворак. Пры хлеўчыку клацае ланцугом сабака, нязлосна гаўкае. З хаты выходзіць сівавалосы мужчына, якога Вадзім адразу пазнае: дык гэта ж той дзядзька, той пчаляр, які быў у іх яшчэ пры бацьку! Сабака, убачыўшы гаспадара, брэша больш старанна, але калі на яго цыкаюць, ахвотна змаўкае, падцінае хвост і лезе ў будку.

— Добрага здароўечка вам, Іванавіч,— пачціва вітаецца маці, пільна глядзіць у вочы чалавеку, пасля садзіцца на ганак і цяжка ўздыхае.— Няма ж ужо майго, Іванавіч,— голас маці ўздрыгвае, але яна трымаецца, болей не плача.— Парыць, бедны, зямельку...

— Чуў, што добрага, а гэта чуў,— стары пчаляр таксама прымошчваецца на ганку, кладзе рукі на калені.— Многа гора кругом, многа...

Яны нейкі час маўчаць. Вадзім не ведае, як яму быць: азвацца ці не. Яму так хочацца вады! Хоць бы дзе кропельку глынуць. У адчыненых сенцах бачна вядро, конаўка пры ім. Вадзім вагаецца: папрасіць ці самому пайсці і напіцца? Пакуль ён так думае, ногі неўпрыкмет падводзяць да вядра. Ага, поўнае. Ён чэрпае, п'е. Вада не вельмі каб халодная, але спаталяе смагу. Становіцца добра. Аднак усё роўна хочацца хутчэй дадому. Цяпер жа саменькі абед, самая гарачыня, і можна яшчэ збегаць на лог. Там, мусіць, будуць усе.

У сенцах нечым саладкавата пахне. Вадзім здагадваецца, што недзе побач вісяць рамкі з воскам. Гэткі запах і ў іхняй кладоўцы. Ён яшчэ раз шморгае носам, нюхае, пасля зноў выходзіць на сонца.

Маці ўжо стаіць, нарыхтавалася, відаць, ісці, і Вадзім радуецца, што доўга яна не затрымалася, мусіць, і сама стамілася нямала.

— Дык прыдзеце ж, Іванавіч,— просіць на развітанне маці.— Паглядзеце, як там. Можа, што і выкачаем. Няма ж ужо каму паглядзець...— Яна хоча знайсці хусцінку,

каб выцерці павільгатнелыя вочы, мацае пальцамі ў рукаве блузкі, але нічога не знаходзіць, пасля, успомніўшы, кідае хуткі позірк на яго, Вадзімаў, завязаны палец, неяк непрыкметна прыхінае хлопца да сябе, гладзіць па галаве далоняю.

— Чаго ж, прыйду,— кажа пчаляр.— Лета ж сухое, павінна быць мёду. У вас жа добрыя пчолы вяліся.

Маці пацвярджае:

— Ага, добрыя, як гаспадар быў. А цяпер... Іх жа глядзець трэба. І ведаць, што ды як.

— Яно і праўда... Добра, прыйду. Мо і днямі.

— От дзякуй вам, Іванавіч,— маці яшчэ стаіць, нешта муляе ёй, пасля яна рашаецца, пытае: — Можа, і вашчынкі ў вас знойдзецца?

— Чаго ж, пашукаю. Прынясу тады.

Назад яны выбралі чамусьці другую дарогу. Перш чым пайсці сюдой, маці пастаяла трохі ў роздуме, па твары яе прабег нейкі цень, затым, узяўшы, як маленькага, Вадзіма за руку, павяла поруч з сабою. Гэта была і не дарога нават, а зарослая травою сцежка, па якой, відаць, мала хто хадзіў. З аднаго боку блізка падкрадваліся задамі агароды местачкоўцаў, з другога — цягнуўся роў, глыбокі, змрочны, на саменькім дне якога віднеўся чэзлы, чамусьці з пачарнелым лісцем ці то алешнік, ці то іншы хмызняк.

Маці стала зноў не пазнаць. Адтаяла ж была крыху, асабліва пасля сустрэчы ў скверыку з той невядомай Вадзіму цёткай, ды і ў двары пчаляра яна ўжо не гэтак змрочна глядзела перад сабою. А вось зараз... Зноў маўчыць, зноў нешта цяжка думае, і Вадзім ведае, што ў такую хвіліну ёй лепей неназаляць, ціха ісці, куды вядзе.

Рову таму і канца, здэцца, няма. Вадзіма ўсё больш і больш палохае гэта месца. Чаму яны выбраліся сюдою? Ці не пра яго, гэты роў, расказвалі большыя хлопцы на лозе? Нібы немцы пахапалі многа-многа нашых людзей, у цёмных машынах звезлі за мястэчка, выкінулі распранутых, голых на сырую, мокрую зямлю — якраз восень была, імжэў, сеяўся, бы праз сіта, халодны дождж,— сілком піхалі ўсіх: жанчын, старых, дзяцей, бліжэй да абрыву, да нейкае ямы, і ўсё білі з кулямётаў. Пасля хадзілі, заглядвалі зверху туды, уніз, ці хто варушыцца, і зноў білі з наганаў, з вінтовак, і гранаты нават кідалі. А потым засыпалі людзей тоўстым пластом зямлі. І ўсё роўна, так расказвалі на лозе, зямля некалькі дзён дыхала, як жывот,

падымалася і апускалася туд-сюд. А яшчэ не меней жудасна там зараз: нібы кожнае ночы ходзіць там, над абрывам, жанчына ў белым і ўсё некага гукае, покуль пеўні першыя не заспяваюць...

Вадзіма ажно скаланула ад гэтых згадак. Не выцерпеўшы, ён усё ж рашаецца, пытае:

— Мама, а праўда, што хлопцы на лозе казалі? Ну, пра роў гэты... Што многа-многа людзей тутака немцы пабілі. Га, праўда? А ноччу нехта ў белым ходзіць, кліча ўсё, кліча...

Маці прыцішае хаду, выпускае Вадзімаву руку, глядзіць на яго так, быццам даўно бачыла, ціха кажа:

— Вялікі ты ўжо ў мяне, сынок. Жыў бы бацька, радаваўся б. А пра што ты патаеш — праўда. Пра людзей праўда. Астатняе ж...

Яна недагаворвае, зноў амаль што бяжыць далей, і Вадзім ледзь паспявае, каб не адстаць, бо яму па-сапраўднаму ўжо страшна. Але вось маці раптоўна спыняецца, зноў бярэ яго за руку, асцярожна падводзіць да ўскрайку глыбокай ямы.

— Тут, сынок, гэта было.— Голас яе дрыжыць, твар з цёмнага, нядаўна яшчэ змрочнага робіцца цяпер белым, бы ліст паперы.— Запомні гэта месца, сынок. І што тут было — на ўсё жыццё сваё таксама запомні. Я і павяла цябе, каб паказаць. І сказаць мелася табе. Ты ж ужо унь як вырас, усё ведаеш, усё панімаеш. Перад памяццю людзей гэтых ніколі, колькі б ні жыў, не хлусі, будзь чэсным.

— А за што яны іх так, мама? І татку за што?— З Вадзімам гэтак даверліва, гэтак сур'ёзна яшчэ ніколі ніхто з дарослых не размаўляў, і ён гатовы задаваць адно пытанне за другім.

— Ну, бацьку вядома за што. Ён жа ў лес хадзіў, з партызанамі бачыўся, яму яны і заданні давалі. Але нелюдзі, бачыш, і ў вёсцы нашай ёсць. Вынюхалі. Данеслі..

— І на людзей гэтых... таксама данеслі?

Маці не адразу адказвае, думае, пасля гаворыць:

— Не, гэтых так сабе, без усякай прычыны. Каб меней усіх нас было, ваяваць з імі не было каму. І яшчэ што яны яўрэі, нечым Гітлеру іхняму не ўпадабаліся...

Усю астатнюю дарогу дадому Вадзім маўчыць, думае пра тое, што ўбачыў сёння, што давялося пачуць. Ён як ніколі адчувае зараз, што ўжо не будзе такім, якім быў

дагэтуль. Чамусьці расхацелася нават бегчы і на лог, і купацца расхацелася, і ў гульні з хлапчукамі гуляць. Быццам за адзін сённяшні дзень яму дадалося некалькі гадоў, і ён не ведае зараз, радавацца гэтаму ці не.

## 2

Вёска жыла новай трывогаю. Хапала іх, гэтых трывог, за гады вайны, аж занадта хапала. Усяго людзі пабачылі, усякае зведалі ліха, якое невядома скуль і бралася, з якіх цёмных дзірак вылазіла. Не было дня, каб хто не расказаў нешта такое, ад чаго жанкі зноў хапаліся за галовы, вохкалі, кідаліся ў слёзы, хоць іх, звыклых і да смерцяў, і да іншых бед, нішто, здэцца, не магло ўжо болей крануць, уразіць. Не, ніяк не чарсцвелі чалавечыя сэрцы.

...Таго разу Вадзіму як ніколі не хацелася гнаць на лог свайго парсючка. Надвор'е зусім сапсавалася. Яшчэ зранку як нагнала хмар, дык амаль і не пераставала сеяцца, бы праз сіта, імжака.

Паснедаўшы — маці напякла з картоплі бліноў, якіх, праўда, на ўсіх было вельмі мала,— Вадзім хацеў залезці на цёплую печ, дзе сядзелі ўжо на чарэні, дурэлі і Лёва, і Славік. Аднак маці бы неяк вінавата папрасіла:

— Пагнаў бы ты, сынок. Няма ж чым карміць. Усю траву парвала ўжо ў агародзе. Хай паскубе трошкі. А дожджыку ж і няма пачці. Ды і не будзе ж ён увесь час. Я вось мяшок табе падрыхтавала, каб не змок, калі што.

Яна пайшла ў кладоўку і вярнулася з чыстым белым мяшком, які выменяла ў некага з мястэчка на мёд, берагла вельмі, нават калі капалі ў агародзе картоплю і не хапала ў што ссыпаць, не хацела ўсё ж пэцкаць яго.

— Вазьмі вот,— маці лоўкім, амаль непрыкметным рухам склала мяшок так, што атрымалася досыць зграбная накідка на галаву і на плечы.

Вадзім, хоць і хацелася яму пабыць разочак дома, усё ж палез на печ, паказытаў трохі малых, тыя завішчалі, бы іх хто рэзаў, даў ім па пстрычцы, пасля пашукаў сярод рознага рыззя сырамятную папругу, якой меўся надперазацца. Зрабіўшы што трэба, выпрасіўшы ў маці лустачку хлеба, ён пайшоў у хлеў, з цяжкасцю адчыніў рыпучыя дзверы. Парсючок, пачуўшы знаёмыя крокі, высунуў у дзірку між абгрызеных жэрдак свой доўгі лыч-пятачок, у якім віднеўся белы дрот, нецярпліва зарохкаў.

— Ух ты, воўка на цябе няма,— замахнуўся нагой на парсючка Вадзім, але не выцяў, пашкадаваў чамусьці.— Трасцы бы табе, а не есці. Усё ты не наясіся.

Ён выпусціў парсючка з катуха. Той ад радасці ажно падбрыкнуў, куляй выскачыў на падворак.

З сенцаў выйшла якраз Верка з тазам у руках. Не гледзячы ні на кога, яна шырока замахнулася і плюхнула на зямлю, далей ад сябе, брудную ваду, якой толькі што мыла падлогу. Вада папала на парсючка, і той, спалохаўшыся, кінуўся ўбок, у прыадчыненыя варотцы, кудою хадзілі ў агарод.

— Вот, заснула, нябо? Ідзі выганяй цяпер.— Вадзім падскочыў, хапіў Верку за руку, босую сцягнуў з ганка на мокрую халодную зямлю.

Верка войкнула, хацела адпіхнуць брата, шуснуць назад у хату. У гэты момант пачуўся якраз нейкі гуд, спачатку слабы, які, аднак, з кожнай секундай мацнеў, шырыўся, зла весна выцясняў усе іншыя вясковыя гукі.

З чапялою, забыўшыся, відаць, паставіць яе на месца, выскачыла на ганак і маці. Яна была яшчэ распэтланая, не прычэсвалася, нават не паспела памыцца. На адной шчацэ і на падбародку чарнеліся сляды ад сажы.

— Што гэта, дзеткі? — Маці, як і Верка, босая, па гразі хуценька пашлэпала да брамкі, высунулася на вуліцу, аднак адразу ж подбегам вярнулася назад, на ганак.— Вой, божачка! Куды ж гэта яны? Што ж гэта яны ўдумалі?!

Машыны раўлі ўжо амаль побач. Маці загадала нікому не вытыркацца, ісці ў хату, сама першая кінулася ў залу, пакідаючы на чыстай падлозе мокрыя сляды.

Прыціхлі на печы, натапырылі вушы і малыя. Схаваўшыся за фікус, маці не спускала вачэй з вуліцы. Вадзім таксама, каб лепей бачыць, адхінуў фіранку, пачаў цікаваць на дарогу. Верка чамусьці палезла на печ, да Лёвы і Славіка.

— Не адхінай вельмі,— цыкнула на Вадзіма маці.— Бронь Бог убачаць, спыняцца!

Але немцы, відаць, і не думалі спыняцца. Вадзім налічыў ужо дзесяць грузавікоў, а яны ўсё яшчэ ішлі і ішлі. У кожным пад брызентавым верхам, добра бачна было праз заднюю, незахінутую дзірку, сядзелі салдаты ў чорным, з аўтаматамі ў руках, нешта крычалі, гарлапанілі, ці не песні спявалі. У кабінах, побач з шафёрамі, ехалі іхнія афіцэры, таксама чамусьці давольныя, вясёлыя, нібы на вяселле спяшаліся.

Нечакана на вуліцу, узняўшы енк, выскачыў з-пад варотаў суседскі сабачка Жучок, заўзята пачаў гаўкаць на кожную машыну. У Вадзіма ажно сэрца зайшлося ад жаху. Хацелася выбегчы на двор, паклікаць Жучка да сябе, кінуць яму тую лустачку хлеба, што маці дала з сабою ў поле. Але не ўспеў ён яшчэ так і падумаць, як адтуль, з вуліцы, пачуўся кароткі, трохі прыглушаны не то стрэл, не то трэск. Жучок, уткнуўшыся спачатку пысай у зямлю, раптам паваліўся на бок, дрыгануў раз-другі нагамі і абмяк, болей не варухнуўся.

— Мамачка! — крыкнуў, калоцячыся ўвесь, Вадзім.— Жучка... забілі. Гады яны, гады!

— Ціха ты, сынок, не крычы так,— маці падышла да Вадзіма.— Не нарабілі б яны большай бяды. Чуе сэрца маё, кепскае яны нешта ўдумалі... Пруць некуды, бы груганнё тое. Божачка, хаця ж пастухі нашыя дзе на іх не напароліся. І кароў, і іх могуць панішчыць, як ненарок напоруцца. Што ж ім хто?..

Маці цяпер ужо не знаходзіла сабе месца. Толькі прайшлі машыны за вёску, аціх трохі гуд, яна вопрамеццю выскачыла на вуліцу. Дождж перастаў, але было яшчэ мокра, па-асенняму золка, няўтульна. Аднак ніхто гэтага не заўважаў. Высыпалі з хат амаль усе — і дарослыя, і дзеці. То там, то тут можна было бачыць купкі людзей. Яны стаялі, абмяркоўвалі падзею, выказвалі свае здагадкі, свой непакой, і найперш зараз — таксама пра пастушкоў, пра быдла. Дзе сёння пасуць?

— У казармы збіраліся быдта,— разгаварылася нават амаль заўсёды маўклівая цётка Тэкля.— Мой хлапец быдта казаў. Трава тамака шчэ ё.

— А мо ў Гараўках? — наморшчыла лоб суседка Саша.

Вадзіма здзівіла, што яна нібы і не бачыла забітага Жучка, усё адно як ён і не іхні, чужы нечы. Як жа так можна? А што ж скажа, як прыгоніць каровы, Міця?

— Толькі б не ў высечцы, толькі б не пры дарозе,— гэта ўжо словы маці, у якіх чулася ўсё большая і большая трывога.

Яна пачала расказваць сон, які бачыўся ёй ноччу: быдта пайшлі яны з мужам, з Пётрам сваім, царства яму нябеснае, у лес, сухастоіну якую пашукаць, каб ссекчы на дровы, бо нямашака ж ужо ні паленца сухіх. Не згледзелі, як і заблудзіліся, ён у адзін бок паказвае, яна ў другі. Пайшлі, куды ён павёў. Ажно ідуць і гадзіну, і дзве, і тры,

а канца-краю тому лесу няма. Наадварот, усё вышэй і вышэй дрэвы вокал, і нават сонца мала заглядвае ўніз, дзе яны брыдуць па лаўжах, па пнёўі, па моху, што ў калена ажно. Пот цурком, з сіл выбіліся ўжо. Хоць ты кладзіся ды памірай. Яна і гатова была б, ды Пётра цягне за руку, хоць і сам ледзьве дыхае. Раптам — прагал нейкі ўперадзе. «Вот, ага, поле, жытло там»,— крычыць так яна. Падыходзяць да тога прагалу, а гэта і не прагал зусім, рака лясная гэта дарогу ім перагарадзіла. Глядзяць, а ў рацэ купаюцца — жанкі, старыя, дзеці. Толькі чамусьці ціха надта, ніводнага галасочку не чутна. І голыя ўсе, вот як маці толькі нарадзіла. Аж страшна нешта стала. А Пётра і кажа: «Пераплывём і мы. Тамака я ўжо ведаю, як дадому ісці». І цягне мяне за руку, аж балець пачало, варухнуць няможна...

— Тут я і прачнулася,— закончыла свой сон маці,— бо і праўда рука разбалелася, стрэмку ўчора загнала, нарываць мецьме.

— Вада — бяда,— аўтарытэтна заключыла цётка Маланне, якая жыла пры вуліцы, кудою ганялі на лог свінні. Яна толькі што падышла, усяго, што расказвала маці, не чула, аднак перапытваць не стала, зразумела з паўслова.

Вадзім як не разрываўся на часткі: хацелася чуць, што гавораць дарослыя, хацелася пацерціся каля іх, і разам з тым ні на хвіліну не пакідала, быццам шылам вострым торкала ў галаву, думка пра нерухомага, распластанага на зямлі трохі воддаль ад баб, Жучка. Страшна чамусьці было падыходзіць да яго. Каб не гэты страх, ён, Вадзім, даўно б ужо не вытрываў, падбег бы. Няўжо, няўжо Жучок нежывы? Няўжо можна нічога не бачыць, не чуць, не дыхаць, вось так, адразу, і сканаць ад нейкае там невялічкае кулькі, якіх у яго, Вадзіма, у таго ж Міці, Генкі Шакуты, у іншых хлопцаў поўныя кішэні, ды яшчэ можна назбіраць і ля точкі, і ля казармаў, была б толькі ахвота? Бедны, бедны Жучок...

Шкадоба да яго ўзяла ўсё ж верх над усімі астатнімі пачуццямі, і Вадзім асцярожна, быццам збіраючыся напалохаць, пачаў падкрадвацца да сабачкі. Здавалася, вось-вось той падхопіцца, весела заскавыча, завіляе хвастом, пачне, гэткі няўрымслівец, падскокваць, прасіць чаго з рук, а то і проста каб лізнуць цябе сваім шурпатым языком. Не, Жучок ляжаў на адным месцы, ненатуральна адкінуўшы галаву, выцягнуўшы лапы. Вадзім цяпер ужо бачыў лужынку крыві ля ягонай пысы. Падбег сюды

ж Лёва, і нават Славіка нехта, ці не Верка, ссадзіў з печы, той таксама прышкандыбаў да іх.

— Ва-а-дзі-і-ім,— зарумзаў Лёва,— я баюся. Во-о, сабачку...

Услед за ім на ўсю вуліцу, быццам і ён нешта разумеў, заўшоўся ў плачы Славік.

— Кыш адсюль! — узлаваўся чамусьці на меншых братоў Вадзім.— Яшчэ не хапала тут вашых нюняў. Ідзіце вунь туды, дзе ўсе.

Яму самому хацелася плакаць, але нейкая трывога, якая перадалася ад дарослых, матчыны словы, што не было б хаця большай бяды, стрымлівалі слёзы. Перасільваючы сябе, ён дрыготкімі пальцамі дакрануўся да Жучка, адразу адчуў, што цела ягонае стала ўжо халодным. Да горла чамусьці падступіла млоснасць, нядобра стала і ў жываце, і, каб не званітавала, Вадзім, не гледзячы, хуценька хапіў сабачку за заднюю лапу, павалок да плота, дзе яшчэ густа буяла крапіва. Падумаў, што як прыгоняць каровы, яны з Міцем возьмуць лапату, выкапаюць глыбокую ямку і абавязкова пахаваюць Жучка, мо нават і дамавінку якую з дошчачак змайструюць. Мо і Генка ім паможа. Ён жа таксама любіў дурэць з Жучком.

— Сынку! — Вадзіму пачуўся матчын голас. Яна ўсё яшчэ стаяла з жанкамі, цяпер павярнулася ў яго бок. Калі ён наблізіўся, ціха сказала: — Збегаў бы ты з кім, сынок, паглядзеў, дзе там пастухі нашыя што робяць. Нешта ўсім нам спакою нямашака... Божачка, колькі ж гэтае ліха будзе шчэ квапіцца на нас?

Жанкі таксама завойкалі, паддаўшы адна адной страхаў, яны гатовыя былі і самі бегчы за вёску, у поле, у лес шукаць тых кароў. Але паспрабуй пабяжы, калі за спадніцу трымаецца яшчэ некалькі рук... Таму, толькі маці папрасіла Вадзіма зрабіць такую ласку, бо ўсё роўна ж парсючка ўжо на лог не пагоніць, неяк абыдзецца, як усе таксама пачалі малёгаць, каб паслухаўся. Ён жа хлопец, яму ж збегаць — што плюнуць, няйнакш.

Вадзіма, аднак, і не трэба было доўга ўгаворваць. Неяк адразу, быццам рукою зняло, прайшла млявасць, нават шкадоба да Жучка крыху прыглухла, саступіла месца новаму моцнаму адчуванню: яго просяць дарослыя, яму давяраюць не абы-якую справу! Гэта ж не іхняя, хлапчукоўская, гульня на лозе ў вайну, тут сапраўдны страх, ад якога ўсярэдзіне ажно ўсё трымціць. А што, калі ён трапіць да немцаў? Яшчэ ж невядома, куды і чаго яны

паехалі, дзе спыніліся... Мо якраз засаду на каго рыхтуюць? Шапталіся ж нядаўна бабы, што партызаны ўсё бліжэй і бліжэй падбіраюцца да мястэчка, ужо некалькі разоў добра калашмацілі гадаў, а ў вёсках, што за лесам, і зусім часта бываюць. Мо немцы і паперлі такою сілаю, каб паставіць ім пастку, разлічыцца з імі. А дулю не хацелі?

Вадзім на хвіліну ўявіў, як недзе там, далёка-далёка, на глухой лясной дарозе, партызаны з патаемных сваіх схованак нападаюць на ворагаў, закідваюць іх гранатамі, сякуць з кулямётаў, пакуль ніводнага ў жывых не застанецца. Вось ім плата і за бацьку, і за тых з мястэчка, што ляжаць закапаныя ў рове, і за Жучка, і за ўсе іншыя няшчасці, ад якіх бабы рвуць на сабе валасы...

— Добра, мама,— пагадзіўся Вадзім.— Я толькі Генку паклічу. Мы разам.

— То, пэўне ж, весялей будзе. І не баўцеся вельмі,— дала апошні наказ маці.

Жанкі пачалі па адной разыходзіцца: дома ж работы — процьма, і войкай не войкай, а жыць жа неяк трэба, нягледзячы ні на што, трэба есці, карміць астатніх, мыць, прыбіраць, думаць пра апратку, пра ўсё іншае, без чаго чалавек не можа абысціся, што б там ні рабілася на белым свеце.

## 3

Вадзім Гурко, не тое што Генка, трохі ведаў лес, ведаў, дзе маглі б пасвіць быдла. Праўда, угадаць пэўна цяжка было. Каровы доўга на адным месцы не любілі хадзіць. Не тое што свінні. Свінні што, свіней не трэба ганяць далёка, ім логу хапала, наскубціся хапала ім і там. А каровы — эге-ге, дудкі яны табе на адным месцы паходзяць, яны беглі б усё некуды і беглі, быццам на новай пашы невядома які ласунак чакаў іх.

Упэўніўшыся, што за вёскай нікога побліз няма, хлопцы вырашылі спачатку ісці да казармаў. Гэта, па сённяшнім надвор'і, было, відаць, самае лепшае месца: і схавацца пастухам ад дажджу, ад золі ёсць дзе, і вецер на паляне, атуленай скрозь лесам, гэтак не даймаў, не працінаў да костачак, як у чыстым полі, ды і трава там, колькі ні дратавалі яе каровы капытамі, спорна зелянела, трымалася да саменькіх замаразкаў.

Мінулі точку. Прыземістая бетонная крэпасць, будаваная яшчэ да вайны, яна зеўрала на іх цёмнымі дзіркамі-амбразурамі. Іншы які раз Вадзім не прамінуў бы выпадку, хоць на хвілінку звярнуў бы да яе, залез бы нават усярэдзіну, яна, дарма што палохала сваёй зацятай маўклівасцю, змрокам і холадам скляпенняў, чамусьці ўсё ж магнітам цягнула, вабіла да сябе...

На другі бок дарогі, трохі бліжэй да лесу, узвышаўся маяк. Ён шырока разгірэчыў свае чатыры драўляныя нагі, на рознай вышыні надточаныя і змацаваныя тоўстым, у палец, дротам. Усярэдзіне ногі гэтыя там-сям былі пераплецены, для большай моцы, яшчэ бёрнамі. Але ўсё роўна, ці мо ад старасці, ці так ад чаго, маяк пахіліўся, і ў ветраны дзень далёка чуваць было, як нямогла стагнаў, бы жаліўся каму на свой лёс. Лезці на яго, хоць былі і драбінкі — яны пачыналіся не ад зямлі, а недзе трохі вышэй галавы,— дарослыя нізавошта не дазвалялі, палохалі, што гэтая аграмадзіна можа ў любы момант рухнуць. Але хіба гэта спыняла каго з хлапчукоў?

Сёння ж было ні да точкі, ні да маяка. Ні яму, Вадзіму, ні Генку. Трэба было спяшацца. Пошук быдла Вадзім узяў на сябе аднаго. Ды яно і само сабою зразумела: Генка, папершае, на якога паўгода меншы, маладзейшы за Вадзіма; па-другое, ён ні разачку не пасвіў каровы, бо акрамя худой, з адвіслымі вушамі свінні маці яго нічога не мела, нічога болей не трымала. Вадзім жа, наадварот, калі недзе ў лесе Коля параніў на калючым дроце нагу, што не мог нават і кроку ступіць, тады ажно тры тыдні ганяў замест старэйшага брата іхнюю Лыску. І паспеў уведаць амаль усе аблюбаваныя пастухамі мясціны.

За точкай, метраў якіх праз трыста, злева ад гравійкі, пачынаўся ядлоўцавы гушчар, ці «пазвішча», як яго чамусьці называлі ўсе ў вёсцы. Ядловец, бы хто знарок раўнюсенька абрэзаў яго, змяняўся сцяной змрочнага яловага лесу, які цягнуўся немаведама куды. З другога ж, правага, боку было ніжэй, і ўвосень, калі лілі дажджы, тут утваралася нават балотца. У ім, па калена ў вадзе, стылі, калелі зараснікі асінніку, чэзлых бярозак, лазы, і сюдой, пакуль ужо не ашчэрваўся, не скоўваў усё мароз, ніхто не хадзіў, не ездзіў. Каб трапіць да казармаў, якія былі за гэтым балотцам, трохі ў глыбіні лесу, даводзілася даваць добрага кругаля.

— А можа, немцы там, га, Вадзім? — Генка, прыціхлы, насцярожаны, боязна аглядаўся па баках.

— А мы зараз во пабачым,— цыркнуў Вадзім слінай, нібы хацеў падкрэсліць, што для яго гэта вельмі звычная справа — ісці па пятах ворагаў, некага сабе там шукаць.

— Як... пабачым? А калі напорамся?

Вадзім паблажліва паляпаў сябрука па плячы:

— Гэх ты, нягегла! Не зыркай толька па баках, а і пад ногі глядзі трохі. Сляды машын бачыш? Ага! Куды вядуць?

Генка аж пачырванеў: як гэта ён так схібіў, не падумаўшы, ляпнуў абы-што. Яно ж і праўда лягчэй лёгкага па следзе здагадацца, куды іх, гадаў, паперла нячыстая.

Немцы, як вызначылі хлопцы, нідзе пакуль не спыняліся, нікуды не скіроўвалі. Свежыя, добра бачныя на вільготным пяску гравійкі выбоіны вялі некуды на Сямёнаў луг, а там, можа, і далей. Так гэта ці не, а вось да казармаў можна ісці смела, не баяцца, што на каго наткнешся.

Яны звярнулі на вузкую, усю зарослую травой лясную дарогу. З бакоў шчыльна падступалі кусты ляшчынніку. Летам тут быў суцэльны зялёны калідор, куды нават сонца рэдка калі заглядвала.

Цяпер лісце трохі пападала, стала святлей, вальней. Але ўсё роўна ісці зараз было непрыемна. З кустоў, хоць дождж і перастаў, яшчэ капала, мокрыя галіны, як хлопцы ні лавіравалі, ні прыгіналіся, часта чаплялі іх, твар, адзенне асыпала буйнымі халоднымі кроплямі. Чвякала пад нагамі. Басанож было і халаднавата. Па чвыру ішлі — нічога, а тут, на мокрай траве, адразу адчулася восеньская золь.

Яны, не згаворваючыся, наддалі ходу, каб трохі ўгрэцца. Калі ж дарога пашырэла, стала сушэйшая, пусціліся нават бягом. На паляну, дзе месціліся тыя казармы, прыляцелі задыханыя і... расчараваныя. Ні пастухоў, ні кароў не было, хоць Вадзім чамусьці думаў, што абавязкова застане іх тут. Дзе ж цяпер шукаць? Куды падацца?

Каля пачарнелай, без дзвярэй і вокан доўгай будыніны ўбачылі дымок. Ён белаватымі кудзеркамі квола цягнуўся ўгору. Падумалася: можа, пастухі сядзяць, грэюцца ля цяпельца ці адышліся на хвіліну, каб паглядзець быдла, што разбрылося па драбналессі. А мо ў казарме хлопцы надумалі ў хованкі пагуляць?

Аднак ні ля вогнішча, ні ў будыніне нікога не знайшлі. Праўда, па ўсім: і па кастры, які не стлеў, шугаў яшчэ добрым жарам, і па вытаптанай вакол траве, і па свежых

стружках (нехта сцізорыкам аздабляў сабе арэхавую палачку),— адчувалася нядаўняя прысутнасць пастухоў. Мо яны дзе блізка?

Вадзім склаў лодачкай ля рота далоні і, набраўшы поўныя грудзі паветра, штомоцы гукнуў:

— Гэ-ге-е-е! Ко-о-о-ль-ка-а-а!

Натапырыўшы вушы, хлопцы прыслухаліся. Аднак, акрамя рэха, якое прыйшло са старога бору, ніхто не азваўся. Вадзім паўтарыў зноў, ужо ў другі бок. І зноў — ціха. Дручком — якраз валяўся побач — Генка калупнуў жар, і адтуль выкацілася бульбіна. Узрадаваны, ён грабянуў мацней. І весела заскакаў на адной назе. Печанай бульбы аказалася шмат. Генка, апякаючы пальцы, трэсачкай пачаў скрэбці падгарэлую скарыначку, і хутка яна апетытна заружовелася.

— Шамай, што штаіш,— напхаўшы поўны рот, смешна прашамкаў губамі Генка і кінуў Вадзіму ўжо аскрэбеную бульбіну.— От шмаката!

Вадзіма, хоць ён і ўзяў ласунак і таксама пачаў сілкавацца, не адпускала, неадчэпна свідравала думка: чаму пастухі кінулі касцёр, бульбу ў прысаку? Што іх спудзіла? Калі б каровы забрылі далёка, маглі б завярнуць іх назад. Ці ўжо, урэшце, папільнаваў бы хто адзін ля кастра, дачакаўся б і забраў спечаную бульбу. Гэтак жа неаднойчы рабілі. А то во кінулі-рынулі ўсё, нібы спехам куды ўцякалі.

Нешта тут, пэўна, не тое...

Бульбу яны прыхапілі ў Вадзімаву шапку. Набралася паўнюткая. Знойдуцца пастухі — а павінны знайсціся, дзе ж могуць дзявацца,— радыя будуць узяць чаго на зуб. Гэта ж яшчэ цэлы дзень наперадзе. Цяпер жа не тое, што летам — у абед дамоў быдла цяпер не прыганялі. Даілі толькі раніцай і вечарам.

Пастухі, ідучы з хаты на ўвесь дзень, бралі «сабойку» — што ў каго было, што мацяркі давалі. Хто лусту хлеба, хто бліцоў, хто праснак. Каму і скварка перападала. Гэта, праўда, лічылася ўжо раскошай. Есці ж у полі хацелася чортведама як. Ніякай «сабойкі» не хапала. Хлопцы пяклі, калі маглі дзе прыдбаць, бульбу, смажылі на дубчыках грыбы, ласаваліся кіслай, ажно сківіцы зводзіла, зайчыкавай капустай. Ну, а пра ягады, арэхі і казаць няма чаго. Летам гэта была ўга якая падмога жывату. Горай восенню, во як цяпер. Ні грыбоў, ні ягад тых, ні арэхаў ужо не стала. Добра яшчэ, што бульба выручала.

Таму Вадзім, як Генка ні злаваўся, не даў яму многа аб'ядацца. Не яго. Няма чаго кваліцца, разяўляць рот на чужое.

Зараз яны ішлі ў Гараўкі. Быць не можа, каб і ў Гараўках пастухоў не заспелі. Пашы для быдла там, праўда, не шмат, што і казаць, затое калі ўжо хавацца ад каго, то лепшага месца не знойдзеш. Туды і дарогі, хаця б калёснай, ніхто не працерабіў. Трапіць у Гараўкі, хто не ведаў трохі лес, можна хіба выпадкова. Там, у акружэнні старых ялін, сосен, было некалькі вясёлых светлых прагалін, дзе расла нейкая асаблівая, не такая, як усюды, трава. Каровы яе вельмі любілі і выскубалі ўсё да каліва. І малака давалі пасля болей, чым калі-небудзь. Але раней як праз тыдзень гнаць туды не выпадала: трава не паспявала яшчэ адысці. Пастухі часта не маглі дачакацца гэтага дня.

Вадзіму два ці тры разы пашанцавала пасвіць у Гараўках. І яго нібы магнітам цягнуў, вабіў да сябе той глухі куток лесу. Непадалёк, дзе так любілі ласавацца рагулі, былі параскіданы роўныя і круглыя, як шапкі, зарослыя пракаветнымі ялінамі, курганы. Хто і калі іх насыпаў, дзеля чаго, што хавалася ў іхніх нетрах, аставалася для ўсіх шчымлівай загадкай.

Пад каранямі камлюкаватых дрэў, што аплялі курганы, хлапчукі часта знаходзілі глыбокія цёмныя норы. Выдумлялі ці мо і праўду казалі, што яшчэ да вайны нейкія людзі капалі тут, нешта ў зямлі шукалі. Другія іх аспрэчвалі, даказвалі, што гэта ж усяго толькі норы, у якіх водзяцца барсукі. Праўда яно ці не, Вадзім не ведаў, бо ні разу ў жыцці не бачыў ніводнага барсука, як ні хацелася хоць адным вокам глянуць, які ён, той барсук.

Яны нямала-такі абрасіліся, але холаду зараз не чулі. Наадварот, ад хуткай хады, а там-сям і подбегам, нават закхекалі, ад абодвух вось-вось магла паваліць і пара. Каб жа ім пад ногі хай сабе не дарогу, хаця людскую сцяжынку, было б нічога, а то ж ішлі, прадзіраліся, можна сказаць, і праз кусты, і праз паваленыя дрэвы. Толькі б прама, толькі б не збіцца з правільнага тропу.

З дзён свайго пастушкоўства Вадзім завязаў на памяць такія-сякія вузельчыкі, і зараз тыя вузельчыкі спатрэбіліся, добра пакуль што выручалі.

Вунь справа мінулі агромністую, запоўненую нейкай рыжай вадой яму. Летам, у сухмень, хлопцы выкалуплівалі там з зямлі рэшткі нашага самалёта, што, падбіты ў пер-

шыя дні вайны, упаў разам з бомбамі з велізарнай вышыні. Усё думалі: а раптам знойдуць што-небудзь ад лётчыка, мо і дазнаюцца, хто ён ды адкуль. Дзе там! І костачак нават не засталося ад чалавека. А можа, ён скочыў на парашуце і цяпер дзе ў лесе разам з партызанамі? Але ж ніхто не бачыў, каб ляцелі з парашутам...

А вунь наперадзе знаёмая невялікая палянка, куды яго, Вадзіма, як сáма пайшлі суніцы, некалькі разоў цягала Верка, бо адна баялася ў лесе. Суніц у гэтае лета было не вельмі, а вось тут, на палянцы, высыпала іх надзіва багата. Добра паласаваліся тады ўсе дома, маці надта шкадавала, што няма мёду, а то патаўкла б трохі — і было б варэння на лякарства.

За палянкай, метраў праз сто, месца прыкметна ніжэла, спускалася ў глыбакаваты роў, на дне якога, схаваны ад вока зялёнай раскай, мятаю, апалым лісцем, цененька булькаў ручаёк. Вада, ведаў Вадзім, была ў ім халодная, смачная, біла аднекуль з зямлі. Колькі разоў ручаёк гэты выручаў іх, пастушкоў, у час летняе спёкі!

Цяпер, пасля печанай бульбы, пасля шпаркай хады, таксама зажадалася прыпасці да яго чыстага струменя. Але, адумаўшыся, Вадзім не дазволіў піць разгарачаным ні сабе, ні Генку. Гэта ж, ведаў, пэўная хвароба, якая адразу зваліць з ног. Таму яны толькі памачылі губы і, перайшоўшы па кладцы — нехта тут, на мокрым, кінуў якраз тры жэрдкі,— пачалі падымацца наверх. А там трохі скрозь густы ельнік — і будзе стары лес, Гараўкі.

Генка адстаў, ледзь ужо плёўся. Вадзім пачакаў яго, запусціў руку ў шапку, працягнуў бульбіну, якая — ведама, у адзежыне — была яшчэ гарачаватая. З ахвотаю ўзяўшы падмацунак і карыстаючыся хвілінай перадышкі, Генка сеў на дол, выцягнуў ногі, крутнуў туд-сюд галавою. Знайшоў калок. Як і ў казарме, ён паскроб скарыначку, апетытна з'еў усё да крошкі.

Цяпер ішлося весялей. Праўда, было ўжо недалёка. Вось адзін, злева, курган, вунь другі... А крыху ўперадзе — большая палянка, за ёю, амаль упрытак — меншая.

Гараўкі, аднак, сустрэлі іх таямнічым пошумам старых дрэў, нейкай гнятлівай цішынёй. Нішто не нагадвала, каб сёння прайшоў тут статак, каб быў хто з людзей.

Разгубленыя, хлопцы не ведалі, што рабіць, куды зараз падацца. Ісці назад дадому? Але ж як глянуць яны каму ў вочы? Іх жа паслалі папярэдзіць пастухоў аб небяспецы, аб тым, каб не вытыркаліся на гравійку, бо ці мала што

можа быць. А яны — на смех жа ў вёсцы падымуць, далібог, падымуць — не змаглі ўдвух знайсці статак. Печаную бульбу во знайшлі, тут у іх нюх добры, а саміх пастухоў — спрыту не хапіла... Не-е, трэба яшчэ куды бегчы, не ленавацца, клікаць, галёкаць, мо хто і пачуе, калі не вельмі далёка...

— Вадзім! — Генка стаяў, углядаўся ў густы ельнік, які выбягаў на палянку, падковай ахінаў яе.

— Чаго? — азваўся Вадзім. Ён трохі адышоўся, каб зрабіць сваю невялікую патрэбу.

— А калі выскачаць два ваўкі? Што тады, га?

Ад нечаканага такога пытання Вадзім трохі нават зніякавеў. І праўда, як было б ратавацца, каб узяліся адкуль ваўкі, напалі на іх? А што ў лесе ваўкі ёсць — пра гэта і казаць няма чаго. Зімою ж не адзін чалавек чуў, як яны выюць. Аж скура шэрхне...

— Не ведаю,— адказаў шчыра.— На дрэва хіба...

Генка нібы абрадаваўся:

— Во і я так думаў. Глядзі, якія сосны! Век не перагрызлі б. Зубы кароткія! — Ён трохі памаўчаў, пасля раптам прапанаваў: — А давай залезем вунь на тую сасну. З саменькага верху ўсё ўбачым. І каровы дзе — убачым, і вёску.

Вадзіма трохі ўкалола: як гэта ён сам не дадумаўся? Генка дадумаўся, а ён, Вадзім, не мог скумекаць, каб кінуць вокам з вяршыні дрэва.

Сасна, на якую паказаў Генка, была і сапраўды вышэйшая за тыя, што раслі побач, а мо і ва ўсіх Гараўках. Яны падышлі да яе гонкага, выносістага ствала і... адразу сумеліся. Паспрабуй залезь, калі знізу няма ніводнага сучка, які можна дастаць рукой. Хлопцы агледзелі ўсе больш-менш высокія дрэвы, але ўсюды было адно і тое ж: каб і ўдвайне вырас, то не дацягнуўся б да першай галіны.

— Вот бы...— Вадзім хацеў нешта сказаць, але асекся на паўслове, прыслухаўся. Знекуль здалёку — а мо падалося? — данёсся захлёбісты пошчак, нібы хто страчыў з аўтамата ці нават кулямёта.

— Што гэта? — Генка наструніўся, пабялеў у твары.

— Стралялі быдта...— шапнуў Вадзім, насцярожана ловячы кожны шолах лесу.

Няўжо немцы дзе тут блізка? І на каго яны палююць? Што ім трэба ў іхнім лесе?

Хлопцы стаялі колькі хвілін, баяліся нават варухнуцца. Ды, як ні ўслухоўваліся, нічога падазронага болей не чулі.

Вадзіму падумалася: можа, яны памыліліся, прынялі трэск якога надломанага, знявечанага дрэва за пошчак аўтамата ці кулямёта...

І ў гэты самы момант абодва ўздрыгнулі: страляніна, цяпер ужо больш выразна, пачулася зноў, у тым баку, дзе, як здагадаўся Вадзім, быў Сямёнаў луг.

— А калі там... быдла? — вырачыў ад жаху вочы Генка.

— Усё ты ведаеш,— буркнуў Вадзім, буркнуў так, механічна, бо на душы і ў самога адразу нешта заскрэбла, кальнула ў сэрца: няўжо пастухі надумалі на Сямёнаў луг гнаць? Там жа баркуноўскія — ведама, пад носам — усё спляжылі сваімі каровамі.

Генка між тым як не енчыў:

— Што рабіць будзем, га, Вадзім? А калі яны іх паб'юць?

— Памаўчаў бы лепей,— па-сапраўднаму ўзлаваўся зараз Вадзім.— Накаркаеш яшчэ бяды...— Ён, хвіліну падумаўшы, цвёрда сказаў: — Падкрадзёмся ціхенька, паглядзім.

— Ты што — здурнеў?! — Генка зноў вырачыў вочы.— Чым ты каму паможаш? Каб шпокнулі...

— Тады — як сабе хочаш. Я адзін. А ты... Э-э-эх!.. Бяжы дадому, бяжы!

Не гледзячы на Генку, Вадзім сігануў у ельнік, узяў кірунак на Сямёнаў луг. Ён пакуль не надта спяшаўся, усё думаў: Генка дагоніць, абавязкова дагоніць, і зноў яны пойдуць разам. Чамусьці не верылася, што гэтак можна падвесці ў такі момант. Сябравалі ж увесь час, колькі помніць сябе Вадзім. Гулялі ў хованкі, у свінку, качалі на вуліцы кацёлку, некалькі гадоў пасвілі разам на лозе свіней. Калі гулялі ў вайну, Генка першы падахвочваўся. І так смела ішоў у атаку. Го-о, там можна быць смелым...

Вадзім прыпыніўся, пастаяў хвілінку. Не, ніхто не бег, не даганяў. Цяпер ён ужо канчаткова ўпэўніўся, што пойдзе адзін, што Генка збаяўся. А хіба яму, Вадзіму, не боязна? Яшчэ як боязна. Але ж і другі страх, які ўсё болей і болей тачыў нутро, запаўняў кожную клетачку цела,— ліпкі, непрыемны страх і за старэйшага брата, і за іншых пастухоў, і за Лыску,— нібы піхаў, гнаў яго наперад, выцясняў усе іншыя пачуцці.

Пратаптанай дарогі ці сцяжыны на Сямёнаў луг таксама, вядома, не было. Але гэта не бянтэжыла. Як ісці туды, Вадзім трохі ведаў. Ад Гаравак, куды вясной ганяў замест

Колі Лыску, ён тады з хлопцамі тры ці чатыры разы гойсаў пад Баркуны, не надта вялікую вёску, што ланцужком цягнулася ўскрай Сямёнавага лугу. Падпільноўвалі рыжага баркуноўскага Хведзю, каб добра, дзесятаму б заказаў, правучыць яго. Хведзя, не па гадах сваіх камлюкаваты, рукасты, але без некалькіх, як казалі, клёпак, увесь час, калі пасвілі на Сямёнавым лузе, задзіраўся з пастухамі, падбухторваў супраць іх сваіх хлопцаў. А аднойчы нават пабіў Анюцінага Лёніка, пераняўшы яго сам-насам за кустамі, калі той адварочваў каровы.

Вось і вырашылі тады правучыць нахабніка, зрабіць яму «цёмную». Нехта падказаў, што Хведзя амаль штодня ходзіць надвечар з рэзгінамі ў лес, носіць дадому на пал сухое ламачча. Аднак аж тры дні — пасля абеду і як не да саменькага заходу сонца — дарэмна сядзелі хлопцы ў засадзе на ўскрайку лесу, не спускаючы вока з недалёкіх баркуноўскіх падворкаў. Ён, Вадзім, нават і елку аблюбаваў, з якой нібы на далоні бачылася амаль уся вёска. Хведзю ж — ці хто змог папярэдзіць, ці што другое з ім сталася — так і не падлавілі.

Зараз, па шляху на Сямёнаў луг, Вадзім меней за ўсё думаў пра іхнюю няўдалую адплату. Не гэта было зараз у галаве. Стрэлы ў тым баку, куды ён ішоў, пачасціліся. Вадзім зноў прыпыніўся: падалося, быццам і крычыць нехта, лямантуе. Божачка, вот жа дзень сёння дык дзень! Што ж гэта такое?..

Ён ужо не ішоў, а краўся. Перш чым перасекчы якую прагаліну, ён стойваўся за кустом ці ствалом дрэва, пільна, насцярожана аглядваўся па баках, цікаваў, што там, наперадзе.

І толькі пераканаўшыся, што нічога падазронага нідзе няма, хуценька мінаў гэты прагал, каб схавацца за новым кустом, пнём ці дрэвам.

Ад людскога крыку цяпер рэзала ўвушшу. Пераважаў жаночы лямант. У яго ўплятаўся надрыўны дзіцячы плач. Вусцішна вылі, енчылі сабакі, вішчалі свінні. Вадзім адчуў, як пачало шэрхнуць цела, як ватнымі рабіліся ногі. Кожны новы крок даваўся, бы на іх павесіў хто вялізныя гіры. Невядома, ці прасунуўся б ён яшчэ хоць на метр, калі б не ўбачыў, не пазнаў елку, з вяршыні якой віжаваў за баркуноўскім Хведзем. Зараз толькі б дабрацца да яе!

Елка расла высокая, густая і, не ў прыклад тым соснам у Гараўках, ад самага нізу сукастая. Залезці на верхавіну не склала б цяжкасці, каб гэта было хоць гадзіну назад.

Тады Вадзім хіба думаў, што чакала яго, калі чорт нейкі падбіў паперціся ў гэтыя Гараўкі, а затым, ужо без Генкі, і на Сямёнаў луг...

Апошнія, здэцца, сілы пакідалі яго. Абдзіраючы да крыві рукі, твар, ён неяк усё ж караскаўся вышэй і вышэй. Нават сам здзіўляўся, што яшчэ здатны нешта рабіць, прымаць нейкае рашэнне. Ён знарок пакуль што не глядзеў у бок Баркуноў, хоць адтуль чулася ўжо суцэльнае галашэнне, якое то ўзмацнялася, то нечым як бы прыглушалася. І толькі калі ўсеўся на сук, на якім і тады сядзеў і з якога найлепш бачна наўкруг, асмеліўся кінуць позірк на вёску.

Спачатку было няўцям, адкуль такі здушаны лямант, такое галашэнне: вёска ж, здэцца, як вымерла. З дрэва праглядвалася амаль уся вуліца, ці не кожная хата, кожны двор. І нідзе — ні жывой душы. Адно выюць нябачныя сабакі. А дзе ж людзі? Хто ж страляў? А гэты нечалавечы крык? Не з-пад зямлі ж ён, пэўна, ідзе...

І раптам Вадзіма ўсяго страсянула, нават з сука ледзь не паляцеў. Як гэта ён адразу не здагадаўся?! Вунь жа, вунь адкуль чутны гэты страшны гáлас! Як з самага пачатку не ўгледзеў ён тога, трохі наводшыбе, прыземістага гумна пад пачарнелай саламянай страхою?

Цяпер, хоць і мяшала восеньская імжа, з елкі ўбачылася многае, што пацвердзіла страшную згадку: у Баркунах немцы, тыя, што ехалі сёння на машынах, што забілі на вуліцы, на вачах ва ўсіх, іхняга любімца — Жучка. Вунь, трымаючы зброю, стаяць яны наўкруг гумна, нечага чакаюць. Што ж яны ўдумалі? Чаму заперлі людзей у цёмнае, чаго ад іх хочуць, што вымагаюць?..

Да вуха даляцеў новы стрэл, і адразу ж недзе коратка кудахнула і аціхла курыца. Вадзім пакруціў галавою тудсюд, абмацаў вачыма некалькі бліжэйшых падворкаў. У адным, што насупраць студні, угледзеў: з хлява, галосячы, выскачыла жанчына ў целагрэйцы, за тою жанчынай — не то хлопчык, не то дзяўчынка, добра не разабраць. За імі ўслед вырасла чорная, нібыта груган, рослая фігура фашыста з аўтаматам у адной руцэ, у другой — з забітай, відаць, курыцай.

Кароткім ствалом немец падштурхнуў жанчыну, выпхнуў на вуліцу, паказаў, куды трэба ісці. Жанчына бязладна замітусілася, яшчэ мацней залямантавала, але салдат у якое імгненне падскочыў да яе, нешта гартанна крыкнуў, піхнуў так, што тая ледзьве не паляцела потырч

у гразь. Пасля гэтага, бы змірыўшыся з тым, што наканавана ёй лёсам, жанчына пайшла шпарчэй. Толькі хапіла дзіця за руку і як не павалакла яго за сабою.

З дрэва Вадзім сачыў, куды яны накіруюцца. Ну, пэўна ж, немец гнаў іх да астатніх вяскоўцаў — у прыземістае гумно. Перад тым як упіхнуць жанчыну ў яго цёмнае нутро, да гумна невядома адкуль выбеглі двое новых немцаў. Яны хвіліну папоркаліся ля дзвярэй, адкінулі нейкую цяжкую завалу, пасля з жахлівым скрыпам прачынілі трошкі адну палавіну.

Людскі крык-стогн, нібы толькі і чакаў гэтага моманту, узарваўся, выбухнуў з новай сілай і адразу ж, як з іржавым скрыпам дзверы зачыніліся, асеў, захліпнуўся, перайшоў у глухі вантробны гул.

Але вось да гумна зноў выбеглі некалькі ў чорных мундзірах і... тут жа адскочылі назад. Вадзім спачатку не зразумеў, чаго замітусіліся фашысты, што іх спудзіла, ажно пакуль не ўбачыў, як нешта маланкай бліснула і дымнымі клубкамі шуганула ўгору. Бо-о-жачка! Дык то ж агонь!.. Загадзя, відаць, аблітыя газай ці, можа, і бензінам, сцены хапіліся прагным полымем. Вось што ўдумалі гады! Няўжо, няўжо яны асмеляцца на та́кое?!

Ён адчуў: пад грудзі, як тады, калі адцягваў у крапіву забітага Жучка, накацілася млоснасць, закружылася галава. У вушах, спачатку ў адным, затым у другім, пачуўся гул, на першым часе тоненькі, бы побач звінеў камар, затым усё болей і болей разрастаўся, мацнеў, гатовы, здэцца, ушчэнт парваць перапонкі. І ўжо амаль не чутно было, як у пражорлівым агні трашчалі кроквы, латы гумна, як у апошнім крыку задыхаліся баркуноўцы... Рукі і ногі, што дагэтуль хоць і вяла, але ўсё ж трымалі яго на дрэве, зусім сшэрхлі, сталі неслухмянымі...

Падаючы з вышыні, ён спачатку чамусьці не спалохаўся, яму было ці не ўсё роўна. Але ў самы апошні момант нейкі інстынкт усё ж абудзіўся, ажыў, прымусіў цела трохі напяцца, каб яно, хоць і падаючы, не чмякнулася вобзем саламяным кулём...

## 4

Вестку пра тое, што спалілі Баркуны і ўсіх жывых там, першы прынёс недзе адразу пасля абеду адзін з пастухоў — Васючкоў Барыс. Яго знарок паслалі, каб сказаць пра гэтую жахлівую навіну, а таксама каб не трывожыліся

ні за быдла, ні за іх саміх, бо схаваліся яны ў самай гушчэчы, і пакуль немцы не праедуць назад, не высунуць адтуль і носа.

Пачуўшы пра Баркуны, бабы на вуліцы загаласілі так, што і нежывы, здэцца, падняўся б з магілы. Яно і зразумела: спалілі ўсё ж людзей, суседзяў, можна сказаць. Тым болей што ў Баркунах многія мелі родзічаў, нават вельмі блізкіх.

Гэтае галашэнне, няўцешнае гэтае гора падагравалася яшчэ і страхам: а раптам, едучы назад, немцы зробяць тое ж самае і з імі? Адны горача раілі кінуць-рынуць і хату, і гаспадарку, хай яно ўсё лепей гарам пойдзе, і, пакуль не позна, уцякаць куды далей у лес, да тых хаця б пастухоў, каб разам хавацца. Другія казалі, што і на лозе можна нейкі час перачакаць. На лог, можа ж, яны, немцы, не папруцца.

Яе, Ліды, калі запыханы Барыс Васючкоў расказваў бабам пра ўсё бачанае, якраз не было на вуліцы. Перад гэтым яе з плачам паклікала Верка, бо Лёва і Славік, улучыўшы момант, што нікога няма ў хаце, залезлі ў шкоду: вывалаклі — як і сілы толькі хапіла! — з кута, з-за кухоннага стала, доўгую дубовую лаву, прысунулі яе да сцяны, дзе вісеў роблены яшчэ бацькам, каб хаваць такі-сякі нажытак, шкапчык, ускараскаліся на тую лаву, са шкапчыка дасталі загорнутае ў чыстую анучку масла, якое маці з такой цяжкасцю збіла, пальцамі пачалі калупаць яго і напоўніцу, нават без хлеба, есці. Хлеб яны таксама, відаць, шукалі, але не знайшлі, бо сляды іхніх пошукаў відаць былі адразу: на кухні ўсё параскідана, усё расхляблена, быццам раніцай не прыбіралі, не наводзілі парадак.

Малых, толькі Верка адчыніла дзверы, нібы ветрам здзьмула з лавы. Яны шуснулі ў залу, зашыліся пад ложак, бо ведалі — так гэта ім не пройдзе. І праўда: Верка, убачыўшы, што вытварылі меншыя браты, адразу за галаву хапілася, пасля, ні слова не кажучы, пабегла ў сенцы, пашукала дзяркач. Вярнуўшыся ў залу з дзеркачом у руках, яна ўкленчыла, заглянула пад ложак, у бакоўцы пад другі, драўляны. Шкадліўцаў, аднак, нідзе не было.

Верка пашукала за шафай, на печы, агледзела ўсе куткі. Хлопцы, як у той казцы, нібы шапкі-невідзімкі надзелі. Падумалася, што, можа, пакуль яна бегала ў сенцы, малыя расчынілі акно і скочылі ў агародчык. Але ж

вокны былі ўсе зашчэплены. Ды і Славіку не па ўзросту яшчэ такі спрыт, каб праз акно лазіць. Але ж глядзі, во, брыдотнікі, і розуму ў іх хапіла гэтак недзе зашыцца.

Верка стаілася, амаль не дыхала, чакала, што нехта ж падасць хоць якую прыкмету жыцця, неяк выявіць сябе. Быць такога не можа.

Яна не памылілася: праз хвіліну-другую падалося, што там, ля шафы, штосьці асцярожна зашкрэблася. Акурат як мыш. Мышы ў хаце вяліся, ноччу і папісквалі, і шамацелі нечым, нават Мурка не заўсёды магла даць ім рады. Дык то ж ноччу, а вось каб удзень... Не-е, тут нешта не так. Верка на дыбачках падкралася бліжэй і... адразу ўсё зразумела. Як гэта яна, дурніца апошняя, з самага пачатку не прыкмеціла?! Шафа ж то не зачынена як мае быць, ладнаватая, у палец шчылінка зеўрала чарнатой усярэдзіну.

— Ага, вось вы дзе, паскуднікі! — Верка кінулася да шафы, расчыніла яе на поўны мах.

Хлопцы, відаць, не чакалі, што іх знойдуць, і, заспетыя знячэўку, узнялі такі піск, нібы іх жыўцом рэзаў хто на маленькія кавалачкі. Аднак Верку гэты піск не астудзіў, яна яшчэ болей раз'ятрылася, калі згледзела пад нагамі ў малых свае ўборы: зялёны сарафан з белымі бубачкамі і сваю любімую квяцістую блузку. Цяпер ужо нішто не магло яе спыніць, каб раз і назаўсёды правучыць гэтых паганцаў, якія толькі і ведаюць, што перавярнуць усё ў хаце і на кожным кроку зрабіць шкоду. Не-е, годзе, цяпер яна ўсыпле ім пад саменькую завязку, няхай енчаць, няхай каму хочаш жаляцца...

Дзяркач ажно зазмільгаў у яе руцэ. Цаляла Верка болей па голых, чорных ад бруду пятках малых, што, як тыя ні падкурчвалі іх пад сябе, як ні хавалі, усё ж вытыркаліся з-пад кіпы шмацця.

— А будзеце, а будзеце?! — пад тупы шоргат дзеркача прыгаворвала Верка, адчуваючы, што злосць яе з кожнай секундай стыне, вытыхаецца і вось-вось, як здаралася неаднойчы, саступіць у душы месца нейкай змрочнай панылай, абыякавасці да ўсяго на свеце; тады ўсё пойдзе ў яе як праз пень-калоду, і яна доўга бяссэнсава будзе блындаць па хаце ці па двары, быццам нешта не то робячы, не то шукаючы, на нешта бясконца натыкаючыся; і лепш было ў такія хвіліны яе не чапаць, не клікаць, не пытацца ні пра што...

Боль, што раптоўна працяў левую руку,— гэты раз

Верка добра спраўлялася і левай,— крыху яе зноў скалануў, але тая чорная незразумелая пустата, якая надыходзіла пасля ўзрушэння і якой яна сама баялася, ужо брала сваё, таму і не было новага выбуху гневу, а толькі ціхі здушаны ўскрык праз упарта сцятыя губы.

Выпусціўшы дзяркач, яна пацягнула руку да вачэй: на ёй, трохі вышэй запясця, выразна, да крывавай чарнаты, абазначыліся дзве падкоўкі ад маладых вострых зубоў.

Вось тады Верка, заплакаўшы, і выскачыла на ганак, каб паклікаць матку, якая нечага корпалася ля хлява. Сама ж, як Ліда ні дапытвалася, чаго плача, не сказала ні слова ні пра масла, ні пра ўкушаную руку — ат, хай як хочуць разбіраюцца, а ёй усё роўна...

Невядома, якая яшчэ кара чакала б хлопцаў, калі б у хату не забегла задыханая, распэтланая, з пукатымі ад жаху вачыма суседка Саша. Ліда, глянуўшы на яе, забылася і пра малых, і пра тое, што яны натварылі, і пра ўсе іншыя турботы сённяшняга дня. Спалатнеўшы, адчуваючы, як сэрца нядобра, па-здрадніцку зашчымела ў грудзях, пасля, бы яго хто шалёна тузануў туд-сюд, ажно загрукала ў рабрыны, яна глуха выдыхнула:

— Ну, што, што?! Кажы ж!..

Яна чамусьці не сумнявалася: здарылася нешта кепскае з дзецьмі — Колем альбо Вадзімкам. «Бо-о-о-жачка-а, за што ж, за што-о?» — шаптала бяскроўнымі вуснамі.

Пачуўшы пра Баркуны, пра тую бяду, якая напаткала людзей, яна ўжо не магла быць дома ні хвіліны. Пацягнула на вуліцу, да ўсіх: яшчэ тлела трохі надзея, што, можа, Саша чаго не дачула, можа, гэта ўсё не так, можа, вяскоўцы лепей ведаюць, бо не можа ж такога быць, каб, бы плашкі ў печы, папаліць жыўцом і малых, і старых.

Разам з тым не адпускала трывога за большых сыноў. Сэрцу нешта падказвала, а яно не ашуквала яшчэ ні разу, што і ў яе хату крадзецца якоесь ліха, і ўсе благія прадчуванні чамусьці Ліда звязвала толькі з імі, Колем і Вадзімам.

Праўда, за Колю яна трохі паспакайнела, калі ёй слова ў слова пераказалі, што гаварыў, як прыбягаў з лесу, Васючкоў Барыс. А вось калі згледзела на вуліцы Генку — той, як ні ў чым не бывала, цёрся сярод баб,— у яе і дыханне перахапіла. А дзе ж Вадзім? Яны ж разам пайшлі шукаць пастухоў, тады ж была раніца, а цяпер, глядзі, і вечарэць неўзабаве пачне.

Яна клікнула Генку. Той, адразу апанурыўшыся, ста-

раючыся не глядзець ёй у вочы, падышоў і, не паспела Ліда яшчэ і рот раскрыць, слова мовіць, першы забалабоніў:

— Думаеце, не страшна было? Ага!.. Я яму казаў: не ідзі. Стралялі унь як! Як шпокнулі б... А ён... Пчала быдта ўджаліла... Паляцеў...

— Куды? Куды паляцеў?! — Яна хапіла яго за плячо, хацела трасянуць, каб не цягнуў ёй жылы, хутчэй казаў, але Генка вылузаўся, нібы чаго спалохаўшыся, адбегся на колькі крокаў убок.

— Быдта я ведаю? — голас яго перайшоў на віск.— Дакладваў ён мне, ці што? Думаеце, не страшна было? Ага!..

Ліда гатовая была накінуцца на яго, недавярка гэтакага, расшкуматаць, але ў час узяла сябе ў рукі, ведала: злосцю, тым болей мо і беспрычыннай, нічога не дамажашся, яму ж уцячы ад яе — што плюнуць.

Хоць усё і кіпела ўсярэдзіне, яна прымусіла сябе як мага цішэй папытаць зноў:

— Геначка, дзіцятка, дык дзе ж Вадзім? Ты ж во дома, а ён дзе? Вы ж разам былі...— Яна нават усхліпнула.— Ужо ж прыбег бы, каб...

Яна не ведала, што тоіцца за гэтым «каб», аднак ніколькі не сумнявалася, што з Вадзімам нешта надарылася. А тут і Генка, бы злітаваўшыся, пашкадаваўшы яе, мусіў прызнацца:

— У Гараўках мы былі. Пасля, як адтуль, дзе Сямёнаў луг, усчалася... ну, страляніна гэтая самая, ён і пабег, каб паглядзець...

— І ты яго пакінуў аднаго?! — не вытрывала, роспачна крыкнула яна, але Генка цяпер ужо не ўцякаў: нешта, відаць, дайшло да яго, што зрабіў ён нядобра і трэба неяк загладжваць сваю віну...

Шукалі Вадзіма ажно да паўночы. Коля ўпрасіў у помач Міцю, цётка Маланя выправіла свайго Анціка. Генка таксама не аднекваўся. Ліда і сама з усіх ног, хоць яны ў яе і падкошваліся ажно, пабегла б у лес, ды яе ледзь не сілком прымусілі застацца ў хаце, з малымі.

Генка павёў спачатку на тое месца ў Гараўках, дзе яны з Вадзімам разлучыліся, адкуль той, ужо адзін, шуснуў у кусты. Хлопцы палілі смалякі, каб хоць трохі бачыць перад сабою, галёкалі на ўвесь лес, але ўсё было дарэмна.

Меркавалі па-рознаму. Можа, Вадзім дзе заблудзіўся, збіўся з тропу і ніяк не знойдзе накірунак дадому? Бывала

ж у лесе і з кожным з іх такое: ідзеш нібыта правільна, а пасля ні з таго ні з сяго нейкім тлумам наліваецца галава, ты ўжо мала што цяміш і, быццам цябе чэрці водзяць, топчашся амаль на адным і тым жа месцы. А мо хлопец трапіў у якую яму ці пастку і не можа выбрацца? Але ж тады хоць крычаў бы, клікаў бы на помач...

Яны ішлі ланцужком, адзін за адным. Першы — Коля з выцягнутай уперад рукой, у якой палала, пырскаючы гарачымі смалянымі іскрамі, ладнаватае сосновае паленца (добра, што маці ў апошні момант здагадалася і выняла з запечча, сунула яму ў рукі разам з запалкамі некалькі такіх вось смалякоў, зберажоных на распал). Услед цяжкавата плёўся, пасопваў носам Міця, за ім, палахліва азіраючыся па баках, адкуль насоўвалася густая, што сажа, цемната, подбегам, каб не адстаць, труха ў Генка. Замыкаў іхняе шэсце, таксама з факелам у руцэ, Анцік. З Анцікам было смялей, бо ён нёс за поясам капоты добра навострaную сякеру — ці мала для чаго ў лесе, ды яшчэ поначы, яна магла спатрэбіцца?!

Немцаў хлопцы ўжо не баяліся: надвечар, зрабіўшы сваю чорную справу, карнікі не вуліцаю, а загуменнем вярнуліся назад, у мястэчка. Тады ж, мо праз гадзіну дазнаўшыся, што ў вёсцы ўсё ціха, прыгналі статак і пастухі.

Ні Колю, ні Міцю з Анцікам не давялося хоць трохі пабыць у хаце, даць пярэдых анямелым нагам: у гэты дзень усе крукам стаялі ля кароў, трымалі іх на маленькім лапіку ў гушчэчы, каб нідзе не разбрыліся, каб не трапілі на вочы чужакам. Міця і Анцік, праўда, успелі, калі прыгналі, памяняць мокрую верхнюю апратку. Цяпер ім было нішто, а вось Коля адчуваў у сваім набрынялым ад вільгаці бушлаце як не сто кіло цяжару.

Але дбаць пра сябе зараз не выпадала. Трывога за брата перадалася ад маці і яму. Не хацелася думаць пра самае горшае: што Вадзім незнарок трапіў на вочы немцам і тыя, прыняўшы яго за баркуноўскага, таксама спалілі разам з усімі. Чаго, чаго ён папёрся ў самую іхнюю пашчу? Цікаўнасць? Дурнота? Генка ж во пасцярогся, аказаўся мудрэйшы за гэтага пустадомка...

Чым бліжэй падыходзілі яны да Сямёнавага лугу, тым мацней чуўся пах гару. Коля не ведаў, як хлопцы, а сам адчуваў: чамусьці шэрхне, сцягваецца на галаве скура, дыбарам становяцца валасы. Расло жаданне павярнуць назад, не мучыць ні сябе, ні сяброў. Нацярпеліся яны за

сённяшні дзень і так нямала. Ну што, што яны знойдуць?! Не будзе ж Вадзім, разявіўшы рот, проста так, ад няма чаго рабіць, стаяць на іхняй дарозе. Калі жывы, калі нічога кепскага не здарылася, то ўжо і сам, пэўна, прыцёгся дадому. А калі...

Ён раптам спыніўся, за ім, як па камандзе, застыў на месцы і ўвесь ланцужок. Падалося, нібы хто паперадзе, трохі лявей, не то ўскрыкнуў, не то застагнаў.

— Ц-с-с-с!..— прашыпеў Коля, напружваючы слых.

І праўда: стогн — цяпер гэта ўжо добра было чутно, што стогн — паўтарыўся. Коля вагаўся: гукнуць ці не? Чамусьці не было ніякага сумнення, што гэта Вадзім. Але што з ім? Чаго стогне? Хто і што з ім зрабіў?

Ціха, нават задзьмуўшы смалякі, яны рушылі на той слабы чалавечы голас...

## 5

Другі ўжо тыдзень пайшоў, а яму мала чаго лепшала.

Ліда амаль не адыходзіла ад ложка, на якім Вадзім ляжаў пластом. Душылася слязьмі і праклінала сябе, што паслала яго, дзіця горкае, на тыя пошукі. Добра, хоць мог яшчэ стагнаць, калі валяўся пад елкай, і Коля з хлопцамі пачулі, прыйшлі ў час на помач, на бушлаце прынеслі дахаты. А то да раніцы, пэўна, і сканаў бы. Дзіва што! Галава ажно ў двух месцах разбітая, на целе таксама не далічыцца ўсіх драпін, сінякоў і ран. Колькі ён, сыночак родны, крыві страціў, колькі выцерпеў, адзін Бог літасцівы ведае! Хоць бы яшчэ ўсярэдзіне чаго не адбіў. Тады ўжо ці выратуеш?

Адразу ж, толькі яго прынеслі, Ліда ў адчаі памчалася ў другі канец вёскі, да старога Ліпая. Доўга грукала ў дзверы, бо той ужо спаў. У крук сагнуты, увесь нейкі выцвілы, зямліста-шэры, Ліпай адзінока дажываў свой век і рэдка высоўваўся куды з падворка.

Ліда мала спадзявалася, што ўгаворыць яго паглядзець сына. Але хто, хто яшчэ мог ёй памагчы? Усё-ткі, хоць зараз і нямоглы, Ліпай як не да саменькай вайны працаваў фельчарам у мястэчковай бальніцы. Нават меў дома такі-сякі інструмент, сам некалі рыхтаваў розныя лякарствы. Дык, можа ж, схамянецца, паспагадае ёй?

Яна не памылілася. Толькі пахапліва, са слязьмі, расказала пра няшчасце, Ліпай нібы трохі выпрастаўся, па-

жвавеў, пачаў шукаць верхнюю апратку. Сказаў яшчэ, каб сама хутчэй бегла дахаты, а ён неўзабаве памаленьку прыдыбае.

І праўда: помач яго, усё, што ён зрабіў напачатку, мо і ўратавала хлопца, але далёка яшчэ не вылечыла. У Вадзіма трымалася тэмпература, ён не вымавіў пакуль ніводнага слоўца, часта стагнаў, а начамі некалькі разоў здушана, нема крычаў. Тады яна клала яму на лоб вільготную анучку, брала ягоную кволую руку ў сваю, цёплую і шурпатую, падносіла да губ, цалавала. З душы яе таксама рваўся крык-стогн, але яна вялікім намаганнем стрымлівала сябе. Ведала: трэба з усіх сіл трымацца, сціснуць нервы ў кулак, бо калі і сама яшчэ зляжа, то што ж будзе з усімі. Верка і Коля, вядома, ужо добрыя памочнікі, але ва ўсім палажыцца на іх яшчэ зарана. Пра Лёву, тым болей пра Славіка, і казаць няма чаго. Яны зусім яшчэ дурненькія, выраслі, можна сказаць, на паўвяршка ад гаршка.

У гэтыя цёмныя трывожныя ночы, калі ўсе спалі, ціха пасопвалі насамі, Ліда, замест таго каб і самой трохі звесці вочы, ніяк не магла пазбавіцца ад сваіх бясконцых думак. Удзень таксама трашчала ад іх галава, але ўдзень было не тое: круцішся, бы ўюн на патэльні, хапаешся і за тое, і за гэта, і часам аглянуцца назад няма калі. Затое ноччу...

Хоць і гуло, ныла ад стомы цела, прасіла спачыну, ёй доўга не спалася. Думкі цяпер ужо цалкам бралі яе ў палон і, нібы тыя мурашы, безупынку мітусіліся ў галаве, тачылі мазгі. Найбольш думалася пра дзяцей. Як-ніяк, пяць ратоў, і кожны дзень просяць есці. А тут яшчэ насоўваецца зіма, і гэтулькі не зроблена, у павеці дроў — бы кот наплакаў, а яшчэ ні абуць, ні адзець хутка не будзе чаго, даношваецца апошняе з таго, што з Пётрам разам набывалі, чаму, бы дзеці, радаваліся...

Сваё жыццё, тое, якое ёй адведзена, яна ўжо не брала ў разлік, не спрабавала зазірнуць хоць трохі наперад, бо была пераканана, што без Пётры яно нішто, пустата і холад. Заставалася толькі мінулае, і хацелася гэтага ці не, але яно настырна, мо і не ў самы лепшы час, нагадвала пра сябе. За доўгія гады, якія звязвалі адной нітачкай яе і мужава жыццё, усякага хапіла, што і казаць.

Перабіраючы зараз па костачках былое, яна дзівілася, як яны з Пётрам усё адолелі, як вынеслі насланнё, якое наканаваў ім лёс. Быццам наважыўшы праверыць іх, паспы-

тацць на трываласць, ён ставіў ім гэтулькі палак у колы, што і на дзесяцярых, пэўна, хапіла б пад завязку.

Нават і пачыналася ў іх не так, як бывае ў людзей...

Колькі вось часу мінула з тае пары, падгадаваліся дзеці, назаўсёды не стала і Пётры, а помніцца ж, помніцца ўсё да макулінкі, быццам учора гэта было. Відаць, асобныя, пераломныя моманты жыцця памяць хавае доўга, мо і да скону, хоць, пэўна, і хацелася б, калі настае пара падбіваць бабкі, тое-сёе сцерці, быццам школьнай гумкай, каб не вярэдзіла без меры душу. Але ж не вытраш, не вытравіш нічым тое, што зроблена некалі неасцярожліва, не вырвеш, бы ў школьным сшытку, старонку з жыцця, на якой, хай і незнарок, паставіў кляксу. Не, так не атрымліваецца...

Хто ж тады, напачатку, зрабіў большую прамашку, якая каштавала ім нерваў, адняла гэтулькі шчаслівых дзён?

Яна, вядома, вініла яго, толькі яго аднаго, хоць і саму сябе тачыў чарвячок, ці добра на той вечарынцы ў старой Агрыпіны зрабіла. Каб жа хто загадзя ведаў, што ўсё так скончыцца, хіба ж паперліся б яны туды, у духмень і таўханіну?

Праўда, ён, Пётра, не вельмі і хінуўся да гуляў. Нават і яе падбіваў, каб не ісці, пабыць у хаце, тое-сёе яшчэ абмазгаваць. А мазгаваць было пра што. Праз месяц жа вяселле, ужо і з яго, і яе боку ўсе ведаюць, усё абгаворана і заклёпана, цяпер гэтай нагодай толькі і жывуць абедзве сям'і. Дык ці ж трэба ім зараз нейкая вечарынка?

Аднак у яе бы чорт тады ўбіўся. Пойдзем ды пойдзем, чаго кіснуць, паглядзім хоць людзей і самі пакажамся. Звягала, покуль ён, спахмурнеўшы, як прадчуваючы што, не здаўся.

Напачатку было як і неаднойчы на гэткіх пагулянках: таўкліся ў цеснаце ды пыле ад земляной падлогі, якая, колькі ні пырскалі на яе вады, умомант станавілася сухой; выбягалі на двор асвяжыцца; хлопцы ў цёмных сенцах, ужо на добрым падпітку, хапалі, нібы жартуючы, дзевак у абдымкі, шчыпалі, а тыя як не сваім голасам вішчалі, адбіваліся, нібы крыўдавалі, а на самой справе страшэнна ў душы перажывалі, калі на іх ніхто не звяртаў увагі, не хацеў нават зачапіць.

Усё было знаёмае, звыклае. Гэтак жа, як і мінулыя разы, вечарынка гула дзесяткамі галасоў, па паўгадзіны пілікаў адну і тую ж мелодыю гармонік, а праз адчыненыя

дзверы валіла густая пара, змешаная з пылам, тытунёвым дымам і рэзкім адэкалонным пахам.

Але ў той вечар, не ў прыклад Пётру, у яе быў асаблівы настрой, і не хацелася зважаць ні на таўханіну, ні на духмень, ні на што іншае. Весялосць і гуллівасць ажно перлі з яе.

Хлопцы, ведаючы, што Пётра не танцуе, ахвотна бралі яе, а яна гэтак жа ахвотна адгукалася на кожнае запрашэнне. Пётра, прыхіліўшыся да сцяны, паблажліва глядзеў на пары, шукаў яе вачыма, па ягоным твары было відаць, што ён любуецца ёю і трошкі мо раўнуе. Але хай, хай, гэта не памяшае, будзе яшчэ болей цаніць і кахаць. Яшчэ ж не муж, і ён не мае права ў чым яе ўпікнуць...

Так думалася ёй.

У віхуры заядлай полькі яна і не згледзела, калі ў гурце танцораў з'явіліся два маладыя лейтэнанцікі. У новай, з іголачкі, форме, у пілотках набакір, яны адразу звярнулі на сябе ўвагу, унеслі нешта свежае ў гулі, надалі вечарынцы асаблівую значнасць. Ого, ці часта да іх у вёску завітвалі новыя гожыя хлопцы, ды яшчэ лейтэнанты! Ніхто не сумняваўся, што яны з казармы ў лесе, якую нядаўна пабудавалі і дзе раскватаравалася вайсковая часць.

Векавуха Агрыпіна, якая вельмі хвацка спявала частушкі, нярэдка такія, што і хлопцы ніякавелі, талопілі долу вочы, на правах гаспадыні хаты па-свойму прывеціла новых гасцей. Седзячы на ложку з дзвюма ладнымі горкамі пуховых падушак — на жаль, ніхто чамусьці на іх не квапіўся,— яна зычным голасам, перакрыўшы нават пілíканне гармоніка, выбухнула:

Ліцянанты, ліцянанты,
Зорачкі крылатыя!
Пачаму вы, ліцянанты,
Доўга нежанатыя?

Лейтэнанты пасміхаліся і, неяк вельмі хутка асвойтаўшыся, давалі на танцах такога чосу, што ўсе і раты паразяўлялі.

Калі пачаўся кракавяк, адзін з іх, смуглявы, з даўнім, добра зарубцаваным шрамам на верхняй губе, што, аднак, зусім не псавала яго твар, наадварот, рабіла больш мужным, загадкавым, падышоў і галантна расшаркаўся перад Лідай. Пётра памкнуўся быў яе затрымаць, але ці не рашыўся, ці не паспеў, а яна лёгка, быццам птушка, вы-

пырхнула на сярэдзіну хаты, закружылася з ім у тым кракавяку.

Усё ёй, Лідзе, падабалася ў Пётры: сур'ёзнасць, мо нават і залішняя, уменне што хочаш змайстраваць, зрабіць па гаспадарцы, яго бясконцая адданасць і прывязанасць да яе, нарэшце, ягоны рост, фігура. Лепшага мужа яна сабе і не сніла. Пра гэта і сяброўкі казалі, зайздросцілі ёй. Але вось адно толькі трохі засмучала: ці то з-за сваёй залішняй сур'ёзнасці, ранняй сталасці, ці так з-за чаго, Пётра не любіў розных вясёлых зборышчаў, тлумных пагулянак і не навучыўся нават танцаваць. А ёй, наадварот, пакуль яшчэ маладая і пакуль кіпела кроў, хацелася павесяліцца, калі-нікалі і паскакаць пад добрую музыку, ды так, каб ажно ног не чуць пад сабою, уволю пасмяяцца, нават пасакрэтнічаць на вушка. А што, што тут кепскага?!

Танцуючы са смуглявым лейтэнанцікам, яна яшчэ раз адчула, як усё ж кепска, што Пётра не ўмее. Гэта ж бы не таптаўся на месцы, не падпіраў сцяну, не прыкідваўся б, што яму ўсё роўна. Хай вучыцца, яшчэ самая іхняя пара, пасля ўжо мо і не да танцаў будзе. А зараз... Не стане ж яна, калі Пётра не хоча, ва ўсім прынароўлівацца да яго, хай і сам трошкі цягнецца за ёю. Во гэты ж лейтэнанцік — бач, як хараша выштукоўвае нагамі, якія выробляе выкрутасы! Паглядзець люба-міла...

Чорт, які ў той вечар пасяліўся ў ёй, не даў ёй больш цвяроза глянуць і на сябе, і на Пётру, і на ўсё іншае. Трэці раз запар выходзячы ў круг з лейтэнантам, яна ўжо не прыкмячала, што Пётраў твар пабраўся чырвонымі плямамі, што нядобра пачалі зыркаць на яе і шаптацца пажылыя жанкі, якія седзьма сядзелі на лавах і без якіх не абыходзілася ні адна вечарынка.

Калі ж, пасля хвіліннай паўзы, зайгралі вальс і ўвішны вайсковец зноў накіраваўся да яе, Пётра неўпрыкмет балюча сціснуў ёй руку і прашаптаў: «Болей не пойдзеш». Паслухацца б яго тады, скінуць з сябе гэтае насланнё, астынуць трохі, дык жа не, гонар нейкі дурны так і папёр з яе. Пётру яна нічога не сказала, прытварылася, што не чула, аднак сама падумала: «Го, яшчэ ж не муж, а раскамандаваўся як. А што, калі пажывём трохі?.. Ды і ці добра адмовіць чалавеку? Ты ж во не танцуеш...»

Яна пайшла зноў, хоць такой ахвоты танцаваць ужо не было. Сённяшні чад пачаў памаленьку развейвацца. Прапаў і гуллівы настрой. Вырашыла, што, як скончыцца

вальс, адразу скажа Пётру, і яны пойдуць адсюль, трохі разам пасядзяць у іх хаце ці мо на лаўцы. Хіба ж ён, дурненькі, яшчэ не пераканаўся, што толькі яго аднаго кахае і ніхто на свеце ёй больш не патрэбны?

Круцячыся ў вальсе, яна звыкла кінула погляд туды, дзе стаяў Пётра і... як не абамлела: яго не было на месцы! У нядобрым прадчуванні зашчымела сэрца, ногі страцілі ранейшы спрыт, сталі нейкія чужыя, вялыя. Яшчэ спадзеючыся, што ён на хвілінку куды адвінуўся, яна неўпрыкмет зыркала вачыма па ўсёй хаце, не абмінула нават і сенцаў: мо ён там, з цемнаты, куды выйшаў ахалодацца, назірае за ёю, чакае, калі скончыцца гранне, каб зноў стаць, дзе стаяў раней? Лейтэнант нешта гаварыў, пра нешта пытаўся, але яна ўжо нічога не чула, у галаву цюкала толькі адно: хутчэй бы пабачыць Пётру, быць з ім побач!

Прадчуванне яе не ашукала: Пётра з вечарынкі знік. Знік адзін, не схацеўшы высветліць адносіны, паслухаць яе довады.

У той вечар, як ні горка было на душы, усё ж не думалася, што такі сур'ёзны ў іх разлад. Верыла, што праз дзень-другі ён апамятаецца, прыбяжыць, яшчэ папросіць прабачэння, а яна не адразу яму і даруе, бо хіба ж можна вось так, ні за што ні пра што, на смех усім, усяе вёскі прынізіць яе, уцячы, як уцякаюць ад самай апошняй шлюндры...

Пётра не аказаўся ні праз дзень, ні праз два, ні праз тыдзень. Жыў бы ён у іхняй вёсцы, яна ўбачыла б яго, сама сказала б што. А то ж — за пяць кіламетраў іхнія Навасады. Крыўда, якая штодня большала на яго, спапяляла ўсё нутро, не дазваляла ёй наводзіць якія-небудзь даведкі. Адмахвалася Ліда і ад надакучлівых роспытаў, што ды як, маці і бацькі, сяброўак сваіх.

На той час па вёсцы часта хадзілі цыганкі, з дзецьмі і без дзяцей, набіваліся паваражыць. Цэлы цыганскі табар ужо як не месяц асталяваўся на невялікай палянцы ў іхнім лесе. Не ў прыклад многім знаёмым дзяўчатам, што былі на выданні, яна, Ліда, не любіла варажыць. Не таму, што ніколечкі не верыла, а проста не хацелася загадзя ведаць свой лёс. Так, лічыла яна, цікавей жыць на свеце. Не ведаеш, ну і не ведаеш. Як бы там ні было, а нечага чакаеш, на нешта спадзяешся. Ого, і няведанне часам карысна чалавеку!

Аднак пасля той вечарынкі, што прывяла да разладу з Пётрам, яна не стрымалася.

Пажылая цыганка, якую яна сама запрасіла да сябе, калі якраз нікога не было дома, расклала карты і такога нагаварыла, што Ліду кідала і ў жар, і ў холад. Выходзіла, што яе чакае нейкі вялікі смутак, шмат слёз, пасля будзе і радасць, але не вечная. Дарогу яе ўсцелюць найбольш не ружы, а шыпы ад ружаў...

Карацей кажучы, карта клалася найбольш чорная, і Ліда, з самага пачатку расстроіўшыся, не схацела ўжо больш слухаць цыганку, хутчэй сунула ёй у руку грошы (у яе былі нейкія свае рублі) і спраўадзіла за вароты. Цыганка трохі пакрыўдзілася, на хаду, бурна жэстыкулюючы, лепятала, што ніхто з ёю так яшчэ не абыходзіўся, што яна ж не магла казаць няпраўду, абы толькі некаму дагадзіць.

Калі праз месяц прыйшла чутка, што Пётра Гурко ажаніўся, Ліда, хоць і скамянела ў яе сэрца, адразу нагадала сваю варажбу. Праўду ж, аднак, казала цыганка! I пра смутак, і пра слёзы. Выплакала іх нямала. Мо таму, каб не смяяліся, хай і цішком, з яе людзі, а яшчэ каб і Пётра ведаў, што не вельмі па ім убіваецца, яна таксама, не параіўшыся ні з кім з родных, выскачыла замуж — у мястэчка, за краўца Яшу, які даўно падбіваў да яе кліны.

Яша быў свой, вясковы, але вывучыўся ў Мінску і, пасяліўшыся ў мястэчку, меў там шалёныя грошы. Хату выбудаваў сабе як цацку. I ў хаце не было хіба толькі птушынага малака.

На першым часе думалася: што яшчэ больш трэба для шчасця? На цябе моляцца, табе ногі гатовы цалаваць, у цябе ёсць усё, пра што і марыць другія не могуць. Жыві ды цешся.

Але цешылася яна нядоўга. Не кахаўшы чалавека, яна не магла звыкнуцца ні з яго дабрынёй, абыходлівасцю, ні з ягоным багаццем. Пуста было ў яе на душы, нішто не радавала, не грэла. Як не на каленях прасіла ў Яшы прабачэння і... каб даў згоду развесціся, адпусціў яе дадому...

Ужо як стала вольная, думала, што больш ніколі не мець ёй шчасця. Яно не для яе, яно назаўсёды абышло яе стараной. Сяброўкі вунь, хоць і не хапалі зорак з неба, амаль усе павыходзілі замуж, спраўна вялі гаспадарку, каторыя мелі нават і дзяцей... Эх, Пётра, Пётра, што ж ты нарабіў?.. Няўжо не кахаў, няўжо ўвесь той час, колькі зналіся, хадзілі разам, колькі цалаваліся, хітраваў, пры-

твараўся? Інакш хіба ж можна вось так, ні слова не сказаўшы, не выслухаўшы яе, паляцець у ноч, у невядомасць, пакінуць яе адну на раздарожжы?..

Карала яна сябе строга за легкадумнасць на вечарынцы ў Агрыпіны, яшчэ болей за такое скараспелае сваё замужжа, але найперш дакарала Пётру. Бо толькі ён, ён адзін вінаваты, што ёй зараз так кепска, так няўтульна на свеце...

Як пражыла яна два гады, лепей і не ўспамінаць. Не жыццё было, а нейкі пачварны сон. Схамянулася трохі, калі дайшлі звесткі, што і ў Пётры не ладзіцца ў сям'і. Жонка яго нарадзіла нежывое дзіця, пасля, ці з-за гэтага, ці так з-за чаго, пачаліся скандалы, розныя іншыя згрызоты.

Казалі, што Пётра схуднеў, стаў раздражнёны, нават тады-сяды бачылі і пад добрай чаркай. «Вось так табе і трэба, не мне адной мучыцца, ёсць жа нейкая справядлівасць»,— хацелася напачатку крычаць на ўвесь свет белы. Але хутка яна пасарамацілa сама сябе, бо зразумела, што ніколечкі не вытравілася з душы каханне да Пётры. І што б там ні было, яна не перастане кахаць, няхай сабе і моўчкі, безнадзейна. Не, кволая надзея ўсё ж цеплілася, хоць не хацелася ў гэтым прызнавацца.

Ліда па-сапраўднаму ўжо захвалявалася, калі стала вядома, што і Пётра парваў са сваёю жонкай. Затаіўшыся, яна чакала. Нейкая інтуіцыя падказвала: і ён не выпускае яе з поля зроку, выбірае толькі зручны момант, каб прыйсці, пакаяцца. Аднак ой як нялёгка зрабіць гэты першы крок насустрач адно аднаму пасля ўсяго, што натварылі самі.

Яны сустрэліся не ў самы лепшы час і зусім выпадкова.

З самае раніцы яе паслалі ў мястэчка, каб купіла штокольвечы з харчу: дома не было чаго есці, акрамя хлеба, выйшлі і крупы, алей. Ліда — мо таму, што было вельмі холадна і мокра, а ў вёсцы яшчэ і гразь па саменькую шчыкалатку — апранулася ва ўсё будняе, даволі ўжо зашмальцаванае, на ногі ўззула, бо не цяклі, бацькавы вялізазныя ялавыя боты. Пасмяялася сама з сябе, бо ведала, якая яна пацешная ў гэткай апратцы. Але хай. Хто будзе ўглядацца ў яе ў такое нэндзнае надвор'е? А па вуліцы яна не пойдзе — можна і загуменнем.

Набраўшы што трэба, наладаваўшы ледзь не поўную карзіну-пляцёнку, яна скіравала да невялікай прыземістай

крамкі, дзе таўсматы вясёлы яўрэй заўсёды прадаваў камсу. Маці не казала ёй пра камсу, але нясцерпна захацелася хоць трошкі чаго салёнага.

У крамцы, ля прылаўка, спіною да яе стаяў нейкі мужчына ў балахоне з капюшонам на галаве. З крысся балахона на дашчаную падлогу часта капала вада. Чалавек, толькі ляпнула клямка і адчыніліся дзверы, павярнуў голаў.

Ліда мелькам глянула на яго і як не самлела. Думаючы, што яе не пазналі, яна выскачыла на вуліцу, хапіла ротам волкага паветра. Ліхаманкава шукала вачыма, куды б хутчэй шмыгнуць, за які вугал схавацца. Але не паспела. Пётра — ён, ён стаяў ля прылаўка! — выйшаў услед і дрыготкім голасам аклікнуў яе...

З гэтага спаткання, якое ставіла крыж на ўсім іхнім мінулым, такім часам недарэчным, блытаным, няпэўным, пачалася новая паласа яе і яго жыцця. Высветліўшы ўсё, даўшы адно аднаму ўволю выгаварыцца, яны пакляліся ніколі не сыпаць солі на раны, не ўпікаць ні ў чым адно аднаго, бо шчасця, сумеснага шчасця ніяк не пабудуеш, калі не будзе суладдзя і ў вялікім, і ў малым.

Клятвы сваёй яны не парушылі. Пачаўшы жыць разам — вяселля ўжо не схацелі спраўляць,— яны былі як бы адно цэлае. Гэта і давала ім сілы, цярпення выстаяць у многіх бедах, якія не пераставалі даймаць іх. Спачатку памерла Лідзіна маці, пасля, праз паўгода, бацька. Не ачомаліся ад жалобы, новая жахлівая навала абрынулася на іх галовы.

У летнюю сухмень — за два месяцы не выпала ні адной дажджынкі — невядома з-за чаго загарэўся хлеў, а ад яго, як ні ратавалі, колькі вёдзер вады ні лілі, узяўся і дранкавы дах хаты.

Пакуль прыехалі на конях пажарнікі з мястэчка, на месцы былога котлішча дыміліся адны галавешкі. Такі-сякі набытак людзі выхапілі з хаты, збераглі ад пражорлівага полымя. Але гэта мала цешыла. Яна, Ліда, хадзіла ўжо апошнія дні, вось-вось павінна была нарадзіць. Куды ж, куды яны цяпер пададуцца, хто прытуліць, ды яшчэ з грудным дзіцем? А есці што? Карова-то засталася, дзякуй Богу, у полі якраз пасвілася, а кабанчыка ў хляве ніхто не выратаваў, не паспеў вывалачы ў агарод.

Яна гатова была рваць на сабе валасы, але Пётра як мог суцяшаў, паказваў свае рукі, абяцаў, што гэтымі рукамі ён горы зверне, возьме любы цяжар на сябе, хай

толькі яна не перажывае. Пакуль яны маладыя і сілы ёсць, яшчэ абжывуцца.

І праўда: агаралі, усё агаралі за некалькі гадоў. І хату гэтую, на зайздрасць многім вяскоўцам, пабудавалі, і пчолак развялі дзесяць калодак, і ўборы такія-сякія справілі, і дзетак во ажно пяцёра займелі. Перад самай ужо вайной Колю новенькія лыжы купілі, бо гэтак жа прасіў хлопец не самаробныя, з дошкі, а купленыя лыжы. Мецілі яшчэ, калі добры год удасца і выкачаюць ладнавата мёду, прыдбаць веласіпед. Гэта ўжо была мара і самога Пётры. Надта хацелася яму хоць трошкі што і для сябе дазволіць, бо ўсе гады, колькі жылі, адно дзіркі нейкія затыкалі. А іх набіралася уга колькі! Але ж нічога, бачыўся ўжо і прасвет. І каб не вайна...

Усё, усё зрушылася, пайшло прахам: набытак, мары, само жыццё. Яна разумела, што яе бяда — гэта маленькая часцінка велізарнай бяды, якая абрынулася на ўсіх, на ўсю яе зямлю, на цэлую краіну. Аднак лягчэй ад гэтага не было. Свой боль, што б там ні казалі, найперш чуваць, хоць балела сэрца ды раней часу сівела галава і ад агульнага людскага гора.

Пётра толькі па няшчасці застаўся дома, не ваяваў. У першыя ж дні, як абвясцілі мабілізацыю, ён, развітаўшыся, таксама падаўся на зборны пункт, адкуль іх, мужчын, хлопцаў, таварняком павезлі недзе на захад, насустрач ворагам.

Але ўжо на трэція суткі Пётра як не прыпоўз дахаты ўвесь учарнелы, змардаваны, са знявечанай левай рукой, з напалову адарваным бомбавым асколкам вухам. Усё было заматана нейкімі бруднымі анучкамі, закарэла ад крыві і гною, і яна, Ліда, калі адмочвала тыя «бінты», прамывала раны, мазала ёдам, прыкладвала лісце трыпутніку, думала, што не перажыве гэткага жаху.

Пётра, трохі ачуняўшы, расказаў, як іхні таварняк, не паспелі і ад'ехацца, ушчэнт разбамбілі нямецкія самалёты. Пасля тых, хто ацалеў, seклі з вышыні кулямётным агнём. Мала каму ўдалося дабегчы да лесу, выратавацца.

Яна дзякавала Богу, што ён жывы, а Пётра, наадварот, усё бедаваў па забітых, уздыхаў, што так зарана адваяваўся, стаў нікому непатрэбны...

Быў жа, аднак, быў ён патрэбны!

Спачатку і яна нават не ведала, чаго ён зачасціў адзін у лес — то венік нібыта трэба новы звязаць, то на падпал смалякоў расстарацца, то яшчэ што-небудзь. Пасля пача-

ла здагадвацца, а калі ўжо зусім пераканалася, якая нагода вяла яго на бязлюдныя лясныя сцежкі, то заплакала, як не плакала даўно. Найперш ад крыўды, што ён, самы родны для яе чалавек, не давяраў ёй, быццам яна магла выдаць ці прагаварыцца каму. Плакала і ад страху за яго жыццё, бо ведала, кожны ж дзень прыходзілі весткі, як лютуюць фашысты і іхнія паслугачы, як расправляюцца з тымі, хто не пакорыцца ім. А тут яшчэ горай — знаецца з партызанамі, даносіць ім, што робіцца ў мястэчку і ў бліжніх ад яго вёсках, чым узброены немцы, колькі іх саміх. Божачка, гэта ж узваліў на сябе такую ношу!

Яна, калі Пётра ішоў у лес на чарговае спатканне з партызанамі, станавілася на калені перад іконай і малілася Богу, каб ён паспагадаў ім, каб усё абышлося добра, каб муж жывы-здаровы вярнуўся назад.

Не, не пачуў Бог яе малітваў, не пачуў...

## 6

Здаецца, ніколі не шчыравала гэтак сонца.

Прачнуўшыся, Вадзім спачатку ажно зажмурыўся. Сонца падкралася да кушэткі, дзе ён ляжаў, унізе на сцяне акрэсліла рамкі вокнаў, а на стале, бліжэй да грубкі, застыла круглай, нібы донца бутэлькі, залаціста-ружовай плямкай.

Вадзіму няўцерп карцела чамусьці залезці на печ, каб адтуль ужо дацягнуцца рукою і памацаць гэтае дзіва.

Ён адкінуў коўдру, спусціў босыя ногі долу, падняўся. Толькі цяпер адчуў, як закружылася галава. Але класціся зноў у пасцель не хацелася. Трымаючыся за табурэтку, пасля за сцяну, ён прайшоў колькі крокаў, спыніўся, пачакаў, пакуль паяснее ў галаве і перастане тахкаць сэрца. Нагам было трохі халаднавата на голай падлозе. Але невядомая радасць поўніла яго ўсяго, і не хацелася зважаць ні на строгі матчын наказ не падымацца самому з пасцелі, ні на што другое.

Ля цёплай, яшчэ зранку напаленай грубкі валяліся Верчыны старыя атопкі. Прытрымліваючыся адной рукой за шурпатую цэглу — грубка не ўсюды пакуль была абмазана глінай і не пабелена,— ён усунуў ногі ў атопкі і адразу адчуў, як стала цёпла і добра. І тут жа спахапіўся: а дзе ж усе? Няўжо нікога няма? Як гэта ён адразу не заўважыў, што і Лёвы, і Славіка няма ў хаце?

— Гэ-э-э! — нямоцна паклікаў Вадзім.

Але з кухні ніхто не азваўся. Забыўшыся, чаго падняўся і што хацеў рабіць, Вадзім пашлэпаў у атопках да акна. Калі быў ужо на сярэдзіне хаты, сам здзівіўся: дык ён жа ні за што не трымаецца! І галава болей не кружыцца. Радасць, якая дагэтуль ціхенька цеплілася ў ягонай душы, зараз ажно выплёхвалася наверх, крычала на ўвесь свет белы.

Праз незамерзлую шыбку Вадзім выглянуў на вуліцу і вачам сваім не паверыў: гэтулькі было снегу! Яшчэ ні аднае зімы не намятала вышэйшых гурбаў. Ад захаплення хацелася скакаць, але ён тут жа стрымаў сябе: няможна. Пакуль што няможна. Але хутка, хутка ўжо і яму дазволяць бегаць, гуляць у хаце, а то і выйсці на двор, палазіць па гэтых гурбах. Можа, нават і пакатацца на лыжах. Эх, мець бы і яму такія лыжы, як у Колі! А то што на тых яго самаробных? Хіба з гурбы на іх з'едзеш? Адразу зарыюцца ў снег. Паляціш, бы падкошаны, і носам таксама зарыешся. Праўда, каб сёння яму дазволілі, ён пабег бы і на самаробных. Гурбы магнітам цягнулі да сябе, вабілі сваёй белізной, пульхнасцю, дзівоснасцю формаў. Як і намяло такія! І калі? Сёння ж вунь сонца сляпіць і на небе ані хмурынкі. Хіба мо ўчора ці сёння ноччу... Але ж ніхто нічога не казаў. Ці мо ён так моцна спаў і не чуў? Не чуў жа во, калі ўсе з хаты разбрыліся. Ну, маці, вядома, робіць што ў хляве, Верка і Коля, пэўна, дровы пілуюць ці рэжуць у каго сечку карове. А дзе ж Лёва і Славік?

Прыплюснуўшы нос да халаднаватага шкла, ён прагна глядзеў на вуліцу, лавіў кожны шолах. Чуваць было, як рыпеў калаўрот студні, там, ля Тэклінай хаты, бразгалі вёдры. Прамільгнулі, пакідаючы ў няўтоптаным добра яшчэ снезе дзве роўныя гладкія канаўкі ад палазоў, нечыя сані, запрэжаныя маладым шустрым конікам. Чый жа гэта конік? Ён, Вадзім, ведаў усіх іхніх коней, а гэты быў чыйсьці незнаёмы. Пэўна, з іншай якой вёскі. Ды і дзядзьку, акрытага рабой суконнай посцілкай, ён не пазнаў.

На вуліцу, нешта жуючы і на хаду падпяразваючыся, выйшаў Міця. На нагах у яго вялікія, у буцах, валёнкі, на галаве — старая выцвілая шапка з вушамі, завязанымі пад падбароддзем на матузкі. Куды гэта ён выбраўся?

Вадзім не вытрываў, пастукаў у шыбку. Але Міця, відаць, не пачуў, ступіў на след ад палаза і скіраваў у бок студні. Шкода, што не завітаў да яго. Вадзіму як ніколі дагэтуль зажадалася пабачыць сябра. Сёння, адчуўшы

сябе лепей, амаль зусім ужо здаровым, ён адчуў і прагу нешта рабіць, некуды таксама ісці, толькі б не сядзець у хаце. Ды каб жа сядзець! Гэта ж з восені і не падымаўся з пасцелі, адлежаў усе бакі...

У сенцах грукнулі дзверы, і пачулася хмыканне Славіка. І матчын голас:

— Годзе, годзе ўжо! Як цюцькі памерзлі. Марш хутчэй на печ! І каб як мышы сядзелі. Чуеце? А то пабудзіце мне...

Маці пусціла хлопцаў у кухню, сама ж — Вадзім згледзеў праз другое, бліжэйшае да ганка акно — падалася да хлява. Што яна там робіць? Можа, малоцяць ячмень? Але ж не чуваць, каб стукалі цэпам.

Лёва і Славік сапраўды ў кухні сцішыліся, толькі саплі насамі і шабуршэлі адзеннем, якое з цяжкасцю сцягвалі з сябе.

Нейкая нязнаная дасюль пяшчота да меншых братоў абудзілася ў Вадзімавым сэрцы. Хацелася з імі пагалёкаць, падурэць, а то і згуляць у хованкі. Ён успомніў пра сонечны кружочак на столі, глянуў туды і сумеўся: яго ўжо не было! Куды ж ён падзеўся? Вось бы Лёву і Славіку паказаць!

— Гэ-э-э! — зноў клікнуў Вадзім.

Малыя стаіліся, бы іх на кухні і не было зусім. Пасля пачуўся гарачы шэпт, шлёпанне голых пятак. Дзверы ў залу асцярожна рыпнулі, крыху прачыніліся. Славік, высунуўшы амаль нагала стрыжаную нажніцамі галаву, зіркнуў на кушэтку, разгубіўся, пасля, убачыўшы Вадзіма ля акна, з гіканнем кінуўся да яго. Радасць ажно свяцілася на ягоным неяк надта ж выцягнутым, схуднелым тварыку. Вадзім таксама не стрымаўся, прыхінуў брацікa да сябе, акурат сто гадоў яны не бачыліся. Бачыліся, вядома. Але ўсе тыя дні, калі ён хварэў, ляжаў у пасцелі, калі балела, пякло ўсё ўсярэдзіне, чамусьці было ні да кога. Адно спаў бы ды спаў...

Падышоў, сарамліва ўсміхаючыся, і Лёва. Гэты — ведаў Вадзім — маўчун маўчуном. Слова з яго лішняга не выціснеш. Затое Славік, які толькі нядаўна навучыўся трохі гаварыць, не каверкаць да непазнавальнасці словы, не аціхаў ні на хвілінку:

— Вадзім, табе носкі ўзо не баляць, не-а? І луцкі не баляць? А ты будзес лязаць, не-е-а? А ў нас капуста смацная са сквалкамі. А ты дасі мне сквалку?

Лёва спадцішка штурхнуў Славіка ў спіну, той хіснуўся і ледзьве не ўпаў.

— Цаго б'ецся? — хацеў ужо захныкаць Славік ды, няўзнак глянуўшы на вуліцу, заскакаў па хаце:

— Паласка! Паласка!

Ён раптам зрабіў жахлівую міну, пакутліва зморшчыў тварык, надзьмуў горкай жывот і, кінуўшыся на падлогу, пачаў, бы мячык, качацца, з хрыпам выдыхаючы:

— О-о-ох, во-о-ох!

Вадзім напачатку нічога не зразумеў, нават напалохаўся. Лёва таксама, разявіўшы рот, няўцямна глядзеў на меншага брата, не ведаючы, што яму рабіць.

Паўз вокны ў двары мільганула чыясь постаць. Аднаго кароткага позірку Вадзіму хапіла, каб пазнаць, хто да іх ідзе. Цяпер стала зразумелым і штукарства малога «артыста». Вадзім ад смеху і сам хапіўся за жывот, але адчуў, як ранейшая млоснасць спакваля падкрадваецца да яго, як цяжэе ўсё цела. Зняўшы атопкі, ён лёг у пасцель, акрыўся коўдрай.

У сенцах ужо грукалі, абівалі з ног снег, пасля доўга ўпоцемку лэпалі рукамі па дзвярах, шукаючы клямку. Аднак яна, відаць, ніяк не знаходзілася, бо адтуль, з сенцаў, чулася нездаволенае сапенне ўперамешку з буркілівым хрыплым мармытаннем. Славік усхапіўся з падлогі і таксама шмыгнуў пад коўдру да Вадзіма, апёкшы яго як не ледзянымі пяткамі.

Дзверы ў кухню, нарэшце, шырока расчыніліся, і адразу ж у кут паляцела нешта грузнае, ці не торба, а то і напакаваны чымсьці мяшок.

— Го, чэрці, павыміралі вы, ці так якая напала трасца? — голас у Параскі грубы, зычны, ажно ўвушшу дзярэ.

Хлопцы маўчалі, не ведалі, як ім быць: азвацца ці не? Параскі яны не баяліся, не, але ж яе выгляд і гэты надта грубы голас нехаця прымушалі сцяцца, на першым часе куды зашыцца, пакуль зноў не звыкнуцца з яе прысутнасцю ў хаце.

Параска не стала доўга чакаць: цяжкімі, аж масніцы застагналі, крокамі пакіравалася да іх, у залу. Убачыўшы адных хлопцаў, якія збіліся ў кучу ля кушэткі, яна папытала:

— А матка дзе? Ну, чаго вылупіліся, бы век не бачылі? Дзе матка, пытаюся?

З-пад коўдры высунуў галаву Славік, памкнуўся быў нешта сказаць, аднак ці не знайшоў патрэбных слоў, ці, можа, пасаромеўся, бо зноў ажно з галавой зашыўся пад

коўдру. Давялося, не спадзеючыся на маўчуна Лёву, адказваць Вадзіму:

— У хляве, цёця Параска. І Верка, і Коля тамака.

— А Коля на лызах на лог паехаў, от,— цяпер ужо не стрываў, піскнуў з-пад коўдры Славік.

Параска, уталопіўшыся ў Вадзіма, успляснула рукамі:

— А ты ж, хлопча, чаго гэткі змэнчаны? Ці не далягае чаго, што ў пасцелі валяешся?

Вадзім не паспеў адказаць: у кухню нехта зайшоў, пляхнуў на падлогу ля печы бярэма дроў.

— Ты, дзеўка? — зычна аклікнула Параска.

Маці, заінелая з вуліцы, заглянула ў залу, памкнулася насустрач Парасцы.

— Мая ж ты Парасачка! — матчыны вочы заззялі радасцю.— Як жа добра, што ты прыйшла! А дзе ж так доўга бадзялася? Нябось, пра нас ужо і забылася.

Яны пацалаваліся. Параска, здаволеная прыёмам, пачала развязваць на сабе розныя матузкі, каб зняць верхнюю апратку, бо ад цяпла і так чырвоныя яе шчокі яшчэ больш запунсавелі, наліліся крывёю.

— Ну як, дзеўка, вы тут гаруеце? — Параска абвяла вачыма хату, ужо распранутая, цяжка апусцілася на табурэтку, якую маці прынесла з кухні.

— Праўду, Парасачка, кажаш: не жывём, а гаруем. Колькі ж гэта ты ў нас не была? Ага, з восені. А цяпер і зіма ўжо апошні дух выпускае. Што ж прынясе вясна?..

Маці, адчувалася па ўсім, найперш прагла пачуць ад Парасі якія навіны: ведама, кабета ходзіць па свеце, корміцца ў розных людзей, а людзі, не тое што яны тут, усё, пэўна, ведаюць. Аднак Параска, зіркнуўшы на дзяцей, найперш на Вадзіма, не стала нічога казаць, толькі спытала:

— Ну, а рабіць жа што будзе?

Маці абрадавалася:

— Чаго-чаго, а работы той хоць захлыніся. Жыў бы Пётра...— яна нечакана ўсхліпнула, але тут жа, змахнуўшы даланёю слёзы, сказала: — Сёння адпачні, пагрэйся, пасушыся, а заўтра, калі каня дзе вазьму, мо і ў лес з'ездзім. Гэта ж дроў амаль нямашака. Сухастоіну б якую агараць. Коля і Верка падсобяць. Снег вось толькі глыбокі...

— А гэты ж чаго? — Параска зноў зіркнула на Вадзіма.— Валяецца ўдзень. Зблажэў...

— Ой, маўчы ты, Парасачка,— маці зноў выцерла

вочы.— Кажуць жа — адна бяда не ходзіць, бяда бяду водзіць... Але ж ужо нічога. Самае горшае мінула. Праўда, сынок?

Яна падрабязна пачала расказваць Парасцы, што надарылася ў той дзень, як палілі Баркуны, як на валасок ад смерці быў і ён, Вадзім. Параска слухала, божкала разам з маці, і пад гэтую іх гаворку Вадзім непрыкметна соладка заснуў. Не чуў нават, як і калі вылузаўся з-пад коўдры Славік, калі прыйшлі Верка і Коля.

Аднак спаць яму доўга не далі — збіраліся абедаць, і маці прынесла лусту і поўную місу пахкай, са здорам, капусты. Паставіла ўсё на табурэтку ля кушэткі, пагладзіла па галаве, пяшчотна сказала:

— Еш, сынок. Смачненькая сёння капуста. Чысценька толькі з'еш. Адразу падужэеш.

Яна зноў падалася на кухню, прычыніла за сабою дзверы, гуд галасоў і бразганне лыжак трохі прыглухлі. Але Вадзіму ўсё роўна чуваць было, як шчыравалі над міскаю малыя, сварыліся — нешта, відаць, не падзялілі, пэўна, скварачку,— як здаволена сёрбала і гучна пасопвала носам Параска, а Верка і Коля, саромеючыся чужога чалавека, гэты раз абедалі ціха, спаважна, як і належыць дарослым, хоць Вадзім ведаў, якія конікі іншы раз выкідвалі за сталом і яны.

Маці ж таксама не чутно: яна амаль заўсёды ела моўчкі, на нагах, больш пры печы, ёй ніколі не ставала часу прысесці разам з усімі, бо трэба ж сачыць і за парадкам, і каб у час кожнаму даліць, дадаць, калі ёсць што, і не абдзяліць нікога.

Вадзім, надзіва, адчуў, як пах стравы прыемна заказытаў у носе, а ў роце, чаго ўжо даўно не было, з'явіліся слінкі. Капуста апякла, давялося нецярпліва хукаць у лыжку. Але паступова і ён, не прыкмячаючы нават свайго старання, спаражніў місу да дна, дажаваў скарыначку хлеба. Астатнія таксама, відаць, скончылі абедаць, бо Лёва і Славік ужо шабуршэлі на печы, маці ж нешта гаварыла Парасцы, бы апраўдвалася. Да Вадзіма даляцелі яе словы:

— Ужо ж неяк патрываем. А там наварым клёцак. Малачко ж якраз ёсць, дзякаваць Богу. Ацялілася наша Лыска, добранькі бычочак ужо бегае. Нейкая будзе падмога...

Вадзіму захацелася падняцца, хоць на хвілінку выйсці на двор, паглядзець таго бычка, пагладзіць яму пыску.

Пасля яды ён і праўда адчуў сябе бадзёра, ляжаць у пасцелі больш ані не хацелася.

— Мам, а ма-а-ам! — Вадзімаў голас пагрубеў, падужэў, гэта ён і сам заўважыў.

Маці, выціраючы аб фартух рукі, хуценька ўбегла ў залу. Убачыўшы, што ўсё чыста спарожнена, яна не магла стрымаць радасці:

— Ну во, сынок, які ты ў нас малайчына. А вечарам клёцак наварым. Даўно ўжо не елі. Параска зажадала...

Вадзім, не слухаючы яе пахвалы, папрасіў:

— Бычка хачу паглядзець. Ма-а-ам, можна?

Маці, відаць было, не чакала такой просьбы і нібы абрадавалася таму, аднак і слухаць не схацела, каб пусціць яго на двор. Вадзім, праўда, і сам мала на гэта спадзяваўся. От, на ўсякі выпадак рашыў папрасіцца. Але, адчуўшы, што маці трохі завагалася, з яшчэ большым стараннем пачаў клянчыць:

— Ну, ма-а-ам! Я ж здаровы ўжо... Бычка толькі пабачу.

Параска, якая ў гэты час заглянула ў залу, умяшалася ў іхнюю гаворку, нечакана падтрымала Вадзіма.

— Чаго ты марынуеш хлопца ў хаце? — без усякай дыпламатыі накінулася яна на Ліду.— Хай трохі прачхаецца, здаравейшы будзе. А то закіс тут саўсім.

Гэта падзейнічала.

І вось, апрануўшы, нацягнуўшы на сябе ўсё, што было ў хаце цяплейшага, Вадзім разам з Колем — маці загадала Колю, каб не кідаў брата аднаго — выйшаў на двор. Халоднае сухое паветра напачатку апякло лёгкія, Вадзім як не задыхнуўся, ажно слёзы сыпанулі з вачэй. Але з кожнай мінутай ён адчуваў, як нейкая свежая, гаючая сіла ўліваецца ў кожную жылку, напаўняе сэрца даўно не знанай радасцю.

Двара было не пазнаць. Плот амаль што даверху схаваўся ў гурбах. На слупках, на страсе хлява, усюдыўсюды ляжалі белыя пульхныя шапкі. Пад сонцам ажно рэзала ўваччу ад снежных бліскавак, і нялёгка было прызвычаіцца адразу да гэтага ззяння. Вадзім зажмурыўся, пастаяў колькі хвілін, пасля, зняўшы рукавіцу, пацёр пальцамі вочы. Стала трохі лягчэй глядзець.

Коля ж нібы не заўважаў нічога навокал, быў нейкі паніклы, разгублены. Пакінуўшы Вадзіма аднаго пасярод двара, не сказаўшы ні слова, ён падаўся пад паветку. Вадзім памаленьку — ногі яшчэ не вельмі слухаліся, былі

каляныя — дакандыбаў да хлява, адчыніў рыпучыя дзверы, трымаючыся за шула, пераступіў праз дошку, якую тырчма клалі на зямлю, каб знізу не мяло ўсярэдзіну. У нос тхнула сенам, цёплым каровіным духам. Лыска, высунуўшы галаву скрозь жэрдкі, вялікім пукатым вокам глянула на яго, як усё роўна пазнавала і не пазнавала.

— Лыска, Лыска,— пачухаў Вадзім карову між рагоў, і тая ад задавальнення ажно заматляла хвастом.

У невялікім катуху, што быў побач з загарадкай, дзе стаяла карова, Вадзім згледзеў цялё. Пярэсценькае, з белай плямкай-зорачкай на лбе. Ну, акурат як у Лыскі. Скурчыўшыся, яно ляжала на свежай саламянай падсцілцы, драмала.

Вадзім не схацеў пароць бычка, падумаў, што няхай лепей паляжыць. Яшчэ нагледзіцца, будзе на гэта часу колькі хочаш.

Зноў шчыльна прычыніўшы дзверы, каб не выстудзіць у хляве, ён патаптаў трохі на месцы снег, пацікаваў за чародкай вераб'ёў, якія ў агародзе, пад яблыняй, узняўшы снежны пыл, гаманліва валтузіліся, пэўна, не маглі падзяліць нейкі ласунак.

Рабіць не было што, і Вадзім рашыў датэпаць яшчэ і заглянуць пад паветку, куды вялі Колевы сляды. Цікава, чаго ён там так доўга калупаецца?

Старэйшага брата ён заспеў ля дубовай калоды, на якой секлі дровы. Паклаўшы на калоду лыжыну, Коля схіліўся над ёй, нешта заклапочана разглядаў. Вадзіма ён не прыкмеціў, а калі той незнарок кашлянуў, спалохана страпянуўся і адхіснуўся назад. Вадзім здагадаўся: нешта, пэўна, здарылася з лыжамі.

— Чаго табе тут? — груба стрэў ён Вадзіма.— Быў бы ля ганка...

— Ну, Ко-оля...— Вадзім не ведаў, як апраўдацца за сваё нечаканае з'яўленне, як дагадзіць брату.— Я не скажу, вот пабачыш... Лыжу зламаў, га?

Коля апёк яго калючым позіркам, пасля ўсё ж палагаднеў, размяк, ледзь не з плачам прызнаўся:

— Халерны той абрыў... Я-я-як панесла! Аж у рэчку. А там...

Ён не дагаварыў, бо ля хлява пачулася гамонка маці і Параскі. Коля схапіў лыжыну, хуценька схаваў яе між старых жэрдак, што былі прыслонены да сцяны, атрэпаўся і выйшаў з-пад паветкі.

— Толькі каб ні гу-гу...— на хаду прыклаў ён да ро-

та палец.— Глядзі ж... А я пасля склею ці бляшкай як змацую.

За лыжыну, ведаў Вадзім, ад маці дасталося б. Яна не раз, быццам адчуваючы што, папярэджвала Колю, каб не ехаў на злом галавы на той лог. Вунь знайшоўся ўжо адзін смяльчак, Васька Мачульскі, што з-за рова. Тыдзень таму і нагу тамака зламаў, не кажучы пра лыжы. А ёй і з адным вісусам хапіла гора пад саменькую завязку...

Цэлы вечар, пакуль усе церліся на кухні, пакуль маці, Верка і Параска абіралі картоплю, пасля дралі яе на тарцы, Вадзіма не пакідала адчуванне, быццам не Коля, а ён зламаў лыжы і зараз па яго твары ўсе здагадаюцца пра тое. Добра, што кнот у лямпе — газы было ледзь-ледзь, на саменькім донцы — гарэў блякла, ды і з печы Вадзім не вельмі стараўся вытыркацца на святлейшае. А то ж пэўна здагадаліся б.

Аднак дарослым, бачна, было зараз не да яго. Маці, праўда, спытала, ці добра яму на печы, можа, лёг бы, пакуль тая вячэра, у зале ў сваю пасцель. Вадзім адмовіўся, сказаў, што на печы яму цяплей і лацвей, і яна пасля нібы і забылася на яго.

А праз якое паўгадзіны ён ужо і саўсім выкінуў з галавы думку пра зламаную лыжу. Коля вінаваты, то хай сам і выкручваецца. А яму што? Доўга, праўда, пякла толькі крыўда, што так ні разачку і не давялося пракаціцца на купленых лыжах...

## 7

Даўно ўжо не было такіх вечароў. Маці, нейкая сёння надта лагодная, не цыкала, не крычала, калі меншыя, Славік, а за ім і Лёва, пачалі звягаць, раней часу прасіць есці, нават змоўчала, калі яны, не падзяліўшы нешта, з енкам счапіліся ля грубкі, учынілі бойку. Сёння яна ні ў што не ўмешвалася, была расслабленая, зусім непазнавальная. Раскочваючы ў далонях бульбяныя шарыкі, яна не спускала вачэй з Парaскі, старалася не прапусціць ніводнага яе слоўца.

Верка таксама ажно вушы развесіла. Звычайна, як толькі цямнела і рабіць ужо не было чаго, яна старалася хоць на гадзіну-другую ўцячы з хаты, туды, дзе збіраліся, гулялі ў фанты хлопцы і дзяўчаты. Коля саромеўся яшчэ паяўляцца на гэтых гулянках, але і ён амаль штовечар адвінаўся — у яго быў свой хаўрус.

Сёння Коля знік, нават не наласіўшы да канца вады ў кадку, якая стаяла пад лавай, пры печы. Маці напачатку трохі пабурчала, але злосці ў яе хапіла ненадоўга. Ведала, што на вячэру з'явіцца, дзе дзенецца, тады яна і скажа яму, каб раз і назаўсёды помніў пра свае абавязкі.

Вячэра ж чакалася мо як ніколі багатая. Бульбяных шарыкаў-клёцак высілася на стале ўжо вялізная горка, а яны ўтраіх усё качалі і качалі новыя, бо заставалася яшчэ дранай бульбы, і трэба было неяк даць ёй рады. Верка была заікнулася, што мо пакінуць на заўтра на аладкі, але Параска гэтак зіркнула на яе, што тая адразу прыкусіла язык, больш не высоўвалася. Маці, хоць у душы, бачна было, пагаджалася з дачкой, усё ж каб, крый Божа, не паказацца перад Параскай якой скнарай, памяркоўна сказала:

— Ат, даробім ужо да канца. З'ямо, і яшчэ як з'ямо. А заўтра, дасць Бог, нешта будзе...

Параска яе горача падтрымала:

— Зварыцца, дык і клёцак тых па лыжцы ўсім...

«Нічога сабе па лыжцы! — зноў падзівіўся Вадзім.— Тут і ў свіны чыгун не ўлезе».

І праўда ж: спатрэбіўся чыгун, у якім заўсёды варылі бульбу скаціне. Маці, папярэдне вышараваўшы яго ўсярэдзіне анучкай, паставіла з вадой у грубку, на саменькі жар. Ледзьве ў дзверцы прасунула. Солі кінула ў варыва ледзь-ледзь, і ўсё роўна, як ні ашчаджала, яе засталося ў палатнянай торбачцы на некалькі разоў. Аднак у клёцкі яна адмерала болей, чым у якую другую страву.

Параска ажно цвіла. Цяпер, ужо нічога не робячы, яна грузна ўселася на табурэтцы каля расчыненай грубкі, зняла атопкі — маці ёй давала пераабуцца,— пачала гладзіць тоўстыя, як бёрны, пэўна, апухлыя лыткі, ступакі. Здаволена пакрэктваючы, яна з яшчэ большай ахвотай апавядала пра сваё жыццё, пра тое, дзе і ў каго была ўсе гэтыя месяцы, што рабіла, чым кармілі, што чутно на свеце.

Вадзім ужо ведаў, яшчэ раней, калі Параска першы раз прыходзіла да іх, што яна знекуль здалёку, ажно з-пад Смаленска, што вайна мо як ні на кога абрынулася на яе бядой: усіх-усіх яе родных — і двух хлопчыкаў, адзін ужо бегаў у першы клас, і старую матку, і мужа-калеку — ноччу, на трэці дзень гэтае навалы, накрыла ў хаце нямецкая бомба. Налёт быў на аэрадром, які размяшчаўся побач, але не меней дасталося і пасёлку. Сама ж яна

цудам засталася жывая, бо якраз па патрэбе выскачыла ў тую душную ноч у агарод...

Параска старалася не гаварыць пра ўсё, што давялося перажыць ёй пасля. Ды і не вельмі лезлі з роспытамі жанкі, бо ведалі, па сабе часта ведалі, як гэта нялёгка, калі хто вярэдзіць незагойную рану...

Вада ў чыгуне тым часам закіпела, і маці, віламі выняўшы яго з грубкі, паставіла на падлогу, пасля прынесла з кухні на абрусе клёцкі, пачала па адной, па дзве кідаць у вар. Скончыўшы, яна паставіла чыгун на вуголле, прыкрыла накрыўкай.

— Мо яшчэ падкласці якое палена? — спытала Параска, зноў заняўшы месца ля грубкі.

Маці, цяпер ужо чапялой, паварушыла галавешкі. Сказала не то сабе, не то Парасцы, быццам і не чула яе слоў:

— Добра напалілі. Жару — уга!.. Хутка зварыцца.

Садзіліся за стол, калі прыйшоў Коля. Клёцкі былі ўжо гатовыя, дыміліся над чыгуном густой парай. Маці забяліла ўсё адразу, інакш не хапіла б малака. Параска запатрабавала для сябе місу, у якую звычайна ссыпалі звараную на ўсю сям'ю картоплю, і маці наліла ў яе ажно па саменькі краёк.

— Еш, Парасачка, наядайся,— яна выняла з пячуркі і падала ёй новую драўляную лыжку, якую выстругаў яшчэ муж Пётра.— Заўтра ж мо і ў лес выберамся. Каня б толькі...

Параска ні з таго ні з сяго гучна зарагатала:

— Го, дзеўка, кармі мяне такімі клёцкамі, дык я табе і на плячах не адзін воз тых дроў перацягаю.

Сёрбалі дружна ўсе, не толькі Параска. Нават Вадзім гэты раз сеў за стол разам з астатнімі. Клёцак ён даўно не еў і цяпер старанна сёрбаў лыжкай. Вось каб яшчэ трохі болей солі! Але ён ведаў, што солі ніхто не дасць, бо яна ашчаджалася як ніішто іншае. Маці колькі разоў спрабавала ў мястэчку выменяць што-небудзь на соль, ды ніяк пакуль не ўдавалася...

Аднак бы ўсе і забыліся, што нечага ў клёцках не хапае. Лёва і Славік наеліся першыя і пад канец, трохі не спаражніўшы місу — ім маці наліла ў адну, асобна,— пачалі ўжо балавацца, пускаць з рота бурбалкі, нават разлілі лужынку на стале. Верка, не сцярпеўшы, злёгку, незласліва стукнула лыжкай абодвум па лбе, і малыя ўмомант шуснулі пад стол, прашыліся між ног і палезлі на печ.

Наеўся і Коля. Сёння ён нічога не расказваў, ніякіх вясковых навін, увесь час маўчаў, і маці вытлумачыла гэта тым, што дома староннi чалавек. Таму яна і не лезла з роспытамі, нават пра тое, што не данасіў вады, забылася.

За сталом засталася адна Параска. Гучна сапучы, смачна шлёпаючы губамі, яна ўсё яшчэ пераціралa ў роце клёцкі, і, здаецца, нічога ў свеце зараз не існавала больш важнага і прыемнага, чым гэтая работа. Пунсовыя, задубянелыя на марозе, сіберным ветры шчокі яе неяк абмяклі, абвіслі, і наогул уся яна, адагрэўшыся, адышоўшы душою ў цёплай хаце, быццам паменшала ў росце, стала не такой шустрай і грознай.

Так здавалася Вадзіму. Ускараскаўшыся, як і малыя, на печ — у сваю пасцель, на кушэтцы, ён пакуль яшчэ не схацеў,— ён з-за коміна час ад часу зіркаў на Параску. Брала цікаўнасць: няўжо яна спарожніць гэткую місу? Гэта ж ім на ўсю сям'ю хапіла б. А тут каб адна... Не можа ж быць такога.

Аднак Параска, бачна было, дабралася ўжо да канца, бо лыжка ўсё часцей шаргацела аб дно.

Верцы таксама, відаць, карцела паглядзець, як там шчыруе Параска, бо не ішла ў залу, не села, як часта бывала пасля вячэры, мудраваць з іголкай у руцэ над нейкай сваёй абновай, а ўсё цярлася на кухні, быццам каб памагчы ў чым маці.

Параска між тым і не думала ўставаць з-за стала, хоць у місе ўжо нічога не заставалася.

— Ну, як клёцкі? — спытала маці, загадзя ведаючы, што Параска не можа не пахваліць яду.— Наелася ж хоць?

Інакш як станоўчага адказу яна і не чакала. Ад людзей, праўда, маці чула, ды і сама яшчэ раней пераканалася, колькі можа за раз з'есці Параска. Але ж каб гэткую пасудзіну...

Параска агламошыла зусім. Гучна крэкнуўшы, яна папрасіла дабаўкі, бо бачыла, што з'едзена не ўсё, што ў чыгуне было яшчэ клёцак.

— Мне-то не шкода...— памкнулася выказаць нейкую сваю думку маці, але Параска не дала ёй і рот далей раскрыць.

— Ты мне, дзеўка, не круці хвастом. Шкадуеш, то скажы, а не — дык вылівай да канца. Хоць раз наесціся каб уволю...— яна, засмяяўшыся, дзвюма рукамі здаволе-

на паляпала па добра-такі адтапыраным жываце, соладка пазяхнула.

Маці, хацела гэтага ці не, мусіла выліць рэшткі ў Парасчыну місу. Цяпер ужо ўсіх, нават Колю, зацікавіла, як жа хоць адолее апошнія клёцкі Параска. А тая, ажно абліваючыся потам, сёрбала і сёрбала, з падбародка часам капала на стол, але жанчына не зважала ні на што, шчыравала з ранейшай заўзятасцю і смакам.

Вадзіму нагадалася восень, калі сáма капалі бульбу. Гэта было недзе праз месяц-два, як забілі бацьку. Параска першы раз тады начавала ў іх. Прыйшоўшы з поля, яна на вячэру зажадала зрабіць таўканіцу. Маці яшчэ не ведала апетыту госці і паставіла бульбу ў звычайны чыгунок, досыць пузаценькі і ёмкі, з разлікам, што хопіць на ўсіх.

Параска пасаромелася напачатку прызнацца, колькі зможа з'есці адна, і прамаўчала. За вячэрай жа, калі маці папытала, чаго яна такая набычаная, Параска, трохі памуляўшыся, выказала крыўду: маўляў, рабіць яна гатова колькі хочаш, але ж чаго-чаго, а бульбы, каб наесціся ад пуза, шкадаваць не трэба.

Маці тады, помніцца, пачырванела, ажно клялася-бажылася, што не шкадавала, думала, хопіць. Скончылася ўсё тым, што яшчэ адзін чыгунок, зноў жа на таўканіцу, тэрмінова паставілі ў грубку.

Параска напіхала жывот так, што ўначы, скаціўшыся неяк з печы, доўга курчылася на голай падлозе, енчыла, стагнала, быццам хто яе жыўцом рэзаў. Нават малыя прачнуліся, з жахам глядзелі, як маці, а пасля і Верка далучылася, абходжвалі Параску, мітусіліся, не ведалі, чым і як памагчы небарацы.

Адпусціла яе, калі ўжо праспявалі другія пеўні. Раніцой жа, быццам нічога зусім не было, Параска зноў снедала, пасля з усімі пайшла ў поле.

Пэўна, той восеньскі выпадак не выходзіў зараз з галавы і ў маці. Яна не ведала, як лепей зрабіць. Не даць кабеце, калі засталося і калі яна жадае, быццам бы і нядобра. І разам з тым палохала, каб не паўтарылася ноччу тое ж самае. Згаладаламу чалавеку, вядома, не заўсёды ўдаецца ўзяць сябе ў рукі...

Не думала маці, што амаль да саменькай раніцы не змружыць вачэй зусім не з-за Парaскі, хоць тая і гэты раз добра-такі папсавала ёй нерваў.

Пачалося ўсё недзе праз паўгадзіны, як патушылі лямпу.

Спярша, трохі яшчэ падурэўшы, паснулі на палку малыя. Славік, дык той нешта нават у сне крыкнуў раздругі, у злосці на некага брыкаўся нагамі, сцягнуў коўдру, і ёй давялося падымацца, зноў накрываць малых, бо так і праляжалі б да раніцы скурчыўшыся, як бывала не раз, пасінелі б, што гусіны пуп.

Параска зноў, як і тады, увосень, выбрала сабе нанач печ. Ды, хацела б яна ці не, толькі на печы і заставалася яшчэ месца. Часта, асабліва калі намерзнецца, залазіла туды маці, але сёння яна лягла ў бакоўцы на свой тапчан. Тапчан быў з вечкам, пасля начы ўсярэдзіну хавалі і коўдру, і сяннік, і падушку. Валялася там і яшчэ чортведама якая старызна.

Верка паслала сабе ў зале, на высокім жалезным ложку з нікеліраванымі білкамі, аздобленымі такімі ж бліскучымі цацкамі-шарыкамі. Ложак разам з пругкім матрацам быў куплены незадоўга да вайны, з'явіўся, як і шкап, самай вялікай каштоўнасцю ў хаце. Засцелены ўсім новым, бялюткім, ложак гэты стаяў як упрыгожанне і, на ўсялякі выпадак, хіба мо для якога важнага госця. Коля спаў у бакоўцы, дзе і маці, на старым, спрэс сточаным шашалем драўляным ложку, які надта ж скрыпеў, быццам скардзіўся каму на сваю нямогласць.

Паглядзеўшы малых, Ліда пашлэпала поцемкам і ў залу, да кушэткі: а раптам раскрыўся і Вадзім? Аднак той, мо ўпершыню за доўгія ночы, ляжаў спакойна, дыхаў роўна і чыста. Гэта яе парадавала. Цяпер і самой можна заснуць.

Яна ўжо драмала, нават пачала сніцца розная трасца, як скрозь гэтае сваё паўзабыццё пачула з вуліцы якісьці тупат. Адразу ўсхапілася, вяласць і дрымота ўмомант прапалі. Адхінула ражок коўдры, прыпала да халоднай шыбіны. Аднак праз намёрзлае шкло нічога на дварэ не ўгледзела. Падумала, што мо здалося спрасоння. Хацела ўжо кінуцца назад, у пасцель, ды з канца вёскі, ад студні, зноў пачуўся гэткі ж самы тупат. Ён з кожнай секундай набліжаўся, шырыўся, мацнеў.

Ліда хуценька стала на тапчан, знайшла ў верхняй фортцы чыстае ад наледзі вочка. У белай снежнай каламуці толькі і паспела згледзець, як алюрам, адзін за адным, пранесліся па вуліцы ў напрамку да мястэчка коннікі. «Няўжо нашы, партызаны?!» — яна пачула, як у грудзях малаточкам часта-часта застукала сэрца, а пад горла спакваля пачаў падбірацца даўкі камяк. Хацела пабудзіць

усіх: Верку, Колю, нават меншых, хацела ўскатурхаць і Параску. Аднак узяў одум: а раптам гэта не партызаны? Раптам зноў немцы, карнікі? Божа літасцівы! Хіба і так мала бяды на галовы людзей звалілася?

Накінуўшы на плечы капоту, сядзела, сцяўшыся, пры акне, з трывогай і нейкай няпэўнай яшчэ надзеяй чакала, што прынясе ноч. Чамусьці схілялася да думкі: не, гэта не немцы, не паліцаі. Тыя нарабілі б вэрхалу, усіх паднялі б на ногі. Ды і баяліся зараз фашысты і іхнія паслугачы куды б сабе ні было поначы вытыркацца. Гэта не ў першы год-два вайны. Тады яны былі уга якія смелыя. Праўда, цяпер, чуючы сваю канчыну, яны мо яшчэ болей звярэлі, нішчылі ўсіх і ўсё, што ім не даспадобы, але рабілі сваю чорную справу найперш удзень.

Яна думала, што і Параска не спіць, бо, як пачуўся той тупат, Параска пашамацела на печы, пастагнала трохі і аціхла. Ліда хацела ўжо аклікнуць яе, каб перакінуцца словам-другім, абмеркаваць падзею. Параска ў гэты момант тоненька, пасля ўсё гучней і гучней пачала падвываць, быццам хто побач, за сцяной, аплакваў нябожчыка.

Ліда не на жарты напалохалася: раптам стрэліла ў галаву, што Параска галосіць, бо адчула нешта нядобрае ў тым тупаце па заснежанай начной вуліцы. Скінуўшы капоту, у адной палатнянай кашулі яна выйшла на кухню, па драбінках, якія былі прымацаваны да вушака дзвярэй, палезла на печ, кранула рукой жанчыну:

— Ты чаго гэта, га? Чуеш?..

Параска не азвалася і не аціхла. Яе нейкае зацятае, з усхліпам падвыванне хіба што змянілася вохканнем і стогнам. Ліда, цяпер ужо мацней ухапіўшыся за Парасчыну нагу, як мага пацягнула на сябе.

— Прачніся, Парасачка! Ты што гэта ўдумала сабе?!

Параска, ледзьве варочаючы языком, нарэшце прахрыпела:

— Во-о-ох, паміраю, дзеўка-а-а! Капцы мне прыйшлі-і-і...

Толькі зараз да Ліды дайшло — вот жа дурная мазгаўня! — якая бяда ў Параскі: зноў аб'елася небарака. І ў гэтай бядзе вінавата найперш яна, Ліда. Пашкадавала, называецца. Добранькай зажадала паказацца. А гэтая яе дабрата бокам во вылазіць. Той раз, восенню, неяк абышлося. А зараз як быць? Чым пасобіць? Не залезеш жа ўсярэдзіну і не выграбеш тыя лішнія клёцкі...

— Пацярпі, Парасачка, пацярпі. Мо як пакрысе вы-

пчхаецца. Вот жа ліха...— Ліду, акрамя гэтае нагоды, не пакідала тачыць і думка пра коннікаў: хто яны і куды падаліся? Калі партызаны, то яны ж трапяць у самую фашысцкую пашчу. Там жа, у мястэчку, іх, немцаў, процьма. Хіба ж партызаны не ведаюць, хіба ім хто не даносіў?

Яна злезла з драбінак, ступіла на ўжо настылую падлогу, не ведаючы, што рабіць. Запальваць лямпу пабаялася: на кухні не было чым тоўстым завесіць акно. Хоць яно і выходзіла ў бок хлява, ніскуль, здэцца, не праглядвалася, аднак лепш было паасцерагацца. Ці мала што?

Параска не аціхала, енчыла і енчыла. За перагародкай, у зале, кашлянула Верка. Відаць, таксама прачнулася, але пакуль што не падавала голасу. Ліда, вярнуўшыся ў бакоўку і зноў наапашкі накінуўшы на сябе капоту, вырашыла заглянуць да Веркі. Калі не спіць, то хоць словам якім перакінуцца. Усё лягчэй стане на сэрцы.

— Не спіш, дачушка? — ціха паклікала яна.

— Дзе ўжо сон той,— Верка села на ложку, звесіла долу голыя ногі.— Сканае шчэ, чаго добрага.

Ліда ажно перахрысцілася:

— Ціпун табе на язык! Што гэта ты такое вярзеш? Хто ж гадаў-думаў...

— «Гадаў-думаў, гадаў-думаў»,— зласнавата перадражніла Верка.— А я што казала, каб і на заўтра пакінуць. Дык жа ўсё мала...

— Не пра гэта цяперака, дачушка,— прымірэнча зашаптала, каб не пабудзіць астатніх, Ліда.— Тут во і коннікі нейкія... Ці ж чула хаця?

Верка здзівілася, захітляла галавой:

— Не-а... Якія яшчэ коннікі? Немцы хіба?

— Не, не немцы, чуе маё сэрца,— Ліда як не ў самае Верчына вуха горача выдыхнула: — Далібожачкі, партызаны. І многа іх туды, у бок мястэчка, падалося. Сама бачыла, каб я так жыла. Мо ўжо і пагоняць немцаў...

Яны сядзелі разам на ложку — Верка ажно да падбародка ахінула сябе коўдрай,— лавілі кожны шолах і ў хаце, і на вуліцы. Параска на нейкі момант перастала енчыць, і яны абрадаваліся, што, можа, мінулася ў яе самае найгоршае.

І раптам у гэтай цішыні вуха ўлавіла, як недзе далёка-далёка штосьці глуха вухнула, затым яшчэ і яшчэ. У тым баку, дзе мястэчка, спачатку квола, затым усё гусцей і гусцей пачала распаўзацца па небе крывавая пляма.

— Гарыць нешта, глядзі,— усхапіўшыся з ложка, Лі-

да першая пабегла да акна, прыпала да шыбкі.— Я ж казала, што гэта яны, партызаны. Сілішча ж нябось, калі ўдумалі нават у мястэчку даць фрыцам чосу... Можа ж, і вайне той ужо канец?

— Гаворыце вы нешта, мама. Да тога канца шчэ...

Верка праглынула слова, бо ў гэты момант у кухні нешта грымнула, акурат што цяжкае звалілася з вышыні на падлогу. Не паспелі яны і апамятацца, як дзверы, спачатку з кухні ў сенцы, затым і на двор, маланкава расчыніліся, быццам невядома скуль наляцеў шквальны вецер і расхлябеніў усё наскрозь, пазрываўшы нават кручкі і завалы.

— А бо-о-о-жачка-а! — першая ачомалася маці.— То ж Параска, здаецца. Куды ж яе панесла гэтак нячыстая? І грукату столькі...

Пацягнула холадам. Маці пайшла зачыніць дзверы, а заадно і пацікавіцца, што з Параскай.

У кухні было ўжо як у лядоўні. За якую мінуту-другую вышастала ўсё цяпло. Намацаўшы ў куце, ля парога, галёшы, Ліда ўззула іх на босыя ногі, замест капоты накінула кажух — ён быў трохі даўжэйшы і цяплейшы.

На ганку і ўсюды навокал намяло свежага снегу. Сыпала і зараз. Снегу адразу ж набілася ў галёшы, і яна ажно сцепанулася ад холаду. «Дык дзе ж, дзе Параска?»

Прыгнуўшыся, Ліда згледзела глыбокія сляды босых ног, якія вялі ў бок хлява. «Во прыспічыла!» — падумала з жахам і спачуваннем, хоць недзе ў куточку душы пачала ўжо кіпець і злосць на жанчыну: хіба ж можна так самой папускацца, не ведаць ніякае меры? Ды каб гэта ўпершыню!

Яна добра-ткі ўжо азябла, стоячы на ганку, а Параскі ўсё не было і не было. А тут яшчэ да вуха данеслася далёкая страляніна — адтуль, з таго боку, дзе агнём адсвечвала неба. Страляніна то аціхала, то ўз'юшвалася з новай сілай, здаецца, нават набліжалася сюды...

Нарэшце, свецячыся ў начной шэрані голымі лыткамі, распэтланая, трымаючыся аберуч за жывот, прабегла ў хату Параска. Пакуль Ліда зачыніла, заперла ўсе дзверы, Параска ўжо ляжала на печы, хуталася ў нейкія анучы, часта і гучна ляскала зубамі.

— Каб цябе халера, каб цябе,— не стрывала, накінулася на яе Ліда.— Гэта ж і апруцянець можна. Хіба ж нельга было б хаця на ногі што ўззуць?

Параска маўчала, усё яшчэ калацілася бы ў ліха-

манцы, але, дзякаваць Богу, хоць болей не енчыла, не стагнала. Ліда пакінула яе ў спакоі, вярнулася ў залу, да Веркі, аднак села не на ложку, а прыхінулася да грубкі, якая не зусім астыла. Адразу адчула, як прыемнае цяпло палілося па целе. Але ўжо праз хвілін колькі, добра не адагрэўшыся, зноў прыпала да акна: на вуліцы пачуўся яшчэ гуд, тупат конскіх капытоў. Верка таксама стала на ложку, прыплюснула твар да шыбкі. Цяпер ні ў яе, ні ў маці не ўзнікала і кроплі сумнення, што гэта вярталіся пасля налёту на немцаў у мястэчку партызаны. Былі тут і на санях, былі і конныя. Па ўсім адчувалася, што людзі і жывёла дарэшты стомленыя.

Лідзе найперш карцела выбегчы з хаты, кінуцца, расцалаваць хоць кожнага, распытаць, што ды як, калі ж вернуцца ўжо назусім. Ёй здавалася, што гэта якраз тыя людзі, каму служыў Пётра, з кім бачыўся, калі адлучаўся ў лес, што яны добра ведаюць і помняць пра яго, што нават сённяшняя іх вылазка на немцаў — гэта маленькая доля адплаты і за яго смерць, і за многае-многае яшчэ.

Яна ўся ажно калацілася, але ўжо не ад холаду, а ад адчування блізкіх змен, прадчування канца вайне.

## 8

Адразу пасля Вялікадня, надвечар, калі ўсе былі ў хаце, маці, нейкая надта засяроджана-строгая ўвесь дзень, раптам сказала:

— Думала я, думала, дзеткі, і вось да чаго дадумалася: Вадзім наш папраўіўся, дзякаваць Богу, і падрос нават за зіму. Дык цяпер ужо можна і яму даверыць Лыску нашу. А Колю і па гаспадарцы работы хопіць, толькі ўпраўляйся. Бо мы з Веркай зусім вымагліся. Цяпер хай Коля за гаспадара будзе. Як, га? — Вочы маці пацяплелі, у голасе чулася лагоднасць, яна глядзела то на аднаго, то на другога, чакала нібы, як прымуць яе словы.

— А парсючка пасвіць хто? — азваўся з-за шкапа, дзе гуляў у нейкую гульню са Славікам, Лёва.

Лідзе думалася, што ён, заняты сваім, не чуў яе. Аднак жа, бач, гульня гульнёю, а вушы добра натапырвае. Яна нават усміхнулася сама сабе, усцешыўшыся, што і Лёва ўжо не той, якім быў хаця б паўгода таму. Вырас, пасталеў і ён, што і казаць. Самы пастушок.

— Вось ты і будзеш пасвіць, сынку,— сказала як мага

лагодней, але так, каб не даць ніякай надзеі на пярэчанне, на якія другія выбрыкі.

Лёва высунуўся з хованкі, на ягоным твары лёгка чыталася і разгубленасць, і боязь новага, ужо такога важнага, даручэння, і яшчэ невядома што. Нічога не сказаўшы, быццам і не яго тычыліся матчыны словы — вось жа ўмее замкнуцца ў сабе, адзін, моўчкі, перажоўваць усё, што ні здарылася б! — ён зноў схаваўся за шкап. Але чуваць было: як Славік ні тузаў яго, ні падахвочваў на гульню, Лёва ніяк не мог расслабіцца, звыкнуцца з тым, што сказала маці.

Затое Вадзім нібы ачмурэў ад радасці. Здэцца, да столі скакаў бы, галёкаў, але таксама стрымліваў сябе, бо,чаго добрага, палічаць яшчэ гэткім блазнам, што і перадумаць могуць. А каровы пасвіць — тут трэба па-даросламу ўжо трымацца, а не як падшыванцу апошняму.

Коля ж, як і Лёва, таксама не сказаў нічога. Ён добра ведаў, што чакае яго дома, на гаспадарцы. Але не пярэчыў маці, бо па яе намёках яшчэ зімою здагадваўся: быдла яму болей ніколі не пасвіць.

Вадзім, пакуль маці з Веркай пачалі корпацца нечага ў шкапе, вытрасаць адзенне, глядзець, што яшчэ ёсць хоць трохі годнага, вырашыў збегаць да Міці, падзяліцца навіною. Вот, пэўна, Міця здзівіцца! Гэта ж даўно яны марылі, што некалі будуць разам ганяць кароў.

Міця быў якраз ля ганка, майстраваў сабе пугу: на кончык гнуткага ядлоўцавага дубца чапляў сырамятны раменьчык, туга звіты ўдвая. Вадзім ведаў, што такая пуга надта хлёстка страляе, абы ўмеў ёю размахнуцца, і карова, якая б збродлівая і наравістая ні была, хутка смірнела, калі добра сканеш па сцягне ці па нагах гэткай штуковінай.

— І мне б такую пугу,— выказаў захапленне Вадзім, але рашыў пакуль не раскрывацца, хоць трохі паказытаць нервы сябруку.

Міця, як і чакаў Вадзім, адразу хмыкнуў:

— Начорта табе. Свінні і так хвост можна накруціць. Гэта ж не карова...

Вадзім, аднак, не вытрываў і, не даўшы Міцю больш пацвельвацца з сябе, пахваліўся:

— Усё, цяпер Лыску паганю я. Не думай, што ты адзін...

— А Коля што? — неяк абыякава, як здалося Вадзіму, спытаў Міця.

«Вось табе і сябрук,— ледзь не пакрыўдзіўся Вадзім.— Яму ці я, ці хто іншы». Аднак стрымаўся, адказаў:

— Коля цяпер дома будзе, гаспарадка ж бо...

На ганак выйшла Міцева маці, папрасіла прынесці вады. Узяўшы два вядры, каромысла, Міця падаўся на вуліцу. Вадзім рашыў пайсці да студні разам. Карцела ўсё ж даведацца, ці хутка пагоняць у поле. Калі Міця не ведае, то мо хто з жанчын, беручы ваду, скажа. Аднак ля студні нікога не было. З цяжкасцю выцягнулі вялізнае драўлянае вядро, якое вельмі цякло. Пакуль вылілі ў свае, абодва і запыхаліся.

— Давай пастаім трохі,— прапанаваў Міця.— А то зараз пілаваць дровы трэба. І сечкі карове няма.

— І ўсё гэта табе рабіць? — спытаў Вадзім, хоць добра ведаў, што ў Міці ні братоў, ні бацькі няма, і хлопцу нават пагуляць некалі.

— А то хто ж зробіць,— неяк вельмі стала адказаў Міця, кладучы каромысла на плечы. Пачапіўшы вёдры, ён з крэктам выпрастаўся, пакрочыў па вуліцы.

— Мажа, я памагу? — прапанаваў Вадзім.

— Табе ж няможна нічога цяжкага рабіць,— Міця прыпыніўся, даў вадзе трохі астояцца, бо надта ж боўталася, выплёсквалася ажно за край, затым, абыходзячы гразкія мясціны, амаль ля саменькага плота, дзе было вышэй і больш падсохла, цяжкім крокам падаўся да свайго двара.

— Хто табе сказаў? Ну, што нельга...— спытаў, ідучы ззаду, Вадзім.

— Маці была твая ў нас, сказала. Што ты не зусім... ну, гэта... акрэп. Трэба пакуль берагчыся.

У Вадзіма трохі адлягло на сэрцы. Узяў быў адразу ў галаву, што і Міця, і Генка, пэўна, і той-сёй яшчэ з яго сябрукоў за час, пакуль ён валяўся ў пасцелі, палічылі яго ўжо не вартым ні на што. Думалі, пэўна, што не падымецца на ногі. А ён вось падняўся, выжыў, хоць на валасок ад той смерці быў.

— Я здаровы ўжо, магу ўсё рабіць,— сказаў Міцю.— Яшчэ пабачым, хто каго пабарукае...

— Пабачым, пабачым...— усміхнуўся Міця.— Мала ўжо чакаць. У полі часу на ўсё будзе... Дзень здасца, бы век цэлы. Так што не вельмі скачы.

Як ні астуджваў Міця, Вадзіму ўсё ж карцела хутчэй паспытаць, які ён, пастушкоў хлеб. Чатыры ці ажно пяць гадоў, якія ён пасвіў на лозе свіней, абрыдлі яму, што

і свет часам нямілы быў. Ведама, кожны дзень, з вясны да позняй восені, адно і тое ж: вузенькая і гразкая, нават калі і суша стаяла, вулка паўз глухую сцяну Маланнінай хаты, пасля ўздоўж высокага і густога, палку нават не праткнеш, плятня, на які пайшло немаведама колькі вазоў яловых сукоў, далей доўгі пакаты схіл — і вось ён, лог, топтаны і ператоптаны, безліч разоў мераны-перамераны іхнімі босымі нагамі. Каб не ручаёк, дзе нават вяліся сліжы, і не іхняя гаць, якую кожнае лета так старанна рабілі і затым пасля любога дажджу гэтак жа старанна яны, хлапчукі, папраўлялі, то на тым лозе за доўгі, бы вечнасць, дзень і здурнець можна было б, не інакш.

Вадзім даўно зайздросціў Колю, Міцю, іншым хлопцам, што пасвілі быдла: хоць, можа, яны і болей стамляліся, раней іх будзілі і пазней часам класціся даводзілася, хоць ногі іхнія, пакалатыя ржэўнікам, вострымі сукамі ў лесе, нярэдка і калючым дротам, доўга нарывалі і гнаіліся, хоць і мерзлі, і моклі, а ў спёку знемагалі ад смагі яны горай за каго іншага,— усё ж іх знітоўваў, прымушаў забывацца на нягоды нейкі асаблівы пастушкоўскі дух. У гэтым Вадзім пераканаўся нават за той кароткі час, як падмяняў Колю. Цяпер жа не Коля, а ён, ён будзе галоўным, на кім ляжа клопат пра Лыску. Хутчэй толькі б пасапраўднаму бралася вясна, хутчэй пайшла б расці трава!

Вадзім, пакуль Міця ўходжваўся па гаспадарцы, надумаў збегаць за вёску, да лесу, каб паглядзець, ці падсохла зямля і ці ёсць ужо што скубці каровам. Да канца дня заставалася яшчэ трохі часу. Сонца сёння хоць і не паказвалася амаль што з-за хмар, але ўсё роўна, калі добра ўгледзецца, можна было пазнаць, дзе яно зараз.

Вадзім без цяжкасці вызначыў, што, пакуль сцямнее, ён не толькі да лесу і назад дойдзе, але і ў казарму, каб схацеў, паспеў бы зазірнуць. Аднак пра казарму ён сёння і думаць не думаў. Усё ж, як ні кажы, аднаму неяк вусцішна. Вось бы з Міцем ці хаця б з Генкам...

Нагадаўшы пра Генку, Вадзім адчуў: не, не хутка ён даруе яму, як бы той ні апраўдваўся. Акрамя таго, што кінуў яго тады аднаго ў Гараўках, збаяўся страляніны, дык яшчэ за цалюткую зіму і носа не паказаў у іхняй хаце. Пэўна ж, брыдка стала. А мо яму зусім не брыдка?

Гэты раз, выйшаўшы за вёску, Вадзім надумаў хоць на хвілінку заскочыць на точку. Да лесу ён яшчэ паспее. Хацелася трошкі пастаяць на яе таўшчэзнай бетоннай спіне, паўзірацца ў зацята маўклівыя дзіркі-амбразуры.

Аднак толькі ступіў крок з дарогі, адчуў: далей не пройдзе, бо ногі па шчыкалатку сядзелі ўжо ў гразі. Збаяўся нават, каб буркі не засталіся без галёшаў. Усё ж неяк выцягнуў спачатку адну нагу, пасля другую і больш не стаў рызыкаваць. Зямля тут, дзе яшчэ ўвосень капалі бульбу — і ў іх тут быў вузенькі клінок,— не паспела зляжацца, набрынялая талай вадой, яна слаба пакуль падсыхала.

Затое на другім баку, дзе тапырыўся пачарнелы леташні ржэўнік, ногі ніколечкі не правальваліся. Там, непадалёк ад маяка, які ўзвышаўся над лесам, хоць, здаецца, за зіму яшчэ болей пахіліўся, скасабочыўся, пасвілася навязанае на вяроўцы чыёсьці рабое цялё.

Вадзім, адразу павесялеўшы, скіраваў да маяка. Яшчэ здалёку згледзеў, што на грудку, ля саменькага яго падножжа, нешта чарнеецца. Няйнакш нехта сядзіць, ці не пільнуе гэтае цялё. Хто ж гэта мог быць?

Вадзім спыніўся, чамусьці завагаўся: падысці ці не? Усё ж цікавасць узяла верх, і ён са спіны наблізіўся да чалавека. Спачатку падумалася, што гэта Барыс Васючкоў. Шапка-аблавуха акурат як у яго. Гэткая ж аблезлая, выцвілая. Барыс, нават калі і цёпла было, доўга, амаль да сярэдзіны лета не разлучаўся з ёю, заўсёды насоўваў на самыя вушы. Пастухі часта кпілі з хлопца, называлі чамусьці «Бармалеем». А з шапкі наогул чынілі нечуваны здзек. Яе, сарваўшы ў Барыса з галавы, ды яшчэ якраз тады, калі яна больш за ўсё была патрэбная, некуды хавалі, пасля, цешачыся і выскаляючыся, шпурлялі замест мяча нагамі. Некалькі разоў запар, толькі каб аддалі яе назад, Барысу даводзілася без чаргі адварочваць быдла.

— Гэ-э!.. — азваўся Вадзім, ужо ніколечкі не сумняваючыся, што гэта Барыс.

Чалавек, аднак, нават не варухнуўся. Унурыўшыся, у латаным — жывога, здэцца, месца не было ад тых латак — плашчы наапашкі ён не то спаў, не то праз шапку нічога не чуў.

Вадзім, стараючыся ступаць асцярожна, не шамацець іржэўнікам, падкраўся бліжэй. Закарцела ўжо каля саменькага вуха Барыса загалёкаць, напалохаць яго, як гэта часта рабілі на лозе пастушкі, калі хто-небудзь незнарок, угрэўшыся, соладка засынаў.

Але ў самы апошні момант нешта Вадзіма насцярожыла. Перш-наперш успомніў, што ніколі не бачыў у Барыса такога плашча. Па-другое, Барыс быў нібы трохі ніжэйшы. Павагаўшыся, Вадзім яшчэ мацней гукнуў:

— Воўк! А-ту-у! Во-о-о-оўк!!!

Гэты вокліч павінен быў і мёртвага ўскатурхаць. Ваўкоў усе баяліся, бо ў апошні час яны нярэдка пачалі паяўляцца там, дзе іх не чакалі, нават побліз быдла, а ўвосень, калі ён, Вадзім, ужо цяжка хварэў, зарэзалі жарабя ў Хвядоса-нямко, што жыве на пасёлку. Адбілі ад маці-кабыліцы, якая пасвілася па скаванай марозам руні непадалёк ад вёскі, і як тая ні насілася, вылузаўшыся неяк з путаў, як ні ржала, клікала каго на помач, усё было дарэмна. Прыбеглі, праўда, людзі, але ад жарабяці мала што засталося тады.

Вадзімаў голас аддаўся рэхам у блізкім адсюль лесе, нават, напалоханая, пырхнула з іржэўніку за маяком, паляцела далей у поле нейкая вялікая птушка. І толькі чалавек у латаным плашчы і шапцы-аблавусе бы прырос да грудка. Няўжо так моцна можна спаць?

Цяпер ужо Вадзім зайшоў спераду. Твару чалавека было не відаць, ён, неяк ненатуральна скурчыўшыся, нязграбна абхапіўшы рукамі вядро, напалову запоўненае пышкамі, быццам нават і не дыхаў. Вадзім адразу, ужо па адных худых парэпаных руках, зараз чамусьці блекла-жаўтлявых, пазнаў, што гэта не Барыс. Гэта хтосьці з дарослых. У каго ж яшчэ гэткая шапка і такі палатаны выцвілы плашч?

— Дзядзечка! — Вадзім асмеліўся, крануў чалавека за плячо, пасля, калі той зноў не азваўся, ужо мацнавата трасянуў, нават трохі прыўзняў схіленую над вядром галаву. І... адразу, бы апараны, адскочыў назад. Адчуў, па скуры пабеглі мурашкі, а ногі сшэрхлі, сталі нейкія чужыя.

Чалавек, у якім ён пазнаў Яська Зуя, быў, па ўсім бачна, нежывы. Быццам у пацвярджэнне гэтай згадкі, Яська рапам пачаў хіліцца, і не паспеў Вадзім хоць трохі апамятацца, як той кульнуўся з грудка. Вывалілася з разгірэчаных Яськавых рук вядро і, дзвынкнуўшы аб камень, адкацілася далёка ўбок. Кучкамі рассыпаліся па ржэўніку пышкі.

Ловячы ротам паветра, Вадзім паспрабаваў кінуцца наўцёкі, але ногі ніяк не слухаліся яго, акурат прыраслі да зямлі. Усё ж, неяк адолеўшы гэтае насланнё, ён задам, не спускаючы вачэй з Яські, памалу адступіў ад грудка, пасля павярнуўся і, на што толькі быў здольны, пусціўся да вёскі. Трэба было як хутчэй расказаць пра Яську. А мо ён яшчэ не памёр зусім? Мо толькі хапіла сэрца і яго яшчэ паспеюць уратаваць?..

...Хавалі Яську ўсёй вёскай. Счарнелую ад гора і слёз Марылю, ягоную жонку, ажно тры разы адлівалі вадой. Плакалі і дзеці. Найбольш, праўда, старэйшыя, Рэня і Дзімка. Рэні было восем гадоў, а Дзімку — дзесяць. Астатнія — яшчэ трое — былі зусім малеча, і яны, пэўна, не разумелі нічога, бо круціліся пад нагамі, часам лезлі куды не трэба, румзалі, прасілі хоць чаго-небудзь есці.

Жанчыны — сярод іх і Вадзімава маці — таксама не адымалі хусцінак ад вачэй. Гледзячы на нябожчыка, а яшчэ больш на схуднелых, змардаваных дзяцей, якія, акрамя ўсяго іншага, і абнасіліся горай, чым хто ў вёсцы, яны, каб не чула Марыля, шапталіся, як памагчы і дзецям, і самой матцы. І пры Яську сям'я во дайшла да ручкі, хоць Яська, усё ж гэта бачылі, высільваўся з апошняга, не лічыўся са сваім хворым сэрцам, з-за якога яго і ў войска не ўзялі. Цяпер, без гаспадара, яны зусім прападуць, калі не падсобіць хоць трохі. На пышках, крапіве ды жалудах доўга не выцягнеш. Было б хаця малако...

Але ж яшчэ зімою, колькі ні плакала Марыля, як ні галасілі дзеці, што выбеглі ў двор у чым папала, Марчук, стараста — з ім было яшчэ двое немцаў і незнаёмы паліцай — вывалак іхнюю Сойку з хлява і, накінуўшы на рогі вяроўку, павёў у мястэчка, на бойню. Марыля ажно паўвёскі бегла ўслед, усё прасіла, усё на нешта спадзявалася:

— Сцяпанка, ты ж недалёка жывеш, ведаеш, як у нас... Як жа я магла тыя падаткі аддаць? З чаго? Дзеці ж во пухнуць ад голаду... Скажы ж хоць слоўца ім...

Марчук, важны, надзьмуты, нават не глядзеў на няшчасную кабету, толькі нездаволена кінуў:

— Немцы парадак любяць. І не енчы, бо нічога не паможа. Не здохнуць твае шчанюкі...

...Пасля могілак, калі ўсе вяскоўцы брылі ўжо назад, а Марылю, якая штохвіліны млела, пад рукі вялі Верка і суседка Саша, Ліда, нагнаўшы белабрысага апануранага Дзімку, папрасіла зайсці да іх.

Дзімка паслухаўся, нясмела ступіў у двор. На ганку сядзеў, вымазаўшыся з ног да галавы ў гразь, Славік і жаласна хныкаў. Убачыўшы сваіх, ён адразу ж узяў на тон вышэй, загаласіў, хоць вушы затыкай.

— А бо-о-ожачка-а! — пляснула рукамі маці і, грозна насупіўшы бровы, моцна хапіла Славіка за руку, паставіла на ногі.— Ну, чаго, чаго? Рэжуць бо?! Вось жа няшчасце Бог паслаў! Дзе гэтак паспеў, бы свінчо тое, валяцца? Кажы!..

— Лё-ё-ва-а... мяне... — пісягамі размазваючы па брудным твары слёзы, ледзьве выціснуў з сябе Славік.— Там... луза вялікая...

— Дзе лужа? Дзе вас нячыстая насіла? У вулцы хіба?

— Ыгы,— кіўнуў Славік, пільна сочачы за матчынымі рукамі: будзе яна хапацца за што, каб адлупцаваць, ці не будзе?

Маці, аднак, занятая сваімі думкамі, не стала больш ні пра што пытацца. Нязлосна, абыякава кінуўшы: «Я ж яму, недавярку гэтакаму, пакажу, хай знае», яна пайшла ў хату, папрасіўшы Дзімку пачакаць трохі ў двары.

Трэба ж было нешта даць хлопцу, каб занёс дадому. Яна ведала, што і другія жанкі, як і яна, будуць ламаць галаву, у дзесяты, а мо і ў соты раз лічыць, мераць, прыкідваць, што ў іх ёсць, што засталося ў хаце, у кладоўцы, у склепе.

Нялёгкі гэта быў клопат не толькі вясною, а нават увосень, бо калі што і збіралі з поля, з агарода, то на гэты скупы набытак адразу накладвалі лапу нямецкія ўлады. Акрамя збору вялізнага падатку, было ж неаднойчы, што і так, бы груганнё тое, немцы і паліцаі наляталі і ўсё да каліва выграбалі з засекаў, калі хто не ўспеў прыхаваць ці як-небудзь інакш схітраваць. У многіх вяскоўцаў ужо к сярэдзіне зімы было хоць зубы на паліцу кладзі. Сам-то неяк трываў бы, мірыўся б і з недаяданнем, і з нішчымніцай, а дзецям жа хіба ўталкуеш, што няма, ну, хоць зарэж, няма скуль узяць, каб накарміць іх.

Вясной жа яшчэ горай: хоць і ашчаджалі, хоць і дрыжэлі над кожнай бульбінай, кожнай крупінкай, усё роўна к таму часу, як выганяць на пашу кароў, дома заставаліся адны хіба шышы. І тым не меней, лічыла Ліда, не выручыць, не падзяліцца нават самым апошнім, што можна яшчэ наскрэбці ў сябе, з гэтымі няшчаснымі дзецьмі, у якіх толькі і ёсць што скура ды косці, было б зараз найвялікшым грахом. Яна ніколі б сабе не даравала такое. Нават усе гэтыя суткі, як надарылася няшчасце з Зуем, Ліда, ды і не адна яна, пэўна ж, не знаходзіла сабе месца, што ў сваіх бедах ды клопатах упусціла з-пад увагі Марылю і яе сям'ю. Ужо даўнавата нехта ля студні — ці не Саша? — казаў, што Зуі дайшлі да ручкі, што сам гаспадар, не паспеў добра сысці снег, хадзіў па бульбянішчы і шукаў пышак. А які наедак з тых пышак? Смеху варта.

Заклапочаная, яна заглянула найперш у кладоўку, што была пры сенцах. Упоцемках звыкла намацала дзеж-

ку, адчыніла вечка — апошні час Ліда заўсёды шчыльна зачыняла дзежку, бо калі неяк забылася нанач зачыніць, мышы добра-ткі пахадзілі, нарабілі шкоды,— запусціла абедзве далоні ў шорсткае халаднаватае зерне. Гэта быў ячмень, які яна пакідала, яшчэ ўвосень перабраўшы кожнае каліва, на насенне. Не стрымалася, узяла адно зернетка на зуб, пажавала. З дзежкі ўжо бралі пакрысе, таўклі ў ступе на крупы. Як ні шкода было насення, але ж нічога болей не заставалася рабіць.

У вялікіх жалезных начоўках, што стаялі, накрытыя дошкамі, у самым куце кладоўкі, было яшчэ пуды два і жыта. Усю зіму Ліда хавала яго ў хляве, у саломе, на выпадак, калі немцы зноў нечакана наскочаць і пачнуць шнарыць па дварах. Пасля ж той ночы, як партызаны пакалашмацілі іх нават у мястэчку, Ліда асмелілася, прынесла жыта ў кладоўку. Днямі яна збіралася папрасіць у каго каня і з'ездзіць у Заямнае, каб змалоць. Усё ж было б на нейкі час на праснакі і зацірку.

Вядома, усяго гэтага, пакуль вырасце што новае, надта мала на сям'ю. Бульбы таксама можна ўжо не лічыць, бо і так ці хопіць пасадзіць нават у агародзе. Давядзецца дзяліць, рэзаць на вочкі самыя маленькія, кволыя клубні. Што ж застаецца? Нічога іншага яна не магла прыдумаць.

Ліда выйшла з кладоўкі, у кухні, за комінам пашукала палатняную торбачку, куды некалі хавалі соль. Хоць балела, разрывалася ад адчаю сэрца, усё ж яна насыпала жыта поўную торбачку. Хай, хай Дзімка парадуе сваіх. Невялікая, але ўсё ж падмога на колькі дзён. Калі б яшчэ па гэтулькі далі і з іншых хат, то пратрывалі б неяк і Марыля, і дзеці яе.

Славіка ўжо не было, зноў, бы ветрам, здзьмула куды. Ліда пашкадавала, што адразу не завяла ў хату, не абмыла хаця б твар, не дала пераапрануцца ў што сухое. Сядзеў толькі на ганку, цярпліва чакаў, неяк па-старэчы апусціўшы галаву, адзін Дзімка.

— Вазьмі, дзіцятка, вот,— працягнула Ліда яму торбачку.— Жытца трошкі. Мо змелеце на жорнах. Хаця б для заціркі. Вадзім вечарам падняce якую кварту, каб забяліць, і малачка.

## 9

Вясна, пасля некаторай замінкі, нарэшце схамянулася, падабрэла, пачала набіраць моцы. Неяк пад вечар насунулася на вёску цёмная, з бліскавіцай і грымотай, хмара, прайшоў спорны дождж, і адразу ж, бы па чыёй камандзе, павярнуўся з поўдня вецер. Трава за ноч, улагоджаная цяплом і вадой, прыкметна пазелянела, нават падрасла, і можна было спадзявацца, што самае цяжкае — як датрымаць, каб зусім не злегла, не завалілася скаціна — мінула. Многія, праўда, у вёсцы не дачакаліся гэтай пары, як і Зуі, засталіся без каровы. Хто пасля каляд, адчуўшы, што не дацягне да вясны з кормам, прадаў, каму давялося дарэзаць, бо ўсё роўна сканала б, у каго забралі, у лік падатку, немцы ці паліцаі.

Ліда радавалася, што Бог гэтую зіму быў яшчэ літасцівы да іх. Адны дэрбы засталіся, ледзьве стаяла ўжо на нагах і іхняя Лыска, але ўсё ж змагла ацяліцца і нават давала якую кроплю малака. А гэта была уга якая зараз падмога! Паходзіць трохі па траве, падгладзіцца — тады і болей дасць.

З гэтай вясной не толькі яна, але і другія звязвалі свае лепшыя надзеі. Ні для кога не было ўжо сакрэтам, што немцаў вось-вось папруць. Казалі, у мястэчку яны як не ашалелі ад страху, а на чыгунцы і на гравійцы дзень і ноч гуло, стаяў няспынны рух. Толькі цяпер найбольш рухаліся на захад, а не на ўсход.

Дзён праз колькі, як пахавалі Зуя, Ліда, падаіўшы вечарам карову, надумала сама схадзіць да Марылі, зноў занесці трохі малака. Прыхапіла і акраец праснака — гэта каб падзяліць хоць пакрышачку між дзецьмі, бо будуць жа, пэўна, глядзець, свідраваць галоднымі вачанятамі. Вядома, гэткая плойма...

Непадалёк ад Зуевых варот яна прыпынілася, пачуўшы не то з кухні, не то з сенцаў — якраз былі адчынены ў хату дзверы — прарэзлівы Марылін голас:

— Падавіся, падавіся сам!.. Не трэба мне твайго нічога. Апомніўся, калі штаны ўжо ўрэйдаў... Пачакай, шчэ не тое будзе... І кароўку я табе ўспомню, як ты валок яе з двара, і шчэ многае...

— За такія разгаворы...— нехта там, усярэдзіне, памкнуўся ўзвысіць тон, але ў час, відаць, адумаўся, папярхнуўся словам.

Ліда пазнала голас. Яшчэ не верачы сабе, яна рашыла

счакаць, не заходзіць у хату. Прыткнулася на лаўцы, нібы каб трохі перадыхнуць. Яно і праўда, ад слабасці ці так ад чаго было чамусьці млосна, моцна кружылася галава.

Марыля тым часам не на жарты раз'ятрылася, крык яе чуўся ўжо ў двары.

— На во, на, укусі за гэтае самае мейсца! Во і спадніцу падыму... Ты прывык лізаць гэта мейсца немцам. Што, выслужыўся? Мала яшчэ збяёдаваў каго? А я ўжо не баюся цябе, не. Не палохай...

Ліда, стараючыся быць непрыкметнай, пасунулася на самы краёк лаўкі, прыткнулася да тоўстага, шурпатага камля старой ліпы. Адчула, як боль, ужо трохі быццам і прыціхлы, зноў схапіў абцугамі, сціснуў сэрца. Зноў, пачуўшы Марылю, кальнула думка: а мо ён, Марчук, вынюхаў пра Пётру і данёс немцам? У той жа дзень, як Пётра хадзіў на сувязь з партызанамі, Марчук якраз — выпадкова ці знарок? — выбраўся ў лес па дровы.

Прыехаў ён дадому не з поўным возам, хоць было яшчэ вельмі рана, і адразу памчаўся чагосьці ў мястэчка. І ўжо к вечару, калі Пётра вяртаўся, таксама з дрывамі, з лесу, яго ля вёскі перахапілі нейкія з матацыкламі, у чорных мундзірах...

Ад гэтых жахлівых згадак хацелася падхапіцца, кінуцца да Марчука і ўжо не крычаць, як Марыля, а адразу ўчапіцца яму ў горла, ды так, каб ажно хруснула пад пальцамі... Але ж паспрабуй зараз чым дакажы, нават заікніся пра гэтыя свае згадкі. Згубіць, злыдзень, звядзе са свету і цябе, і дзяцей... І ўсё ж Марыля во не пабаялася, сказала. Чаму ж у яе такія каляныя ногі і язык быццам праглынула? Колькі ж яна будзе трываць, насіць у сэрцы свой боль, які патрабуе яснасці, патрабуе адплаты?..

Моцна ляпнула брамка, і Марчук, бы кіпнем абліты, выскачыў на вуліцу. Услед за ім праз вароты паляцеў і пляснуўся пад саменькія яго ногі ладнаваты пакунак, загорнуты ў нямецкую газету. Газета разлезлася на шматкі, і Ліда згледзела, хоць і было ўжо досыць цемнавата, вялікую кулідку хлеба і брус сала. «Божачка,— як токам працяла яе,— і гэта яна змагла выкінуць!..»

Марчук, не прыкмячаючы нічога, затрауленым зверам круціўся на месцы. Быў спачатку нагнуўся, каб падняць дабро, але раптам перадумаў. Глуха, утробна хаўкнуўшы, з усяе сілы наском ялавага бота пачаў утоптваць у зямлю спачатку хлеб, затым сала. Чутно было, як ён ажно скрыгатнуў зубамі ад свайго шчыравання. І толькі калі нехта

ля студні запознена загаманіў, пачаў раскручваць калаўрот, ён кінуў гэты занятак і, трымаючыся бліжэй платоў, падаўся дадому.

Ліда адразу ўскочыла з лаўкі, шмыгнула на Марылін падворак. Усе дзверы былі расчынены наросхрыст, і яна, бы цень, бясшумна ступіла на парог кухні. На стале, з краю, тлела газоўка, пры яе слабым хісткім святле Марыля, за гэтыя дні яшчэ болей схуднелая, усохлая, з запалымі вачыма на белым, без аднае, здаецца, крывінкі, твары клала на под дровы, каб за ноч падсохлі. На вялізнай печы, што займала паўкухні, ляжалі ўпокат, адно пры адным, дзеці. Стрыжаныя пад нажніцы хлопчыкі — Ліда, на свой сорам, не помніла добра, як каторага зваць — і збоку, ля коміна, нездаволеныя, пакрыўджаныя чымсьці Рэня і меншанькая Каця. Іхнія галоўкі трохі звешваліся з печы, вочы пільна сачылі за кожным рухам маці. Сярод дзяцей не бачна было толькі Дзімкі. У хаце панавала нейкая гнятлівая цішыня, якую цяжка ўявіць сабе там, дзе ёсць малыя.

Убачыўшы Ліду, дзеці пажвавелі, зашабуршэлі якімсьці рыззём, прагна ўтаропіліся ў гладышак, які трымала яна ў руцэ. Марыля аглянулася, пазнала суседку, абрадавалася:

— Вой, добра, што ты... — І, не даўшы Лідзе сказаць хоць слова, спытала: — Бачыла Марчука? Толькі ж во выскачыў за вароты.

— Бачыла, як жа. Турнула ты яго... Чаго прыходзіў?

— А не здагадваешся бо? Нюх у яго, што ў сабакі таго. Учуў ужо, адкуль вецер падзьмуў. Убачыў, нябось, чым яму абернецца яго служба. Ніхто ж ні пра што не забыўся... За кароўку маю хацеў, брыдота, падачкай адкупіцца.— Марыля раптам захліпала носам.— Можа, яшчэ і мой пажыў бы, каб не гэта ўсё. А то ж во не знаем, як і гаравацъ...

Яна больш не стрымлівала сябе, дала волю слязам. Дзеці на печы зноў сцішыліся, апанурыліся. Каця, праўда, таксама ўслед за маткай пачала румзаць, спачатку тоненька, пасля ўсё галасней і галасней.

Лідзе не хацелася ўмешвацца, суцяшаць пакуль Марылю. Хай трохі паплача. Па сабе ведала, як цяжка без слёз насіць у сабе гора. А вось калі... Яна ўспомніла, што ў яе ж ёсць праснак, выняла яго, загорнуты ў анучку, з кішэні жакеткі, пачала ламаць на кавалачкі. Трошкі большы, які застаўся ад дзяльбы, з паджарыстай хрумст-

кай скарыначкай, дала спачатку Каці. Тая адразу працягнула тоненькую, у сініх жылках на запясці, ручку і, забыўшыся на свой плач, пачала прагна жаваць. Астатнім таксама дасталося па невялічкім акрайчыку. Не хапіла толькі Марылі і Дзімку. Дзімкі, зрэшты, усё яшчэ не было дома. Ліда не стала пытацца, дзе ён. Мо да каго з хлопцаў зайшоў, а то яшчэ якой работай заняты. Ён жа старэйшы ў сям'і, гаспадар, лічы, ужо.

Яны сядзелі доўга, пакуль не паснулі дзеці. Марыля пачала па адным сцягваць іх з печы, класці каго куды ў пасцель. Лідзе таксама трэба было ўжо спяшацца, каб яшчэ тое-сёе зрабіць, падрыхтаваць на заўтра. Аднак яна не магла зрушыцца з месца, не папытаўшы пра самае галоўнае, што пакідала напаследак, што пачало тачыць усё яе нутро, як пачула тыя словы Марылі, кінутыя ёю наўздагон Марчуку: «Мала яшчэ выдаў, збяёдаваў каго?» Колькі гаварылі пра рознае, а ў яе ні на хвіліну не выходзіла з галавы: «Мо яна ведае пра Пётру, ды не хоча сказаць?.. Не хоча, каб было балюча? Чаму ж так смела кінула Марчуку ў вочы гэткія словы? І чаму той, нягледзячы на свой круты нораў, маўчаў, падцяўшы хвост?»

Усё ж яна не спытала, стрымала сябе. Ведала: Марыля сама, без панукі, скажа, калі ёсць што сказаць. Усяму свой час...

Па дарозе дахаты яна вырашыла, што заўтра ж, бо адкладваць няма куды, абыдзе таго-сяго, хто яшчэ нічога не даў, нічым не падсобіў Марылі. Найперш, вядома, загляне да Сымона: каму-каму, а яму, жмінду гэткаму, прыбядняцца не трэба. Бачылі ж многія, не сляпыя, як і сам стары Сымон, і двое яго надта ж пранырлівых, бацечку пераплюнулі, сынкоў — Фанька і Лёдзік — дзень і ноч, не паспелі яшчэ адступіць нашы, ужо цягалі з мястэчковых крамаў і мануфактуру, і алей, і соль, і яшчэ рознае добра. Усю вайну, калі другія не ведалі, як жыць далей, як выкручвацца, Сымон раскашаваў, трымаў карову, каня, меў некалькі авечак і свіней. Чамусьці ні немцы, ні паліцаі яго не чапалі. Умеў, відаць, падладжвацца...

Хацелася Лідзе і яшчэ з адным суседам паталкавацъ — Яўменам, якога за вочы ўсе называлі чамусьці Брындам, ды вось ніяк не ўдавалася падлавіць зручнай хвілі. З тым яна таксама не цырымонілася б, сказала б у вочы ўсё, што думае. Няўжо ж нічога чалавечага ў ім не засталося?

Бедная Малання!.. Божа літасцівы, што выцерпела яна

ад гэткага мужа, колькі сінякоў панасіла і зараз носіць ад яго зверстваў! Але ж каб толькі гэта?! Галоўнае — усё пазамыкаў, усё прыгроб сабе, адгарадзіўся не толькі ад жонкі, але і ад сыноў — Анціка, Платона, Пашкі. Малання ўжо таксама ледзьве ногі цягае, ды і хлопцы не вычухваюцца з хваробы, а яму, брыдоце, на ўсё начхаць. Майструе свае нажы, таркі, пярсцёнкі з гільзаў — тут у яго, нічога не скажаш, рукі хвацкія — і кожную нядзелю чыкільгае на сваім рыпучым пратэзе ў мястэчка, на базар. Што прадасць са зробленага, што памяняе на харч і самагонку і тады ўжо валачэцца да гэтай бессаромніцы, гэтай абдзіралы Паўлючанкі. Там, зачыніўшыся на ўсе завалы, разам гуляюць, балююць, покуль ёсць за што баляваць. Толькі апошнія перад нядзеляю два-тры дні Брында, працверазеўшы, начуе дома. Зноў з ранку да позняга вечара шчыруе, піліць, ляпае, точыць — рыхтуецца да базару. Бронь Бог памяшаць яму ў гэты час, зачапіць хоць словам, а то і проста трапіць на вочы. Звер зверам. Колькі разоў у п'яным шале ганяўся з малатком ці абцугамі і за Маланняй, і за кім-небудзь з хлопцаў. Каб не пратэз, каб большая ўвішнасць, то няйнакш знявечыў бы каго.

І ўсё ж Ліда, колькі Малання яе ні адгаворвала, вырашыла — якраз была субота — зайсці да Яўмена ў ягоную каморку. Знайшла і прычыну: зламаўся кончык кухоннага нажа, і трэба было неяк закругліць яго, зноў навастрыць.

Яна пастукалася, чаго ніколі ў вёсцы не рабілі суседзі. Яўмен, відаць, не пачуў ці не паверыў сваім вушам, што нехта можа стукацца да яго, бо працягваў шоргаць, як і шоргаў, напільнікам. Лідзе давялося пастукаць мацней. Шорганне спынілася, і нездаволены пракураны голас спытаў з-за дзвярэй:

— Хто? Якой трасцы там?!

— Яўменка, гэта я,— Ліда старалася гаварыць ласкавей, спадзявалася, што, якая б ні была тлумная яго галава пасля пагулянкі, усё ж ён пазнае яе, адчыніць, не кінецца ваўкалакам на суседку.

Гэта спадзяванне падмацоўвалася адной таямніцай, пра якую не ведаў ніхто, нават Маланння, але ведалі добра Яўмен і яна, Ліда, бо тычылася толькі іх дваіх. Не можа быць, каб яе прыход, іхняя размова сам-насам ніколечкі яго не ўскалыхнула, не абудзіла хоць што-кольвечы чалавечае.

А быў жа чалавекам, быў... Хіба ж няшчасце з нагой яшчэ за тры ці, здэцца, чатыры гады перад фінскай вай-

ной, калі ў лесе, на павале, не пасцярогся як мае быць і елкай патрушчыла галёнку, праз якую давялося адрэзаць усю нагу,— дык хіба гэтае няшчасце так азлобіла яго, зусім, да апошняга каліўца вытравіла ў чалавеку сумленне? Што ён думае сабе? А яна ж, Ліда, у самую цяжкую для сябе пару, калі разарвала сваё няўдалае замуства з Яшам, а на Пётру пакуль спадзявацца не выпадала, ледзьве не паддалася на заляцанні Яўмена, ледзьве тады, у адну з паездак на сенажаць, устояла супраць яго мужчынскага шалу. Было ж, было... Мо каб ён тады ўжо не быў жанаты, то хто ведае, як магло стацца для яе, ці прасілася б яна гэтак, ці вылузвалася б з яго гарачых абдымкаў. І ўсё ж, нягледзячы ні на што, ён найперш пашкадаваў яе, першы саўладаў з сабою.

Чаму ж зараз, у такі цяжкі і трывожны час, калі сама трэба пільнавацца адно аднаго, падтрымліваць, памагаць адзін аднаму, чаму ж зараз ён гэтак распусціўся, дайшоў да гэткага брыдкага, паганага жыцця? Што ж кепскага зрабіла яму Малання? Кабета ж і руплівая, і стaранная, і тварам не горшая, чым хто ў вёсцы, а ў параўнанні з той сучкай, Паўлючанкай той, наогул, баба — лепшай не трэба. Дык жа не... І Маланні жыццё не жыццё, і дзеці, асабліва большы, Анцік, ад сораму і страху апанурыліся, людзям у вочы баяцца глянуць, бы самі ў чым правініліся, ды і галодныя ж таксама, хоць бацечка шыкуе... Дзе ж тут яго чалавечнасць?

— Ну, чаго хацела? — адчыніў-такі дзверы, пусціў Ліду да сябе ў камору Яўмен.

Аброслы густой чорнай шчэццю, з чырвонымі не то ад бяссоння, не то ад нядаўняй папойкі вачыма ён стаяў перад ёю з нейкай жалязякаю ў руках, нядобра, ваўкавата глядзеў, чакаў, што скажа.

Яна разумела, што зараз, у гэтую вось хвіліну, ушчуваць яго, сарамаціць, нешта там даказваць — марная трата часу. Нічога добрага гэта не дасць. Трэба трохі вычакаць, падысці да яго лаўчэй, асцярожней. А вось як?

Ні да чога не дадумаўшыся, працягнула яму нож, ціха папрасіла:

— Зрабі, Яўменка, завайстры як. Адзін жа гэта ў мяне. Што ж без нажа...

— Часу няма мне,— буркнуў ён, але, заўважыла Ліда, ваўкаватасці ў вачах трохі паменела, чалавека ўзяў бы нейкі одум: як жа быць з ёю, прагнаць ці ўсё ж уважыць просьбу?

— Я ж не за так, я ж чым-небудзь аддзячу,— яна старался не ўпусціць моманту, не даць яму ніякага пярэдыху, ніякага часу на пярэчанне. Бо, ведала добра, калі ўжо заўпарціцца, стане на дыбкі, то ніякімі довадамі, ніякай лагодай яго не проймеш: такі характар.— Мёду трохі пасля, летам, дам, на лякарства табе і дзецям з Маланняй...

— Ат, пляцеш бо,— абарваў яе груба.— Мёду-смуроду... Трэба мне твой мёд, як сабаку тая палка. Сама галота... — Ён нечакана, ажно напужаў яе, вырваў з рук нож, каравым учарнелым пальцам правёў па лязе, зморшчыўся, бы зуб яго хапіў, пасля ўталопіўся, пра нешта думаючы, на зламаны кончык.— Заўтра прыходзь...

— От добра, Яўменка, зрабі. Заўтра забяру... Я ж ведала, што не адмовіш...

Яна ўсцешыла сябе, што нейкі пачатак зроблены, што заўтра, калі Яўмен яшчэ болей прачхаецца, можна будзе ўжо смялей з ім паталкаваць аб тым-сім, трохі раскрыць яму вочы і на самога сябе, і на Паўлючанку. Гэта ж зусім ужо трэба быць сляпым і глухім, каб не бачыць, не чуць, як яна абдзірае яго, бы ліпку, пасля бессаромна абгаворвае, насміхаецца, ганьбіць самай горшай для мужчыны ганьбай... Калі хоць трохі гонару мае, то, можа, паслухаецца, хай сабе не адразу, але паслухаецца людзей, павернецца інакш да дзяцей, да Маланні. А не захоча, то прападзе, здохне, бы той сабака пад плотам. Паўлючанка не стане плакаць па ім, не...

Не думала, не гадала Ліда, што ні заўтра, ні паслязаўтра не давядзецца ёй ісці да каго-небудзь. Ні да Сымона, каб памог, падкінуў што Марылі, ні да Брынды, нават хаця б забраць гатовы нож. Падзеі наспелі, павярнуліся так, што ёй было не да гэтага...

## 10

Яшчэ на золку, не справіліся пакуль выгнаць кароў, яшчэ не данесла Ліда ў хату даёнку з пеністым сырадоем, як з боку мястэчка, спачатку па сцежцы, пасля і вуліцаю пацягнуліся, напаўняючы ўсё суцэльным гудам і грукатам, нямецкія машыны, матацыклы, нават танкі. Многія машыны валаклі за сабою гарматы, іншае чортведама якое

страхоцце. «Божачка, няўжо зноў?!» — абпаліла Ліду жахлівая думка.

З вядром у руцэ, так і не дайшоўшы да ганка, яна застыла ў двары, паспеўшы толькі, каб не ўбачылі, прыткнуцца да дубовага шула.

Але немцы нібы і не думалі, каб дзе спыніцца, нібы ім было ні да кога і ні да чога. Чым пільней прыглядалася Ліда ў ранішняй яшчэ шэрані да таго, што рабілася на вуліцы, тым болей і болей расла пераканансць: гэта ж бягуць, адступаюць на захад галоўныя нямецкія часці. Па чыгунцы і гравійцы ўжо не спраўляюцца, дык і сюдою ажно паперлі. Во прыспічыла!

Яна адчула, як страх, што скаваў быў адразу ўсё нутро, пачаў памаленьку развейвацца, саступаў месца нейкай апантанай радасці, хоць, ведала, да сапраўднай радасці трэба яшчэ дажыць. Па цяперашнім часе, у такім віры і калатнечы, усякае можа стацца. Яшчэ невядома, што здольны ў апошнюю хвіліну выкінуць вораг. На Баркунах, ды і не толькі іх, людзі змаглі пераканацца.

І ўсё ж, як ні дзіўна, Ліда перастала баяцца. Яна, цяпер ужо не хаваючыся: «Ат, што будзе, то будзе»,— павольна пайшла па двары, знарок затрымалася ля ганка, быццам каб сашмаргнуць наліплы да ног гной, затым падалася ў хату.

Ля печы ў адной белай сарочцы стаяла Верка. Убачыўшы маці, яна захліпала носам.

— Ты што, дачушка? — Ліда зноў напалохалася, бо згледзела, што і Коля, і Вадзім таксама стаяць неапранутыя, твару на тых няма.— Вы чаго гэтак, дзеткі?

— То ж немцы... Мы думалі... — Коля першы ўзяў сябе ў рукі, падаўся да ложка, пачаў апранацца.

Ліда паставіла даёнку на ўслон, падышла да Веркі, абняла, прытуліла яе распэтланую пасля сну галаву да грудзей, супакоіла:

— Нічога, можа ж, пранясе як. Ідзіце ўсе, апранайцеся скарэй. Лепей быць апранутымі...

Успаролі і малых — Лёву і Славіка. Тых ніколі гэтак рана не будзілі, таму яны, не зважаючы на гуд і грукат за акном, ад чаго дрыжэла ўсё ў хаце, ды і сама хата, хныкалі, наравілі вылузацца з рук, зноў кінуцца на сяннік, зашыцца пад коўдру. Аднак пакрысе раскатурхаліся, памкнуліся былі да акна. Ліда ды і Коля так цыкнулі на іх, што яны адразу пабраліся на печ, адтуль ужо насцярожана цікавалі, што робіцца на вуліцы.

— Мама, а Лыска як? — спытаў Вадзім, стоячы перад маці ва ўсёй сваёй пастушковай апратцы.— Ужо ж, мусіць, гнаць трэба...

— Куды гнаць?! Ты што чаўпеш? Хіба што на згуб галавы... — Яна стаяла ля печы і цяпер і праўда не ведала, як быць далей. Пара было б распальваць дровы, варыць што-кольвечы, але не рашалася: мо ўсё ж не высоўвацца, не варта нічым дражніць немцаў. А то яшчэ, згледзеўшы дым, учуўшы яду, спыняцца, бронь Бог уваляцца ў хату, запатрабуюць чаго. Не дасі, то пойдуць і ў хлеў. А там...

Непакой за Лыску і парсючка — цяляці ўжо не было, ужо з паўмесяца, як зварылі апошнюю костку — на хвіліну зацьміў і страх за сям'ю. Яна схамянулася, пасарамаціла сябе, што ў такі момант думае не пра галоўнае — як ды дзе ўберагчыся, пакуль аціхне, пакуль прыйдуць нашы, а чортведама пра што.

Хацелася схадзіць да каго з суседзяў. Але ж як і нос высунуць куды? Лепш, мусіць, ужо сядзець, бы мышы тыя, на адным месцы. І ўсё ж не выходзіла з галавы: мо ўсе вяскоўцы паўцякалі, і толькі яна, дурніца апошняя, тырчыць дома, не ўчула небяспеку?

З розных вокнаў, праўда, не высоўваючыся надта, каб не прыкмецілі, яна глядзела, ці паліць хто, ці ёсць дымы над комінамі, бо сама ж у гэты час і ўходжваліся наранні. Але, колькі ні цікавала, так і не ўбачыла ніводнага дымка. Ды і людзей, ні малога ні старога, таксама не бачна было ні ў адным двары.

Невядомасць, няпэўнасць мучылі, яна так і не запаліла ў печы, наліла толькі ўсім па кварце малака, падзяліла апошнюю звараную яшчэ ўчора ў мундзірах картоплю, якую ашчаджала на абед. Абабрала і дала яшчэ па круглячку бручкі.

Праз вулічны вэрхал, што так і не аціхаў ні на хвіліну, яна не ўчула, як нехта зайшоў у сенцы. І толькі калі ляпнула клямка, Ліда, здрыгануўшыся ўсім целам, сама не свая павярнулася да дзвярэй. На парозе стаяла Манька, старэйшая Пётрава сястра, якая жыла на пасёлку, бліжэй да рова.

— Ты, Манечка? — узрадавалася Ліда, нібы забыўшыся пра сваю крыўду, пра тое, што ўжо больш чым год яны былі ў сварцы, не размаўлялі, не здароўкаліся, нават на пасху ні тая, ні другая не пусцілі па валачобнае адна да адной і дзяцей.

Крыўду, здавалася, недаравальную на ўсё жыццё крыўду нанесла ёй Манька, калі ішлі кагалам з царквы, дзе Ліда заказвала па Пётру паніхіду — якраз была гадавіна, як яго не стала. Ліда, хоць і прайшла добры кавалак дарогі, усё яшчэ не магла апомніцца, не размаўляла з жанчынамі, бясконца хліпала і хліпала носам, часам нават, калі валам пад грудзі накочвала жалоба і нельга было з ёю саўладаць, плакала наўзрыд. Бабы суцяшалі яе, і толькі адна Манька, закапыліўшы губы, зацята маўчала, пасля, не вытрымаўшы, ляпнула, бы нажом торкнула ў саменькае сэрца:

— Так ужо і гаруеш, так і бядуеш... Ха, што слёзы тыя. А чо ж не гаравала, як з ліцянантам круціла, чо ж не берагла, пусціла аднаго ў лес? Была б з ім побач, памагла б, то...

Тады, помніцца, каб не бабы, Ліда павыдзірала б ёй валасы, не палічылася б, што і сястра Пётры. Яе білі дрыжыкі, шалёнымі вачыма свідравала яна залоўку, а вось слоў патрэбных не знаходзілася. Хоць было што сказаць у адказ. Ведала, добра ведала Ліда прычыну Маньчынага раздражнення. Гэта ж такі дармовы кус з рук выслізнуў!..

Уся закавыка была ў тым, што Пётра — незадоўга да сваёй смерці — перавёз на сястрын пляц, бліжэй да логу і далей ад нямецкіх вачэй, калоды з пчоламі. У першы месяц-другі, калі яго не стала, Лідзе было не да пчол, яна нібы і забылася пра іх. Калі ж і адна, і другая жанкі прыйшлі і расказалі, што Манька ў мястэчку прадае мёд, бачылі гэта не раз, Ліда ажно ўз'юшылася: як гэта так, яны самі сядзяць на нішчымніцы, няма за што прыдбаць ні газы, ні солі, а залоўка паспела, нікому не сказаўшы, залезці ў вуллі і распараджацца чужым мёдам?! Хіба ж гэта не нахабнасць?!

Вядома, вуллі забралі назад, паставілі на сваім агародзе. І калі раней Ліда меркавала, што за паслугу аддасць Маньцы, назусім аддасць вулей, а то і два, хай толькі даглядае, не дасць пчолам прапасці, то пасля такога выбрыку з боку залоўкі і не заікнулася пра свой намер. Вось тая і шалела, вось і не ведала, як і за што ўкусіць.

За гэты год, пакуль яны не зналіся, Ліду ўсё ж не-не дый браў одум: а мо не варта варагаваць, не чужыя ж? Як ні кажы, Манька — родная кроў Пётры, і ў яе ж, хай сабе байструк, але неблагі хлопец, Грыша, расце. Хоць адзін ён у яе, але і яго гадаваць трэба. Ды і такі неспакойны час

зараз: сёння жывеш, а заўтра невядома, што з табою будзе.

І Лідзе ўжо вельмі дробязнай здавалася прычына іхняй сваркі, калі ў свеце гэтулькі гора, крыві, несправядлівасці. Спрахнуў бы той мёд, каб з-за яго не размаўляць, варагаваць нават. Але ж не яна, не яна першая ўсчала. Бач, трэба было ўпікнуць лейтэнантам, калі сам Пётра ніколі не ўпікаў. А што наконт таго, што пусціла яго аднаго ў лес... Гэта ўжо зусім смеху варта, такое абвінавачванне. Пэўна, сказанула залоўка, толькі каб лацвей уджаліць. Мо і сама шкадуе, аднак жа слова не верабей...

Вось чаму, убачыўшы Маньку ў сваёй хаце, ды ў гэткі момант, калі сэрца разрывалася на кавалкі ад няпэўнасці і невядомасці, Ліда гатова была нават кінуцца і расцалаваць залоўку.

— Як жа ты прайшла? Кудою? Не вуліцаю ж мо... І дзе гэта людзі ўсе? — яна, не даўшы Маньцы і слова сказаць, нават павітацца, адразу засыпала яе пытаннямі.

Манька, адчувалася, была задаволена пачаткам іх стрэчы, тым, што Ліда не стала высвятляць адносіны, быццам нічога ніякага між імі не адбылося, быццам толькі нядаўна бачыліся, пра ўсё перагаварылі і вось зноў напаткаліся па пільнай патрэбе.

— Праз плот лезла, чо ж заставалася. Во і спадніцу нават падрала,— Манька і праўда паказала дабрэнную, з пядзю, дзірку на старой шарачковай спадніцы. Яна цяжка дыхала, на твары яе, гэтаксама, як і ў Ліды, ляжаў адбітак страху, разгубленасці.

— Учора чалавека з Заямнага бачыла. Кацярына наказвала, каб, як што якое, да іх усе дабіраліся. Там ужо немцы не дастануць, скулу ім.

Ліда ўзрадавалася:

— Я таксама пра гэта думала. Але ж як і скаціну, і хату кінуць? Дый высунься зараз куды... Мусіць, ад лёсу свайго не ўцячэш...

— Чалавек той праўду казаў, што не сёння-заўтра немцы пабягуць па ўсіх дарогах, не паспеюць і порткі падцягнуць. А як, казаў, нашы сядуць ім на пяткі, то і міны, і кулі, і бонбы тыя — усё ў ход пойдзе. Пекла будзе. Чо ж, ведае, мусіць...

— Хто ж кажа, што не ведае,— пагадзілася Ліда.— Усё, пэўне, так і будзе. А вось жа вазьмі, ведаючы нават, скраніся з месца. Хай нават і да Кацярыны. Не лёгка гэта.

— Ну, то глядзі... — Манька хоць і не аддыхалася, але

прысесці на ўслон адмовілася, тым жа ходам, праз плот, зазбіралася назад — дома адзін Грыша застаўся.

К абеду машын паменела. Недзе праз паўгадзіны на вуліцы і зусім сціхла, тым часам як на сценцы ўсё яшчэ гуло і віравала. Аднак трывога трохі спала, і Ліда падумала, што мо і добра, што яны нікуды не пабеглі, перачакалі ў хаце. Тыя, хто, як і яна, не ўцёк у лес, сядзеў-хаваўся дома, хто ў зямлянках сярод агарода, хто яшчэ дзе, зараз нясмела высоўваліся за вароты і брамкі.

Лідзе няўцерп карцела хутчэй даведацца, ці не ўчынілі чаго паганага немцы, скончыцца ўсё гэтым перапалохам ці не. Мо ж хто ведае, скажа?

Убачыўшы, што нехта круціць калаўрот, яна ўзяла вёдры і, хоць Коля падахвоціўся сам прынесці вады, таропка падалася да студні. Калі ўжо вярталася з поўнымі вёдрамі, з жахам убачыла, як непадалёк ад іхняе хаты, з'ехаўшы трошкі з сярэдзіны дарогі, спынілася акаясьці акрытая брызентам машына. З кабіны выскачыў шафёр у нямецкай форме, без пілоткі, задраў капот, пачаў корпацца, нешта рабіць усярэдзіне. Памкнуўся быў завесці, каб ехаць далей, але матор толькі чмыхнуў і на большае не паддаваўся. Побач з шафёрам, згледзела Ліда, сядзеў і яшчэ нейкі ў форме, з пагонамі, у высокай шапцы-кукардзе. «Афіцэр,— падумала сама сабе.— Вось яшчэ насланнё! І якраз блізка ля хаты...»

Яна чакала, што зараз, скарыстаўшы прыпынак, з-пад брызенту вываляцца нямецкія ваякі і, само сабой зразумела, пойдуць шнарыць па дварах. Тады ўжо не чакай дабра... Але ніхто не выскокваў на зямлю, і Ліда здагадалася, што там, пад брызентам, нікога больш няма. А гэтыя ж двое мо не будуць надта затрымлівацца, мо ж парамантуюць і кінуцца даганяць сваіх.

Час між тым ішоў, а машына як прыкіпела да месца. З двара чуваць было, як афіцэр усё грамчэй і грамчэй пачаў нешта гергетаць, пэўна, лаяцца, дакараць шафёра. Той не апраўдваўся, маўчаў, усё роўна як вады ў рот набраўшы.

Ліда не стала чакаць, калі яны паедуць. Трэ было нечым накарміць Лыску, бо тая з галаду ўжо колькі разоў трывожна мыкала, падавала свой голас. За хлявом, на паўмежку, адрасло трохі травы, і Ліда, захапіўшы з кладоўкі серп і плецены з лазы кош, пайшла ў агарод. Выклікалася памагчы ёй і Верка.

Але ўжо праз якое паўгадзіны Ліда на чым свет прак-

лінала сябе, што не паслухалася залоўкі, паспадзявалася ціха адседзецца ў гэткай заварусе...

Кормячы Лыску, яна ўчула стрэл, запар адзін і другі. Бы.апантаная, выскачыла на падворак. За ёю, без адзінай крывінкі ў твары, пабегла Верка. З хаты, таксама дарэшты напалоханыя, выглянулі Коля і Вадзім.

На вуліцы, непадалёк ад машыны, Ліда згледзела купку дзяцей, сярод іх вока адразу вылучыла Славіка. Лёва стаяў трохі збоку, яго за каўнер кашулі моцна трымаў афіцэр, нешта злосна гаварыў, раз-пораз размахваў наганам.

Дзеці, асабліва малыя, жаласліва ўсхліпвалі, але нікуды не разбягаліся. «Што ж, што там адбылося?!» — маланкай мільганула, апякла думка. Але колькі крокаў не дабегла да машыны, як зноў учула стрэл, куля, бачна было, шпокнула, уздыбіла зямлю каля саменькіх Лёвавых ног.

— Паночку, што ён зрабіў?! — Яна не ведала, што гаварыла б яшчэ, як было б усё далей, калі б афіцэр раптам не адпусціў хлопца, не палез зноў у кабіну.

Лёва, каб Ліда не падхапіла яго, пэўна, грымнуўся б долу.

— Сыночак, родненькі,— несучы яго, безуважнага, нейкага бы чужога, у свой падворак, роспачна казала яна.— Чаго ж было перціся туды? Што ж вы там не бачылі? І за што ж ён цябе, гад гэны, ірад гэны паганы?..

Ужо трохі пазней, калі машына завялася і паехала, Ліда дазналася пра ўсё падрабязна.

Іх, спачатку Лёву, які неспадзеўкі высунуўся на вуліцу, пасля іншых хлапчукоў, хто таксама не мог уседзець дома, вyслізнуў з-пад увагі дарослых, паклікаў, кіўнуўшы пальцам: «Ком, ком», гэты самы афіцэр. Каверкаючы словы, ён так-сяк растлумачыў, што ад іх хоча. Аказваецца, трэба было знайсці нейкую маленькую спружынку, якая нібыта пстрыкнула невядома куды.

Хлапчукі, хто на коленцах, хто так нагнуўшыся, пачалі аглядаць кожны камячок зямлі, кожную травінку, трэсачкамі, дубцамі асцярожна разграбалі пясок, баючыся, каб часам не наступіць, не затаптаць тую макулінку. Колькі, аднак, ні шчыравалі, усё было марна. Штохвіліны паглядаючы на гадзіннік, афіцэр яшчэ больш занерваваўся, зноў нешта злоснае сказаў шафёру.

Ці то спалохаўшыся, ці мо таму, што надакучыла гнуцца і шукаць невядома што, той-сёй з хлапчукоў хацеў



4—2157

шмыгнуць дахаты. Афіцэр тым часам гэтак гыркнуў на іх, што ўцекачы ўмомант вярнуліся кожны на сваё месца, зноў пачалі свідраваць вачыма дол.

Лёва далей чым хто адышоўся ад машыны. Некаторыя бачылі, як ён раптам укленчыў, бы падняў што ў траве, як правая рука яго хуценька матлянулася ў кішэню штаноў і назад. Афіцэр таксама, відаць, нешта прыкмеціў. Ён павярнуўся ў бок Лёвы і пранізліва сачыў за кожным яго рухам. Счакаўшы хвіліну, зларадна ўхмыльнуўся, гукнуў:

— Ком, ком!..

Усе перасталі шукаць, выпрастаўшыся, уталопіліся на яго. Афіцэр, бы гуляючы, забаўляючыся з курком, зноў пашавяліўшы сагнутым у крук пальцам, паклікаў да сябе Лёву. Хлопчык нясмела падышоў. Гэтак жа зларадна ўхмыляючыся, немец нечакана запусціў пальцы да Лёвы ў кішэню, пабрынчэў там нечым. Затым падпіхнуў яго да шафёра, загадаў высыпаць усё на невялікую паласатую анучу, што была паслана на зямлі.

Лёва, чамусьці ўсё больш і больш чырванеючы, неахвотна спаражняў кішэню. Сярод каменьчыкаў, розных каляровых шкельцаў, пустых гільзаў, іншага хлапчукоўскага дабра раптам мільганула, упала на анучу і спружынка. Шафёр з палёгкай уздыхнуў, хапіў яе, кінуўся да машыны. Афіцэр жа, нічога не кажучы, павольна расшпіліў кабур і два разы стрэліў Лёву пад саменькія босыя ногі. Ад страху той прысеў, гатовы быў нават паваліцца, але немец з сілай тузануў хлопчыка за каўнер, прымусіў стаяць і зноў шпокнуў, усадзіў кулю ў зямлю бліз пятак.

Гэты, трэці, стрэл чула, бачыла і Ліда.

Ужо ў хаце, тулячы Лёву да сябе, яна прыткнулася на край кушэткі, пасля спахапілася, абмацала яго ногі, агледзела ўсё цела. Раны, на шчасце, нідзе не было. Аднак Лёву пачала біць нейкая ліхаманка, ён па-ранейшаму не мог сказаць ніводнага слова. Ліда пашукала кажух, накрыла хлопца. Спадзявалася, што ён угрэецца, засне на кушэтцы. А там мо і лепей стане...

На вуліцы між тым зноў усчаўся рух. Натужліва равучы маторамі, пайшлі яшчэ больш цяжкія машыны. Цяпер не толькі шыбы ў вокнах дрынчэлі, але і падвешаная да столі, з закапцелым шклом лямпа пачала вырабляць у паветры чортведама якія выкрутасы.

Сумненняў у Ліды больш не было: трэба як мага хутчэй уцякаць з вёскі, не чакаць самага горшага. У Кацярыны, пэўна ж, не прападуць.

## 11

Усе карты зноў зблытаў ім Лёва. Пакуль маці корпалася ў кладоўцы, збірала хатуль, пакуль Верка і Коля выводзілі, навязвалі за хлявом, пры паўмежку, карову, а ён, Вадзім, шукаў, што кінуць, каб не вішчаў, мог чым пажывіцца падсвінак, Лёва нечакана знік, бы ў ваду кануў. Маці ажно рукі ламала, дакараючы сябе, што не ўпільнавала хлопца. Яны, усе разам, агледзелі кожны закутак, кожную ранейшую яго хованку, злазілі нават на гарышча, шукалі ў хляве і пад паветкай, але нічога гэта не дало. Гукаць таксама не выпадала, бо ў такім гудзе і грукаце, які поўніў наваколле, нават свайго голасу не было чутно.

— Славічак, дзіцятка, можа ж, ты бачыў, ведаеш, дзе ён? — дапытвалася маці ў малога, але той хітаў галавой, пачынаў нават хныкаць, і яго пакінулі ў спакоі.

Калі ж аднекуль, не з-пад мястэчка, а з боку мелзавода, данёсся выбух, пасля яшчэ і яшчэ, маці не то загадала, не то папрасіла:

— Бяжэце, дзеткі! Адны бяжэце! А я ўжо тут папільную... Не кінеш жа яго аднаго. Божа-Божачка, што ж гэта з хлопцам такое? Гэтак перапалохалі! Хоць бы з перапалоху не ўдумаў чаго?.. Хіба ж ён кеміць што? Знайду, то мы дагонім. А цяпер бяжэце!..

— А вы як, мама? — цяпер ужо заплакала Верка.

Маці бы не пачула яе слоў, наказвала далей:

— Ты ж, Коля, Славічка глядзі, каб не адстаў. І ўсё астатняе... А дарогу ж мо ведаеце... Мінеце лог, далей узбоч лесу, каля сажалак, пасля балацявінай — там жа зусім неглыбока, за ёю на грудку ўбачыце Матэцкага хутар. Адтуль ужо і рукой падаць будзе да Заямнага. Ды вы ж мо і не адны такія будзеце. Пэўна ж, многія вяскоўцы туды кінуліся... Бяжэце, дзетачкі...

...Яны мінулі ўжо свой агарод, праз дзірку ў Маланніным штыкетніку — нехта, відаць, толькі нядаўна працерабіў — выйшлі ў завулак, адкуль рукой падаць было да логу, як іх дагнала маці.

— Пачакайце трошкі, дзеткі... — яна, цяжка дыхаючы, раз-пораз хапаючыся за сэрца, прыхінулася да плота, памкнулася была яшчэ нешта сказаць, але раптам са слязьмі на вачах кінулася да кожнага, пачала апантана цалаваць.

— Вы што, мама?.. — зноў не вытрымала, захліпала носам Верка.— Можна ж усім разам...

Маці адразу ўзяла сябе ў рукі, высушыла слёзы, пасуровела:

— Не, не, вы бяжэце... Унь, чуеце, ужо бліжэй грыміць. А Лёву як знайду, тады...

Вадзіму чамусьці як ніколі шкода было, што маці не з імі. Здаецца, таксама нікуды б не пабег, застаўся б з ёю, памог бы пашукаць брата. Але ж хіба яна паслухаецца?

За Яцуковай хатай, адкуль адразу пачынаўся спуск на лог, Вадзім знарок запаволіў хаду, яшчэ раз абярнуўся: маці, бы ўкопаная, стаяла на адным месцы, глядзела ім услед. Колі са Славікам і Веркі не было відаць, яны ўжо, пэўна, падыходзілі да мосціка, а ён ніяк не мог рабіць гэтыя апошнія крокі, якія разлучаць яго з маці і схаваюць яе з вачэй.

У гэты момант Вадзіму чамусьці здалося, што ўжо ніколі-ніколі не ўбачыць яе, не пачуе яе голасу. Адчуваючы, як нешта камяком, не пракаўтнуць, падвярнула да горла, ён яшчэ, апошні раз, махнуў ёй рукой і кінуўся даганяць астатніх...

Другія суткі мінулі, пайшлі трэція, а маці з Лёвам усё не было і не было. Цётка Кацярына згадзілася пусціць Колю з Вадзімам у разведку, але цётка Манька — яна з Грышам дабралася ў Заямнае на паўдня раней — настрашыла, угаварыла пачакаць хаця б да вечара.

— Чо ж перціся на злом галавы,— казала яна, калі ўсе, цесна абляпіўшы стол, снедалі, елі картоплю з расолам, падбеленым казіным малаком: у цёткі Кацярыны каровы не было, трымала толькі казу.— Вечарам жа самі чулі, як там, у тым баку, яшчэ вухкала, як грукатала. Можа, Ліда сядзіць дзе ў зямлянцы на агародзе, носа не высуне. Многія ж не змаглі ўцячы...

І ўсё ж пасля абеду яны, не паслухаўшыся нікога, выправіліся ў дарогу. Верка пакінула Славіка гуляць з Грышам на поплаве каля хаты і трохі правяла іх. Па яе апануранымм выглядзе Вадзім здагадаўся, які камень у яе на сэрцы, у якой яна трывозе за маці і брата, ды і за іх абодвух. Яна мо і далей прайшлася б з імі, але Коля настояў, каб вярталася, і Верка, ні слова не сказаўшы, бы пакрыўджаная, адразу павярнула назад.

Яны рашылі даць кругаля, гэты раз не набліжацца да

сядзібы Матэцкага: пабаяліся яго шалёнага сабакі. Напалохала іх, толькі прыйшлі ў Заямнае, цётка Кацярына. Дазнаўшыся, што дабіраліся праз хутар, яна ажно скаланулася, пасля накінулася на Маньку:

— Я ж знарок наказвала, каб тудэю не ішлі. Ты хіба не перадала Лідзе?

Манька павінілася, сказала, што зусім гэта выпала з галавы. Цётка Кацярына, павохкаўшы, пабедаваўшы, што не прыйшлі Ліда з Лёвам, тут жа, у двары, расказала, якая жахлівая прыгода надарылася нядаўна ў Матэцкага.

Ноччу да яго пастукалі. Ён, хоць і адчуваў сябе нямогла — ведама, чалавеку даўно за шэсцьдзесят, ды яшчэ і хвароба нейкая прычапілася, тачыла і тачыла, гэтак жа, як і яго кабету Адолю,— усё ж скараскаўся з палка ля грубкі, выйшаў у сенцы, папытаў, хто гэта і чаго трэба. «Партызаны»,— адказалі знадворку, за дзвярыма.

Партызан ён не баяўся, усю вайну яны часта па той ці іншай прычыне наведваліся да яго не толькі ноччу, але, бывала, і днём, таму смела адкінуў завалу. У хату зайшлі двое, зусім незнаёмыя. Не павітаўшыся, не папрасіўшы, як другія, чаго падсілкавацца, яны пачалі ўсюды шнарыць, перавярнулі ўсё ў шкапе, забралі, кінулі ў брызентавую торбу яго хромавыя боты, туды ж запхнулі Адоліну ваўняную хустку, без якой старая замерзла б зімой, пачалі прымервацца і да новага сынавага фрэнча.

Вось тут па-сапраўднаму ўзвінціўся, не сцярпеў стары Матэцкі: як гэта так, яго Лёнік у чырвоным войску ваюе, кроў сваю недзе пралівае, а тут нейкія ліхадзеі будуць іх рабаваць?! Яшчэ партызанамі назваліся!.. Бандзюкі яны, а не партызаны. Партызан ён бачыў уга колькі! Ён яшчэ ўспомніць ім, хай не думаюць. Будзе на іх управа! Пад зямлёю знойдзе, пазнае... Хай не спадзяваюцца на яго літасць...

— Што і як там было па парадку,— расказвала цётка,— невядома. Стары Матэцкі, увесь у крыві, толькі к абеду пасля той ночы прыпоўз у вёску. Калі трохі ачуняў, калі перавязалі раны на галаве і назе, тады папрасіў, каб схадзіў хто, паглядзеў, што са старой. У яе ж таксама стралялі...

Трое мужчын хадзіла. Жахнуліся ажно, калі ўбачылі, што ў двары. Адоля, ужо нежывая, са шклянымі зрэнкамі, ляжала ля калодзежа, тут жа енчыў, курчыўся, дадыхаў адзін з двух вялізных, бы ваўкі, сабак Матэцкага. Другі шалёна бегаў трохі далей, ірваў, грыз ланцуг, ажно зубы

крышыліся. Ледзьве выцягнулі Адолю, каб пахаваць на могілках.

— А сабака,— заключыла цётка,— той, што быў на ланцугу, усё ж сарваўся, бегае каля хутара, вые поначы. Не дай Бог трапіць яму на вочы...

...Ішлі з Колем асцярожна, прыглядаліся да кожнага кусціка, кожнай лагчынкі, кожнага дрэўца,— баяліся, каб таксама не напароцца на каго чужога. Хутар Матэцкага ўжо далёка застаўся ззаду, але ўсё яшчэ тачыла, не давала хоць трохі расслабіцца, пачуць сябе вальней і думка пра здзічэлага сабаку: а раптам ён адбегся ажно сюды, зараз вось выскачыць, накінецца, пашкуматае на кавалкі. Паспрабуй адбіся голымі рукамі ад гэткай ваўкарэзіны!

Толькі калі прачмякалі, падкасаўшы штаны, праз балацявіну — абысці яе было б надта доўга,— Вадзім ускінуў галаву, уздыхнуў з палёгкай.

Сонца сёння не скупілася, пякло нібы летам, і ён на хаду, каб не адстаць ад Колі, сцягнуў праз галаву свой цеснаваты ўжо світэр, застаўся ў адной палатнянай кашулі з парваным па-жывому рукавом: гэта ў цёткі, калі выклікаліся з Грышам напілаваць трохі дроў, зачапіўся за сук, за што Верка дала яму добрую прачуханку.

Без світэра адразу стала лягчэй, і Вадзім параўняўся з братам, пайшоў поруч. Колю, бачыў, таксама было горача, лоб яго густа пабраўся пацеркамі поту.

— Пасядзім трошкі,— прапанаваў Вадзім.

Коля нібы чакаў гэтых слоў, адразу кінуўся на траву, расцягнуў ногі. Каб хоць на хвіліну адагнаць думкі аб маці з Лёвам, Вадзім нечакана ўспомніў, папытаў:

— А мама бачыла, што ты лыжы зламаў? Га, Коля?

Коля паморшчыўся, акурат зуб яго хапіў:

— Знайшоў калі і пра што пытаць... Тут і без таго галава пухне.

Памаўчалі. Вадзім павярнуўся на спіну, так, каб не сляпіла вочы, паўглядаўся ў неба. Хмар амаль не было, толькі светлыя кучаравыя воблачкі, якія ніколькі не мяшалі сонцу, быццам застылі, прывязаныя кім, у бясконцай блакітнай глыбіні. Хацелася глядзець і глядзець у гэтую бездань, не думаючы ні пра што благое. Можа ж, усё будзе добра. Можа ж, скончылася для іх вайна і не трэба ўжо хавацца, дрыжэць, уцякаць невядома куды. Не верыцца ажно. Але ж гэта, пэўна, так. Вунь як ціха ўсюды,

як, улагоджанае вясновым цяплом і цішынёй, усё вакол радуецца, спяшаецца жыць: і божая кароўка, што невядома адкуль успаўзла на Вадзімава калена і адтуль ужо спрабуе зараз расправіць свае маленькія крыльцы, пэўна, каб узляцець, і — вачэй не адвесці — вясёлкавага колеру матылёк, які не ведае ўтомы, усё кружыць, усё лунае над зямлёй, і вось тая мурашачка — яна цягне, узваліўшы сабе на спіну, нейкую ношу, ажно ўдвая ці ўтрая большую за сябе. Усё-ўсё ў добрай жывой мітусні. І няўжо ж яшчэ ўчора тут недзе блізка вухкала, страляла, што і ў Заямным было чутно, няўжо сеяла смерць?!.

Пайшлі далей.

Уперадзе чарнеўся густы падлесак, за ім упрытык — нешырокая падкоўка старога яловага лесу, куды найчасцей хадзілі з іхняе Жорнаўкі ў грыбы, асабліва восенню, як сама высыпалі апенькі: бралі іх тут вёдрамі і кашамі хто колькі мог. Лес, хоць праз яго, напрасткі, было б і бліжэй, усё ж абагнулі ўскрай, па звычнай дарозе ля сажалак. Калі, задыхаўшыся, узбеглі на ўзлобак перад логам, убачылі на другім баку яго і Жорнаўку: усюды, здэцца, было ціха, спакойна. Колькі ні глядзелі, ні прыслухоўваліся, не заўважылі нічога, што магло б насцярожыць. Дык чаму ж тады гэтак непакоіцца сэрца, чаму ж ні на хвілінку не адпускае, запаўняе ўсё нутро нейкая неўсвядомленая трывога, якая, чым бліжэй дадому, усё большае і большае?

На лозе, перад саменькай, лічы, ужо вёскай, толькі ўзысці на пагорак, Коля тонам старэйшага, тонам, які не даваў ніякай надзеі на пярэчанне, сказаў:

— Застанешся пакуль тут. Вунь у тым алешніку. Я адзін пакуль... Ці мала што...

— Дык жа... — памкнуўся нешта давесці Вадзім, але Коля гэтак зіркнуў на яго, што хлопцу нічога не засталося, як скарыцца.

Алешнік рос нягуста, але хавацца ў ім было добра. Тут многія жорнаўскія капалі некалі гліну, і ямы, глыбокія норы, калі, вядома, стаяла суша і высыхала вада, хлапчукі скарыстоўвалі для сваіх бясконцых забаў, гульняў у вайну, хованак.

Зараз тут ні адной жывой душы не было. Хоць бы каго са сваіх хлопцаў пабачыць, перакінуцца словам. Дзе ўсе, куды параскідала гэтая завяруха?

Невядомасць мучыла. Вельмі кружылася галава і хацелася піць.

Сонца стаяла ўжо як не над самым лесам, яно ўвачавідкі большала, чырванела, бы налівалася крывёю. Вадзіму станавілася чамусьці нават вусцішна. Здавалася, што мінула цэлая вечнасць, як ён тут адзін.

Нарэшце, не вытрываўшы, ён скіраваў на дарогу, праз дашчаны мосцік, кімсьці за гэтыя дні напалову раскіданы і патрушчаны, перайшоў на другі бок ручая, пачаў падымацца ўгору.

Ужо ля Яцуковага агарода ўбачыў Колю. Брата было не пазнаць. Ён не ішоў, а, нібы ўчадзелы ці падбіты кім, чамусьці хістаўся з боку на бок, тады-сяды нават хапаўся рукамі за плот.

Трохі бліжэй Вадзім згледзеў: за плотам, па сваім паўмежку, услед за Колем чыкільгала, як не да самай зямлі прыпадаючы на хворую нагу, старая ўсохлая Яцучыха, нешта слязліва гаварыла. Нарэшце Вадзім улавіў і словы Яцучыхі:

— Куды ж ты нанач, дзіцятка? Хіба гору што паможаш? Калі ў Заямнае, то ўжо заўтра б хай. Пэўне ж, трэба клікаць сваіх, трэба ж хаваць... Божа-Божа, і што гэта ў свеце робіцца?!

Згледзеўшы Вадзіма, яна не стрымалася, загаласіла, ажно мароз па скуры пабег:

— А мае ж вы хлопчыкі, а мае ж вы сіроткі няшчасныя!.. І што ж гэта нарабілася? І саму гэтак ушчэнт, і сыночка костачкі чуць сабралі... Хіба ж ведала яна, хіба ж думала калі, што на міну тую напарацца? І на каго ж пакінула яна вас?.. Цяпер жа нішто не пагражала б... Цяпер жа кругом свае... Аднаго дзянёчка і не хапіла... І як жа цяпер жыць мецьме адны-адненькія?..

«Што, што яна гаворыць?! — абпаліла Вадзіма жахлівая здагадка.— Няўжо?!»

Яшчэ не загаварыў з Колем, яшчэ не пачуў з яго ўчарнелых, моцна сцятых вуснаў ніводнага слова, а ўжо пэўна ведаў: здарылася тое страшнае, што ўжо і не можа быць страшней у сям'і, у жыцці кожнага чалавека, што вайна, якая пакацілася недзе далей на захад, усё ж успела зрабіць на яго сэрцы яшчэ адзін, самы крывавы, самі балючы свой след...

# ЧАСТКА ДРУГАЯ

## 1

Верка пакіне іх ужо заўтра.

Яна, бы цень, сноўдалася па пустой, нязвыкла пустой хаце, штохвіліны паглядвала ў акно, на вуліцу, пасля садзілася на зэдлік, нешта доўга думала. Вадзіму з печы бачна было, які заклапочаны, які маркотны ў Веркі твар, і яму ўжо шкода было не гэтак сябе, як сястру, і нават карцела сказаць ёй, сказаць тое, што ўсе гэтыя дні ажно рвалася, прасілася з душы: «А можа, не трэба, га, Верка? Што ж мы ўдвох з Колем?.. Хіба ж тут няможна жыць? Вунь якая хата вялікая! Сказала б Юзіку, папрасіла б добра, дык хіба ж ён не паслухаўся б цябе, не застаўся б...»

Але, ведаў, зараз, прасі не прасі, нічога не зменіцца. І ўжо ўсё вырашана, падзелена, усё, што Верка захацела ўзяць сабе: і жалезны ложак з бліскучымі шарыкамі-цацкамі на білках, і шкап, і дзве падушкі, і чатыры вуллі з пчоламі,— усё гэта Юзік з Колем яшчэ заўчора павезлі на дзвюх павозках у далёкія тыя Галаброды, ці як іх там, недзе ажно на край свету, у другі, не іхні нават, раён. А сёння Юзік — з ім, вядома, і Коля — павінен прыехаць ужо ў лёгкім вазку, каб забраць толькі яе і Славіка. Яшчэ пераначуюць тут, а заўтра наранні выправяцца ў вялікую дарогу. Яны з Колем назусім астануцца адны. Будуць даглядаць, даіць самі Лыску, паліць у печы, варыць штокольвечы есці, мыць міскі, сваё адзенне,— усё, усё рабіць самі. І ніхто ў іх болей ні пра што не папытае, не падкажа, не паўшчувае нават. Усё ж як добра жылося разам!

Шкода было ўжо і Славіка, хоць на меншага брата ён трохі і злаваўся, лічыў яго брахуном, нізавошта не хацеў браць з сабою куды-небудзь. Узяў быў у поле, дык цяпер хлопцы на кожным кроку ўпікаюць яго, Вадзіма, быццам ён сам, а не Славік, выдаў іхнюю пастушкоўскую таямніцу, пазбавіў іх гэткай радасці мець яшчэ зусім спраўны нямецкі карабін.

Знайшоў яго ля казармы, у паўзасыпаным акопе, Анюцін Лёнік. Корпаўся нечага там і з пяску выграб карабін і цалюткую скрынку патронаў да яго. Зброю нехта прапанаваў здаць у мястэчка, у міліцыю, бо, ведалі, за хаванне яе па галоўцы не пагладзяць. Але адразу не занеслі. Пасля, калі пасвілі ў Гараўках і далей ад пабочных вачэй і вушэй, калі ў ахвоту пастралялі, усе аднадушна вырашылі: знаходку пакуль яшчэ патрымаюць у сябе, трохі яшчэ пазабаўляюцца, а тады ўжо здадуць.

Падвёў усіх Славік.

Неяк, калі Верка і Коля былі занятыя — брыгадзір загадаў ім сёння на сенажаць,— Вадзім, каб не кідаць Славіка аднаго, пагнаў Лыску, узяўшы з сабою брата. І якраз у той дзень пастухі надумалі ў Гараўках учыніць гульню: хто больш метка цэліцца. Да камля старой яліны прымацавалі кавалак бляхі і амаль да самага вечара, не шкадуючы патронаў, бо іх была яшчэ процьма, з рознай адлегласці шпокалі па чарзе ў тую бляху. Вядома, зрашацілі яе ўшчэнт і былі вельмі задаволеныя. Вылучыліся нават свае пераможцы. Але ўжо назаўтра Славік, бавячы час на вуліцы, пахваліўся некаму з дарослых, што ён бачыў у Гараўках. Адразу на ўсю вёску ўзняўся лямант. Хочаш не хочаш, а давялося развітацца з карабінам і цэлымі, не скарыстанымі яшчэ патронамі.

Вось і касавурацца зараз пастухі на Вадзіма, а ён, у сваю чаргу, ніяк не можа дараваць Славіку за яго доўгі язык.

Калі Верка выходзіла замуж, калі, пасля вяселля, яна абвясціла, што забярэ — Юзік згадзіўся — з сабою і Славіка, Вадзім напачатку абрадаваўся: хай, хай едзе, абыдуцца яны з Колем без яго, навошта ім тут гэткі даносчык і звягло.

І ўсё ж чым меней заставалася да ад'езду Веркі і Славіка, тым большым неспакоем і шкадобай поўнілася Вадзімава сэрца. А сёння ён і зусім не знаходзіў сабе месца. Сёння ён нават Лыску не пагнаў сам: на два дні дамовіўся з Сашыным Міцем, каб той папасвіў і іхнюю карову. Можа ж, будзе патрэба, дык ён, Вадзім, і Міцю таксама выручыць, хай толькі акажацца.

Ляжаць на печы станавілася няўцерп. Верка, рыхтуючы на вячэру што-кольвечы з прысмакаў — прыйдуць жа цётка і той-сёй з суседзяў, каб апошні раз пасядзець трохі за сталом, правесці яе ў дарогу,— напаліла так, што Вадзім ажно ўзмакрэў.

Ён злез наніз, выйшаў на падворак. На вуліцы пасля хаты, тым больш пасля печы, было спачатку халаднавата. Але хутка абвыкнуўся, хоць сапраўднага цяпла, як павінна быць у ліпені, самай макаўцы лета, не адчувалася. Чатыры дні таму з поўначы, з-за логу, падзьмуў нейкі надта ж калючы, непрыветны вецер, завесіў неба, сонца суцэльнай пасцілкай шэрых нізкіх хмар. З іх цадзілася, імжыла, нават тады-сяды пасыпала градам, ажно трое сутак запар.

Намерзліся і намокліся яны тады ў полі. Не памагалі ні мяшкі, якімі акрывалі галаву і плечы, ні іншая апратка. Аднаму Сымонаву Лёдзіку было цёпла. Гэтаму што! Уздзябурыў целагрэйку, наверх нацягнуў доўгі брызентавы — дзе толькі і ўзялі такі? — плашч з башлыком, на ногі насунуў гумавыя боты і хадзіў сабе пан панам, пасвістваў, пасміхаўся з іх, босых, мокрых, пасінелых, бы гусіны пуп.

Праўда, і яны знайшлі нарэшце такі-сякі ратунак. Анцік першы з кансервавай бляшанкі, якіх поўна валялася, хоць і добра ўжо заржавелых, у асінніку ля казармы, зрабіў сабе цяпельца. Аказваецца, вялікай мудрасці для гэтага не трэба было мець: цвіком у бляшанцы напрабіваў па баках дзірачак, пачапіў дужкай, як у вядры, дрот, напіхаў туды смалякоў, а то і жывой смалы з елак, і гэтак з агнём, размахваючы, бы той поп у царкве, кадзілам, хадзіў за каровамі, грэў рукі, сам грэўся.

У той дзень ужо ўсе астатнія пастухі, нават Сымонаў Лёдзік, парабілі сабе такія цяпельцы. Лёдзіку, праўда, не пашанцавала: надта ж быў размахаўся сваім кадзілам, і адтуль праз верх лінулася гарачай смалы на плашч. Пакуль агледзеўся, выпаліла вялікую, у кулак, дзірку. Хлопцы помсліва рагаталі цяпер ужо з яго, ад чаго Лёдзік ажно скрыгатаў зубамі, пэўна, ведаючы, што яго чакае дома.

Сёння, вядома, ніхто не замерзне, вецер ужо цяплейшы, ды і за каўнер не лье. Але ўсё роўна дома ў гэткую пагоду лепей, чым у полі. Вадзім з радасцю падумаў, што як удала ён адпрасіўся ў Міці. Зараз, можа, прыедуць Юзік і Коля, а там неўзабаве і за стол сядуць. Ды і са Славікам варта было б, нарэшце, хоць трохі пабыць разам, не адпіхваць болей ад сябе. Заўтра ж яго ўжо не будзе... Зрэшты, а дзе гэта ён?

Вадзім выглянуў на вуліцу.

Насупраць Маланнінай хаты гулялі ў «свінку» некалькі падлеткаў, але Славіка сярод іх не было. Вадзім пашукаў

пад паветкай, абагнуў наўкруг хлеў, па вузкай сцежцы, вытаптанай у палеглым ужо картапляніку, пайшоў да яблыні: мо Славік там, мо рашыў напароць якіх антонаў і зараз сядзіць, як бывала не раз, дзе-небудзь на суку, хрумстае, заморвае чарвячка. Сёння Верка, хоць і нагатавала ўсяго, мала чаго ім дала, усё ашчаджала на вячэру, і Вадзім сам адчуў, як завуркатала ў жываце, як нясцерпна захацелася ўзяць чаго ў рот.

Не знайшоўшы брата ў садзе, ён патрос адну з яблынь, але нічога людскага не звалілася: у гэтым годзе яблыкі не ўрадзілі, а тыя, што целяпаліся там-сям на галінах, былі нейкія карослівыя, надта ж не па часе кіслыя, Амерыку ажно ўбачыш. І ўсё ж Вадзім падняў з паўмежка колькі заморкаў. Адзін адразу надкусіў, іншыя паклаў у кішэню: з'есца, яшчэ як з'есца, калі нічога іншага няма. Зноў падаўся на вуліцу, да хлапчукоў, папытаць, дзе Славік. Мо ж бачылі?

Малыя заўзята гулялі ў сваю гульню, ніхто на Вадзіма нават не звяртаў увагі. Памагла яму Яськава Каця. Мурзатая, у адной паркалёвай сукеначцы, якая была ёй ужо і кароткая, у многіх месцах палатаная, Каця кешкалася непадалёк ад хлапчукоў у пяску, ляпіла аладкі. Убачыўшы Вадзіма, яна сама падбегла да яго, сказала:

— А Славік на маяк палезе, вот. Яны пайшлі туды...

— Хто яны? — Вадзім пачуў трывогу.— І даўно?

Каця, аднак, бы не чула, што пытаў Вадзім. Яна прагна глядзела, як ён грыз яблык, касавурылася і на адтапыраную кішэню. Давялося ўсё ж выцягнуць, аддаць ёй адзін антон. Шкада, што трапіў у руку самы лепшы. Не затрымліваючыся больш ні на хвіліну, ён амаль подбегам памчаўся ў канец вёскі, да лесу. Няўжо ж гэты вісус удумаў палезці на маяк? Няўжо яго хто падбухторыў, паабяцаў што? А мо Каця брэша? Трэба ж ужо зусім не мець галавы на плячах, каб палезці на гэтую касабокую раскірэку, якая па-старэчы стогне, хістаецца ад любога ветру.

Яшчэ здалёку ён і напраўду ўбачыў ля падножжа маяка некалькі хлапчукоўскіх фігурак, і тут жа — ажно млосна, нядобра неяк стала ўсярэдзіне — вока выхапіла на вышыні, недзе ўжо блізка ля макаўкі, маленькую чорную кропку, якая бы прырасла да драўлянай нагі-апоры, не рухалася ні ўзад ні ўперад. Няўжо ж гэта Славік?!

Хлапчукі, пазнаўшы Вадзіма, хуценька шуснулі куды каторы, парассыпаліся па полі. Застаўся на месцы адзін

толькі канапляністы, кропелька ў кропельку з твару, што і Барыс Васючкоў, яго меншы брат Пятрок.

Вадзім задыханы падбег да малога, хапіў за руку, тузануў:

— Хто, хто гэта загадаў яму... туды? Падсадзіў хто? Кажы!..

Пятрок не стаў вылузвацца, скрывіў толькі губы, захныкаў:

— Н-н-не ведаю. Я прыбег, а Славік ужо... Пусці-і!

Высвятляць адносіны не было часу. Вадзім пачуў, што там, уверсе, жаласна румзае, калоціцца ад страху і бездапаможнасці Славік. Чаму ж ён назад не злазіць? Чаго чакае?

Прыгледзеўшыся, Вадзім убачыў, што адной з драбінак, адразу пад Славікавымі нагамі, зусім няма, пэўна, зламалася. Відаць, добра-ткі струхлела, што не вытрымала нават яго кволага цела.

Крычаць зараз на брата, ведаў Вадзім, зусім нягарта. Трэба неяк памагчы спусціцца яму на зямлю, пасля ўжо даць добрую прачуханку, нават і вушы накруціць. Вот жа брыдота, хай хутчэй едзе адсюль, пакуль шыю сабе не скруціў.

Ён падскочыў, учапіўся спачатку правай, пасля і левай рукой за першую драбінку, трохі павісеў, памог сабе, ашчаперыўшы босымі пяткамі слізкае бервяно, дацягнуцца і да другой драбінкі. Цяпер, калі меў ужо апору, хай і не зусім надзейную, але ўсё ж апору, можна было асцярожліва церабіцца вышэй.

Драўляная нага, па якой ён лез, ды і ўвесь маяк увогуле, дробна і пагрозліва трымцелі, і самому з кожным новым крокам уверх станавілася вусцішна, плакаць ажно хацелася. І ўсё ж, як бы там ні было, памалу падбіраўся да Славіка. Стараўся не глядзець на зямлю. Ведаў, гэта яшчэ больш паддало б страху, магла б закружыцца, адурнець галава, і тады костачак ужо не сабраў бы, як піць даць, не сабраў бы. Грымнуцца з такой вышыні — зусім не тое, што з елкі пад Баркунамі, хоць і тады ледзьве ачуняў, праваляўся ў пасцелі невядома колькі. Каб не маці...

Славік, дарма што Вадзім быў амаль побач, так і не пераставаў румзаць. Ці не баяўся лупцоўкі за сваё свавольства? А варта было б, яшчэ як варта!

— Ціха ўжо, смындра! — узяўшы сябе ў рукі, незласліва гукнуў яму Вадзім, каб лішне не трывожыць, не ўз-

вінчваць хлопца.— Злезем неяк. Вот жа гора з табой! І чаго паперла сюды нячыстая?

Не ўлавіўшы ў Вадзімавым голасе пагрозы, Славік адразу бы павесялеў, пажвавеў, зноў пачаў дрыгаць нагой у паветры, шукаць якой апоры. Вадзім памкнуўся быў лезці далей, каб памагчы неяк, падтрымаць брата, ды раптам абамлеў: пад ім таксама нешта хрупнула. Абхапіўшы аберуч бервяно і стараючыся даваць меней нагрузкі наногі, ён падцягнуўся яшчэ на адну прыступку. Стаў і, затаіўшы дых, прыслухаўся: не, нічога больш не хрупала, не трашчала, хіба што вецер на вышыні адчуваўся мацней, у пераплётах штосьці скуголіла, тонenька піскліва завывала, бы знарок палохала... Тут ужо добра адчувалася, як ад кожнага неасцярожнага штуршка, кожнага парыву ветру ўздрыгвае, бы ў апошняй нядобрай ліхаманцы б'ецца некалі магутнае, а зараз ужо зусім нямоглае цела маяка, няспынна плача і стогне.

Чамусьці на хвіліну Вадзіму да болю ў сэрцы стала маркотна ад гэтага старэчага плачу-стогну. Колькі ён помніць сябе, маяк быў адной з найлепшых іхніх хлапчукоўскіх уцех. Ото ж і папалазілі яны, нягледзячы на перасцярогі, крыкі дарослых, на яго галаваломную вышыню! З той, ад макаўкі, вышыні многае наўкруг бачылася: уся, бы на далоні, іхняя вёска, лог, ад пачатку і да самага яго канца, далей у цёплай дымнай павалоцы — мястэчка, з другога боку — вокам не ахапіць — зялёныя абсягі лесу, пералескі, палі, незнаёмыя, няходжаныя імі дарогі. Дух ажно займала ад нязведанасці, хараства, абуджала ў сэрцы шчымлівыя мары-летуценні. Не адзін з іх, спусціўшыся на зямлю, доўга пасля гэтага хадзіў бы ачумелы, у вачах не атухаў бляск, быццам ён пабыў у чароўным сне, быццам зазірнуў у сваю зманлівую дарослаcць, адчуў, дзеля чаго жыць, як трэба спяшацца рабіць што вартае.

Але, як і ўсё на свеце, пастарэў, адслужыў сваё іх колішні сябра, іх чатырохногі драўляны велікан.

Зараз Вадзім гатовы быў маліцца, гаварыць любыя словы заклінання, каб маяк яшчэ трохі патрываў, выпусціў хаця б іх са свайго палону. Болей ні ён, ні хто другі сюды не палезе, не будзе абцяжарваць астатняе, ужо вельмі кароткае яго жыццё...

Схамянуўшыся, Вадзім прыкідваў, як лепей Славіку адолець пусты прагал. Сапраўды, няма за што зачапіцца нагой. На месцы, дзе мацавалася нядаўна драбінка, засталася адна трухля. Ён дацягнуўся, калупнуў тую трухлю.

У выемцы агаліўся вялікі ржавы цвік. Тузануў яго туд-сюд уверх-уніз. Не, цвік, дзякаваць Богу, яшчэ трымаўся, можна было ўсё ж рызыкнуць, ступіць на яго. Галоўнае, не адпускаць рукі ад бервяна. У выпадку, калі цвік не вытрымае, сагнецца ці зломіцца і праваліцца нага, можна будзе і на пузе, хоць гэта вельмі рызыкоўна, праехацца трохі ўніз.

Цвік усё ж апраўдаў надзею, нікольkі нават не паддаўся. Славік, падбадзёраны братам, адолеў-ткі самае страшнае. Цяпер ужо абое — Вадзім першы, знізу, Славік за ім — драбінка за драбінкай, стараючыся ступаць мякка, асцярожна, не разгойдвацца, амаль што не дыхаючы, злазілі ўсё ніжэй і ніжэй. Адчуўшы пад нагамі зямлю, Славік ужо зусім знясілеў, доўга, пасінелы, сцяўшыся ў камячок, сядзеў на грудку, тросся не то ад холаду, не то ад нервовага перанапружання.

Калі напачатку Вадзім кіпеў на брата ад злосці, то зараз, бачачы яго гэтакім змэнчаным, бездапаможным, стараўся не чапаць, ні пра што не пытацца, адышоўся трохі ўбок, каб хлопец спакойна пасядзеў, акрыяў. Можа ж, сам прызнаецца, чаго палез на злом галавы, ведаючы, што ўжо цэлы год, калі не ўсе два, нават самыя апошнія падшыванцы-сарвігаловы не адважваліся жартаваць, забаўляцца з маяком.

Дадому ішлі сцішаныя, маўклівыя.

— Не кажы Верцы, га, Вадзім? — нарэшце выціснуў з сябе, папрасіў Славік.— Не палезу, пабачыш от... Пабажыцца магу!

— Палезь, яшчэ раз палезь! — Вадзім быў ускіпеў, пасля ўсё ж палагоднеў: — А пагнала чаго ж? Дурасць бо?

Славік панурыў галаву, трохі павагаўся, пасля ўсё ж мусіў прызнацца:

— Падушачкі... Ну, у Мішкі... Казаў, жменю дасць. Паказваў усім... І сітніцу...

— Клыпа?! — Вадзім спыніўся, здзіўлены прызнаннем брата і адначасова абураны.

— Ыгы...

— Вот жа нягоднік! Я надзяру яму вушы! Хай знае! Ён і падсадзіў знізу?

— Не-а... Я сам... Не кажы толькі, га?

Славік ніколі гэтак па-даросламу не прасіўся, і Вадзім паабяцаў не расказваць дома пра здарэнне. Але ўсю дарогу і да вёскі, і па вуліцы як ішлі, Вадзіма тачыла: гэта

ж трэба, з-за некалькіх падушачак і кусмана сітніцы палез к чорту самому на ражон. Ды і ці даў бы яшчэ той блатнюга? Колькі ўжо з іншымі хлапчукамі гэтак вось дражніўся, прымушаў іх барукацца, а то і біцца, што, бывала, і да крыві даходзіла, падбухторваў шастаць па чужых агародах, мяўкаць, бэкаць ці гаўкаць, брыдка мацюкацца на незнаёмых цётак, якія знекуль здалёку стомлена пляліся сценкаю ў мястэчка па той ці іншай сваёй патрэбе. Слухалася, усё выконвала малеча, абы толькі Мішка даў пакаштаваць тых ласункаў.

Амаль ніколі ён нічога не даваў, а калі і даваў, то адчэпнага. Бунтаўшчыку ж ці каму з нездаволеных рабіў «цёмную» і шпіляў у галаву гэтулькі пстрычак, што ў малога адпадала ўсякая ахвота патрабаваць нешта большае ад Мішкі. От, што даў, дык і добра. І гэтаму будзь рады...

Многія маткі ўжо неаднойчы скардзіліся — Вадзім неяк і сам чуў — Мішкавай маці, выфранчанай, крыклівай Любе, што вытварае яе сынок.

Люба была не адсюль, не з іхняе Жорнаўкі. Адразу пасля вайны знекуль прывёз яе Рагуля, пасадзіў у адну, меншую, палавіну Марчуковай хаты, другую, з другім, асобным, уваходам, з пяццю вокнамі і кафляным стаяком, заняў сам. Як там заняў, а нешта, казалі, усё-ткі паставіў. Жыў жа Рагуля, хоць і старшынстваваў у іх ужо тры гады, чацвёрты пайшоў, у мястэчку. Там здымаў кватэру. А Люба нібыта нейкая яго не то родзічка, не то яшчэ хто. Ну, пэўна ж, не чужая. Інакш чаму б Рагуля і ў калгас не ўгаварыў яе пайсці, а ўладкаваў у мястэчку ў магазін, ды і так, казалі, прывозіў ёй розныя дарункі і гасцінцы і з саду калгаснага, і з агарода?..

Чаму б пры такой матцы Мішку не фарсіць, не дражніцца з хлапчукамі, не пахваляцца чым смачным, чаго многія з іх не толькі ніколі не елі, але і ў вочы не бачылі? А што збіваў з тропу многіх падлеткаў, вучыў іх нядобраму, Люба і слухаць не хацела нікога, паводзіла сябе ў вёсцы вельмі ж ужо ганарліва...

Нічога, ён, Вадзім, не паглядзіць ні на што, усё ж надзярэ Мішку вушы, хай каму хоча пасля гэтага жаліцца...

Дома, толькі зайшлі ў двор, адразу ля хлява згледзелі вазок і яшчэ не распрэжанага рудога каня. Вадзім адчуў, як моцна ёкнула сэрца: усё, вось і надышоў, зусім-зусім ужо наблізіўся той момант, калі Верка пакіне іх адных. Цяпер ужо нішто не зменіцца. Хай сабе дождж, хай страляе пярун, хай паласуюць неба маланкі. Не, нішто не

зменіцца. Вось на гэтым вазку, гэты руды конь павязе яе і Славіка далёка-далёка адсюль, куды не прыбяжыш, як да цёткі, хаця б і ў само Заямнае, не пацікавішся: ну, што ў вас тут, усе жывыя-здаровыя? Не, з Веркай гэтак не будзе. Паедзе, павязуць яе, і невядома, ці зможа вырвацца да іх з Колем з той сваёй далёкай далечыні, каб адведаць, прывезці ім што ў падмогу, сказаць якое ўцешлівае слова. Калі яшчэ ўчора, дый сёння нават зранку, як ляжаў на печы, закрадвалася нейкая кволая не то надзея, не то мара, што, можа, нешта ўсё ж памяняецца, мо, скажам, Юзік паехаў і не захоча назад вярнуцца, адпусціць назад аднаго толькі Колю, то зараз ад гэтай мары-надзеі нічога не засталося. Ён не шкадаваў бы ні вулляў, ні шкапа, нічога-нічога, ды і Коля, мусіць, не шкадаваў бы, каб толькі Верка са Славікам асталіся дома.

Верка, хоць, бачыў Вадзім, была радая Юзіку, штохвіліны церлася каля яго, распытвала, як давезлі пчол, ці не пабіўся дзе шкап, як назад дабіраліся, усё ж не-не ды кідала ўстрывожаны маркотны пагляд і на Вадзіма, і на апусцелую хату, дзе яны гэтулькі ўсяго спазналі... Адзін момант здалося нават, што з вачэй яе скацілася па шчацэ колькі слязінак. Але ўжо ў наступную хвіліну яна, толькі Юзік заікнуўся, каб паліць на рукі, зноў уся ажно засвяцілася, бегма кінулася памагаць.

Вадзім выйшаў на двор, падаўся да хлява, дзе Коля выпрагаў з вазка каня. Коля, здэцца, і не перажываў, не трывожыўся ні пра што. А мо ён толькі прытвараўся, хаваў у сабе, што думае, што і ў яго робіцца на сэрцы? Не можа ж быць такога, каб ад'езд Веркі і Славіка яго ніколечкі не ўзрушыў, пакінуў абыякавым?

— Во бы такога нам! — замест усякіх іншых слоў, замест таго, каб хаця павітацца, бо не бачыліся ж амаль трое сутак, сказаў у захапленні Коля, пяшчотна гладзячы даланёй па галаве Рудога.

Ён папрасіў у Юзіка сам абхадзіць каня і цяпер, забыўшыся пра ўсё на свеце, тупаў каля яго, чысціў, чухаў ля вушэй, і той, давольны і канцом далёкай дарогі, і поўным карытцам аўса — авёс, цэлы мяшок, Юзік захапіў з сабою,— лагодна і рахмана фыркаючы ад асалоды, стаяў на месцы, смачна жаваў, пераціраў зубамі корм.

— Ага, сыты які! — падтрымаў гаворку Вадзім, каб неяк дагадзіць старэйшаму брату, бо ведаў, як той напераджываўся з-за іхніх коней, што яны такія лядашчыя, адна скура ды косці.

Не было амаль таго дня, таго вечара, калі б Коля — ужо больш чым год ён, кінуўшы школу, рабіў конюхам на пару з аднавокім Нічыпарам, зарабляў працадні — не кляў парадкі ў калгасе, самога Рагулю, фуражыра Фаньку, па віне якіх, лічыў брат, мардавалася жывёла.

— Вады б яшчэ з вядро,— сказаў Коля, нешта думаючы сваё.— Але са студні зразу не дасі. Скажы Верцы, хай цёплай, калі ё, дамяшаць трохі нальё.

Вадзім, хапіўшы пустое вядро, подбегам кінуўся ў хату. Дзверы з сенцаў былі незачынены, і ён, без грукату зайшоўшы ў кухню, ажно спатыкнуўся на парозе. Юзік з Веркай, не бачачы яго, нічога наогул не бачачы кругом, моцна ашчаперылі адно аднаго ля прыпека і цалаваліся. Вадзім адчуў, як чырвань заліла яму ўвесь твар, вушы, як агнём успыхнулі шчокі, акурат злавіў яго хто знянацку за брыдкім заняткам.

Стараючыся не нарабіць шуму, ён вышмыгнуў на ганак, так, з пустым вядром, і вярнуўся да хлява.

— Вада ж дзе? — спытаў Коля, пільна гэты раз глянуўшы на Вадзіма.

— Яны... Яны... Тамака...

— Што там? Хто? — Коля пачаў ужо невядома чаго нервавацца.— Мармычаш нешта, бы зноў на пацука наступіў...

Вадзім не сказаў, а выдыхнуў, адвярнуўшыся трохі ўбок, хаваючы вочы:

— Цалуюцца тамака!..

Коля на хвіліну сцішыўся, пасля нечакана на ўвесь двор выбухнуў рогатам, ажно Руды занепакоіўся. Перастаўшы жаваць авёс, ён скасіў вялікае вільготнае вока на аднаго, на другога, пастрыг вушамі. Не ўлавіўшы для сябе ніякага падвоху, Руды зноў тыцнуў пысу ў карытца.

Вадзім гатовы быў скрозь зямлю праваліцца ад гэтага рогату. Ён ужо каяўся, што ляпнуў Колю такое. Яшчэ, чаго добрага, будзе скаліць зубы перад Юзікам, Веркай, каму другому разбалбоча, як напалохалі яго сястра і швагер, што аж без аглядкі ўцякаў з хаты. Коля можа нават і прыдумаць што ў дадатак. Пасля на вуліцы будуць з яго пасміхацца, як пасміхаліся, калі ён яшчэ вясной наступіў у сенцах на тога паўдохлага пацука.

Пацук, не то ад бяскорміцы, не то ад старасці, згубіў усякую асцярожнасць і пільнасць. У сенцах было цёмна, і Вадзім, лэпаючы па дзвярах, шукаючы клямку, не адразу ўцяміў, што гэта такое цеплаватае і мяккае трапіла яму

пад босую пятку. І толькі калі адтуль, з-пад нагі, пачуўся прарэзлівы піск-енк, ён сам нема закрычаў, да смерці напалохаў і Верку, і Колю, разбудзіў на палку нават Славіка.

Яму хуценька адчынілі дзверы, як не ўвалаклі праз парог у кухню. Усё дапытваліся, што з ім. Вадзім мыляў губамі, ніяк не мог узбіцца на голас, нешта няўцямна мармытаў. Каўтнуўшы з кварты вады, тады толькі паказаў вачыма, у якіх усё яшчэ таіўся страх, на сенцы. Коля выглянуў. Праз хвіліну ён вярнуўся, гідліва кінуў на падлогу ля печы вялікага паўжывога пацука. Ото ж і пацехі было ўсім!

Гэты раз Коля, відаць, пашкадаваў яго, нікому нічога не расказаў, ні Верцы, ні Юзіку, нікому другому, хто прыйшоў, каго паклікала сястра на свае праводзіны. Дый не да жартаў, не да весялосці было зараз.

Верка, штохвіліны выціраючы ражком фартуха слёзы, каторы ўжо раз прасіла цётку Маньку:

— Вы ж, цёця, ужо калі і самі гляньце, калі што ў іх не так будзе. Яны ж, можа, саромецца будуць часта назаляць. Я ж ведаю...

Манька, смачна пераціраючы ў роце скварку з лустай хлеба, запэўніла:

— А чо ж не паглядзець? Пагляджу, як жа. Сіроты ж. Аднэ... — яна перастала жаваць, пракаўтнула рэшткі яды, таксама, гледзячы на Верку, заплакала-загаравала: — Бедная Ліда! Ведала б пра ўсё... Не ўбярог Бог ні яе, ні сынка... І іх Пётра паклікаў...

— Ну вот! — нездаволена падняўся з-за стала Коля.— Зацягнеце шчэ песеньку... Ніхто ж не памірае пакуль. Не памром, будзем жывы і мы. Не вайна ж, мусіць...

Яго падтрымалі і Юзік, і суседка Саша. Елі, пілі, што прыгатавала Верка, стараліся болей не вярэдзіць нікому душу.

Сястра і праўда больш пры людзях не плакала, але, як усе разышліся, зноў дала волю слязам. Юзік спрабаваў яе ўгаворваць, памагаў прыбіраць са стала, мыць посуд, толькі Верка зараз бы і не чула і не бачыла яго. Юзік, нямала расстроены, выйшаў на ганак, закурыў, моцна зацягнуўся дымам. Выйшаў услед і Коля, таксама папрасіў махоркі на самакрутку, хоць ніколі дагэтуль не курыў.

Горш за ўсіх, пэўна, было Вадзіму. Славік ужо спаў на палку, бясклапотна, бы нічога і не адбылося з ім сёння, пасопваў носам. Верка поркалася яшчэ на кухні, а ён не

ведаў, дзе дзець сябе. На вуліцу ўжо было позна, і ён сноўдаўся па пустой і гулкай — без шкапа і нікеліраванага ложка гэта вельмі адчувалася — хаце, не знаходзячы сабе месца. Моташна і неяк надта ж пуста было на сэрцы. Трывога і невядомасць падкрадваліся ўсё бліжэй і бліжэй, шкрэбліся кіпцюрамі недзе ўсярэдзіне, а гэты плач Веркі зусім даконваў, блытаў думкі. Самому хацелася кінуцца ніцма на сяннік каля Славіка і, закусіўшы губу, моўчкі ўволю наплакацца. Але ж не, яму нельга распускаць нервы, трэба трымацца. Што ж будзе, калі яны з Колем, застаўшыся ўдвух, апусцяць рукі, будуць адно нудзіцца? Ні да чога гэта добрага не давядзе.

Як ні падбадзёрваў сябе, але ўсё роўна спаў кепска. Ноччу, чаго раней з ім не было, колькі разоў прахопліваўся, накрываў Славіка, асцярожна, каб не пабудзіць, кранаўся яго худой, костачкі палічыць можна, спіны. Зноў падкочвала да сэрца шкадоба, што, толькі міне вось гэтая ноч і абудзіцца дзень, ён не ўбачыць больш і меншага брата. Усё ж, што б там ні казалі, ім добра жылося разам. Хай сабе нават без бацькі, без маткі і Лёвы. Верка, хоць і высільвалася да апошняга, але неяк трымала гаспадарку, не звяла яе на нішто. Во і карова ім засталася, і пчол тры вуллі, і яблыні, і агарод. Цяпер усё ім з Колем дагледзець... Эх, каб не гэты Юзік!..

Каторы ўжо раз за апошні месяц, як і да вяселля рыхтаваліся, і два гэтыя тыдні пасля, асабліва калі стала вядома, што Верка з імі не застанецца, што ёй трэба разам з Юзікам збірацца ў далёкую дарогу — недзе там іх цяпер дом,— Вадзім адчуваў пякучую рэўнасць да гэтага чужога і зусім невядомага яшчэ нядаўна чалавека, што прыйшоў і забраў у іх сястру. Што, хіба другога каго не мог сабе знайсці, абавязкова Верку? Прыпёрла ж яго сюды, у іхнюю хату, нейкая трасца. А хто вінаваты? Ён, Вадзім, сам! Мо каб не тады, з той нагою...

Юзік быў нетутэйшы, з прыезджых.

Аднойчы пасля абеду ў Жорнаўку з боку мястэчка пацягнуліся падводы, запрэжаныя парамі спраўных, добра ўкормленых коней. Падвод, нейкіх надта ж доўгіх і шырокіх — такіх тут ніхто ніколі не бачыў — было сем ці мо восем. На кожнай — поўна ўсякага хатняга пажытку. Уперадзе гэтай незвычайнай працэсіі важна ехаў, гэты раз перасеўшы ў брычку, сам Рагуля. Конь яго, павэдлуг

з іншымі калгаснымі, глядзеўся яшчэ ніштавата, але ўсё роўна ні ў якое параўнанне не ішоў з тымі, якія ўпрэжаны былі ў вазы.

Як не ўся вёска, хто толькі быў дома, высыпала на вуліцу, каб падзівіцца, што за людзі, куды і чаго выбраліся з усімі сваімі мэтлахамі, пачынаючы ад ложкаў, сталоў, кублаў, вёдраў і бочак і канчаючы хатулямі з адзеннем, скрынкамі і скрыначкамі, невядома чым напакаванымі.

Вадзім якраз пасвіў карову і ўжо толькі позна вечарам даведаўся, што гэта перасяленцы і едуць ажно з саменькай Польшчы, недзе з-пад Беластока. Што ў мястэчку на станцыі іх выгрузілі з вагонаў і накіравалі — так нехта распарадзіўся, мусіць,— у іхнюю Жорнаўку.

Ахвотнікаў пусціць да сябе на пастой чужых людзей было колькі хочаш. Па-першае, Рагуля, выконваючы нечы важны загад, бясконца цёрся, тупаў ля прыезджых, стараўся як мага дагадзіць ім, і таму кожнаму, хто згаджаўся падзяліцца сваім жытлом, абяцаў як не горы залатыя. Ну, горы мо і не горы, а вось плаціць грашыма, хай сабе трохі — гэта ўжо абавязкова! А каму лішняй у гэткі час, пакуль у калгасе нічога не палучалі, была жывая капейчына? Ого, толькі дай! Дзірак жа тых у кожнага — затыкай і не заткнеш. Па-другое, цеплілася спадзеўка, што і ад пастаяльцаў нешта перападзе. Па ўсім жа бачна, людзі яны добрыя, гаспадарлівыя, мо і не скнары.

Так ці інакш, рассяленне прайшло хутка, і гэтая падзея ўнесла ў жыццё вёскі нейкі новы настрой, дала многім, асабліва жанкам, гэтулькі харчу для размоў, што і дня і ночы не хапіла б, каб усё абгаварыць, усё як след абмусоліць.

Найбольш было здзіўленняў, вохаў ды ахаў. Вадзім сам чуў, як ля студні бабы, нібы мухі тыя, абляпілі Паўлючанку, усё дапытваліся:

— Ну, як там твае кватаранты, га? Кажы ж!..

— А што кватаранты,— важнічала Паўлючанка,— што ім можа быць кепска? Прасторна, дзякуваць Богу, чыста, ніхто не мяшае. Не тое што ў каторых...

— Ці не кохту гэту яны табе далі? Не было ж, бо...

— Ну й далі. У іх гэтых кохтаў...

Цмокаючы языкамі, усе разглядалі на Паўлючанцы абнову, мацалі рукамі, вохкалі і хвалілі, прыкідвалі, колькі б магла каштаваць такая адзежына.

— Колькі б ні стоіла, а ўся мая,— ганарліва ўскінула галаву Паўлючанка.— Такую не купіш!

Гэтая яе ганарлівасць многім дужа не падабалася, і нехта з баб не мінуў выпадку, каб не ўкалоць:

— А дзе ж з Яўменам у любошчы гуляцьмеш? Ці ўжо ўсю машну спаражніў? Непатрэбны стаў?

Ля студні дружна хіхікнулі, і Паўлючанцы нічога не заставалася, як, бліснуўшы вачыма і закапыліўшы губы, хапіць вёдры і падацца дадому.

А яшчэ дзён праз колькі Жорнаўку пачалі непакоіць забытыя за вайну і гэтыя два гады пасля яе пахі. Вадзім гэта паспытаў мо самы першы.

Неяк перад абедам, шлэпаючы па пяску пасярэдзіне вуліцы, моцна налягаючы на правую нагу — у лесе, калі адварочваў быдла, узбіўся на калючы дрот і ажно ў трох месцах прапароў пятку, пасля чаго змушаны быў адпрасіцца на якую гадзіну дадому, каб Верка абмыла ранкі і чым завязала,— ён, толькі параўняўся з хатай лесніка Міхнея, нечакана спыніўся на месцы, бы спатыкнуўся на што: з двара густа і духмяна патыхнула нечым надта ж смачным. Адчуў, як з рота самі пацяклі слінкі, як млосна закружылася галава. Адразу і не разабраўся, ад чаго ж гэта такі пах. Няўжо ад хлеба? Ну, вядома ж, ад хлеба! Але такога смачнага, такога густога паху ён ніколі дасюль не чуў.

Вадзім успомніў, што і ў Міхнея пасяліліся прыезджыя з Польшчы і гэта толькі яны, не хто другі, пякуць такі хлеб. Ён не мог ужо ісці далей. Млоснасць ліпкім потам разлілася па целе. Прысеўшы на лаўку, зноў бы смакуючы, пацягнуў праз нос паветра, пасля прагна пачаў хаўтаць яго і ротам. Але, як ні шчыраваў, ніколечкі нават не лягчэла. У жываце, наадварот, працягла завуркатала, акурат там абудзіўся нябачны звер і грозна запатрабаваў падмацунку. Вадзім адчуў зараз нешта накшталт віны перад гэтым самым заклятым сваім ворагам, бо на дасвецці, выганяючы карову, як з'еў тры бульбіны з цыбуляй і кіслым малаком, дык дасюль нічога і не трымаў больш у роце. А што тыя тры бульбіны? Цьфу! Праўда, у лесе пажаваў трохі зайчыкавай капусты, але, акрамя аскоміны, і яна нічога не дала, не спатоліла ненажэрны апетыт гэтага звера, што шавеліцца і шавеліцца ў жываце, рэдка калі пакідае яго ў спакоі, хоць ты невядома што з ім рабі.

Заняты сваімі думкамі, усё яшчэ адчуваючы млявасць, ён не адразу пачуў крокі ў двары, і толькі калі ляпнула брамка, увесь ажно скалануўся. Павярнуўшы галаў, убачыў маладжавую, досыць чыста апранутую жанчыну, якая

выйшла на вуліцу. Каб гэта быў сам стары Міхней, Вадзім не стаў бы ніякавець, неяк мог бы вытлумачыць, чаго ён тут без дай прычыны прыліп да іхняй лаўкі. А што чужому чалавеку скажаш, калі папытае?..

А яна і праўда пільна паўглядалася на яго, нейкім пявучым, нязвыклым для іхняе вёскі голасам пацікавілася:

— Чый жа ты, хлопчык, будзеш?..

Вадзім, яшчэ не даўшы рады сабрацца з духам, прамаўчаў. Ён ужо ўстаў з лаўкі, гатовы пайсці далей, але толькі ступіў на паколатую пятку, як зморшчыўся ад болю, нават ціхенька скрыгатнуў зубамі.

— Матка боская! — падскочыла, нагнулася ля яго жанчына, не пытаючыся, узяла ў свае рукі яго брудную, парэпаную нагу, паглядзела на ранкі.— То ў цябе ж кроў! Дзе так наскочыў?

Вадзім змушаны быў расказаць пра быдла, пра калючы дрот, якога поўна яшчэ з вайны ў лесе, асабліва пры гравійцы.

— Нічога,— запэўніў ён, здзіўлены гэткай увагай зусім чужой жанчыны.— Зажыве, от пабачыце. Я ўжо колькі прабіваў... Ды і другія... Мне сястра анучай закруціць.

— А ёд ёсць? — спытала жанчына.— Трэба ж ачысціць, памазаць...

— Не-а,— Вадзім няўцямна хітнуў галавой.— А што гэта?

— Ну, тады пойдзем са мною, я памажу ёдам,— жанчына рашуча ўзяла яго пад руку, і, дзіва дзіўнае, Вадзім не заўпарціўся, неяк лёгка згадзіўся пайсці ўслед за ёю ў хату.

На кухні яна пасадзіла яго на лаву, анучкай, змочанай у цёплай вадзе, пачала церці, ачышчаць бруд у тым месцы, дзе былі ранкі. Рукі ў яе былі спрытныя, нейкія надта ж далікатныя. Але Вадзім зараз нічога не чуў і не заўважаў: ні сваіх, у драпінах і цыпках, мо сто гадоў нямытых, ног, ні таго, што рабіла з імі гэтая дзіўная жанчына.

На кухні ён ужо зусім ачмурэў ад хлебнага духу. Праз адчыненыя дзверы ў чысты пакой Вадзім згледзеў вялікія, бы засланка, з крамянай скарынкай боханы, якія чамусьці стаялі прыслоненыя да сцяны. Немаведама што ён аддаў бы, каб адламаць ад тога бохана хоць маленькі крышанок. Сліна ўжо не ўмяшчалася ў роце, ён сутаргава каўтаў яе і адчуваў, што зараз не вытрывае, страціць прытомнасць. Спіна зноў пакрылася потам, ногі і рукі неяк сшэрхлі, абвялі.

Гэты яго стан адчула жанчына, аднак вытлумачыла ўсё па-свойму:

— Пацярпі, хлопчык, пацярпі. Ад ёду, вядома, пабаліць трохі, але ж і зажыве скарэй. Хаця б не заражэнне... Юзік! — яна гукнула некаму туды, у расчынены пакой, дзе былі боханы.— Прынясі хлопчыку вады. У сенцах вазьмі, там халаднейшая.

«Вады, якой яшчэ вады?» — нeяк глуха, бы голас — не, не голас, а рэха яго — ішоў з іхняй студні, данеслася да Вадзіма. Ён адчуў, што яшчэ трохі — і скінецца з лавы, таму, намагаючы апошнія сілы, абедзвюма рукамі ўчапіўся за край чыста вышараванай лавы. Жанчына спалохана замітусілася, сама, не дачакаўшыся падмогі нейкага там Юзіка, кінулася з кубкам у сенцы, прынесла вады.

— На, выпі трошкі, зараз палягчэе... Вось жа бяда якая, гэтак параніцца!

«Дурная яна, ці што? — трохі апамятаўшыся, падумаў ужо зласліва Вадзім.— Хлеба, нябо, не дасць, а вады... А раны тыя — цьфу, не гэткія былі. Ёд шчэ нейкі на іх...» Ён, зноў кінуўшы прагны позірк на боханы, хацеў падняцца, пайсці. Быў злез ужо з лавы, але жанчына, успляснуўшы рукамі, нечакана падхапіўшы яго пад пахі, пасадзіла назад, папрасіла пачакаць трохі.

— Ты ж есці хочаш... — Яна чамусьці пачырванела, нейкая бы вінаватасць з'явілася ў яе ціхім лагодным голасе, і Вадзім з радасцю для сябе адзначыў, што мо ўсё ж пашанцуе пакаштаваць хлеба, мо гэтая жанчына і не такая ўжо нягеглая, каб не здагадацца ні пра што.

...Праз якое паўгадзіны, здаволены і ўлагоджаны смачнай ядой — да хлеба яму далі добры кус і кумпяка, а хлеба, вялікаваты гэткі акраец, жанчына яшчэ закруціла ў паперу, каб узяў з сабою,— Вадзім, злёгку накульгваючы, выйшаў на ганак. Яго выклікаўся падвезці на ровары Юзік, досыць сталы, ветлівы хлопец, нечым падобны на гэтую маладжавую жанчыну. «Сястра, няйнакш»,— здагадаўся Вадзім.

Усеўшыся на раму, трымаючыся за надта ж дзіўна выгнуты, бы рогі ў барана, руль, Вадзім адчуваў сябе шчаслівым. Цяпер яму больш за ўсё на свеце хацелася, каб яго ўбачылі хлопцы: Генка Шакута, Міця, Анцік, Дзімка... Але, бы знарок, не тое што хлопцаў, нават жанок ля студні гэты раз не было, як павыміралі ўсё роўна. Адно дзятва грэбалася ў пяску пасярод вуліцы. Вадзім усцешыўся і тым, як разбягалася, вызваляючы дарогу, шылася

да саменькіх платоў галапузая малеча, на ўсе вочы гледзячы на веласіпед і зайздросцячы Вадзіму.

Юзік з шыкам затармазіў ля хаты, дзе паказаў Вадзім, ссадзіў яго і ўжо хацеў павярнуць назад, ды якраз на вуліцу з двара выбегла Верка ў парванай, сцёгны голыя ажно свяціліся, сукенцы. Нікога і нічога не бачачы, яна ашалела махала рукамі, час ад часу прысядала, біла сябе па лытках, хапалася за галаву, за распэтланыя валасы.

Здагадаўшыся пра ўсё, Вадзім спачатку быў зарагатаў, але калі і над яго галавой зашыкалі пчолы, а адна, доўга не марудзячы, з разгону ўшпіліла яму ў шчаку пякучае джала, тады толькі ён зразумеў, у якую бяду трапіла сястра.

— У хату, у хату трэ! Скарэй! — ён, баронячыся, гэтак жа, як і Верка, ад раз'юшаных насякомых, хапіў яе за руку, пацягнуў у сенцы.

За імі, кінуўшы на вуліцы, ля лаўкі, веласіпед, убег і Юзік. У цёмных сенцах пчолы, нарэшце, адчапіліся ад іх, але ўсё яшчэ, шукаючы, відаць, сваіх ахвяр, недзе побач пагрозліва гулі.

— Чаго яны гэтак... на цябе? — шапнуў Вадзім, адчуваючы, як пячэ, разбухае левая шчака, а разам з ёю і ўся сківаца.

Верка нічога не адказала, толькі ціхенька ўсхліпнула, пасля, бы адумаўшыся ці засаромеўшыся чужога чалавека, сама стрымана засмяялася.

У гэты дзень, хоць і пакусалі іх пчолы — Юзіку таксама дасталося,— яны злавілі, нікуды не выпусцілі цэлы рой. Усё рабіў Юзік. Ён сам распаліў, знайшоўшы ля хлява сухой драўлянай трухлі, дымар, сам апырскваў рой вадою, сам, хоць Верка на ражон лезла, каб падсобіць у чым, трос з яблыні, з галінак у вялікае рэшата нядаўніх сваіх куслівых ворагаў, якія зараз былі надзіва паслухмяныя, пакорлівыя ад дыму і вады.

Ніколі не думаў Вадзім: ні тады, калі лячылі яму нагу і частавалі хлебам, ні калі Юзік катаў на ровары, ні тады, калі ён яшчэ не раз прыязджаў да іх, быццам каб памагчы з пчоламі, бо і Верка, і Коля не ўсё ўмелі,— што гэтак павернецца далей, што яны, Верка і Юзік, знюхаюцца, пачнуць сохнуць адно па адным, а пасля надумаюць згуляць вяселле і з'ехаць чортведама куды...

Вадзім не прыкмеціў, калі зноў заснуў, і абудзіла яго Верка. Яна ўжо ўспела падаіць і выгнаць на вуліцу каро-

ву. Юзік і Коля таксама былі на нагах, ля хлява аглядалі колы брычкі, змазвалі каланіцай восі. Побач, выведзены з хлява, стаяў, падсілкоўваўся аўсом Руды, ні на кога не звяртаў увагі, быццам ведаў, якая далёкая, якая нялёгкая дарога чакае яго наперадзе.

Было досыць залкавата, сонца яшчэ не ўспела падняцца з-за хат і дрэў, не высушыла расу, якая сёння гусцей, чым калі, ляжала на траве, на лістоце, нават на платах.

Снедалі на хуткую руку, гэты раз моўчкі. Верка сухімі дровамі паспела выпаліць у печы, напякла бліноў, і зараз усе мачалі ў міску, дзе была смятана, разбаўленая трохі малаком з тварагом. Выпілі яшчэ па кубку вару. У яго Юзік кінуў жменьку нейкіх зёлак, вар атрымаўся надзіва пахучы і смачны. Гэта, казаў, каб не мучыла ў дарозе смага і бадзёрасць у целе болей трымалася.

Селі ў брычку ўсе, як ні было цесна. Коля з Вадзімам прыткнуліся на білках, спусціўшы ногі долу. Вырашылі, што хлопцы праедуцца разам да мястэчка, а там, толькі Юзік скіруе на гравійку, развітаюцца і вернуцца назад.

Верка загадала ехаць не вуліцаю, а загуменнем, хай сабе і горшай дарогай. Не, не таму, што яна баялася нейчага там нядобрага погляду ці асуджэння. Спакон жа веку так вялося: куды іголка, туды і нітка. Гэтыя словы, бы ў апраўданне, Вадзім неаднойчы чуў ад Веркі апошнія дні. І ўсё ж...

Гледзячы на сястру, Вадзім здагадваўся, што робіцца ў яе на сэрцы. У хвіліны развітання з дамоўкай, дзе прайшлі яе семнаццаць гадоў і дзе яна гэтулькі ўсяго зазнала, Верка зусім расклеілася і не хацела ні перад кім паказваць свой настрой. Ды і твар яе сёння быў надта ж шэрым, нейкім азызлым, бы нездаровым. Пэўна, і яна не спала гэтую ноч. Таму яе ўжо ніхто не чапаў, не лез у душу.

У рове, калі ад'ехаліся даволі далекавата і не стала відаць ні хаты, ні нават макаўкі клёну пры ёй, Верка спахапілася і квола папрасіла:

— На могілкі б яшчэ... На мінутку хацяя...

Юзік спыніў Рудога, памкнуўся быў нешта сказаць, мо адгаварыць Верку, але, не асмеліўшыся, відаць, пярэчыць, паслухмяна тузануў лейчыну, зварочваючы на вузкую каляністую дарогу, што вяла да густой купкі дрэў. Там месціліся могілкі.

Блізка ля агароджы, першай злезшы з вазка, Верка зноў папрасіла:

— Вы тут пасядзеце. Я адна...

Яны не маглі не паслухацца. Верка пайшла, і нейкі час яе самотная фігура адзінока мільгала між сціплых самаробных помнікаў, жалезных і драўляных крыжоў, якіх за апошнія гады панастаўлялі тут немаведама колькі. Далей, к сярэдзіне, усё паглынала рознае кустоўе, большыя і меншыя дрэвы. Пад імі былі магілы тых, каго, як і бацьку іхняга, хавалі на пачатку вайны.

Вадзім добра памятаў, як Верка ў горы ледзь не на коленцах прасіла выкапаць ямы для маці і Лёвы поруч з бацькам. Але месца не было. Давялося, у рэшце рэшт, зміры́цца, што адшукалі лапік незанятай зямлі праз вузкую сцежачку, у галаве бацькі і дзеда з бабай. Гэта ўсё ж, хоць і не зусім добра, вырашылі, а вось каб адкрыць вечкі дамавін, даць развітацца з маці і Лёвам, даць уволю выплакацца перад імі, сказаць апошнія словы, гледзячы ім у твар, нізавошта не дазволілі. Не дазволілі найперш жанкі, хто збіраў па полі іхнія рэшткі адразу пасля таго выбуху міны.

Так і апусцілі ў зямлю дзве несамавітыя, з негабляваных дошак труны — адну вялікую, другую як не напалавіну меншую — Лёваву...

Верка бавілася.

Мінула ўжо не мінута і не дзве, можа, усе дваццаць, калі не болей, а яе не было. Юзік таксама скочыў з вазка, пахадзіў вакол Рудога, паправіў на ім вуздэчку, пасля, пасапраўднаму ўжо занепакоіўшыся, пайшоў шукаць Верку. Вадзім дагнаў яго, выклікаўся паказаць месца, дзе хавалі маці і брата.

Верка, відаць, не чула, калі яны падышлі, бо не варухнулася, не падняла нават галавы на іхнія крокі. Акурат падбітая кім птушка, яна неяк нязграбна ляжала на мацерынай магіле, шырока раскінуўшы рукі, раз-пораз нервова ўздрыгвала. Вадзім адчуў, як нешта даўка падкаціла пад саменькі кадык, як здрадліва павільгатнелі вочы. Але ён хутка ўзяў сябе ў рукі. Адвярнуўшыся, пакуль Юзік суцяшаў Верку, угаворваў гэтак не ўбівацца, паберагчы і сваё здароўе, бо ўсё роўна ж з зямлі нікога не падымеш, ён рукавом неўпрыкмет цернуў па твары, падаўся на выхад, за агароджу.

Амаль услед прыйшлі і Верка з Юзікам. Верка пакуль ні з кім не гаварыла, сядзела ў вазку па-ранейшаму апанураная, здэцца, да ўсіх і да ўсяго абыякавая. І толькі калі

ўжо набліжаліся да мястэчка, яна, сцепануўшы плячыма, бы скідаючы з сябе здранцвенне, загаварыла да Колі і Вадзіма, даючы апошнія настаўленні:

— Картоплю праз тыдзень можаце папробаваць. Там, ля склепа, на вышэйшым, некалькі градак адцвіло. Не вывальвайце ўвесь корч, а ў зямлі намацайце рукой большую і варэце. А Лыску па вочарадзі дойце. Хай і Вадзім пробуе, калі ты, Коля, часам не зможаш. Можа, і Манька ці Саша калі памогуць, я ж прасіла.

— Ведаем жа, пэўна,— буркнуў Коля, лічачы, відаць, што ўсё даўно наконт гаспадаркі гаворана-перагаворана і болей не варта пра гэта мазоліць язык.

Але, паглыбленая ў свае думкі — хаця ж бы чаго не забыцца! — Верка як і не чула яго слоў, працягвала далей:

— У дзежцы ячменю шчэ трохі ёсць. Можна на крупнік стаўчы, а то і на праснакі змалоць, пакуль што-якое... Звязі ў Заямнае. Там жа Кацярынін Мішка ў млыне зараз робіць. Ен без вочарадзі пусціць. Ці ўжо як жыта будзе, тады разам. Можа ж, дадуць што за коні? — спытала яна, павярнуўшы галаву ў бок брата.

— Калі гэта яшчэ тое жыта,— няпэўна пацінуў плячыма Коля.— Дый не вельмі Рагуля расшчодрыцца. Дзяржаве здаваць трэ...

У мястэчку ўжо маўчалі, бо калёсы, уз'ехаўшы на брук, гэтак грукацелі, што заглушалі ўсякі голас. На білках стала сядзець вельмі мулка, і спачатку Коля, пасля і Вадзім скочылі долу, пайшлі побач з вазком. Праехалі мылаварню, а там была і паваротка на галоўную дарогу. Юзік, выкіраваўшы на шашу, збочыў да канавы, спыніў Рудога.

Злезлі з вазка і ён, і Верка, толькі Славік, успораты сёння рана і зараз закалыханы яздой, бесклапотна спаў. Яго не сталі будзіць, хоць Вадзіму хацелася і з ім развітацца. Калі яшчэ цяпер пабачацца...

Нейкую хвіліну ўсе маўчалі, і гэта было цяжка, вось так стаяць і маўчаць. Але ж што гаварыць? Што зараз тыя пустыя словы, калі даўно ўсё сказана? Вадзім адчуваў, нібы сэрца яго крояць на дзве часткі і большую нехта нябачны выняў з грудзей і кінуў туды, у вазок, у якім паедуць Верка і Славік. Паедуць у іншы дом, у іншае жыццё. І між імі назаўсёды ляжа гэтая невядомая шаша, яшчэ розныя дарогі, лясы і рэчкі. Эх, Верка, Верка!..

— Ну, вот... — першы парушыў маўчанне Коля і падаў

спачатку руку Юзіку, пасля падышоў да Веркі.— Мы ўжо назад. А вы памаленьку... Да ночы, калі ўсё добра будзе, і даберацеся. Конь жа добры, не тое, што нашыя...

Ен затуманеным позіркам акінуў Рудога, да якога за гэтыя дні вельмі прывязаўся, нязграбна неяк, хаваючы чамусьці вочы, абняў сястру за шыю, цмокнуў у шчаку. Тое ж зрабіў і Вадзім.

Верка ў гэтыя хвіліны трымалася надзіва спакойна, хоць, адчувалася, гэта каштавала ёй нямала сіл.

— То і праўда, ідзеце,— сказала яна і яшчэ раз па чарзе пацалавала абодвух.

І толькі калі ўжо садзілася ў вазок, зноў усхліпнула, зноў размазала па шчацэ слёзы.

У самы апошні момант Юзік адклікаў Колю трохі ўбок, нешта няголасна сказаў яму, пасля, як згледзеў Вадзім, штосьці выняў з кішэнькі фрэнча і працягнуў брату. Бачыла гэта і Верка і, удзячная Юзіку, ажно пасвятлела ў твары.

Яны паехалі. Па шашы, высыпанай пяском, колы пакаціліся лягчэй, чым было па брукаванцы. За колькі хвілін вазок ад'ехаўся далекавата. Вадзіму няўцерп хацелася дагнаць усіх, яшчэ хоць адным словам перакінуцца з сястрой, паглядзець на соннага Славіка. Але Коля, бы адгадаўшы яго настрой, сказаў:

— Што ж, хай едуць. І не трэба так убівацца. Юзік самая для яе пара, і ім разам будзе добра. А мы таксама неяк перакідаемся... Во на першы час швагер і грошай падкінуў,— ён выняў з кішэні, паказаў некалькі чырвонцаў...

## 2

Была ўжо сярэдзіна жніўня. Надвор'е, пасля нечаканага, хоць, добра яшчэ, нядоўгага холаду ў ліпені, наладзілася, стала горача, асабліва ўдзень. Праўда, зноў паявіліся гізы, і пастухам дадалося клопату з быдлам.

Не было таго дня, каб чыя-небудзь карова, без толку намахаўшыся хвастом і не бачачы ніякай іншай рады, раптам не шалела, не зрывалася з усіх капытоў з месца і не ляцела ў лясны гушчар, шукаючы прахалоды, ратунку ад тых куслівых гізоў. Пераняць яе, нават калі б ты і лічыўся невядома якім спрытным на нагі, было немагчыма.

Хлапчукі ажно валіліся ад утомы, з ранку да вечара бегаючы за статкам, пільнуючы, каб ён не ўбіўся ў шкоду.

Тым не меней, пакуль на полі не ўсё было зжата і скошана, збродлівым рагулям хапала дзе паласавацца, напоўніць свой ненажэрны трыбух.

А гэта часта так сабе не абыходзілася. Ні для жывёлы, ні для пастуха. Некаторыя каровы гэтак наядаліся, асабліва калі дападалі да канюшыны, што пасля іх пушыла, раздувала бакі, і ратаваць сваіх карміцелек збягаліся жанкі як не з усяе вёскі. А тут яшчэ ў дадатак да гэтай бяды штраф з канторы — за патраву, і паспрабуй не заплаці таго штрафу! Маткі, а ў каго быў і бацька, спаганялі сваю злосць на пастуху, і ні плачам, ні просьбамі нельга было хоць трохі зменшыць сабе кару.

На чым свет клялі ў тыя дні хлапчукі і долю сваю, і кароў, а найбольш старшыню калгаса Рагулю. Ото ж хітрэнны і помслівы чалавек! Сам, нібы ў яго не было ніякага іншага клопату, гойсаў па дарогах і палетках на рыжым жарабцы, прытойваўся дзе-небудзь і цярпліва чакаў, калі жывёла ўзбрыдзе на патраву. Не, адразу ён не выскокваў, не выяўляў сябе, хай бы тая рагатая шкадліўка немаведама колькі патаптала ці з'ела чаго недазволенага. Але варта было падбегчы запыханаму пастуху, як Рагуля нібы з-пад зямлі вырастаў перад ім на сваім раз'ятраным кані. Бронь Бог удумаў бы кінуцца наўцёкі ці не прызнаўся, хто ты, як прозвішча, дзе жывеш. Бізун хвацка пахадзіў бы па тваіх голых пятках. А яшчэ горш, калі б Рагуля заняў і пагнаў куды карову, за якую пасля, каб вярнуць яе назад, адкупляліся б дома ўдвая большым штрафам. А дзе, дзе браць тыя грошы?

Гэтак ужо было з Васючковым Барысам.

Тады, у той дзень, гізы лютавалі акурат перад пустым канцом, грызлі-загрызалі ўсё жывое. Іх наляцела знекуль цэлая плойма, і не толькі каровам, але і ім, пастухам, даставалася нямала. Варта было трохі зазявацца, як вялізны чорны гіз упіваўся ў тваю скуру, і пакуль ты паспяваў войкнуць, замахнуцца, каб забіць яго, ён ужо адлятаў далёка, шукаючы новую ахвяру. А на целе тваім, бы хто торкнуў кончыкам шыла, крывавілася, вельмі свярбела ранка, якая пасля апухала і доўга яшчэ балела.

Яны пасвілі трохі далей за казармамі, у высечцы — вялікім прагале сярод лесу, парослым маладым, па пояс, асіннікам, танклявымі, але густалістымі бярозкамі, з якіх добра было вязаць венікі. Тут, на месцы гэтага кустоўя, яшчэ нядаўна шумелі, цягнуліся ў неба гонкія смалістыя сосны. Але адразу ж пасля вайны аднекуль наехала многа

мужчын з пiламi, сякерамi i за тыдзень-другi спляжылi, аблысiлi вялiкi кавалак ляснога абсягу. Казалi, увесь той лес вазiлi ажно ў саменькi Мiнск, на нейкую будоўлю.

Хто-хто, а пастухi радавалiся, што iм яшчэ дадалося пашы. Гараўкi i выганы пры казармах ужо не заўсёды выручалi, а ў высечцы пайшла маладая трава, таму каровы часта самi кiравалiся ў той бок.

Гнаць у высечку ў саменькую спёку, ды яшчэ пасля абеду, можа, i не варта было, бо ўсе ж добра ведалi, што авадням, мухам бы хто мёдам там намазаў. Але настояў, падбухторыў усiх сам Барыс Васючкоў. Пагналi ды пагналi. Надта ж хацелася яму нарэзаць венiкаў, якiя матка мелася несцi заўтра ў мястэчка на базар.

Ведаў бы ён, чым абернуцца тыя венiкi!..

Не мiнула i пяцi мiнут, як каровы, спачатку адна, пасля другая, перасталi скубцi i ўжо не толькi хвастом i нагамi, але i галавой, безупынку матляючы ёю то ў адзiн, то ў другi бок, баранiлiся ад куслiвай заедзi.

Першай не вытрывала Мiцева Падласка, хоць i лiчылася нiбыта цiхай i рахманай. Раптам узбрыкнуўшы, закруцiўшы баранкам хвост, яна вопрамеццю кiнулася куды вочы глядзяць. Мiця, страляючы сырамятнай пугай, памкнуўся быў ёй наперарэз, нават мацюкнуўся разоў колькi, але дзе там! Падласкi неўзабаве i след прастыў у лясной гушчэчы. За ёю, падкiнуўшы ўгору заднiя капыты, акурат наступiла на гарачае вуголле, паляцела Васючкова аднарогая Чарнуха, невядома кiм i чаму так названая, бо нiякая яна не была чорная, хiба што хвост i капыты выдавалi трохi цямнейшымi, а ва ўсiм астатнiм мала адрознiвалася ад iншых рабых i бурых кароў.

— Ах, гадаўка! — толькi i ўспеў праводзiць яе вачыма Барыс, засмучаны, што не ўдалося зрэзаць i дзвюх галiнак на той венiк.

Неўзабаве ў высечцы не засталося нiводнай каровы. Пагiзавалi, паддаўшы адна адной ахвоты, куды каторая. Шукаць iх зараз было, што iголку ў тым стозе сена. Нейкi час, зашыўшыся ў непралазны гушчар, абы толькi заедзь не даставала, яны, бы прывязаныя кiм, будуць стаяць там i нi рыкам, нi мыкам не выдадуць сябе, колькi б ты нi клiкаў, якой бы карай нi пагражаў цi, наадварот, якiя б нi абяцаў ёй ласункi.

Набегалiся, намучылiся хлапчукi тады мо як нiколi. Толькi к саменькаму вечару, калi спала гарачыня i сонца, якое перайшло ўжо за лог, менш чым на пядзю заставала-

ся, каб дапасці да шчотачкі лесу за тым логам, так-сяк сабралі ў гурт быдла. Не, не ўсё. Не было аднарогай Чарнухі і Вадзімавай Лыскі.

Вадзіму, пэўна, горш чым каму дасталося. Расшкуматаў, зачапіўшы недзе за сук, калашыну сваіх апошніх картовых портак, пакалоў, калі прадзіраўся праз густы ельнік, рукі, твар. Да ўсяго гэтага яшчэ і вока зацерушыў нечым, і яно зараз балела, няспынна слязілася, не давала як глядзець перад сабой.

Ён толькі што выйшаў з лесу, дзе аббег усе знаёмыя і незнаёмыя сцежкі і палянкі, зазірнуў нават на Сямёнаў луг — ці мала што, магла ж, трасца на яе, і сюды даперці, каб чым пажывіцца,— пасля, даўшы добрага кругаля, зноў наблізіўся да Жорнаўкі, да таго поля пры ёй, дзе яшчэ даспяваў, цвярдзеў зернем ладнаваты клін грэчкі, а ўпрытык з ім зелянела, падцягвалася для другога, восеньскага, укосу палоска канюшыны.

Не, Лыскі і тут не было, і Вадзім, не чуючы ад утомы ног, пацёгся да маяка, дзе ўжо было зжата жыта і нават усе мэдлікі звезены ў калгаснае гумно. Тут, на ржэўніку, і дапасвалі статак, чакаючы канца гэткага няўдалага сёння дня, іхнія пастухі.

У Вадзіма цеплілася надзея, што Лыска, пакуль ён шастаў па лесе і хмызах, знайшлася, сама прыцерлася да гурту. Калі не, то хай яна ўжо здохне, хай ваўкі растрыбушаць, паганку гэткую, хай ногі зломіць ці шыю сабе скруціць, але ён не будзе яе больш шукаць, бегаць высалапіўшы язык...

Лыска — Вадзім яшчэ здалёк яе ўбачыў, і ад радасці ажно хораша ёкнула сэрца — хадзіла з усімі каровамі і, як ні ў чым не бывала, скубла траву. Уся тая злосць, якая толькі што распірала Вадзіму грудзі, неяк адразу ўляглася, астыла, бы і не было падраных штаноў, падрапанага, там-сям нават да крыві, цела, зацярушанага вока. Нават — адчуў гэта добра — сіл і настрою дадалося. Пайшоў да ўсіх, каб цяпер ужо спакойна, не думаючы ні пра што, пасядзець, дачакацца, каб гнаць дадому. Хутчэй бы толькі!

Вадзім трохі зніякавеў, засаромеўся, згледзеўшы на грудку ля маяка нечую дзявочую постаць. Яшчэ чаго не хапала! Зараз, у такім выглядзе, яму ніяк нельга туды паказвацца. Зноў акінуўшы сябе поглядам, выцершы брудным рукавом кашулі слязлівае вока, ён хацеў збочыць, быццам каб адвярнуць Лыску, але Міця гукнуў яму:

— Хопіць шлэндацца. Сюды кіруй! Лыска ж вунь пасецца, прыцёглася нядаўна.

Давялося, хочаш не хочаш, падысці. Хлопцы адразу ўзнялі яго на смех, ажно за жываты пачалі хапацца. А больш за ўсіх стараўся, скаліў зубы Генка Шакута. Вось жа брыдота! Сябрук яшчэ называецца... І чаго ён тут? У іх жа па-ранейшаму каровы няма, ніяк не могуць узбіцца хаця б на цялушку, і Генка, пакуль у школу, амаль штодзень ездзяць з маткай у Мінск і нешта там мяняюць ці прадаюць. Рэдка яны зараз і бачацца. Няма калі. Але хутка зноў пойдуць у адзін клас, ужо ў мястэчка. А гэтае дзяўчо? Вадзім, нарэшце, пазнаў яе. То ж Люська, ажно з-пад рова! Бачыў яе даўно, яшчэ калі парсючка на лог ганяў. Люська тады ўсё козы, сваю і чужыя, на лозе пасвіла, нароўні з іншай малечай гаць гаціла, лавіла сліжоў, у «свінку», пікуля гуляла, нават часта верхаводзіла над хлапчукамі.

Як ні дзіўна, яны слухаліся яе, часам, калі што не так, Люська магла і таўхача даць любому. Спрыту ў яе хапала. Аднак на яе доўга не злаваліся, бо карала яна па справядлівасці, і гэта кожны добра ведаў.

Захапляліся і зайздросцілі хлапчукі, як Люська казла ўтаймавала, верхам на ім пакаталася. Нехта там навязаў на вяроўцы да алешыны старога, з доўгай бародкай і пакручастымі дужымі рагамі, казла. Яго бы агню баяліся, бо ён ужо не аднаго падшыванца, бывала, гойдаў на сваіх рагах. Але ўсё роўна як магнітам цягнула малых падражніцца з жывёлінай.

Неяк Люська пашкадавала казла, панесла яму палавінку сваёй недаедзенай морквы. Хлапчукі ажно вочы вылупілі, калі Люська з ласункам у выцягнутай руцэ ступіла ў кола, куды казёл ужо мог лёгка дацягнуцца на вяроўцы.

— Уцякай, заб'е! — з жахам крычалі, размахваючы рукамі, хлапчукі.

Толькі Люська як і не чула нічога. Прыгнуўшыся, дробненька і асцярожліва ступаючы наперад, яна са словамі: «На, дурненькі, на», набліжалася да алешыны, ля якой наструнілся, здзіўлены гэткім нечуваным нахабствам, казёл. Аднак малеча яшчэ больш вочы вылупіла, калі казёл, неяк бокам наблізіўшыся да Люсьчынай рукі, узяў губамі моркву, пачаў смачна жаваць. І толькі скончыў яду, як ні з таго ні з сяго палез на Люську з рагамі...

Доўга пасля дзівіліся хлапчукі, адкуль узялося ў такой

пігаліцы спрыту неяк узбіцца казлу на спіну, штомоцы ўхапіцца рукамі за рогі, вытрымаць усе выбрыкі ўпартай жывёліны. Як ні шалеў казёл, як ні прытанцоўваў, што ні выраблаў і галавой, і нагамі, Люська ўпарта трымалася наверсе. Калі ж, злаўчыўшыся, яна пяткай паддала ў адно нейкае вельмі балючае месца, казёл адразу згубіў увесь свой спрыт, астыў і здаўся на волю пераможцы.

Пасля, колькі ні пасвілі яны на лозе, Люську, і толькі яе адну, казёл пакорліва падпускаў да сябе. Яна гладзіла яго, давала што-небудзь смачнае, смела бралася за яго рогі.

Вадзім, пакуль з яго пацвельваліся пастухі, прыгадаў, што яшчэ, ужо зусім нядаўна, расказвала пра Люську сястра Верка. Быццам яе ўкусіў, усё па той жа прычыне — з-за яе безразважлівае смеласці і дабрыні,— нейкі дурны сабака, укусіў за шчаку, калі дзяўчынка вось гэтак жа схацела пагладзіць, пашкадаваць яго. Люська доўга ляжала ў бальніцы, ёй пералівалі кроў, магла нават памерці...

Зараз яна, нейкая быццам ужо не такая, як была раней, быццам значна сталейшая за іх, сваіх равеснікаў, больш разважная і далікатная, сядзела на грудку, таксама смяшліва глядзела на Вадзіма, але ў яе поглядзе было і нешта вельмі спагадлівае, вельмі цёплае, і гэта ўсё разам узятае яшчэ мацней бянтэжыла і трошачкі нават чамусьці хвалявала хлопца. Вадзім губляўся ў здагадках, як яна тут апынулася. Няўжо з Генкам прыйшла? Але чаго?

Люська між тым хутка асекла пустасмехаў:

— Сціхнулі б ужо! Ну, што вы да чалавека прыліплі, што смала тая? На сябе лепш паглядзелі б, перш чым выскаляцца. Самі б так папанасіліся...— Яна, не паспеў Вадзім прымасціцца ля хлопцаў, падскочыла да яго, прапанавала: — Давай вока гляну. Нешта заляцела, відаць.

— Ат, вылецідь...— Вадзім, баючыся новых насмешак, хацеў адмовіцца ад Люсьчынай паслугі, але Люська як і не чула яго слоў. Неяк вельмі спрытна і далікатна, быццам была найлепшы лекар і займалася гэтым усё жыццё, яна левай рукой ашчаперыла Вадзімаву галаву, а правай, ухапіўшыся двума пальчыкамі за вейку, пацягнула яе ўгору.

— Вунь бервяно цэлае...— Люська, не паспеў Вадзім і апамятацца, раптам упрытык наблізіла твар да яго твару, кончыкам языка нячутна правяла па мокрай зрэнцы і адпусціла вейку.

Вадзім адразу адчуў палёгку, нібы свет яму нанова адкрыўся, нібы гара з плячэй звалілася.

— Як цяпер? — спытала Люська.

— Усё, здаецца... — Вадзім паморгаў раз-другі, яшчэ не верачы, што гэтак лёгка пазбавіўся ад адной непрыемнасці — з вокам. Вось бы так і са штанамі! Каб хто залатаў і каб не было відаць...

— Гы-гы, цалаваліся, цалаваліся! — падхапіўся з грудка і, хітранька крывячы рот, заскакаў на адной назе малы, увесь — з галавы да пятак — канапляністы Булынінай Агаты Васютка.— Кавалер і паненка, кавалер і паненка. Гы-гы!..

— Ах ты, шпінгалет! — цыкнула на яго Люська.— Змоўкнеш ці не?

Але Васютка, бы чортам падбіты, ці мо каб дагадзіць хлопцам, якія не вельмі яго балавалі, больш чым каму давалі пстрычак за любое непаслухмянства, не ўтаймоўваўся, падскокваў на адной назе, працягваў дражніцца:

— Кавалер і паненка... Кавалер і паненка... Гы-гы! Цалаваліся...

Вадзім пачырванеў, ажно — адчуў — усё ўнутры ўспыхнула агнём. Вось жа нахабнік! Каб не гэтак звінелі ногі і не былі падраныя штаны, ён хутка б злавіў яго і надраў бы вушы. Яны ў яго і так вялікія, што ў зайца,— усе ж ведалі, як Агата па прычыне і без прычыны накручвала сыну вушы,— а зараз і Вадзім не пашкадаваў бы гэтага малога брахуна. Дзесятаму б заказаў!

Ён быў упэўнены, што хто-хто, а Люська ўжо абавязкова не сцерпіць абразы і па-свойму расквітаецца з Васюткам. Што ёй дагнаць таго падшыванца! Аднак, наўздзіў, дзяўчынка і не паварухнулася. Толькі, неяк падобраму ўсміхнуўшыся, зусім незласліва сказала Васютку:

— Вось дурненькі. Я ж і цябе пацалавала б, ды ты такі смаркаты...

Хлопцы зноў грымнулі рогатам, некаторыя ажно за жываты пахапаліся. Васютку нічога не заставалася, як, шмаргануўшы рукавом ля носа, падацца да быдла.

Сабралася пайсці і Люська. Вадзім ажно цяпер згледзеў на тым месцы, дзе яна сядзела, невялікі гліняны гладыш з абабітымі краямі, поўны чарніц.

«Вунь яна чаго тут,— падумалася Вадзіму.— З ягад вяртаецца і прыткнулася, пэўна, каб адпачыць. А Генка што? І ён разам?..»

Не паспела Люська і двух крокаў ступіць, як ад узлеску, што па тым баку гравійкі, пачуўся нечы крык. Усе ўскочылі з месцаў, пасталі на грудку, пачалі ўглядацца, не разумеючы пакуль нічога.

— Гэта Барыса Васючкова голас,— выказаў нехта здагадку.

— Сяроўна як плача...

— Ага, там нехта шчэ...

Нарэшце з кустоў на калёсную дарогу, што віляла ўскрай падлеску, выпырхнула фігура конніка, і хоць было яшчэ далекавата, хлапчукі адразу пазналі Рагулю на сваім нязменным рыжым жарабцы. А ззаду гэта хто? На повадзе ў Рагулі? Ды то ж Васючкова Чарнуха! Яна, ну, вядома, яна! А вунь за Чарнухай, панурыўшы галаў, пляцецца і пастух.

Аказваецца,— толькі зараз Вадзім пра гэта даведаўся,— Васючкоў Барыс таксама не раз прыбягаў сюды, да маяка, пытаўся, ці не аб'явілася часам яго прапажа. Ледзь не скрыгатаў зубамі і грозіўся чортведама як спаласаваць пугай, хай толькі знойдзе, сваю аднарогую брыдоту. Больш за ўсё баяўся, каб яна дзе не нарабіла шкоды, не ўзбілася на патраву.

Баяўся, выходзіць, не так сабе. Чарнуха і праўда недзе нашкодзіла і трапіла на вока старшыні. Што ж цяпер будзе? Няўжо не адпусціць?

Хлапчукі, губляючыся ў здагадках, з жахам наглядалі гэтую працэсію: паперадзе жарабец з Рагулем наверсе, у добрым армейскім сядле са страмёнамі, за жарабцом на вяроўцы пакорлівая карова, а трохі воддаль — паніклы, ушчэнт стомлены, заплаканы Барыс Васючкоў.

Калі ўжо ўзбіліся на гравійку, адразу ўзняўшы слуп пылу, Рагуля на хвіліну прыпыніў каня. Невядома, што ў яго было наўме, што хацеў: ці сказаць астатнім, хто там, на грудку, што і ім гэтак будзе, калі не стануць як след пільнаваць быдла, ці мо завагаўся, усё ж пашкадаваў хлопца і ўдумаў адпусціць карову? Не, працэсія рушыла далей, у бок вёскі. Ага, хаця б Рагуля не пашкадаваў каго! Дачакаешся ад гэткага...

Ужо вечарам, калі прыгналі дамоў, і Вадзім, і ўсе астатнія пастухі даведаліся, што карову Васючковым Рагуля так і не аддаў, замкнуў яе ў калгаснай восеці. Многія вяскоўцы былі сведкамі, як прасіла, як малёгала хворая,

зусім нямоглая Куліна, Барысава матка, каб Рагуля адпусціў Чарнуху.

— Прысядацель, ці ж многа тамака, на той бручцы, яна ўжо чаго з'ела?.. Чаго ж так караеш?

— Многа ці нямнога, а штраф за шкоду палагаецца. Такі парадак. Плаці... — Рагуля трохі павагаўся і назваў суму.— Тады і забірай сваю худобу.

— А бо-о-о! — заламала рукі Куліна.— Паймей совісць, прысядацель! Скуль у мяне тыя грошы, калі шчэ дома два раты? І чаму мне болей, чым каму другому?

— Пойдзеш рабіць у калгас, будзе меней. Захацела, іш, як усім! Меней як хто на пазыку гасударсцвенную падпісалася, падаткі ніколі ў час не плоціш...

— Паймей совісць! — Куліна ажно пабялела, ажно перайшла на віск.— Хіба я не на калгознай рабоце надарвалася, га? Ты хіба, як мы, бабы, запрагаўся калі ў плуг, у барану? Што, ужо забыўся? Забыўся, як увесну, калі коней да бэлек падвязвалі, каб на нагах стаяць маглі, колькі прасіў баб, каб выручалі?.. Паймей совісць, прысядацель!.. А цяпер што ж, знасілася я, не магу. Усё баліць усярэдзіне, як агнём пячэ. І дахтары тыя не памагаюць. А ў хаце ж, кромі Барыскі, яшчэ меншы...

Рагуля, убачыўшы, што ля канторы стоўпіліся некалькі цікаўных, галоўным чынам жанок, не схацеў уступаць у спрэчцы. Лічыў, што калі ўступіш, не праявіш характар, то зусім затопчуць, ніякай справы тады не правернеш... А спраў у калгасе — хоць дзень, хоць ноч рабі, ніколі не пераробіш. Ён рашыў, што пара даць Куліне пад саменькі дых, каб болей не звягала, не муціла тут ваду, не сарамаціла яго. «Іш, знайшлася...»

— Хварэеш, кажаш, па дактарах бегаеш,— успыліў ужо Рагуля.— На поле не можаш... А венікі, цэлыя вязанкі, на базар цягаць можаш? Смятану, масла прадаваць можаш?.. І ўсё бедная, гаротная. Ведаем мы такіх гаротных... Плаці штраф, а не то на бойню здадзім карову. Заўтра ж адвядзём!.. Я цацкацца не буду. Гасударсцвенныя інцірэсы для мяне важней усяго, ведай гэта добра.

## 3

Ноч ішла на спад, а яна яшчэ і на хвілінку не змружыла вачэй, не забылася хоць у кароткім, але такім патрэбным, каб неяк жыць, стаяць на нагах, рабіць сваю работу,

сне, без якога, ведала, увесь дзень будзе як тлумная, а ў дадатак да таго, што яшчэ і сярэдзіну ўсю бы хто абцугамі сашчаміў ці лінуў туды воцату, то і зусім калека, апошняя немач. Ведаючы гэта, яна была і прылягла трохі на падушку, прыкрыла ногі старой ваўнянай хусткай,— нешта яны апошні час пачалі шэрхнуць і без дай прычыны мерзнуць,— аднак не змагла ўлежаць і паўгадзіны, зноў паднялася, села на табурэтку ля акна, зноў глядзела на вуліцу, у начную шэрань, і ўсё думала.

За перагародкай на шорсткім сенніку спалі Барыс, валетам з ім і Пятрок. У Петрака хоць і свая, асобная пасцель, але ніяк пакуль не прывучыцца класціся адзін. Усё плішчыцца і плішчыцца да старэйшага, да Барыса. Хай сабе і ў ногі, але каб толькі разам. Эх, дзеці, дзеці...

Недзе на кухні, ці не ля коміна пры стол, зашабуршэла, заскрэблася мыш, можа, нават і не адна, і Куліна адразу пераключылася на іншае, падумала, што трэба было б завесці маладую рыску, вунь у Яськавай Марылі кошка прывяла ажно чатырох, такіх слаўных, такіх пакуль бездапаможных, і Марыля ўжо бядуе, дзе іх рассоваць, хто б узяў сабе. Тапіць жа надта не хочацца, шкода, як-ніяк жывое...

Але зноў, калі падумалася пра гэта, бы токам працяло: а як жа будзе з малаком? Чым і рыску тую напачатку карміць? Хлопцы ж во і самі звечара ляглі паўгалодныя, не даеўшы крупніку. У абед зварыла на трынозе, спадзявалася на малако вечарам, каб забяліць, нават Марылю падвяла, таксама не наліла ёй літру — Марыля ўжо даўно, з саменькай вясны, брала для дзяцей у іх малако, паабяцаўшы ў аддзяку памагчы капаць картоплю, яшчэ ў чым, калі трэба, падсобіць... Як жа цяпер з Чарнухай? Няўжо Рагуля не аддасць, зацягне на бойню, як гразіўся?..

Куліна ўжо шкадавала, што не схадзіла звечара да Сымонаў: можа б, пазычылі тыя на штраф грошы? У каго-каго, а ў іх ёсцека. Лёдзіка вунь фінагентам зрабілі, ездзіць па вёсках, а Фанька — фуражыр у Рагулі, улез жа неяк, перападае, кажуць, яму нямала дабра... Ды і з самім Рагулем яны ў вялікім хаўрусе.

Пашкадавала яна зараз і пра другое: не трэба было свяціцца на базары, прадаваць венікі і тое збітае з такой цяжкасцю масла. Адарвала, можна сказаць, ад дзяцей, ад сябе, нішчымніцай тры тыдні давіліся, але збіла на сваю галаву дзве місачкі па фунце з нечым у кожнай. Бач,

некаму ж вока засвярбела ад таго масла, адразу данеслі Рагулю. А хто? Хто ж яшчэ мог, як не магазіншчыца тая прыблудная, як не Любка Клыпа? Аціралася якраз там, губы свае намалявала, напаказ усім выстаўляла, нешта з убораў шукала. Мала ў яе шчэ тых убораў? А тут во каб палітончык і якую кашульку наверх купіць меншаму да школы — пойдзе ж, пойдзе, нарэшце, у першы клас, дачакаўся-ткі! — як трэба папасушыць мазгі, як трэба пакруціцца.

Яна памкнулася была падысці да куфэрка, падняць яго цяжкае вечка, яшчэ раз паглядзець, памацаць рукамі Петрыкаву абнову. Але перадумала. У перадранішняй шэрані што там добра ўгледзіш. Ды і шумам — куфэрак апошні час надта ж пачаў скрыгатаць у завесах — баялася, каб ненарокам каго не пабудзіць. Барыс сёння спаў як ніколі кепска, скрозь сон нешта голасна, амаль істэрычна крычаў, кідаўся з боку на бок на сенніку, і яна некалькі разоў кралася да іхняга ложка, у трывозе ўглядалася ў родныя твары сыноў, пасля ціха шлэпала назад, да акна на сваю табурэтку.

Цяпер, пад раніцу, Барыс бы трохі паспакайнеў, і яна, аберагаючы гэты самы салодкі хлапечы сон, сядзела амаль не варушачыся, зноў і зноў думала пра сваё.

Не, не такім бачылася ёй яе пасляваеннае жыццё. Другія, хто дачакаўся з фронту мужа, гаспадара, рабілі зараз у чатыры рукі, нешта дабудоўвалі, нешта па-новаму ладкавалі. Як ні цяжка было, а стараліся тое-сёе і ў хату прыдбаць. Адзін хто з сям'і, каб мець жывую капейку, ішоў у мястэчка, уладкоўваўся ці на лесазавод, ці ў МТС, на чыгунку тую ж, а то і ў Мінск падаваўся, другі — вядома ж, найперш яна, жонка — заставаўся пры двары, у калгасе працадні зарабляў. Пустыя яны былі, тыя працадні, слёзы адны, а не заробкі, але ж усё роўна нехта павінен быў цягнуць і гэты воз. Як бы там ні было, а думалася ж пра лепшае, была надзея, што яшчэ год-другі — і ўсё перайначыцца, меней будуць падатку браць, пазыку мо тую адменяць ці хаця б паменшаць, трохі што і ў магазін у мястэчка дадуць. Хлеба ж і там купіць вольна не купіш, трэба з начы ў хвост станавіцца. Ды і то ці дастанецца...

Ёй, Куліне, здавалася, калі яна слухала радыё,— яшчэ даваенная чорная талерка во як спатрэбілася, добра, што ўберагла,— што ў іх, мусіць, як нідзе нямашака горай. Усюды ж, толькі і чуеш пра гэта па тым радзіве, людзі

жывуць калі яшчэ не заможна, то ўсё ж добра, нават шчасліва, шлюць правадыру пісьмы і падзякі ў Маскву, песні пра долю сваю шчасную спяваюць. А ў іх што? Коней на ўвесь калгас — па пальцах пералічыш, ды і тых толькі летам, калі на траве трохі паходзяць, і можна яшчэ назваць коньмі. Вясной жа — здыхляціна. Гэтак і з каровамі. Божачка, як жа мучыцца і жывёла тая нявінная, калі няма людскага гаспадара? А Рагуля хіба гаспадар? Што ён кумекае ў той зямлі, у той гаспадарцы? Кажуць, да вайны недзе трактары чыніў, а ў партызанах нібыта і пораху не нюхаў... А зараз — ого-о! Шышка, на жарабцы гарцуе, ваюе з бабамі і з дзецьмі, са штрафамі тымі зусім ужо з глуздоў з'ехаў. Нехта ж яго і ў раёне з начальства вялікага засланяе.

Яна была шчыра пераканана, што няйнакш калі не вораг, то злы, неразумны чалавек прымазаўся да раённых начальнікаў і хітранька робіць так, каб усім людзям было кепска. Хіба ж не было і раней, да вайны, такога? Вунь колькі і гаварылі, і пісалі пра гэткіх ціхіх шкоднікаў... Так мо і зараз. Дзе ж тое бачана, каб, ёсцека ў цябе ў хляве што ці хоць шаром пакаці, ясі калі скаромнае ці скваркі той нават і дзеці гады не бачылі, а мясны падатак, ды не кіло, не два, а некалькі ажно дзесяткаў, будзь добры — аддай. Гэтак і з многім астатнім. А не аддасі — наракай на сябе, вядзі на бойню хоць адзіную сваю кароўку-карміцельку. І не спытае той агент па падатках, ці ёсць, ці засталася ў цябе дома хоць расінка макавая. Яму што? Яму сваё трэба зрабіць, добра адчытацца. А на довады, на слёзы твае... Моў, горад карміць трэба. Трэба, вядома ж, трэба. Але ж хіба і ім тут, у вёсцы, есці не хочацца? Чаму ж для таго горада ў Сымонаў і такіх, як ён, не браць болей? Пораўну тут ніяк няможна. Было б хоць што на працадзень той, а то ж — нічога ніякага. А як жа тады жыцьме? Красці хіба? Бронь Бог да такога дакаціцца! Украў быў, як сеяліся, вядро ячменю, каб надраць круп, Язэп Ступак, на чатыры гады звезлі некуды віну сваю загладжваць. Не паглядзелі, што і ваяваў, і здароўе на фронце пакінуў, і медалямі грудзі ўчэплены. Правініўся — палучы сваё. Не, кражай не пражывеш, не будзеш давольны. Гэта мо толькі Сымоны могуць пад сябе грэбці з чужога, і ўсё ім з рук сыходзіць, і на сумленне ім начхаць. Абы свая машна была поўная...

Перабіраючы зараз у памяці вешкі пражытага, давячыся слязьмі ад нанесенай свежай раны-крыўды, Куліна

раптам ажно страпянулася ад нечаканай думкі: вось бы неяк там, у Маскве, пра ўсё, што тут у іхняй вёсцы, нават у мястэчку робіцца-творыцца, дазнаўся ЁН, самы вялікі над усімі чалавек! Каб жа хто асмеліўся ды напісаў ЯМУ! Пэўна ж, ЁН анічога не ведае. Ні пра падатак такі неразумны, ні пра тое, што з хлебам у іх гэтак трудна, ні пра голыя палачкі-працадні, ні пра выбрыкі Рагулі... Нават можна было б пра таго ж Язэпа сказаць. Усё ж чалавек, хоць і правініўся, ды і надта, але не са злога вумыслу ўкраў вядро ячменю — есці хацеў... А тут шчэ дачка Рэня, дзяўчынка большая, на сухоты хварэе, мёд, тлушчы трэба, каб уратаваць.

Божа, колькі пра ўсё можна было б сказаць ЯМУ! ЁН хутка навёў бы парадак, паставіў каго трэба на месца. Гэткую ж вайну выйграў, фрыца прыдушыў, каб галаву болей ніколі не падняў. А тут бы ЁН ужо са сваімі шкоднікамі, якія за яго спіной паскудзяць, хутка б расквітаўся. Што, у іхняй вёсцы, калгасе не можа быць гэтак жа, як у тым радзіве гаворыцца? Каб добра і па-чалавечы?..

І яшчэ ёй падумалася пра адно, пра што яна сама, каб змагла толькі, ужо напісала б ЯМУ. Пра самае-самае горкае, якое ніяк не хацела астойвацца на дне душы, каламуціла і каламуціла, з-за чаго мо і нервы, і здароўе раней часу папсавала, спакойна не спала ўсе гэтыя доўгія пасля вайны дні і месяцы. Пра чалавека свайго, пра мужа Косціка тое. Што ім, ёй і дзецям, давялося з-за яго зведаць, ды яшчэ і зараз даводзіцца...

Як і ўсе, каму яшчэ было каго чакаць, яна, Куліна, таксама чакала мужа з вайны. Чакала спачатку з партызанаў. Ажно тры доўгія гады, як Косцік падаўся ў лес, не было ад яго ніводнай весткі. Яна, хоць і думалася ўсякае, усё ж знаходзіла гэтаму апраўданне: мо іх закінулі дзе далёка, лясам жа канца-краю няма, і паспрабуй надта з той далечыні даць пра сябе які знак.

Калі ж толькі фронт адкаціўся на захад і партызанаў ужо не стала, калі адны з іх вярнуліся дахаты, а другія ўліліся ў войска, каб ваяваць далей, Куліна і тут не падумала яшчэ нічога благога наконт Косціка. Пэўна ж, і ён недзе зараз у чырвоным войску, б'е фашыстаў — ужо на іхняй зямлі. Яна маліла толькі Бога, каб у апошнія месяцы вайны ён пабярог мужа, бо хоць і канчалася тая калатнеча, аднак пахаванкі сыпаліся зараз мо як ніколі густа.

Кожны дзень, як толькі па вёсцы ішла паштарка іхняя Клава Чапылова, жанок пачынала бы ў ліхаманцы якой

трэсці. І чакалі дачакацца не маглі яе, і разам з тым як агню баяліся гэтай самай ціхай і бяскрыўднай жанчыны. Выме з торбы жаданы трохкутнічак — і слёзы шчаслівыя на вачах, і словы ўдзячныя ад саменькага сэрца. Пройдзе міма, толькі павітаецца, кіўнуўшы моўчкі галавой,— таксама не бяда. Ёсць яшчэ надзея, што заўтра-паслязаўтра прыйдзе той трохкутнічак, парадуе ўсіх.

Але ж і іншая была пошта, і Клава, скамянелая, непазнавальна чорная ў твары, аддавала яе з рук у рукі таму, каго гэта тычылася. Ужо не жаданы трохкутнічак з такім знаёмым, такім родным почыркам, а казённы лісток з няшчадным, як пярун, як лязо брытвы, словам: загінуў...

Ей, Куліне, па-ранейшаму нічога не было. Ні мужавага пісьма, ні казённай паперы. І ўсё ж яна суцяшала сябе: мо некалі пісаць, гэткія ж ідуць баі, яшчэ напіша. Пасля браў іншы одум, тачыла душу ўжо сапраўдная трывога за Косцікава жыццё. Але каб загінуў, то хіба не паведамілі б?..

Ні яго самога, ні весткі якой не дачакалася Куліна, калі і там, у пекле тым германскім, усё закончылася, калі і на ўсходзе аціхла. Дарэмна яна як не штодзень бегала на станцыю, сустракала-праводзіла вачыма кожны воінскі эшалон, усё спадзеючыся, што сыдзе, сыдзе ж нарэшце на родны перон і ён, Косцік, абдыме яе, вытра закарэлай салдацкай насоўкай яе горкія слёзы, раскажа пра ўсё, што было з ім у гэтай найвялікшай людской калатнечы. Не, не сышоў, не абняў. Ні праз месяц, ні праз год нават...

Ніхто, пэўна, не ўведае, што перадумала, перажыла яна за гэты час, якіх толькі сноў, адзін ад аднаго горшых і страшнейшых, ні перасніла.

Нічога не ведаў і ваенкамат, колькі туды ні хадзіла, колькі ні назаляла. Яны, праўда, некуды ўсё пісалі, але толку з гэтага было мала. Не далі ніякай яснасці і партызаны, хоць звярталася да многіх, што ад пачатку і да канца былі ў лесе.

Цяжка жыць у такой няпэўнасці: удава ты, жонка партызана або франтавіка, што загінуў, злажыў сваю галаву, як і многія, ці чортведама хто? Няпэўнасць гэтая, акрамя ўсяго, не давала, мусіць, права і на помач дзецям, бо калі іншым жанкам хоць што-кольвечы давалі за чалавека, то ёй за Косціка ніхто нават і не заікнуўся. Быццам і не было яго саўсім на вайне, быццам адседжваўся дома ў яе пад спадніцай. Пайдзі зараз каму дакажы што. Той вунь, да Кротава шчэ, фінагент Заборскі, ці як яго там,

трымаў ужо нос па ветры і ніяк не хацеў браць у разлік, калі тармасіў яе з падаткамі, што і яна салдацкая ўдава і можна было б зрабіць нейкую паслабку.

— Нічога не знаю і знаць не хачу,— гнуў сваё ён, важна рассеўшыся на ўслоне ля стала, расклаўшы на ім свае паперы.— Вот у мяне імеецца спіс, хто пагібнуў. А твой мужык дзе, не знаю. А мо ён дзе здрэйфіў быў ды на другі бок перакінуўся? Я пачом знаю? А зараз ужо дарогі назад няма, каб і хацеў...

Яна тады, помніцца, як стаяла з віламі ля печы, так і кінулася з імі да стала, гатовая наскрозь праштырхнуць гэтага недавярка, які пасмеў гаварыць ёй такое пра Косціка... Пасля, трохі ўжо апамятаўшыся, сама была задаволеная, што не ўзяла грэх на сваю душу, што нешта ў апошні момант, ці не ўскрык Петрака, яе спыніў. Ды і Заборскі той, дарма што важны і грузны, адкуль і спрыт толькі ўзяў, хуценька скокнуў у агародчык праз адчыненае акно.

Цэлы дзень і ноч яна тады плакала, нічога і ў рот нават не ўзяла. Душыла, раздзірала грудзі крыўда, якая засланіла ўсе астатнія думкі і пачуцці. Каб яе Косцік мог здрадзіць ці там што вытварыць... Як можна толькі і ляпнуць такое, не ведаючы чалавека?! Як?!.

Дзе ж ты зараз, дарагі чалавек, у якой зямельцы парыш свае костачкі? А мо і праўда з табой што адбылося, мо папаў у якую бяду і не можаш падаць голасу, не можаш аніяк аказацца? І ніхто ў свеце не ведае пра тваю бяду, нават тыя, з кім ты быў разам, з кім ішоў па цяжкіх дарогах. На вайне ж усякае магло стацца...

У бясконцых думках пра лёс Косціка згадвала Куліна выпадак з таго першага дня, як толькі ўварваліся ў іхнюю Жорнаўку немцы.

Тады, ратуючыся ад страляніны, ад мін, што сваім выццём і нярэдкім вухканнем недзе амаль побач дыбам узнімалі на галаве валасы і ажно раздзіралі напалам душу, яны, вяскоўцы, сядзелі найбольш у агародах, у выкапаных глыбока ў зямлі ямах-хованках. Калі ж трохі аціхла, страляніна адкацілася бліжэй да мястэчка, той-сёй пачаў ужо вылазіць наверх, каб дыхнуць паветра, а найперш агледзецца, пераканацца, ці ўсё цэлае з пабудоў, ці няма дзе пажару або разваленага чаго ад выбухаў.

Вось тады, не прайшло яшчэ гадзіны, як яна, Куліна, з Барыскам і Петракам зайшлі пасля зямлянкі ў хату, і прыбег да іх Лідзін хлопец — Вадзім. Яна спачатку падумала пра самае горшае: усё, некага з іх, Ліду ці каго

з дзяцей, а мо і ўсіх разам, акрамя Вадзіма, забіла. Інакш чаго ж у яго такі ўстрывожаны, такі разгублены твар?

А Вадзім вазьмі ды скажы:

— Цётачка, мама вас просіць. І каб скарэй толькі...

Яна, добра што на вуліцы было пакуль ціха, падалася ў Лідзін двор. Трымалася, каб не гэтак кідацца каму ў вочы, блізенька да плота.

Ліда, нейкая ўся распэтланая, таксама разгубленая, сустрэла яе ля брамкі і адразу горача зашаптала, забожкала:

— Вой, божачка, што й рабіць, не ведаем. Ён жа адзін там і сцячэ крывёю...

— Ты пра што гэта? — яна зусім нічога не разумела з Лідзінага вохкання і божкання.

Узяўшы сябе ў рукі, Ліда ўсё ж змагла тое-сёе растлумачыць. Аказваецца, толькі што Вадзімку чорт нейкі падбіў прабегчыся каля канюшні. А там, у расхлябленай насцеж каморцы для вупражу, нехта цяжка стогне. Вадзім хуценька дадому, яе паклікаў. Глянулі, а гэта ж баец наш, маладзенькі такі, увесь ажно чорны, закарэлы ад поту і крыві. Неяк учуў іхнія крокі, адразу напяўся, хапіўся быў за гранату...

Яны вярнуліся назад, каб не напужаць яго, каб не нарабіў з сабой бяды... Ды і падумаць заадно, як і чым яму памагчы, як ратаваць, схаваць дзе, каб надта хто і ў вёсцы не ведаў.

— Мо ў лазню пакуль хіба...— выказала яна тады меркаванне.

Ліда як бы абрадавалася:

— Я таксама, Кулiначка, пра тое ж думала. Лазня ў цябе непрыкметная, сярод вішанніку, далей ад вуліцы. Мо ж выхайдаем разам... А ўнясём, калі прыцямнее трохі... Ужо ж к вечару хіліцца, беражонага і Бог беражэ...

Не, не атрымалася ў іх тады нічога. Не ўбярог Бог ні саму Ліду, ні Пётру, ні сынка Лёву. Але гэта пазней ужо было. А ў той дзень крыважэрная смерць упільнавала байца, як той, бедненькі, ні змагаўся за сябе. Толькі нядзёшава аддаў ён жыццё...

Неўзабаве, прайшло ўсяго мінут колькі, як паклікала яе Ліда, ускочылі ў Жорнаўку нямецкія матацыклісты, пасля наляцела іншай пошасці. Шнарылі ўсюды, там-сям пайшлі па дварах, жывіліся лёгкай здабычай.

Занесла нячыстая некага з іх і на канюшню. Як там было, ніхто з вяскоўцаў добра не бачыў, усе ж баяліся

высунуцца з хаты. Але стрэлы ў тым баку многія чулі. Спачатку вінтовачныя — адзін, другі, трэці. А ў адказ — захлёбістыя аўтаматныя чэргі.

Малання — яна бліжэй, чым хто другі, жыла да ранейшай канюшні — расказвала, што і галасы немцаў чула, і нават скрозь марлевую фіранку падгледзела, як яны, навёўшы дулы аўтаматаў, рашоцілі тую каморку, дзе вупраж.

Далей жа яшчэ страшней было. Адчынілі яны дзверы, каб зірнуць, каго ж зрашоцілі, хто і іхняга аднаго паклаў напавал вінтовачнымі стрэламі, як раптам... вухнула, ды гэтак вухнула, што і каморку развярнула ўшчэнт, і аўтаматчыкаў пашкуматала, куды каторага кінула, і агнём адразу ж усё зашугала. Суша тады стаяла, як даўно не было такой, таму і пыхнула ўсё факелам. К ночы ад канюшні адны галавешкі толькі смылелі...

Так і не ўратавалі параненага байца, не дазналіся, хто ён і скуль родам. Нічога, нават костачак, не засталося на тым месцы. Быў чалавек і зусім яго не стала. Бы выпарыўся ўсё роўна. Вот жа жытка чалавечая. Мо так і з Косцікам яе дзе. Ці ў партызанах шчэ дзе, ці ў войску штоякое адбылося. І ніхто, ні адненькая блізкая душа не бачыла, не ўзяла на заметку сабе, што гэта быў ён, Косця Васючкоў з Жорнаўкі. Таму мо і ні пісьма, ні іншай якой вестачкі... Як жа жыць зараз без яго, як дзяцей гадаваць?

Яна па-ранейшаму не клалася ў ложак, хоць галава была ўжо зусім тлумная. Ведала — прыляжа, то і зусім можа расквэсіцца, не падымешся пасля. Сёння чамусьці як ніколі доўга не адпускала ўсярэдзіне, але яна, Куліна, ведала, што ніхто, апроч яе самой, не паможа ёй, калі яна перастане шавяліцца, увіхацца, спраўляць свой звычны жаночы клопат.

Стараючыся не нарабіць шуму, яна прыадчыніла акно ў агародчык і адразу ўпікнула сябе, што не дадумалася да гэтага раней. Са свежым перадранішнім паветрам у твар дыхнула водарам ажыўшых пасля дзённай сухмені кветак — вяргіняў, у гэтым годзе, нягледзячы ні на што, вельмі буйных, ядраных, мальваў і сухавеек, пах якіх ажно казытаў ноздры. Куліна адчула, што боль нібыта паменеў. Сядзела вось так, слухала цішыню вуліцы і зусім не прыкмеціла, як самі сабой заплюшчыліся вочы, даючы хоць невялікую расслабку знерваванаму, змучанаму за дзень целу.

Не пачула яна ў гэтым зацятым кароткім сне, калі, быццам толькі што з пашы вярнулася, зайшла ў двор, спрактыкавана піхнуўшы адным рогам брамку, іхняя Чарнуха, ціха, як заўсёды рабіла, мыкнула і падалася да хлява.

## 4

Невясёлыя думкі ў той позні, далёка за поўнач, час роіліся ў галаве і яшчэ аднаго чалавека — Рагулі. Люба ўжо даўно, пакрыўджана адвярнуўшыся да сцяны, на якой усцяж усяго ложка, ад білкі да білкі, віселі маляваныя на палатне вельмі кідкія, вочы ажно ламала, гусі-лебедзі, пасопвала носам, а ён курыў папяросу за папяросай, давіўся дымам, але ўсё роўна ні на хвіліну не пакідаў свой занятак. Гэтак было хоць трохі лягчэй...

Нарэшце, не вытрываўшы, відаць, ад смуроду, яна чмыхнула, лэпнула гарачай рукой па яго грудзях, пасля рыўком, агаліўшы — поначы нават добра было відаць — белыя гладкія сцёгны, павярнулася на спіну, раздражнёна ўжо сказала:

— І якая муха сёння цябе? У такім настроі мог бы і не прыходзіць, не класціся разам...

Ён не стрымаўся, таксама едка кінуў:

— Ну і сука ж ты! Табе адно наўме. Магу і пайсці! Але...

Люба зразумела, што перагнула трохі палку, што такім вось чынам нічога не даможацца ад яго — ні ласкі, ні прызнання, хто сапсаваў яму настрой, ад чаго прыйшоў чарнейшы за ноч.

— Даруй, Васечка, лапачка, золатца маё,— яна змяніла тактыку і ўжо як мага пяшчотней загаварыла зноў: — Ведаю, як ваяваць табе з гэтымі бабамі, наводзіць той парадак. Мой Міша казаў вечарам, што гэтай... як яе?.. Васючковай карову ты заняў, штраф уляпіў. А што ж яны сабе думалі? Распусці толькі...

— Ды заткніся ты! — узарваўся ён, і Люба ад неспадзеўкі ажно падскочыла на коўзкім, цеснаватым усё ж на дваіх, матрацы, пасля, ні слова болей не кажучы, уткнулася тварам у падушку, захліпала.

У яго расло і расло раздражненне супраць гэтай жанчыны, і зараз ён быў гатовы невядома што зрабіць з ёю. Стрымліваючы сябе, Рагуля падняўся, спусціў долу ногі, торкнуў у вазон акурак, суха спытаў:

— Там што... ну, выпіць каб... Знойдзецца?

— Есць, як жа! — Яна, адразу перастаўшы хліпаць, горача адгукнулася на гэту просьбу.— Схадзі сам. У шкапчыку на кухні. На самым нізе глядзі...

Ён пстрыкнуў выключальнікам, але святла не было. Тады Рагуля вярнуўся назад, да ложка, намацаў на стале карабок з запалкамі, зноў падаўся на кухню. Пры хісткім кволым святле знайшоў бутэльку, і не адну, не дзве нават. Яшчэ зларадна падумаў: «Нацягала ўсякіх. На роту хапіла б...» З той, дзе пачата гарэлка, выдраў зубамі корак, не шукаючы шклянкі, поўна наліў у вялікую, з-пад вады, кварту, прагна, адным доўгім глытком выпіў да дна.

Люба, калі ён зноў лёг з краю, паспрабавала яшчэ раз падступіцца, уведаць прычыну сённяшняй яго раздражнёнасці, бы нейкага страху ў вачах.

Напачатку яна не надала значэння гэтаму яго настрою — ці мала якіх непрыемнасцей звальвалася на галаву старшыні калгаса. Але зараз, калі ён поначы, зусім ні з таго ні з сяго, палез па гарэлку і, добра чула, наліў і кульнуў як не паўбутэлькі, калі высмаліў пачку «Казбеку», яе таксама ахапіў неспакой, нават трывога і за сябе, і за яго. А мо ёй толькі так здаецца? Каб жа ён сказаў хоць што... А то ж маўчыць, акурат вады ў рот набраў. Толькі калі-нікалі гыркне, бы яна для яго якая-небудзь непатрэбная подсцілка. Была ж, была патрэбная! Вунь колькі папабегаў, папанасіў усяго.

— Васечка, ну што ты?.. Хіба ўжо красівейшую знайшоў? Яно ж да, ты зараз на кані, куды ўжо мне. Ці ж не? Але і да мяне шчэ, ведай, колькі чапляецца! Толькі б маргнула, толькі б схацела...

Яна знарок гэта гаварыла, спрабуючы хоць гэтым, як ёй здавалася, хітрым жаночым ходам расцвяліць яго, крануць за жывое.

Але нічога не выйшла. Ён, бы ўджалены, рэзка хітнуўся, прыўзняўся на локці і, ажно дыханне ў яе сцяла, вочы на лоб палезлі, хапіў усёй пяцярнёй за горла. Давянуўшы, працадзіў скрозь зубы:

— Задушу г-гадаўку, ведай! Жыццё мне пакарожыла... Праз сквапнасць тваю нечалавечую, мацць тваю...

Яна хацела крычаць, але ніякага крыку, апроч хіба глухога ўтробнага храпу, не магла выціснуць з грудзей. Вырвацца таксама не магла, ды і баялася шавяльнуцца, бо адчувала, што хватка ў яго мёртвая, так сабе не адпусціць. Рукі ў яе былі вольныя, яна магла б да крыві

ўшчыкнуць яго, балюча ўпіцца кіпцюрамі ў расхрыстаную валасатую грудзіну, нават да вачэй дацягнулася б. Але інстынкт самааховы ў апошні момант падказаў: не рабі гэтага, цярпі, колькі можаш цярпець, інакш усё, ён зараз зусім ашалееў, і можна чакаць ад яго ўсякага.

Ад спазмаў, удушша, ад нечалавечага болю здавалася, што і сэрца вось-вось разарвецца на кавалкі — гэтак яно стукала-грукала ў грудзях.

— В-в-ва-а-аа-а...— пеністы, на апошнім дыханні ўсхліп вырваўся з перакошанага рота. Яшчэ секунда-другая — і малаточкі, якія ліхаманкава забілі па мазгах, зрабілі б сваё, і ўсё ахінулася б мройна-крывавым туманам... Але ён адпусціў пальцы, і яна, знямоганая, не паварочваючы галавы, аднымі застылымі вачыма сачыла, як Рагуля таропка надзяваў гімнасцёрку, усцягваў на ногі галіфэ. І толькі калі выйшаў на падворак, калі ляпнуў брамкай, яна напоўніцу дыхнула смярдзючым дымным паветрам, пасля аслабелай рукой правяла па шыі, быццам мацала, ці цэлыя храсткі. Не было сілы ні пра што думаць.

Рагуля не пайшоў вуліцай, скіраваў адразу на загуменне. Было рана. Толькі на ўсходзе ледзь-ледзь забарвовела, і ён спадзяваўся, што, пакуль дойдзе да канторы, яго ніхто не ўбачыць: вёска, зmoраная зараз работай, пакуль яшчэ спала. У галаве ад бяссоння, ад выпітага, ад думак — і гарэлка не памагла, ні на хвіліну не прыглушыла іх растрывожаны рой — была цэлая каша.

Не даходзячы колькі да канторы, на дзірваністым грудку пры садзе згледзеў доўгую прыземістую будыніну — восець, куды складвалі зараз снапы. Спыніўшыся, хвіліну павагаўшыся, Рагуля скіраваў на вузенькую сцяжынку-пятлянку, што вяла да восеці. На хаду лэпнуў па кішэньцы ў гімнасцёрцы, неслухмянымі пальцамі выняў ключ.

Усярэдзіне было зусім цёмна, і ён, стаўшы ў дзвярах, нейкі час намагаўся ўспомніць, дзе ўчора навязаў тую паганую карову. «Хоць бы гук які падала, брыдота... А мо ўжо хто выпусціў ці здохла? Яшчэ тады на маю галаву...»

Не, карова была на месцы і на нагах. Як ні ў чым не бывала, яна смачна, бы ў сваім хляве, жавала жвачку, нават галаву не павярнула ў ягоны бок. Ён адвязаў яе ад шула, скінуў з шыі вяроўку і, з усёй сілы пнуўшы ботам пад бок, выдыхнуў:

— Но-о-о, ваўкарэзіна!

Ад нечаканасці ці ад болю Чарнуха ўскінула азадак, вопрамеццю кінулася ў расхлябленыя дзверы. А ён зноў той жа сцяжынкай-пятлянкай, каб не абрасіцца, бо боты пускалі ўжо ваду, вярнуўся на дарогу.

У канторы не стаў уключаць святло, сеў, узлакаціўшыся на абшарпаны стол, не ведаў, што зараз рабіць, як дачакацца тога дня. Да дзевяці, калі з'явіцца на службу Кантовіч, было яшчэ багата часу, здаецца, цэлая вечнасць. Шкода, што няма ў яго дома тэлефона, а то падняў бы з пасцелі, хай бы і ён трохі п... дробным макам. У яго крэсла цяплейшае, і яшчэ больш наробіць у штаны са страху згубіць яго. Цяпер ужо назаўсёды.

На ганку нехта зашкробся ў замку, пасля піхнуў дзверы, і Рагуля не адразу ўцяміў, хто гэта і чаго прэцца ў такую рань. І толькі калі ў маленькіх сенечках бразнулі вёдры, ён здагадаўся — прыйшла прыбіраць нямая Рошчыха. «Цьфу, маць тваю...— услых вылаяўся ён.— І тут спакою няма. Нат у сваёй канторы. Чаго качарзе гэтай старой так рупіць?»

Рагуля рашыў пайсці адсюль. Няхай прыбірае. Стрэліла думка ўсё ж наведаць Кантовіча дома. Пасля, у кабінеце ў яго, можаш і не пагаварыць сам-насам. Будуць ісці саслужыўцы — хто з чым. Рагуля ўжо і ўчора, адразу пасля палiклінікі, завітаў бы да яго, каб нехта не сказаў, што Кантовіч у Мінску і вернецца надта позна.

Да мястэчка, не схацеўшы сядлаць жарабца, паплёўся пешкі. Ногі ад бяссоння, ды і выпітага, якое яшчэ не зусім вычхалася, ажно запляталіся. Зараз нават горай, чым калі выскачыў ад Любы. Але ён ведаў, што, пакуль дойдзе, трохі мо палепшае, паяснее ў галаве. А яму зараз трэба о-го якая ясная галава!

Было ўсяго а палове сёмай, як ён пастукаў у дзверы, дзе жыў Кантовіч. Кнопкі званка ў вушаку не знайшоў, і давялося стукнуць яшчэ раз, цяпер ужо кулаком і з большай сілай, бо ніхто за дзвярыма ад першага разу нават не шавяльнуўся.

Нарэшце ў прыхожай учуў чыесьці шлёпанцы, пасля сонны голас:

— Хто?

— Гэта я, Антон! Рагуля.

Шчоўкнуў, павярнуўся ў замку ключ.

Па шэрым, зямлістым ажно твары Рагулі Кантовіч адразу зразумеў, што нешта выключнае прывяло чалавека так рана на яго парог. Але ён вырашыў не паказаць выгляду, знарок бадзёра папытаў:

— Што — пажар? Паводка? А мо твой варанец, Аскар твой, капыты адкінуў? Не бядуй, драндулет хутка які-небудзь выдзяляць, будзеш шпарчэй гойсаць. І аўса не трэба будзе.

Рагуля не падтрымаў гуллівы настрой гаспадара кватэры.

Збольшага апаласнуўшы твар халоднай вадой, не схацеўшы нічога ўзяць у рот, як ні настойвала жонка, Кантовіч выйшаў на вуліцу, скіраваў у бязлюдны зараз сквер. Ведаў: тут можна, пакуль тая работа, пахадзіць, спакойна пра ўсё пагаварыць. Ніхто не памяшае.

— Ну, то спавядайся. Не дзеля ж шпацыру падняў мяне з пасцелі. Учора з Мінска поначы прыехаў, па базах лазілі. Недаспаў трохі.

Рагуля крыва ўсміхнуўся, сказаў:

— Нічога, зараз цябе халодным душыкам абдам. Адразу ўзбадзёрышся, аж занадта...

— Не цягні жылы! — Кантовіч пачаў ужо злавацца.— Некалі мне. Сёння ў дзесяць у нас вялікая нарада. Па гандлю. Яшчэ выступленне трэба неяк абмазгаваць.

— Добра, добра, не буду.— Рагуля спыніўся, пільна паглядзеў у твар Кантовічу.— Помніш хутар... Ну, ля Заямнага што? Старых тых?..

Кантовіч рагатнуў:

— А што? І з таго свету цябе дастаюць, прывідамі ў сне з'яўляюцца? Нярвішкі, брат, у цябе таго... Лячыць трэба!

Рагуля, сам не чакаючы такога, хапіў яго за каўнер тэніскі, адным махам прыцягнуў да сябе:

— Ідыёт! Жартачкі табе... Жывы стары корч той... Жывы!.. Паняў?! Хутчэй з нас хто на той свет пойдзе, калі...

— Ты што — з глуздоў з'ехаў?! — твар Кантовіча адразу пабраўся бурымі плямамі, бы хто дзеркачом шаснуў па ім.— Яны ж пры нас шчэ... Разве не помніш?..

І ўсё ж тое, што расказаў Рагуля, напалохала яго ўшчэнт, ад напускной саліднасці і следу не засталося.

А было так.

Пасля той прыкрай размовы з Кулінай, калі, падкапыліўшы губы, яна пацёглася дадому, Рагуля надумаў падскочыць у бальніцу, да дзяжурнага хірурга. Яшчэ зранку, злазячы з каня, няўдала ступіў на правую нагу, відаць, моцна вывіхнуў. Цэлы дзень цярпеў, а вось зараз адчуў, што нага, бы цеста ў дзежцы, набухла, у боце ледзь

умяшчаецца. На ноч баяўся заставацца з гэткім болем.

Дзяжурыў нехта Асколаў. Рагуля яго чамусьці не ведаў, хоць амаль усе ўрачы ў раённай бальніцы былі яму знаёмыя. А гэты... Новага, відаць, прыслалі.

Асколаў, дарма што малады, аказаўся вушлым і спрытным. Абмацаўшы нагу, ён нечакана, ажно іскры пасыпаліся з вачэй ў Рагулі, крутнуў яе, штосілы пацягнуў на сябе.

— Ну, брат, табе толькі касталомам быць,— выцер з ілба халодны пот Рагуля.— Так і зусім без нагі можна застацца.

Асколаў засмяяўся:

— Неўзабаве польку скакаць будзеце.

І праўда. Асколаў, не шкадуючы спірту, змазаў шчыкалаткі, пасля доўга пальцамі, даланёю цёр ля костачак, па сухажыллі. Боль ужо не гэтак адчуваўся, нават і пухліна пайшла на спад. Абуўшыся, падаўшы хірургу руку, Рагуля — ён амаль ужо не накульгваў — вырашыў зазірнуць у прыёмнае аддзяленне. Мо якраз там сёння Іра Лабуціна.

Рагулю чамусьці няўцерп захацелася пабачыць дзяўчыну.

Пазнаёміўся ён з Ірай тыдзень таму, зусім выпадкова. Заскочыў быў на хвілінку на пошту, няўдала неяк матлянуўся і выбіў з рук у дзяўчыны — тая за нешта разлічвалася з паштаркай — кашалёк. На цэментавую падлогу звонка сыпанула добрая жменя манет. Дзяўчына павярнулася ў ягоны бок, з дакорам зіркнула, пасля зусім незласліва сказала:

— Во мядзведзь! Збірайце цяпер. Гэта мае апошнія. А да палучкі яшчэ...

Ён, уражаны яе прыгажосцю, стаяў, бы той доўбень, пасля нагнуўся, пачаў усё ж збіраць грошы. Пазней, калі развіталіся, калі Іра прызналася, дзе робіць, ён, ідучы ў кантору, папракнуў сябе, што не мог даўмецца замест той рассыпанай драбязы даць ёй — для гэтага і прычына была найлепшая — якую дзесятку сваіх. Не схацела б, засаромелася б — пераканаў бы, што да палучкі толькі.

Іра якраз не дзяжурыла. Была з самай раніцы. У прыёмным пакоі, досыць утульным з-за мноства вазонаў, сядзела яе зменшчыца, пажылая стомленая жанчына, якая сказала пра Іру. Рагуля яшчэ папытаў, калі Іра заўтра будзе. Пажылая медсястра не паспела адказаць: у пакой з пугай у руцэ, у разбітых салдацкіх чобатах з абмоткамі нясмела заглянуў прышчыкаваты хлапец.

Сказаў, што з вёскі, з Заямнага ажно, прывёз хворага. Ён во тут, у павозцы на двары.

— Што ў яго? — неяк абыякава запытала медсястра.

Прышчыкаваты, бы вінаваты ў чым, пачырванеў, пераступіў з нагі на нагу, зноў азваўся:

— А я знаю бо? Адняло ўсё. Вачыма шчэ толькі стрыжэ... А так — пластом.

— Сюды б яго неяк палажыць пакуль што...— яна глянула на Рагулю, папрасіла: — Паможаце?

Рагуля, ні пра што яшчэ не думаючы, лёгка і бесклапотна згадзіўся падсобіць хлапцу.

Хворым аказаўся стары гадоў пад семдзесят, з блеклажаўтлявым ілбом, няголеным тварам, са шчыльна самгнёнымі вейкамі. Пакуль сястра бегала некага клікаць, ён, рэагуючы, відаць, на яркую лямпачку пад столлю, на хвіліну расплюшчыў вочы, глянуў на тых, хто нёс яго, укладваў на кушэтку.

Раптам зрэнкі яго расшырыліся, у іх адбілася нечалавечая пакута і жах. Здэцца, яны шылам калолі, праціналі ажно наскрозь.

— Ляжыце, баця, ляжыце.— Хлапец, адчуўшы нешта нядобрае, нейкае раптоўнае ўзрушэнне, пагладзіў у старога руку, паправіў на галаве рэдкія валасы.— Усё, тутачкі ўжо не прападом. Жыці будзема, баця... І гаварыць шчэ... уга колькі!

Рагулю нібы токам што ўдарыла: дзе ж, дзе бачыў ён гэтыя вочы, гэты пякучы знішчальны пагляд, гэтыя выцвілыя, такія здзічэлыя ад гневу ці нянавісці гузічкі-зрэнкі?! Дзе?..

І раптам здрыгануўся, адвёў свае вочы ад вачэй старога. Адчуў, што калі зараз вось не пойдзе, не пабяжыць нават адсюль, то сам страціць прытомнасць, грымнецца на голы цэмент.

На вуліцы, дарма што было цёпла, яго пачала біць ліхаманка. Дрыготкімі пальцамі ледзь адвязаў ад дрэва свайго Аскара, ледзь ускараскаўся ў сядло. У той вечар, хоць і не планаваў заходзіць да Любы — яна яму ўжо нямала абрыдла, і Рагуля неаднойчы падумваў, якую б гэта знайсці зачэпку і парваць з ёю, раз і ўжо назаўсёды,— аднак, каб не застацца сам-насам са сваімі думкамі, рашыў усё ж пастукацца ў яе дзверы...

Зараз, ходзячы з Кантовічам туд-сюд па ціхай у гэты ранні час ліпавай алеі, расказваючы пра ўчарашняе, пра сустрэчу ў бальніцы, ён менш за ўсё думаў, як правёў ноч,

як паспеў напаскудзіць і Любе. Было не да таго. Гняло другое...

— М-да-а...— пасля нядоўгага маўчання выцадзіў Кантовіч.— Дурнецка тады ўсё палучылася. Не думалі ж нічога такога. Узялі б, і ўсё там... Каб стары той не ўзбурыўся, ведзьма яго не ўчапілася ў валасы, ляманту на ўвесь двор не нарабіла. Наскочыў бы хто на крык іхні, і нам бы тады... Факт. Кулю ў канцы вайны, ды шчэ ад сваіх... Раманаў і натацый доўга б не чытаў.

— Мы і так у яго былі на падазрэнні.

— Гэта табе здаецца,— не згадзіўся Кантовіч.— І ён, і камісар мяне цанілі... Факт!

Рагуля, крывячы губы, усміхнуўся:

— Надта ж ты пра сябе важнай думкі. Ведалі б у атрадзе пра ўсё... Пра нашыя начныя вылазкі ўдвох, і пра Любку-Любачку, і пра кватарантку яе Эльвіру. Яшчэ і пра падаруначкі нашыя цішком, каб ніхто ведаць не ведаў. Дагуляліся, адным словам, папілі сівушкі, маць тваю!..

— Гэта ж твая такая сквапная была да барахла, усё мала здавалася,— нібы ўпікнуў Кантовіч.— Дзе ж яна ўсё падзявала? Прадала хіба? А мо закапала?..

Рагулю як солі хто пад хвост сыпнуў. Набрыняўшы крывёю, ён з лютай нянавісцю глянуў у вочы Кантовічу:

— Т-ты-ы, шышка гандлярская! Чысценькім думаеш зараз быць? Успеў ужо адмыцца? Што, страшна стала? Як жа: мірны час, кватэрка свая, дыван на сцяне, жоначка маладая і гладкая, кабінецік на службе асобны, мяккае крэсла, прадукты там лепшыя з-пад прылаўка... А забыўся, забыўся пра ўсё?! Бачыш, Любка ва ўсім ужо вінаватая... А хто, хто прасіў цябе дулам тады размахваць, у ход пускаць?! Хто?! Скажаш, мо і я разам?..

Кантовіч, пабялеўшы, аглянуўся ва ўсе бакі, сцішана сказаў:

— Ты ж ведаеш, папужаць толькі хацелася, каб не вякалі, горла не дралі. А пад дула самі ж палезлі, помніш? Ды ўжо і адступаць позна было.

— Вот, вот, хоць гэта яшчэ не забыўся.— Голас Рагулі трохі памякчэў. А то Любка... Можаш цяпер і ты пахадзіць да яе, твая ж кадра, пакуль за ж... не возьмуць. Ты ж таксама вока на яе касіў, усё аблізваўся, Эльвіру сваю да істэрыкі даводзіў. Зрэшты, а дзе яна зараз? Усё забываў раней папытаць у цябе.

— У Мінску недзе... А, быллём усё параслo. Маладыя былі і дурныя, кроў шалёная грала. А яшчэ галава задурманеная трохі была...

— Добра сабе трохі... Як у бочку лілі. Але ж, відаць, плаціць за ўсё трэба будзе. Не паглядзяць на заслугі. Не чакай.

Кантовіч з надзеяй спытаў:

— А можа, ты памыліўся? Можа, не ён? Пяць жа гадоў пачці...

— Ён, ён! Тут няма памылкі. І пазнаў мяне, бачыў бы яго вочы!.. Вычухаўся ж неяк тады... Моцны, відаць, корч.

— А што рабіць?! — Кантовіч, знізіўшы голас да шэпту, умольна ўжо глядзеў на Рагулю.

Той істэрычна рагатнуў:

— Атруты яму ў боршч падсыпаць. Як каралям рабілі. Чыста і надзейна. І спі спакойна...

— Мне не да смеху, калі ўсё так. Можа, не загаворыць, га? Ці зусім...

— А і Б сядзелі на трубе...— Рагуля выняў з кішэні штаноў гадзіннік, паглядзеў час.— Што гадаць зараз? Нічога не дасць тое гаданне.

Развіталіся яны гэты раз як ніколі дасюль, нават не падалі адзін аднаму рукі.

## 5

Яшчэ ўчора неяк не думалася пра блізкую зіму. Можна было хадзіць без шапкі, нават босым, а ўдзень, калі шчыравала, хоць і нізкае ўжо, сонца, то і зусім без пінжака. Над полем, над садамі, агародамі танюсенькімі срэбнымі нітачкамі плавала павуціна, чаплялася за дрэвы, за ржэўнік, набівалася ў валасы. Лісце, дарма што пажоўкла, усё яшчэ трымалася на дрэвах, бы просячы ў прыроды даць адтэрміноўку, каб болей пакрасавацца, парадаваць вока барвовасцю, мядзяным сваім хараством.

Ноч прынесла змены.

Яшчэ звечара, калі агляდаліся, калі ён, Вадзім, насіў ваду, паіў і даіў карову, а Коля, прыйшоўшы з канюшні, яшчэ ў дадатак да таго, што Лыска падабрала ў полі, кінуў ёй трохі аўсянай саломы, вось тады, проста на вачах, пачало мяняцца на двары. Узняўся вецер і пахаладала. Неакітаваныя з кухні шыбкі акна часта і дробненька, неяк вельмі жаласліва затрымцелі, вусцішна загуло ў коміне.

Праз гадзіны дзве выпастала хату наскрозь, а на кухні, з паўночнага боку, стала бы ў лядоўні.

— Будзем зімой паліць адно грубку,— сказаў Коля.—

Дроў на ўсю хату не набярэшся. Хопіць нам залы. А пагрэцца — пры грубцы можна. Шчэ дзверы на кухню посцілкай завесім, каб холад не так...

Патупаўшы, нешта бы ўспомніўшы, ён апрануў бушлат, падперазаўся бацькавай скуранoй папругай з бліскучай мядзянаю спражкай. Ужо на парозе кінуў:

— Да хлопцаў падскочу. А ты звары картоплі. Хочаш, таўканіцу зрабі. Як выпаліцца, пастаў на жар. Скарынка будзе. З малаком з'ямо.

Ляпнуўшы клямкай, ён пайшоў. Вадзім запаліў газоўку — на лямпу не хапала газы,— пачаў класці ў грубку дровы. Хацеў наніз выбраць што сушэйшае, каб хутчэй распаліць, нагрэць хату. Але з цэлага бярэма ніводнага сухога палена не знайшоў. Мо з паўгадзіны дзьмухаў, соваў трохі паперы, але дровы толькі шыпелі, слязіліся, ніяк не хацелі ўгарацца. Галава ажно распухла ад таго дзьмухання. Урэшце агонь усё ж раз'ятрыўся, узяў сваё.

У чаканні, калі зварыцца картопля, Вадзім парабіў што-кольвечы з урокаў. Не атрымлівалася задача, і ён, колькі ні мудраваў, ніяк не мог знайсці патрэбны адказ, які стаяў у канцы задачніка. Рашыў пакінуць на заўтра. Мо ў каго спіша, пакуль пачнецца ўрок. Шкода, што, акрамя Генкі Шакуты, ніхто з іхняга краю не пайшоў у пяты клас, ужо ў само мястэчка. Ні Міця, ні Барыс Васючкоў, ні Марылін Дзімка. Міця, толькі здаў іспыты за пачатковую школу, уладкаваўся на лесазавод і зараз кожны дзень з першым гудком выбягаў з дому, спяшаўся на работу. Барыс, калі пайшоў у школу, у першы клас, іхні Пятрок і зусім занядужала маці, узяў на сябе ўсю гаспадарку. Было яму ўжо не да вучобы.

Болей за ўсіх пашанцавала Дзімку, чым не магла нахваліцца павесялелая трохі Марыля. Хлапец недзе павучыўся і зараз сядзеў на трактары з дзіўнай, загадкавай назвай «Націк», выклікаючы ва ўсіх хлопцаў лютую зайздрасць.

З Генкам Вадзім трапіў у адзін пяты «В», толькі што не на адну парту. Мо гэтак і лепей...

Зараз, таўкучы ў гаршку бульбу, Вадзім думаў пра іхнія адносіны: нешта выходзіла ў іх не так, нейкая бы кошка прабягала між імі ўвесь час. Вадзім даўно ўжо дараваў Генку, што ён тады, у Гараўках, збаяўся, кінуў яго зусім аднаго, не пайшоў пад Баркуны, калі немцы палілі іх разам з людзьмі. Збаяўся, ну і збаяўся. Што ж зробіш. Не век жа помніць гэта. Думалася, што ўжо

ў новай школе, тым больш у адным класе, яны зноў стануць як адна душа.

Спачатку і было так. Кожнае раніцы, узяўшы пад паху патрэбныя кніжкі і сшыткі — торбачкі ці сумкі для іх не было,— Вадзім выходзіў трохі раней, каб паспець забегчы на пасёлак, да Генкі. Той звычайна чакаў яго ўжо на вуліцы. Ішлі і дадому разам.

Нейкі час Вадзім і вечарам бегаў да сябрука. Запаліўшы лямпу, перад гэтым добра, да бляску выцершы анучкай шкло, Генка нёс яе ў бакоўку. Там стаяў стол і тапчан, і яны, нікому не мяшаючы, рабілі ўрокі. Найперш рашалі задачы. У Генкі добра атрымлівалася з арыфметыкай, таму Вадзім напачатку гора не ведаў з гэтым прадметам. Хоць найбольш спісваў ад яго, але і сам таму-сяму вучыўся. Ён жа, Вадзім, пераказваў Генку прачытанае па гісторыі, літаратуры. То быў ужо яго любімы канёк, і Генка, марудлівы на язык, слухаў, часам нават цмокаў, стараўся нешта запомніць.

Гэтак цягнулася да канца верасня. А пасля Генка выкінуў фокус, які зноў астудзіў іх адно да аднаго.

Неяк, калі ўжо вярнуліся са школы, Генка прыбег да яго сам. Вадзім якраз грыз з праснаком антон, падсілкоўваўся, бо ў хаце з яды больш нічога не было, заставалася ад раніцы халодная, у лупінах, картопля, якую паспеў зварыць Коля, але да яе Вадзім больш нічога не знайшоў. Таму праснак, які з ячневай мукі спяклі яны ў грубцы ўчора, быў адзіным падмацункам на пусты, галодны да млявасці, галавакружэння жывот.

— Хочаш грошай? — шапнуў Генка, хоць у хаце нікога не было, хіба што недзе за печчу цягнуў сваю аднастайную песню цвыркун.

Вадзім падумаў, што Генка дзеля жарту вярзе такое, таму бесклапотна і дурасліва нават сказаў:

— А то не?! Што, знайшоў кашалёк ці клад дзе з зямлі выграб? Тады падзялі. Нам з Колем вунь як грошы трэба! Заўтра зноў з аблігацыямі прыйдуць. І нядоімка шчэ... Высыпай на стол!

— Свае мець будзеш...— Генка не прыняў жартаўлівага тону сябрука.— Яблык толькі трэба. У вас жа ё. Пяць ці шэсць кіло трэба. І цюцелька ў цюцельку каб, на бязмене б дзе паважыць.

— Колькі за тыя шэсць кіло? Разбагацееш надта. Чакай. А хто купіць? Прадавака такі...

Генка зноў знізіў голас да шэпту:

— На базу, дзе садавіну прымаюць, здамо. А там, калі квіток дадуць, лёгка пасля «шэсць» дапісаць шчэ і «сот». Усяго тры літаркі. Кумекаеш?.. У бухгалтэрыі не здагадаюцца. Цяцеры тамака сядзяць. Рыла ўжо так рабіў. Думаеш, скуль у яго футболка тая і фотаапарат? У Мінску на барахолцы ўсё купіць можна. Абы грошы.

— Дык гэта ж... гэта...— Вадзім ажно задыхнуўся ад абурэння.— Гэта ж махлярства!.. Во што!.. І ты хочаш, як Рыла? Ён жа блатнюк, яго і са школы гнаць трэ ў карак.

— Пагоняць, чакай. Бацька яго ведаеш якая шышка? На хлебапякарні. Дырэктар тамака. Во! — Генка падняў угору палец.— Гэта ён загадаў, каб у школу нашу, ну, у ларок, хлеба болей далі. Настаўнікі кожны дзень па буханцы бяруць. Што, не бачыў? А так хіба б хапіла?

Вадзім падумаў, што Генка, відаць, гаварыў праўду. Ён сам яшчэ і сёння здзіўляўся, што гэтулькі ў ларку хлеба. Нават давалі, хто меў грошы, па васьмушцы, а то і чвэртцы і вучням. Многія на пераменцы бегалі, пасля ціхенька і ў час урока жавалі. Хлебны дух стаяў на ўвесь клас.

Вадзім таксама разоў колькі і на адной, і на другой перамене заглядваў у ларок, корпаўся ў кішэнях, бы ў яго там што было, толькі ніяк вось не мог знайсці. Пасля, апанураны, брыў назад, садзіўся на сваю парту. Каб не бачыць, як другія ядуць, разгортваў сшытак ці падручнік, стараўся нешта чытаць. Але чамусьці нічога з тога прачытанага не лезла ў галаў, не запаміналася. Звінела чамусьці ў вушах, а перад вачыма мітусіліся чорныя мушкі...

Генка больш не заікаўся пра яблыкі, згрыз два антоны і памалу пацёгся дадому. На развітанне сказаў, што ён выдумаў, нікуды не збіраўся нічога несці. І пра Рылу таксама выдумаў.

Вадзіму верылася і не верылася.

Наступныя дні пацвердзілі: з Генкам усё ж нешта адбывалася. Ужо на другі дзень, не дачакаўшыся Вадзіма, ён пайшоў у школу адзін. У класе апраўдваўся, што не чуў гудка, таму і пабег, каб не спазніцца.

Пасля Вадзім бачыў яго разам з Рылам за прыбіральняй. Яны, хаваючыся там, курылі. А яшчэ праз два тыдні Генка прыйшоў у школу ў новай, амаль гэткай жа, як і ў Рылы, футболцы з замочкам і кішэнькамі на грудзях. Футболка, праўда, была вялікаватая, сядзела нязграбна, асабліва тапырылася на спіне і ў плячах. Але Генку гэта не бянтэжыла. Ён увесь час круціўся ў дзяўчат на вачах,

часта вымаў са штаноў падушачкі, аблепленыя хлебнымі крошкамі, кідаў у рот і апетытна хрумстаў.

Па дарозе дадому прапанаваў жменьку падушачак і Вадзіму.

— Скуль гэта ў цябе? Падушачкі, футболка? — спытаў Вадзім.

Генка трохі памуляўся, адвёў вочы ўбок, сказаў:

— Дзядзька з Гродна прыязджаў. У госці. Ну і во падарыў. А што, кепска? І грошай даў на цукеркі. Ён у нас багацей. Адзін жыве, дак...

— Брэшаш ты ўсё гэта! — не сцярпеў Вадзім.— Няма ў цябе ў Гродне ніякага дзядзькі. Ніколі ж не казаў пра яго.

Генка псіхануў, нешта колкае прамармытаў, пасля вырваўся наперад і, не азірнуўшыся, звярнуў у першую вулку, каб ісці дадому пасёлкам. Вадзім тады не стаў яго даганяць.

...Коля недзе пазніўся, і Вадзім не ведаў, есці аднаму ці ўсё ж пачакаць брата. Даўно ўжо стлела ў грубцы вуголле, і адтуль ішоў надта ж смачны, ажно казытала ў роце, пах таўканіцы, запраўленай смажанай на здоры цыбуляй. Здору, расшчодрыўшыся, прынесла ім цётка Манька, і яны з Колем як мага ашчаджалі яго. Толькі на расскварку, і каб болей ні кавалачка куды так.

На дварэ, чутно было, па-ранейшаму шалеў вецер, недзе голлем шоргала нават па закоце. Хоць грубка была добра напалена, ажно пыхала жарам, у хаце ўсё ж адчувалася прахалода. Цяпла ў такую непагадзь не трымалі найперш вокны. Вадзім падумаў, што заўтра трэба ўжо зняць з гарышча і паставіць падвойныя рамы. А з кім знімеш? Коля цалюткі дзень на канюшні аціраецца. Работы там хапае, прыходзіць, калі ўжо цёмна. Добра, што яшчэ днём можа вырвацца на гадзіну-другую і прыбегчы дадому, похапкам што зварыць на трынозе ці накалоць дроў. Але часцей за ўсё па гаспадарцы ўвіхацца даводзіцца яму, Вадзіму. А што зробіш?

Чамусьці да болю, да спазмаў у горле нагадалася маці, яе шурпатыя, але такія цёплыя рукі, якія craналі, гладзілі яго лоб, калі ён хварэў, пластом ляжаў на кушэтцы. Нагадаўся той вечар, як варыліся клёцкі, многа клёцак... Параска, схіленая над місай, зноў маці, яе апошні, развітальны ўжо пацалунак. Бы ведала ўсё... Збялелы, што мел,

Лёва, і немец у пагонах, калі трымаў яго за каўнер і шпокаў з нагана пад ногі... Здэцца, як даўно тое было. І ці было? Няўжо гэта прайшло праз яго, Вадзімава, жыццё?

Няўцерп хацелася плакаць. Ён прысунуў да грубкі стол, услончык, сеў, прыхінуўшыся спіной да гарачай цэглы, і напраўду заплакаў. Крыўдна было, што і аб Верцы, Славіку нічога дасюль не чутно. Як яны там? Ніякай жа вестачкі, як паехалі, шчэ не далі. Бы ў ваду дзе канулі...

Пры печцы, у цяпле, расхадзіліся, відаць, вошы, бо надта пачало свярбець пад пахамі, на спіне: Вадзім падсунуў бліжэй газоўку, нажніцамі абрэзаў з кнота нагар, і калі той узяўся трохі ярчэйшым язычком агню, зняў з сябе кашулю.

Вошай было нямала, сытых, ужо разбухлых ад крыві. Глытаючы слёзы, ён апантана душыў іх, ажно пакуль не прыйшоў Коля, не заспеў яго за гэтым заняткам.

— Заўтра добра напалім у печы,— сказаў Коля.— Будзем на подзе, у духу, пражыць усё адзенне. Тваё і маё. Мяне тожа кусалі. Коўдры трэ прапякчы. Ніводнай не застанецца.

— Ага, чакай, згінуць яны табе! — Вадзім адзеўся, памыў чыста рукі.— Ужо ж рабілі так. Мыла няма. Ад мыла б яны...

— Дастанем мо і мыла, ага,— згадзіўся Коля.— Скора папрашуся ў Нічыпара, каб парабіў адзін. З'езджу ў Заямнае, змялю жыта. Мо ў Мішкі ці ў яго Каці і грашмі трохі разжывуся. Пасля ж аддамо. За коней Рагуля шчэ абяцаў нешта. Во мяшок збожжа ўжо ё.

Таўканіца на патэльні ўзялася тоўстай карычневай скарынкай, і яны з Колем добра павячэралі. Запівалі малаком. Яно было густое, смачнае, хоць, праўда, трохі ўжо і гаркавіла. Гэты раз Лыска дала мала што больш за літр.

— Запускаецца наша карова,— сказаў Вадзім.— Скора без малака застанёмся. Тады як?

Коля, нешта думаючы сваё, адказаў:

— От, жывы будзем. Мёду ж тры глечыкі ё, прададзім пасля. Пазней, як каляды мінуць, даражэй стане. Мо і Мішка з Кацяй чаго падкінуць...

— Да Веркі б неяк...— выказаў думку Вадзім.— Не аказваюцца зусім. Хварэюць, ці які чорт?

— У іх там, на новым месцы, задушыся хоць, пакуль да толку дабяруцца. Мо ж хто зімой падскочыць... А нам калі? Ды і не блізка.

Спаць ляглі позна. Калі патушылі газоўку, Вадзім здзівіўся, як светла было на вуліцы. Ён выглянуў у акно і адразу ўсё зразумеў. Усюды: на зямлі, на галінках дрэў, на плоце, на склепе ляжала бялюткая снежная коўдра.

Невядома чаму сэрца ажно захлынулася ад радасці.

## 6

Тая жахлівая гісторыя, якую расказвалі пра настаўніцу малодшых класаў Вераніку Васільеўну, разварушыла, узрушыла ўсю школу. Нехта нават кляўся і бажыўся, што чытаў пра ўсё гэта ў адной мінскай газеце: там, быдта, цэлая старонка, ні больш ні менш, пра Вераніку Васільеўну была. Другія пераконвалі, што чулі па радыё пра яе: выступаў нейкі пісьменнік і так хораша, з такім жалем гаварыў пра перажытае ёю ў першы пасляваенны год там, у далёкім, глухім палескім кутку, што ажно валасы на галаве шавяліліся і слёзы самі капалі з вачэй...

У кожнага чарговага расказчыка гісторыя гэта папаўнялася ўсё новымі і новымі падрабязнасцямі.

Цікавей чым хто расказаў Вадзіму пра Вераніку Васільеўну аднакласнік Казімір Лукашык. Казімір быў не мясцовы. Невядома, які лёс закінуў хлопца сюды, у мястэчка. Жыў ён у невялічкім прышкольным інтэрнаце разам з тымі, хто вучыўся і не меў ніякага прытулку, ніякага жытла. Бацька Казіміра, мы ведалі, працаваў у судзе недзе пад Курскам, прысылаў яму трохі грошай. А вось чаму сын не з ім разам, чаму тут адзін сярод чужых людзей, заставалася таямніцай. Але ніхто не лез у яго душу з роспытамі. Настаўнікі вельмі хвалілі Казіміра і заўсёды ставілі ў прыклад. Ён і праўда быў надта ж сур'ёзны, на гады два ці тры старэйшы за астатніх. Вучыўся Казік як не на адны пяцёркі. Аднак любіў літаратуру больш, відаць, за ўсё іншае. Хораша, ажно мурашкі па целе бегалі, чытаў на перапынках вершы нейкіх паэтаў. Дзяўчаты шапталіся, што Казімір і сам піша, але нікому чамусьці не хоча паказаць тое сваё напісанае.

Неяк захварэў іхні географ Антон Паўлавіч, і Казік прапанаваў Вадзіму, пакуль пачнецца новы ўрок, пайсці на стадыён, пасядзець там на траве. Вадзім з радасцю згадзіўся. Вось тут, на стадыёне — якраз ніхто не мяшаў,— Казік з усімі падрабязнасцямі, бы чытаў па кніжцы, і расказаў, што ведаў пра новую вучыцельку.

Доўга, вельмі доўга Вадзім быў пад уражаннем ад пачутага. Відаць, гэта ж адчувалі і іншыя. Многія на пераменах знарок бегалі ў прыземісты драўляны будынак, што стаяў бліжэй да вуліцы, каб цішком зірнуць, якая ж яна, гэтая Вераніка Васільеўна.

У настаўніцкую яна чамусьці хадзіла рэдка, найбольш заставалася з вучнямі ў класе, таму і мала яшчэ хто ведаў яе ў твар. Не ведаў і Вадзім.

Яна сама пазнаёмілася з ім. Атрымалася ўсё нечакана, для Вадзіма нават няёмка.

Той раз у ларок зноў прывезлі боханы свежага хлеба. І зноў Вадзім, ледзьве дачакаўшыся, калі празвініць званок, пабег туды. Цяпер у яго была ўжо нейкая драбяза і можна было смела папрасіць, каб узважылі хлеба і яму — на ўсе грошы, якія ёсць з сабой. Але, як ні спяшаўся, многія яго апярэдзілі. Давялося, хочаш не хочаш, стаць у канец вялікаватага ўжо хваста. Да ўсяго да таго настаўнікам — такі ўжо закон — важылі без чаргі.

Вадзім з горыччу прыкінуў, што, пакуль званок, яму аніяк не прабіцца да прылаўка. Хіба прапусціць урок... Але ж зараз гісторыя, сам дырэктар школы прыйдзе з указкай і картамі ў клас, і паспрабуй толькі без дай прычыны куды адвініся. Ого, пасля перад усімі будзе цябе чыхвосціць, цягнуць жылы, дапытвацца, чаму прагуляў, чытаць розныя натацыі. Чаго-чаго, а строгасці ў яго хапала... Не, лепш у вір галавой, чым такая ганьба!

І ўсё ж, хоць усе, хто стаў быў у яго ззаду, пакінулі чаргу і пабеглі па сваіх класах, Вадзім застаўся ў ларку. А мо пашанцуе, мо зараз чарга пойдзе хутчэй і ён возьме ў рукі кавал гарачага шчэ хлеба...

Званок прагучаў, бы хто ўдарыў па галаве, па нервах малюпасенькім малаточкам, адразу ацвеперазіўшы, развеяўшы надзею падсілкавацца. Пасля, ведаў Вадзім, ларок ужо зачыняць, бо не будзе чаго прадаваць. Ушчэнт азмрочаны, Вадзім выйшаў на двор. Ад свежага паветра ці так ад чаго раптоўна закружылася галава, і ён, каб аддыхацца, на колькі хвілін затрымаўся на ганку.

— Хлопчык, ты што ж? Нічога не ўзяў?

Каля яго, выйшаўшы з ларка, запынілася маладжавая з твару, але чамусьці з сівымі, бы ў старой бабы, валасамі жанчына, строга і акуратна апранутая. Не інакш, нейкая настаўніца. Яна, бачыў Вадзім, стаяла ля самага прылаўка, таксама купляла хлеб.

— Дык жа... Званок быў! — бы дакараючы каго, адка-

заў Вадзім, а сам сабе зласнавата падумаў: «Добра, што сама хоць... Лезуць тут шчэ з рознымі роспытамі».

Ён хацеў ужо бегчы ў свой корпус, але яна, нейк вельмі далікатна, бы калісьці маці, дакранулася даланёй да яго валасоў, ціха і як бы вінавата сказала:

— Божачка, што гэта вайна нарабіла!..— На вачах у жанчыны, згледзеў Вадзім, з'явіліся чамусьці слёзы.— Ты ж і апрануты як... Холадна, відаць.

— Не-а,— хітнуў галавой Вадзім.

Не паспеў ён апамятацца, як жанчына палезла ў сваю сумку, выняла адтуль досыць велікаваты акраец, паклала яму ў руку.

— Вазьмі,— шчыра, дрыготкім голасам папрасіла яна.— Я вельмі цябе прашу... У мяне, глянь, цэлых яшчэ паўбуханкі. Вазьмі, хлопчык!

Яна выцягнула з рукава насоўку, прыклала да вачэй, пасля, ні слова больш не сказаўшы, сышла з ганка, падалася да школьных варот.

Вадзіму хацелася напачатку дагнаць яе, аддаць назад хлеб, паказаць нават грошы, на якія ён мог сам купіць чаго, толькі каб вот не гэты званок... Але чамусьці не слухаліся ногі, ды, як на тое, і мову бы хто адняў у яго, акурат нямком стаў.

У класе, пакуль яшчэ не прыйшоў дырэктар, да Вадзіма на парту падсеў Казік, ціха папытаў:

— А яна што, ведае цябе, га?

— Хто яна? — нічога не зразумеў Вадзім.

— Ну, Вераніка Васільеўна. Хлеба што давала табе...

— ?! — у Вадзіма, адчуў, заняло дыханне, а шчокі ажно ўспыхнулі агнём.— Гэта ж, гэта...

— Добрая яна,— чамусьці вельмі маркотным голасам сказаў Казік. Ён хацеў яшчэ нешта дадаць, але, запнуўшыся на паўслове, павярнуўся, пайшоў на сваю парту.

На тым, па гісторыі, уроку Вадзіму, каб ён не сядзеў ззаду і яго не закрывала шырокая, акурат у дарослага дзядзькі, спіна другагодніка Жоры Бугаёва, або, як усе яго дражнілі, Бугая, давялося б нясоладка. Дырэктар, пэўна ж, звярнуў бы ўвагу на вучня, які, замест таго каб слухаць урок, матаць сабе на вус, сядзіць з анёльскім выглядам на твары, уталопіўшы позірк у нейкую нябачную кропку, і нічога, акрамя тае кропкі, не бачыць, нічога не чуе.

Чуць-то Вадзім і праўда нічога не чуў. А вось бачылася многае. Усё, што расказваў яму Казік пра Вераніку Ва-

сільеўну, устала перад ім гэтак відавочна і ярка, быццам сам ён быў сведкам усяго, перажыў тое, што перажыла гэтая маладая, але без пары ссівелая настаўніца.

...Сяло Саўкі было хоць і прырэчнае, але вельмі глухое, падкоўкай, як змяілася і сама рака, ляжала яно на высакаватай пясчанай выспе ў акружэнні пракаветных лясоў, якім не было ні канца ні краю.

Яна, калі яе ўпершыню прывезлі сюды з пыльнага бязлеснага гарадка, дзе жыла з маткай і меншым братам, радавалася, нібы дзяўчынка. Радавалася сваёй вольнай волі, таму, што, нарэшце, спраўдзілася яе мара — яна стане вучыць вясковых дзяцей, радавалася гэтай прыгожай чысцюткай рацэ (у іх жа там нічога няма), лесу, у якім гэтулькі, казалі, грыбоў, ягад, што ніколі не пабярэш усе, колькі б ні стараўся. Давольная была Вераніка Васільеўна і школкай, няхай сабе маленькай, усяго на два пакоі, але зараз ужо яе школкай, дзе, стаўшы поўнай гаспадыняй, яна пачне самастойнае жыццё.

Вучняў у яе набралася нямала, і ўсе рознага ўзросту. З аднымі трэба было пачынаць з самага пачатку, з загагулінак, пасля літар, вучыць чытаць і рашаць хоць саменькія простыя задачы. Другія да вайны яшчэ паспелі пахадзіць у школу і зараз стараліся што трохі ўспомніць з той сваёй даўняй навукі.

Так ці інакш, работы ёй навалілася па горла, і на першым часе Вераніку Васільеўну гэта не засмучала. Не было калі думаць пра сябе, не было калі сумаваць. Заставалася ж вольная хвіліна — і яна ішла ў лес, балазе ён зусім побач, адразу за хатай цёткі Марты, школьнай прыбіральшчыцы, да якой маладая настаўніца напрасілася і на кватэру, і сталавацца. А то пратаптанай сцяжынкай лёгка, не чуючы свайго цела, збягала з крутаяру на луг, разувалася і басанож, топчучы мяккую шаўкавістую траву, ластаўкай ляцела да ракі. Выбірала там вышэйшае месца, садзілася, падкурчыўшы ногі, на грудок і доўга глядзела на плыткую раку. Часам нават пляла з лугавых красак вянок і кідала ў ваду. Хораша было бачыць, як плынь паварочвала вянок, круціла туд-сюд, бы ліхач-шафёр баранку руля, пасля паціху выкіроўвала на больш імклівы струмень, на спіне якога несла яго ў загадкавую, зманлівую да спазмаў у горле далячынь.

Але скончылася лета, з павуцінай сплыла цёплая як

ніколі восень, полымем адшугаў лістапад. Паніклі травы і краскі. Усё часцей і часцей халодны зарэчны вецер пачаў трымцець шыбкамі вокан, а то і барабаніць кроплямі нудотнага дажджу.

Сум, спачатку неўсвядомлены, пасля ўсё больш і больш зацяты, падкрадваўся да маладога дзявочага сэрца...

Ен прыйшоў да яе ў школку ў часе перамены, калі яна, схаваўшыся ў сваёй «настаўніцкай», як смехам называла Вераніка Васільеўна адгароджаны дашчанай перагародкай пакойчык, дзе мог умясціцца невялікі шкап, стол і дзве табурэткі, парадкавала, тасавала сшыткі, рыхтуючыся да новага, апошняга на сёння, урока. Ен быў вясёлы, на падпітку, і Вераніка Васільеўна адразу гэта змеціла. Не паздароўкаўшыся, не зняўшы кубанкі, ён бухнуўся на табурэтку, і тая ажно зарыпела, застагнала пад яго мускулістым целам.

— Ну, здарова! — нарэшце вымавіў ён, шчэрачы моцныя белыя зубы.— Я Вася. Васька Кнот. Чула? Не? То давай знаёміцца...

Вераніка Васільеўна змоўчала, а нечаканы візіцёр, не даючы ёй апамятацца, амаль гвалтам узяў у сваю пляскатую, бы лапата, клюшню-руку яе кволую далонь, трохі, злёгку, ціскануў. Ей хацелася закрычаць, нават заплакаць, але нейкае ўнутранае чуццё казала, што якраз гэтага рабіць нельга, што ён толькі і чакае таго, каб яна папрасіла літасці.

Ад болю ў Веранікі Васільеўны нагарнуліся на вачах слёзы, аднак усё ж трывала. Трывала мо яшчэ і таму, што за грубай хлапечай выхадкай, за гэтай вось развязнасцю і бесцырымоннасцю ўгадала ў ім зусім не тое, што хацеў ён невядома чаму сам выставіць напаказ. Няўжо ж яна памыляецца?

— Да сілы б яшчэ далікатнасці...— ціха сказала яна, і яе голас, тое, як яна трымалася і як гаварыла, абяззброіла хлопца.

Ен выпусціў яе руку і адразу бы зліняў, зніякавеў, бы, прачнуўшыся ўранні, згледзеў, што спаўзла долу коўдра, якой накрываўся, пад чужым насмешлівым позіркам агаліўшы яго цела.

Каб убараніцца ад насмешкі, ён зноў надзеў на сябе маску, спытаў:

— Т-ты, вучыцелька! Знаеш хоць, з кім знюхалася, у

якое гняздо асінае трапіла, хто цябе прыгрэў? Не знаеш? На тваім месцы б...

Нічога не цямячы, Вераніка Васільеўна адно плюскала вейкамі, а ён, пацяшаючыся з яе разгубленасці, гаварыў нейкімі загадкамі, ад якіх рабілася ажно горача і млосна:

— Перадай ведзьме той: усядно прыжду і ўхандокаю яе нягодніка. У яе ж на вачах. У мяне свой суд будзе...— Ён пільна паглядзеў дзяўчыне ў вочы, пасля, нечакана запусціўшы руку ў кішэню, выцягнуў адтуль... новенькі зіхоткі наган, дадаў: — Вось гэтым прыкончу. Хай не надзеецца...

Ужо з ганка Кнот зноў вярнуўся і, убачыўшы яе пасярод пакоя гэткай жа разгубленай і бездапаможнай, паспрабаваў супакоіць:

— Не калаціся, яй-бо, думаў, ты чула пра ўсё. Не чула, то шчэ пачуеш... А ты, ведаю, Вераніка. Харошае імя. У партызанах у нас была адна, тожа Вераніка. У засаду папала...

Увесь урок у яе ажно выскоквала з грудзей сэрца, нічога не лезла ў галаву. Яна не магла дачакацца, каб хутчэй адпусціць дзяцей і застацца адной. Доўга, ужо і шарэць пачало, сядзела яна ў сваёй бакоўцы, думала чортведама што. Не хацелася чамусьці ісці на кватэру, не хацелася і абедаць. Ведала, што Марта недзе чакае яе, пэўна, і сама прыбяжыць сюды, каб паглядзець, чаго яна бавіцца. Ужо ж не раз гэтак было. Але лепш бы ніхто яе на чапаў, не тармасіў...

Вераніка Васільеўна як ніколі зараз адчувала, што, жывучы сярод новых людзей, нешта важнае яна ўпусціла, сама нібы адгарадзілася ад іх глухой сцяной. Дасюль здавалася, што ўсё ў яе ідзе хораша і спраўна. Урокі, сшыткі, прагулкі ў лес, вянкі з лугавых красак, у цёплай пасцелі на сон — цікавая кніжка. Што, здэцца, яшчэ трэба? Марта мала што ёй расказвала, чамусьці больш маўчала. Кешкалася па гаспадарцы, сушыла грыбы, ягады, вязанкамі цягала пад паветку сушняк. А то адлучалася на паўдня ў гарадок на базар, каб што-якое купіць ці выменяць на лясныя дарункі. Ранічкай жа, калі Вераніка Васільеўна яшчэ соладка спала, яна спяшалася ў школку напаліць грубку, памыць, прыбраць пакойчык і клас. Паспявала і дома згатаваць сняданак. І так вось з дня на дзень.

А жыццё, як зразумела Вераніка Васільеўна, было куды шырэйшае, не такое простае і лёгкае. Ішоў жа толькі

другі год пасля такой вайны. Ці папытала ў каго яна, настаўніца, як тут усё было, што вытваралі чужынцы, хто з сяльчан злажыў галаву, якія яшчэ беды напаткалі людзей? Інстынкт падказваў: і за словамі Ваські Кнота таксама тоіцца нешта такое, што даўно ёй трэба было б ведаць. Не, гэта не тая безразважная хлапечая выхадка, нейкая зухаватасць, ад якіх ёй заўсёды рабілася моташна. Тут штосьці зусім іншае. А што?...

Марта і праўда прыйшла, чамусьці пастукаўшыся да яе ў бакоўку, чаго раней не рабіла. Што гэта яна, Вераніка Васільеўна пазнала адразу. Пазнала па яе кашлі ў сенечках, па шлёганні галёшаў на цвёрдай, убітай, бы ток, земляной падлозе.

У той вечар, ужо ў хаце, яны не перакінуліся ні словам. Вераніка Васільеўна, спаслаўшыся, што няможацца, не схацела нічога есці. Ляжала ў ложку, акрыўшыся з галавою коўдрай, і не то драмала, не то правальвалася ў забыццё.

Увесь наступны дзень ёй карцела ў каго-небудзь бы незнарок, бы між іншым папытаць пра Кнота. Аднак штосьці стрымлівала дзяўчыну. Нічога не спытала яна і ў Марты. Ні вечарам, ні назаўтра ўранні, калі збіралася ў школу. Вераніка Васільеўна ўжо здагадвалася, якую «ведзьму» меў на ўвазе ўчарашні госць. Няўжо Марта яму ў чым насаліла, што той нават наганам пагражае?.. Але ж Кнот казаў не пра яе саму.

Яе раптам як токам працяла ад жахлівай думкі: то, можа, меўся на ўвазе хто з сям'і — муж ці сын гаспадыні? Няўжо?! Няўжо яна, настаўніца, гэтак і праўда ўліпла, напрасіўшыся на кватэру да чалавека, якога ніколечкі не ведала?

...Ён зноў прыйшоў у школу, цяпер ужо прымеркаваўшы, калі не будзе дзяцей і яна яшчэ не паспее выслізнуць на вуліцу. Гэты раз і паздароўкаўся, і не спяшаўся па-свойску ўсесціся на табурэтку ў чужым пакоі. Кубанкі, праўда, і зараз не зняў, чамусьці яшчэ больш зухавата ссунуў яе набакір. Аднак на твары яго, ва ўсім абліччы адчувалася бы вінаватасць за свой першы візіт.

— Што, зноў дулам маеш пахваліцца? — ужо без страху спытала Вераніка Васільеўна, гледзячы яму ў вочы.— Давай, давай, граза ўсіх нямецкіх гарнізонаў, бясстрашны партызанскі разведчык і дыверсант Васька Кнот. Што, не тое кажу?..Чула, як жа... Герой! А вот пра

Марту так і не знаю нічога. Якая ж кошка прабегла між вамі? Чаму наганам махаеш? І чаму не здаў яго куды трэба?

Васька аж паморшчыўся, акурат зуб яго хапіў і не адпускаў ні на хвіліну. Яна тады пашкадавала хлопца, не стала больш настырняць з роспытамі. Ён трошкі памуляўся і папрасіў яе вечарам выйсці на вуліцу разам пагуляць. Вераніка Васільеўна, знешне нібы абыякавая да яго слоў, з радасцю ў душы згадзілася.

Яны блукалі ўскрай сяла, колькі разоў спускаліся да ракі. Але там доўга не бавіліся. На лузе, на адкрытым, было золка, ветрана, і яны зноў па ледзь прыкметнай у цемнаце сцяжынцы падымаліся ўгору, шыліся бліжэй да хат ці дрэў. Васька мала што расказваў, а Вераніка Васільеўна не вельмі старалася цягнуць яго за язык; ёй нават трохі падабалася гэтая хлапечая стрыманасць, нават зацятасць. Ніколі не любіла яна балбатуноў, тых, хто малоў абы-што, у каго рот не закрываўся. І ўсё ж ёй хацелася ведаць пра такога нечаканага свайго кавалера.

Цікаўнасць гэтую падагрэў адзін са старэйшых вучняў, рахманы, уедлівы ў вучобе Ваня Боўтач. Два дні таму ў часе пераменкі ён пастукаўся ў бакоўку, каб папрасіць крэйды. Вераніка Васільеўна тады ўсё ж не стрымалася, спытала пра Ваську Кнота. У Вані, хоць выглядаў ён і вялым і змораным, ажно вочы агнём успыхнулі пры адной толькі згадцы пра Кнота.

— За яго... ну, каб хто сцапаў... за галаву немцы ўга што давалі. Усюды паперкі і картачкі яго клеілі... Ён і паіхняму мог гергетаць!

Вераніка Васільеўна трохі затрымала хлапчука, распытвала і распытвала. Вось чаму яна ведала калі не ўсё, то вельмі многае. А пра Марту, што таксама надта ж муляла, не давала ёй спакою, не рашалася пытацца. Думалася зараз, што Васька сам раскажа, калі ўжо намякаў. Не сёння, дык заўтра раскажа.

У той вечар, хоць і добра-ткі намерзлася, яна адчувала, што ў яе бы нанова крылы выраслі. Лежачы ў пасцелі, доўга яшчэ ўсміхалася сама сабе, згадваючы, з якой перасцярогай, калі яна паскардзілася, што зайшліся ад холаду рукі, узяў ён іх у свае цёплыя шорсткія лапішчы і не выпускаў, пакуль добра не нагрэў. І не нахабнічаў, не цінуў, як першы раз.

Ці магла нават у самым жахлівым сне бачыць тады Вераніка Васільеўна, чым скончыцца гэта знаёмства?..

Ужо калі яны не маглі адно без аднаго, калі з дня на дзень збіраліся ў сельсавет, што быў за пяць кіламетраў адсюль, у вёсцы Бортнікі, каб распісацца, здарылася тая гісторыя, якая перавярнула, скруціла ўсё яе жыццё, абпаліла крылы, раней часу пабяліла дзявочую галаву...

Стаялі якраз самыя пякучыя паслякалядныя маразы. Сляпіла вочы ад зіхоткай снежнай белі, а днём, пад сонцам, і наогул нельга было глянуць, каб не прыжмурыцца, не прыкрыцца хоць трохі даланёй ад ззяння мірыядаў іскрынак. Вечарамі ж у насцярожанай, да знямогі акалелай цішыні шчыравала ў небе поўня, і чуцен быў любы гук, дзе б ён, блізка ці далёка, ні нараджаўся.

Яна была шчаслівая, асабліва калі надыходзіў вось такі вечар, калі, паглядваючы штохвіліны на свой маленькі наручны гадзіннік, апранала што цяплейшае і спяшалася да школы, дзе, як заўсёды, ля веснічак чакаў яе Вася.

У адзін з такіх яшчэ няпозніх вечароў, акурат перад нядзеляй, Вераніка Васільеўна прапанавала Васю адведаць яе сяброўку Галю Ляшчынскую, таксама настаўніцу з Бортнікаў, з якой пазнаёміліся яшчэ восенню ў райкоме камсамола, калі афарлялі дакументы, станавіліся разам на ўчот.

Неяк Галя ўжо заглядвала ў Саўкі, цяпер жа, лічыла Вераніка Васільеўна, яе чарга зрабіць візіт у адказ. Тым больш Галя падрабязна расказала і нават намалявала на лістку, як адшукаць хату, дзе яна кватаруе. Вось будзе сюрпрыз, калі яны з'явяцца ўдваіх і прытым гэтак нечакана!

Вася, трошкі падумаўшы, згадзіўся, толькі папрасіў пачакаць яго нядоўга, пакуль збегае дадому, прыхопіць больш курыва.

Хлопец і праўда не забавіўся, і яны па вышараваным да сталёвага бляску санным следзе, які пры месячным святле неяк дзіўна, нават таямніча фасфарысцыраваў, спусціліся на луг, коўзаючыся, прабеглі па ўмерзлым лёдзе ракі, зноў тым жа следам выйшлі на роўны, што стол, зіхотка белы абсяг надрэчча.

— Хораша як, Вася! — Вераніка Васільеўна спынілася, прыслухалася.— Божа, няўжо гэтак можа быць ціха? Паслухай, ты толькі паслухай!

Колькі хвілін яны стаялі, стаіўшы дыханне, слухалі цішыню, пакуль не адчулі, што мароз пачынае браць за ногі, лезе пад апратку.

Пайшлі далей. Грэючыся, яна дурасліва рукавічкай

збіла з яго галавы кубанку, якая колам пакацілася па шорскім, уляжалым ужо снезе. Ён не кінуўся за кубанкай, а, матлянуўшыся, спрытна, у адным гарачым парыве прыцягнуў дзяўчыну да сябе. Яна не стрывала, першая прыпала да яго вуснаў, бы злоўленая кім птушка, затрапятала, задыхнулася ў абдымках.

— Кахаеш? — аднымі вачыма папытаў ён, і Веранікa Васільеўна, усё без слоў зразумеўшы, у знак згоды яшчэ мацней прытулілася да хлапечых грудзей.

Кубанку ён зноў надзеў набакір, агаліўшы правае вуха. Вераніка Васільеўна рассмяялася:

— І як яно ў цябе не мерзне?

— Што? — Ён няўцямна глянуў дзяўчыне ў вочы.

— Галава, што ж яшчэ.

— А чаму тады «яно»?

— Ну, вуха на галаве,— зноў засмяяўшыся, яна ўзяла яго пад руку, выраўняла свой крок з ягоным.

— От, звычка...

— І наган насіць — таксама звычка?

Пытанне было нечаканае, і ён, бы сумеўшыся, памарудзіў з адказам.

Вераніка Васільеўна патушыла ўсмешку, паскардзілася:

— Ты ж так мала мне чаго расказаў... Каб не Ваня, Ваня Боўтач, яшчэ той-сёй , нічога б і не ведала пра цябе. А вот Марта — ані слоўца. Крывіцца пачала, як данеслі, што мы з табой... разам што... Зусім памянялася, хоць з хаты той бяжы.

— Да сябе забяру. Бацька ўжо ведае...

Дзяўчына ажно задыхнулася ад шчасця, аднак гулліва спытала:

— І без мяне вырашылі? А калі не пайду?

— Украду тады.— Ён, укленчыўшы, падхапіў яе на рукі і, нібы тую пушынку, панёс перад сабой.

— Дурненькі, я ж цяжкая...— Яна наблізіла свой твар да яго твару, гарачымі вуснамі кранулася ягонай шчакі.

Асцярожна мацаючы нагамі дарогу, Васіль туліў каханую да грудзей, ніяк не хацеў адпускаць яе долу. У маладым шчаслівым шале яны і не згледзелі спачатку, як злева, сярод куцага, пасярэбранага інеем вербалозу нешта бясшумна, бы цень, мільганула, пасля яшчэ і яшчэ... Першай адчула нейкую незразумелую трывогу Вераніка Васільеўна. Гэта перадалося і Васілю. Вызваліўшы дзяўчыну з абдымкаў, ён прыпыніўся, зіркнуў па баках.

— Вася-я-я...— Яна кінулася да яго і, сцяўшыся ў адзін суцэльны камяк, паказала рукой на вербалоз.— Ды гэта ж... Гэта... Ваўкі!..

Ён таксама ўжо згледзеў іх, ажно сем ці восем злавесна маўклівых, цёмных, перахлябістых у поясе драпежнікаў, якія, не вельмі тоячыся, ішлі па цаліку ўзбоч самай дарогі, пад зыркім, магільна халодным святлом поўні.

— Назад, Вась!.. Да Бортнікаў жа тых, мусіць...— Вераніка Васільеўна адчула, як пад хусткай уздыбіліся валасы і чамусьці пачалі шэрхнуць ногі.— Можа ж, яны далей? Пакінуць нас...

Васіль, неяк адразу падабраўшыся, увесь таксама наструніўшыся, лэпнуў правай рукой па халяве бота і, выцягнуўшы адтуль загорнуты ў анучку наган, ухмыльнуўся:

— Не пакінуць, не. Ведаю ўжо трохі іх паганае нутро. Было часу пераканацца...

Ваўкі, адчуўшы, што людзі іх змецілі і ўперад болей не пойдуць, таксама спыніліся, селі на снег. Але ненадоўга. Атрымаўшы ад важака нейкую каманду, яны раптам заклубіліся ў кароткім, ці не ў рытуальным якім, танцы і ўжо рашуча, тасуючыся, маняючыся месцамі, пачалі набліжацца да дарогі.

Цяпер, на голай снежнай роўнядзі, Васіль дакладна палічыў, колькі ж іх у зграі. Так, ён не памыліўся: іх было сем, галодных, на ўсё гатовых звяроў.

Ліхаманкава сціскаючы ў руцэ рукаяць нагана, ён не спяшаўся страляць: ведаў, што кожная яго прамашка будзе дорага каштаваць абаім, яму і ёй. З разгарачанай галавы не выходзіла думка-папрок сабе: дурань, які ж ён дурань, што не мог кінуць у кішэню, як бегаў па курыва, яшчэ колькі патронаў. Ну, не было б, то хай, а то ж колькі часу хавае ад усіх, нават ад бацькі, свой апошні партызанскі трафей, калі браў тую важную нямецкую шышку, за якую сам камандзір брыгады горача ціснуў яму руку і грозіўся высокай узнагародай...

Пабялелая, нібыта снег, Вераніка Васільеўна ўжо нічога не магла гаварыць, толькі, чуў Васіль, дробна выстуквала зубамі чачотку. Не губляючы з поля зроку ўсю зграю, ён да колікаў у вачах трымаў на мушцы яе важака — самку, якую адразу вылучыў сярод іншых сваіх іклатых сародзічаў. Вылучыў не за яе рост — тут яна якраз была мо і не вышэйшая, не мажнейшая за астатніх драпежнікаў — і не за якую там адметнасць ног, галавы ці пашчы. Не. Яна адразу прыкавала да сябе ўвагу нейкай асаблівай

звярынай асанкай, большай, ці што, стрыманасцю, якая, пэўна, ішла ад усведамлення сваёй лідзіруючай ролі ў жыцці зграі.

Яны павольна, крок за крокам, адступалі назад, пакуль ваўкі яшчэ не аблажылі іх з усіх бакоў, не перакрылі дарогу. Важна было, ведаў Васіль, захаваць хоць нейкі спакой, вытрымку, бо калі яны замітусяцца, пакажуць пяткі, драпежнікі ўмомант зрэагуюць на іхнюю слабасць і тут жа ўчыняць сваю чорную справу. Зрэшты, тады і ёй, і яму будзе ўжо ўсё роўна. А пакуль што... Пакуль у руках у яго зброя, яны пазмагаюцца за сваё жыццё. Толькі б не падвяла, трымалася неяк на нагах Вераніка!

Васілю хацелася трошкі чым падбадзёрыць дзяўчыну, сказаць хоць адно слоўца ўцехі, крануцца яе пляча. Але не паспеў. Адзін з ваўкоў, які менш за ўсё, здэцца, выяўляў сваю варожасць і агрэсіўнасць, трымаўся трошкі наводдаль ад астатніх, бы ўсё тое, што яны тут зараз надумалі рабіць з людзьмі, яго ніколечкі не тычылася, раптам у шалёным скачку ўзвіўся ў паветра, кінуўся на іх...

Памагла Васілю яго заўсёдная рэакцыя, якой захапляліся ў партызанскім атрадзе ўсе, хто ведаў хлопца, тая рэакцыя, што не адзін раз ратавала ў самых вострых, безвыходных, здэцца, сітуацыях. Вось і зараз меткі стрэл у ашчэраную звярыную пашчу напавал зваліў смельчака ўжо блізка ля іхніх ног, трохі ацверазіўшы ўсю зграю. Ваўкі інстынктыўна адкінуліся назад. Але ўцякаць зусім і не падумалі, на што спадзявалася, убачыўшы забітага драпежніка, Вераніка Васільеўна.

— Васечка, мо бяжым?! — як не ўзмалілася яна, хапіўшы хлопца за руку. Ён горача ціскануў яе тонкія, усё яшчэ дрыготкія пальцы, прытуліў да сябе, і яны разам, паранейшаму не зводзячы вачэй са сваіх ворагаў, ступілі колькі крокаў у бок Саўкоў.

Зграя, аднак, скінуўшы з сябе нядоўгае ўтрапенне і атрымаўшы ад ваўчыцы новы загад, далёка іх не пусціла. Двое ваўкоў, пакідаючы на снезе глыбокія разлапістыя сляды, леваруч абагнулі людзей і, зноў выбегшы на самую дарогу, перакрылі іх шлях да адступлення.

Цяпер Васілю трэба было аглядвацца і назад, бо ў любы момант тыя двое маглі зрабіць са спіны нечаканы кінжальны выпад, які, калі празяваеш хоць долю секунды, скончыцца для іх трагічна. Ён разумеў, што, каб звяры з самага пачатку не пачулі запаху зброі, пораху, яны б гэтак не далікатнічалі і ўжо даўно пашкуматалі, раза-

рвалі б іх на кавалкі. Усё зараз залежала ад ягонай вытрымкі. Кожны патрон, добра ведаў Васіль, не павінен прапасці марна, упустую.

Хлопца зноў жа цікавіла найперш ваўчыца. Як ні пульсавала, ні біла штуршкамі ў скроні кроў ад нервовага перанапружання, як ні балела душа за ўшчэнт напалоханую, нейкую незразумела абвялую, да ўсяго ўжо абыякавую каханую дзяўчыну, ён усё ж не выпускаў з галавы думку пра важака зграі, бо ад гэтага залежала для іх усё. Возьме на мушку, заб'е ваўчыцу, якая павяла зграю на людзей, мо тады астатнія ваўкі здрэйфяць, адступяцца, пашкадуюць сваю паганую шкуру.

Аднак ваўчыца, бы навучаная кім, блізка не падыходзіла, а калі Васіль, згараючы ад нецярпення, усё ж ускідваў руку, каб хоць трохі прыцэліцца, пульнуць ёй між вачэй у лабаціну, яна рабіла рэзкі вокамгненны фінт, зводзіла на нішто яго намаганне. Гэты бяскроўны пакуль паядынак, між чалавекам і важаком зграі ўскладняўся тым, што іншыя ваўкі, толькі ён пачынаў мецiцца ў самку, адразу ж наструньваліся да дрыжыкаў у целе і ў любое імгненне гатовы былі на самы адчайны крок.

І ўсё ж Васіль, улучыўшы, як яму здалося, спрыяльны момант, калі ваўчыца не была нікім прыкрыта, і тыя двое ззаду драпежнікаў пакуль яшчэ асцярожнічалі, не лезлі на ражон, нечаканым узмахам рукі ўскінуў наган, націснуў на курок.

Ён быў упэўнены, што папаў, і ваўчыца, хаўкаючы, захлынаючыся крывёю, ужо недзе курчыцца на снезе. Але зноў жа: звяруга, непрыкметна для чалавечага зроку змясціўшыся на якога паўметра ўбок, як сядзела на хвасце і задніх лапах, так і працягвала ў той жа паставе сядзець, хіба што ў вачах у яе стала больш лютага, нецярплівага агню. Калі і як магла яна гэтак маланкава зрэагаваць на стрэл, угадаць і недзе за мізэрныя долі секунды апярэдзіць рух пальца, было для Васіля загадкай. Ён з жахам падумаў ужо пра тое, што засталося ўсяго тры патроны. А ваўкі, нейк бы пасмялеўшы пасля гэтага няўдалага стрэлу, зноў пачалі звужаць вакол іх сваё жывое кола...

Трэба было шукаць нейкае выйсце, бо зброя, як зразумеў Васіль, цяпер ужо ці выручыць. Можна знішчыць яшчэ аднаго, двух, ну, трох драпежнікаў, і ўсё. А як жа бараніцца ад астатніх трох, якія яшчэ застануцца? Голымі рукамі?

Краем вока Васіль згледзеў на поплаве, метраў за пяцьдзесят справа ад сябе, зацярушаны снегам стажок сена, і адразу ўспыхнула нейкая надзея. Толькі б прабіцца туды! У яго ж яшчэ, акрамя трох патронаў, ёсць паўкарабка запалак, ёсць кавалак старой газеціны, якую бярог на курыва. А гэта агонь, чаго больш за ўсё і баяцца звяры.

Ваўкі, калі людзі сышлі з цвёрдай дарогі, ступілі ў снег, не сталі перашкаджаць: інстынкт падказваў, што іхнім ахвярам нікуды не дзецца, гэта іх апошні адчайны крок, што тая нітачка, якая звязвае іх з жыццём і за якую яны так учэпіста трымаюцца, ужо зусім кволая, безнадзейная. Ніхто і нішто не паможа гэтым дваім, бо зараз ужо настаў іх, воўчы, час, ён уладарна, голасам галоднай плоці выгнаў зграю з цёмных і глухіх лясных урочышчаў, прымусіў дрыжэць ад страху ўсё жывое. І гора таму, з кім перакрыжуюцца іхнія, воўчыя, сцежкі!

Васіль мала спадзяваўся, што ваўкі дадуць бесперашкодна дабрысці да стажка. Здавалася, вось-вось, перагрупаваўшыся, разгадаўшы яго намер, яны выбегуць наперарэз, пагрозна ашчэрацца, і тады ўжо хіба толькі стрэламі ва ўпор можна будзе прабіцца скрозь гэты люты клыкасты кардон. Але ж колькі ў яго тых стрэлаў засталося?!

І ўсё ж і ён, і Вераніка дапалі да сена, абышліся пакуль без зброі. Васіль, злаўчыўшыся, з ходу падхапіў дзяўчыну за ногі, і, не паспела яна што ўцяміць, як была ўжо на самай макаўцы стажка, аберуч трымалася за бярозавы шост, які мацаваў сена, не даваў зімовай сцюжы без пары без часу раскудлаціць, разбэрсаць дабро.

Цяпер толькі ваўкі, мусіць, зразумелі намер чалавека, і адразу дадалося ў іх агрэсіўнасці.

Бліжэйшы да Васіля звер, з магутным пярэднім торсам і як не львінымі лапамі, нечакана матлянуўся за стажок і ўжо адтуль, з другога боку, маланкава кінуўся хлопцу пад ногі. Васіль, не гатовы да гэтага выпаду, ледзьве паспеў наском бота адвесці ад сябе драпежную пысу. Стрэл прагучаў тут жа, але воўк, кульнуўшыся, у перадсмяротнай агоніі ўсё ж здолеў хапіць хлопца за правае сцягно, разам са штанінай вырваўшы кавалак жывога мяса. Востры боль працяў усё нутро, распаленым жалезам паласнуў па сэрцы. Васіль, не стрымаўшыся, усадзіў у галаву драпежніка яшчэ адну кулю.

— Ва-асечк-а-а!..— адчуўшы нядобрае, заплакала Вераніка Васільеўна.

Ён жа, не зважаючы, што з раны штуршкамі біла кроў,

лілася ў бот, напагатове трымаючы наган, левым ступаком калупнуў сена, намацаў апору і пругка, натрэніравана кінуў сваё цела на стажок, у ногі дзяўчыне. Яна, хапіўшы яго за каўнер кажушка, падтрымала, не дала з'ехаць уніз, дзе ўжо, зусім чамусьці не баючыся, гаспадарылі трое драпежнікаў.

Толькі ваўчыца, з яшчэ адным сваім дружком, сядзела трохі наводдаль, глядзела не то на іх, не то на поўню, якая па-ранейшаму, цяпер ужо неяк злавесна, раскашавала ў халодным цёмна-сінім небе.

Рану, каб запыніць кроў, Вераніка ўзялася заматаць сама, для чаго не без дапамогі зубоў распаласавала наўкруг увесь ніз сваёй новай крамнай сарочкі. Васіль, разгарачаны і дарэшты наструнены, нарэшце з палёгкай уздыхнуў. Нейкі час абаім здавалася, што ўжо самае небяспечнае, самае страшнае засталося ззаду. Але, яшчэ раз глянуўшы на ваўчыцу, хлопец зразумеў: спакою ім і на сене не будзе. Зграя не адступіцца...

Ён не памыліўся. Недзе праз паўгадзіны пачаў падкрадвацца да іх яшчэ адзін, не менш люты вораг — холад, і з кожнай хвілінай трываць ад яго станавілася ўсё цяжэй і цяжэй. Хацелі трохі зашыцца ў стажок, але сена, колькі ні капалі, было нейкае няўдалае, наскрозь прамёрзлае, відаць, складвалі яго мокрым, пасля, пэўна, яшчэ паддало дажджоў, і так і захапіла зіма, закавала ўсё марозам.

Вераніка Васільеўна не чула ні рук ні ног. Васіль як мог гарнуў яе да сябе, хацеў нават даць свой кажушок, але дзяўчына наадрэз адмовілася. Яна адчувала, што і яго пачынаюць біць дрыжыкі. Пагрэцца ж, каб хаця трохі, не было як: на вастраверхім стажку не патэпаеш, не падурэеш, бо ўмомант можаш з'ехаць наніз, а там цябе ўжо чакаюць не дачакаюцца...

Ён сцепануў плячыма і, неймаверным намаганнем волі падавіўшы, каб не адчула Вераніка, боль у сцягне, падняўся на ногі, хапіўся за шост, паглядзеў, дзе ваўчыца. На ранейшым месцы яе ўжо не было. Зноў у разгарачаным хлапечым мозгу шавяльнулася думка: трэба ўсё ж упільнаваць людаедку і апошні патрон, які яшчэ застаўся, з блізкай адлегласці разрадзіць у яе паганае цела.

Але як ні круціў галавою, як ні ўглядаўся, ваўчыцы не ўбачыў. Унізе, задраўшы ўверх пысы, сядзелі ўсё тыя ж шэрыя драпежнікі. Дзе ж, аднак, самка? І той, што аціраўся ля яе зусім нядаўна, воўк? Мо яны з другога боку стажка, дзе зверху, на ўзроўні грудзей, звісаў брыль?

Паспрабуй дастань тады чым, вытуры іх з-пад тога брыля! Добрая засада для каварнага скоку...

Нешта трэба было рабіць.

Васіль разумеў, што яшчэ гадзіны паўтары, ну дзве, сама болей, і яны ператворацца ў лёд. Вераніка і так ужо не магла гаварыць, толькі, бы той асінавы ліст, трымцела ўсім целам. Ён усё ж зняў свой кажушок, акрыў ёй плечы. Хай трохі сагрэецца. Самому ж можна было неяк патрываць, хоць і яго ўжо працінала навылёт сцюжа. Да ўсяго таго пачала шалёна торгаць скрываўленая нага, і ён змушаны быў зноў легчы на сена. З'явілася думка неяк паскорыць развязку, самому падражніць ваўчыцу, выманіць яе на віднае месца, калі яна толькі там. А зрэшты, дзе ж ёй яшчэ быць?..

Васіль лёг на пуза і, абвіўшы нагамі шост, гэтак трымаючыся, пачаў, галавой уніз, паціху з'язджаць са стажка. Выцягнутай як мага далей уперад правай рукой, якая сціскала наган, ён дацягнуўся да выступу, рукаяткай пачаў біць па ім у надзеі, што сена хоць трохі абваліцца, агаліць, высвеціць хованку. Разам з тым хлопец добра разумеў, чым усё гэта для яго можа скончыцца. Аднак іншага выйсця не бачылася. Клікаць некага зараз на дапамогу было б дарэмна: і адно, і другое сяло далёка, не тое што роспачнага чалавечага крыку не пачуеш, але і стрэлу, тым больш з нагана. Ды і час ужо досыць позні. Хто цяпер, у гэтую стынь, калі нават каму і не спіцца, захоча без пільнай патрэбы вылазіць з цёпла напаленай хаты, блындацца невядома дзе і чаго?

Праз кароткі час Васіль пераканаўся, што ваўчыца са сваім нязменным дружком і праўда тояцца там, дзе ён меркаваў,— пад стажком. Першыя камякі мёрзлага сена, якія ён з цяжкасцю збіў долу, трохі, відаць, раз'ятрылі звяроў, яны пагрозліва кляцнулі зубамі, зашабуршэлі, аднак вылазіць усё ж не думалі. Ад холаду хлопец ужо не чуў ні рук ні ног.

Пераканаўшыся, што з ягонай задумкі — пабурыць той выступ, той сянны брыль — нічога не выйдзе, Васіль злаўчыўся, падцягнуўся назад да Веранікі. Яна, трохі ўгрэўшыся пад яго апраткай, з жахам сачыла, што ён робіць, што ўдумаў. Васіль жа, аддыхаўшыся, ужо загарэўся новым планам: трэба, хоць гэта зноў-ткі надта рызыкоўна, паспрабаваць паліць сена. А чаго?.. Некалькі жмутоў, якія, запаліўшы, вогненнымі факеламі кінуць яны ўніз, ужо напэўна адгоняць зграю. Як жа ён адразу

не даўмеўся да такога?!. Ды і самі хоць трохі адыдуць.

Ён палез у кішэню па запалкі і... ажно ўчарнеў: карабка не было, як не было і дна кішэні, дзе ляжаў той карабок. Голая далонь вылезла наверх калашыны, акурат у тым месцы, дзе сышліся воўчыя іклы.

— Ва-а-сечк-а-а!..— зноў, убачыўшы яго твар, здагадаўшыся пра ўсё, прастагнала Вераніка Васільеўна.— Ва-а-сечк-а-а!..

Ён, пакуль шалёна калацілася ў грудзях сэрца, сеў ля яе, адным плечуком падлез пад кажушок. Дзяўчына, знайшоўшы ў сабе сілы варухнуцца, акрыла яго ўсяго, памацала, ці трымаецца на ране павязка, трохі, як магла, падправіла яе. Скаланулася, калі адчула пад пальцамі жывую цёплую кроў, якая, пэўна, не спынялася, пульсавала і пульсавала.

Яна зноў, ахвяруючы рэшткамі цяпла, студзячы цела следзянелымі далонямі, адхінула паліто, выцягнула з-пад спадніцы сарочку, не сарочку, а ўжо адно ашмоцце, зноў, колькі хапіла сілы, тузанула. Адарвалася меней, чым напачатку, але ўсё ж можна было яшчэ раз заматаць рану, мацней заціснуць, каб не свістала кроў. Яна не паспела добра завязаць: ля стажка, якраз з тога боку, дзе навісь, пачулася нейкая валтузня, і Васіля бы спружынай ускінула з месца. Зноў, сціскаючы настылую ручку нагана, ён глянуў уніз. Была надзея, што ваўчыца нарэшце-ткі згубіць пільнасць і хоць на хвілінку пакажацца з укрыцця.

Не, яна не выйшла, колькі ні чакаў, колькі ні ўглядаўся. Распальваючы ў сабе яшчэ больш лютую злосць да гэтай пачвары, якая загнала іх у тупік, што ўжо ні туды ні сюды, церпячы, перамагаючы боль, да якога прыкметна дадавалася нейкай нязвыклай млявасці, цяжкасці ва ўсім целе, Васіль зноў папоўз уніз. Цяпер рашыў не адступацца. Губляць ужо не было чаго...

Зноў, як у першым заходзе, ён сутаргава чапляўся ботамі за шост, ажно млелі, калелі ад напружання і холаду ступакі. Рукам было цяплей: як-ніяк, даваў ім работы, дзёр і дзёр наскрозь прамерзлыя, спрасаваныя з лёдам і снегам пласты сена, самыя грузныя з іх, зноў жа каб нарабіць больш стукату-грукату, спіхваў уніз. Добра, што не мяшаў наган: гэты раз Васіль трымаў яго ў зубах, з тым, каб пры найпершай патрэбе лёгка было хапіць яго, спусціць курок...

Усё адбылося вокамгненна.

Колькі мінула часу, а гэтай хвіліны Вераніка Васільеў-

на не забудзе ўжо да самага скону. Тады, хоць і не чула свайго цела, хоць і адзервянела ўсё, нават язык, здэцца, прымёрз да паднябення, яна, аднак, змагла стаць на ногі, трывога і жаласць да любага надалі яшчэ трохі сілы. Бачачы, як яму нялёгка, Вераніка Васільеўна ўкленчыла, паспрабавала, ухапіўшыся за халяву бота, падтрымаць хлопца.

І тут, на вачах у яе, гэта і сталася.

Не паспеў вухнуць на зямлю, рэхам аддацца ў настылай начной цішыні чарговы, мо самы вялікі, камяк, як з-пад стажка чорнай маланкай узвіўся ў паветра адзін з драпежнікаў. Цяжка было адразу пазнаць — ваўчыца гэта ці яе дружок. Васіль усё ж не прамарудзіў, стрэліў, і стрэл гэты мог бы ўратаваць яму жыццё.

Але тут жа, у тую ж са стрэлам секунду, бы ўсё загадзя разлічыўшы, матлянулася на ўзроўні яго галавы другая злавесная фігура — ужо самой ваўчыцы. Анямеўшы ад жаху, не ў сілах выдавіць з грудзей нават глухі, утробны крык-стогн, Вераніка Васільеўна застылымі, гэткімі ж анямелымі зрэнкамі глядзела, як драпежніца мёртвай хваткай упілася Васілю ў карак, пацягнула ўніз. Не чула яна і таго, як, працягла ўзвыўшы, як толькі могуць выць галодныя ваўкі, збеглася парадзелая зграя да стажка на свой крывава-жудасны баль.

— А-а-а...— нарэшце з хрыпам прарвалася ў дзяўчыны, калі яна згледзела ў сваіх руках ялавы бот, той, які толькі што быў на Васілёвай назе.

— А-а-а!..

Не, ніхто, акрамя ваўкоў, не чуў яе роспачнага, поўнага няўцешнага гора і адчаю голасу. Па-ранейшаму, нібы нічога ў свеце не змянілася, не адбылося, плыла ў халодным цёмным небе поўня, цадзіла і цадзіла на сцішаную, анямелую зямлю мярцвяна-халоднае святло. Моцна спалі, адбыўшы свой нялёгкі дзённы клопат, людзі, і толькі дзеці, звечара наслухаўшыся розных страшных гісторый, раз-пораз ускрыквалі ў сне.

І тады яна, трымаючы ў выцягнутых перад сабою руках усё той жа бот, пачала злазіць наніз.

Зграя, не здаволіўшыся адной ахвярай, чакала яе непадалёк ад стажка. Ваўкі пакуль не нападалі, яны, бы пацяшаючыся з бяссілля чалавека, смакавалі ўжо хуткую і канчатковую над ім перамогу. А чалавек той — ушчэнт спустошаная, змучаная страхам, холадам, горам дзяўчына — больш за ўсё баяўся зараз аднаго: не ўпасці б, толькі не ўпасці!

Цяжка ступаючы адзервянелымі, акурат чужымі, нагамі, ішла яна проста на самку, якая, тырчком наставіўшы вушы, уся таксама наструненая, гатовая да невядома якога ўчынку, сядзела на крок ці два бліжэй ад астатніх ваўкоў.

Двое з іх, згараючы ад нецярпення, стараючыся, пэўна, дагадзіць свайму важаку, памкнуліся былі высунуцца наперад, але ваўчыца, нядобра бліснуўшы вачыма, кароткім рэзкім паваротам галавы спыніла іх, астудзіла іхні імпэт.

Вераніцы было ўжо ўсё роўна. Яна ведала, што зараз памрэ, што яе больш не стане, як не стала любага ёй чалавека, але таго страху, які яшчэ нядаўна скоўваў кожную клетачку яе цела, не было. Кволым дагараючым вугольчыкам недзе ў глыбіні свядомасці тлела яшчэ адно, апошняе жаданне — не ўпасці, дайсці неяк да гэтай крыважэрнай пачвары, якая зламала іхні з Васем лёс, адабрала жыццё, паглядзець у паганыя яе вочы і... шпурнуць, калі хопіць толькі сілы, гэты яшчэ цэлы, непашкуматаны звярынымі ікламі бот.

І яна, наўздзіў не чалавеку, а тым тром, акрамя ваўчыцы, жывым драпежнікам, на якіх не хапіла куль і якія зараз, падпарадкоўваючыся волі самкі, сядзелі ззаду, усё ж дайшла, амаль што ўпрытык стала перад іхняй грознай уладаркай і кінула сваю ношку ў самую яе пашчу.

Чаго заўгодна чакалі ваўкі, а не такога нахабства ад сваёй асуджанай на смерць ахвяры. У любое імгненне яны, кіруючыся адвечным воўчым законам — уберагчы, засланіць ад небяспекі, а трэба, то і ганьбы свайго важака, без аглядкі аддаць за яго жыццё, маглі парваць на шматкі гэтую бездапаможную, без крывінкі, здэцца, і без плоці істоту, якая кінула небывалы, надзвычай дзёрзкі выклік усёй зграі. Але ж гэты суровы, няўмольна строгі загад сядзець на сваім месцы, не высоўвацца... Паспрабуй толькі не паслухайся, не выканай волю важака. Зрэшты, ім, ваўкам, няцяжка зразумець і ваўчыцу. Хіба ж не ўспенілася, не ўскіпела ў ёй самой гарачая звярыная кроў, не пагнала па жылах імклівыя токі, не паклікала да адплаты?

Аднак што ж гэта?.. Замест таго каб учыніць свой хуткі і звыклы суд, ваўчыца, іх лоўкая дужая і гордая ўладарка, перад якой дрыжэлі і яны, і ўсё жывое наўкол, якая ніколі не ведала ні стомы, ні літасці, раптам ні з таго ні з сяго павярнулася хвастом да ахвяры і, неяк па-асабліваму

ўзвыўшы, даўшы знакісці за ёю, трымацца аднаго следу, марудна і цяжка, бы яе падмянілі ці навалілася нечаканая немач, патрусіла ў бок лесу. Што, што яна ўдумала сабе? Няўжо ад той хілячкі на дзвюх нагах, у целе якой ледзьве ўжо трымціць душа, няўжо ад яе зыходзіць хоць якая макулінка пагрозы?..

...Пад раніцу мароз прыкметна паменеў. Нечакана змяніўся вецер, і разам з ім, бы толькі і чакалі свайго часу, знекуль наплылі калматыя хмары, заслалі ўсё неба. Зноў, як было тыдзень назад, завірушыла.

Яна не помніла, як дапляласся да першай хаты і, не ў сілах зрабіць больш і кроку, зняможана апусцілася на бёрны, што ляжалі пры плоце. Сяло яшчэ спала, ні адно акно, ні адна шыбка, колькі ні ўглядалася ўсцяж вуліцы, не свяцілася хоць бы якім бляклым агеньчыкам, на які можна было б пастукацца, расказаць людзям пра бяду. Навалілася, да гуду, да памутнення ў галаве, санлівасць, густая і цягучая, што смала.

У гэтым стане явы і трызнення Вераніка Васільеўна не адразу адчула, што нехта старанна ліжа голыя яе рукі, голыя даўно, яшчэ як злазіла са стажка, як ішла з пустым ботам да зграі. Калі згубіліся рукавічкі, што змусіла зняць іх, яна таксама не помніла. Было тады ні да чога. Ды і зараз...

Кароткі промільг памяці даў магчымасць зноў прыслухацца да сябе, да свайго дарэшты змучанага, скалелага цела. І тады яна здагадалася, што ўжо не адна, што прыйшла ёй на выручку добрая і спагадлівая істота — чыйсьці, ці не з гэтага вось двара, сабака, якому ў гэтую ноч таксама было не да сну.

Вераніка Васільеўна з удзячнасцю, на якую толькі была зараз здольная, варочала кісці рук туд-сюд, адчуваючы цяпло жывога шурпатага языка. Не ў сілах яшчэ расплюшчыць набрынялыя, цяжкія, акурат павесілі на іх гіры, павекі, яна ажыўшымі трохі пальцамі пацягнулася да поўсці, пагладзіла ля вушэй. Сабака лізнуў з яшчэ большай стараннасцю, нават апантанасцю.

Невядома, колькі б так доўжылася, каб раптам не захліпнуўся ў няспынным лютым брэху сабака з суседняга, праз вуліцу, падворка, за ім яшчэ і яшчэ, ажно па ўсім сяле. Нібыта чым вострым торкнуў хто ў саменькае дзявочае сэрца. Гак-сяк адолеўшы, прагнаўшы слабасць, Вераніка Васільеўна зіркнула перад сабой і... адчула, што зноў

млее: ля ног яе, як усё роўна нічога і не было гадзіну ці дзве таму, ляжала, лізала ёй рукі сама ваўчыца. «Насланнё, о божачка... Што ж гэта я?..» — з нейкай недасяжнай бездані дайшла, прабілася да яе думка. Балела, ажно расколвалася напалам галава, звінела ўвушшу, а ў вачах, нават і заплюшчаных, шалёна скакалі чорныя мушкі.

Прымусіўшы сябе трохі супакоіцца, як мага гонячы прэч гэты чорны мітуслівы рой, дзяўчына зноў падняла галаву і зноў стрэлася поглядам з самым лютым сваім ворагам...

Скуль узялося той рашучасці, яна ўжо не ведала, але рукі міжволі, самі сабой пацягнуліся да звярынай шыі. У воўчых вачах Вераніка Васільеўна згледзела — ці мо ёй так падалося — невыказную тугу, смутак, нават слёзы. Не, зверу — дзяўчына гэта добра адчувала — было ўсё роўна, што яна з ім рабіла, і смутак той, і туга, і слёзы («Няўжо і ваўкі могуць ліць кракадзілавы слёзы?!») былі зусім не ад болю.

Як доказ гэтаму, ваўчыца лёгенька, без усякага намагання хітнула галавой, і дзявочыя пальцы адразу ж расшчапіліся.

І скаланула, узрушыла новая неспадзеўка.

Ліхаманкава спрабуючы зноў, ужо мацней і больш надзейна, учапіцца ваўчыцы ў горла, Вераніка Васільеўна намацала ў густой яе поўсці нешта цвёрдае, акурат ашыйнік. Ну вядома ж — ашыйнік! Адразу ж прыгадалася, як яшчэ з восені ад кагосьці ў сяле чула пра незвычайна хітрую і лоўкую нямецкую аўчарку: нібыта, уцякаючы без задніх ног з нашай зямлі, фашысты кінулі яе на волю лёсу ў глухім зарэчанскім лесе. Яшчэ, расказвалі, на ашыйніку ў той аўчаркі выпісаны і мянушка, і дзень нараджэння, і якая ў яе кроў, а таксама нязменнае нямецкае «Gott mit uns» — «З намі бог». Няўжо, няўжо гэта тая самая пачвара, якая стала зараз на чале воўчай зграі, якая загубіла не адну нявінную душу, разарвала на кавалкі Васю?

Шкода, што не было голасу, каб крычаць, клікаць каго на помач. Яна ажно задыхалася ад слабасці сваёй і бездапаможнасці. Усё, на што была яшчэ здатная, што магла зрабіць,— паказаць, вочы ў вочы, гэтаму крыважэрнаму пярэваратню, які, ці не адчуўшы ў рэшце рэшт віну за ўчыненае людзям зло, зараз запознена прыпоўз да чалавечага жытла, ужо каб павініцца, усю сілу сваёй нянавісці, сваёй пагарды...

Знайшлі яе, калі трохі вывіднела, на тым жа самым месцы — на бёрнах. Знайшоў, выглянуўшы выпадкова на вуліцу, стары Ахрэм, гаспадар тых бёрнаў. Зацярушаная снегам, яна сядзела, сагнуўшыся ў абаранак, і не падавала, здэцца, ніякіх прыкмет жыцця. Голыя ссінелыя рукі ляжалі на каленях. З-пад лёгкай, не для зімовай пары, ваўнянай хусткі выбіваліся пасмы сівых валасоў.

Толькі па адзенні Ахрэм і яго рупная, увішная яшчэ кабета Адоля пазналі, што гэта іхняя вучыцелька — Вераніка Васільеўна. Добра, што ў хаце бераглася невялікая бутэлечка спірту — будучы яшчэ летам у горадзе, выменяла яго Адоля на яйкі, каб было чым лячыцца ад прастуды. Спірт, моцнае, да знямогі ажно, націранне, пасля гарачы, на зёлках розных, чай, гарачая чарэнь вярнулі дзяўчыну да жыцця, уратавалі ёй і рукі, і ногі. Вот толькі з валасамі выйшла няўпраўка: яны, што з імі ні рабілі, так і засталіся ссівелымі, бы хто густа пасыпаў іх попелам.

Першым ім, Ахрэму і Адолі, і расказала, выкарабкаўшыся з небыцця, Вераніка Васільеўна пра Васю. Страшная гэта навіна ўзрушыла, ашаламіла ўсіх сяльчан. Да слёз, горкіх і няўцешных, шкадавалі хлопца.

Ад старых — Вераніку Васільеўну яны ўжо нікуды ад сябе не пусцілі — дзяўчына дазналася і пра былую сваю гаспадыню — Марту. Дык вось чаму Марта гэтак калацілася пры адным толькі напамінку пра Васю! З-за сынка свайго Грышкі калацілася. Неўзабаве, праз год ці два, ён павінен выйсці з турмы. Упяклі яго туды за доўгі язык. Падрабляючы ў часе вайны на чыгунцы, Грышка выдаў у лапы гестапаўцаў Васеву маці — Паліну. Пераапранутая ва ўсё жабрацкае, Паліна па заданні партызан ацíралася, нібыта просячы міласціну, на станцыі, пільным вокам сачыла і запамінала, што робіцца наўкола, куды і колькі ідзе эшалонаў, якую тэхніку гоняць на фронт фашысты.

Грышка, які корпаўся, рабіў нешта на пуцях, пазнаў сваю аднасяльчанку і, скалячы зубы, нібы выхваляючыся, разбалабоніў аднаму, другому, што гэта ж маці Васіля Кнота, за галаву якога немцы абяцаюць вялікую ўзнагароду. Вядома, жанчыну хутка схапілі, доўга катавалі. Смерць Паліна прыняла жахлівую...

І зараз Вераніка Васільеўна лішні раз адчула, якая яна была сляпая і глухая да ўсяго, што тычылася любага ёй чалавека. Дайшоў да яе нарэшце і сэнс Васевых слоў пры тым, самым першым іхнім знаёмстве, калі хлопец

заявіўся ў школьную бакоўку, сказаў: «Перадай ведзьме той: усядно прыжду і ўхандокаю яе нягодніка. У яе ж на вачах. У мяне свой суд будзе...» Не ведаў, бедны, што самога чакала яго наперадзе...

Вясной, толькі скончыліся заняткі ў школе, Вераніка Васільеўна папрасілася на працу ў любы іншы раён. Заставацца ў Саўках у яе ўжо не было ніякіх сіл.

## 7

У млын Коля выбраўся недзе толькі пасля каляд. Чакаў, спадзяваўся, што да тога меха жыта, які ўжо ёсць, старшыня дадасць, як і абяцаў, яшчэ пуды два-тры, і тады можна завезці, змалоць усё разам, бо не так лёгка кінуць работу на ўвесь божы дзень. Нічыпар хоць і згаджаўся нібыта паглядзець яго коней, але і ля сваіх не вельмі ўвіхаўся, не вельмі шчыраваў.

Давялося, аднак, везці адзін мяшок. Ні зернетка не даў больш Рагуля на працадні. Ні ім, конюхам, ні каму другому. Казаў, што ўсё падчысцілі, нават і на насенне будуць пазычаць вясной у дзяржавы.

Каб не Лыска, Вадзім таксама б паехаў з братам. Была якраз нядзеля, у школу не трэба, і як хацелася б наведацца разам у Заямнае, пабыць у цёткі Кацярыны, паесці чаго смачнага. Ад гэтай згадкі ў яго ажно забурчэла ў жываце, кругам пайшла галава. Усё ж ён узяў сябе ў рукі, бо ведаў, што абодвум адвінацца з дому аніяк нельга — карова іхняя апошні час зусім аслабела, глядзі яе зараз і глядзі. Неяк трэ было б падкарміць Лыску чым лепшым, спарнейшым. А чым? На вышках і ў загарадцы нанізе — адна салома, ды і той засталося на месяц, ну, паўтара. На больш не хопіць. Сена яшчэ перад новым годам скончылася. А колькі яго і было ў іх? З саломы ж голай што возьмеш? Вядома, калі парэзаць яе на сечку, запарыць, намяшаць туды здробненых буракоў ці бульбы, тады і гэта яда. Шчэ якая! Толькі пра буракі зараз таксама не было гаворкі — засек у склепе падчысцілі дарэшты. Ды і не ўрадзілі ў той год буракі, ва ўсіх не ўрадзілі. Вялося ж яшчэ ніштавата бульбы, але Коля дрыжэў над кожным кашом, карове дазваляў адны хіба лупіны.

Неяк, калі Вадзім не стрываў, насек трохі ў карытцы,

каб зрабіць мяшанку з сечкай, Коля, прыбегшы на хвілінку нечага дадому, убачыў і як не з кулакамі кінуўся на Вадзіма:

— Аддай, гаўнюк, ключ ад склепа, сам буду набіраць на кожны дзень. Хочаш, каб вясной пышкі елі і пасадзіць не было што?

З тога часу Лыска давілася адной саломай, на вачах проста марнела. Пасля школы Вадзім нярэдка ішоў на загуменне, падбіраў ашмоткі сена на дарозе. Тудой вазілі фураж на кароўнік, і тое-сёе на калдобінах страсалася з вазоў. Хоць гэта былі слёзы, драбяза, але з якой прагнасцю, з якім смакам Лыска перацірала сапраўднае лугавое сена. Душа ажно балела за яе...

Коля, скіраваўшы да саменькага ганка, з дапамогай Вадзіма ўскінуў у сані мяшок, затым падаўся ў хату, каб пашукаць на печы цяплейшыя рукавіцы. Вадзім хацеў узяць з-пад сядзення якога паўахапка аўсянай саломы — усё ж не ржаная, але брат, змеціўшы гэта праз акно, пастукаў у шыбку, пасля выйшаў на двор, заклапочана сказаў:

— Я ж не знаю, калі ўпраўлюся, мо завоз на млыне. А каню жаваць нешта трэба. Як вярнуся і застанецца, тады...

Ён паехаў, а Вадзім, пасноўдаўшыся па пустой гулкай хаце, зноў рашыў схадзіць на загуменне. У нядзелю ў мястэчка ехала на базар многа людзей з блізкіх і далёкіх вёсак, і была надзея, што ў каго-небудзь хоць гвалтам выхапіць які пук-другі сена, калі не будзе чаго сабраць на дарозе. А што ж яшчэ застаецца? У калгасе ж не выпрасіць, у іх саміх мала ўжо корму засталося. І каровам, і коням сталі даваць як не палову з таго, што давалі на пачатку зімы. А яшчэ ж да пашы той... Зараз Рагуля гойсае на сваім Аскары, зубамі ажно скрыгоча, а сам забыўся, што ўсю атаву, ды і добрую атаву, на сенакосе пад снег пакінуў. Ні людзям не даў, ні для калгаснай жывёлы не скарыстаў.

З восені, казалі, ды Вадзім і сам бачыў разоў колькі, старшыня хадзіў бы ў ваду усё роўна апушчаны, нават пра штрафы забыўся, нечага нібыта быў напалоханы. Упусціў момант, калі трэба было ўсіх кінуць на тую атаву, скасіць, высушыць, звезці куды ці застагаваць на месцы. Нечакана ўсчаліся халады і нудотныя дажджы, якія змяніліся замаразкамі, а пасля раптоўна і зіма легла. Вось цяпер і носіцца Рагуля на сваім жарабцы, а што толку, жывёле ад

гэтага не лягчэй. Хутка таксама, пэўна, пачнуць карміць яе адной саломай. Коля ўжо цяпер, шкадуючы коней, бачачы, як ім не хапае корму, кожны вечар ледзь не плача, калі расказвае аб непаладках у калгасе.

Сама больш абураўся брат з-за таго, што Рагуля яшчэ з восені, цішком, хоць і ведаў, якая доўгая зімоўка наперадзе, раздаў сваім хаўруснікам ладнаваты стажок гатовага сена з самага далёкага, далей ад усякага непажаданага вока, сенакосу за Выселкамі.

Пажывіўся, расказвалі ў вёсцы, адхапіў добры куш ад стажка і Сымонаў Фанька. Каня папрасіў яшчэ звечара, нібыта каб падвезці нанач да шаптухі, недзе аж за Магільнае, хворую матку, у якой ні з таго ні з сяго пачала сохнуць правая нага. Але гэта была мана. Нехта ўсё ж упільнаваў, як апоўначы, калі ўжо ні скуль не свяціўся ні адзін агеньчык, Фанька з бацькам вярнуліся ад той «шаптухі» з дабрэнным, як толькі наладавалі і ў цемнаце давезлі, возам пахкага сена.

Прыпёр цэлую фуру, але ўжо не хаваючыся, не тоячыся, адкуль сена і хто выпісаў, вечна на падпітку Давэцька, іхні брыгадзір, а таксама звяглівая і злосная, бы ведзьма, што кінуў яе муж, рахункаводка Марута, ці, як інакш клікалі яе за вочы, Цыфіра. Не адсталі ад іх яшчэ некаторыя прыбліжаныя Рагулі.

Лепш было б Вадзіму не ведаць пра ўсё гэта. Асабліва зараз, калі сэрца крывёю аблівалася за Лыску, калі не было ад каго чакаць помачы... Гняло, што адным усё дазволена, другія канцы з канцамі не могуць звесці. Нават і каровы нібыта не ўсе роўныя на гэтым свеце...

Саней сценкаю і праўда ехала нямала. Але каб з іх што зляцела ці стрэслася, гэтага не было. Назбіраць свежых конскіх яблыкаў, у каго вялося свінчо, можна было б колькі заўгодна, а вось сена, як на тое, ані шматка. А па макулінцы той, па травінцы там-сям, ды і то праз метраў дзесяць — дваццаць адна ад адной,— хіба многа так назбіраеш?

Сёння дарога была гладкая, уезджаная, палазы слізгацелі, бы маслам намазаныя, і спадзявацца на якую затрымку ці каб хто незнарок зашыўся ў снег альбо нават кульнуўся на паваротцы не даводзілася.

Вадзім, прыхіліўшыся спіною да тэлеграфнага слупа, на якім, на самай яго макаўцы, неяк таямніча-звабліва, ажно шолах па целе ішоў, гулі напятыя правады, стаяў, услухоўваўся ў іхнюю гамонку і адчуваў, як у грудзях

нешта шырыцца, расце, напаўняе ўсю яго істоту летуценнасцю, неадольным, да салодкіх слёз, жаданнем вырвацца з кола нярадаснай сваёй будзённасці, апынуцца ў віры другога, нязнанага яму жыцця, адкуль, акурат клічучы, дражнячы яго, ідуць гэтыя таямніча-зваблівыя гукі. Пэўна ж, ёсць, ёсць такое жыццё, ён, Вадзім, абавязкова даможацца, каб дыхнуць ім на поўныя грудзі, каб не ведаць гэтага вечнага клопату, што ўзяць на зуб сёння і заўтра, што абуць і апрануць, як уратаваць Лыску.

Ужо было такое адчуванне, і не раз было. Нават гэтай восенню, калі яшчэ не пасварыліся з Генкам. Генка прапанаваў пасля школы падскочыць разам на станцыю, каб аддаць — так папрасіла яго матка — нейкім далёкім сваім родзічам пазычаныя калісьці ёю дваццаць рублёў. Ён, Вадзім, з ахвотай згадзіўся, бо ўжо даўно і сам збіраўся схадзіць туды, паглядзець нарэшце-ткі поезд, бо, брыдка было нават каму і прызнацца, яшчэ ні разу не бачыў ні паравоза, ні вагонаў, ні самой чыгункі.

У хату да чужых людзей ён не пайшоў, ды Генка не клікаў яго. Сеўшы на траву на высокім адхоне, Вадзім не спускаў вачэй з чатырох бліскучых сталёвых стужак, нічога гэтак зараз не жадаючы, каб па іх прамчаўся які-небудзь поезд.

Яму тады мо як ніколі пашанцавала. Хоць Генка, зрабіўшы сваё, не раз і не два гукаў ужо ад брамкі, каб ісці дахаты, нейкі інстынкт усё ж бы падказваў Вадзіму яшчэ трохі пачакаць, не спяшацца.

І вось недзе далёка-далёка, дзе зліваліся ў адно цэлае гэтыя сталёвыя стужкі, пачуўся спачатку слабы, пасля ўсё больш і больш выразны гук, як усё роўна гула, стагнала чымсьці патрывожаная сама зямля. Не паспеў Вадзім яшчэ ўцяміць, што да чаго, а на станцыю, сцішыўшы свой імклівы бег, але не спыняючыся, працяжна і да рэзі ўвушшу гулка пасвістваючы, чорнай аграмадзінай, у клубках дыму і пары, падкаціў паравоз. За ім — цэлы хвост зіхотка пафарбаваных хатак-вагонаў, праз вокны якіх бачыліся ўсярэдзіне людзі. Людзі былі задумлівыя, сур'ёзныя, прыгожа апранутыя. На століках перад імі стаялі бутэлькі з прыгожымі наклейкамі, стосам ляжалі кніжкі, іншыя пакункі. Відаць былі лежакі, засланыя бялюткімі прасцінамі. Хто яны, гэтыя невядомыя пасажыры, куды, у якія далёкія гарады сцелюцца іх дарогі?

Хацелася бясконца глядзець і глядзець на тыя вокны, на чужыя загадкавыя твары, на дзіўныя колы вагонаў,

што выстуквалі на рэйках нейкі бадзёры матыў, на самі зіхоткія вагоны. Было адчуванне, што ўсё гэта прымчалася з іншага, невядомага яму, Вадзіму, свету, каб ускалыхнуць, патрывожыць яго душу...

Ён спахапіўся, калі холад добра ўжо ўзяў яго за ногі, пасля спакваля палез і пад старую, амаль ужо без ваты, фуфайку, пачаў студзіць спіну. Схацеў быў ісці дадому, не тырчаць жа тут, ля слупа, без дай прычыны ўвесь ранак. Усё роўна ж не пажывішся нічым... Аднак, глянуўшы зноў на дарогу, згледзеў як не ля самага яшчэ лесу вазок, высакавата наладаваны не то сенам, не то саломай. Стуль, з тога боку, ніхто зараз калгаснае не вазіў, не было чаго, і можна было адразу здагадацца, што гэта на базар. Куды ж яшчэ?

Ужо калі вазок, запрэжаны маладым сытым буланчыкам, пад'ехаў блізкавата, Вадзім пазнаў сена. Сэрца ў грудзях нецярпліва затахкала.

Абрадавала, што і буланчык, і вусаты, у новым белым кажуху дзядзька на версе вазка былі незнаёмыя, знекуль, відаць, здалёку.

Вадзім, каб не кідацца вельмі ў вочы, схаваўся спачатку за слуп, пасля, прыкінуўшы, што ўсё роўна ж зусім не стоішся, прыкмецяць, а гэтым яшчэ больш насцярожыш чалавека, вырашыў пайсці насустрач вазку — хай дзядзька сабе думае, што ён, Вадзім, кіруецца ў лес і яго анікалечкі нават не цікавіць, хто там і што вязе.

Вазок застаўся ззаду, а ён усё яшчэ аддаляўся і аддаляўся ад яго, нават баяўся абярнуцца — ведаў напэўна, што гаспадар сена недзе цікуе за ім. «Хіцер Зміцер, але і я не дурань»,— нагадаў Вадзім чутыя ад некага словы і пакуль што не збаўляў ходу. Дагнаць вазок, калі дзядзька расслабіцца і згубіць пільнасць, будзе для яго як плюнуць.

Так яно і здарылася. Ужо досыць адышоўшыся, Вадзім няўзнак павярнуў галаў і ўбачыў: возчык, наставіўшы каўнер кажуха, сядзіць, бы тая кучка, да яго спіной і ў вус, пэўна, не дзьме, не думае ні пра што благое. Хлопец лёгка, на адной назе, крутнуўся і прыпусціў па гладкім санным следзе. У адзін момант апынуўся ззаду вазка. Цяпер, каб дзядзька і хацеў, то не ўбачыць, хто ў яго на хвасце. Галоўнае — рабіць усё ціха, не вельмі шабуршэць, не скубці па шмат.

Сена было мяккае, шаўкавістае, настоенае на густым лугавым водары, але ўціснута рублём і вяроўкамі гэтак,

што і пальцаў нельга нават уторкнуць, каб лацвей ухапіцца ды вырваць які жмут.

Вадзім паспрабаваў і з аднаго, і з другога боку, але нічога людскага не мог узяць. І тады, злаўчыўшыся, ён учапіўся ў вяроўчыну, падцягнуўся, дастаў левай рукой рубля. Гэтак трымаючыся, правай пачаў лапаць зверху. Сена тут ляжала вальней, і ўжо праз хвіліну Вадзім зваліў долу ладнаватую кучку. Акрылены поспехам, ён запусціў руку яшчэ глыбей, маючы намер ужо вырваць з вазка не менш чым ахапак...

І ў гэты самы момант нешта аглушыла яго, у вачах успыхнула чорная маланка, да вуха слаба, бы з-пад зямлі, даляцеў хрыпаты мужчынскі голас:

— Ах ты, паганец... Я ж табе!..

Вадзім згледзеў, як уверх матлянулася гнутая, бы вужака, арэхавая палка, гатовая зноў апусціцца на яго галаву. Яна і апусцілася, але Вадзім, перамагаючы гуд у патыліцы і рэзкі пякучы боль усёй правай шчакі і сківіцы, паспеў неяк ухіліцца ад удару, затым скочыў у снег.

Дзядзька, тпрукнуўшы на каня, таксама пачаў злазіць, але зараз Вадзім не баяўся, ён добра ведаў, што ніхто яго не дагоніць. Хоць сківіца па-ранейшаму пякла агнём, не варочалася чамусьці галава, аднак ногі ўсё яшчэ былі лёгкія, добра слухаліся яго.

Ён адбегся крокаў на дваццаць і спыніўся, пачаў чакаць. Блытаючыся ў крыссі доўгага свайго кажуха, дзядзька патупаў ззаду вазка, памацаў вяроўкі, пагразіў Вадзіму палкай, затым узяў у рукі лейцы і, няўклюдна перавальваючыся з боку на бок, пацёгся поруч з канём. Вадзім быў рады, што возчык не стаў падбіраць тое, што ўжо валялася на дарозе: відаць, палічыў гэта для сябе драбязой. А мо ўсё ж загаварыла трохі якое сумленне. Мо здагадаўся, як гэтае сена трэба зараз яму, Вадзіму, калі рашыўся на такі крок, палез к чорту на ражон...

Дадому нёс, ухапіўшы аберуч, даволі цяжкаватае бярэмца. Ужо ў вулцы адчуў, як зайшлася ад холаду левая рука — недзе, ці то калі чапляўся за рубель, ці то за вяроўчыну, парваў жыўцом рукавіцу. Яна, праўда, была ўжо нікудышная, але для бруднай работы магла яшчэ спатрэбіцца.

Ён паклаў сена на сцежку, а голыя рукі ўсунуў у кішэні фуфайкі, пачаў грэць. Галава па-ранейшаму была тлумная, ды і шчака чамусьці патаўсцела, ажно цяжка стала варочаць языком. Вока таксама нібыта пачало зацягваць

пухлінай. «Вот шчэ не хапала...» — занепакоіўся Вадзім і зноў нагнуўся, каб падняць ношку. Між рук згледзеў, як нехта, абапіраючыся на палку, звярнуў у завулак і чыкільгае па яго свежых слядах, прастуе на сценку.

Пазнаўшы, хто гэта, хлопец адчуў, як у галаву, яшчэ больш напаўняючы яе гудам, хлынула гарачая хваля крыві. Надта ж не хацелася яму вока ў вока сустрэцца з Брындам! Хоць той за апошні час вельмі здаў, неяк асунуўся і пастарэў, але як быў гадам, так гадам і застаўся. Гэта ведалі ўсе.

Зараз, убачыўшы Брынду, Вадзім адчуў нейкую здрадлівую нясмеласць, нават страх перад гэтым аднаногім чалавекам. Неяк міжволі падумаў пра яго: «Ну чаго, чаго ты гэткі злосны на ўвесь свет? Як можна жыць, калі ўсё і ўсіх, нават самых сваіх родных у хаце, ненавідзіш, калі заўсёды рабіў толькі для сябе, пыніў сваю кішку і ніколечкі не думаў, нават у самую цяжкую хвіліну, што нехта побач з табою — сыны і іхняя матка, а твая жонка — галадае?! Як можна такое? А цяпер, калі табе прыспічыла, пачала брацца за горла немач, калі і Паўлючанка адвярнулася, паказала хвігу, як не стаў даваць грошы, калі ты адчуў, што сыны ніколі не прыйдуць да цябе на паклон, бо самі ўжо нешта зарабляюць і могуць жыць не горш, а то і лепш за цябе,— вось за гэта ты яшчэ больш шалееш, пырскаешся слінай, не знаходзіш сабе месца».

Каб выслабаніць, даць сцежку, Вадзім сышоў убок як не да самага плота, пакінуўшы ў снезе глыбокія сляды. Брында, параўняўшыся, нават не глянуў у яго бок, і хлопца ўсцешыла, што так удала размінуліся.

Сена ў хлеў Вадзім адразу не панёс, пакінуў ля ганка. Хутчэй пайшоў у хату, каб сагрэць рукі, а найперш — глянуць на сябе ў ашчарэпак старога люстэрка, якое знекуль прывалок Коля, калі надумаў упершыню пагаліцца.

Ён зжахнуўся, убачыўшы сябе ў тым люстэрку. Акрамя пухліны, праз усю шчаку цягнулася пісяга, якая там-сям закарэла ўжо крывёю. Дасталося і галаве. Трохі вышэй скроні набрыняў досыць вялікаваты гузяк, ён выпер нават скрозь валасы. Але гузяк турбаваў менш, чым пабітая шчака. Як цяпер каму паказацца, што скажаш у школе, тым жа настаўнікам? А яны ж папытаюць, абавязкова папытаюць, хто гэтак прыклаўся да твайго твару, на ўвесь клас могуць і рогат падняць. Ахвочых паскаліць зубы знойдзецца колькі заўгодна, абы была зачэпка. Паду-

маюць яшчэ, што біўся з кім, ці мо старэйшы брат гэтак размаляваў за што-небудзь. Не прызнаешся ж, што цібрыў з чужога воза і заслужыў па справядлівасці. Яшчэ горш тады будуць здзекавацца. А мо не пайсці дзён колькі ў школу і пазней сказаць, што хварэў?

Лыску гэты раз ён карміў ужо не з такім настроем. Карова, праўда, зноў ажно давілася, гэтак хапала тое сена. Можна было б парадавацца, што на два дні ёй будзе чаго есці. Але радасці не было. І не толькі з-за гузяка і пісягі. Нешта так, адчуваў Вадзім, зрушылася ў яго на душы, пакінула на саменькім яе донцы гнятлівы астой. Не хацелася ні есці, ні рыхтаваць урокі, ні рабіць што па гаспадарцы.

Ён палез на печ, умасціўся на чарэні і адтуль, грэючыся, неяк безуважна глядзеў на ціхую, пустую вуліцу. Не прыкмеціў нават, як падкраўся, зваліў цяжкі і ліпкі, бы смала, сон.

## 8

Коля вярнуўся, калі пачынала шарэць, брацца на вечар. Зайшоўшы ў кухню, ён голасна, бадзёра гукнуў. Вадзім прахапіўся, зашабуршэў рыззём, пасля кумільгом скаціўся з печы.

— Ты?! — спытаў, адчуваючы нейкую бы віну, што не зрабіў нічога па доме, што заснуў, нават не пачуў, як Коля з санькмі пад'ехаў да самых варот, як адчыняў дзверы ў хату.

— Пайшлі, муку ўнясём,— Коля зашоргаў па падлозе буцамі, у якія былі запраўлены валёнкі, падаўся на вуліцу.

Ужо ля воза няўзнак кінуў погляд на Вадзіма, ажно прысвіснуў:

— Фі-і, во то-то-о!.. Што ж гэта з тваёй мордай?! Хто цябе так?!

— Пасля раскажу,— буркнуў, не стаў тлумачыць Вадзім, баючыся, каб не пачулі ў Сашыным двары альбо каля студні — там якраз жанкі цягалі ваду, а Саша ішла ад хлява, несла ў хату бярэма дроў.

Коля не стаў дапытвацца, адкінуў посцілку, якой былі накрыты чамусьці два мяхі.

— Во, пытляванка,— торкнуўшы пальцам у вялікі белы мех, горача, ажно захліпаючыся ад радасці, шапнуў Коля.

Другі мех быў іхні. Яго Вадзім адразу пазнаў па латцы, бо сам неяк прышываў яе.

Муку яны занеслі, пакінулі ў кухні — так захацеў Коля. Нагадаўшы Вадзіму, каб пакарміў чым ёсць і напаіў Лыску, а таксама запаліў у грубцы, ён пагнаў каня на канюшню. Паабяцаў доўга сёння не затрымлівацца.

У Вадзіма, нарэшце, палепшаў настрой. Найперш, мусіць, ад таго, што перастала балець галава і спала амаль што ўся пухліна. Толькі, праўда, вока яшчэ не зусім хацела расплюшчвацца, але гэта ўжо была драбяза павэдлуг з тым, што ўгледзеў ён у люстэрку з самага пачатку. Падругое, у іх ужо ёсць мука, і заўтра, не, нават сёння можна нешта смачнае зрабіць на вячэру. Карцела хутчэй памацаць пальцамі, нават панюхаць, якая яна, тая пытлянанка. Ён ведаў, што з яе пякуць калачы, сухарыкі, вараць зацірку, але бачыць сваімі вачыма не даводзілася. Мо некалі, яшчэ пры матцы і бацьку, і ў іх вадзілася такая мука, але ж тады, малым хлапчуком, хіба ён ведаў ёй цану?

Вадзім развязаў мех, узяў драўляную лыжку, чэрпнуў трохі зверху, панёс да акна — паглядзець пры большым святле. Мука была пульхная і мяккая, бы пыл, і бялюткаябялюткая, ажно не верылася, што такую можна атрымаць з пшаніцы. Во што значыць млын, а не якія там свае, самаробныя, жорны! Але хто Колю даў гэтулькі? Няўжо Мішка? Цяжка нават паверыць...

Па ваду ён пакуль што не пайшоў, спаіў карове тое вядро, якое стаяла на лаве ў кухні. Сабе прынясе, як болей сцямнее. Тады не страшна будзе, калі хто яшчэ завітае да студні — упоцемку не зменіш, што там у цябе на шчацэ ці ля вока.

Коля прыйшоў позна і мо як ніколі расстроены.

Вадзім, з хвіліны на хвіліну чакаючы брата, так нічога і не зрабіў на вячэру — усё спадзяваўся, што яны разам памазгуюць. Цяпер жа, калі ў грубцы датлявала апошняе вуголле, варыць ці пячы што-небудзь не выпадала. Елі падагрэты ўчарашні крупнік. Трохі было яшчэ праснака. Вадзім падзяліў яго, каб і на заўтра на раніцу хапіла, калі не ўспеюць чаго новага згатаваць.

Коля маўчаў, і Вадзіму, які ведаў ягоны характар, не хацелася гвалтам лезці ў душу. Ведаў, што акрыяе і сам раскажа. Аднак, калі і пасланіся і ляглі ў пасцелі, Вадзім не дачакаўся, пакуль развяжацца ў брата язык. Не сцярпеў, сам папытаў:

— А пытляванка скуль? Га?

Але ў Колі, бы і не звярталіся да яго з гэткім пытаннем, раптам прарвалася нешта сваё:

— Гад ён, гад апошні! Знаў бы, дык...

— Пра каго ты?

Коля памаўчаў, лэпнуў, чуваць было, па падаконніку, намацаў запалкі, нечага пасвяціў, пасля, калі зноў акрыла ўсё цемната, даў волю гневу:

— Пра Рагулю, каго ж шчэ... У кантору аж пазваў, кулаком грукаў па стале. У яго бо не папытаў, каб каня ўзяць, у млын з'ездзіць... Прападаеш з коньмі тымі, не ведаеш ужо, як, чым іх толькі паддзяржаць. А ён, гад, мне шчэ і выгаворвае, гразіцца...

— Можа, мне кінуць, га, Коля? — падаў голас Вадзім.— Я б пайшоў куды. Ты б пры доме, а я... Вунь жа Дзімка Марылін — трактарыст ужо!

Коля як не ўскіпеў:

— І з мазгаўні гэта сваё выкінь, каб не вучыцца. Я ўжо хай... Не ўдалося мне. Каб матка ці бацька жылі, то вучыўся б, чаго ж. Хаця б Верка тут была. Але бачыш, як усё... А ты не ўдумай мне, бо галаву адкручу. Пракідаемся памалу... Мукі ўжо ё...

Вадзім, карыстаючыся момантам, зноў запытаў:

— Што, Мішка даў пытлянкі?

Коля, чуваць было, скрыгатнуў зубамі, памаўчаў трохі, памуляўся, але мусіў усё ж прызнацца:

— Ага, чакай ад яго... А скулу хацеў? Добра, што сам адгадаваў рыла, ільсніцца аж. І ў хату, казалі, нацягаў усяго, на век хопіць. А паабедаць каб, дык і не заікнуўся. І Кацярыну б'е, казалі, калоціць з-за тога багацця. Усё мала, усё б заглынуў... А мяшок гэты, калі ён жэрці дахаты пайшоў, я сам... Ніхто не бачыў. Там з нейкай канторы малолі, многа мяхоў, не злічыш...

Вадзім, уражаны пачутым, зацята маўчаў, і Коля, каб лепш неяк апраўдацца, змякчыць свой учынак, усё гаварыў і гаварыў:

— Ты не думай, ён там не збяднее. У іх там гэты мех і не заўважаць нат. Мішка купаецца ў той муцэ. Во дзе залатое донца знайшоў! І рыла наеў... Але ж хоць бы сам папытаў, як і што мы. Прытвараўся, што і не бачыць, што з адным дохлым мяшэчкам жыта каня гнаў. І паабедаць нат... Як заеўся, ты скажы! Але нічога, і мы памаленьку вычухаемся, вот пабачыш, скора мёду шчэ той, апошні, глечык прадамо. На базар неяк трэ. А то ў мяне ўжо

і Нічыпар пытаў, думаў, што за так яму аддам. Сказаў, што няма больш. Табе б бацінкі якія купіць, гэтыя вышчарыліся ўжо. Ды і шчэ многа чаго...

Гаварылі яны як не да паўночы. У той вечар давялося і Вадзіму паспавядацца, хто яго размаляваў. Коля цяжка соп, відаць,быў нездаволены, што гэтак усё адбылося. Але маўчаў.

Спаў Вадзім кепска. Сніў рознае страхоцце. Раніцай жа, прахапіўшыся, нічога не мог уцяміць з таго, што плялося цалюткую ноч. Усё ж паступова ў памяці пачало сёе-тое вымалёўвацца. Найбольш страшнае было, калі на яго нібыта кульнуўся вялізны воз з сенам, калі прыплюшчыла галаву да каменя. Колькі ні біўся, колькі ні крычаў, каб хто памог, выбавіў з-пад гэтага цяжару,— нічога не памагло. Калі ж ужо зусім задыхаўся, знекуль працягнулася ўчэпістая валасатая рука, выцягнула з-пад гары сена. Глянуў Вадзім і абамлеў: то ж быў... Мішка з Заямнага! Абуты ў агромністыя валёнкі, ён стаяў перад ім, калываўся туд-сюд, неяк хітра і помсліва пасміхаўся.

З гэтым Вадзім і прахапіўся.

Сон яму не спадабаўся. Хацеў расказаць Колю, які ўжо ў поцемках адзяваўся, але перадумаў: ат, навошта ўсякай дурнотай яшчэ і Колю забіваць галаву?

Вадзім таксама хуценька падняўся, узяў у рукі той ашчарэпак-люстэрка. Не, на твар свой па-ранейшаму было брыдка глядзець. Коля, павярнуўшы яго галаву і так і гэтак, сказаў, што нічога страшнага няма, шрам не вельмі вялікі, сіняк таксама ўжо мала відаць, аднак у школу не варта пакуль паказвацца, каб не смяшыць нікога.

Дровы ў печы былі сухія, яны на вясёлым дружным агні хутка напяклі ладны стосік бялюткіх блінцоў. З глечыка Коля калупнуў трохі мёду, і сёння яны елі бліны з мёдам.

З добрым настроем брат пайшоў на канюшню, а Вадзім застаўся парадкавацца дома.

Ніхто з іх і думаць не думаў у той дзень, што настрой іхні будзе зноў сапсаваны.

Пасля абеду, неўзабаве як Коля залез на печ, каб трохі падрамаць ды зноў ісці на канюшню, а Вадзім зубрыў урок па гісторыі, хтосьці пад'ехаў у вазку да брамкі, накінуў лейцы на шула і паўз вокны папраставаў да ганка.

— Коля, нехта да нас...— гукнуў Вадзім, але Коля не азваўся: відаць, угрэўшыся, ён паспеў ужо моцна заснуць.

Невядомы не стаў стукацца, адразу — патрапіў жа ў цемнаце — намацаў клямку, пацягнуў на сябе дзверы.

Закрыўшы даланёй шчаку, Вадзім пайшоў глянуць, хто і чаго завітаў да іх. Найперш падумалася, што гэта іхні фінагент ці хто наконт пазыкі — тры-чатыры разы ў год яны наведваліся ў кожную хату. Да гэтага ўжо прывыклі. Але чужыя людзі амаль заўсёды стукаліся, а гэты...

Вадзім не пазнаў чалавека: на ім быў доўгі, мо яшчэ даўжэйшы, чым у тога ўчарашняга дзядзькі з возам сена, кажух, дабрэнныя, на тоўстай падэшве, боты, нейкая адмысловая пушыстая шапка з адвіслымі вушмі.

— Ну, здароў!..— павітаўся незнаёмы, і Вадзім толькі зараз па блішчастых уперадзе трох металёвых зубах і нейкім надта ж скрыпучым — ці не ад тога жалеза ў роце — голасе пазнаў Мішку. «Вот табе і сон...» — мільганула раптоўна думка.

— Здрастуйце,— адказаў Вадзім, адчуваючы, як душа яго ўсё больш і больш аддзяляецца ад цела, плішчыцца некуды ў пяткі. Ён няўзнак кінуў позірк у кут, да стала, куды паставілі з Колем тыя два мяхі. З парога, ад Мішкі яны, пэўна, не былі відаць, і зараз Вадзім нічога гэтак у сваім жыцці не жадаў, толькі каб Мішка далей парога нікуды не ішоў, толькі б папытаў, што яму трэба, і ехаў сабе дадому. Але ж, пэўна, не на адну хвілінку, не на дзве і не так сабе завітаў ён да іх. «Божачка, як жа гэта выкруціцца?» — моўчкі шапнуў ён сам сабе.

— А дзе ж той... мельнік? — спытаў Мішка, ужо кіруючыся ў залу.

Вадзім, нічога не разумеючы, лыпнуў вачыма, пасля здагадаўся, што гэта ж ён Колю мае наўме.

У зале Мішка сцягнуў з сябе рукавіцы, пачаў расшпільваць кажух. Вадзім, стаўшы цяпер ля грубкі, не ведаў, як яму быць, як трымацца. Зноў успыхнула кволая надзея: а мо ён не заўважыць Колю, даведаецца толькі, што няма брата дома, ды пойдзе на вуліцу?

Усё яшчэ трымаючыся за шчаку, ён глядзеў Мішку проста ў вочы, стараўся зразумець, што таго прывяло да іх, якія яшчэ пытанні задасць.

— Дык што маўчыш? — зноў звярнуўся да яго Мішка.— І за шчаку дзержышся... Зуб хіба?

— Ыгы...— схлусіў Вадзім, усцешаны, што Мішка сам падказаў яму нейкае выйсце. Вельмі ж не хацелася паказваць свой шрам і яшчэ пасля тлумачыць, як усё было. Ды

і наогул не хацелася нічога гаварыць, тым больш пра Колю. Мо брат будзе ціха спаць, і Мішка не ўгледзіць яго на печы.

Пакуль ён гэтак мучыўся, Коля сам выдаў сябе з галавой. Лежачы, відаць, у нязручнай позе, ён нечакана густа, смачна захроп, ад чаго Мішка, акурат як у тым ноччу сне, злрадна ўхмыльнуўся, затым пайшоў да печы, стаў на драбінкі, штосілы тарగануў Колю за калашыну.

— Га? Што? — прахапіўся той і, убачыўшы перад сабой Мішку, адразу неяк панік, пабялеў у твары, перасмыкнуў патрэсканымі ад марозу губамі. Не даючы Колю апамятацца, Мішка ўсёй пяцярнёй, бы клюшняй, хапіў яго за каўнер расхрыстанай, даўно нямытай кашулі, прахрыпеў:

— Сваячок вашывы, маць тваю!.. Шчэ ганяцца за табой? Дзе мяшок дзяваў? У цюрму хочаш?! Дык я ўпяку, не пагляджу...

Коля, ні слова не кажучы, скочыў уніз, пашлёпаў босы на кухню, ашчаперыў мяшок і, ад натугі набрыняўшы крывёю, панёс яго, гоцнуў Мішку пад ногі.

— На! На! Падавіся ім,— крыкнуў, збіваючыся на віск, брат.— Шчэ на бліны што браў, пяклі сёння, вярну. Пачакай троху. А не — то во штаны мае забяры. Можа ж, у цябе няма чаго насіць. Ага, на во штаны! — Ён матлянуўся да цвіка ля дзвярэй, хапіў дыяганалевае афіцэрскае галіфэ, досыць паношанае, пацёртае, але яшчэ без латак, кінуў Мішку ў самы твар.

Той, відаць, не чакаў такога абароту, рэзка шпурнуў штаны прэч ад сябе. Патаптаўшыся на месцы, ні з таго ні з сяго ляпнуў:

— Жаніць цябе трэба, сукінага сына! Можа, талковая пападзе, то навучыць чаму...

— А табе,— не астываў Коля,— якое дзела да нас? Сам ведаю, што рабіць. Саветчык шчэ вышукаўся...

Мішка, гняўліва бліснуўшы вачыма, плюнуў сабе пад ногі, лёгка ўзваліў мяшок на плечы, пайшоў да дзвярэй. Ужо на парозе, трымаючыся за клямку, буркнуў:

— Мог бы і папрасіць, калі ўжо так прыспічыла пакаштаваць тае пытляванкі. А то сам... А я адчытавацца як далжон? Думаў хоць?

— Выпрасіш у цябе, ага, чакай толькі! Гразі не даў бы, каб і паміраў, не то што...— артачыўся, расцвельваў сябе Коля.— Здыхаць буду, а на паклон да цябе на пайду.

Мішка паехаў, і ў хаце запанавала гнятлівая цішыня.

Вадзім, бы прывязаны, слупам стаяў ля грубкі, не ў сілах вымавіць хоць слова. Коля зноў палез на печ, доўга там сярод рыззя нешта шукаў, відаць, анучы, якія клаў сушыць, і таксама зацята маўчаў. Апануранй, як усё роўна злуючы чаго і на Вадзіма, сабраўся, грымнуў дзвярыма — пайшоў, мусіць, на канюшню.

## 9

У тую зіму як з дзіравага рэшата сыпаліся на іх непрыемнасці. Не паспелі ачомацца ад візіту Мішкі, забыцца пра мяшок пытляванкі і смак бліноў з яе, яшчэ не зусім знік шрам у Вадзіма са шчакі, а тут раптам — новае ліха: не паднялася іхняя Лыска.

Прыйшоўшы са школы, Вадзім ужо ў двары адчуў нейкі неспакой. Хата, як амаль заўсёды ў гэты час, была на замку, і ён не стаў адмыкаць, рашыў, кінуўшы торбу з кнігамі на ганку, заглянуць найперш у хлеў. Цяпер ужо неўсвядомленая трывога за Лыску пачала тачыць сэрца.

І нездарма, аказваецца. Карова, хоць Вадзім і паклікаў яе, не падала нават ні гуку, чаго раней з ёй ніколі не было. Вадзім на ўвесь мах расчыніў абедзве палавінкі дзвярэй, каб даць больш святла, падаўся да загарадкі.

Лыску ўбачыў у вельмі нязвыклай позе: яна ляжала не гэтак, як раней — на жываце, падкурчыўшы пад сябе капыты, а — заваліўшыся на бок, і ногі зараз тырчэлі бы чужыя, бы непатрэбныя ёй.

— Лыска, Лысачка, бедная наша... — Вадзім не помніў, як скочыў у загарадку, укленчыў ля каровінай галавы, як, хапіўшы за рогі, прыўзняў трошкі ад зямлі. Яна была жывая, разумнымі і добрымі, але вельмі сумнымі вачыма глядзела на яго, бы гаварыла: «Ну чаго, чаго гэтак усхадзіўся? Жыву ж, бачыш, трываю. Вось толькі млоснасць нейкая напала, ногі не сталі трымаць. А так... Паляжу, аддыхаюся і зноў устану. Ужо ж, можа, і вясна скора, і трава свежая, сакавітая пойдзе, і сонца сагрэе мне бакі і косці. І — эх, зноў бы ў поле куды, хоць бы ў высечку тую ці ў Гараўкі! Хай нават і мух там процьма, хай авадні сабе. Але ж — лета затое, многа травы, цяпла многа ўсюды. Дацягнуць толькі б! І малака шчэ дам, не думай, што старая. З цялём, праўда, ужо не атрымалася, але ж малака шчэ...»

Яму здавалася, што Лыска і напраўду хоча нешта

сказаць, мела б толькі чалавечы голас. Ён гладзіў, чухаў яе ля вушэй, на лбе, ліхаманкава думаў, што рабіць, як памагчы беднай жывёліне. Паспрабаваў быў, трымаючы за рогі, падахвоціць, каб яна паднялася, прасіў самымі найлепшымі, якія толькі ведаў, словамі, сам пнуўся з апошніх сіл, цягнуў яе ўгору. Але Лыска, хоць і ўдзячна плюскала вокам на гэтыя ласкавыя словы і нібы пагаджалася, што трэба, трэба ўсё ж падняцца, нават зрабіла аднудзве спробы, але далей гэтага не пайшла, зноў адкінулася назад, цяжка, хапатліва задыхала.

— Я зараз, зараз,— спахапіўся Вадзім і бегма кінуўся з хлява. Адамкнуўшы хату, пачаў шнарыць, шукаць, чаго б гэта даць хутчэй Лысцы, чым трохі падсілкаваць яе.

У печы стаяў вялікі гаршчок цёплай вады, і Вадзім надумаў зрабіць пойла. Віламі выцягнуў гаршчок на прыпек, адліў з яго ў пустое вядро, кінуў, папярэдне расцёршы ў далонях, рэшту зваранай раніцай бульбы. Павагаўшыся, дадаў трохі жытняй мукі. Мяшок, каб Коля не пазнаў, гэтак жа сама завязаў матузкамі. Усё старанна перамяшаў і панёс карове. Думаў, што яна адразу падыме галаву, прагна пачне смактаць. Але Лыска засталася абыякавай да боўтанкі, хоць Вадзім не раз мачыў у вядры пальцы, стараўся даць, каб пакаштавала, карове на язык. Ён зноў, узяўшыся за рогі, паспрабаваў памагчы Лысцы падняцца, зноў прасіў яе самымі ласкавымі словамі.

Толькі ўсё было дарэмна. Вадзіму хацелася ажно плакаць. Ён не ведаў ужо, што і як далей рабіць. Трэ было б хутчэй клікаць Колю, і ён, відаць, пабег бы па яго на канюшню, але ўспомніў, што брат сёння з некім удвох паехаў на луг па сена для коней — там дабіралі ўжо апошні стажок. Гэты раз была Колева чарга, таму, калі ўсё абыдзецца добра, калі не пазамятала дарогі і не перакуліцца дзе воз, ён прыедзе толькі к саменькаму вечару. Было памкненне наказаць праз каго, каб прыйшла Манька, мо яна што параіла б ці нават памагла.

Але ў апошні момант Вадзім перадумаў — надта ж не ляжала душа слухаць цётчыну звягу: чаму і тое не гэтак, і гэта не так? Бы чос на Маньчын язык напаў — усё чамукала б ды чамукала б. Чаму Коля з восені, калі Рагуля быў шчодры і таму-сяму выпісваў сена, не паплакаўся перад ім, не дамогся хоць што і для сябе? «Сіраты ж, і ён, прадсядацель, павінен быў падсобіць. Коля ж то днюе і начуе на тэй, гарам яна б гарэла, канюшні, запусціў усё

сваё, усё хазяйства, а мае з гэтага старання хвігу, адны палачкі без шышоў, вось што». I гэтак далей, і гэтак далей. Чаму Верка як з'ехала, дык і нагі сваёй сюды больш не паказвае? Моў, што ёй да таго, як жывуць, як гаруюць браты — абы самой было добра.

На довады Вадзіма, што сястра ж прыслала ліст, што ў яе зараз малое дзіця, дзяўчынка, няма як адвінуцца, а Юзік па горла заняты гаспадаркай, што прыедуць яны трохі пазней, калі не абое разам, то нехта адзін,— на ўсе гэтыя довады Манька яшчэ больш шыпела, мяшала Верку з гразёю.

Вадзім змушаны быў тады цётчыну тыраду перапыніць, сказаць ёй колькі моцных слоў. Манька як косткай падавілася, вылупіўшы вочы, хаўтала ротам паветра, а пасля захліпала і хуценька вымелася з хаты.

Яна злавалася доўга, перастала хадзіць да іх, а неяк, перастрэўшы Колю, паскардзілася цяпер ужо і на яго, Вадзіма. Коля змусіў брата папрасіць у цёткі прабачэння, запэўніць, што не будзе больш гэтак гаварыць на яе. Будзе маўчаць. Манька трохі бы адтаяла, але па-ранейшаму капыліла губу, прыходзіла да іх усё радзей, і радзей. Толькі гэта чамусьці Вадзіма больш радавала, чым засмучала.

Таму і зараз не хацелася, каб яна тут падымала гвалт — а што яна падыме, у гэтым ён аніколечкі не сумняваўся,— каб зноў чыхвосціла сястру, Колю, вінаваціла ўсіх у чортведама якіх грахах. Лепш ужо Сашу ці хаця б Марылю паклікаць.

Сашы, аднак, дома не аказалася — дзверы таксама былі замкнёныя, і Вадзім пабег да Марылі.

У двары сустрэў Дзімку. Той непадалёк ад ганка калоў дровы. Вадзім даўно яго ўжо не бачыў; хлопец з ранняй вясны да глыбокай восені на эмтээсаўскім трактары рабіў у розных — куды толькі пашлюць — калгасах раёна і дома бываў рэдка. Але ўсё роўна Марыля не магла нахваліцца, нарадавацца сынам. Па ўсіх хатах неяк насіла, паказвала Дзімкаў здымак у раённай газеце.

Там, на тым здымку, хлопец, праўда, быў не адзін, а са сваім напарнікам. Яны стаялі каля трактара, нешта бы правяралі ў ім. Відаць было ўзаранае поле, шырокімі скібамі ляжала ралля, па ёй хадзілі галкі, удалечыні чарнеўся малады лясок.

Вадзім запомніў нават загаловак пад здымкам — «На асеннім ворыве». Унізе ў вялікаватай заметцы расказвала-

ся, хто гэта ля трактара і што добрае яны зрабілі. Дзімку там уга як расхвальвалі.

Зараз хлопца было проста не пазнаць. Павэдлуг з Вадзімам ён глядзеўся ўжо амаль як мужчына. І калі ўспеў толькі гэтак выцягнуцца ды памажнець!

— Здароў, механізатар! — гукнуў Вадзім, бо Дзімка, захоплены работай, нікога і нічога не прыкмячаў.

Аглянуўшыся, той з размаху торкнуў калун у дзерава, пасля падаў руку, цісkануў. «Во гэта сіла,— зноў падзівіўся Вадзім.— Не тое што ў мяне...»

Трохі пагаварыўшы, Вадзім не стрываў, папытаўся:

— А матка ж дзе? З каровай там нешта ў нас... Мо паглядзела б.

Марыля, на шчасце, сёння пасля абеду не пайшла ў калгас, кешкалася, рабіла нешта ў хаце. Дзімка паклікаў яе. Вадзім расказаў пра ўсё, і неўзабаве ў катух, дзе ляжала Лыска, яны ўвайшлі ўжо ўтраіх. Зноў марна пробавалі падняць яе ці хаця б напаіць. Дзімка прапанаваў нават узяць дзе моцныя вяроўкі, абвязаць імі карову і, закінуўшы канцы за бэльку, падцягнуць. Калі Лыска стане на ногі, вяроўку трэба моцна завязаць і болей не адпускаць. Гэтак, казаў, ён памагаў ужо адным, у каго спыняўся на начлег.

Вадзім, падумаўшы, адмовіўся ад вяровак, вырашыў пачакаць Колю. Ён старэйшы брат і хай сам мяркуе, што рабіць. А то яшчэ кепска атрымаецца — тады ўсю віну на яго зложыць. Але ж шкада, да слёз шкада Лыску.

— Не з-за хваробы гэта, ад голаду,— уздыхнула Марыля.— Цяпер бы ёй добрай яды, сена ці чаго з бульбай паранай, а то й мукой. У мяне там картапляніку ё троху ў хлеўчыку, забярэце як. Парэжаце — усё лепш, чым салома пустая. Дый так мякчэйшае мо будзе есці... Скарэй тая б ужо вясна, трава. І людзі, і скаціна ажылі б троху.

Яна, выйшаўшы з хлява, паўглядалася на Вадзіма, зноў уздыхнула і раптам прапанавала:

— Вадзімка, дзіцятка, ты ж і сам шчэ, відаць, як са школы прыбег, і зернетка макавае ў роце не трымаў. Пойдзем, я вас з Дзімкам пакармлю. Ён тожа нядаўна прыйшоў са свайго мэтээса і за дровы тыя адразу хапіўся. А ў мяне ж там ужо капустачка зварылася са здорам, хлеба ё каліва. Пойдзем, дзіцятка. І кароўцы вашай там што, можа, знайду, занясеш. Мо возьме ў рот, паляжыць троху ды возьме...

Вадзім пачырванеў, пачаў аднекваццa, але цяпер ужо Дзімка рашуча сказаў:

— Пайшлі, пайшлі, чаго там упарціцца. Матка кліча, то...

Вадзім, пэўна, ужо згадзіўся б — надта ж напамінак пра капусту расцвяліў яго голад, выклікаў поўны рот сліны,— каб у гэты час не ўбачыў Колю.

— Во, а мы цябе чакалі,— заклапочана стрэў ён старэйшага брата.— Але я думаў, што ты позна... Хіба па сена не ездзіў?

— Ездзіў, прывезлі ўжо...— Коля, бачылася па ягоным шэрым твары, быў вельмі стомлены і таксама галодны. Паздароўкаўшыся з Марыляй і Дзімкам, ён неяк абыякава спытаў: — Што-небудзь з каровай? Не можа ўстаць?

— Ага,— кіўнуў галавой Вадзім.— Не ўстае. І ў рот нічога не бярэ. Хацелі падняць, на нагах, можа, папіла б ці з'ела што. Дык жа ніяк не падступіцца.

Марыля дадала:

— Аслабела яна. Сын кажа, што да бэлькі вяроўчынай падвязаць яе трэ.

— Ладна, там паглядзім,— буркнуў Коля і пайшоў у хату.

Моўчкі, ні слова не сказаўшы, бы пакрыўдзіліся, падаліся з двара і Марыля з сынам.

Вадзіма надта здзівіла гэтая братава халоднасць, як усё роўна абыякавасць да іхняй Лыскі. Як жа так можна?! З-за коней ён гатовы хоць пабіцца з кім, часта прывалачэцца з работы і бегае з кута ў кут, зубамі ажно скрыгоча, калі што на канюшні не так. А тут — свая ж, адзіная іх кароўка канцы можа ў любы час аддаць...

Але ўжо неўзабаве Вадзім зразумеў, што дарэмна ён так кепска думаў пра брата. Тому і праўда было пакуль што не да Лыскі. Коля нават і есці не стаў чаго шукаць, а хутчэй, ухапіўшы з цвіка старую,Верчыну яшчэ, капоту, палез на печ, акрыўся з галавой. Нейкі час сцішана ляжаў, і Вадзім, упэўнены, што брат надта намёрзся і цяпер, угрэўшыся, заснуў, не стаў да яго прыставаць, задаваць пытанні.

Недзе, аднак, праз паўгадзіны Коля пачаў стагнаць, чаго з ім ніколі не было, варочацца з боку на бок. Вадзім не вытрываў, падышоў да печы, гукнуў:

— Чаго ты, Коля? Прастудзіўся?

Коля па-ранейшаму не азваўся, бы і не чуў, што да яго звяртаюцца.

Вадзім хацеў ужо апранацца, ісці на двор, зноў хацеў паглядзець Лыску, ды і дроў прынесці. Скора ж паліць у грубцы, думаць нешта на вячэру. Добра было б з братам параіцца, ды вось жа... Невядома, што з ім такое... Хіба і на канюшню больш не пойдзе? Няўжо Нічыпар адпусціў яго, адзін нанач узяўся ўходжвацца з коньмі?

— Пачакай...— зноў застагнаўшы, Коля сеў, спусціў з печы ногі.— Нядобра мне нейк. Мусіць, надарваўся. Трэба б дзівасілу дзе. Нічыпар сказаў, толькі дзівасіл і паможа.

— А як гэта... надарваўся? — спытаў Вадзім.— Хіба на пуп што надта?..

Коля лёг і, пакуль Вадзім апранаўся, з пятага на дзесятае расказаў, што з ім сёння адбылося.

Яны ўдвох — з ім быў Галенда Жоржык, яго прызначыў у помач Давэцька — хутка знайшлі той апошні стажок, хутка наладавалі неблагі воз. Маглі б, праўда, ускінуць і больш, але разлічылі, што якраз гэтулькі застаецца, каб узяць у другі заезд. Добра ўціснулі рублём, абвязалі вяроўкамі, самі палезлі наверх. Думалі, што без бяды, без гора дабяруцца да Жорнаўкі, узважаць, дзе скажа фуражыр, скінуць тое сена і зноў, хуценька чаго перахапіўшы, паедуць па астатняе. Да цямна лёгка абернуцца.

Ды выйшла неспадзеўка.

Калі, адразу за Машчонамі, з'язджалі з невысокай горкі, дзе ўперадзе гарбаціўся драўляны масток праз укутую лёдам Альшанку, парвалася ці развязалася нечакана правая лейчына. Конь выплюнуў цуглі і, цяпер ужо без усякага тормазу, не стрымаўся на схіле. Падагнаны саньмі з сенам, ён з усіх капытоў пусціўся ўніз.

Коля на хаду скочыў з воза, маючы намер неяк памагчы напалоханай жывёліне, мо нават ухапіцца за аброць ці нават за храпу і гэтак збегчы разам, трапіць акурат на масток. Але на нагах ён не ўстаяў, плашмя расцягнуўся на дарозе. Імкліва падхапіўся і з жахам убачыў, што воз ужо далекавата, звярнуў з дарогі ўлева і па снежным цаліку імчыць да рэчкі. Мільганула думка крыкнуць Жоржыку, каб не цягнуў з усіх сіл за цэлую лейчыну, адпусціў яе зусім, не збіваў каня з тропу — той сам адолее страх, сам на роўным выкіруе куды трэба.

Але было позна. Ці то жывёліна зусім ашалела, ці то гружаныя сані гэтак набралі разгону, толькі яны ў імгненне вока апынуліся на шурпатым і надта ж шорсткім ад умерзлага снегу лёдзе.

Коля падбег і здзівіўся, як воз не кульнуўся, з'язджаючы з берагавога адхону. Конь і сам, відаць, не чакаў такога, бо цяпер дробна калаціўся, вінавата касіў вокам, бы прыкідваў, куды ж гэта яго занесла нячыстая, як выкараскацца адсюль.

Удвох з Жоржыкам — той таксама быў напачатку ні жывы ні мёртвы — яны прайшлі па лёдзе мо метраў з дзвесце, пакуль знайшлі больш-менш прыдатнае, каб выбрацца на бераг, месца. Вытапталі старанна снег, праверылі яшчэ раз, ці моцна тут закута рака, і ўжо тады падвялі, завярнулі як трэба каня. Вырашылі, што Жоржык будзе за павадыра і паганятага, а ён, Коля, возьмецца папіхаць ззаду. Усё ж без падмогі чалавека тут, пэўна, аніяк не абыдзешся.

Гэтак і зрабілі. Жоржык праверыў вупраж, пасля, узяўшыся за аброць, ласкава, але настойліва папрасіў каня:

— Ну, Гнядок, не падкачай, ядры цябе. Пасля хлеба дам. А хочаш — на́ зараз, падсілкуйся сабе.— Ён выняў з кішэні ватоўкі кавалак жытняга хлеба, паднёс каню да губ. Той з удзячнасцю ўзяў, запрацаваў скіўцамі. «Сенам бы яго шчэ падкарміць...» — падумаў Коля, але вырашыў, што гэта зойме нямала часу. Падкормяць пасля, як выедуць на роўнае. Абы толькі выехаць...

Нечаканасць надарылася ўжо амаль на самым версе.

Гняды, каб на імгненне перавесці дых перад апошнім рыўком, спыніўся, расслабіўся, і сані, якія амаль напалову былі ўжо на роўным, раптам пад адным полазам аселі ў снег, пачалі хіліцца.

Коля, які папіхаў і гэтак ужо стараўся, што ажно ўплішчыўся ў сена, не паспеў адскочыць убок. Увесь цяжар лёг на яго плечы. Дзякуючы яму воз і не кульнуўся. Але Коля ў тую хвіліну ўжо не думаў ні пра што: перад вачыма яго паплылі чырвоныя кругі, а ногі і шыя гатовы былі вось-вось хруснуць, зламацца. Нешта бы адарвалася і ў жываце. Крыкнуць, каб і хацеў, ён ужо не мог: у горла акурат хто ўторкнуў тоўстую палку. Толькі здушаны хрып цяжка вырваўся з грудзей.

Не разгубіўся гэты раз Жоржык. Спрыту яму не давялося пазычаць: імгненна, у тры скачкі, ён апынуўся ля Колі, падставіў свае плечы і адначасова моцна таргануў за лейцы, нокнуў каню. Гняды зразумеў усё, напяўся яшчэ раз і нарэшце выцягнуў воз з рэчышча.

Коля толькі наверсе, на сене, трохі аддыхаўся. Усю

астатнюю дарогу кіраваў Жоржык, а ён ляжаў спачатку пластом і адно ля самай Жорнаўкі злез наніз, паплёўся поруч з саньмі.

Вядома, другі раз, па астатняе, яны ўжо не паехалі. Жоржык выправадзіў Колю дадому, падрадзіўшыся сам упарадкаваць і сена, і з коньмі Нічыпару што-кольвечы падсобіць.

Вадзім не ведаў, што параіць брату.

— А мо мёду, Коля? — спытаў ён.— Бо дзівасілу ж тога... дзе й знайсці?..

— Калі ё ў каго, то хіба ў Ліпая. Але, можа, абыдзецца. Паляжу — і пройдзе, далжно прайсці. У Ліпая з галавой нешта. Не гаворыць саўсім. І не падымаецца. Глухая Рошчыха, ну, якая ў канторы выцірае, толькі па губах і панімае яго. І глядзіць. Варыць, прымае. Але і ў яе дапытайся...

Ноч прайшла быццам спакойна. Коля звечара як заснуў на печы (у ложак не схацеў, сказаў, што трэба яму як мага больш цяпла), дык да раніцы, мусіць, і не прачынаўся.

Вадзім, перад тым як самому легчы, схадзіў яшчэ ў хлеў. Палячы лучыну і гэтак свецячы сам сабе, зноў падсунуў карове, цяпер ужо з жалезнай місы, падагрэтае ў грубцы пойла. На радасць, яна зараз высмактала як не да дна. Таму, настроіўшыся, што ўсё абыдзецца, заўтра будзе зусім добра, Вадзім пайшоў у хату, лёг у пасцель. Стомлены за дзень, ён хутка заснуў і спаў акурат забіты.

Прахапіўся раніцай і не ведаў, як быць: збірацца ў школу ці не. Коля ўжо прачнуўся, але з печы не злазіў. Зразумеўшы, відаць, што турбуе брата, сказаў:

— На работу сёння не пайду. Шчэ трэба адляжацца. А ты збірайся ў школу. Лыску я потым, як развіднее, пакармлю. Чорт яе не возьме.

...А вечарам Вадзім плакаў, як даўно ўжо не плакаў апошні час. Вініў, поедам еў сябе, што паслухаўся, папёрся з дому. Сёння яшчэ і забавіўся гэтак надоўга. Надумалі якраз пасля ўрокаў сход класны праводзіць, паклікалі нават дырэктара. Сарамацілі, ушчувалі Рылу, гразіліся выключыць са школы за тое, што аціраўся вечарам ля РДК і з некім там пабіўся, трапіў у міліцыю. Сам жа Рыла бы і не чуў за сабой віны, нахабна глядзеў усім у вочы, і дырэктару таксама, успомніў нешта пра свайго бацьку. Смех, дый годзе! На гэтым і ўвесь сход скончыўся.

Вадзім і на ўроках, і на сходзе сядзеў сам не свой. Сэрца як чула нешта. Здэцца, і пісаў быў з дошкі ў сшытак, і слухаў, што гаварылі, тлумачылі настаўнікі, і карпатліва гартаў старонкі падручнікаў, баючыся, каб не выклікалі, таму што сёння нічога не ведаў,— аднак рабіў гэта нібы ў сне, падсвядома, бо ў галаву нешта торкала і торкала: там, дома, не ўсё ў парадку, трэба бегчы хутчэй...

І праўда: яшчэ ля рова вельмі пастарэлая апошнім часам, але ўсё ўвішная Клава Чапылова, якая разносіла пошту, спыніла яго і з маркотай у голасе спытала:

— Ты ж, мусі, са школы толечкі?

— Ага,— Вадзім хацеў бегчы далей, ды яго дагнала новае, як бізун, пытанне:

— Той й ня ведаеш, што карову дарэзалі, што брата ў больніцу забралі?

У Вадзіма ажно дыхавіцу заняло. Ён ледзьве выціснуў з сябе:

— Як... дарэзалі? Лыску нашую?!

Клава не паспела нічога адказаць, бо ў гэты час з-пад брамкі выскачыла звяглівая Ліпаёвых сучка, кінулася жанчыне пад самыя ногі, на ўсю вуліцу нарабіла енку.

Вадзіма бы ветрам здзьмула з таго месца, дзе толькі што стаяў. У хаце, у якую заляцеў, нават не зачыніўшы ніводных дзвярэй, яго чакала цётка Манька.

— Во, з'явіўся віхор...— яна, апранутая ў чорную плюшаўку, у цёплай ваўнянай хустцы, нізка насунутай на лоб, сядзела на ўслоне, а перад ёй на падлозе з драўляных начовак... вытыркаліся рогі, вялікім журботным вокам глянула на Вадзіма, апёкшы яго сэрца, каровіна галава. Нешта яшчэ, аслізлае і бясформеннае, ляжала на дне начовак.

Ад убачанага Вадзіму зрабілася млосна, ды ён неяк перамог гэтую сваю слабасць і ўсё, што бруіла зараз у ім, пераверў, неспадзеўкі нават для самога сябе, у злосць, тупую неразумную злосць, каб выплюхнуць яе на цётку. Пазней, вядома, ён вініў сябе за гэтую нястрыманасць, гатовы быў, здэцца, язык свой адкусіць, што так даў яму волю. Але зараз адна апантаная, нічым не стрыманая лютасць, бы цётка, толькі яна, была вінавата ва ўсіх іхніх з Колем бедах, валодала ім.

— В-вы... вы... вы...— ён задыхаўся, губы яго дрыжэлі, ён ліхаманкава шукаў найбольш калючых для цёткі

слоў.— в-вы-ы... і маму маю ненавідзелі, і нас хочаце... каб нічогачкі... Вам радасна, што ў нас так... Чаму вы Лыску... зарэзалі? Ага! Я ведаю, ведаю... Вам... В-вы-ы! І Верку ненавідзіце за нешта. Усіх бы ўкусілі!.. Праглынулі б нат...

Ён нешта яшчэ, нічога не цямячы, не кантралюючы сябе, крычаў як не ў самы цётчын твар, пакуль яна, збялелая, з моцна падцятымі бялёсымі губамі, не завішчала на ўсю хату:

— Сціхнеш ці не, га?! Смаркач ты за...ны... Чо ж, не ведаючы, плявузгаеш? Хто, хто зарэзаў Лыску?! Я, ці што?! Табе Коля скажа... А што самі давялі яе... гэтак... Я ў тым хіба вінаватая?.. Цьфу ты!.. Хацела вам з галавы і вымя што памазгаваць, то цяпер сам рабі, сам хоць задушыся. Патрэбна мне гэта... Каб такая няўдзяка чорная... Божачка, Божа!..— цётка гняўліва апякла Вадзіма позіркам, паднялася з услона і, цяжка шоргаючы па падлозе нацягнутымі зверху бурак буцамі, папляласся да парога. Перш чым ляпнуць клямкай, яна абярнулася, яшчэ ў дадатак злосна кінула: — І нагі маёй тут больш... ані... Каб мяне так чыхвосцілі!..

Вадзім не спыніў яе, не папрасіў прабачэння, зараз усё ў ягонай галаве перамяшалася, ён па інерцыі яшчэ бегаў па хаце, не ведаючы, што рабіць далей. Начоўкі з каровінай галавой і вымем ён, зноў здрыгануўшыся ўсім целам, засунуў далей пад лаўку, зверху нават кінуў на іх нейкую сатлелую, з «чортавай скуры», сарочку.

Цяпер падумаў пра Колю. Няўжо ж яму так кепска стала, што ў бальніцу забралі? І калі? Хіба ўжо як Лыску пад нож?.. Бо без Колі... А мо ён сам яе... каб не мучылася доўга?..

Ушчэнт разгублены і расстроены, Вадзім не прыкмеціў, як нехта матлянуўся паўз вокны, загрукаў на ганку.

Зайшоў Нічыпар.

— Ну, здароў, Салавей-разбойнік! — бадзёра павітаўся ён, папраўляючы на правым воку чорную падушачку-павязку.

Вадзім здагадаўся, што Нічыпар завітаў не так сабе, што якраз ён, пэўна, усё зараз і выкладзе.

— Чым ты цётцы гэтак насаліў? Стрэў на вуліцы, то ўсім — стрэчнаму-папярэчнаму — пярындзіць, што ты ашалеў саўсім, з хаты яе выгнаў. І чуць не з кулакамі кідаўся. І мне, сказала, лепш не пападацца табе пад руку, бо можаш апошняе вока выдзерці. Гэткі, казала, шалёны,

бы Давэцькаў сабака, якога на шкурадзёрку аддалі. Што ж гэта, га?

Вадзім не стаў апраўдвацца, нецярпліва папытаў:

— Дзядзька Нічыпар, што з Колем? І што тут было, пакуль я ў школе?..

Нічыпар трохі супакоіў:

— Ды нічога ўжо такога... страшнага... Лыска хіба што... Дык жа Коля сам мяне малёгаў. На канюшню прыбягаў. Касой мы і дарэзалі, бо саўсім дрэнная была... Коля трымаў за рогі, а я... Яшчэ б трохі — і адкінула б капыты. Тады хіба на мыла, як таго Давэцькавага сабаку. Пасля і Колю нешта скурчыла. Паклікалі ў помач Жоржыка, і ён павёз, каб паказаць дохтару. Ну, той і пакінуў Колю ў бальніцы. Сказаў, што падмацуюць. А я сам — з тушай — адразачку на бойню...— Нічыпар пакорпаўся ў кішэні зашмальцаванага ватніка і выняў паперку, падаў Вадзіму.— На. Гэта квіток на гавяду. Па ім троху пазней грошы дадуць. Каб многа — то не. Надта ж худэба была. Адна скура ды косці. Але грошы ўсё ж будуць. Коля сам пасля палучыць. Можа ж, нядоўга яго там падзержаць, халера іх ведае...— Нічыпар яшчэ раз падбадзёрыў Вадзіма і пайшоў. Стала нібы лягчэй, але ненадоўга.

Усё ж і ў той вечар, і назаўтра, калі, вырашыўшы прапусціць урокі, Вадзімварыў каровіна вымя, каб аднесці чаго смачнейшага Колю ў бальніцу, яго не пакідаў адчай. Каб хто сказаў дзён колькі назад, што ён сам, сваімі рукамі будзе мыць, рэзаць на кавалкі і варыць у гаршку нешта ад іхняй Лыскі, ён тады і напраўду ўчапіўся б таму брахуну ў валасы ці плюнуў у твар. Лепш ужо не жыць на свеце, чым да такога дакаціцца.

Напачатку ён і не думаў падыходзіць да начовак, дзе ляжалі каровіны рэшткі. Хацеў быў нават, зноў наплакаўшыся перад сном, упоцемку вынесці ўсё на двор і закапаць дзе глыбока ў снег. Але, уявіўшы, як галодныя сабакі вынюхаюць — а вынюхаюць яны абавязкова, ад гэтых шэльмаў нічога не схаваеш — і вывалакуць здабычу наверх, мо і на вуліцу нават, а хто-небудзь з жанок яшчэ возьме ды скажа адна адной: «Во глянь, гэта ж, яй-бо, ад Гурковых здыхлі, ну, Лыскі, значыць. Вадзім, пэўна, выкінуў. І з рагамі нат, глядзі...», ён не стаў нічога рабіць, пакінуў усё на ранейшым месцы. Сам раздзеўся і лёг спаць.

А раніцай, ужо трохі з іншым настроем, вырашыў усё ж, паспрабаваў зварыць тое вымя. Найперш, вядома, для

Колі. Колю трэба мяснoe. Не вельмі ў бальніцы што дадуць. Ага, чакай толькі. Праўда, і дома яны каштавалі мяса хіба што на вялікае свята. Але ж дома — не тое што там. Хвораму чалавеку ўсё трэба па-іншаму. Ды і людзі ж бачыць будуць. Яшчэ скажуць, што для брата роднага не мог чаго пастарацца...

У гаршку на прыпечку кіпела мо з гадзіну, і Вадзім не стаў больш падкладваць трэсак пад трыногу: вырашыў, што можна ўжо вымаць і пробаваць той наедак.

Аднак, з цяжкасцю адрэзаўшы невялікі кус і ўзяўшы яго на зуб, ён адчуў, што вымя аніколечкі не памякчэла — як было гумай, калі сырое клаў у гаршчок, так гумай засталося і зараз. Ніякі кіпень не зрабіў яго ядомым. Зноў паставіў гаршчок на трыногу і пайшоў з кашом пад паветку, падабраў апошнія сухія трэскі і паленцы. Агню цяпер рашыў даць больш. У ваду — добра, што не здурнеў і не паспеў адцадзіць — кінуў яшчэ дробку солі, бо падалося, што было мала.

Варыў цяпер, час ад часу поркаючы ў вымя відэльцам, яшчэ гадзіны са дзве. Калі ўжо не стала чым паліць і зусім лопнула цярпенне, Вадзім усё ж выліў ваду. Яна была рудая, нейкая смярдзючая, і ніводнай кропелькі тлушчу не плавала ў ёй зверху.

Зноў, так-сяк адшмуляваўшы нажом новы кавалачак, заўзята ўпіўся ў яго зубамі. Не, яно па-ранейшаму аніяк не паддавалася, каб можна было хоць крыху разжаваць ды пракаўтнуць. Балелі ўжо сківіцы, і Вадзім, не вытрываўшы, адчуўшы марнасць сваіх намаганняў, выплюнуў усю гэтую жвачку ў памыйнае вядро. Было да слёз крыўдна, што страціў гэтулькі распалу, а яшчэ часу. Да ўсяго таго і галодны застаўся. Спадзяваўся, што тым звараным вымем сам падмацуецца і Колю прынясе. А цяпер з чым ісці? Пячы праснак ці аладкі? Ужо ж добра разднела, і варта толькі спазніцца, то могуць пасля зусім не пусціць.

Пайшоў у мястэчка з цяжкім сэрцам і пустымі рукамі. Скажа брату ўсё як ёсць. Мо ён, Вадзім, не так варыў? Мо цётка змагла б што лепш зрабіць? Але цяпер ужо думай не думай — позна. Сам вінаваты...

## 10

Колю адшукаў не адразу. Па-першае, не ведаў напачатку, куды ткнуцца. Бальніца змяшчалася ў некалькіх драўляных, Бог ведае якога часу, нізкіх і змрочных зна-

дворку будынінах. Праўда, тут жа, трохі збоку, узводзіўся ўжо новы, на два паверхі, цагляны корпус, і многія, ведаў Вадзім, ажно языкамі цмокалі ад захаплення, што ў іх будзе гэткая свая высокая і прасторная бальніца.

Усё ж нейкая цётка падказала яму зайсці ў прыёмны пакой, а там ужо скажуць, куды адвялі і паклалі хворага. Вадзім так і зрабіў. У прыёмным сядзела, корпалася ў шуфлядцы стала досыць зграбная з твару дзяўчына, і ён, нясмела кашлянуўшы, папытаў:

— Мне к брату. Учора яго паклалі. З жыватом нешта...

Дзяўчына ўзняла вочы. Вадзім мімаходзь адзначыў сам сабе, якія яны ў яе цёмныя і прыгожыя. Чамусьці хацелася глядзець і глядзець у іх бяздонне. Ён нават засаромеўся і пачырванеў ад гэтага свайго неўсвядомленага жадання. Таму, каб дзяўчына не падумала чаго благога, ціхенька дадаў:

— Яго Гурко фамілія, Коля... Можа, ведаеце?

Яна глянула на свой маленькі ручны гадзіннік, хвіліну бы ўзважвала нешта, пасля сказала:

— Ведаю, як жа. Але зараз нельга. Там доктар... Пасядзі трохі. Скончыцца абход, тады хіба што.

Вадзім быў удзячны гэтай дзяўчыне ў белым халаце, які зграбна аблягаў яе танклявы гнуткі стан. Нечым ледзьве ўлоўным — ці то голасам сваім, мяккім і спагадным, ці то манерай ускідваць галаву, калі трэба было папраўляць кудзеркі, што выбіваліся з-пад гэткай жа белай, як і халат, шапачкі, ці то паставай і нават трохі вачыма — яна нагадала Вадзіму сястру, і зрабілася чамусьці сумна, нават балюча. Зноў мо як ніколі востра адчуў ён, як не хапае Веркі. Зараз во захварэў Коля, ён недзе валяецца тут. Недзе яму, можа, блага, а Верка анічога не ведае, што ў іх тут робіцца. Хацелася ад усяго гэтага плакаць, але ён як мага стрымліваў сябе.

Нехта ляпнуў дзвярыма і па-гаспадарску цвёрдым, рашучым крокам увайшоў у пакой. З-пад узмакрэлых ад нечаканых слёз веек Вадзім зіркнуў на чалавека і адразу тузануўся на крэсле, не ведаючы, куды зашыцца, што рабіць: да стала, дзе сядзела дзяўчына, кіраваўся сам Рагуля. «Чаго яму сюды? — мільганула думка.— Захварэў, ці што? Але ж твар вунь аж ільсніцца ад тлушчу ды здавальнення. А мо ён таксама праведаць каго?»

— Ірыне, самай пекнай дзяўчыне, наш баявы салют! — расплыўся ў шчаслівай ухмылцы Рагуля.

Ён нахіліўся, нагвалт узяў дзявочую руку, прыклаў да губ, гучна цмокнуў.

— Ой, што вы робіце?! — засаромелася Ірына.— Я ж на рабоце. Дый людзі...

Рагуля толькі цяпер агледзеўся, пашукаў тых людзей, але, акрамя хілага падлетка, які, унурыўшыся, сядзеў, мо драмаў у кутку, нікога больш не ўбачыў. Зарагатаўшы, ён па-свойску плюхнуўся на кушэтку, з палявой афіцэрскай сумкі выняў нейкую прыгожую бутэлечку, паставіў перад дзяўчынай.— Во! Шык заморскі. З саменькай Масквы везлі.

— Гэта — мне?! — ажно ўспыхнула Іра.— Божачка, духі! Відаць, дарагія...— Яна пакруціла бутэлечку перад вачыма, адвінціла нешта зверху, з прыемнасцю панюхала. Пасля, завінціўшы, раптам адсунула ад сябе.— Не-не! Вазьміце назад. Вы ж растраціліся, а я... Я не магу такое...

Рагуля хіхікнуў, усхапіўся з кушэткі і, перагнуўшыся цераз стол, паклаў падарунак у шуфлядку. Дзяўчына больш не пратэставала, але чырвань, што заліла яе твар, ніяк не сыходзіла.

Вадзіму было надта няёмка, што ён тут апынуўся, з'яўляецца сведкам гэтых Рагулевых заляцанняў. Добра яшчэ, што той яго не пазнаў, хоць пазнаць, мусіць, ніяк і не мог. Хіба ўсіх у Жорнаўцы, нават падлеткаў, Рагуля мог ведаць у твар? Аніколі. Тым больш ён, Вадзім, здэцца, ні разачку не мазоліў яму вочы. І ўсё ж хлопцу было зараз хоць скрозь зямлю праваліся.

— Нешта ты сёння кіслая. Хто-небудзь зноў канцы аддаў? Якая-небудзь старушэнцыя? Дык жа пажыла, годзе. Чаго неба капціць...— Рагуля паспрабаваў жартаваць, але Іра не падтрымала яго гуллівага настрою, нават не ўсміхнулася. Схамянуўшыся, прызналася, як бы паскардзілася:

— Ой, мне не да смешачак. Цяжка да ўсяго прывыкнуць. Відаць, кіну гэту работу. Каб жа толькі, як вы кажаце, «старушэнцыямі» канчалася. А то ж ад ран колькі і маладых... Не, не магу! Усё вайна бокам вылазіць. Вы гэта не так бачыце, а ў бальніцы... Кожны дзень нешта. Сёння во ноччу адзін стары памёр. Летам яшчэ паклалі. З Заямнага ён. Спаралізавала зусім. Казалі, нейкіх двое бандзюкоў жонку яго забілі, ды і сам ён чуць жывы прыпоўз з хутара ў вёску. Кроўю доўга харкаў, а пасля спаралізавала. Усю восень і зіму ў нас праваляўся. Быў трохі, з пятага на дзесятае, загаварыў, і адразу — міліцыю клі-

кацы. Задыхаўся, крычаў, што ў нас тут бандзіт робіць, што сам бачыў яго. Доктар смяяўся, ўсе шкадавалі старога, а той яшчэ больш нерваваўся, крычаў і крычаў, пакуль...

Зазваніў тэлефон. Іра ўзяла трубку, з некім горача пачала спрачацца.

Вадзім быў агламошаны пачутым. Малаточкам у мазгі ўсё стукала і стукала: «Дык то ж яна пра Матэцкага!.. Глянь ты, памёр і стары, во перажыў дык перажыў гора і страху. А цяпер — гэтак шчэ ў бальніцы...» Было надта цікава ведаць, што Іра раскажа пра Матэцкага яшчэ, бо яна ж не скончыла, на паўслове перапыніў званок.

Адарваўшы ад каленяў галаву, Вадзім няўзнак зіркнуў на дзяўчыну. Але вока зачапілася не за яе, а за Рагулю. І дзіва дзіўнае! Толькі што чалавек пеўнем пахаджваў, а зараз сядзіць на кушэтцы нейкі зусім чужы, азызлы, наструнены. Няўжо гэтак спяшаецца куды? Дык хто ж цябе трымае!..

Ні Іра, ні Вадзім і ўявіць сабе не маглі, што думаў у гэтыя хвіліны Рагуля, што рабілася ў яго на душы. Страх, у якім ён жыў цэлы тыдзень, калі даведаўся ад Кантовіча, што стары ў бальніцы трохі ачуняў і нават нібыта загаварыў, зараз, пасля Ірыных слоў, зноў скаваў усё нутро. А гадзіну ж назад ён ажно скакаў ад радасці. Той жа Кантовіч з самага ранку прыехаў на нейкім драндулеце да яго ў кантору, зайшоў у кабінет і, зачыніўшы шчыльна дзверы, горача шапнуў:

— Ну, маліся Богу. Можаш цяпер дрыхнуць спакойна...

— Ты пра што? — не зразумеў Рагуля, вяла падаючы ранняму госцю руку.

Але Кантовіч, замест таго каб адразу адказаць, не мучыць няпэўнасцю, не спяшаючыся зняў з сябе новы даўгаполы кажух, павесіў на вешалку, з нейкай споднай яго кішэні выняў крамную, з наклейкай, пляшку, у алюмініевую кружку, што стаяла на стале ля графіна з вадой, наліў як не поўна. Піць першы не стаў, падаў кружку Рагулю.

— Прычасціся, памяні раба божага. Хай яму добра на тым свеце можацца.

Рагуля пра ўсё здагадаўся, засвяціўся тварам, але, быццам яшчэ не верачы, спытаў:

— Калі?

— Сёння ноччу. Усё, цяпер хіба што ў раі ці ў пекле будзем высвятляць адносіны...— рагатнуў Кантовіч і дадаў: — Дык і я хачу прыгубіць трошкі. Давай спаражняй хутчэй посуд!

Яны выпілі ўсё да донца. Кантовіч не стаў затрымлівацца, адразу сабраўся ехаць. З ім надумаў падскочыць у мястэчка і Рагуля. Шыхнула раптам думка завітаць да Іры Лабуцінай, каб ад яе самой выведаць што-небудзь пра старога. Цяпер можна ўжо не баяцца, што зноў сутыкнецца з ім вочы ў вочы. У стале ён знайшоў, кінуў у армейскую палявую сумку, з якой ніколі не разлучаўся, падарунак для дзяўчыны. Яго ўжо даўно прыдбаў на ўсякі выпадак.

Іра хоць і пацвердзіла словы Кантовіча (Рагуля быў надта здаволены, што гэтак лёгка падбіў дзяўчыну на патрэбную гаворку), але яе прызнанне не дало яму якой-небудзь палёгкі. Пакуль Іра разводзіла лясы па тэлефоне, Рагуля напружана прыкідваў, што ж яшчэ хацела сказаць яна пра Матэцкага, пра яго апошнія дні ў бальніцы. Настырна лезці з роспытам цяпер ужо рызыкоўна, а ведаць трэба было б. А раптам усё ж Матэцкі дакрычаўся, раптам яго выслухаў хто трэба і ўзяў сабе на заметку? Мо хвароба знарок дала старому для гэтага кароткую перадышку, развязала язык, каб перад смерцю выказацца, загубіць і яго, Рагулю? А што, калі ён назваў ягоныя прыкметы, а мо нават, дазнаўшыся як, і прозвішча?..

Двое мужчын выйшлі з-за шкляных дзвярэй, падаліся на вуліцу. Адзін з іх, маладзейшы, з дбайна дагледжанай бародкай, тут жа вярнуўся, наблізіўся да чалавека на кушэтцы, падаў руку.

— Го-о, таварыш Рагуля! Што, зноў з нагою да нас? Дык я ўмомант. Ці, можа, якая другая патрэба? — барадач кінуў хуткі цікаўны позірк на Іру.

Рагуля не адразу пазнаў Асколава. Той ад лета памажнеў, наеў добры жывоцік, адгадаваў на твары густую расліннасць. Вельмі ж не хацелася Рагулю, каб яго тут хто зараз пазнаваў. Але што зробіш...

— Ёсць патрэба,— беручы сябе ў рукі, сказаў ён, каб толькі Асколаў хутчэй адчапіўся, ішоў па сваіх справах.

Іра паклала ўжо трубку і зараз нешта запісвала ў журнал. На хвіліну адарваўшыся ад гэтага занятку, яна глянула ў бок Вадзіма, сказала:

— А ты, хлопчык, можаш прайсці да брата. Ён у ты-

наццатай палаце. Толькі б табе апрануць што наверх.

Дзяўчына адамкнула старую, паточаную шашалем шафу, пакорпалася ўсярэдзіне і падала яму доўгі сіні халат, у якім не было ніводнага гузіка.

— Ну, хоць такі,— усміхаючыся, яна сама накінула яго Вадзіму на плечы, адчыніла шкляныя дзверы і паказала, па якім калідоры ісці.

Коля, відаць, аніяк не чакаў зараз брата, бо адразу, не павітаўшыся нават, напусціўся на яго:

— А чаму не ў школе? Хочаш, каб зацягалі пасля? Вечарам бы ўжо забег, калі так прыспічыла.

І ўсё ж Вадзім бачыў, што брат рады гэтаму візіту. Коля падняўся з ложка, надзеў казённую апратку і выйшаў у калідор. У канцы яго стаяла некалькі табурэтак. Там, ля цёплай батарэі, яны і прымасціліся.

— Ты не вельмі... гэтак... перажывай,— сказаў Коля.— Нешта будзе. Грошай трохі палучым, то, можа, хоць цялушачку купім. Праз лета, глядзі, і карова гатовая. А наша ўжо старая была. Колькі тога малака давала...

Вадзім каўтнуў камяк у горле, запярэчыў:

— Ага! Затое — якое! Ні ў кога не было такога смачнага...

— Гэта табе здаецца.

«Не здаецца! Не здаецца!» — хацеў крыкнуць Вадзім, але ў час стрымаўся, бо ўбачыў, як спахмурнеў Колеў твар, як нервова ён перасмыкнуў губамі. Замест гэтых слоў Вадзім ціха папытаў:

— А цябе калі, га, Коля? Ну, з бальніцы... Аднаму ведаеш як... А што доктар кажа?

Коля махнуў рукою, бы гэта было для яго драбязой, пра якую не варта нават і гаварыць, і ў сваю чаргу пацікавіўся:

— Нічыпар аддаў квіток?

— Ага.

— Колькі там заважыла? — брат думаў, відаць, толькі пра адно.

Вадзім адчуў сябе няёмка, што нават не глянуў на вагу. Ад яе ж залежала, колькі грошай дадуць.

— Не ведаю,— павініўся ён перад Колем.— Але Нічыпар казаў, трохі будзе.

— То можаш і сам палучыць. У Нічыпара папытай, ён падкажа, дзе там плоцяць. І каб не траціў, глядзі! — строга папярэдзіў брат.

Ісці дадому не хацелася. У школу таксама было позна.

Канчаўся недзе чацвёрты ўрок, і каб цяпер Вадзім заявіўся ў клас, яго б толькі ўзнялі на смех. Ды і перад класным, а то і дырэктарам давялося б апраўдвацца. Не, лепш ужо хай заўтра... Нясцерпна карцела ўзяць чаго ў рот. У галодным гулкім жываце нешта ўвесь час вурчала, ад млоснасці ажно падкошваліся ногі.

Хоць у кішэні гуляў вецер, Вадзім надумаў гэты раз заглянуць у сталоўку, пацікавіцца, як там і што. Калі не выганяць, то добра было б і прыткнуцца дзе збоку, трохі пагрэцца.

Сталоўка была новая, адчынілі яе недзе з паўмесяца назад. Пра яе многа гаварылі ў мястэчку. Той-сёй ужо і ў школе пахваляўся, што пробаваў там боршч і кампот, а Рыла — нават і катлету.

Вадзіму таксама неаднойчы хацелася забегчы туды, але кожны раз ён гнаў ад сябе гэтую спакусу. Гнаў, праўда, да лепшага часу, пакуль не ўзаб'ецца на якія грошы. Але іх па-ранейшаму не было. І таму, ідучы ў школу і са школы паўз гэту зваблівую будыніну, ён толькі прыцішваў хаду, толькі на поўныя грудзі ўдыхаў пахі, што несліся з кухні, да млоснасці кружылі галаву.

Ён здзівіўся ажно, як усярэдзіне было цёпла і ўтульна. Гэта Вадзім адчуў і ацаніў яшчэ ў калідорчыку, толькі зачыніў з вуліцы дзверы. У саму залу ён не пайшоў, бо ўбачыў, што людзі там сядзяць распранутыя, відаць, паліто і шапкі свае павесілі недзе на кручкі ці вешалку.

Тут жа, у калідорчыку, да сцяны прымацавана была нейкая пісаная ад рукі паперчына. «Меню»,— значылася зверху паперчыны. Вадзіма гэта абрадавала, бо можна было, быццам вывучаючы, прыцэньваючыся — не траціць жа грошы на абы-што! — глядзець і глядзець у тое меню. Ніхто цяпер не ўпікне і не западозрыць, што ў цябе няма ні шыша, што ты проста так тут аціраешся.

Аднак Вадзіму не пашанцавала ўжо з самага пачатку. Нечакана ўгледзеў, што ў зале за адным са сталоў сядзіць, сёрбае нешта з талеркі Мішка Клыпа. Яго скуласты чырвоны твар навіс над саменькай пасудзінай, здэцца, зараз Мішка пачне вылізваць талерку языком. «Во, гад, і сюды дапяў,— чамусьці як ніколі злосна падумаў пра Клыпу Вадзім.— Пэўна ж, матка яму ўсё стрэнчыць. Шчэ й грошы адвальвае».

А вунь і яна сама. Падышла ўпрытык да Мішкі, паставіла каля яго яшчэ нейкую талерку. «Няўжо катлета? — каўтануў слінкі Вадзім.— Ага, здэцца, катлета з картоп-

ляю ці нават макаронамі... Во дык яда! Але чаму Люба ў сталоўцы аціраецца? Няўжо з магазіна паперлі? А мо й сама сюды?.. Пэўна ж, і тут яна не прападзе...»

Вадзім хацеў быў пайсці, каб не трапіць ім на вочы, але чамусьці ногі аніколечкі не слухаліся, бы прыраслі да цэментавай падлогі. З'явілася на хвілінку здрадлівая думка папрасіць Любу, каб і яму дала чаго паесці ў доўг. Ён жа аддасць, заўтра во палучыць за Лыску на бойні і аддасць. Коля ж, можа, не з'есць яго. Хоць бы разок папробаваць катлету.

Пакуль ён вагаўся, набіраўся смеласці, Клыпа ўмалоў ужо ўсё з талеркі і, не дачакаўшыся маці, хапіў партфель, выскачыў у калідорчык. Рот яго яшчэ быў набіты ядой, на кончыку носа наліпла таўкаініцы, а тоўстыя губы ажно льсніліся ад тлушчу.

Згледзеўшы Вадзіма, Клыпа сумеўся, зрабіў намаганне пракаўтнуць тое, што заставалася ў роце, але гэта яму чамусьці не ўдалося, ён папярхнуўся і... выплюнуў пад саменькія Вадзімавы ногі вялікі абслінены камяк.

Вадзім спачатку засмяяўся, пасля разабрала злосць.

— Абдрышчашся шчэ зараз! — Ён схапіў Клыпу за каўнер паліто.— А бацінкі хто мне вытра ад тваёй блявоціны, га? Тоцкі? Ад лішку ўжо і назад прэ?

Клыпа, аднак, і не падумаў павініцца ці хоць бы якнебудзь апраўдацца. Наадварот, каб насаліць Вадзіму, тоненька завішчаў:

— А табе зайздросна, ага, зайздросна? Дык тады сам нагніся, пакаштуй маё... Сма-а-а-ачна! Не еў такога... Во і абаранак на закуску шчэ дам...

Клыпа і праўда паспеў выняць з кішэні паліто круглы жаўтаваты абаранак, сунуў Вадзіму як не пад нос.

Гэта было ўжо занадта. Вадзіма ажно страсянула. Чамусьці адразу нагадаўся Славік, тое, як з-за ласунку — адной-дзвюх падушачак ці кавалачка сітніцы, якімі падражніўся Клыпа, брат палез чорту на рогі — на саменькі верх маяка, адкуль гэтак нялёгка было яму, Вадзіму, зняць сарвігалаву.

— Ах ты, гад печаны! — Вадзім злаўчыўся, піхнуў нагой дзверы ў сталоўку, каб адтуль ніхто не ўбачыў і не пачуў, затым з усяе сілы, якая невядома скуль толькі і ўзялася, зламаў Клыпу ў паясніцы, яшчэ трохі паднатужыўся і зусім ужо кінуў яго на калені. Каб той раней часу не енчыў, даланёю заціснуў яму рот і ўжо ля самай падлогі адпусціў руку, пачаў, як таго брыдотнага памаўзлівага ката, тыцкаць тварам у аб'едкі.

— То цяпер і мамку сваю гукай. Хай пагладзіць па галоўцы...

Клыпа круціўся вужакай, спрабаваў неяк вылузацца, хацеў быў нават укусіць Вадзіма за нагу, але, адчуўшы, што гэта яму не ўдасца, узвыў, акурат хто тупым нажом рэзаў яго на кавалкі.

— А-а-а-а!

— А во табе! А во табе!..

Нейкай шалёнай радасцю поўнілася Вадзімава сэрца. Адразу перастала смактаць пад лыжачкай, па ўсім целе разлілося цяпло. Ён гнуў і гнуў галаву Клыпы да падлогі, бы ў гэтым бачыў для сябе найпершы сродак адплаты за тыя беды, непрыемнасці, што сыпаліся і сыпаліся на іх з Колем увесь апошні час...

Вадзім быццам не зразумеў адразу, хто гэта коршакам наляцеў на яго, пачаў здзіраць з галавы шапку, пасля балюча, да іскраў у вачах, учапіўся ў валасы. І толькі крык на ўсю сталоўку: «Забіва-а-а-аюць, во-ой! Сыночка маго забіва-а-аюць!» — ацверазіў яго, змусіў адпусціць сваю ахвяру. Вадзім штосілы рвануўся з учэпістых Любіных рук, вопрамеццю кінуўся на вуліцу. Уздагон яму ляцелі праклёны:

— Бандзі-і-іт! Гало-о-та вашывая. Цюрма па табе плача ўжэ. Дачакаешся! Вот я толькі!..

Якой яшчэ карай нябеснай пагражала яму Люба, Вадзім не чуў, бо адбегся досыць далёка. Ён брыў па вуліцы, не цямячы добра, куды і чаго брыдзе. На яго касавурыліся прахожыя, але, не астыўшы яшчэ ад нядаўняй валтузні, ён ні на што не звяртаў увагі.

Схамянуўся Вадзім, толькі калі адчуў холад у галаву. Яшчэ, бы не верачы сабе, лэпнуў рукой па макаўцы і зніякавеў: шапкі не было. Як жа без яе? Шапка хоць і не новая, але цёплая, а дома больш ніякай няма. Не хусткай жа абкручваць галаву. Куры засмяюць. А да лета тога... Мо вярнуцца, паглядзець у калідорчыку сталоўкі? Раптам яна валяецца на цэменце.

Вадзім прыцішыў хаду, хацеў павярнуць назад. Але, уявіўшы, як знячэўку можа нос у нос сутыкнуцца з раз'юшанай Любай, махнуў рукой, пайшоў далей.

Ужо на хаду згледзеў, што і куртцы, пашытай з салдацкага шынялі яшчэ пры Верцы, таксама дасталося: зверху былі «з мясам» выдраны два гузікі, трэці, астатні, таксама ледзь-ледзь целяпаўся на абрыўку кужэльнай ніткі. Холад дабіраўся ўжо да грудзей, апякаў вушы,

і Вадзім змушаны быў наставіць каўнер, трохі неяк захінуцца.

Неспадзеўкі ногі вынеслі яго ў вулку, на рагу якой, сіратліва павэдлуг з іншымі дамамі местачкоўцаў, без агароджы і хаця б аднаго дрэўца побач, стаяла старая драўляная хатка. Ля дзвярэй яе, на фанерцы, прыбітай да струхлелай ад даўнасці сцяны, зялёнай фарбай было напісана: «Інтэрнат сярэдняй школы № 1».

Вадзім, не пастукаўшыся, адчыніў дзверы ў пакой, у нейкага прышчавага хлопца, якога ён, здэцца, бачыў аднойчы ў школьным двары, спытаў, дзе Лукашык.

— А чорт яго знае,— адказаў прышчавы, корпаючыся ля тумбачкі і нешта жуючы.— Відаць, з урокаў няма. Пачакай, калі не гарыць.

Вадзім сеў на табурэтку, адзіную, здэцца, ва ўсім пакоі, агледзеўся. Зноў, як і тады, калі Казік першы раз завёў да сябе, каб даць пачытаць падручнік па гісторыі — свайго ў Вадзіма не было,— яго надта здзівіла, што жалезныя ложкі ў пакоі стаяць у два паверхі — адзін над адным. «Во калі б зламаўся які!»

Казік прыйшоў скора і абрадаваўся, убачыўшы Вадзіма:

— А я хацеў ужоісці ў Жорнаўку, шукаць вашу хату. Думаў, раптам захварэў. Пытаўся ў Шакуты, дык той толькі хмыкнуў і прамаўчаў. Вы што, пасварыліся з ім, ці так што?

— Ат,— неяк няпэўна адказаў Вадзім.— Чаго было сварыцца?

Гаварыць доўга пакуль не выпадала. Казік прызнаўся, што кішкі марш іграюць, і падаўся ў калідорчык нешта рабіць на абед.

Па адным, па двое ўвальваліся ў пакой астатнія жыхары. Адразу стала цесна і тлумна. Вадзім адчуў сябе ніякавата. Ён не ведаў, дзе лепш прыткнуцца, каб не замінаць хлопцам. Хацеў ужо ісці шукаць Казіка, але прышчавы, які назваўся Сяргеем, сказаў, што ўсе яны зараз разбягуцца куды каторы.

Вадзім здагадаўся: дык то ж сёння субота! Адразу стала весялей. Заўтра не трэба ў школу, не трэба думаць пра ўрокі.

Хлопцы і праўда доўга не затрымаліся. Спехам хапіўшы чаго трохі ў рот, што заставалася яшчэ ў тумбачках ці між вокнаў, яны пачалі збірацца ў дарогу. Сама далей, як ён дазнаўся, было дзевяцікласніку Толіку Борбашу —

у нейкія Перасады. Туды, у лясную глушэчу, рэдка хадзілі якія машыны. Але Толік ніколі і не разлічваў на транспарт. Свае дваццаць з хвосцікам кіламетраў ён лёгка прабягаў за тры-чатыры гадзіны.

Зараз ён, запіхнуўшы ў кішэню кажуха пустую зрэбную торбачку, выскачыў першы: хацеў яшчэ повідну мінуць лес, дзе, казаў, апошнім часам з'явілася нямала ваўкоў. Неўзабаве па адным змыліся і астатнія.

Вадзім застаўся адзін. У гулкай, пасля гэткага гармідару, цішыні пачуў, як недзе нешта шыпіць і сквірчыць. Здагадаўся, што гэта за гукі, і адчыніў дзверы, выглянуў у калідорчык. У невялікай, вузенькай, бы пенал, куханьцы гарэў керагаз, а на ім у глыбокай патэльні апетытнымі, ажно слінкі пацяклі, палачкамі-скрылікамі смажылася, дабірала ружовасці бульба.

— Наямося зараз,— усмешкай стрэў яго Казік.— А што, хлопцы ўжо далі чосу?

— Ага, нікога не засталося.

— Ну, то й хай. Не прападзём і мы...

Да бульбы ў Казіка знайшоўся шчэ салёны гурок. Казік распалавініў яго, і яны, закусваючы тым агурком, умомант падчысцілі ўсё з патэльні. Вадзіму зараз было як ніколі добра, не хацелася нават дадому.

— Начуй тут,— прапанаваў, быццам адгадаў яго думкі, Казік.— Прапалім у грубцы, зварым шчэ чаго. І ўрокі разам паробім. А месца — любы во ложак выбірай. Хочаш — верхні, хочаш — ніжні. Сёння ніхто не вернецца.— Трохі памаўчаўшы, ён няўзнак уздыхнуў і дадаў: — Каб мне можна, я б таксама... дадому...

Вадзім бачыў, як спахмурнеў Казікаў твар, як глыбока ў вачах прытаіўся незразумелы смутак. Хацелася спытаць пра бацьку, маці, пра тое, як усё ж ён тут апынуўся адзін, зусім-зусім без анікога роднага ці блізкага. Але Казік, мо адчуўшы, што будзе такое пытанне, хуценька наапашкі накінуў на сябе ватоўку і выйшаў на двор. Вярнуўся неўзабаве з бярэмам бярозавых плашак.

— Ого, сухія якія! — Вадзім узяў адно палена, патрымаў у руках, бы ўзважваў.— Такімі напаліш, шчэ як! А мы з Колем ніяк не ўзабёмся на сухія дровы. Цяпер дык і ніякіх няма. А яшчэ Коля злёг...

— Было б бліжэй, занеслі б і вам трохі,— адгукнуўся Казік, кладучы плашкі ў грубку.— А што? Вечарам, як сцямнее, ніхто б і не бачыў. А яшчэ каб на падводзе... У нас за хатай многа. Летам у школу навезлі, а адтуль

і нам далі. Мы самі пілавалі, секлі. Так што каб падвода...

— Неяк будзе... — махнуў рукой Вадзім.— Паправіцца Коля, з'ездзім у лес. Сухастоіну якую, можа, агораем.

Падпальваць пакуль што Казік не стаў, адно ўсё падрыхтаваў, каб было пад рукой: і шматок паперы, і запалкі.

Цямнела хутка. Недзе праз гадзіну ўключылі святло. Лямпачка ў шкляным абажуры гарэла зырка, і Вадзім зноў падумаў, што як добра з электрыкай: гэта ж не трэба дбаць пра газу, сляпіцца пры той лямпе ці газоўцы, бясконца чысціць шкло. У іх, у Жорнаўцы, праўда, таксама паставілі ўжо слупы, таму-сяму зрабілі нават праводку, але току яшчэ не далі: казалі, што пакуль не хапае ўсім, найперш — мястэчку.

— Вам тут — лахва! — сказаў Вадзім, раскладваючы на стале сшыткі.

— Чаму? — спытаў Казік.

— І цёпла, і святла уга колькі, і весела ўсім кагалам.

Казік пацвердзіў:

— Ага, сумаваць няма калі. Але часам невядома куды збег бы ад гэтага кагалу.

— Перабірайся да нас з Колем — у Жорнаўку. Месца хопіць. Будзем разам у школу хадзіць. А што?..

Казік прамаўчаў, надоўга нечага задумаўся. Вадзім больш не лез з роспытамі, унурыўся ў падручнік па геаграфіі. Казік тым часам рашаў задачы, тое, што лічыў для сябе цяжэйшым.

Праз якое паўгадзіны ён адсунуў ад сябе і задачнік, і сшытак, падняўся. Прапанаваў:

— Давай праветрымся. У галаву нічорта не лезе...

Яны выйшлі на вуліцу. Адразу пасля пакоя на дварэ было хоць вока выкалі, ды і мароз, адчувалася, уз'ятрыўся яшчэ больш. Вадзім глыбей насунуў на галаву нейкую старую аблавуху, якую адшукаў яму Казік сярод рознага хлапечага рыззя, зваленага ў кучу за грубкай.

— Куды лыжы навострым? — спытаў Вадзім.

Казік патаптаўся на месцы, памахаў рукамі, пасля нечакана прапанаваў:

— Давай зірнём у адно акно.

— У якое... акно? — не зразумеў Вадзім.

— Ну, пабачыш...

Яны прайшлі трохі па вуліцы, слаба асветленай і павясковаму бязлюднай у гэты яшчэ няпозні час, пасля звярнулі на другую, паралельную, мінулі колькі хат, вокны якіх зеўралі чарнатой. «Рана і тут кладуцца,— падумаў

Вадзім.— Як і ў Жорнаўцы... Ці, можа, электрыку шкадуюць, каб меней плаціць?»

Казік прыцішыў хаду непадалёк ад невысокага заінелага плота, за якім, неяк трохі вуглом да вуліцы, стаяла шэрая прыземістая камяніца. Даўшы знак Вадзіму спыніцца на месцы, ён асцярожна пакраўся да варот, трохі пастаяў там, паўслухоўваўся. Пасля лёгка, без аніякага скрыпу адчыніў брамку і рукой паказаў Вадзіму ісці за ім.

Яны, стараючыся ступаць як мага цішэй, зайшлі з боку хлеўчыка, наблізіліся да мякка асветленага, захінутага з сярэдзіны фіранкамі акна.

— Што там? — шапнуў Вадзім.

— Тс-с-с,— Казік зняў рукавіцу, прыклаў палец да губ.

Праз фіранкі нічога не прасвечвалася, але Казіка гэта ані не засмуціла. Ён некуды адвінуўся і ўжо праз хвіліну прывалок даволі цяжкаватую калоду, на якой, відаць, seклі дровы, мякка, нячутна апусціў яе на снег. Узабраўшыся на падстаўку, хлопец глянуў вышэй фіранак. Твар яго, адзначыў сабе Вадзім, адразу ўспыхнуў радасцю, вочы ажно заіскрыліся. Казік, здаецца, і не дыхаў зусім, утрапёна ўсё глядзеў і глядзеў, бы там, за шыбамі ў хаце, было невядома якое дзіва.

Вадзім падымаўся на дыбачкі, таксама спрабаваў што згледзець усярэдзіне, але, акрамя верху цаглянай грубкі і паклеенай газетамі столі, нічога не бачыў.

Спакваля ўжо даймаў холад: спачатку падкраўся да пальцаў ног, пасля і рукі пакрысе сталі дзервянець. Вадзім адчуў, што доўга гэтак, без аніякага руху, ён не вытрывае. Тады ён таргануў Казіка за калашыну, але хлопец нават не павярнуў галавы, бы гэта яго і не тычылася.

«Во прыліп!» — Вадзіма пачала ўжо брацць злосць, і ён зноў, ужо мацней, пацягнуў Казіка на сябе. Той, нарэшце, ачомаўся, бы з неахвотай саступіў сваё месца на калодзе.

Спачатку Вадзім нічога не зразумеў. Праз незамерзлую шыбінку акна ён убачыў невялікі стол, засланы цыратай, на ім чарніліцу-невылівайку, некалькі алоўкаў і дзве даволі высакаватыя кіпкі сшыткаў, адзін з якіх быў разгорнуты і там было нешта набэрсана. «То ж вучнёўскія! — жахнуўся Вадзім.— Няўжо настаўнік?! А мы...»

У наступнае імгненне ён адчуў, як нешта гарачай хваляй шухнула ў твар, як часта затахкала ў грудзях сэрца. Ад грубкі (і як гэта ён, ёлуп, адразу не змеціў?!) ішла да стала... Вераніка Васільеўна.

Ад нечаканасці хлопец ледзьве не зваліўся з калоды. Добра, Казік падтрымаў яго за рукаво, а то, пэўна, і зваліўся б, нарабіў бы грукату-стукату. Вадзім хацеў ужо сам скочыць асцярожна ў снег, але баяўся зараз і варухнуцца, бо Вераніка Васільеўна была гэтак блізка, што аж страшна стала: хаця б не пачула, не заўважыла. Сораму ж будзе — не абярэшся. Тады хоць школу кідай.

Між тым Вераніка Васільеўна села за стол, з алоўкам у руцэ схілілася над разгорнутым сшыткам. Нешта ў ім паправіла і адклала ўбок, зверху ўзяла новы. Але больш не гартала і не чытала, сядзела чамусьці маркотная, засяроджаная. Асветлены лямпай твар яе быў зараз надзіва прыгожы, што і праўда глядзеў бы і глядзеў на яго не адрываючыся.

Раптам па ім прабег нейкі цень, у незразумелым ціку тарганулася шчака, на якой красавалася маленькая цёмная радзімка. Вераніка Васільеўна плюснула раз-другі вачыма, пасля кінула галаву на стол, на падстаўленыя далоні, ці не ў плачы затрэсліся яе вострыя, пад лёгкай белай блузкай, плечукі.

— Яна... Там...— Вадзім не ведаў, што і казаць, што і падумаць.

— Што, што там? — нецярпліва шапнуў Казік і ўжо бесцырымонна, забыўшыся пра ўсякую асцярожнасць, піхнуў Вадзіма з калоды.

Ён яшчэ даўгавата стаяў на ёй, нешта бязгучна мыляў пасінелымі ад холаду губамі, і Вадзім, здзіўлены, уражаны ўсім, не асмельваўся нават заікнуцца, што пара ўжо ісці назад...

У той вечар, калі і палілі грубку ў інтэрнаце, і варылі ў маленькім чыгунку, пасля елі, гэты раз без асаблівай ахвоты, картоплю, і калі, патушыўшы ўжо святло, ляжалі ў ложках (Вадзім, дзеля цікаўнасці, залез наверх, пад саменькую амаль столь), яны ўсё ніяк не маглі выгаварыцца. У цемнаце Казік рашыўся, пачаў чытаць свае вершы, загадзя толькі папярэдзіў, каб Вадзім нікому пра гэта ні гу-гу. Вадзім пабажыўся нават, што ўмее трымаць язык за зубамі, што няма ў яго нікога такога, каму яшчэ можна было б даверыцца, выкласці тое, што на душы.

Вершы, як не ўсе, былі пра каханне, і чытаў іх Казік ціха, амаль шэптам. Але па голасе адчувалася: хлопец дужа хвалюецца і стрымлівае сябе.

— Казік, гэта ж здорава! — пахваліў Вадзім.— Каб я ўмеў вось так...

У адным, самым доўгім і ўзнёслым вершы некалькі ажно разоў паміналася імя — Вераніка. Казік вымаўляў яго з такой пяшчотай у голасе, што ў Вадзіма ўжо ні кроплі не заставалася сумнення: дык то ж маецца на ўвазе Вераніка Васільеўна. Божачка, няўжо?! Няўжо Казік закахаўся ў настаўніцу, пра якую расказваў гэткую страшную гісторыю?

Цяпер станавіліся зразумелымі ўсе сённяшнія Казікавы паводзіны: і гэта жаданне яшчэ раз, хоць поцемку, хоць праз акно глянуць на яе адным вокам, і яго сённяшняя ўзвінчанасць, усхваляванасць, і вось гэтыя вершы, якія пісаліся, пэўна, у хвіліны суму і вялікай няўтольнай прагі кахання.

— Ты... ты... любіш яе? — папытаў Вадзім, калі Казік скончыў чытаць і зараз стоена маўчаў.

Казік не адгукнуўся, усё роўна як заснуў, пасля не сказаў, а выдыхнуў:

— Я б за яе — жыццё аддаў!..

Вадзіма, аж пакуль не зліпліся ў знямозе вочы, ні на хвіліну не пакідала адчуванне нечага новага, нязвыклага, што адбывалася зараз у ягоным жыцці. Адчуванне, што, паглыблены ў свае клопаты, свае балячкі, ён многае ўпусціў, не ведае зусім, што жыццё — яно ж шырэйшае, больш загадкавае і няпростае, а ён адгарадзіўся ад усяго свету толькі дамоўкай, сваёй Жорнаўкай і не бачыць, не хоча бачыць нічога іншага.

Ад гэтага станавілася шчымліва балюча і крыўдна, і хацелася хутчэй нешта памяняць і ў сабе, і вакол сябе. Але ж ці многа зараз магло ад яго толькі залежаць?

## 11

Грошы за Лыску далі не адразу. Тыдзень ажно запар пасля ўрокаў хадзіў Вадзім на бойню, і кожны раз яму ўсё тлумілі галаву: прыйдзі заўтра, зараз няма ні капейкі. Азызлая немаладая ўжо касірка, якая сядзела ў акенцы, надта і гаварыць з ім не хацела, не прымала ніякіх тлумачэнняў. Выведзены з цярпення, Вадзім шукаў якога начальніка, каб паскардзіцца яму. Але ў канторы заўсёды церлася шмат рознага люду, розных дзядзькоў і цётак, хапала тут сварак, часам і слёз, і малёгання, таму Вадзім адразу кінуў надзею нешта хутчэй за астатніх выгадаць для сябе.

Дома ўжо, апроч бульбы, нічога не было, не было чаго ўзяць і Колю ў бальніцу. Брата ўсё яшчэ лячылі. Вадзім праз дзень хадзіў да яго, сядзеў з ім у палаце ці ў калідоры ля цёплай батарэі. Коля апошні час чамусьці паблажэў, хоць, казаў, адчуваў сябе добра і хутка ўжо выпішацца. Вадзіму вельмі хацелася што смачнае купіць яму, ды і сабе тое-сёе на падмацунак. Не адной жа бульбай давіцца. Толькі б неяк атрымаць за Лыску.

Нарэшце ён выбраўся на бойню зранку, плюнуўшы на ўрокі, на тое, хто што скажа пасля. Касірка гэты раз узяла яго паперу, папытала толькі, чаму не прыйшлі бацька ці маці. Абнадзеены, ён не стаў артачыцца, цярпліва расказаў пра сябе, з кім жыве, дзе зараз старэйшы брат Коля.

— Ладна, што з табой,— уздыхнула касірка і дала распісацца ў нейкай ведамасці, пасля адлічыла грошы.

Нёсся ён дахаты як на крылах. І ўжо за сталом, калі пералічыў паперкі, калі пераканаўся, што яго не абманулі і нічога па дарозе не згубіў, спахапіўся: які ж ён безгаловы дурань! Чаго было, высалапіўшы язык, ляцець з пустымі рукамі? Мог жа спакойна, як і ўсе людзі, зайсці адразу ў краму, купіць чаго-небудзь. Мо нават і на хлеб нарваўся б. Цяпер часцей яго пачалі даваць. Узяў бы яшчэ дзве-тры кансервы, а да бульбы — з паўкіло якіх селядцоў.

Але ў мястэчка другі раз ісці сёння не выпадала: трэба было пастарацца трохі дроў ды напаліць стаяк, а то ўчора не паліў, і ў хаце зараз — хоць ваўкоў ганяй.

Ён пашукаў на печы і ўсцягнуў на ногі буркі, наверх — буцы. З жалем агледзеў свае бацінкі, у якіх хадзіў у школу. Адзін з іх зеўраў спераду ладнаватай дзіркай, прасіў есці, і, каб не адвалілася дзе падэшва, Вадзім змушаны быў замотваць насок вяроўчынкай. Другі бацінак глядзеўся лепш, але і той, бачна па ўсім, доўга не патрывае: тамсям зверху і збоку разлезлася ўжо шытво, і праз дзіркі набівалася снегу. А зараз, калі раптоўна пацяплела і пусціла, не стала паратунку шчэ і ад вады. Ногі кожны дзень мокрыя, ніяк іх не адагрэць.

Сякеру ён знайшоў чамусьці ў хляве — відаць, выпадкова там пакінуў, калі апошні раз адбіваў на падпал сухую жэрдку ад загарадкі, дзе стаяла Лыска. Вадзім ведаў, што Коля можа лаяць яго за гэта, але ж іншага выйсця не было — нечым трэба ж дома паліць ды варыць есці.

Ён, яшчэ раз абвёўшы вачыма хлеў, адчуў, як нешта

даўкае падкаціла да горла, перахапіла дыханне. Як зараз убачыў той даўні ўжо дзень, калі былі яшчэ жывыя маці і Лёва, калі прыходзіла, начавала ў іх Параска. Няўжо, няўжо было тое?! Няўжо вось тут, у загарадцы, стаяла жывая Лыска, а побач, у асобным катушку, ляжала цялё, пярэсценькае, з бялюткай плямкай-зорачкай на лбе?..

Каб не заплакаць, Вадзім выйшаў на двор, зачыніў за сабой дзверы. Сёння, бы знарок, яны нейк надта тужліва зарыпелі на заржавелых завесах, і гук той разануў па сэрцы новым болем...

Дроў, апроч некалькіх сырых яловых цурбакоў, што тырчалі з-пад снегу ля паветкі, не знайшлося ні паленца. Вадзім і гэтаму быў зараз рады. Хоць цурбакі і тапырыліся наўкруг тоўстымі ядранымі сукамі, але ён упраўна пакалоў іх, склаў невялічкай горкай. Абышоў пасля хлеў, абшнарыў пільна ўсе куткі паветкі, аднак нічога не змеціў сухога — у дадатак да елкі, якую, ведаў, распаліць будзе надта цяжка. Але зноў бурыць загарадку дзеля распалу больш не рашыўся: абыдзецца мо і так. Вечар вялікі, нейк угарыцца.

Ён нагнуўся ўжо браць дровы, каб занесці ў хату, як пачуў ля брамкі нечыя чужыя галасы. Вадзім выпрастаўся, глянуў паўз ганак на вуліцу. І праўда: па двары ўжо ішлі двое мужчын. Адзін, вышэйшы, быў у салдацкім шынялі і звычайнай аблавушцы, другі, пузаценькі, апрануты больш фарсіста: у кубанцы і апяразанай шырокім рамянём тужурцы. У абодвух на нагах — хромавыя боты. Пузатага Вадзім пазнаў адразу і ажно пахаладзеў: дык то ж іхні фінагент Кротаў! Другога зусім не ведаў — мо чалавек так чаго з ім на пару.

Вадзім памкнуўся быў шмыгнуць куды за вугал, але зразумеў, што спазніўся, што яго заўважылі і зараз, хочаш ці не, давядзецца ісці ў хату і там чырванець, пыкаць і мыкаць, чаму не ўсё аддалі, што палажана, пачнуць ушчуваць, сарамаціць, палохаць... Гэтыя песенькі Вадзіму ўжо ўга як знаёмыя. Кротаў на іх майстар — лепшага не знайсці ва ўсім свеце! Нават Лёдзіка Сымонавага, кажуць, пераплюнуў, хоць таго ў Ясюцічах, дзе збірае падаткі, баяцца немаведама як — і дарослыя, і дзеці.

— Ну, здароў быў! — бадзёра павітаўся Кротаў, калі Вадзім падышоў да іх.— Даўненька цябе не бачыў. Глядзі, як вылузаўся, які спраўны стаў. Хазяін. Красаўчык... А дзе ж брат?

Кротаў яўна насміхаўся з яго, але Вадзім прапусціў

гэтыя словы між вушэй, далікатна паздароўкаўся, адказаў на пытанне. З надзеяй падумаў, што, дазнаўшыся пра Колю, пра бальніцу, яны пойдуць, не стануць прыставаць.

Аднак Кротаў ужо штурхнуў дзверы ў сенцы, першы ўвайшоў у хату. «Там жа на стале, пад газетай, грошы! — жахнуўся Вадзім.— Божачка, і трэба было не схаваць дзе пад сяннік ці яшчэ куды? Хто ж думаў...» Ён падскокам, апярэджваючы і Кротава, і высокага ў шынялі, забег у залу і, быццам каб выслабаніць стол, скамячыў газеціну, а з ёю разам і грошы. Толькі ці дрэнна скамячыў, ці парвалася дзе знізу папера, але дзве трыццаткі выпалі на падлогу, ляглі як не пад самыя боты Кротава.

Вадзім збялеў, хацеў кінуцца падняць, але Кротаў апярэдзіў яго, нагнуўся, першы ўзяў тыя трыццаткі.

— Ого, грошай — аж куры не клююць. А з гасударствам разлічыцца, дык Тоцкі, га? Ну, ну, пакажы, колькі там у цябе? — Кротаў памкнуўся да хлопца, але не паспеў зрабіць і кроку, як той сам коршакам наляцеў на яго, упіўся зубамі ў руку, у якой былі грошы.

Усё адбылося надта нечакана. Кротаў спачатку хаўкнуў, пасля, не стрываўшы, ускрыкнуў ад болю. Трыццаткі зноў паляцелі долу, але Вадзім не даў ім зараз упасці, вокамгненна падхапіў іх, сунуў пад фуфайку, дзе была ўжо газеціна, і гэтак жа вокамгненна, увесь напружаны, напяты кожнай жылкай цела, адскочыў да сцяны.

— Ах ты, шчанюк паганы! — узарваўся лаянкай Кротаў, штохвіліны фукаючы, студзячы ротам тое месца на запясці, дзе расла, набухала цёмная пляма, куды прыклаўся зубамі Вадзім.— Я ж цябе, паганец, зараз у парашок разатру, мокрае месца на сцяне ад цябе пакіну...

Невядома, як было б, але ўмяшаўся той, у шынялі. Ён узяў Кротава пад локаць, сілай нават усадзіў на табурэтку, сказаў:

— Ты што, з глуздоў з'ехаў? Ён сам заплоціць, убачыш. І падатак, і на пазыку падпішацца. Ён жа сазнацельны. Мусіць, камсамолец ужо. А ты...

«Мякка сцелеш,— зларадна падумаў Вадзім, усё яшчэ напружана стоячы ля сцяны між двух вокнаў.— Добранькім прыкідваешся. Табе плоцяць, вот і сцелеш. А гэтаму брухачу... хай ведае, як хапаць не сваё...»

Праўда, чым больш Вадзім астываў, тым мацней пачынала яго тачыць трывога: а ці трэба было зубамі? Ён і сам не чакаў ад сябе такога. Мо Кротаў і так аддаў бы грошы. Не яго ж. А ўрэшце — ліха яго ведае. Кротаў даўно на іх

з Колем палюе. Колькі разоў наведваўся да іх, але заўсёды рабіў ад варот паварот. Яны ці замыкаліся і стойваліся, нібы няма нікога дома, ці, калі ўжо Кротаў заспяваў іх знянацку, бажыліся, што не маюць ні капейкі, што, як толькі разжывуцца, аддадуць тыя падаткі. Кротаў губляў цярпенне і гразіўся апісаць маёмасць, але, павадзіўшы вачыма па хаце і ні на чым не запыніўшы позірк, хаваў паперы, абяцаў прыйсці зноў.

І вось — прыйшоў. Яшчэ некага ў помач прывёў з сабою. Мо хто данёс, што за Лыску аддалі? Але хто ж гэта ведаў? Хіба Кротаў сам званіў на бойню і цікавіўся. Ад яго ўсяго можна чакаць...

У хаце колькі хвілін панавала цішыня. Вадзім здагадваўся, што Кротаў нешта абмазгоўвае, нешта спее ў яго галаве пад фарсістай кубанкай. Праўда, зараз яму зусім не да форсу — сядзіць вунь чырвоны, бы рак, і ўсё яшчэ трымае перад сабой укушаную руку. Што ж ён скажа? А мо аддыхаецца трохі і зноў кінецца да яго?

— Ну, што ж,— нарэшце стукае па стале кулаком Кротаў.— Наваждаўся з вамі, будзе. Шкадаваў, што сіроты, усё адцягваў і адцягваў. Думаў, зразумееце, і адзін, і другі тожа, што ёсць абшчэственныя інцярэсы, якія вышэй усяго, і кожны, хто адступіцца ад іх, лічыцца сабатажнікам. А з сабатажнікам у нас — адзін разгавор, карoткі...— Кротаў уваходзіў у сваю звыклую ролю, праўда, гэты раз ён гаварыў трохі стражэй, але сэнс заставаўся амаль той жа.— Іш ты, там, недзе ў гарадах, рабочы клас надрываецца, цягае цэглу, адбудоўвае фабрыкі і заводы, каб яшчэ лепш цвіла наша жызня. А тут — іш ты! Рабочым, трудавой інцілігенцыі патрэбен харч і да харчу. А скуль жа ўзяць, калі не будзем мы сазнацельнымі, не будзе паступлення, калі ўсе вось так стануць сабаціраваць? А сабатажнікі хто? Ворагі, ды яшчэ якія! А яшчэ калі яны робяць шкоду прадстаўнікам уласці пры іспалненні імі службовых абавязкаў...

«Куды ён хіліць? — лыпаў вачыма, не разумеў Вадзім.— Нейкія сабатажнікі... Шкода... Чортведама што. Я ж толькі... Ну, каб свае грошы за Лыску забраць. А што ўкусіў, то хіба ж наўмысля?»

Кротаў між тым пакутна ўздыхнуў, выняў з палявой сумкі паперу, хімічны аловак, але, перш чым нешта пісаць, зноў загаварыў:

— Ва-первых, у школу пойдзе прадстаўленне за такі

бандзіцкі выпад супраць прадстаўніка ўласці. А бандзюкоў там не трымаюць. Гэта жалезна...

Вадзім адчуў, як нешта ў яго ўсярэдзіне надарвалася, адбыўся незразумелы зрух. Цяжкія, бы цагліны, словы Кротава сёння чамусьці білі надта балюча. Яго не гэтак палохала, што могуць выгнаць — і напэўна ж выганяць! — са школы, колькі тое, як на школьнай лінейцы пасярод двара дырэктар, хмурачы бровы, выйдзе наперад і стане перад усімі чытаць тую Кротаву паперку. А ў паперцы — і пра грошы, якія ён, Вадзім, хаваў за пазуху, і пра сабатажнікаў нешта нейкае, і... пра зубы. Во здзіўлення, а яшчэ больш рогату будзе! Недзе там, са сваім класам, будзе стаяць і Вераніка Васільеўна. Яна пазнае яго, пэўна ж, пазнае. Не каму ж другому, а яму аддавала свой хлеб. Мо ўсё, што купіла была сабе, аддала тады, калі ўбачыла яго на ганку ларка. Як усё адно ў душу заглянула, як адчула, што ён галодны...

— ...Ва-втарых,— Кротаў яшчэ больш узвысіў голас,— брата твайго судзіць будзем, як старэйшага, ужо самастаяцельнага гаспадара, за сакрыццё даходаў ад дзяржавы. Мера хоць і строгая, але абязацельная ў настаяшчы мамент...

— Бярыце во, бярыце! — больш ужо не вытрываў, крыкнуў на ўсю хату Вадзім. З-пад фуфайкі ён выхапіў газетны жмутак, кінуў на стол.— Колькі трэба — бярыце. Мы б аддалі... Заўсёды ж аддавалі. Але не было ў нас... А гэта во карову дарэзалі, за яе заплацілі...

Чалавек у шынялі зноў паклаў руку Кротаву на плячо, пасля нагнуўся да яго ніжэй, нешта бы нездаволена шапнуў на вуха. З-за шамацення паперы — Кротаў адразу ж пачаў разгортваць газету, лічыць грошы — Вадзім не пачуў ні слоўца. Не пачуў і таго, што буркнуў у адказ Кротаў. Падумалася: мо яны пасля ўсяго, што адбылося, не хочуць узяць нядоімку, мо раяцца, як пісаць дакументы ў школу і ў суд на Колю. Але ж чаго б тады лічыць грошы?

— Бярыце,— ужо не так роспачна сказаў Вадзім.— Калі гэтак усё... А ў школу і ў суд... Можа, не нада... Брат жа ў бальніцы... Ён хацеў цялушачку купіць за выручанае. Але хай...

Кротаў узняў галаву, зноў пакутна ўздыхнуў, нея кпільна, з-пад ілба, зірнуў на свайго напарніка, які ўжо не стаяў на месцы, а чагосьці нецярпліва тупаў туд-сюд ад стала да грубкі і назад, пасля сказаў:

— Угаварыў, ладна. Цялеснага пашкоджання, буду

лічыць, не было, хоць яно і імеецца. Многія думаюць, што я, калі ўжо пры іспалненні, дык звер зверам, не хачу ўнікнуць, зразумець чалавечую жызню. Лягчэй усяго так плявузгаць. А калі і з мяне трэбуюць, ды яшчэ як трэбуюць! Ого-го! Лягчэй было б распусціць нюні...

Ён яшчэ нешта гаварыў, але Вадзім ужо мала даходзіў да сэнсу гэтай яго гаворкі. Няўцямна і неяк абыякава глядзеў, як Кротаў выпісваў квіткі, пасля як адлічваў ад невялікай стопкі на стале грошы...

## 12

Колю, як той ні храбрыўся, ні выпінаў грудзі ў пачатку хваробы, выпусцілі з бальніцы толькі пасля Вялікадня.

Неяк, калі меліся ўжо выпісваць, ноччу яму стала блага: зноў, пасля многіх уколаў, грэлак, розных там парашкоў ды таблетак, абвастрыўся боль усярэдзіне — акурат усё тое ж, з чым яго і прывезлі сюды. Яшчэ, у дадатак, чамусьці пацягнула на ваніты. Ледзь дачакаўся раніцы.

Раніцай нанова бралі аналізы, мацалі, выстуквалі, пасля паказалі незнаёмаму доктару, пажылому, буйнатвараму, які, расказвалі, перавёўся сюды ажно з самога Мінска — тут яму паабяцалі большую плату і казённую кватэру. Дык вось той доктар і ашаломіў Колю: маўляў, лячыўся ён яшчэ мала і дрэнна і зараз пачнуць па другім крузе. Калі ж брат ледзь не ўзбунтаваўся, Алег Архіпавіч — так звалі буйнатварага — сказаў яму, бы адрэзаў: «Умеў не шанаваць здароўя, дык умей, малады чалавек, цярпець, што б і колькі ні рабілі з табой у бальніцы».

І Коля скарыўся. А дзе дзенешся?

Вадзім толькі дома прызнаўся брату, што ад грошай за Лыску не засталося і паловы. У бальніцы пра гэта не хацеў яму казаць. Там, пры ўсіх, Коля мог бы разнервавацца, раскрычацца, мог бы яшчэ пусціць у ход і рукі.

Ужо ж было ўвосень такое, калі Вадзім пасля школы адразу дадому не пайшоў, а спакусіўся з хлопцамі — яны склаліся па колькі капеек і купілі яму нават білет — паглядзець у кінатэатры надта ж дзіўны заморскі фільм «Тарзан». Фільм круцілі доўга, нешта там, у будцы кінамеханікаў, не клеілася, ірвалася стужка, усе тупацелі нагамі, свісталі, ды гэтак, што ажно ўвушшу калола. Калі ж успыхваў экран, зала імгненна замірала, пасля зноў

узрывалася, але ўжо не свістам, а воклічамі захаплення і здзіўлення. Гэтак віталі незвычайныя прыгоды чалавека-малпы ў дзікім вечназялёным лесе — няўжо, няўжо бываюць на свеце і такія месцы, і такія лясы?!

Фільм, казалі, яшчэ не ўвесь, у другія дні будуць паказваць далей. Аднак і тое, што ўбачыў Вадзім, ашаламіла яго, выклікала жаданне хутчэй знайсці і перачытаць усе кнігі, дзе пісалася пра тыя далёкія землі і краіны.

Дадому ён ішоў, калі ўжо ніштавата пацямнела. Імжыў дождж, ногі бясконца ліплі ў гразі. Выбіраць, дзе сушэйшае, не даводзілася, бо расквэсіла ўсюды, нават ля саменькіх платоў. Ды Вадзім зараз і не прыкмячаў ні гэтай асенняй слаты, ні гразі, нічога. Быў яшчэ ва ўладзе таго, што бачыў на экране.

Ён, пэўна, і хату сваю поцемку мінуў бы, каб не ўпёрся ў нечы воз з саломай пасярод вуліцы. І толькі тады скінуў з сябе летуценнасць, жахнуўся: гэта ж Коля, пэўна, хутка прыйдзе з канюшні, а дома яшчэ нічога не зроблена.

Атрымалася нават горш, чым ён думаў. Увесь ужо мокры, Коля стаяў на ганку і нечым калупаў у замку. Толькі зараз Вадзім успомніў, што ключа ў брата нямашака, што, спяшаючыся ў школу, ён паклаў яго не пад дошчачку за хатай, куды заўсёды клалі, а незнарок кінуў у кішэню палітона. І во Коля... Трэба ж было гэтак забыцца, паперціся на тога «Тарзана»!

Коля, пачуўшы пра кіно, адразу ўспыхнуў, з ходу ўляпіў яму даланёй на твары, ад чаго правая шчака цалюткі вечар гарэла агнём.

Тады Вадзім доўга не гаварыў з братам, крыўдаваў на яго. Пакрысе, праўда, крыўда тая астыла, але Вадзім многае ўжо рабіў з аглядкай: а раптам Колю зноў чым не дагодзіш і ён пачне даказваць сваё кулаком?..

...Брат, наўздзіў, спакойна, нават нібы абыякава стрэў зараз вестку, як Кротаў сумеў абчысціць іх, забраў усю нядоімку, шчэ, прыгразіўшы, і на пазыку вывудзіў грошай. Седзячы за сталом, ён безуважна слухаў, не стаў лічыць рэшту, якую паклаў перад ім Вадзім. Схамянуўшыся, адно толькі і сказаў:

— Плакала наша цялушачка...

Пакалупаўшы вышчарбленым кухонным нажом у шчыліне між дзвюх стальніц, Коля падняўся, пайшоў у бакоўку. Чуваць было, як ён распранаўся. Вадзім не ведаў, што рабіць з грашыма: пакінуць вось так на стале ці зноў схаваць, дзе былі і дагэтуль — у анучцы пад Колеў матрац?

Ён акуратна, адна да адной, склаў усе паперкі і таксама заглянуў у бакоўку. Коля ляжаў на сваёй пасцелі, з галавой акрыўшыся рабою суконнаю коўдрай.

— Коля, я летам пайду куды... ну, папрацаваць каб... Ты не перажывай. Добра?

Коля маўчаў. Падумаўшы, што брат натаміўся пасля бальніцы і ўжо спіць, Вадзім на дыбачках падаўся назад, у пярэдні пакой. Запаліў лямпу і сеў рыхтаваць на заўтра ўрокі. Але, як ні намагаўся запомніць хоць што з таго, што чытаў, у галаве нічога не заставалася. Стрэмкай сядзела ў мазгах, не давала засяродзіцца іншае: як прыдбаць чаго з яды? Колю пасля бальніцы патрэбен харч, і неблагі харч, а дзе яго ўзяць? На пустой, нішчымнай бульбе, якой таксама заставалася хіба што каб пасадзіць, вельмі не акрыяеш. А больш дома — хоць шаром пакаці. Мукі ані місачкі, сёння з Колем з апошняй зварылі зацірку: якраз цётка Саша прынесла паўглечыка малака. Добра было б зараз хлеба...

Шыхнула думка — падацца во зараз у мястэчка і заняць чаргу. Толькі гэтак, казалі, калі звечара зоймеш і прастаіш стойма да раніцы, можна і ўхапіць якую кулідку. Але як жа тады са школай? Ён жа, пэўна, спозніцца.

Вадзім глянуў у расклад. Першыя два ўрокі была заўтра фізкультура. На школьным стадыёне, які ўжо добра падсох, нават вызеленіўся маладой траўкай, мелісяправодзіць нейкія спаборніцтвы. «Ат, што будзе, то будзе»,— узгарэўся Вадзім і, выдраўшы з непатрэбнага сшытка чысты лісток, напісаў: «Коля! За мяне не перажывай. Можа, хлеба трохі разжывуся. Падамся ў мястэчка, пастаю ў чарзе. А ты спі...»

Вёскай Вадзім не пайшоў, бо ў рове яшчэ не ўсюды высахла. Затое на сценцы было — хоць каціся. І цяплынь стаяла, ажно не верылася, што перажылі ўрэшце зіму, пасля якой усім стане лепей. Не трэба больш кожны дзень паліць, грэць хату, а таму і ламаць галаву, дзе ўзяць тых дроў. З абуткам таксама палёгка — можна, акрамя хіба што ў школу, хадзіць цэлы дзень босы. Ды і наконт апраткі... Горш, праўда, з ядою — вясной усё канчаецца, выграбаецца да каліва. Але ж хутка і крапівы можна ўжо навырыць ды насёрбацца, і пышак на калгасным бульбянішчы, калі пастарацца, шчэ напораш, а там і шчаўе... І далей ужо будзе болей і болей усяго.

Гэтак, трохі абнадзеіўшы сябе, Вадзім і не прыкмеціў,

як мінуў роў, пасля кантору калгаса. На сценцы не было ні душы, і гэта радавала хлопца. Не хацелася, каб хто-небудзь бачыў, куды ён прэцца понaчы.

Вёска ўжо спала, бо ніводным агеньчыкам не свяціліся вокны хат. Праўда, няроўнае мігатлівае святло ішло з-за пагорка ад лесу — акурат хто там запальваў і тушыў пражэктар. Вадзім ведаў, што гэта ніякі не пражэктар, што працуе ў начную змену трактар, арэ папар, дзе ўсё лета і ўвосень пасвілі калгаснае быдла.

Уперадзе, трохі лявей ад дарогі, пачуўся шоргат, бы хто ішоў у гэты бок. Вадзім спыніўся, паўглядаўся. У даволі густаватым начным мораку пазнаў аселую, з латаным-пералатаным дахам будыніну — калгасны свіран, пабач — яшчэ адну, большую, куды складвалі фураж. Ён хацеў ужо рушыць далей, як згледзеў, што і праўда ад-туль, ад свірна, хтось крадзецца. Падумаў, што гэта мо стораж, Вацлаў Гудок, тупае ад няма чаго рабіць, выгульвае сшэрхлае ад доўгага сядзення цела. Зараз ён, пэўна, паверне назад, да свірна, зноў прытоіцца ў сваёй будцы.

Не спускаючы вачэй з цёмнай таўсматай фігуры, Вадзім прысеў на кукішкі. Гэтак лепей бачыў чалавека і сам заставаўся непрыкметны.

Чалавек, нібыта, аднак, зусім не падобны на Вацлава ні паставай, ні паходкай, усё больш і больш набліжаўся да дарогі. Ён нешта цягнуў на плячах, усё роўна як поўны чаго мех. Вадзім змушаны быў адступіць трохі назад, схавацца за камель старой, пашчэрбленай маланкай дзічкі.

Калі незнаёмец выйшаў на сцежку, Вадзім адразу пазнаў у ім... брыгадзіра Даўэцьку. Той, крэкчучы, спыніўся, зладзеявата аглянуўся, пасля лацвей палажыў мех на сваёй шырокай, акурат печ, спіне і паціху пабрыў у бок дома. «Дык гэта ж... гэта... украў у калгасным свірне?! — жахнуўся Вадзім.— А дзе ж быў стораж? А мо разам і рабілі гэта?»

Яго ажно калаціла. Ужо даўно і ад многіх чуў Вадзім, як крадуць у калгасе, ды не абы-хто, а якраз тыя, што бліжэй стаяць да старшыні, каму ён аддаў пасады. Колькі разоў Коля, ледзь не плачучы, скардзіўся на фуражыра Фаньку: як ён недаважвае коням і аўса і сена, а пасля лішкі адвозіць пакрысе дадому ці чужому каму збывае. А цяпер, казала нядаўна Марыля, і сотак Рагуля прырэзаў Сымонам. І не аднаму яму. Даўэцьку таксама. А ён жа і не прачыхаецца ад той гарэлкі. Ведама, ёсць за што піць...


8—2157

Ужо не ў сілах стрымаць сябе, не цямячы, гэтак ён усё робіць ці не, Вадзім выйшаў з-за дзічкі як не перад саменькім Давэцькавым носам. Ад нечаканасці Давэцька ажно спатыкнуўся, выпусціў з рук мяшок, і той скаціўся са спіны, глуха чмякнуўся на зямлю ля ягоных ног.

— Вух, напалохаў, ядры цябе! — пазнаўшы Вадзіма, брыгадзір лэпнуў даланёй па потным мясістым твары і трохі ўзбадзёрыўся.— А я думаў — бандзіт які. А тут, ядры цябе, свой. То, можа, і падсобіш данесці. Ты ж — спрытны. А дома ўдружу чаго...

Вадзіма напачатку як спаралізавала гэтая Давэцькава адкрытасць і нахабнасць. Ён мыляў губамі, шукаў і не знаходзіў патрэбных слоў, пасля ўсё ж, адолеўшы замяшанне, злосна кінуў:

— Укралі, шчэ і памагатага? Думаеце, усё вам можна, ніхто нічога не знае і знаць не будзе? Будзе, шчэ як будзе! Я сам...

— Ты што менціш? — ужо трохі ачомаўшыся, узвысіў голас Давэцька.— Язык зараз адшчыкну. Дзе ўзёў і што ўзёў — не тваё смаркатае дзела. Можа, соль купіў і нясу. Ага, соль. Яну самую.

— Праверацъ вашу соль, праверацъ,— не здаваўся Вадзім.— Як вы са свірна калгаснага яе цягнулі... Думаеце, не ведаю, што жыта, не бачыў бо?

Давэцька часта задыхаў, з рота яго патыхнула нечым смярдзючым, замешаным на махорцы, сівусе і цыбулі. Ён, нічога не кажучы, нагнуўся, ашчаперыў мех, нібы каб падняць, закінуць на плечы, і гэта Вадзіма расслабіла, на нейкую хвіліну пазбавіла пільнасці. Давэцька крутнуўся, зрабіў нечаканы выпад і тут жа хапіў яго за вуха. Вадзім адчуў, як нешта ў ягонай галаве стрэліла, у вачах джыгнула маланка, як рэзкі боль кіпцюрамі ўпіўся ў цела.

— А-а-хва-мм-а-а...— забулькатала ў Вадзіма ў горле, і не было ўжо сілы ні вырывацца, ні бараніцца, ні прасіць якой лістасці. Яшчэ трохі — і ён асеў бы, асунуўся б пад ногі Давэцьку.

Адчуўшы, відаць, што ўзяў лішку, Давэцька адпусціў вуха, здзекліва сказаў:

— Гэта, ядры цябе, не з Кротавым кусацца, мне свае зубы не пакажаш. Умэнт без іх застанешся...— Ён з сілай піхнуў хлопца, і той потырч паляцеў у канаву, дзе было яшчэ талай вады. Пакуль Вадзім падняўся, узгробся на сцежку, Давэцькі ўжо не было. Не было і крадзенага мяшка.

У першую хвіліну Вадзім узгарэўся жаданнем пабегчы, неўпрыкмет наблізіцца да злодзея і ззаду таўхануць яго, ды гэтак, каб аж носам зямлю загроб, а пасля крычаць, крычаць на ўсю вёску: хай бы хто выйшаў з хаты, паглядзеў, як і куды сплывае калгаснае дабро.

Ён ужо і памкнуўся пабегчы, ды адчуў, што парваўся пасак, якім падпяразваўся, які трымаў порткі. Пакуль валаводзіўся, завязваў вузел, прайшла, здэцца, вечнасць. Вядома, нельга было ўжо і думаць, каб дагнаць Давэцьку. Яшчэ, да ўсяго, і вуха гарэла, смылела агнём, страшна нават было дакрануцца да таго месца — мо, чаго добрага, гад гэты вырваў яго з мясам.

Вадзім асцярожна правёў пальцамі па шчацэ, намацаў спачатку мочку, пасля і ўсё вуха, пачаў лёгенька гладзіць і церці яго, ужо радуючыся, што засталося цэлае. У мястэчка, аднак, ён не пайшоў — у канаве гэтак валяўся, ды і падмачыў адзенне, што патыкацца куды да людзей было б надта брыдка.

Яшчэ трохі пастаяўшы, Вадзім памалу паплёўся назад. Хацеў быў павярнуць у завулак, знарок прайсціся каля Давэцькавай хаты. Але перадумаў. Што ён зараз зробіць? Што каму дакажа? А той гад падкалодны, калі шчэ не спіць, можа, змеціўшы Вадзіма, напусціць і сабаку: у яго ж яшчэ адзін, акрамя таго, што забілі і здалі на мыла, ваўкарэзіна на дроце ў двары гойсае, што каго хочаш загрызе, толькі нацкуй.

Коля, дзякаваць Богу, не прачнуўся на рып дзвярэй, інакш бы аказаўся, папытаў што.

Упоцемку, стараючыся ступаць асцярожна, Вадзім намацаў на стале лямпу і запалкі, ціха падаўся на кухню. Там, пры святле, распрануўся, доўга над дзежкай адмываў вадою брудныя плямы на штанах і картовым пінжаку. Спаласнуўся збольшага і сам, бо гразёю былі абляпаны і твар, і шыя, нават у роце адчуваўся непрыемны смак балота.

Спаць лёг, калі недзе — ці не ў хляве ў Сашы? — прарэзліва падаў голас, абвяшчаючы, пэўна, новы дзень, певень, за ім, бы па камандзе, рознымі галасамі адгукнуліся яшчэ колькі гэткіх жа гарлапанаў.

Раніцай, як ні хацелася яшчэ хоць трохі падрамаць, Вадзім падхапіўся першы, адразу падбег да грубкі, ля якой павесіў адзенне. Добра, што ўсё высахла, што амаль не засталося плям. Колю вырашыў пра ўчарашняе нічога пакуль не казаць.

Неўзабаве і брат прачнуўся і адразу палез у шафу, выцягнуў кіцель і дыяганалевыя штаны, што купіў увосень на базары за тры мяшкі картоплі, затым пайшоў мыцца.

— Ты куды, га? — не стрываў, гукнуў Вадзім.

Коля, пасля нядоўгага маўчання, азваўся з кухні:

— З'езджу на колькі дзён да Веркі. Нешта ж ніхто не аказваецца. Што, можа, і прывязу, калі ўсё добра ў іх...

— Коля, і я. Я ж ні разачку...— у Вадзіма перахапіла дыханне, ад хвалявання ажно задрыжэў голас. Ён умольна глядзеў на брата, спадзеючыся на нейкае цуда.

Але цуда не адбылося. Коля адразу астудзіў яго:

— Паеду адзін. А табе ў школу. Ды і білеты на дваіх не па нашых грашах. Пасля зубы на паліцу, ці што?

Вадзім пракаўтнуў горкі камяк і моўчкі пачаў збірацца ў школу. Ён ведаў, што Колю не пераканаеш, прасі не прасі.

## 13

Усё, аднак, абярнулася ў гэты дзень па-другому.

Не паспеў Вадзім дамовіцца з братам, колькі той пакіне яму грошай на харч, дзе гэты раз схавае ключ і калі чакаць яго ад Веркі, як скрозь двайныя шыбкі вокан данёсся нечы надрыўны плач, ад якога ў абодвух ажно мурашкі пабеглі па целе.

— Хто гэта? — Вадзім прыліп да акна, каб глянуць на вуліцу, але там было пуста.

Тады ён выскачыў на ганак, за ім услед, босы, але ўжо ў галіфэ, і Коля. Плач, нават галашэнне, неслісяя нібыта ад Марылінага двара. Па вуліцы ўжо ў той бок спяшаліся людзі.

— Нешта здарылася, бяда, мусіць, нейкая,— выказаў меркаванне Коля.

Вадзім не сцярпеў, услед за Тэкляй, якая нізка, як не да самай зямлі, прыпадала на правую сухую нагу, але яшчэ досыць шустра чыкільгала, пайшоў на гэты жудасны голас.

Сапраўды, ля Марылінага плота стоўпілася нямала людзей. Там жа, у акружэнні ўзбуджаных змрочных вяскоўцаў, стаяў запрэжаны конь, усе нешта ў павозцы разглядвалі, пасля адыходзіліся, мужчыны ціха між сабой гаварылі, ківалі галовамі, адну за адной смалілі самакруткі, а жанкі, хапаючыся за сэрца, душыліся слязьмі.

У Вадзіма падкошваліся ногі, цяжкая здагадка апаліла ўсё ўсярэдзіне. А пачуўшы роспачнае, на мяжы крайняга чалавечага адчаю: «А мой жа ты Дзі-і-і-мачка-а-а, а мой жа ты сыночак ненагля-я-яд-ны-ы-ы...», ён пэўна ўжо ведаў, што бедную жанчыну напаткала яшчэ адно вялізнае гора, не меншае, відаць, чым смерць самога гаспадара — Яські. Але што, што магло здарыцца?! Хлопец жа не хварэў, праўда, некалькі дзён назад Вадзім, як ішоў у школу, стрэў яго на сценцы нейкага надта соннага, зблажэлага і... з ног да галавы ў мазуце і гразі. Вадзім адразу не пазнаў яго, але Дзімка сам спыніўся, падаў руку. Яшчэ пажартаваў: «Што, чысцюля, трактарыста дык ужо і прызнаваць, і здароўкацца не хочаш?»

Яны тады трохі пагаварылі. Дзімка нават закурыў, і Вадзім зноў падзівіўся яго дарослаецці, ажно і пазайздросціў, што той на трактары, што робіць і сам зарабляе на ўсіх. «Яшчэ пакуль прычэпшчыкам,— адвёў убок вочы Дзімка.— І не так усё проста, як хто думае. Няма каму рабіць, дык во — аж дзве змены ўкалвалі. Трэба ж сеяць».

Абодва тады спяшаліся, таму на гэтым і скончылі гамонку.

Зараз, наблізіўшыся, Вадзім баяўся глянуць на воз. Ён скіраваў да купкі мужчын, прыслухаўся, што гаварыў таўсматы дзяцюк у замасленай, аж ільснілася, ватоўцы і гэткіх жа брудных брызентавых штанах, апушчаных на кірзавыя боты.

— Я яму сваё,— нервова камечачы ў руках кепку, дзяцюк нават не глядзеў ні на кога.— Што мы ўжо выдыхліся, з ног валімся. А ён, Ярмолаў, сваё: «Трасца вас не возьме, не зломкі. А дзе ў МТС зараз тыя людзі? Дзе? Няма, і ўсё». А тут яшчэ ваш Давэцька пад'ехаў і падтакнуў...

— А ён тамака чаго, Давэцька? — перапыніў дзядзька Даўнар, які сёння, нягледзячы на свой заўсёдны вясёлы нораў, быў надта хмурны, разгублены.— Тамака ж «Іскры» быдта бы зямля.

— Не, якраз вашая,— падняў галаву дзяцюк.— Ваш Давэцька на сябе запісваў узаранае, мераў усё, усё стаяў над каркам...

— Загубілі хлопца, ядры вашу! — злосна буркнуў Нічыпар, папраўляючы чорную павязку на воку.— Судзіць некага трэба за гэта безабраззе. Гэта ж і конь скапыціцца, як столькі на ім без пярэдыху... А тут, можна сказаць, яшчэ падростак. І па шаснаццаць гадзін узапар.

Дзяцюк (Вадзім здагадаўся, што гэта трактарыст, з якім у пары рабіў Дзімка) змахнуў рукой раптоўныя слёзы, якія гарошынамі пакаціліся па ўчарнелым твары, адышоўся ад купкі.

— Не яго віна,— заступіўся за чалавека дзядзька Даўнар.— Ён і сам, глянь, на нагах чуць дзержыцца, гэтак знясілеў. А яшчэ ліха гэтае... Дый з кабіны не абернешся кожную хвілю, каб зірнуць, як тамака прычэпшчык з плугамі завіхаецца...

Жоржык Галенда не пагадзіўся з дзядзькам Даўнаром, абурыўся:

— А хай бы сам ён трохі пасядзеў за тымі плугамі, а не ўсё хлопцу. Дзімка вунь тожа вадзіў трактар і араў ужо, сам бачыў. Дык калі памочнік... Вот і заснуў, мусіць, і кульнуўся пад тыя плугі...

Вадзім усё ж набраўся смеласці, таксама падышоў да воза. Але Дзімка быў ужо накрыты прасцінай, яго збіраліся, нібы па нечым загадзе, везці спачатку ў бальніцу, пасля ўжо аддаць Марылі хаваць.

Вадзім, каўтаючы салёныя слёзы, адчуваючы слабасць ва ўсім целе, а яшчэ нейкі непрыемны шум у галаве, бы там працавала малатарня, памалу пабрыў дадому. Па шляху стрэў і Колю. Той, рашыўшы, відаць, сёння не ехаць да Веркі, зняў сваю святочную апратку, ішоў ва ўсім будзённым, у чым вярнуўся з бальніцы. Коля не спытаў нічога, відаць, пра ўсё ўжо ведаў, і яны размінуюліся на вуліцы, бы чужыя.

Вадзіма ў хаце пачало раптам калаціць, акурат ліхаманка хапіла. Не раздзяваючыся, ён лёг у ложак, зашыўся пад коўдру. Але не лягчэла. Апроч таго, па-ранейшаму, а мо і больш шчыруючы, працавала ў галаве ўсё тая ж малатарня, і не было, здэцца, паратунку ні ад гэтага ўедлівага гуду, ні ад дурнога, незразумелага холаду. Хацелася вельмі заснуць, каб забыцца на ўсё. Ён нават лічыў да ста і болей, адно ж кінуў гэты занятак, адчуўшы, што дарэмна губляе час. Тады ён падняўся, узяў з печы стары кажух, са шкапа яшчэ і Колеву тужурку, акрыў лепей ногі, галаву, а вушы заткнуў пальцамі.

Колькі гэтак, стаіўшыся, ляжаў, ён не ведаў. Пасля неўпрыкмет праваліўся бы ў якую бездань. Вярзлося чортведама што.

Калі грукнулі дзверы і ён, няўцямна лыпаючы вачыма, падняў галаву, холаду ўжо гэткага не адчуў, ды і гуд нібы паслабеў. Прыслухаўся. Але ніхто не ішоў. Вадзім зразу-

меў, што яму падалося наконт грукату. Хацеў ужо ўстаць, быў нават спусціў долу ногі, аднак ранейшая слабасць зноў кінула ў пасцель.

І зноў пачало чаўпціся рознае страхоцце. Знекуль выплыў азызлы ад гарэлкі твар Давэцькі, пасля ён увесь сам і чамусьці верхам на агромністым, вышэй хаты, калаўроце з іхняе студні.

Яны ж з Дзімкам якраз вылушчвалі з пшанічных каласкоў спялейшыя, найбольш ядраныя зярняткі, ласаваліся імі і зусім не прыкмецілі, як Давэцька на тым агромністым коле-калаўроце падкраўся да іх ззаду. Калі пачулі нарэшце шум і агляну ліся, было позна бегчы ў лес, хавацца ў гушчары. З поўнымі ратамі белай смачнай кашыцы яны пусціліся наўцёкі па пшанічным полі.

Першы Дзімка, за ім і ён, Вадзім. Ногі блыталіся ў густых высокіх сцяблінах, калоссе няшчадна біла па вачах, губах, а калаўрот з Давэцькам наверсе, змінаючы, вынішчаючы за сабой цэлую шырозную палосу, усё больш і больш набіраў ходу, наступаў ім на пяткі.

Вадзім ужо не мог здыхацца, здаецца, вось-вось разарвуцца на шматкі лёгкія, і ён упадзе пад страшнае пачварнае кола. А тут яшчэ гэты здзекліва-вар'яцкі рогат Давэцькі, ад якога дыбарам станавіліся валасы! «Не адста-в-ай! — абарочваўся, крычаў яму як не ў самае вуха Дзімка.— Блізенька ўжо роў, кола там трасцу пакоціцца».

Вадзім налёг з апошніх сіл, ледзьве быў не дагнаў сябрука, але нага зачапіла за камень, і ён потырч паляцеў на зямлю. Заплюшчыў вочы, чакаючы апошні свой канец. Ды тут падскочыў Дзімка, тузануў за руку, пацягнуў яго за сабой.

Поле пайшло трохі на схіл, і бегчы стала нібыта лягчэй. Толькі і кола з п'яным седаком на ім набавіла абаротаў, ззаду ўсё мацней чуўся яго злавесны скрып і шоргат. «Ха-ха-ха-а! Ух, ха-ха-ха-а!» — рагатаў ужо як не над самым вухам Давэцька.

І тады здарылася нечаканае.

Дзімка, коратка кінуўшы Вадзіму, што роў ужо зусім побач, раптам спыніўся, распасцёр рукі і... сам грудзьмі пайшоў на кола. Давэцька перастаў танцаваць наверсе, ад неспадзеўкі вырачыў вочы, хацеў нібыта затармазіць сваю чортаву машыну, ды ці не паспеў, ці не змог: Дзімка, умомант падмяты, расплюшчаны, застаўся ляжаць на пшанічным полі. «Дзім-ка-а! — забыўшыся пра небяспеку, пра ўсё на свеце, кінуўся да яго Вадзім.— Дзім-ка-а!..»

— Ты чаго, чаго? — як з-пад зямлі дайшло да слыху, пасля, адчуўшы дотык да пляча, ён зноў ускрыкнуў, усхапіўся, памкнуўся некуды бегчы. Коля ўтрымаў яго, пасадзіў назад на ложак, заклапочана сказаў: — Не трэба так убівацца. Усё роўна не вернеш з тога свету. Хоць крычы, хоць скавычы. Вот толькі абідна, што і не пажыў...

Канчаткова ачомаўшыся, Вадзім зіркнуў у акно. На дварэ за той час, пакуль ён спаў ці мо трызніў, добра выяснілася, на небе ўжо высока раскашавала сонца, шчодрае яго святло залівала ўвесь пакой. Вадзіму было горача, твар чамусьці гарэў агнём, і гэта заўважыў Коля.

— Дык у цябе ж, пэўна, жар? — брат і раз, і другі падносіў далонь да яго лба, колькі хвілін трымаў так.— Што ж рабіць? А я хацеў заўтра, калі пахаваюць Дзімку, паехаць. На дзён хоць колькі, пакуль рабіць...

Напамінак пра Дзімку зноў скалануў Вадзіма, ён выбег на ганак, пастаяў трохі, пасля пабрыў пад паветку, прыхінуўся да дубовага шула.

Коля знайшоў яго, як не сілком зацягнуў назад, у хату. Сказаў.

— Зараз вот напалю печ, на ёй за ноч і вычухаешся. А пакуль лезь у ложак, ляжы. Я і звару што. Нечага, можа, наскрабу.

Назаўтра Вадзім і праўда адчуў у целе палёгку. Але на сэрцы па-ранейшаму было пагана. Пра школу, пра тое, што на носе экзамены, зноў нават не падумаў. Брат, праўда, заікнуўся раніцай, каб збегаў, пакуль хаваць Дзімку, хоць на колькі ўрокаў. Але Вадзім бы і не чуў яго слоў, сядзеў за сталом, гартаў нейкую кнігу, спрабаваў чытаць. Толькі ні слоўца з таго, што чытаў, ён не помніў.

Коля адчапіўся ад яго, ляпнуўшы дзвярыма, некуды падаўся, мо нават да Марылі, каб што трохі памагчы мужчынам.

Перад абедам, калі павалілі ў той бок вяскоўцы, пайшоў з усімі і Вадзім.

Ніколі яшчэ, мусіць, іхняя вуліца не збірала разам гэтулькі людзей, як зараз. На машыне, поўны ажно кузаў, прыехалі нейкія хлопцы, дзядзькі з абветранымі тварамі, цёмнымі ад жалеза і саляркі рукамі. Той-сёй быў у камбінезоне.

Вадзім адразу здагадаўся, што гэта эмтээсаўскія. Адтуль жа, з кузава, знялі вялізныя медныя трубы, паклалі на траве ля плота. Малеча адразу кінулася разглядваць гэткія незвычайныя цацкі.

— Аркештру прывезлі,— прашамкала бяззубым ротам Тэкля, якая, абапіраючыся сёння на сукатую палку, тупала чамусьці наводдаль ад іншых баб, нават не імкнулася да гурту.

У хату, каб і хацеў, было б зараз не ўшыцца. Праз адчыненае акно Вадзім бачыў там найбольш жанок. Яны, выплакаўшы, пэўна, усе слёзы, моўчкі сядзелі наўкруг састаўленых разам дзвюх лаў, дзе мясцілася абабітая чырвонай матэрыяй дамавіна. Ён пазнаў і Марылю. Але яна гэтак змянілася з учарашняга, што страшна было нават глядзець на яе. Марыля, якую падтрымлівала за локаць цётка Саша, стаяла наўколенцах ля галавы сына, штохвіліны нахінялася, худымі, ажно нейкімі жаўтлявымі пальцамі гладзіла Дзімкаў лоб, твар, папраўляла, каб лепей ляжалі, маленькія букецікі лясных пралесак — іх раніцай назбіралі і прынеслі ў хату дзеці.

— Ты лепш паплач, паплач,— угаворвалі яе кабеты.— Са слязьмі лягчэй будзе.

Вадзім не вытрываў глядзець на ўсё гэта, адышоўся да акна і пабрыў на лог. За вёскай ужо ўспомніў учарашні свой сон, пшанічнае поле, па якім яны з Дзімкам беглі, бараніліся ад Давэцькі і яго страшнага кола, і чамусьці вельмі захацелася ўзяць дзе зараз колькі каласкоў, пакласці ў труну да Дзімкі. Але ж дзе, дзе іх узяць? Пустых, без зярнят, назбіраць яшчэ можна, пахадзіўшы па леташнім незаараным іржэўніку. А вось каб цэлых, поўненькіх ды важкіх, ды яшчэ каб пшанічных, такіх, якімі яны і напраўду, не ў сне, неаднойчы ласаваліся ў полі, калі вельмі хацелася есці?

І тут яму раптам успомнілася, што такія каласкі, нават цэлы іх снопік, ён бачыў неяк увосень у дзядзькі Даўнара, да якога бегаў з міскай узяць салёных агуркоў (Даўнар, будучы на канюшні, сам праз Колю наказваў прыйсці да іх па гуркі, бо яны са сваёй старой насалілі цалюткую ажно бочку, а есці не могуць — у абаіх нешта з жыватамі зрабілася). Тады Вадзім, чакаючы ў хаце, пакуль цётка Гэлька тэпала ў склеп, і звярнуў увагу на той пшанічны снопік, які, абвіты стужкамі, стаяў у паліваным гладышы на палічцы ў куце, пад іконаю.

Дзядзькі Даўнара якраз не было, паехаў у лес па дровы, і Вадзім, ад няма чаго рабіць, памацаў рукамі яго музыку — кларнет, што вісеў на сцяне, з-за якога дзядзьку ведалі, пэўна, у кожнай вёсцы, ды і ў мястэчку — гэтак хораша ён іграў на ім.

Падышоў Вадзім і да снопіка, таксама падзівіўся, як добра, лепш нават, чымся які вазон, глядзіцца гэткае ўпрыгожанне ў хаце. Яшчэ падумаў тады, што і сам калі-небудзь, як будуць жаць, назбірае, а то і вырве колькі сцяблінак жыта, а лепш, мусіць, пшаніцы, звяжа і паставіць сабе на стол ці на падаконнік.

Успомніўшы ўсё гэта, Вадзім проста з логу, праз агарод, папраставаў паўмежкам да Даўнаровай хаты. Цяпер ён толькі непакоіўся, каб хаця заспець каго дома. Цётку Гэльку то пэўна ўжо ветрам здзьмула, здэцца, ён бачыў яе ў Марылінай хаце. А вось самога Даўнара сярод мужчын не было. Гэта ён дакладна помніў.

І праўда — дзядзька стаяў на ганку, замыкаў ужо дзверы, як Вадзім высунуўся з-за хлява.

— Дзядзька! Дзядзька Даўнар! — спяшаючыся, каб чалавек часам не пайшоў на вуліцу, за вароты, бо пасля няёмка будзе прасіць яго вярнуцца, моцна гукнуў Вадзім.

— А-а, ты, хлопча,— абярнуўся на яго голас дзядзька.— Нехта нябось прыслаў чаго? То кажы, дый пойдзем разам. Пара бо. А то без нас пахаваюць. А гэта нядобра было б з нашага боку. Я вот і кларнет узёў... — Ён раптам спахапіўся, пільна глянуў Вадзіму ў вочы, папытаў: — А чаму ад хлява ідзеш? Ці шукаў мяне тамака? Я ж у доме поркаўся.

Вадзім не ведаў, як і што сказаць, пасля прызнаўся:

— Быў я ўжо ля Марылі... Цяжка стала, дык я на лог. І во ўспомніў, што ў вас каласкі. Ну, што ў куце, пад іконамі якія.

Дзядзька Даўнар нічога не разумеў, і Вадзім мусіў больш не таіцца:

— Дык я хацеў папрасіць колькі і пакласці да Дзімкі. Кветкі ж кладуць, дык і каласкі, можа...

Яны падышлі да Марылінай хаты, калі чацвёра эмтээсаўскіх выносілі Дзімку на падворак, пасля на вуліцу.

Цяпер ужо гралі трубы, але ў музыкантаў нешта з самага пачатку не заладзілася, і яны, трохі яшчэ падзьмуўшы, склалі свае інструменты ў машыну і пайшлі, апусціўшы галовы, разам з усімі.

Вадзім не ведаў, як яму быць: зараз вось наблізіцца да труны і, працягнуўшы руку, кінуць туды каласкі ці ўсё ж на могілках, калі стануць развітвацца? Ён, можа, і зрабіў бы гэта зараз, быў нават амаль што параўняўся з дзецюкамі, якія, па двое з кожнага боку, неслі не вельмі цяжкую сваю ношу.

Ды тут сярод заплаканых жанок Вадзім згледзеў Давэцьку, і нешта адразу ў ім надарвалася, нейкі туман зноў наплыў на вочы, а сэрца часта-часта затахкала, гатовае выскачыць з грудзей.

На могілках яму не стала лепш. Наадварот, калі раптам дзядзька Даўнар зайграў на сваім кларнеце, а пад тое яго надта ж тужлівае гранне, якое рвала душу і пераварочвала нутро, загаласілі жанчыны, найперш — Марыля, Вадзім ужо дрэнна ўспрымаў усё акаляючае. Праўда, як бы там ні было, а ў галаве не-не дый кволілася думка ўсё ж неяк пакласці пшанічныя каласкі ў труну.

Гэта яму нарэшце ўдалося зрабіць, калі Давэцька некуды адвінуўся, бо пры ім Вадзіма пачынала ажно калаціць. І ў такім стане ён баяўся, каб часам не сарвацца, не крыкнуць пры ўсіх: «Вы, вы вінаватыя, і Дзімку вам не шкода, аніколечкі не шкода. Я ж нават і ў сне сніў, як вы... як звялі яго са свету...»

Але ён і не крыкнуў, і не сказаў нікому ні слова. Ні ў часе жалобы, ні тады, калі, яшчэ раз аглянуўшыся на грудок на Дзімкавай магілцы, пабрыў ціха дадому.

Сёння ён не караў сябе за гэтае маўчанне, ведаў — яшчэ будзе і дзень, і час, калі скажа ўсё, што трэба сказаць, што вынасіў у сваіх думках, што накіпела на сэрцы.

## 14

На кансультацыі перад апошнім экзаменам Лёлька Белая перадала Вадзіму пісульку. Каб не бачыла фізічка Ала Дзям'янаўна, старая маршчакаватая дзева, ад якой пасля не абярэшся звягі, ды і прыдзірак на экзамене, ён пад партай асцярожна разгарнуў невялікі, трохкутнічкам складзены, шматок паперы, косячы адным вокам, прачытаў: «Не ляці, бы шалёны, адразу ў сваю Жорнаўку. Пачакай. Ёсць гаворка. Казік».

Вадзім не стаў адпісваць, неўпрыкмет для фізічкі абярнуўся, злавіў Казікаў позірк, ледзь улоўным кіўком галавы даў зразумець, што ён абавязкова пачакае, не стане нікуды спяшацца.

Апошні час Вадзім і праўда ні на хвіліну не затрымліваўся ў школе. Прыходзіў запыханы на экзамен, раней за ўсіх здаваў і адразу ж імчаўся дадому.

Спраў хапала, аж занадта. Коля, прыехаўшы ад сястры (ёй там, аказваецца, таксама жыццё не мёд, з-за

работы не бачыць свету ні яна сама, ні Юзік, нават Славіку і тому дастаецца), зноў днямі пачаў прападаць на канюшні. Як не ўвесь клопат з агародам — пасадзіць картоплю і на градах што-кольвечы зрабіць — лёг на Вадзіма.

Пасаблялі, дзякаваць Богу, трохі жанчыны, цётка Саша, Васючкова Куліна, хоць той і цяжкавата было з-за хваробы. Градку з цыбуляй выклікалася абрабіць старая Тэкля. Цётка Манька, закранутая за жывое, што чужыя стараюцца, а яна да сваіх пляменнікаў адвярнулася задам, нарэшце таксама адумалася, прыйшла і, як нічога і не было, пачала рэзаць на «вочкі» бульбу. Са склепа ў хлеў пацягаў яе кашамі Вадзім. Бульбы заставалася мала, на пасадку аніяк не хапіла б, і Коля пайшоў, дзе дзенешся, на паклон да бацькі Жоржыка Галенды, пазычыў да восені яшчэ тры мяшкі насенкі.

І вось, калі, нарэшце, усё пароблена, Вадзім можа і расслабіцца, можа спакойна пабыць з Казікам, нават, каб былі грошы, схадзіў бы з ім у кіно. Да экзамена яшчэ два дні, і цяпер, не заняты хатнімі клопатамі, ён лягчэй падрыхтуецца. Можна і ночы не сядзець навылёт.

Казік, як толькі выйшаў з душнага класа, адразу скіраваў на школьны стадыён. Вадзім падаўся за ім. Гэтую роўную, бы стол, пустку, якая была выгараджана плотам і ані не праглядвалася з вокан настаўніцкай, ён любіў. Там можна было, калі не праводзіўся ўрок фізкультуры, пад настрой павыдурняцца, паскаліць зубы, згуляць у якую гульню. Старэйшыя вучні тут смела курылі самакруткі ці папяросы, некаторыя кідалі пятакі, спрабуючы выйграць якую драбязу на кішэнныя патрэбы.

Зараз на стадыёне не было ні душы, і гэта хлопца ўсцешыла. Казік не схацеў садзіцца на траву, прапанаваў пахадзіць па ўтаптанай, пасыпанай буйным чвырам дарожцы. Быў ён нейкі задуменны, нават замаркочаны, зусім не такі, як заўсёды. Вадзім не стаў лезці з роспытамі, ведаў — Казік сам ва ўсім прызнаецца, калі што накіпела на сэрцы.

— Адразу, як здам фізіку, паеду да бацькі,— сказаў ён, гледзячы сабе пад ногі.— Назаўсёды. Можа, і не ўбачымся болей.

Вадзім спыніўся, як аслупянеў:

— Ты што, Казік? А са школай як?

— Буду хадзіць там. Бацька зараз адзін. Напісаў, што зноў моцна захварэў...

— А матка твая? Дзе яна? — не стрымаўся, папытаў Вадзім.— Ты ж ніколі пра яе ні слова.

Казік адразу звяў і яшчэ больш спахмурнеў, на вачах нават выступілі слёзы. Вадзім ужо дакараў сябе, што сваёй залішняй цікаўнасцю зрабіў, пэўна, сябру балюча. Інакш чаго б гэтыя слёзы?

Сказаў:

— Не думай, я не дапытваюся: можаш, калі што якое, і не спавядацца. Але ж ты і агламошыў. Без цябе, каб ты ведаў, будзе нечага не хапаць. Звыкаешся ж...

Гэтага шчырага Вадзімавага прызнання Казік бы і не чуў. Трохі памуляўшыся, ён дрыготкім голасам прагаварыў:

— Тут мама мая. Тут, у мястэчку жыве. Мне было брыдка каму прызнавацца, што... што яна кінула параненага бацьку і з адным маёрам — той служыў у нас у ваенным гарадку — уцякла сюды. Мы доўга яе шукалі, шукала міліцыя, думалі, дзе забілі ці так у якую бяду папала. Адразу ж пасля вайны хапала розных бандзюгаў, дык усякае думалася. Бацька зусім злёг, на ўколах толькі і жыў. І вось, нарэшце, прыйшло пісьмо ад мамы. Яна каялася, што гэтак зрабіла, не пакінула ніякай пісулькі на стале, усё нібы атрымалася раптоўна, трэба было адразу на поезд. А з поездам адбылася аварыя, сышоў з рэек, і яна ў непрытомнасці паўмесяца праляжала ў бальніцы, ледзь, пісала, вычухалася. Пасля і яшчэ прыйшло адно, даўжэйшае, пасланне, ужо адсюль, нават з хатнім адрасам на канверце. Гэта яна мне аднаму пісала, ды бацька ўпотай, ведаю, сто разоў яго чытаў, бо вельмі любіў маму, не мог жыць без яе. Мама прасіла выслаць такія-сякія рэчы, якія не ўспела захапіць, нават сваю метрыку. Зноў напрамілы Бог малёгала даравацць...

— І ўсё роўна гэта ж... гэта... подла! — вырвалася ў Вадзіма.— А ты — нічога?

Казік нарэшце падняў галаву, глянуў Вадзіму ў вочы:

— Не ўсё так проста. І я спачатку думаў, як ты. Не пісаў ёй ні слова, толькі сабраў пасылку і аднёс на пошту. Потым, калі бацьку бралі надоўга ў шпіталь, я ўгаварыў яго, каб адпусціў і мяне — пажыць трохі тут, нават і ў школу хадзіць...

— Дык чаму ж не ў іх астаўся? Ці месца не хапіла?

— Не, я адразу дырэктару прызнаўся, прасіў інтэрнат, і ён во пасяліў з хлопцамі.— Казік ужо трохі нібы супакоіўся, голас гэтак не дрыжэў, але на твары па-ранейшаму

было напісана, як цяжка яму пра ўсё гаварыць.— А маме доўга не паказваўся на вочы. Бачыў яе, колькі разоў ішоў услед за ёю, калі яна вярталася ці з работы, ці з магазіна. Не ведаю, мне хацелася кінуцца да яе, цалаваць яе рукі, хацелася, каб яна, як некалі, прытуліла да сябе. Усё ж мама. Але... наплываў раптам твар бацькі, разгублены, змардаваны ад частых хвароб, перажыванняў, і я збочваў куды-небудзь, далей ад чужых вачэй, і плакаў. Пасля... пісаў вершы. Але я іх нікому не паказваў і, мусіць, не пакажу... А неяк яна зачапілася абцасам за вытыркнутую ў тратуары дошку і грымнулася вобзем. Рыдыкюль яе паляцеў убок, да плота, адтуль усё павысыпалася, а мама, добра выцяўшыся, спрабавала падняцца, ды адразу не атрымлівалася. Я быў пра ўсё на свеце забыўся, кінуўся ўжо, каб падняць яе, атрэсці з адзення пыл, сказаць колькі слоў. Але мяне абагнаў адзін хлопец, я ведаю яго, ён заўсёды ходзіць каля нашага інтэрната некуды на работу. Дык вот не я, а ён падаў маме руку, паставіў на ногі, нешта, пэўна, смешнае сказаў, і мама сама з ім рассмяялася, хоць яшчэ і крывілася ад болю. А той хлопец ужо нагнуўся, увішна пачаў збіраць рэчы ў рыдыкюль. Пасля яны памалу ішлі разам, пра нешта гаварылі, а я трохі воддаль плёўся ўслед, пакуль мама не завярнула ў вулку, дзе на рагу стаяў яе дом — старая цагляная камяніца на тры паверхі, напоўненая, казалі, сем'ямі ваенных, бы бочка селядцамі.

— І ты... Ні разачку не сустрэўся, не гаварыў з ёю? — не сцярпеў Вадзім.

Казік, стаміўшыся, відаць, ад доўгага шпацыру тудсюд, цяпер ужо сеў на сакаўную траву, памаўчаў нейкі час, пасля сказаў:

— Ну, чаму ж... Сустрэўся. І гаварыў. Але і я многае зараз зразумеў...

— Што ты зразумеў? Што можна вот так кінуць і хворага мужа, і сына свайго? Хай яны як хочуць, абы мне было добра. Ці не праўда?

— Не гарачыся,— чамусьці не ўседзеў на месцы Казік і, падняўшыся, зноў хутка закрочыў па дарожцы.— Трэба спачатку ва ўсім добра разабрацца, тады ўжо рабіць прысуд. Судзіць — яно лягчэй лёгкага. А што ты сказаў бы, калі б сваю маці, якая табе даражэй за ўсё на свеце і якую і год, і два бачыў штодня нейкаю нежывою, з патухлымі вачыма, з раннімі маршчынамі на твары, раптам стрэў і... не пазнаў — так яна памаладзела, расцвіла,

гэтулькі цяпла і шчасця выпраменьваюць яе вочы. Ого, як гэта не проста, каб стаць шчаслівым!

Вадзім усё ж не здаваўся:

— Шчасце — за кошт іншых? Ну, яму, твайму бацьку — пакутаваць, а некаму да чорта лысага і яго жыццё, і яго пакуты...

— Не і не,— рашуча перапыніў Вадзіма Казік.— Не будзем больш пра гэта. Добра? Я вось хачу параіць табе летам адну работку. Ты ж казаў, што збіраўся на канікулах нешта зарабіць.

— Ага. Пайду на мелавы завод. Куды яшчэ ў нас тут? Буду з кар'ера тачкі цягаць.— Вадзім быў ужо і сам рады, што Казік змяніў тэму гаворкі, бо, адчуваў, нядоўга гэтак і пасварыцца, нагаварыць адно аднаму чортведама што. Во бы аддзячыў сябру за яго шчырасць, ды яшчэ калі той развітваецца з табою.

— Работу можна лягчэйшую, не з тачкай,— сказаў Казік.— Каб у мяне не гэтак усё, я б сам. Але я цябе запісаў. Пасля выклічуць у выканком, расталкуюць, навучаць, як і што. Пыталіся толькі твой адрас і ці ты надзейны. Гэта каб не падвёў.

Вадзіма надта зацікавіла, аж заінтрыгавала Казікава гаворка, але ён пакуль не разумеў, што ад яго патрабуецца. Казік, бы адчуўшы, што далей цягнуць гуму нельга, нарэшце растлумачыў:

— Як паспее жыта, трэба ўраджайнасць, ну, колькі з гектара цэнтнераў, вымераць. Не ў гумне, калі ўсё збяруць, а яшчэ на полі, перад тым як пачнуць жаць. Будзе і конь табе з павозкай выдзелены, і нехта з памагатых. Гэта заданне аж з Мінска, мо нават з самой Масквы.

— Дык... Ці справішся? — захваляваўся ажно Вадзім.

Казік падахвоціў:

— Не вешай раней часу нос. Не ты адзін будзеш. Можа, нават па двое ў кожнай групцы зробяць. Скажуць пра гэта.

У той дзень яны аніяк не маглі расстацца. Са стадыёна пайшлі яшчэ да Казіка ў інтэрнат, там разам падсілкаваліся. Хлопцаў зноў нікога не заспелі. Адны ўжо выселіліся да самае восені, другія, хто яшчэ жыў, разбрыліся куды каторы вучыць у зацішным месцы і заадно на сонцы грэцца.

У пакоі было ўсё параскідана, на голых сетках валяліся згорнутыя цюфякі, цёмныя, без наўлечак, падушкі. Тае абжытасці, як зімой, не ставала і блізка. Рэчы свае Казік

таксама ўжо сабраў: ля ложка стаяў досыць абшарпаны, перавязаны вяроўчынай чамадан і вялізная, набітая адзеннем сетка.

— Дык мы правядзем цябе,— са здрадлівай дрыготкаю ў голасе сказаў Вадзім.— Здадзім і адразу ўсім класам правядзем.

Казік, аднак, папрасіў:

— Не кажы нікому пра мяне. Мне так лягчэй будзе. Пасля, увосень, я напішу ў школу пісьмо. А правядзе мяне мама. Яна сама выклікалася. Я не хачу, каб бачыў хто. Ды і пагаварыць нам шчэ трэба пра многае...

Па дарозе дадому Вадзіма не пакідала адчуванне, што не ва ўсім Казік адкрыўся яму. Гісторыя з бацькам і маці, вядома, пакінула рану ў ягонай душы. Але ж цэлы год ён з той ранай хадзіў, жыў, пісаў вершы, жартаваў. Чаму ж зараз гэтак скіс?

Вадзім здагадаўся: з сябрам здарылася нешта яшчэ, што перажыў ён, яшчэ адно ўзрушэнне, звязанае, мусіць, са сваім нечаканым, бы гром узімку, і надта ж безнадзейным каханнем. Гэта таксама прыспешыла яго ад'езд. Прыгадалася, як яны з Казікам лазілі пад акном у Веранікі Васільеўны і як ён пасля ў інтэрнаце прызнаўся: «Я б за яе — жыцця не пашкадаваў».

Што ж, хіба яна, Вераніка Васільеўна, у чым вінаватая?

# ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

## 1

Тое лета як не штодня па ўсім наўколлі ад краю і да краю шугалі навальніцы. Такіх навальніц з перунамі нават старыя людзі, казалі, не помнілі на сваім вяку.

Звычайна зранку лагодна свяціла сонца, хораша парылася, падсыхаючы, зямля, даверліва цягнуліся да цёплых промняў праз меру набрынялыя вільгаццю травы, кветкі, лістота дрэў. На небе не было ні хмурынкі, і здавалася, сонцу шчыраваць аж да саменькага заходу.

Аднак пасля абеду ў прыродзе многае мянялася. Ужо ад любой, нават зусім няцяжкай, работы ці хадзьбы з цябе струменямі пачынаў ліцца гарачы пот, і вельмі хацелася нават слабага подыху ветру. Толькі яго не было. У прыродзе, ва ўсім наваколлі адчувалася нейкая насцярога, якая перадавалася і людзям, і жывёле, і птушкам...

Спачатку на небе з'яўлялася невялікая цёмная хмарка, якая з кожнай хвілінай расла ў памеры, набрыньвала ўсё большай і большай чарнатой. Адтуль жа, спярша глуха, бы з-пад зямлі, даносілася вуркатанне, затым яно пераходзіла ў грымоты, і ўжо ні ў кога не заставалася сумнення, што і сёння навальніца абрынецца на вёску шалам вады і маланак.

Жанкі спяшаліся закругліць сваю работу ў агародзе ці ў полі, хутчэй беглі дадому і шчыльна зачынялі ўсе вокны, дзверы, закладвалі ў печы юшкі. З набліжэннем хмары, якая ўжо ахоплівала паўнеба, яны голасна клікалі дадому дзяцей, пасля станавіліся ў покуці на калені і, гледзячы на іконы, часта хрысціліся, бязгучна, аднымі губамі выпрошвалі ў Бога літасці: каб сляпая стыхія не спляжыла градам пасаджанае і пасеянае, не забіла каго, пякельным агнём не спаліла хлеў ці хату, не нарабіла яшчэ якой страшнай бяды.

А пра беды расказвалі нямала. Па-першае, у памяці кожнага, старога і малога, быў яшчэ леташні выпадак, як у Маланні ў часе навальніцы згарэў свіронак, а з ім разам — Яўмен.

Яўмен з самай раніцы, зусім ужо адпіўшы мазгі, барабаніў у сваёй бакоўцы нейкім інструментам, брыдка лаяўся, штохвіліны нечым тупым стукаў у перагародку, ажно шыбкі ў вокнах хадзілі ходырам. Маланння, у якой вельмі балела, ажно расколвалася напалам галава, што і свет быў нямілы, не сцярпела, гукнула, каб ён перастаў выдурняцца, не смяшыў людзей, лепш бы лёг ды паспаў.

На колькі хвілін за сцяною і праўда ўсталявалася цішыня. Але яна была зманліваю. Брында, хапіўшы з варштата напільнік, наўздзіў борзда прычыкільгаў на кухню, падкраўся да палка, дзе жанчына прылегла, пакуль трохі адпусціць боль, і ўзняў над яе галавой той напільнік...

Невядома, што было б далей, каб на матчын крык не ўскочыў з двара ў хату — добра яшчэ, што быў побач і пачуў — Анцік. Ён адным кароткім ударам выбіў з рук п'янага бацькі інструмент, трасянуў старога так, што той мяшком асунуўся на падлогу.

Да абеду Брында, плёваючыся, сыходзячы ад злосці пенай, таіўся ў сваёй бакоўцы, а пасля чамусьці перабраўся ў свіронак і там, на сатлелым ад даўнасці сенніку, у прахалодзе, нарэшце сцішыўся, пэўна, заснуў.

Калі, у якую хвіліну ўзяўся пажар на іхнім падворку, цяжка было сказаць, бо ў прыродзе рабілася чортведама што: маланкі з перунамі больш чым паўгадзіны кроілі на кавалкі зямлю і неба, прымушалі людзей забівацца ў самыя глухія куткі, затыкаць вушы і заплюшчваць вочы, толькі б нічога не чуць і не бачыць.

Агонь заўважылі з Зуевай хаты. Марыля, хоць і вымакла да ніткі, хуценька прыбегла да Маланні, штомоцы забарабаніла ў шыбку акна...

Помач, якая прыйшла ад суседзяў, не вельмі ўжо і спатрэбілася: свіронак, нягледзячы, што ліло бы з вядра, згарэў умомант, а да хаты і хлява агонь не дабраўся, балазе вецер дзьмуў якраз адтуль.

Малання, белая, што мел, распэтланая, безуважная да ўсяго, сядзела, схіліўшы галаву, на мокрым ганку і ўсё паўтарала, абліваючыся слязьмі: «А мой жа ты Яўменка, а за што ж Бог гэтак цябе?... Што ж ты зрабіў гэтакае яму?..»

Людзі ківалі галовамі і моўчкі, без аднаго слова, разыходзіліся па хатах.

Гэта было мінулым летам, а сёлета Жорнаўку, хоць стыхія і не давала нікому спакою, бяда пакуль абыходзіла.

Праўда, маланкай абвугліла і раскалола як не напалам магутную стогадовую ліпу бліз Галендавай хаты. Два вялізныя сукі адшчапіліся ад ствала і, падаючы долу, бы нітку, парвалі правады на слупах. Аднак гэта ніхто не лічыў за бяду. Не адбылося б чаго горшага...

І якраз у тыя дні, у самую макаўку лета, адна нагода ўсё ж адбылася. Пра яе жорнаўцы гаварылі хіба толькі шэптам, яна выклікала безліч самых розных чутак, згадак, меркаванняў. Адны ўжо і шкадавалі віноўніка такой жахлівай гісторыі, іншыя, пасміхаючыся, казалі, што Бог, мусіць, усё ж ёсць на свеце і, як з Яўменам, чыніць свой боскі суд. Так ці інакш, усе сыходзіліся на адной думцы: каб не Даўнар, то чалавека, каго ўсё гэта тычылася, чакала б самая пакутная смерць, якую, пэўна, і лютаму ворагу свайму не пажадаеш.

...У той дзень — якраз была нядзеля — Даўнар граў на сваім кларнеце ў вёсцы Пакровы, што кіламетраў за дзесяць ад Жорнаўкі. Граў і дзень цэлы, і вечар, і далёка за поўнач, пакуль вясельнікі, нават самыя заядлыя, уволю не натанцаваліся і не разбрыліся куды каторы спаць. Сваты разлічыліся з ім, яшчэ добра пачаставалі, прапанавалі таксама дзе прылегчы. Але, ужо на добрым падпітку, Даўнар узахвоціўся ісці дадому — раптам успомніў, што ранкам яму ж трэба заступаць на старажоўства ў калгасным агародзе.

Дарогай ён не пайшоў, вырашыў скараціць сабе адлегласць, праскочыць напрасткі праз лес. Бралася ўжо на світанак, і Даўнар спяшаўся. Так ён апынуўся ля казармаў, адкуль дамоў заставалася менш чым палова шляху.

Зусім працверазеўшы, Даўнар пашкадаваў, што чорт падбіў яго ісці нацянькі: утаміўся яшчэ болей, ды і абрасіўся з ног да галавы. У чобатах ад тае расы ажно чвякала ды хлюпала.

Толькі ён сеў на пянёк, каб трохі аддыхацца, мо і разуцца, выкруціць шкарпэткі, як пачуў справа ад казармаў нейкі незразумела даўкі не то стогн, не то ўсхліп. Падумаў напачатку, што гэта сава — яны ж, шэльмы, маглі і на чалавечы манер плакаць ці скуголіць.

Хацеў рушыць далей, як гукі тыя паўтарыліся, цяпер больш выразна, з большым напружаннем сіл, нават адчаем і роспаччу. Даўнар па-сапраўднаму ўжо наструніў вушы, не ведаючы, што думаць. Стала трохі страшнавата,

хоць ніколі ў лесе не баяўся. Уцячы б адсюль хутчэй, аднак цікаўнасць усё ж узяла верх: пасля ён не дараваў бы сабе, каб не паглядзеў, хто так палохае яго.

Ён збочыў з роснай сцежкі, увайшоў у бярозавы маладняк, нагнуўся, падняў чысты ядраны чашчавік, што трапіў пад ногі. Вачыма пашукаў яшчэ: добра было б нечакана прынесці бабе на суп ці для смажаніны хоць якіх грыбоў.

За акопамі — яны ўжо асунуліся, успелі зарасці травой, зацерушыліся ігліцай — пачынаўся стары яловы лес. Да яго, наўздзіў, пакуль што не дапялі лесарубы, якія спрэс пляжылі зараз дрэвы і ў Гараўках, і ў іншых самых глухіх чашчобах.

Даўнар, стаіўшыся, вырашыў не высоўвацца далей, трохі пачакаць. Зноў напружыў слых. І тут ажно скалануўся: гартанны ўсхліп-стогн зусім побач разануў па вушах, уздыбіў на галаве валасы. Зіркнуўшы ўперад, зглеДзеў ля старой кашлатай елкі нешта незразумелае, бы хто ўпрытык спіной прыпёрся да камля, акурат прыклеіўся, толькі галава бездапаможна звешвалася на грудзі.

Падумаў: мо каму няможацца ці гэтак набраўся якога зелля, што не здольны адарвацца ад апоры? Але ж як апынуўся тут ды яшчэ ў такую рань? Мо заблудзіўся ці якая так трасца занесла?

Чалавека, колькі Даўнар ні ўглядаўся, было не пазнаць: па-першае, пад елкамі стаяў яшчэ паўзмрок, па-другое, незнаёмец быў ці не голы зусім, бо побач звешвалася з сука яго апратка — штаны, фрэнч, нешта яшчэ белае, як усё роўна кашуля ці споднікі. «Божачка, што ж гэта за насланнё такое?!» — ужо не верыў сабе Даўнар, не ў сілах скрануцца з месца, падысці да нябогі.

З цяжкасцю ўсё ж адолеў утрапенне, наблізіўся да тае елкі... і адразу сам ледзь не страціў прытомнасць: чалавек і праўда быў зусім голы, вяроўчынай па нагах, руках і нават шыі прывязаны да камля, у дадатак да ўсяго з рота вытыркала нейкаяануча-кляп. А самае страшнае — па целе няшчаснага поўзалі, мітусіліся туд-сюд тысячы, мо і мільёны мурашак. Яны гэтак абляпілі яго ўсяго, што жывога месца нідзе не заставалася. Пад нагамі ў нябогі, наўкруг усяе елкі, аказваецца, разлёгся вялікі мурашнік.

«То гэта ж... Гэта... Нехта знарок зрабіў такое!» — зжахнуўся Даўнар і агледзеўся, шукаючы тога злачынца,

як усё роўна ён павінен тут побач недзе стаяць і з гарэзна-здзеклівай усмешкай пазіраць на сваю ахвяру.

Даўнар разгубіўся, не ведаў, што зараз рабіць: развязаць чалавека, адвалакчы яго куды далей з мурашніка, трохі ачодаць, памагчы апрануцца, ці, пакінуўшы ўсё як ёсць, бегчы ў вёску, у кантору ды званіць хутчэй у міліцыю ці бальніцу?

Яго гэтую разгубленасць адчуў, пэўна, незнаёмец, бо з цяжкасцю падняў галаву, бліснуў шалёнымі вачыма, у якіх адбіліся нечалавечая пакута, мальба, апошняя надзея.

«Пайду, то яму хана скора будзе»,— Даўнар ужо без ваганняў рушыў да камля. Спачатку вырваў з рота ў чалавека кляп, адкінуў, бы вужаку, убок, затым зайшоў, ступаючы на жывы вірлівы мурашнік, на другі бок елкі, пашукаў вузлы вяровак. Нехта рабіў сваю чорную справу без спеху, грунтоўна, завязваў вяроўкі моцна і надзейна, трэсачкі нельга было б уторкнуць. Даўнар лэпнуў па кішэнях, пашукаў ножык, але ўспомніў, што не ўзяў з сабой, што застаўся ў рабочай апратцы. Пашкадаваў яшчэ: гэта ж не ведаў бы гора, умомант распаласаваў бы путы.

Ён, ломячы ногці, папрабаваў аслабіць, разблытаць тугія вузлы, але нічога не атрымалася. Тады скеміў, што можна ж памагчы зубамі, як неаднойчы даводзілася рабіць гэта раней.

Нявольнік жа, здэцца, не падаваў ніякіх прыкмет жыцця, бо галава яго, хоць ужо і без кляпа, вяла і бездапаможна звісла ўніз, наколькі дазваляла яму верхняя вяроўчына.

Даўнар заспяшаўся. Вырашыў, што найлепш будзе, калі ён пачне вызвабаняць чалавека, пачынаючы з ног. Ён укленчыў, нагнуўся, спрабуючы зубамі хапіцца за вузел. Мурашы, якія дагэтуль не вельмі актыўнічалі, бы ўжо здаволіліся сваёй ахвярай, зараз дружна накінуліся на яго. Умомант абляпілі твар, папаўзлі па шыі, нават зашыліся пад сарочку. Цела непрыемна засвярбела, засмылела ад укусаў. «А як жа яму, бедалагу?» — мільганула думка, і Даўнар, усёй пяцярнёй лэпнуўшы па адной, па другой шчацэ, так-сяк змахнуўшы з сябе ўз'юшаных насякомых, пачаў ірваць зубамі, матлашыць пальцамі тую праклятую завязку. Нарэшце яна паддалася. Тады — зараз ужо на коленцах — развязаў вяроўку, якая апаясвала чалавека па жываце. Чалавек бы трохі ажыў, выціснуў з рота нейкі кволы гук, бы хацеў што сказаць, ды не атрымалася.

Заставалася выслабаніць нявольніку грудзі і рукі, якія былі аблытаны больш, чым іншыя часткі цела. Тут Даўнару давялося павалэндацца даўжэй. Мурашы зусім ужо азвярэлі, джалілі і джалілі, паратунку не было ніякага ад іх.

Але вось і апошні вузел развязаны. Цяпер, разам ужо з вяроўкай, ёю і падтрымліваючы, Даўнар пацягнуў чалавека далей ад вірлівага, ушчэнт узбунтаванага мурашніка. Хапіўшы з сука бялізну, ён пачаў апантана шморгаць па целе небаракі, вызваляць ад насякомых, заадно і грэць.

Як жа быў здзіўлены і збянтэжаны Даўнар, калі ў незнаёмцу, толькі крыху адчысціў, апрануў яго, пазнаў... самога Рагулю!

— Т-т-таварыш п-п-радсядацель! — Даўнар пачаў ажно заікацца.— Як ж-ж-жа гэ-т-та?.. Хто ж-ж-ж гэта т-т-так?

Ссінелы, увесь пакусаны, змардаваны ўшчэнт, Рагуля ляжаў, бы ўсё роўна нябожчык, на сухойігліцы, пакуль нічога не гаварыў, толькі лыпаў зрэнкамі. Цяпер Даўнар яшчэ больш зачухаў патыліцу: як жа быць? Кінуцца ў вёску па помач ці не? Старшыня-недаляка, ведаў, ніколі не даруе, калі ён што зробіць не так. Хоць бы хутчэй выціснуў якое слова, даў каманду.

Рагуля, зноў бы адчуўшы настрой свайго нечаканага збавіцеля, пачаў заўзята мыляць губамі, ці не пнуўся што сказаць. Даўнар нахіліўся над самым ягоным тварам, тады толькі разабраў, і то пятае цераз дзесятае, чаго хацеў старшыня. Аказваецца, Рагуля напрамілы Бог малёгаў нідзе нічога не расказваць, нікому не заяўляць, толькі знайсці Любу Клыпа і прывесці, каб ніхто нічога не ведаў, яе сюды. Вось і ўсё, усё яго жаданне. І хай моцна трымае язык за зубамі, інакш...

Што было б інакш, Даўнар не вельмі задумваўся, але выканаў просьбу Рагулі, знайшоў — якраз не пайшла яшчэ на работу — Любу і прывёў яе ў лес, пакінуў са старшынёй сам-насам. Даўнар быў і здаволены, што гэтак вызваліўся ад нечаканага клопату.

А вось утрымаць язык за зубамі яму не ўдалося. Гэлька адразу ж даведалася — нехта з жанок падгледзеў,— што Даўнар ранenька логам вёў Любу ў лес. З чапялой у руцэ яна прыстала да мужа: мазгаўню размажджэру, калі не прызнаешся, куды вадзіў гэтую сучку, што рабіў з ёю. Яна ж, адкормленая на дармовых харчах, гладкая

ды выгуленая, хоць каго гатова заарканіць, абы толькі ў штанах быў.

Даўнар бэкаў і мэкаў, круціўся як уюн на патэльні, бо добра ведаў: сказаць жонцы — гэта тое ж, што разбалабоніць на ўсю Жорнаўку, а то і далей. І ўсё ж, бачачы, што бабу аніяк не ўтаймаваць, што разнясе ў пыл хату, а самога калі не вытне чапялой, то запіліць ці з'есць жыўцом, Даўнар з усімі падрабязнасцямі, толькі каб паверыла, пераказаў, што сёння адбылося ў лесе...

Не паспеў ён і апамятацца, як Гэльку бы ветрам здзьмула з месца. Забылася і пра някормленых парасят, і што недапалена ў печы, што крупнік не паставіла варыцца на абед. Даўнар хацеў стукнуць па стале кулаком, яшчэ раз папярэдзіць, каб нікому пра старшыню ні гу-гу, але спазніўся: Гэлька праз хвіліну была ўжо ля студні, дзе жанкі бралі ваду...

## 2

Навальніца нямала дала страху і Вадзіму. Ніколі не думаў, што ў полі, ды яшчэ ўдзень, гэтак можа быць вусцішна. Раней, як пасвіў свінні і авечкі, пасля каровы, дождж, часта з маланкамі і перуном, таксама заспяваў яго дзе папала, таксама мачыў да апошняй ніткі. Але тады Вадзім ні разу не быў адзін, заўсёды побач знаходзіўся нехта з хлопцаў. А ў кампаніі, што там ні кажы, многа лягчэй пераносіш любыя нягоды.

Сёння да навальніцы Вадзім мог быць ужо ў мястэчку, адвезці ў гумно гэтыя вось снапкі жыта. Раніца ж для яго пачалася нібы ўдала: лёгка, нават доўга і не галасаваў, дабраўся на спадарожнай машыне як не да самага калгаса «Узгор'е», заспеў яшчэ ў канторы яго старшыню Пянькова, паказаў паперку з пячаткай райвыканкома. У паперцы той значылася, што ён, Вадзім Гурко, прызначаны метравальшчыкам і што яму павінны даць у помач і чалавека, і каня з павозкай, а таксама сажань і серп,— карацей, усё, што ён папросіць для работы.

Пянькоў, нейкі памяты, бледны з твару мужчына немаладога веку, доўга круціў у руках Вадзімаў дакумент, уважліва чытаў, мыляў губамі, пасля з сумам сказаў:

— Што там, стала быць, мераць? Я і без меркі ведаю: больш за дзесяць цэнтнераў не будзе. Пясок жа ў нас, а гною таго ўнеслі — кот наплакаў. Дзе яго возьмеш?

Было б больш жывёлы... От, троху попелу, троху памёту курынага вясною наскрэблі... Кот, стала быць, наплакаў...

Вадзім адчуваў сябе вельмі няёмка, што вось гэты пажылы і, бачна па ўсім, хвараваты чалавек спавядаецца перад ім, школьнікам, як бы вініцца за беднасць сваю, за кепскі ўраджай. Але што яму, Вадзіму, рабіць? Яго ж прыслалі сюды, яму заданне такое далі і грошы за гэта будуць плаціць...

Адвесці на жытнёвы палетак выклікаўся сам Пянькоў. Яшчэ ў канторы, праўда, папярэдзіў Вадзіма:

— Ты ўжо, стала быць, адзін як-небудзь выкручвайся. Няма памагатага, хоць забі. І падводы зараз няма. Пасля, калі зробіш, што табе там трэба зрабіць, неяк падвязём. Але да абеду нічога не выйдзе...

Вадзім рады быў, што старшыня хоць прыстараўся для яго серп і сажань — сапраўды, калі так атрымалася, ён можа і адзін управіцца. Паказвалі ж, як гэта рабіць.

Вузкай, добра ўтаптанай сцежкай, якая непадалёк ад вёскі вілася ўправа, яны — старшыня з сажнем наперадзе, за ім Вадзім з сярпом у руках — увайшлі ў гонкі вясёлы саснячок, мінулі яго, затым мінулі і другі такі ж падлесак. І толькі за ім Вадзім убачыў жыта. Яно займала досыць вялікі абсяг, было гатовае, каб жаць. Каласы пад гарачым ужо сонцам, здэцца, аж пазвоньвалі, прасіліся на серп.

Пянькоў сарваў адзін каласок, памяў у далоні, паказаў, якія вылушчыліся зярняты. Іх і праўда было малаватата, ды і дробныя нейкія, акурат замораныя ці без пары засушаныя.

— Вот, стала быць, і наешся такога хлеба,— уздыхнуў ён.— Эх-ма-а! Здамо пастаўкі, то сабе ці што і застанецца. А людзі ж нашы спадзяюцца, чакаюць... Мінулы год па сто пяцьдзесят грамаў ледзь вымудравалі на працадзень.

Старшыня, адчувалася, хацеў нешта дадаць, але перадумаў, махнуў толькі рукой і, кінуўшы сажань, пакрочыў ускрай палетка. Вадзім таксама паклаў свой серп, падаўся за ім. Думаў, што Пянькоў яшчэ што скажа. Але той — ці то знарок, ці проста не заўважаў хлопца — раптам узяў ды завярнуў у гушчар, хутка знік з вачэй. Бегчы ўслед, зразумеў Вадзім, не мела сэнсу.

Трохі памарудзіўшы, ён вярнуўся на ранейшае месца, падняў сажань і серп, затым, асцярожна ступаючы, каб не стаптаць ніводнай сцяблінвы, углыбіўся ў жыта. Хацелася паглядзець, якое яно, ці ўсюды гэткія ж, як паказаў Пянькоў, каласы. Намеціў вокам, дзе можна ўзяць першую

пробу. Здаецца, урадзіла тут аднолькава, так што можна смела адмераць патрэбны для тае пробы квадрацік...

Ужо апоўдні, нямала папацеўшы — мо не так ад работы, як ад таго, што пачынала парыць,— Вадзім аглядаў, ці добра звязаны, і пералічваў снапкі. Іх набралася шаснаццаць штук, па адным, па два з кожнага выжатага лапіка. Вырашыў, што хопіць. Галоўнае — узяў калоссе на ўсім кліне, у самых розных яго месцах. Не паленаваўся, дапяў нават да высакаватай выспы, дзе, меркаваў, жыта будзе нават горшае, чым пры ўзлеску. Так яно і выйшла. Ледзь з адмеранага звязаў худзенькі снапок.

Заставалася зараз дачакацца каня з павозкай. Мо Пянькоў не забыўся ж, прышле каго ці сам прыедзе. Лепш бы сам, бо толькі зараз Вадзім спахапіўся, што не папытаў у старшыні, колькі гектараў у гэтым кліне. Тут ужо абавязкова трэба ведаць, бо інакш яго паўшчуваюць у райвыканкоме, мо шчэ і грошай не дадуць. Праўда, у іх там недзе даўно ёсць усе лічбы: колькі і чаго пасеяна, пасаджана, колькі надоена. Ута, тамака ўмеюць лічыць, шчэ як умеюць. Але ж раз і ад яго патрабуюць лічбу, то будзь добры, дай. Астатняе цябе не тычыцца...

Пякло ўсё мацней і мацней. Цяпер Вадзім распрануўся да трусоў, але, убачыўшы, што яны парваныя ў самым далікатным месцы, зноў усцягнуў штаны: баяўся, каб хто не натрапіў, не заспеў яго знянацку ў гэткім выглядзе. Тады ад сораму хоць уцякай немаведама куды.

Ён падаўся бліжэй да сасняку, каб дзе схавацца ў цень, перачакаць задуху. Аднак маладыя сосенкі мала давалі прахалоды, сонца, што стаяла як не над галавой, наскрозь прашывала сваімі няшчаднымі промнямі не вельмі густы лапнік. Раслі б побач дзе елка ці бяроза, ценю хапіла б, хоць дзень цэлы адлежвайся. А так...

Вадзім вярнуўся да снапкоў, пастаяў, не ведаючы, што далей рабіць. Браў ужо непакой. Хаця б дабрацца да мястэчка, успець схаваць усё ў гумне, а мо нават і абабіць зерне. Там жа для гэтага падрыхтаваны і мяшкі, і цапы, і рэшата, каб ачысціць ад асцюкоў і мякіны. Доўга марудзіць нельга, бо заўтра ці паслязаўтра могуць паслаць яшчэ куды, ужо ў новае месца.

Знекуль нібы даляцела песня. Вадзім стаіў дыханне, прыслухаўся. Аднак, акрамя жаўруковага шчыравання і няўтомнага, да звону ўвушшу, стракатання конікаў у жыце, нічога не пачуў. Падумаў, што яму памроілася. Але з лёгкім павевам гарачага ветру зноў, цяпер больш выраз-

на, данёсся да вуха працяжны жаночы спеў. «Ці не жнуць? Відаць, з другога краю пачалі...»

Стала весялей. Значыць, ён не адзін тут, у полі, недзе не вельмі далёка, пэўна, ужо добра прытаміўшыся, прыткнуліся на ўзмежку, мо нават і цень знайшлі, калгасныя жнеі — маладыя дзяўчаты, жанкі. Усе ў квяцістых, самых лепшых, у каго якія былі, хусцінках на галаве — свята ж, ды яшчэ якое! — яны нагбом папілі з гладышоў хто квасу, хто вады, пагаварылі пра ўраджай, паўздыхалі, што гэткі і сёлета няўрод, і, пакуль вольная хвілінка, зацягнулі песню, знаёмую і блізкую ім, да болю шчымліва-самотную, тую, якую перанялі ад мацярок сваіх і бабуль:

Ой, я жала жыта пры дарозе,
Павесіла калысачку на бярозе.
Як жала жыта пры даліне,
Павесіла калысачку на каліне.

Ці таму, што дадалося болей галасоў, ці што песня, можа, пасавала настрою, спявалася ад чыстай, яснай душы. Вадзім чуў яе кожнае слоўца і сам паступова, бы губка, напаўняўся яе чароўнымі гукамі:

Ох, я жну палоску, жну другую,
Крычыць маё дзіцятачка, а я чую.
Паспі, не плач, дзіцятачка, мая доню,
Дай дажаці жыта — сваю долю.

У гэтым суладным хоры вылучаўся нечы бойкі і разам з тым вельмі напеўны голас, які хацелася б слухаць і слухаць. «Усё роўна як Люська спявае,— з хваляваннем падумаў Вадзім.— Але ж як яна тут?..»

Апошні час, наўздзіў сабе, Вадзім усё часцей і часцей прыгадваў дзяўчыну. Да яе, заўважаў, былі неабыякавыя і іншыя хлопцы. Той жа Генка Шакута вясной неяк пахваляўся Казіку, што нават цалаваўся з Люськай і што яна нібыта аж памірае, гэтак хоча сябраваць з ім. Вадзім не вельмі верыў Генку, ведаў, які ён стаў хвалько і задавака, асабліва калі знюхаўся з Рылам, калі купіў сабе футболку з жалезным замочкам-«маланкай» і кішэнькамі на грудзях.

На пачатку лета Вадзім добра паласаваўся з Люськай ранетамі, ад якіх, нягледзячы, што яны былі вельмі салодкія, набіў аскому, пасля чаго тыдзень ці нават болей не мог узяць у рот нічога з садавіны. А ў першы дзень яшчэ і горш было, думаў, не вытрывае, ганебна сканае ў дашчанай адгародцы за хлявом...

Палезці ў чужы сад падбіла яго Люська. У той вечар

падлеткі з іхняга краю вёскі бавілі час на бёрнах ля Агрыпінінай хаты, дурэлі, вішчалі, гулялі ў фанты.

Вадзім не адразу далучыўся да ўсіх. Было надта хораша сядзець аднаму на лаўцы ля свайго плоту, ні пра што не думаць, адно ўдыхаць дурманлівы пах, што ішоў ад кустоў язміну ў іхнім агародчыку. Язмін Вадзім любіў, мусіць, лепш за якія іншыя кветкі, і калі брат неяк быў заікнуўся, каб выкарчаваць куст-другі, пасадзіць на яго месцы лішняе каліва цыбулі ці так чаго з агародніны, Вадзім учыніў Колю такі гвалт, што той махнуў толькі рукою і больш не заікаўся наконт сваёй задумкі...

Нехта з дзявочага гурту зацягнуў «Рабіну», ды так вабна, што Вадзім не вытрываў, падаўся да бёрнаў. Яго ў поцемках, мусіць, не заўважылі, бо ніхто і галавы не павярнуў у ягоны бок — усе, уволю да гэтага нагуляўшыся, сцішана сядзелі і слухалі песню.

Спявала — Вадзім зараз пазнаў яе голас і прыемна здзівіўся — Люська. Ёй спрабавалі памагчы яшчэ колькі дзяўчат, але, адчуўшы, што толькі псуюць абедню, што ў іх і блізка так не атрымліваецца, змоўклі, у душы, напэўна, зайздросцячы сяброўцы. А Люську як усё роўна прарвала: не паспявала адну скончыць песню, як пачынала другую. «Скуль яна гэтулькі ведае іх?» — здзівіўся Вадзім. Ніхто, хоць было ўжо і позна, не хацеў разыходзіцца. Вадзім згледзеў, што нават сама Агрыпіна не спіць: расчыніўшы акно, яна ўзлакацілася на падваконне, таксама ўважліва слухае, успамінае нешта сваё.

Вадзіму тады ўпершыню стрэльнула ў галаву шалёная думка, ад якой кроў густа прыліла да твару, змусіла доўга калаціцца сэрца: правесці Люську дадому. Ён, наколькі дазваляла цемната, пашукаў вачыма, ці ёсць хто ў яе бок з пасялковых, і з радасцю пераканаўся: няма. Галоўнае, няма Генкі. Дзе ён і што з ім, Вадзіма зараз мала займала. Урэшце, а чаму гэта ён павінен аглядвацца на Шакуту? Хто ён Люсьцы?

Адчуўшы, што хутка канец гулям, Вадзім надумаў непрыкметна, як і прыйшоў, знікнуць, каб загадзя трапіць у вулку, кудой Люська будзе бегчы назад. Іншай дарогі ёй няма, хіба што праз роў. Але чаго ёй тудою перціся?

Чакаць доўга не давялося. Ужо хвілін праз колькі, калі аціхла ўсё ля Агрыпіны, у пачатку вулкі пачуліся торопкія крокі. Не было ніякага сумнення, што гэта яна, Люська. Ад хвалявання Вадзім не ведаў, што рабіць. Усё ж сабраўся з духам і, ціха насвістваючы, пайшоў дзяўчыне насу-

страч. Хай думае, што ён выпадкова апынуўся тут і во — стрэў яе.

Люська і праўда вельмі напачатку здзівілася, убачыўшы Вадзіма.

— Ты?! А я думала, што п'яны хто...— Яна спынілася насупраць яго, танклявая, у кароткай жакетачцы, якая зграбна аблягала яе невысокую фігурку, пасля, засмяяўшыся, гарэзліва сказала: — Чакай, чакай... А ты ж, мусіць, таксама ля Агрыпіны быў? І як успеў сюды? А можа, я не ўгледзела добра?..

Вадзім гатовы быў скрозь зямлю праваліцца. Ён ніяк не спадзяваўся, што Люська, якая сядзела з другога краю бёрнаў, магла бачыць яго. Было ж цёмна, ды і калі ёй было за спевамі зіркаць па баках?

— Ну і быў, ну і што? — у Вадзіма адразу апаў настрой, ён ужо не ведаў, як далей быць: пайсці ці ўсё ж затрымаць дзяўчыну, пабыць з ёй хоць колечкі хвілін? Калі яшчэ такое зноўку выпадзе...

Люська — вось жа малайчына! — неяк вельмі даверліва кранулася ягонай рукі і раптам прапанавала:

— А ведаеш што? Давай аблаташым адзін сад. Як ты, га? Не будзеш калаціцца? — Яна трохі памаўчала, пасля дадала: — Паміраю, яблык хачу. Далібожачкі. Ранетак бы...

— Позна ўжо. Ды і дзе тых ранетак возьмеш? — здзівіўся Вадзім Люсьчынаму жаданню.— Захацела чаго...

Дзяўчына зноў рассмяялася:

— Для злодзея самая цяпер пара. А ранеткі... Ведаць трэба, у каго яны растуць.

— Я магу, чаго ж...— Вадзім адчуў, што трэба хутчэй згаджацца, бо лішнія выпыты нічога яму добрага не дадуць: Люська можа ўспыхнуць і збегчы ад такога кавалера, падумаўшы яшчэ, што ён і праўда спалохаўся, коленкі ажно дрыжаць.

Не выпускаючы са сваёй цёплай далоні Вадзімаву руку, яна павяла яго, бы малога, назад, на вуліцу, адтуль звярнула ў бок рова. Вёска хоць і спала, але ішлі моўчкі, трымаліся бліжэй да платоў.

Вадзім ліхаманкава прыкідваў, у каго ж гэта растуць тыя ранеткі. Акрамя як у Галенчыхі, ён не помніў, каб у каго яшчэ былі такія смачныя яблыкі. Але ж да Галенчыхі, ён ведаў, нізавошта не залезеш. Ну, перш-наперш, не пераскочыш праз плот, бо ён надта ў яе густы

і высозны, да таго ж спрэс аблытаны калючым дротам. Але гэта нішто, тут хлопцы далі б неяк рады, не такое адольвалі.

Галоўнае ж пудзіла, перашкода для аматараў пажывіцца чужым — прыдуркаваты Галенчышын сын Вінцэсь. Хворы на галаву, ён затое ў целе меў сілу, якая здзіўляла ўсіх: мог у выцягнутай руцэ падняць мех бульбы, сагнуць тоўсты жалезны прэнт, даланёй раскалоць напалам цагліну ці дошку-саракоўку.

Угнявіць Вінцэся было вельмі рызыкоўна. Аднойчы местачковыя падшыванцы, якія вёскай вярталіся з лесу, з ягад, па нечай падказцы вырашылі падражніцца з Вінцэсем. Пераканаўшыся, што ён у садзе, за высокім надзейным плотам, і выскачыць адразу да іх аніяк не можа, яны пачалі ўлюлюкаць, паказваць яму язык, круціць пальцамі ля скроняў. Аднак Вінцэсь як сядзеў ля будана, смачна сёрбаў нешта з вялікага гаршка, так і заставаўся сядзець у той жа паставе, ні на кога не звяртаючы ўвагі. Тады большы з кампаніі, таксама навучаны мясцовымі шалапутамі, пусціў у ход апошні козыр. Паколькі вуліца зараз была пустэльная і ніхто з дарослых, ведаў, не падслухае, ён скрывіў хітранька губы і не то прадэкламаваў, не то праспяваў:

> У Вінцэся-курашчупа
> Шышка вырасла ля пупа.
> Шышку добра ён пасе,
> Шышкай яблыкі трасе.
> Уля-ля, уля-ля,
> Шышкай яблыкі трасе.

Вось гэтага Вінцэсь ужо не мог сцярпець. Выціснуўшы з грудзей глухі, даўкі гук, ён вокамгненна ўсхапіўся з месца, ашалела кінуўся да плота...

Як там было напачатку, ніхто не бачыў, бо ўсе працавалі ў полі. Пасля расказваў расхваляванай Галенчысе і ўсім цікаўным конюх Нічыпар, што толькі дзякуючы яму тыя местачковыя падшыванцы засталіся жывыя. Ён якраз сценкаю вяртаўся з мястэчка і пачуў на вуліцы тупат і дзікі крык-енк хорам у некалькі галасоў. Нядоўга думаючы, дзядзька спрытна сігануў праз паркан чужога агарода, па бульбоўніку і градах выскачыў на вуліцу.

Адразу не зразумеў, што і да чаго: па пяску, узнімаючы босымі ступакамі воблакі пылу, з вырачанымі ад жаху вачыма імчаліся незнаёмыя падлеткі, на чым свет клікалі на помач матак. Ён быў спачатку падумаў, што, можа, сабака які ашалеў ці Гудкоў бык сарваўся з навязі і пры-

пусціў за ўцекачамі. І тут убачыў Вінцэся. Ажно не паверыў сабе дзядзька Нічыпар: Вінцэсь, у адных доўгіх, да каленяў, трусах, распэтланы, з перакошаным тварам, ляцеў за хлапчукамі і, трымаючы ў руках ладны дубовы слупок, нагвалт вырваны з плота, размахваў, бы палкай, ім направа-налева.

З цяжкасцю ўдалося дзядзьку супыніць Вінцэся, угаварыць вярнуцца дадому. Паслухаўся Вінцэсь толькі таму, што Нічыпар даваў яму неяк праехацца верхам на старой рахманай кабыле, калі яны з маці прыходзілі на канюшню набраць у вёдры свежых, з параю яшчэ конскіх яблык для свіней.

Зараз, пакорліва ідучы за Люськай па соннай вуліцы, Вадзім не вытрываў, ціха папытаў:

— Дык куды мы?

Люська як бы нават здзівілася:

— Хіба не кумекаеш? Да Галенчыхі, куды ж. У каго яшчэ ранеткі...

Чаго хочаш чакаў хлопец ад Люські, толькі не гэтага выбрыку. Няўжо яна і праўда палезе на ражон да Вінцэся, які і днюе і начуе ў будане пад яблынямі?

Вадзіма ажно скаланула. Гэта адчула Люська, супакоіла:

— Не бойся. Я пазабаўляю яго. Я ведаю для яго лякарства...— Яна гарэзліва засмяялася.— А ты тым часам нарвеш поўную запазуху, кішэні наб'еш. Яшчэ б шапку мець...

Калі былі ўжо недалёка ад Галенчышынага пляца, Люська спынілася, прыслухалася, пасля як не ў самае вуха шапнула Вадзіму:

— Дурненькі, слухайся мяне. Значыць, так...

Падрабязна (Вадзім нават падумаў, што Люська даўно ўсё абмазгавала і цяпер выдае гатовы план) яна размеркавала абавязкі кожнага: яму пакажа, дзе адарваны і прыстаўлены назад, ужо без цвікоў, дзве штыкеціны, як ад гэтага лаза лягчэй знайсці патрэбную яблыню. Сама ж яна зойдзе зусім з іншага боку агарода, туды пакліча і Вінцэся...

— Ты што?! — спалохаўся ўжо за дзяўчыну Вадзім.— Ён жа дурны. А раптам ён?..

Вадзім не дагаварыў, што магло быць «раптам». Люська не стрымалася, хіхікнула ў жменю:

— Дурны-то дурны, а як убачыць спадніцу, то аж млее. Мне ўжо ў каханні прызнаваўся. Калі б ні ішла,

адразу бяжыць да плота, радасна шчэрыцца, падміргвае...

Вадзіма трохі збянтэжыла гэтае прызнанне, але ён не падаў выгляду. Толькі падумаў: «Чорт, а не дзеўка». Люська між тым казала:

— А вось яблык, колькі ні намякала, ні разу не даў. У Галенчыхі і снегу зімой не дапрасіўся б, не тое што яблык. Усё на базар валачэ...

Тыя хвіліны, пакуль ён, стаіўшы дыханне, прыгінаючыся як не да саменькай зямлі, краўся да старой, досыць высокай яблыні, каштаваў, ці ўсё ж на ранеты натрапіў, пасля калі разгірэчаны стаяў на хісткай галіне і ўсляпую лэпаў па лісці, асцярожна зрываў і клаў за кашулю, папярэдне туга падцягнуўшы на поясе папружку, найбольш буйныя плады,— хвіліны тыя падаліся яму цэлай вечнасцю. А яшчэ ж трэба было натапырваць вушы, чуйна ўслухоўвацца, як там, на другім краі агарода, спраўляецца Люська. Ей таксама, пэўна, нялёгка: паспрабуй затрымаць надоўга за плотам Вінцэся, каб не выклікаць у ім насцярогі! Але па тым, як Вінцэсь весела гыгыкаў, пнуўся таксама нешта расказваць, дзяўчына сваю ролю выконвала спраўна.

Адзін момант Вадзім як не абамлеў, ажно душа ледзьве не пайшла ў пяткі: галіна, на якой ён стаяў, раптам сагнулася пад цяжарам яго цела, ён згубіў раўнавагу і ледзьве не грымнуўся вобзем. Добра, што ў апошні момант адной нагой знайшоў новую апору, ды і рукой паспеў схапіцца за ствол. І ўсё роўна шуму трохі нарабіў. З жахам чакаў, што Вінцэсь расшалопае, што да чаго, зараз вось кінецца да яблыні, і тады...

Яго праймаў то жар, то холад. Колькі секунд ён нават дыхнуць баяўся. А яшчэ і Вінцэсевага гыгыкання не стала чутна. Няўжо западозрыў што? Ад таго дурнога ды шалёнага літасці не чакай, варта трапіць яму ў лапы.

Палёгку адчуў Вадзім, калі Люська раптам выбухнула рогатам, а пасля кароткай паўзы за нешта пачала ўжо ўшчуваць Вінцэся:

— Ай, ну цябе... Вядома, хлопец ты хоць куды, але як адарвеш мне руку, чаго я буду вартая. Ну, сам памазгуй. Так што лепш не трэба рукі. Ды і пайду я ўжо. А ты праз плот не пералазь, я ж і так бачу цябе...

Вадзім зразумеў, што пара даваць лататы, што дзяўчына, мусіць, на апошнім узводзе, не ў сілах больш трымаць Вінцэся, бо той надта пачаў смялець. Зрэшты, і ён, Вадзім, сваё зрабіў: усюды, куды можна і нямож-

на, напхаў яблык. Цяпер толькі заставалася ціха злезці і жывым-здаровым выбрацца назад.

Калі ўжо зноў, як і было, замаскіраваў лаз і далекавата адышоўся ад Галенчышынага пляца, падаў Люсьцы ўмоўны знак: падняў ля плота і гучна два разы стукнуў камень аб камень...

Доўга яшчэ хадзілі яны па вуліцы, пасёлку, забрылі нават на лог, уволю, цяпер ужо нікога не баючыся, смяяліся. І грызлі, не паспяваў адно Вадзім за пазуху лазіць, нязвыкла салодкія, за мёд мо нават саладзейшыя, ранеты.

Зусім ачмурыла яго тая ноч. Даўно з Вадзімам не было такога. Спаць не хацелася ані. Ён рады быў, што і Люська не заікнулася нават, каб пайсці дадому. А ў яе ж, ведаў, вельмі строгая матка, якая можа спытаць, дзе дачушка валачылася да раніцы. Аднак дзяўчына нібы забылася на ўсё. Яно і не штука забыцца. Памагала гэтаму і сама прырода. Некуды сплылі апошнія хмары, і неба спрэс усеяла цэлая плойма зорак. Між іх як не над самай галавой раскашавала надта ж зыркая поўня. У яе святле ўсё здавалася незвычайным, казачным.

«Няўжо, няўжо гэткі свет прыгожы»,— думаў здзіўлена Вадзім, не ў сілах выказаць усё, што ў душы яго адбываецца зараз, звычайнымі словамі.

Развіталіся з Люськай, калі на ўсходзе ледзь-ледзь пачала набрыньваць чырвоным вузкая палоска неба.

## 3

Ні старшыні, ні каго з павозкай так усё не было і не было. «Гэты Пянькоў, відаць, добры брахун», — пачаў ужо нервавацца Вадзім.

Як на тое, нясцерпна мучыла яшчэ і смага. Раніцай ён, не падумаўшы, з'еў кавалак селядца з картопляй, і зараз у роце сушыла, язык ажно зрабіўся бы тарка. Але сама горш, што зноў чакалася навальніца.

З поўдня, скуль нарэшце падзьмуў і вецер, ужо насоўвалася на сонца хмара. Неўзабаве данесліся грымоты, але чамусьці з-за саснякоў, хоць у тым баку неба было чыстае. Вадзім адышоўся трохі ў жыта і нарэшце ўбачыў: самае страшнае, аказваецца, падкрадвалася адтуль, з-за ляска. Хмары там былі ажно чорна-сінія, моцна збітыя ў адну тугую масу і нагадвалі крэмень, па якім нехта нябачны

з волатаўскай сілай біў чымсьці вострым, высякаў маланкі-стрэлы.

Вадзім замітусіўся, не ведаў нават, што рабіць. Бегчы ў вёску было няблізка, а яшчэ прасіцца да каго чужога ў хату ён нізавошта не асмеліўся б. Хіба што дабрацца да канторы? Але каго ён удзень заспее? Пянькоў каб быў тамака, то пра яго ўжо напэўна ўспомніў бы. Як жа інакай?..

Мільганула думка падацца да жней, туды, у другі канец поля, скуль з гадзіну таму чуліся спевы. Але ж зараз адтуль — ні гуку, мусіць, перад навальніцай усе паразбягаліся дадому.

Пакуль ён гэтак разважаў, вецер як ашалеў, узняў у сасняках такі шум, вэрхал, быццам сабраўся павырываць з коранем усе запар дрэвы. Ісці туды і шукаць там якога зацішку было б больш чым неразумна. «Во папаўся, дык папаўся! » — Вадзім, думаючы пра сябе, занепакоіўся яшчэ, як уратаваць, каб не расшкуматала ўшчэнт, жытнёвыя снапкі. Паставіць у мэдлік? Ажно ветру толькі і трэба тое, ён умомант, калі будзе па-ранейшаму гэтак шалець — а ён яшчэ, здэцца, нават узмацняецца,— падыме ў паветра і знясе невядома куды ўсё нажатае. Пакінуць снапы вось так, уроскід на зямлі, таксама нельга: дождж, а то, можа, і град, збэрсае, пасячэ нагвалт, змалоціць да каліўца кожны колас. Што ён, Вадзім, тады падбярэ, як апраўдаецца за сваю нядбайнасць?

Неўзабаве чыркнула ў паўнеба маланка, і ён, асляплены, адразу прысеў на кукішкі, унурыў галаў. З жахам чакаў перуна. Аднак абышлося пакуль звычайным громам, які глуха і буркатліва, але таксама досыць пагрозліва пракаціўся недзе за ляском.

Вадзім падхапіўся, зноў ліхаманкава пачаў шукаць нейкай рады. Непадалёк вока ўпала на таўставатае бярвенца, і тут нечакана ўзнікла думка скласці снапы шчыльней адзін да аднаго, накідаць на іх травы ці якой саломы, а мо і таго лепш — лапніку, і прыціснуць такім бярвенцам. Калі будзе мала аднаго, дык пашукае яшчэ. Не можа ж быць, каб не знайшлося яшчэ чаго цяжкога.

Ён рабіў цяпер як апантаны, ужо амаль у цемнаце, якая раптоўна чорнай коўдрай ахінула наўколле і толькі на секунду-другую асвятлялася злавесным агнём маланак: ламаў найбольш густыя лапкі, спехам зносіў у кучу, пасля прывалок тое бярвенца і яшчэ тры зламаныя некалі, ужо без сукоў, сасонкі. Калі снапкі былі ўрэшце акрыты,

прыціснуты зверху, Вадзім змог аглянуцца, прыслухацца, што творыцца кругом.

А тварылася чортведама што. Усюды стаяў суцэльны гуд. Яго ўзмацніла яшчэ лавіна дажджу, якая з новым шквалам ветру абрынулася на ўсё жывое і нежывое. Умомант Вадзім вымак да ніткі.

Але было б, мусіць, паўбяды, каб не перуны ды маланкі, якія штохвіліны кроілі зямлю і неба. Іншыя страхі павэдлуг з імі — цьфу, нішто. Вадзім спрабаваў заплюшчваць вочы, затыкаць пальцамі вушы, аднак хутка кінуў гэтае балаўство, бо пераканаўся: сляпую стыхію, хітры не хітры, не ашукаеш, цела ўсё роўна кожнай сваёй клетачкай адчувае пагрозлівую яе сілу.

Адзін раз пеканула так, што ажно спынілася сэрца. Калі трохі ачомаўся, не адразу зразумеў, дзе ён і што з ім: пластом, бы яго хто паклаў туды, Вадзім ляжаў у глыбакаватай канаўцы, напоўненай пеністай вадой, толькі галава тырчэла наверсе. Так-сяк выбраўшыся, ён гатовы ўжо быў маліцца, як рабілі ў вёсцы жанкі, толькі б хутчэй усё канчалася. Далей такога жаху ён, мусіць, не вытрымае...

Неба нібыта пачула яго. Паступова, з неахвотай, яшчэ агрызаючыся агнём і грымотамі, навальніца ўсё ж аддалялася, губляла сваю першапачатковую моц. Перастаў лупіць дождж, і хутка пасвятлела, а неўзабаве — о дзіва дзівоснае! — выглянула з-за хмар сонца. Цяпер яно было для Вадзіма як ніколі жаданае, ён не верыў нават, што яшчэ гадзін колькі таму не ведаў, як хавацца ад яго гарачых промняў. На вачах проста пачала падсыхаць зямля.

Вадзім таксама, нікога ўжо не баючыся — хто тут будзе зараз? — зняў з сябе адзенне, нават трусы, павесіў на сажань, уторкнуўшы яго ў зямлю, сушыцца. Штаны, праўда, збольшага абмыў папярэдне ад гразі ў той канаўцы, усё яшчэ да краёў напоўненай дажджавой вадою. Зноў здзівіла і скаланула ажно, як ён туды трапіў, як не захлынуўся...

Трэба было нарэшце глянуць на снапкі. Хлопца радавала, што ён дадумаўся гэтак накрыць іх, што нічога не параскідала, не пазносіла ветрам. А калі трохі памачыла, то нічога, сонцам зараз падсушыць усё.

Лапнік, надзіва, вельмі памог, не прапусціў вільгаці. Ва ўсякім разе, каласы, за рэдкім выключэннем, засталіся амаль сухія. Вадзім усё роўна паставіў снапкі так, каб больш даставалася кожнаму сонца, затым пайшоў пераварнуць адзенне.

У гэты момант, скуль і ўзялася, на дарогу ўсцяж ляска выехала падвода, пакіравалася ў яго бок. «Нарэшцеткі!» — Вадзім хапатліва пачаў нацягваць на сябе не зусім дасушаныя трусы, майку, штаны.

Як жа ён быў збянтэжаны, калі на падводзе, на ахапку саломы, убачыў дзяўчо ў вялікім, наапашкі, картовым пінжаку з чужога, відаць, пляча, затое ў караткаватай, цеснай для сябе белай сукенцы.

Адразу ў галаве мільганула думка, што дзяўчо, пэўна ж, бачыла яго голым, будзе зараз з гэтага рагатаць, яшчэ і ў вёсцы ўсім разбалабоніць. «І хто ёй лейцы даверыў?» — абурыўся напачатку Вадзім. Аднак калі возчыца ўладна нокнула на каня, гэтак пасля хвацка спыніла дзе трэба, ён ужо інакш глядзеў на дзяўчынку.

— Ты па мяне? — першы звярнуўся да «Канаплянкі» (твар у дзяўчо густа, гусцей ужо нельга, быў усеяны вяснушкамі).

— Ыгы,— радасна кіўнула галавой тая.— Дзядзя Ягор сказаў, каб я... Каб да яго ехаць.

— А хто ён, твой дзядзя Ягор? — зноў ледзь не абурыўся Вадзім.— Мне ў мястэчка трэ, а не да дзядзі. І так во колькі часу... А там яшчэ да цёці надумаеш.

«Канаплянка», аднак, бы і не заўважыла гэтага рэзкага тону, спакойна растлумачыла:

— Цёця памерла нядаўна. Дзядзя Ягор адзін зараз. Яму есці я раблю, мама таксама, але ёй некалі.

Вадзім, так нічога і не зразумеўшы, шчыльна саставіў між драбінак, калоссем уверх, усе свае снапкі, зноў пералічыў, прымацаваў, каб не скінуўся дзе часам, сажань, уторкнуў у салому серп. На воз з дзяўчом не сеў, пабрыў ззаду. Пасля ўсё ж скочыў у перадок. Хацеў узяць у свае рукі лейцы, аднак пабаяўся, што «Канаплянка» падумае, быццам ён ёй не давярае. Умасціўшыся разам на салому, ужо больш лагодна папытаў:

— А позна чаму так? Хіба Пянькоў не распарадзіўся?

Дзяўчынка няпэўна пацісн́ула плячыма:

— Дзядзя Ягор раскажа...

«Дзядзя Ягор аплёўваў увесь двор...— хацеў падражніць яе Вадзім, але перадумаў.— Свет на ім клінам сышоўся, ці што?»

«Канаплянка», відаць, адчула яго настрой, бо сама неяк адразу замкнулася, стала надта сур'ёзнай, трэба альбо не трэба нокала ўсё на каня.

У вёску ўехалі, калі сышлі ўжо дажджавыя ручаі

і ручаінкі, але гразі яшчэ хапала. На вуліцы, усе, бы чэрці, мурзатыя, насіліся па лужах дзеці, пырскаліся адзін на аднаго, вішчалі. Толькі цяпер, з воза, Вадзім заўважыў, якія тут несамавітыя хаты, не тое што ў іхняй Жорнаўцы. Жорнаўцы гадоў за колькі да вайны не пашанцавала, уся згарэла, і людзі будаваліся нанова. Затое зараз хаты ў іх як хаты, не раўня гэтым, нейкім скасабочаным, з саламянымі парослымі стрэхамі, з падслепаватымі ваконцамі.

— Тп-п-п-р-р-у! — скамандавала каню дзяўчо, спыніўшыся ля высокіх, шчыльна збітых варотаў. Затым павярнулася тварам да Вадзіма.

— Дзядзя Ягор, мусіць, у хаце.

«Ды пайшла ты са сваім...» — па-сапраўднаму ўжо хацеў вылаяцца Вадзім, але асекся, адразу праглынуў язык: на вуліцу, ляпнуўшы брамкай, выйшаў... сам Пянькоў.

— Во, дзядзя Ягор, прывезла! — адрапартавала «Канаплянка», зноў засвяціўшыся тварам.

Пянькоў, дзіўна неяк апрануты — дыяганалевае галіфэ, зашпіленае не на ўсе гузікі, босыя ногі ў нейкіх ірваных атопках, зваляная, з пахам нафталіну кашуля паверх штаноў,— падаў Вадзіму руку, пацісну́ў.

Вадзім не ведаў, дзе дзяваць вочы: гэта ж трэба так апраставалосіцца! Вось табе і Ягор, які «аплёваў увесь двор...». Добра яшчэ, што не ляпнуў такое пры дзяўчо. Сказала б пасля дзядзю, той, пэўна, не схацеў бы з ім і хвіліны знацца.

— Ты, Марына, пасядзі пакуль на возе, папільнуй, каб дзеці не палазілі. А мы, стала быць, трохі падсушымся, перахопім чаго...— Пянькоў, сказаўшы гэта «Канаплянцы», запрасіў хлопца ў хату.

Вадзім пакорна пайшоў услед за старшынёй. Напамінак пра яду расцвяліў у ім шалёны апетыт. Успомніў, што гэта ж з самай раніцы як паеў дома таго селядца з картопляй, дык нічога і ў роце больш не меў. Спадзяваўся, што ў абед будзе ўжо ў мястэчку, а там — балазе ёсць у кішэні невялікія грошы — падсілкуецца ў сталоўцы. Але ж з-за навальніцы во як выйшла...

Кіўнуўшы на крэсла пры стале, Пянькоў сам знік за перагародкай, нечага там завазіўся. Ужо адтуль падаў голас:

— Крэпка, стала быць, дасталося? А мяне і самога навальніца накрыла ў дарозе. З Радава акурат вяртаўся, у райком клікалі. Дык тожа не было дзе прыткнуць галаву.

Яшчэ і плашч не прыхапіў, думаў, пранясе сёння. А не пранесла. Дало дык дало. Конь хоць і прывучаны да ўсяго, але таксама трохі, стрыг вушамі, не знаходзіў сабе месца.

— Гэта вы на гэтай падводзе ездзілі? — папытаў Вадзім.

Пянькоў вярнуўся ў пярэдні пакой ужо ў гімнасцёрцы, на якой віднеліся сляды ад пагонаў, але ногі па-ранейшаму былі ў парваных атопках.

— Не, у мяне для раёна другі, лягчэйшы, вазок. А на кані, то на гэтым. Марына яго надта любіць, дык хутка ёй перапрэглі, яна і паехала па цябе. Завязе і ў Радава. Сама напрасілася. Толькі вот перакусім. Можа ж, успееш?

Вадзім нічога не адказаў, хоць было вельмі прыемна, што старшыня размаўляе з ім нібы з роўным сабе.

На стале між тым з'явілася талерка нарэзанага скрылікамі сала, паўкулідкі крамнага, але добра, бачна, выпечанага, хлеба, некалькі свежых, толькі з грады, агуркоў.

Елі моўчкі. Пянькоў усё падсоўваў Вадзіму сала, а сам да яго чамусьці і не дакранаўся, хрумстаў толькі зялёны гурок з хлебным мякішам, адкладваючы ўбок скарынкі. Вадзіма здзіўляла, як можна не есці гэткага смакоцця. Нечакана падумаў, што, можа, старшыня эканоміць, адно дзеля госця і выставіў такі частунак.

Адразу неяк прапала ахвота жаваць, браць яшчэ чаго ў руку. Пянькоў гэта заўважыў, замітусіўся і, хаваючы глыбока ў вачах сум, сказаў:

— Еш, еш, хлопча. А на мяне, стала быць, не глядзі. Не магу я... Усё ўсярэдзіне ўжо...

Ён не дагаварыў, што ў яго там усярэдзіне, раптам падняўся, адным махам расчыніў акно, прагна ўдыхнуў свежага паветра. Пасля няголасна паклікаў:

— Марына!

«Канаплянка» доўга не забавілася, увішна, бы віхор, уляцела ў хату, пільным вокам акінула стол, прапанавала:

— Яшчэ, можа, агуркоў нарваць, дзядзя Ягор?

— Нарві, стала быць, калі не лянуешся, і сама з'еш трохі. Пакуль жа вернешся...

«Не такая яна, аказваецца, і маляўка,— цяпер ужо інакш падумаў пра дзяўчынку Вадзім.— Гэта рост і твар яе такою выдаюць».

Марына выйшла, а Пянькоў зноў падсеў да стала, ад няма чаго рабіць — ці і праўда было цікава — папытаў у Вадзіма, скуль ён, з кім жыве, які кончыў клас. Хлопец

збольшага расказаў пра сябе. Пянькоў, паклаўшы на стале абедзве рукі — адна з іх, правая, была нямала знявечана, на кісці віднеўся глыбокі след загоенай раны,— неяк безуважна, бы і не слухаў зусім, сядзеў у адной паставе, поглядам быў недзе далёка-далёка. Але толькі Вадзім перапыніўся на хвілінку, як старшыня тут жа азваўся:

— Гавары, хлопча, я чую... Проста думаецца ўсякае...

«Канаплянка» перашкодзіла іхняй размове. Прынесла яшчэ некалькі мокрых пасля дажджу гуркоў, у дадатак паклала на дошчачку і пук зялёнай цыбулі.

— Па кіслае малако збегаю, дзядзя Ягор. Добра? — папытала дзяўчынка.— Мама прыгатавала.

— Хай ужо без кіслага будзе. Я пасля сам схаджу. А ты вот пасядзі, перакусі таксама. І зараз, стала быць, паедзеце. А мне яшчэ на поле. Там жа сёння жаць пайшлі... — Пянькоў зноў накроіў хлеба, таўставатыя лусты, а зверху — скрылькі сала, паклаў перад абаімі.— Ешце. І цыбулю бярыце. Вітаміны. Вам жа расці і дужэць...

— А вы, дзядзя Ягор? — папытала Марына.— Хіба наеліся?

— Колькі мне трэба. Добра во, што хлеба дастаў у мястэчку. Вечарам маці дам крыху.

«Канаплянка», мусіць, таксама згаладалася, бо апетытна накінулася на яду. Услед за ёю і Вадзім смялей узяў новую лусту. З хлебам ды салам добра ішла цыбуля.

У Пянькова раптам павільгатнелі вочы, з нейкай дрыготкаю ў голасе ён загаварыў:

— Дзеці, можна сказаць, вы яшчэ, а колькі ўжо і на вашу долю... Эх-ма-а!.. Сэрца баліць, і галава ад думак пухне. А што зменіш? І чаму так, чаму?..

— Вы пра што, дзядзя Ягор? — «Канаплянка» відавочна захвалявалася.— Можа, вам сказалі што дрэннае?

Пянькоў — Вадзім зараз яго не пазнаваў, чалавека бы ўсё роўна падмянілі — ці не звярнуў на яе словы ўвагі, ці не пачуў, працягваў нешта сваё, што прасілася нагвалт з душы:

— Ваявалі, не шкадавалі ні жыцця, ні крыві, думалі, што ўжо не будзе так, як было. Многаму ж і вайна вучыць. Але, мусіць, не навучыла. Ці мала навучыла... Ну чым, чым правінілася Соня? Чаму з ёю так? А бабы, дзеці нашыя? Вёска, ніхто асабліва не ўбачыць, не пачуе, дык можна, стала быць, з яе апошнія жылы цягнуць. Эх-ма-а!.. — Ён рэзка махнуў у паветры знявечанай рукой,

пасля падхапіўся, зноў, шлёпаючы атопкамі, падаўся да расчыненага акна.— І горш яшчэ абідна, што сябры, з кім і вошы адны кармілі, і смерці разам у твар глядзелі, і скарынкай астатняй дзяліліся, цяпер, як селі ў крэсла, пысу адварочваюць, нічога не хочуць ні знаць, ні ведаць... Сёння ў райкоме кажу Ягораву: ты ж сакратар, адказваеш за лёс людзей, табе давяраюць. Прыедзь у вёску, паглядзі, як жывуць, загляні ў хаты, на поле загляні. Сам усё ўбачыш... І не будзеш гэтулькі трэбаваць. Хай жа ім хоць трохі чаго застанецца. А ён... Эх-ма-а! Што й казаць? Вымову во ўляпілі, шчэ гразіліся партбілет забраць. Соню зноў прыпомнілі... Абідна!

Вадзім далёка не ўсё разумеў з таго, на што скардзіўся Пянькоў, што мучыла, гняло яго. Але калі ўжо адкрыўся ім, ды не ў самы, мусіць, найлепшы для гэтага час, то добра-ткі дапякло, не мог чалавек болей трываць.

Яму было ўжо няёмка сядзець за сталом, і ён падняўся, падзякаваў за ўсё, сабраўся ехаць. Паднялася ўслед, зразумеўшы ягоны намер, і «Канаплянка». Пянькоў выйшаў праводзіць, але, бы засаромеўшыся сваёй мінутнай слабасці, хаваў старанна вочы, сам забраў з воза сажань і серп, кінуў праз вароты ў двор. На развітанне, калі Марына зняла са слупка лейцы, калі добра, зноў жа спераду, умасцілася на саломе, пакінуўшы месца Вадзіму, ён падышоў да каня, агледзеў вупраж, падцягнуў сядзёлку, паправіў хамут.

Не ведаў тады яшчэ Вадзім, што ніколі ўжо не стрэне гэтага чалавека, які нечым растрывожыў, пасеяў у галаве цэлы рой няясных думак...

Недзе праз месяцы два, не болей, трапіла яму ў рукі раённая газета «Светлы шлях», і там, на апошняй старонцы ў маленькай чорнай рамцы знізу, было дробнымі літаркамі напісана: «Радаўскі райком партыі і райвыканком смуткуюць з прычыны раптоўнай смерці старшыні калгаса «Узгор'е» Пянькова Ягора Мітрафанавіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім».

Гэтая вестка скаланула Вадзіма, ён ажно не паверыў сабе, яшчэ і яшчэ раз перачытаў напісанае. Не, памылкі не было. Горкі, што палын, камяк перахапіў дыханне. Хацелася заплакаць, і ён як мага стрымліваў слёзы. Каб было чым і калі, ён, здэцца, хоць зараз пад'ехаў бы ў тую глухую вёску з саламянымі стрэхамі, з падслепаватымі вокнамі, знайшоў бы «Канаплянку», папытаў бы, што ж, што сталася з яе дзядзем. Аднак часу ў яго такога не было.

У самога закруцілася так, што хоць у пятлю лезь, ён роспачна шукаў выйсця, як жыць далей...

Але гэта ўсё было пасля.

А тады, едучы з Марынаю ў мястэчка, везучы жытнёвыя снапкі, Вадзім доўга маўчаў, «перамолваў» у галаве нагаворанае Пяньковым. Памагла «Канаплянка». Відаць, ёй таксама нешта муляла, хацелася з кім — не з канём жа — адвесці душу, і яна, бы старая бабуля, забедавала:

— Бедны дзядзя Ягор! Я і мама гэтак яго жалеем...

— А чаго, чаго яго жалець? — толькі каб падражніць дзяўчо, тым самым выпытаць як мага болей, азваўся Вадзім.— Падумаеш, вымова там нейкая... Перацерпіць!

«Канаплянка» ўспыхнула, была адвярнулася, але паступова адтаяла. За дарогу Вадзім выпытаў у яе многае. Найбольш сумнае было — пра Соню. «Вось, аказваецца, хто яна Пяänькову! — цяпер толькі дайшло да Вадзіма.— То ж яго жонка...»

Марына між тым казала:

— Дык калі па радзіве канец вайны аб'явілі, але дзядзя яшчэ не вярнуўся з фронту, цёця Соня ўзяла напісала некаму, каб пашукалі яе брата. Мама сама чытала, як цёця жаласна тое напісала. Што Іван, ну, брат яе родны, аніякі зусім не вораг, гэта нехта па злосці хацеў яго ўкусіць, бо ўсе яго добра ведалі ў Радаве, любілі і ў банку, дзе ён там некім важным быў, і ўсюды любілі... А пасля, калі яшчэ вайна не пачалася, забралі яго ноччу, некуды павезлі ў чорнай машыне. І ўсё з кварціры чысцютка выграблі... Чакала цёця, чакала, што будзе, што адкажуць, а тады, не дачакаўшыся, яшчэ паслала адну заяву. Туды ж, куды першы раз. Цяпер ужо цёця надта раззлавалася, пісала, што муж яе, ну, дзядзя Ягор, маёрам у арміі, ваюе з фашыстамі, кроў сваю ліе, а яны і пораху не нюхалі, шукаюць ворагаў, дзе іх саўсім няма і не было, што яны там, відаць, усе падурнелі, яна іх выведзе на чыстую ваду, яна дойдзе і да саменькай Масквы. Там усё ўзнаюць, хай не думаюць, што так гэта ім пройдзе — нявінных людзей хапаць ноччу, здзек над імі чыніць, а потым — канцы ў ваду...

— Ну і што? — Вадзіму не цярпелася знаць далей гэтую гісторыю, хоць ён чамусьці і верыў і не верыў «Канаплянцы»: ат, ці мала чаго дзяўчо можа навыдумляць ад няма чаго рабіць?

Яны ехалі, можа, з гадзіну, але да мястэчка было яшчэ далекавата. Марына цяпер не падганяла каня, і ён трухаў

памаленьку па вільготным жвіры, звыкла, прывучаны, відаць, да гэткіх паездак, трымаўся краю гравійкі, каб не мяшаць часам якой выпадковай машыне.

— Папалася і цёця, што ж далей...— у Марыны ажно голас раптам перасеў, яна і раз, і другі шмыгнула носам, пасля рукавом пінжака церанула па твары.— Узялі яе ў нейкую бальніцу, сказалі, што яна ненармальная, што лячыць трэба. Мы доўга яе шукалі, мама была ўся ўчарнела, гэтак перажывала, аб'ездзіла ўсякіх начальнікаў, але ніхто нічога не ведаў. Толькі калі дзядзя Ягор вярнуўся, тады толькі неяк знайшоў, прывёз цёцю дадому. Ніхто яе ў вёсцы не пазнаў, гэтак змянілася. І не гаварыла ані. Скора ў цёці Соні і праўда з галавой нешта зрабілася, яна ўсё рагатала, і яе адвезлі ў дом, дзе шалёныя...

«Канаплянка» на апошніх словах зусім раскісла, была нават усхліпнула, і Вадзім не пытаўся больш у яе ні пра што, сядзеў, утрапёна глядзеў на дарогу. Там, дзе заходзіла сонца, у яго промнях выразна бачыліся ўжо крайнія местачковыя хаты, атуленыя прысадамі.

## 4

Ішоў дзень за днём, усё на целе нібы зажыло, вярнуліся сілы, ён хадзіў ужо ў кантору, падпісваў паперы, і на Аскары ўспеў праехацца па полі, стараючыся, праўда, доўга нідзе не затрымлівацца, асабліва каб не мазоліць людзям вочы, а боль, не гэтак фізічны, як душэўны боль, змешаны напалам са страхам, чаканнем нечага непапраўнага, пастаянна нагадваў пра сябе, ніколькі нават не менеў.

З'явілася было жаданне плюнуць на ўсё тут, з'ехаць куды як мага далей, дзе яго не ведалі, яшчэ раз пачаць жыццё спачатку. Але што, што ён умеў рабіць? Зноў, як і да вайны, папрасіцца рамонтнікам у МТС? Бр-р-р, толькі не гэта. Не па ім, Рагулю, была тая праца. Як нешта недаравальна страчанае ў жыцці, успамінаў ён час, калі трэба было штодзень усцягваць на сябе зачуханую, ушчэнт замусоленую робу, па шмат гадзін, а то, бывала, і суткамі запар, калі няўпраўка якая, калупацца ў маторах, бясконца нешта чыніць, зварваць і кляпаць, яшчэ чортведама што рабіць, браць да пасінення на пуп, падымаючы розныя жалязякі, а ў абед у маленькай бруднай бытоўцы жаваць сухую пайку — сала, хлеб і цыбулю, радзей кава-

лак кілбасы, пасля, наспех перакінуўшыся ў карты з такімі ж, як сам, рабацягамі, «камінарамі» — гэтак жартам называлі яны адзін аднаго за вечна чорныя твары і рукі,— плесціся на сваё рабочае месца, каб, барані Бог, не спазніцца. Бо калі спознішся і раз, і другі, нешта недаробіш, начальства ўжо воўкам глядзіць, можа пры выпадку цябе пакараць і рублём, і на сходзе яшчэ збэсціць, абвінаваціць ва ўсіх смяротных грахах. Хто ты для яго? Звычайны вінцік, якіх нямала валяецца ў іх нават пад нагамі...

Таму, круці не круці, думай не думай, нікуды адсюль яму, мусіць, ужо не вырвацца, такой работы, ды яшчэ з добрым, на талковую галаву, наварам — усё ж, як-ніяк, старшыня калгаса, зусім не апошняя ў раёне фігура,— болей нідзе не знойдзеш. Там, на новым месцы, не будзе другога Кантовіча, хто б зноў закінуў за цябе слова, далікатна, неназойліва, але цвёрда ўвёў каму трэба ў вушы, што ты чалавек акурат той, на каго можна палажыцца, маеш хватку кіраўніка, які хоць кроў з носа, але выцісне, мабілізуе, выканае дырэктыву... Ого, падтрымка ўплывовага сябра не мала значыць.

Апошні час, праўда, сувязь іхняя пачала паступова слабнуць, і гэта не магло не турбаваць Рагулю. Сустракаліся яны цяпер хіба на раённых нарадах, радзей — выпадкова — дзе на вуліцы ў мястэчку і яшчэ радзей — удвух за чаркай, найбольш у каго-небудзь з іх дома. Дома можна было нічога не баяцца, ні на кога не аглядвацца, уволю хоць выгаварыцца, а добра падпіўшы, дык і схапіцца за́грудкі, каб праз мінуту-другую ўжо цалавацца і плакаць...

Патрэбу пабачыць былога сябра, спаражніць перад ім душу адчуў Рагуля асабліва зараз, пасля гэтай паганай з ім гісторыі ў лесе. Можа, Кантовіч развее яго новы страх, можа, усё, што адбылося,— звычайная недарэчнасць, помста, хай сабе і вельмі жорсткая, за бойку ў рэстаране, за тую цыганістую грудастую самачку, якая сама чаплялася, бы смала, намякала некуды з ёй пайсці, пасля, ужо на вуліцы, усадзіла з нечай дапамогай яго на пахкае мурожнае сена ў вазку, села побач сама... О, каб гэта было так! Але ж тачылі мазгі, ні днём ні ноччу не давалі спакою словы некага сіпатага, сказаныя ўжо там, у цёмным лесе, калі з яго, Рагулі, пачаў выветрывацца сівушны дурман, калі адчуў, што нечыя рукі прывязваюць яго, голага, да шурпатай елкі: «Не цырымоньцеся надта. Знаю гэтага паганца... Сабаку сабачае». Няўжо гэта выпадко-

вые словы? І хто ён, той сіпаты? Скуль яго ведае, што трэба яму?..

Думкі, ад якіх можна ажно звар'яцець.

Рагуля зноў і зноў круціў ручку апарата, прасіў тэлефаністку злучыць яго з кабінетам Кантовіча, але тэлефон каторы ўжо дзень зацята маўчаў. Ехаць самому ў мястэчка Васіль Агафонавіч пакуль не мог, бо твар далёка яшчэ не ўвесь ачысціўся ад слядоў учыненага над ім гвалту.

Дзе ж, аднак, Антон Захаравіч, куды мог адвінуцца ці з'ехаць? Рагуля папрасіў цяпер злучыць яго хоць з кім-небудзь з райспажыўсаюза, папытаць пра Кантовіча.

— Хвілінaчку,— сказала тэлефаністка, і праз колькі секунд на другім канцы провада пачулася:

— Слухаю.

Рагуля сумеўся, пазнаўшы густы, пракураны бас самога Боўтача, старшыні райспажыўсаюза, з якім не размаўляў з таго дня, знарок нават не вітаўся, калі перадалі, што яго, Рагулю, Боўтач сваёй рукой выкрасліў са спіса на матацыкл з каляскай, хоць многія старшыні даўно ўжо фарсіста ганялі жалезных коней, а ён па-ранейшаму змушаны націраць зад на сваім Аскары і чакаць, чакаць, чакаць...

Васіль Агафонавіч не стаў нічога пытацца, павесіў трубку. Вырашыў, што пазвоніць Кантовічу надвечар ці ўжо заўтра з саменькай раніцы, як толькі з'явіцца на работу.

У канторы, слава Богу, было пуста. Ен ведаў, што і сёння, і заўтра, і ў бліжэйшыя дні ніхто з калгаснікаў сюды не загляне, ні з якімі заявамі, скаргамі ці просьбамі не папрэцца, бо некалі: усе, нават яго бухгалтарка, «Цыфіра», зараз у полі. Давэцьку, іншым брыгадзірам ён строга загадаў сабраць і дзяцей, і старых, успароць з печы нямоглых, не кажучы ўжо аб працаздольных, каб за тыдні два, а то і меней, усё чыста зжаць, абмалаціць ды здаць збожжапастаўкі.

Вельмі хацелася Рагулю хутчэй адрапартаваць: во, выканаў і нават перавыканаў, найпершы свой запавет перад дзяржавай стрымаў. Ен ведаў, што гэта заўважаць, абавязкова распішуць у газеце, нават і ў абласной, знойдуць магчымасць яшчэ неяк адзначыць... А што? Калгас іхні, дзякуючы жалезнай дысцыпліне, якую ён, Рагуля, увёў, нават штрафам, хоць за гэта многія глядзяць на яго воўкам, гатовы ажно зжэрці, па зводцы ў раённай газеце

дабраўся недзе ўжо да сярэдзіны. Яшчэ год-два, і можна наступіць на пяткі ганарыстаму Лабунку з «Перамогі», якога начальства хваліць дзе трэба і не трэба, нават ордэн для яго расстараліся.

Рагулю падалося, што нехта ў калідоры шкрабецца, і ён выйшаў з кабінета паглядзець, хто б гэта мог быць. Нікога не ўбачыў, але сэрца чамусьці часта-часта затахкала.

Васіль Агафонавіч ажно плюнуў, голасна вылаяў сябе, што стаў гэткім нервовым і палахлівым нават удзень, нават у сваёй канторы. Ён вярнуўся, зноў сеў у крэсла, глынуў з графіна трохі вады. Затым, успомніўшы, што ў шафцы за папкамі, іншымі паперамі схавана нечапаная бутэлька «Маскоўскай», адразу павесялеў.

Шклянка гарэлкі, выпітая залпам, адным доўгім прагным глытком, апякла ўсё ўсярэдзіне, ён нават хаўкнуў, пашкадаваў, што няма чаго кінуць у рот прыкусіць. Але ўжо праз якую хвіліну жыватворнае цяпло імклівымі токамі пайшло па целе, неяк непрыкметна прытупіла трывогі і страх, развеяла змрочны настрой. Падумалася адно, што дарэмна паслухаў, бы малое дзіцё, Любу, не настаяў тады, калі курчыўся ад болю, калі бездапаможнай падлай валяўся ў сябе ў ложку, нікога, апроч яе, не пускаючы ў хату, каб прынесла хоць кроплю чаго, гарэлкі, віна ці спірту, і дала тым самым забыцца. Усё ж ёсць, ёсць лякарства лепшае, чым тыя таблеткі, націранні, прымочкі, якімі гаіла яго Люба. Гаіла цела, а для душы, што было яму зараз важней за ўсё на свеце, лекаў не знаходзілася.

А душа, што ні кажы, балела. Чамусьці часцей і часцей пачалі адольваць думкі пра дом, пра ўчарнелага ад гора, раптоўна пасівелага бацьку, пра брата Косцю. Ці жывыя яны? Хоць бы як даведацца, як цішком, не паказваючыся нікому на вочы, з'ездзіць туды. Аднак і далёка гэта вельмі, і рызыкоўна, можа хто пазнаць, а тады... Дый ці даравалі б, каб жывыя былі, бацька і брат, не кажучы пра аднавяскоўцаў? А Ліна? Як яна? Хай бы ўжо выйшла лепш за тога ветэрынара, хай бы шчаслівая была з ім, чым зараз так мучыцца яму, Рагулю, насіць у сабе, ніколі і нікому не адкрываючыся, нават Кантовічу, вялікі, невыказна цяжкі камень на сэрцы.

А вінавата ўсё ж яна, Ліна. Гэтак добра напачатку складвалася ў іх, гэтак кахалі адно аднаго, і раптам...

Ён тады, у тую вясну перад вайной, набыў ужо добры касцюм, чаравікі, планаваў неўзабаве надзець, пафарсіць

у капелюшы, як некаторыя з гарадскіх. А што, чым ён горшы? Пры кожнай сустрэчы з Лінай гаварыў, колькі адклаў грошай, як яны спраўна зажывуць разам, хай толькі ён збярэ больш, купіць усё патрэбнае.

Неяк, калі сядзелі вечарам на беразе іхняй задумлівай, ціхаплыннай Лазнянкі, калі ўжо зайшло сонца і ў тым баку, над далёкай, за лугам, шчоткай лесу надта ж грала, шчодра разлівала барвы неба, Ліна, варта было яму заікнуцца, сказаць, што нагледзеў сёння ў магазіне, раптам успыхнула, адпіхнула яго ад сябе, бы ўджаленая, ускочыла на ногі.

— Лін, ты чаго? — заклапочана спытаў у яе.

Але дзяўчына зацята маўчала, толькі цяжка дыхала, стрымліваючы нешта ў сабе, была і з твару сама не свая.

Лепей бы і яму тады памаўчаць, мо яна ачнулася б, села побач, зноў прыхінулася б да яго пляча. Але ж яго, як на тое, бзык нейкі ўкусіў, прачнуўся непатрэбны зараз мужчынскі гонар, выліўся ў раздражнёныя словы:

— Вот яшчэ фокусы! Пстрыкаеш невядома чаго. Я ёй як на споведзі, а яна... Глядзі, дапстрыкаешся. Думаеш, свет клінам на табе сышоўся?..

Адсохнуў бы яго лепш язык, перш чым такое ляпнуць Ліне. Але ляпнуў, і было позна ўжо нешта паправіць. Ліна ўсхліпнула, скрозь слёзы сказала:

— Шкода, што толькі і наўме табе тыя грошы. Думала, змагу адкрыць вочы на нешта яшчэ, не раўня ім. Во вечар які, глядзець, слухаць, цешыцца б... А ты... Не, не пара мы, гэта я ўжо знаю... Ты і халодны робішся, і мяне нават не бачыш, як расказваеш сваё. А калі б разам, дык саўсім...

Яна, роспачна махнуўшы рукой, пабегла ў бок вёскі. Пакуль Рагуля апомніўся, дзяўчыны і след прастыў. Ён доўга блукаў па вуліцы, стаяў пад бэзавым кустом ля іхняй хаты, заглядваў у цёмныя вокны, думаў усё, што Ліна не спіць, выйдзе і яны зноў паміраццa.

Ліна, аднак, не выйшла. Пачало брацца ўжо на раніцу, і толькі тады ён паплёўся ў сваю, суседнюю, вёску, каб хоць паўгадзіны падрамаць, пасля, абліўшыся халоднай вадой, хапіўшы чаго ў рот, зноў спяшацца за пяць кіламетраў на тую абрыдлую работу ў МТС.

Мінуў тыдзень, пайшоў другі. Няпэўнасць з Лінай мучыла Рагулю. Але ён вырашыў усё ж набрацца цярпення, не шукаць пакуль сустрэчы з дзяўчынай. Чамусьці быў упэўнены — і ўжо гэтак было аднойчы,— што яна адума-

ецца, павініцца, першая падасць голас. З іхняй жа Залатоўкі ў эмтээсаўскай канторы робіць Лініна сяброўка Саша Белая, праз якую Ліна неаднойчы перадавала яму той ці іншы наказ.

Зараз, аднак, Белая маўчала, бы вады ў рот набраўшы. А неўзабаве нехта з хлопцаў перадаў Рагулю, што каля Ліны малады чупрыністы ветэрынар аціраецца...

Такой аплявухі ён ніяк не чакаў. А тут яшчэ не то спачуваць, не то смяяцца ў вёсцы пачалі: маўляў, во дзеўка дык дзеўка, гэткага хлопца кінула, касцюм які, капялюш мае, эканомны, рубля нідзе лішняга не вытрасе, а яна, сікуха залатоўская, бач, на вучанага памяняла, яшчэ большых грошай схацела... А таго не заўважае, што «віцінар» і тварам нейкі няўдалы, нават чупрына не ратуе, і дохлы надта ж, адны косці ды скура, і апратка неважнецкая. Адкуль такога выпаралі?

Тыя словы бы тупым нажом рэзалі яго па жывым, выклікаючы бяссільную злосць. Яна гэтак саспела, закаламуціла галаву, што піхнула на новы неабдуманы крок.

Калі ў нядзелю на беразе Лазнянкі хлопцы зноў наладзілі гулі, запрасілі музыкантаў, Рагуля пайшоў туды з цвёрдым намерам правучыць нахабніка, бо, казалі, ён з Лінай ужо з'яўляўся і на танцах, і ў кіно вадзіў, і катаў яе на калгасным веласіпедзе.

Рагуля і праўда краем вока згледзеў Ліну ў гурце хлопцаў і дзяўчат побач з нейкім кучаравым, але той не падаўся, як распісвалі яму, вельмі лядашчым і брыдкім. Ды і апрануты быў хоць, можа, і не дарага, затое зграбна: белая кашуля з закасанымі вышэй локця рукавамі, на поясе паверх старанна адпрасаваных, са стрэлкай, штаноў шырокі рэмень з бліскучай жалезнай спражкай.

«Піжоніцца, аднак...» — шалёная кроў прыліла Рагулю да скроняў, ён, здэцца, зараз вось, пры ўсіх, паказаў бы гэтаму чыстаплюю, каровінаму лекару, чаго варты сапраўдны рабацяга і як адбіваць у каго чужых дзевак. Спокан веку між іхнімі хлопцамі вялося: занята якая, дык, як бы табе ні ўпадабалася, не лезь да яе, пашукай іншую, вольную. Хіба толькі хто кіне сам, тады, і то загадзя перагаварыўшы з ранейшым кавалерам, а мо і магарыч у кампаніі выпіўшы, можаш падлабуньвацца, ладзіць з той, пакінутай, любошчы. Таго, хто забываўся, парушаў гэты няпісаны закон, білі моцна, няшчадна, так, каб стала навукай іншым.

Ён, аднак, зараз стрымаў сябе, вырашыў пачакаць,

калі добра прыцямнее. Каб не сутыкнуцца твар у твар з Лінай, спусціўся з крутога берага, пайшоў па вільготным жвіры ўсцяж рэчкі.

Праз метраў сто яго дагнаў аднавясковец Юрка Блінаў, ці Блін, як называлі гэтага гультаяватага, вечна пад градусамі дзецюка і старыя, і малыя, прапанаваў:

— Слухай, папалошчам горла, га? У мяне, бляха, во...— Блін паказаў на адтапыраную кішэню.

Рагуля з радасцю згадзіўся, хоць перад гэтым не схацеў, як ні запрашалі, выпіць дома: да бацькі якраз завітаў знаёмы ляснік, і стары выняў дзеля яго даўно прыхаваную бутлю, а матка пачала завіхацца з закуссю.

Яны, сеўшы на пляскаты камень, праз рыльца высмакталі па чарзе ўсё з пляшкі, парожнюю пасуду кінулі ў раку.

— Хай, бляха, і рыбка панюхае трохі, шустрэй загуляе,— выскаліўся са сваёй дасціпнасці Блін, пасля без перадыху спытаў: — Бачыў таго... ну, ля тваёй што? Калі фізію будзем чысціць? Ці ты, бляха, ужо зміры́ўся?

Рагулю цюкнула ў голаў думка скарыстаць Бліна, з яго дапамогай выманіць лекара з кола, адысціся, адно Ліна за імі не ўвязалася б, і тут пусціць прыблуду юшку, ды так, каб дадому і ракачом не мог дапаўзці.

Блін падахвоціўся ўсё зрабіць чын чынам, узяў на сябе ролю пасыльнага.

Застаўшыся адзін ля рэчкі, Рагуля прыкідваў варыянты, гадаў, як быць, калі сапернік яго не выйдзе, калі раптам здагадаецца, што чакае яго па-за колам. Зрэшты, можна тады ўжо і не далікатнічаць, пры ўсіх — хай бачаць і ведаюць нашых — падмяць пад сябе гэтага завумнага шыбздзіка і, як кажа Блін, «пачысціць яму фізію».

Ён нямала здзівіўся, калі ў густым вячэрнім прыцемку згледзеў дзве няясныя постаці, якія кіраваліся ў бок ракі. Бліжэй пазнаў ужо і Бліна, і таго, кучаравага.

— Во ён самы,— цыркнуў слінай Блін, спыніўшыся ля Рагулі.— Ён, бляха, падумаў, мусіць, што на сто грамаў сюды яго клікалі. Зараз нап'ецца...

Не паспеў Рагуля і апамятацца, як Блін першы коршакам кінуўся на ветэрынара. Але чамусьці — ці не спатыкнуўся? — тут жа, толькі глуха неяк хаўкнуўшы, як падавіўся чым, грымнуў вобзем.

— Ва-а-ась! — заенчыў праз хвіліну Блін, спрабуючы стаць на ногі.— Нашых, б-б-бляха, б'юць...

Даравацьтакое было ўжо нельга. Такое не ўпісвалася

ні ў якія рамкі: каб нехта прышлы, няхай сабе і пры пасадзе, устанаўліваў тут свае парадкі, баламуціў ваду ды яшчэ, замест таго каб павініцца, сам лезе ў бойку, паказвае свой спрыт. Нічога, не такім рогі абломвалі... Блін што, Блін хоць і задзірысты, бы певень, але ж слабак, ад гарэлкі ніколі вычхацца не можа.

Здагадаўшыся ці, пэўна, адчуўшы што, пацягнуліся сюды хлопцы, пасталі наўкруг. Той-сёй пачаў пацвельвацца з Бліна, які па-ранейшаму валяўся на зямлі, непадалёк ад ветэрынара.

— Што, Блін, ногі цалуеш чалавеку? Ну, ну, цалуй. Гэта табе не з маткай мерацца дома сілай...— І ўжо з'едліва да Рагулі: — І ты, можа, прыкладзешся? Што, ад страху ў штаны нарабіў? Вот не чакалі ад цябе. Гэткія ж кулачышчы. Ліна, праўда, не аценіла, які ты мужык...

Кроў, падагрэтая самагонкай, шалёна закіпала ў ім, брала ўжо злосць і на гэтых во зявак, якія замест таго каб падтрымаць свайго, хаця памаўчаць, строяць тут кепікі, успомнілі чамусьці Ліну, праехаліся і наконт яго. Гэта нешта новае...

Ён марудна-пагрозліва пачаў набліжацца да ветэрынара, ліхаманкава прыкідваючы, куды лепш біць: у скіўіцу ці пад дых? Галоўнае — даць так, каб той скурчыўся, распластаўся побач з Блінам, гэтак жа заскавытаў. Нагамі ён не будзе яго чапаць, не будзе ламаць рэбры, каб пасля не мянцілі лішняе языкамі. Хопіць яму і кулакоў, ад якіх папросіць літасці, што не раз рабілі іншыя.

І ўсё ж думалася: ветэрынар адступіцца, паспрабуе, пэўна, уцячы. Тады давядзецца дагнаць яго, бо, не высветліўшы зараз адносін, ён сабе ўжо не даруе.

Сапернік, аднак, напружана стаяў, не думаў нікуды бегчы, толькі не зводзіў з яго вачэй. Цяпер і хлопцы, зацікаўленыя, што будзе, ужо не балабонілі, не нацкоўвалі, пільна сачылі за паядынкам.

Ад першага ўдару лекар вокамгненна неяк ухіліўся, застаўшыся, як ні дзіўна, на тым жа самым месцы. Рагуля што ёсць сілы замахнуўся зноў, цэлячы яму пад паху, але кулак зноў бесперашкодна завіс у паветры. Гэта выклікала ў хлопцаў выбух рогату. Такога ён аніяк не чакаў. Як, якім чынам гэты недаляка, быццам бы і не шавяльнуўшыся, выварочваецца, ставіць яго, Рагулю, у смешнае становішча? Ці мо ён, як і Блін, так сп'янеў, што цаляць ужо развучыўся? Але ж колькі таго пітва было! Не па столькі пілі... Нешта трэба было рабіць, бо, адчуваў, зараз на яго

пачнуць тыцкаць пальцам, яшчэ паклічуць Ліну, каб і яна пасмяялася з усімі...

Ён зрабіў рэзкі выпад, каб усім целам наваліцца на ветэрынара, падмяць пад сябе і тады ўжо чыніць над ім свой суд. Але... тут жа адчуў, як нейкая невядомая сіла кульнула яго на дзірван, як перад вачыма паплыў чырвоны дым. Яшчэ добра не цямячы, што адбылося, ён у гарачцы падняўся, зноў рушыў на свайго праціўніка. І зноў пад рогат зявак паляцеў потырч, цяпер, праўда, не вельмі выцяўшыся.

...З гэтага вось моманту, як усведамляў зараз Рагуля, і пачалося тое галоўнае, ад чаго жыццё яго пайшло наўскасяк. Яму б тады неяк змірыцца, супакоіцца, плюнуць на ўсё, пашукаць іншую дзяўчыну, абысці бокам і ветэрынара, раз ён ужо такі спрытны. Дык жа не, гонар і сорам зусім зачмурылі мазгі, не давалі спаць. Часта начамі прахопліваўся, скрыгатаў зубамі, думаў, як лепш расквітацца з тым нягоднікам. Паліла нутро і крыўда на сваіх хлопцаў, якія сталі сведкамі яго ганьбы, нічым не памаглі, нават, наадварот, заахвочвалі чужака.

Неяк, зрабіўшы позна вечарам засаду, высачыўшы ветэрынара аднаго, Рагуля метка шпурнуў у яго камень, трапіў акурат у галаву. Той ускрыкнуў, хапіўшыся аберуч за скроні, асеў на пясок. На жаль, яго, Рагулю, нехта прыкмеціў, данёс куды трэба. Так ён трапіў у турму. Тэрмін далі хоць і нядоўгі, але ж усё роўна паламалі яго лёс, назаўсёды памецілі чорнай фарбай. Таму, мусіць, ён і вайну ўспрыняў як нейкае збавенне для сябе, асабліва не ўпарціўся, калі хаўруснікі, з якімі сядзеў разам, падахвоцілі пайсці служыць немцам, надзець форму паліцыянта.

Вось тады першы сардэчны ўдар падкасіў маці, у яе аднялася левая палова цела. Бацька таксама асунуўся, не глядзеў нікому ў вочы, раптам ссівеў. А ў яго самога ад аднаго толькі ўсведамлення, што цяпер усе па-сапраўднаму пачнуць яго баяцца, што з любым можа звесці рахункі, паставіць на калені, хмельна кружылася галава. І спела, спела ў той галаве помслівае пачуццё.

Неяк як бы між іншым сказалі яму, што бачылі Ліну з ветэрынарам на таўкучцы ў абласным цэнтры. Рагуля ўзлаваўся тады, што не затрымалі абаіх, не высветлілі, як яны згаварыліся і сустрэліся гэтак далёка, што рабілі, дзе наогул ацiраецца зараз той жанішок. А мо ён пераапрану-

ты партызан і віжаваў, з дапамогай гэтай здрадлівай сучкі, за важнымі аб'ектамі, збіраў звесткі? Цяжка верылася, каб ён толькі лячыў нечых кароў і не прыкладўся да зброі, зміры́ўся з новымі парадкамі новых гаспадароў.

Рагуля рабіў усё, каб іх высачыць, схапіць. Падключыў дзеля гэтага многіх сваіх сённяшніх і былых хаўруснікаў.

Неяк ва ўправу заглянуў Блін і, папрасіўшы гарэлкі, шапнуў, што Ліна часта ходзіць нечага ў лес, вяртаецца амаль понарчы.

Пільнавалі цяпер ветэрынара і яго каханку не дзе-небудзь далёка, а ў лесе ля Залатоўкі. Сам Рагуля, каб не трапіць выпадкова на вочы землякам, там не паказваўся, адседжваўся пакуль ва ўправе.

Высачылі іх позна вечарам на ўзлеску, непадалёку ад вёскі, акружылі. Усчалася перастрэлка. Ветэрынар, загадаўшы дзяўчыне легчы на зямлю, як мог адбіваўся з нагана. Калі не стала іншага выйсця, апошнюю кулю ён пусціў сабе ў лоб. Пад адзеннем у яго паліцаі знайшлі жмут лістовак з карыкатурамі на Гітлера, Гебельса. Ліну — так прасіў Рагуля — не кранулі, нібы не заўважыўшы, пакінулі ў лесе са сваім дружком.

На першым часе Рагуля быў вельмі засмучаны, што ветэрынара не прывезлі жывога. Вось там, ва ўправе, пагаварыў бы з ім, прыпомніў бы ўсё... Але трохі пазней ужо рады быў, што сам не прысутнічаў у засадзе, што няма на яго сумленні той смерці. Нехта, аднак, разбалабоніў па ўсіх вёсках пра яго сапраўдную ролю ў гэтай аперацыі. У сябе дома Рагуля ўжо не мог паявіцца: пракляўшы сына-паліцая, ад другога сардэчнага прыступу сканала маці. Бацька з меншым братам не пусцілі яго нават на парог, калі вёска хавала гаротную жанчыну.

Тыя дзве смерці трохі ацверазілі Рагулю, ён ужо спалохаўся за сябе, за ўсё, што можа чакаць яго, калі Саветы раптам перамогуць, вернуцца назад. Сталінградскія падзеі дадалі гэтага страху. Пакуль яшчэ не позна, пакуль многа не нашкодзіў, сваёй рукой нікога не забіў, трэба хутчэй уцякаць з паліцыі. А куды? Добра было б падацца ў партызаны. Толькі там можна змыць з сябе брудную пляму. Але ж дзе, дзе ён знойдзе іх і хто прыме да сябе без праверкі?!

Памог выпадак. Аднойчы ў іхнія лапы трапіла важная птушка — камандзір аднаго з партызанскіх атрадаў. Рагуля добра ўсё прыкінуў і вырашыў не ўпусціць рэдкага, мусіць, для сябе шанцу: глыбокай ноччу, калі дзяжурыў

і нікога болей не было ва ўправе, ён прыхапіў сакрэтныя дакументы, прыбіў паліцая-ахоўніка, вызваліў палоннага і ўцёк з ім у лес.

Так пачалася новая старонка ў ягонай біяграфіі. Пэўна, не ведаў бы сёння ён, Рагуля, гэткіх цяжкіх пакут, спаў бы спакайней, каб ужо ў партызанскім атрадзе і, галоўнае, пад самы канец вайны не нарабіў новых глупстваў. Вініць цяпер можна толькі самога сябе, хоць у разгульна-небяспечнае жыццё ўцягнуў яго Кантовіч.

Начамі, калі не было задання, ахвотна бегалі яны разам у адну невялікую вёсачку, як не да раніцы пілігулялі ў вясёлай Любкі і яе кватаранткі-бежанкі Эльвіры. Гэта было б нішто, каб тыя не вымагалі ад іх падарункаў — за гарэлку-сівуху і пасцельныя ўцехі. Хочаш не хочаш, а даводзілася ці то красці ў каго, ці то, маскіруючыся, каб потым незнарок не пазналі, нагвалт забіраць з хат, вядома, як мага далей адсюль, што лепшае, цягнуць сваім палюбоўніцам. Вось і папаліся, натрапілі ля Заямнага на тую ашалелую старую, якую давялося прыкончыць...

Цяпер, мусіць, сам Бог, калі ён толькі ёсць на свеце, помсціць за гэта. Але чаму, чаму толькі яму аднаму? Чаму Катовіч жыве прыпяваючы і ў вус не дзьме? А можа, і ў яго так, толькі не прызнаецца? Вунь пра старога калі даведаўся, як калаціўся...

І ўсё ж болей, чым што іншае, займалі зараз Рагулю думкі пра нядаўняе з ім здарэнне. Кідала то ў гарачы, то ў халодны пот, калі зноў і зноў прыгадваліся словы сіпатага: «Знаю гэтага паганца. Сабаку сабачае...»

Ён мераў і мераў крокамі кабінет, пасля валіўся на крэсла, сцішваўся, да звону ўвушшу ўслухоўваўся ў кожны шолах. Здавалася, нехта ўсё ж прабраўся ў кантору, стаіўся, цяжка дыхае ў калідоры. Хапіўшы са стала цяжкі, ад чарнільнага прыбора, прэс, ён краўся да дзвярэй, вокамгненна на ўвесь мах расчыняў іх, гатовы на любы ўчынак. Але нікога нідзе не было, і тады яму станавілася страшна яшчэ і ад таго, што, мусіць, пачаў ужо вар'яцець...

## 5

У новы, сёмы ўжо, клас Вадзім трохі хоць прыбраўся, не тое, як хадзіў летась і ўсе ранейшыя гады. Купіў кашулю, у палосачку касцюм, бацінкі са шнуркамі, зімовую

шапку. Грошы за яго работу метравальшчыкам далі не такія вялікія, але ўсё ж падмога ім з Колем была прыкметная. Што Колевы тыя палачкі, тыя працадні? Палачкі і ёсць палачкі. Навару з іх амаль ніякага.

З восені і Коля хацеў быў падацца куды ў мястэчка, напытаў нават работу ў бальніцы — падвозіць у вялікіх бочках ваду. Калі даў згоду, у думках, праўда, пашкадаваўшы, што трошкі малаваты заробак, у яго запатрабавалі паперку з калгаса.

— Якая паперка? — Коля не разумеў, што ад яго хочуць.

Бальнічны гаспадарнік зморшчыўся, але растлумачыў:

— Ну, што адпускаюць цябе. Без паперкі ці пашпарта ніяк не можам узяць. Многа вас такіх просіцца з вёсак, але ж... Загадана нам.

Брат пасля дома пляваўся, на чым свет лаяў некім прыдуманыя парадкі, каб вясковы чалавек, нават здыхаючы, не мог памяняць што ў сваім жыцці. Меркаваў выбраць час і схадзіць усё ж у кантору да Рагулі...

Вечарам Коля быў чарнейшы за ноч, не схацеў нічога есці, пасля сабраўся да хлопцаў. Прывалокся, калі Вадзім ужо спаў. Абудзіў яго шумам, грукатам у сенцах і на кухні. Вадзім выглянуў і не пазнаў брата: той з галавы да пят быў вываленым ў гразі (якраз прайшоў дождж) і... п'яны, не мог нават трымацца на нагах.

— Ты што гэта, га, Коля? — папытаў у яго.— Мусіць, Жоржык так для цябе пастараўся. Дык жа ён здаровы, вядро выжлукціць, а ты... Эх!..

Коля, пакінуўшы на падлозе брудныя мокрыя сляды, дапяў да лавы, цяжка сеў, не падумаў нават, каб распрануцца хутчэй ды заваліцца ў ложак. Вадзім памкнуўся хаця разуць яго, але Коля не даўся, раптам грубавата адпіхнуў ад сябе, вышчарыўся:

— Разумнік і ты... Цяпер ён з-за цябе жыцця не дасць, не тое што паперку. І з конюхаў шчэ можа турнуць, гад той печаны. Казаў, на палявых работах мала людзей. Думае, што на канюшні дык мёд. Але ж коні...

Ён нечакана заплакаў, чаго даўно з ім не было. Вадзім здагадаўся, што хацеў сказаць брат, таму не стаў больш ні пра што дапытвацца, пайшоў, зноў лёг у пасцель. Галава была як дурная. Трохі пакрыўдзіла братава выхадка, але, мусіць, і яму Рагуля добра насаліў, не ведаў, як укусіць за тое Вадзімава пісьмо ў мінскую газету.

Шыхнула Вадзіму напісаць у рэдакцыю тыдні тры таму, адразу, як разлічыўся са сваім не такім ужо лёгкім заданнем, як атрымаў на рукі першыя заробленыя ім рублі.

Дзядзька Даўнар, калі ішлі разам з мястэчка, сказаў, што хоча, мусіць, кідаць гэтае сваё старажоўства ў садзе і агародзе, бо ўсё роўна толку ніякага няма і не будзе. «Чаму?» — здзівіўся тады Вадзім, бо ведаў, што дзядзькава месца многія ў вёсцы лічылі надта ж цёплым і самі марылі займець такое б. «А-а,— махнуў рукою дзядзька Даўнар,— пільнуеш, пільнуеш, нават ад дзяцей, а начальнікі адусюль наязджаюць, паперкі ад Рагулі ў нос тыцкаюць, а то ён і сам з імі завітвае. І ўсё, няма лепшых ні гурочкаў, ні памідораў тых, ні яблык. І ніхто і капейкі не плоціць. Пасля іх пасуцца ўжо Давэцька, Фанька, таксама грабуць як найболей...»

Цалюткі вечар крэмзаў тады Вадзім блакнот, пісаў пра ўсе парадкі ў іхняй Жорнаўцы. Пра што сам ведаў, што чуў ад дзядзькі Даўнара, ад другіх вяскоўцаў. Атрымалася не вельмі складна — усё ж цяжка, аказваецца, выкласці на паперы, што ў галаве ў цябе месціцца, ад чаго душа баліць,— але, галоўнае, нічога самага важнага не ўпусціў. Перапісаў на чыстыя лісткі, вырваныя са сшытка, у канцы паставіў чысло. Адрас і прозвішча акуратна вывеў на канверце, які загадзя купіў, пасля ў Радаве кінуў сам у паштовую скрынку, не стаў, як многія рабілі, перадаваць Клаве Чапыловай.

Ён, відаць, і забыўся б на сваю пісаніну, калі б раптам не наказалі забегчы, як будзе час, да электраманцёра Гурко, таго, што жыў на пасёлку пры самых могілках. Вадзім здзівіўся, чаго гэта чалавек кліча, што трэба. Здаецца ж, ні ён, ні Коля не мелі з ім ніякіх агульных спраў, не лічыліся хаця б якімі, няхай самымі далёкімі, родзічамі. Праўда, прозвішча было аднолькавае, але гэта зусім нават нічога не азначала.

Вадзім пайшоў увечары, разлічыўшы, што гаспадар, пэўна, вярнуўся ўжо са сваёй работы на электрастанцыі. І праўда: Васіль Гурко, ускудлачаны, даўно няголены бабыль (жанкі, успомніў зараз Вадзім, вельмі едка жартавалі наконт яго), сядзеў ля свайго плота на хліпкай лаўцы, смаліў самакрутку, кольцамі пускаў у паветра дым.

Спыніўшыся насупраць, Вадзім няголасна павітаўся. Бабыль абыякава неяк адказаў, нібыта і не звярнуў на яго ўвагі.

— Вы клікалі нечага,— нагадаў пра сябе хлопец, больш за ўсё баючыся, каб хто часам не разыграў яго. Тады будуць ірваць ад рогату жываты, пацяшацца з дурнога.

Пры гэтых словах бабыль адразу схамянуўся, пільна агледзеў Вадзіма з верху да нізу, быў нечага завагаўся, потым спытаў:

— Дык, можа, ты гэта сачыняў у газету, табе той канверт? Прынесла Чапылова, пачытаў, што тамака, і во думаю, хто такі яшчэ вышукаўся аднафамілец, да каго так пачціва зварочваюцца.

Цяпер Вадзім зразумеў усё: гэта ж ён, дурань апошні, не напісаў на канверце сваё імя і па бацьку, паставіў толькі: В. Гурко. А скуль ім, у рэдакцыі, ведаць, Васіль Гурко ці Вадзім Гурко? І Клава не ведала, няма чаго яе і вінаваціць.

— Маё гэта, я...— Вадзім аж пачырванеў, што так усё па-дурному атрымалася, што бабылю цяпер гаворкі хопіць на месяц, калі не болей. Але хай, хай гаворыць, толькі б хутчэй аддаў пісьмо, не цягнуў жылы. Што ж яны там пішуць?

Сэрца ажно з грудзей выскоквала, калі бабыль пайшоў у хату, затым вынес, аддаў яму ў рукі вялікі шэры канверт з надрукаванымі ўверсе назвай і адрасам газеты. Чытаў укладзены ўсярэдзіну лісток, таксама друкаваны, але ўжо на машынцы, у сябе дома і ад хвалявання не адразу даходзіў да сэнсу. «Паважаны тав. Гурко! — гаварылася ў тым лістку.— Вельмі рады, што Вы неабыякавыя да спраў сваёй вёскі, свайго роднага калгаса, паведамляеце нам пра недахопы асобных людзей, носьбітаў гэтых недахопаў. Ваша грамадзянская пазіцыя заслугоўвае пахвалы. Але мы не можам змясціць на сваіх старонках апісаныя Вамі факты, бо яны вельмі нехарактэрныя для нашай рэчаіснасці, напоўненай героікай, энтузіязмам мас пад мудрым кіраўніцтвам любімага намі правадыра. Вядома, мы перашлём пісьмо Ваша раённым уладам, няхай на месцы паглядзяць, як і што, прымуць, калі трэба, меры. Вас жа просім пісаць яшчэ, быць нашым сталым аўтарам. Расказвайце, як выконваюцца грандыёзныя планы новай сталінскай пяцігодкі, пішыце пра наватараў, стаханаўцаў калгаснага руху, якія, не сумняваемся, ёсць і ў вашай мясцовасці...»

Вадзім дачытаў да канца і адразу скіс. «Што яны чаўпуць там? — нядобра падумаў пра тых, хто яму адпіс-

ваў.— Выдумваюць нейкіх «носьбітаў недахопаў». Цьфу!.. Ды тыя ж Давэцька, Фанька — найпершыя злодзеі і п'яніцы, а не якія там «носьбіты». Яны, пэўна, абдрыш...— Вадзім нават у думках пасаромеўся вымавіць любімае дзядзькі Даўнара слоўца! — ад смеху і радасці, што іх так далікатна можа нехта назваць...»

Паступова, аднак, настрой памяняўся. Зноў і зноў перачытваючы адрасаваны яму аж з самога Мінска ліст, Вадзім пашкадаваў ужо, што няма каму паказаць, перад кім пахваліцца. Гэта ж не жартачкі: напрамілы Бог просяць яго аб паслузе, ды не абы-якой, а каб быў іхнім аўтарам, блізкім да іх чалавекам, каб усё мог заўважаць, браць на заметку, пасылаць ім...

З гэтага адказу Вадзім зразумеў і яшчэ адно, важнае і істотнае для сябе: няхай пісьма і не будзе ў газеце, аднак жа яно дарма не прапала, яго, мусіць, адрасавалі ўжо іхняму райкому ці райвыканкому. Уявіў, як выклічуць Рагулю да каго-небудзь з высокага начальства ў кабінет, пачытаюць напісанае Вадзімам, сурова папытаюць, што ён, старшыня, думае сабе. Чаму дапусціў, каб людзі гэтак рабілі, рабілі і нічога не атрымоўвалі? А яшчэ чаму ўзяў пад сваё крыльца розных п'яніц ды хапуг, разбазарвае ўсё калгаснае, нават зямлю, надзяляючы лішнімі кавалкамі тых, хто яму падпявае? Там, у пісьме тым, будзе і пра штрафы, якімі Рагуля замучыў ушчэнт калгаснікаў, і пра многае-многае другое. Пэўна, дадуць вымову, мо нават, калі Рагуля палезе на ражон — а гэты можа палезці,— з партыі патураць, пасля і са старшынёўства...

Колькі дзён Вадзім чакаў важных для сябе навін, але ў калгасе ўсё ішло, як заўсёды, як учора, заўчора, і ён, заняты клопатамі пра новую вучобу, пра сшыткі і кніжкі, пачаў трохі астываць, забывацца. І вось Коля нагадаў самым нечаканым чынам, што Рагуля ўжо ведае, хто і што на яго пісаў. Але яму, мусіць, начхаць на ўсякую пісаніну, бо хіба так даводзіў бы брата, каб той ажно напіўся з крыўды, пасля плакаў.

У школу ён пайшоў, пакінуўшы Колю на стале пісульку, што вернецца позна: сёння, з выпадку новага навучальнага года, у клубе пасля ўрокаў будуць паказваць іхнюю самадзейнасць. Хацелася, вельмі хацелася Вадзіму быць там. Па-першае, ён ведаў, што зноў выступіць дзесяцікласнік Вова Лабаеў, які гэты раз падрыхтаваў, казалі, новыя песні і будзе сам на акардэоне акампанаваць сабе.

Вову, яго гранне і спевы вельмі любілі не толькі ў шко-

ле. Вучня гэтага часта запрашалі ў РДК на дарослыя канцэрты, якія рыхтаваліся да розных святаў — Першага мая, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Новага года, да выбараў. Але туды трапіць было амаль немагчыма. З іхняга класа адзін хіба Рыла мог пахваліцца, што быў на вечары ў РДК, што дастаць яму білет — раз адно плюнуць... Па-другое, на сённяшні школьны канцэрт мелася прыйсці Люська, і Вадзім тайна марыў заняць для яе месца, каб сядзець побач. Цяпер яму, у новым картовым касцюме, цэлых бацінках, было ніколькі ўжо нябрыдка паказвацца на людзях. Вот яшчэ добрую прыдбаць тэніску ці кашулю, тады і Генка, і Рыла гэтак бы, мусіць, кпліва не глядзелі б на яго, не задзіралі нос.

Шакута, дзякаваць Богу, у гэтым годзе не стаў мазоліць Вадзіму вочы: стварылі дадатковы сёмы клас, і Генка з Рылам, яшчэ колькі чалавек падахвоціліся вучыцца ў тым новым класе.

Каго вельмі не хапала Вадзіму, дык гэта Лукашыка. Усё ж нядблага яны сябравалі, многае давяралі адзін аднаму. Праўда, Казік доўга маўчаў, не прызнаваўся наконт маці, але хлопца можна зразумець: гэта было нешта для яго святое, асабістае, балюча-недатыкальнае, таямніца, якую не адразу і не кожнаму адкрыеш.

Дзе ён і што з ім зараз?

Калі казаць праўду, у Вадзіма яшчэ перад школай тлела кволая надзея, што Лукашык вернецца да іх, зноў сядзе за сваю парту, зноў у інтэрнаце яны будуць смажыць на патэльні бульбу і гаварыць, гаварыць. Недзе Вадзім адчуваў: не, не ўсю яшчэ, не да саменькага донца, вывернуў перад ім сябра душу. Мо пасаромеўся пакуль, а мо таксама палічыў тое, асабістае, не для чужых вушэй. Заставалася адно здагадвацца па вершах, якія чытаў Казік у тую марозную ноч, што рабілася ў яго на сэрцы... Зрэшты, не бачна нешта і Веранікі Васільеўны. Хоць бы і яна не з'ехала куды.

Пасля ўрокаў Вадзім як не першы трапіў у клуб, на два адзаду сядзенні паклаў сваю сумку (агораў, купіў-такі і яе перад школай) і старую газету. Схацеў выйсці, каб угледзець дзе Люську, паказаць ёй месца. Але было ўжо не прабіцца на двор: і малеча, і са старэйшых класаў валілі па калідоры суцэльнай сцяной, таўхаліся, вішчалі, большыя ставілі таму-сяму падножкі. Умомант было ўсё запоўнена і занята. Зала гула суцэльным гудам.

Вадзім варочаў галавой туд-сюд, спрабуючы адшукаць

Люську ў гэтым вірлівым мурашніку, паклікаць да сябе. Не можа ж быць, каб яна забылася, не прыйшла. Яшчэ ўчора, стрэўшы яе на пераменцы ля ларка, папытаў, ці будзе на канцэрце. Яна радасна кіўнула, усміхнулася, і ад тае ўсмешкі ў яго хораша, салодка затрымцела ўсё ўнутры.

Калі пачалося, Вадзім змушаны быў саступіць вольнае месца дзяўчынцы з банцікам, якая стаяла непадалёк у праходзе, не-не дый скоса зіркала ў ягоны бок. Настрой вельмі падпсаваўся. Не так цікава ўжо стала глядзець на тыя танцы, якія выконваліся групамі ці ў пары, не здзіўлялі больш і розныя акрабатычныя практыкаванні, галаваломныя піраміды. Вершы, праўда, асабліва пра вайну, а таксама песні паступова бралі яго ў палон, прымушалі забыцца пра ўсё на свеце.

Вова Лабаеў зусім скарыў. Ён выйшаў на сцэну пад дружныя гарачыя воплескі і воклічы. Вадзім бачыў, як узгарэліся вочы нават у гэтай маляўкі з сінім банцікам у валасах, калі абвясцілі, што будзе выступаць Лабаеў.

Сам сабе падыгрываючы на акардэоне, першую песню Вова заспяваў пра халодную франтавую зямлянку, дзе ў цеснай пячурцы б'ецца агонь. А на дварэ — цемната, хоць вока выкалі, шалее вецер і круціць мяцеліца. А недзе блізка ў заснежаных прамёрзлых палях стаіўся вораг, які нясе смерць. Да яе, той смерці, мо ўсяго чатыры крокі. Але не хочацца думаць пра горшае, хочацца думаць пра сваю любую дзяўчыну. Хоць яна і вельмі далёка адсюль, але як добра было б, каб яна пачула твой голас, даведалася, як ты сумуеш... Пра гэта гаворыць і твой неразлучны сябра гармонік. Ён няўтомна разам з табою спявае пра дзявочую ўсмешку, яе вочы, спявае на злосць смерці і мяцеліцы, расказвае пра каханне, ад якога і ў халоднай зямлянцы робіцца нашмат цяплей...

Вадзім ніколі не чуў гэтых слоў, гэтай музыкі, яны зараз як ніколі развярэдзілі яго душу. Ён сядзеў, баючыся нават шавяльнуцца, баючыся нешта прапусціць, недачуць. Сэрца ажно трымцела ад незразумелага смутку і жалю, і хацелася чамусьці плакаць. Трохі прыглушанае за гэтыя гады, зноў у памяці абудзілася ўсё нядаўняе, што самім ім перажыта, перадумана, адчута, нават выліта слязьмі... Ат, лепш не ўспамінаць, бо і цяпер могуць лінуць градам слёзы. Во маляўка ўжо лыпае на цябе, думае, пэўна, што рабіць ёй: таксама заплакаць ці пачакаць? Як бы добра было, каб побач сядзела не яна, а Люська. Ёй жа і месца

займаў. Пэўна, і Люська гэтую песню не чула, інакш бы развучыла, праспявала б тады, як збіраліся на бёрнах ля Агрыпіны.

Тым часам, перачакаўшы доўгія — у многіх, пэўна, далоні ўжо смылелі — апладысменты, Лабаеў узяў іншыя акорды, зайграў новую мелодыю. Зала сцішылася. І тады прыемным, добра пастаўленым голасам спявак пачаў расказваць ужо вясёлую гісторыю пра старую і старога, як яны сядзелі на печы і ленаваліся зачыніць у хату дзверы. Стары прапанаваў, і баба з гэтым згадзілася, што злезе і зачыніць дзверы той, хто першы парушыць маўчанне. І вось цягнецца і гадзіна, і другая, а гаспадары — ні гу-гу, нібы вады ў рот набралі. І тут у хату заходзяць двое незнаёмцаў. Усё бяруць, раскашуюць сабе як хочуць. Старыя ж не думаюць аказвацца, бо яны далі зарок... Раптам адзін з незнаёмцаў, пакаштаваўшы ў печы пірог, сказаў, што ён нібыта сыры і нясмачны. Тут ужо баба не сцярпела, гнеўна ўзбурылася на нахабніка. Стары ж толькі хіхікнуў у кулак і адно загадаў: «Старуха, дверь закрой».

Цяпер усе голасна смяяліся, і Вадзім рады быў, што і з яго знялося напружанне, выкліканае папярэдняй песняй. Лабаеў жа пакінуў сцэну пад гром новых воплескаў. Многія падумалі ўжо, што ўсё, канцэрт на гэтым скончыўся, бо што можна паказваць пасля Лабаева? Вадзім дык нават падняўся са свайго месца, узяў у руку сумку. Але тут вядучая, якая аб'яўляла ўсе нумары, раптам сказала:

— А зараз верш «Два сокалы» прачытае вучаніца пятага класа Люся Міронава.

Чаго хочаш чакаў Вадзім, толькі не гэтага. Ён не зводзіў вачэй са сцэны, мала яшчэ верачы, што выйдзе сама Люська. Мо памылка якая? А мо ён няправільна пачуў у гэткім шуме прозвішча?

Люську і праўда здалёк, ды яшчэ па-новаму, нязвыкла неяк апранутую, цяжка было адразу пазнаць. На ёй была зграбная цёмная спаднічка, гожая, вішнёвага колеру, блузка, на нагах белыя шкарпэткі і балеткі. У валасах, гэтак жа, як і ў суседкі-маляўкі — стужка, толькі не сіняя, а чырвоная.

Нязнаную дасюль пяшчоту, замілаванасць адчуў Вадзім да дзяўчыны. Выходзіць, яна аніколечкі яму і не маніла. Нават упікнуў сябе, што не зусім добра быў падумаў пра яе.

Люська нібы разгубілася адразу пры гэткай колькасці цікаўных вачэй, але ўжо праз секунду-другую ледзь прык-

метна трасянула галавой, акурат скідваючы з сябе здранцвенне, роўна, журботна-ўрачыста пачала:

На дубу зеленом,
Да над тем простором
Два сокола ясных
Вели разговоры.

Верш пра невядомых гордых птушак, ды яшчэ як чытала яго гэтая вучаніца, зацікавіў, нават заінтрыгаваў. А калі Люся Міронава з дрыготкай у голасе прадэкламавала:

Ой, как первый сокол
Со вторым прощался,
Он с предсмертным словом
К другу обращался,—

у зале ўжо ніхто і не дыхаў. Пэўна, не ў аднаго Вадзіма павільгатнелі вочы, а ў галаве замроіліся думкі: «Што, што здарылася? Чаму ён памірае, чаму развітваецца? Хто яму, тому першаму сокалу, што паганае зрабіў?.. Але ж, мусібыць, зрабіў. Мусіць, быў вораг... Дзе яна вычытала гэта?»

Між тым са сцэны гучала, яшчэ больш распальваючы цікаўнасць:

«Сокол ты мой сизый,
Час пришел расстаться,
Все труды, заботы
На тебя ложатся».

А другой ответил:
«Позабудь тревоги,
Мы тебе клянемся —
Не свернем с дороги».

И сдержал он клятву,
Клятву боевую,
Сделал он счастливой
Всю страну родную.

Хто ж, хто былі тыя сокалы? Аказваецца,

Первый сокол Ленин,
Другой сокол — Сталин.

Калі Міронава скончыла, многія адразу разгубіліся, не ведалі, пляскаць у ладкі ці не. Усё ж нехта пачаў, яго падтрымалі астатнія. Але апладысменты былі не густыя і тут жа затухлі. Вадзім зразумеў чаму. Як ні кажы, а канец, ды і ўвесь верш наогул, быў надта ж сумны, кроіў напалам сэрца.

Выйшаўшы за школьныя вароты, Вадзім спыніўся, стаў чакаць Люську. Яму вельмі і вельмі хацелася сёння пабыць з дзяўчынаю разам, выказаць сваё захапленне і вершам, і тым, як яна чытала.

...А недзе праз гадзіну, ужо дома, Коля пабіў яго, упершыню гэтак распусціў свае рукі, не даў з гарачкі поўху, калі ён, Вадзім, знёс ключ, а яшчэ, доўга гледзячы «Тарзана», прывалокся поцемкам. Не, гэты раз брат нібы ашалеў, біў дзе папала, цаляў кулаком нават і ў галаву. Але Вадзім як мог выкручваўся, усё хацеў дазнацца, чаго ён зноў уз'юшыўся. Ці, можа, перапіў дзе і не ведае, куды сілу дзяваць?

Коля і праўда быў п'янаваты, пырскаўся слінай, цешта шыпеў. Пасля, як трохі астыў, Вадзім з яго бязладных слоў зразумеў прычыну гэтага дзікага гневу. Аказваецца, Рагуля спраўдзіў сваю пагрозу, выгнаў брата з канюшні, яшчэ, прыдраўшыся, уляпіў штрафу. І ўсё гэта праз яго, Вадзімаву, пісаніну...

## 6

У небе, як не над самай галавой, луналі два маладыя ястрабкі. Да іх далучыўся быў і трэці, але, зрабіўшы плаўны, без адзінага ўзмаху крылаў, разварот, некуды сплыў і ўжо не вяртаўся. А гэтых двое быццам хто прывязаў да зямлі доўгай нябачнай вяроўчынкай, і тая вяроўчынка не давала ім ні ўзляцець вышэй, ні выйсці за межы вызначанага ім кола. Так прывязваюць хлапчукі на моцнай кужэльнай нітцы папяровага змея, не дазваляючы яму вырвацца на волю, у бясконцы нябесны абсяг.

Усё ж думалася: як можна гэтак доўга трымацца ў паветры, нічым не падсабляючы сабе, і што яны, ястрабкі тыя, выглядаюць з вышыні?

Адзін з іх раптам застыў на месцы і... каменем пайшоў уніз. Вадзіма ажно скаланула. Ён падхапіўся на ногі, да мурашак уваччу напружыў зрок, спрабуючы згледзець, куды падае гэтая вялікая гожая птушка. Спачатку абурыла: мусібыць, нейкі нягоднік прыцэліўся з ружжа і напавал зваліў яе. Але пачуўся б стрэл, а яго не было. Ды і другі ястрабок занепакоіўся б, уцёк, але ён і не думаў гэтага рабіць, лунаў сабе ды лунаў.

На хвілінку адно перастаў Вадзім сачыць за небам, а тут зноў глянуў і ўсё зразумеў: прапаўшы ястрабок, цяпер ужо цяжка ўзмахваючы крыламі, набіраў кругамі вышыню і нешта велікаватае трымаў у кіпцюрах. «Дык то ж ён кураня нечае схапіў, далібог, кураня! А я быў пашкадаваў...»

Яшчэ больш пагана стала на душы.

Заходзіла сонца, і паветра неяк раптоўна паядранела. Вадзім адчуў, што да цела пачала падбірацца стыласць, адно ў галаве было па-ранейшаму моташна і горача, акурат на мазгі сыпаў хто свежы, толькі з-пад агню, попел. «Няўжо і ўсюды так,— стрэмкай сядзелі, не давалі спакою думкі,— калі ты дужэйшы, уласць маеш, то можаш некага апляваць, растаптаць, а то, як гэты ястрабок, накінуцца і зусім знішчыць, зжэрці? Дзе ж, дзе выхад?..»

На Колю ён менш за ўсё зараз злаваўся, хоць уцёк ад яго з дому на лог, з гарачкі пакляўшыся ніколі не даравання. Але ж, як бы там ні было, ён разумеў і стан брата. А вось Рагуля... Не думаў неяк, што пісьмо трапіць да яго і ён будзе зводзіць са свету Колю.

Сонца між тым зайшло, цалкам схавалася за лес. Вадзім вырашыў на лозе больш не заставацца, даць, пакуль не сцямнела, кругаля, паўз вёску выйсці з другога боку ў калгасны сад да дзядзькі Даўнара. Сёння звечара той якраз зменіць свайго напарніка, будзе пільнаваць апошняе, што заставалася яшчэ з садавіны і гароднiны. Хацелася з некім адвесці душу, і дзядзька Даўнар мо лепш чым хто зможа падказаць нешта, параіць. Дый і дзявацца не было куды. Дадому Вадзім вырашыў сёння не ісці. А заўтра, мусіць, і школу прапусціць...

Дзядзька яшчэ здалёк пачуў чужыя крокі і гукнуў з будана:

— Хто там швэндаецца? Во спушчу сабаку!..

Вадзім ведаў, што сабакі ў сторажаў зараз няма: нехта з дарослых местачковых хлопцаў паўмесяца назад, як лазілі ноччу ў яблыкі, прэнтам перабіў яму спіну, і бедны сабака да раніцы ў муках сканаў. Хіба, можа, узялі дзе новага. Але ж каб быў, то кінуўся б ужо...

— Гэта я, дзядзька! — Вадзім рады быў, што выйшаў акурат на яго. Павітаўся, вінавата неяк папрасіў: — Я ў вас пабуду. Добра?

— Няма чым смачным і пачаставаць,— вылезшы наверх, не сказаў нічога на гэту просьбу дзядзька Даўнар. Але Вадзім па голасе нават пачуў, як чалавек зарада-

ваўся яму.— Хіба антонаў сарву. Летнія дык даўно з лісцем расцягалі... Шчэ памідораў троху знайду. А хлеб ё.

Не чакаючы згоды, ён шуснуў некуды ўбок і вокамгненна растаў у цемнаце, нават крокаў не было чутно. «Як кошка, гэтак навучыўся красціся,— падзівіўся Вадзім.— Сторажу, мусіць, трэба так...»

З будана пахла сенам, адтуль ішло прыемнае цяпло. Вадзіму карцела хутчэй залезці ўсярэдзіну, трохі сагрэцца, бо ўжо і дрыжыкі пачалі праймаць. Апратка яго — картовыя штаны ды памяты ад доўгага ляжання на лозе пінжачок — мала чамусьці ратавала.

Дзядзька Даўнар не забавіўся, першы залез і запрасіў хлопца ў сваю начлежку. Намацаў недзе запалкі, чыркнуў адну, запаліў ліхтар.

— Во хоць скупы, ды агонь. Можна, пакуль накопціць, чым падмацавацца повідну.

Хлеба быў ладны акраец, і ён амаль увесь дастаўся Вадзіму. Дзядзька, спаслаўшыся, што кіславаты, не для яго жывата, адмовіўся хоць колькі адламаць сабе. Не ўзяў у рот ні яблык, ні памідора.

— Ты не глядзі на мяне, еш,— апраўдваўся перад хлопцам.— Я дома нядаўна павячэраў. Місу крупніку з малаком умалоў. Тое во па мне. А ад гэтага зеляніва,— паказаў рукой на памідоры і яблыкі,— аскома ўжо.

Ліхтар і праўда пачаў скора капціць. Давялося патушыць яго. Нейкі час маўчалі, пасля дзядзька перамясціўся бліжэй да выхаду, закурыў, пусціў дым і, нібы працягваючы ранейшую размову, загаварыў:

— Ты, хлопча, не пеpажывай надта. Перамелецца — мука будзе. А брат дарэмна гэтак з табой. Біцца — апошняе дзела. Я скажу яму. Не твая віна, што яго Рагуля бэсціць, ад коней адлучыў. Прадсядацель, каб быў талковы, разумны, дык гэтага б не рабіў. Ён ад злосці, што хвост яму, мусі, трохі прышчамілі, шалее. Тваё пісьмо правільнае. Усе кажуць... А з братам утрасецца. Ну, любіў тую работу, з-за яе, як можна яшчэ было, нікуды на грошы нат не пайшоў. Але ж свет клінам зараз не сышоўся. Будзе што другое рабіць. Не тое перажылі. I бацька твой, і матка, царства ім нябеснае, ды і я сам колькі зведалі, у якой ляпярдоніі ні былі. (Гэтае слова — ляпярдонія — колькі ні дапытваліся ў дзядзькі, што азначае, так і заставалася загадкай для ўсіх жорнаўцаў. Не знайшоў яго Вадзім і ў слоўніках, хоць знарок і хадзіў у дарослую бібліятэку, доўга поркаўся там). Бацькам, праўда, тваім не пашанца-

вала, але што зробіш — вайна. А зараз жа няма яе, і неяк усё ўтрасецца...

Дзядзька на хвіліну змоўк, прыслухаўся, нават вылез з будана, некуды быў адышоў, але неўзабаве вярнуўся, сеў на ранейшае месца. Раптам рассмяяўся.

— Што тамака? — шэптам папытаў Вадзім.

— Як галіну хто акурат зламаў,— адказаў дзядзька.— Гэта ў мяне ўжо, як нехта казаў, галь... галя... во забыўся... галяцынацыя. А засмяяўся не з гэтага. З Амерыкі ўспомніў...

Вадзім, ды і ўсе жорнаўцы, ад малога да вялікага, ведалі, як некалі, калі быў яшчэ малады, дзядзька ў пошуках капейкі (збіраўся неўзабаве жаніцца) дапяў быў у Амерыку. Праз год прыехаў назад з дзіравымі кішэнямі, худы і страшны, але здаволены, што вярнуўся і што гэтулькі многа пабачыў усяго. І доўга смяялася вёска з дзядзькавых прыгод, яго не то выдумак, не то праўдзівых гісторый.

— Я не так сабе ляпнуў, што ва ўсякую трапляў ляпярдонію,— пачаў успамінаць дзядзька.— Помню, і месяц сядзім без работы, і два. Швэндаемся і ў порце, і па дварох, шукаем, каб дзе чаго выпараць з'есці. Акурат у іх тамака крызіц нейкі вялікі быў, і капцаноў сваіх хапала, аж занадта, не тое каб шчэ нас, чужых, прывеціць. Дык вот ні выехаць у Расею няма як і за што, ні жыць тут. А маладыя ж, ядры яго, многія шчэ і дзевак не мацалі як мае быць, не ведалі гэткага смаку, а тут — памірай. Сабакам і то лепш. Тых хоць хто пагладзіць, пашкадуе ды выкіне якую костку. А нам — дуля з макам...

Перапыніўшыся, дзядзька Даўнар пашастаў у кішэнях, выняў, чуваць было, запалкі, паперу, скруціў цыгарку. Хутка зноў адчуўся едкі пах самасаду. Але Вадзім цярпеў, дзе дзенешся. Не скажаш жа, каб чалавек не курыў. Ён тут гаспадар.

— Дык вот, швэндаемся мы гэтак, і свет ужо нямілы, і думаеш ужо, ці не кінуцца з якога моста ці прычала ў ваду, каб раз і назаўсёды... У адным месцы бачым мужыкоў многа, стаяць у вочарадзі, хвост аж за вугал загінаецца. Пазналі мы знаёмага, нашага капцана, пытаемся, чаго вочарадзь. «А чорт яго знае,— паціскае плячыма той.— Усе стаяць, і я стаю». Ну, прымасціліся і мы адзаду. Думаем, сяроўна час няма куды ўбіць. Раптам нешта і праўда цікавае? Пасля жалець будзеш. Лаўлю за крысо аднаго, хто ўжо адстаяў, а ён весела так рагоча, шчаслі-

вы, бытта работу палучыў ці доларaў жмут знайшоў. Кажа, не бойцеся, нядорага бяруць, грошы такія можна наскрэбці, затое будзеш усё ведаць пра сябе, чаго ты варты і на што можаш спадзявацца... Во, думаю, гэта акурат і трэба, бо ўжо згубіў усякую веру... Падыходзіць, урэшце, вочарадзь. Праціскаюся ў нейкі калідорчык, цёмны і вузкі, акурат пенал. У канцы яго — сцяна, а ў сцяне той — круглая дзірка. Нехта ў цемнаце кажа, каб садзіў туды галаву, там, за сцяной, усё пакажуць... Што ж, выхаду няма, саджу. Раптам адчуваю, як галаву нечым заціскаюць, не павярнуць ні на сантыметру. Страх ажно. А раптам чыкнуць чым па шыі ці сякера зверху апусціцца? Расплюшчваю вочы — а бацюхны родныя! — голы бабскі зад на ўвесь екран. Во кумедзія, думаю. Кіно рашылі паказваць, не інакш. Але што гэта? Зад стаў раптам напаўзаць, набліжацца як не ў самы твар. То ж не екран, а жывая баба! Пнуся выдраць галаву з дзіркі, але дзе там! Гэтак сціснута, што і плюнуць, каб хацеў, не плюнеш. Глядзі толькі і запамінай. Ледзь з калідорчыка тога выйшаў, але ўжо на вуліцы і віду не паказаў, што бачыў. Як і ўсе, смяяўся перад вочараддзю, таксама крывіў давольную морду. Во, хлопча, якая ляпярдонія. А ты кажаш... Зараз што, зараз жыць можна. І трэба жыць. А калі там што трохі, дык перамелецца...

Вадзім ніколі не чуў ад дзядзькі гэткай гісторыі, таму і развесяліўся, нават рагатаў. Непрыкметна неяк сплылі кудысьці цяжкія думкі, акрамя хіба адной: што рабіць зараз, як быць з домам? Усё ж, хоць Коля і моцна пакрыўдзіў, але трэба вярнуцца. Успомніў, што заўтра ў іх па рускай кантрольная дыктоўка, і прапусціць яе аніяк нельга. А сшыткі ж, ручка, уся сумка — там, у хаце.

— Пайду, мусіць, ужо,— Вадзім пасунуўся бліжэй да выхаду, глянуў на неба.

За той час, пакуль дзядзька расказваў, яно ўспела густа ўсеяцца яркімі буйнымі зоркамі. Над вёскай узышоў серпік маладога месяца, але святла ад яго было мала, можна сказаць, аніякага.

— Ладна, хлопча, ідзі,— нібы і чакаў гэтых слоў дзядзька Даўнар.— Там жа брат, мусібыць, шукаць будзе. Мішка нечага надвечар прыязджаў да вас.

— Які Мішка?

— Ну, Кацярынін, з Заямнага каторы. Здароваліся шчэ з ім...

Ступіўшы на ганак, Вадзім, наўздзіў сабе, знайшоў на

дзвярах замок. Ключ быў за хатай, у заўсёднай іхняй хованцы. «Куды ён мог дзявацца? — занепакоіўся ўжо за брата.— А мо і праўда мяне шукае. Але хай, хай...»

Адамкнуў, зайшоў у кухню, уключыў электрычнасць. Лямпачка, нягледзячы на позні час, гарэла вельмі блякла. І ўсё ж на стале ён адразу згледзеў парожнюю бутэльку з наклейкай «Маскоўская», кавалкі недаедзенай вяндліны («Мішка, відаць, гэта ён прывозіў»), акраец калача, два разрэзаныя напалам памідоры, пасыпаныя зверху буйной соллю.

Пробавацьса стала нічога не стаў, трохі яшчэ пахадзіў з кута ў кут, пасля, не тушачы святла, раздзеўся, кінуўся ў пасцель. Заснуў непрыкметна і, сам таго не чакаў, праспаў да раніцы. Прахапіўся, калі пачало віднець. Найперш заглянуў у бакоўку — ці вярнуўся Коля. Яго не было. На кухні з учарашняга гэтак жа скупа свяціла лямпачка. За ноч яна пачарнела, гатовая, мусіць, скора перагарэць.

Пачынаўся новы дзень. Ён абрынуў на Вадзіма такія нечаканасці, ад якіх цяжка было ачомацца...

Неўзабаве, як пачалася першая перамена, загадалі выходзіць у школьны двор, строіцца на лінейку. «Якая яшчэ лінейка? — паціскаючы плячыма, пыталіся адзін у аднаго.— У нас жа кантрольная. Нехта пасмяяўся».

Аднак і праўда: з усіх будынкаў школы выбягалі ўжо, станавіліся цесна ў вялікі квадрат вучні — і старэйшых класаў, і малодшых. Кожнага, бадай, хвалявала прычына гэткага раптоўнага збору. Што, што адбылося? Хтосьці непадалёк шапнуў, што ўкралі з настаўніцкай акардэон, на якім граў Вова Лабаеў. Так гэта ці не, зараз даведаюцца.

У сярэдзіну квадрата выйшаў дырэктар школы, насуплены, змрочны, доўга стаяў, чакаў, пакуль усе ўгамоняцца. Вадзім неўпрыкмет павадзіў вачыма, пашукаў Люську Міронаву. Чамусьці нідзе не ўбачыў яе. Мо спазнілася, а то часам захварэла?

Ніяк не ўдавалася Вадзіму стрэцца з дзяўчынаю сам-насам. Тады, пасля канцэрта, ён не дачакаўся яе. Калі і кудой выскачыла Люська са школы, было для Вадзіма загадкаю. Няўжо пайшла праз стадыён, зрабіла гэткі круг, толькі каб не бачылі яе? Але чаго, чаго хаваецца? Ці мо хто іншы яе праводзіў? Нехта ж з класа ў час перамені, згледзеўшы ў двары Генку Шакуту, не то жартам, не то напраўду сказаў, што той аж сохне па Міронавай,

асабліва як пабачыў на сцэне. Ён, Вадзім, не паверыў гэтаму. Аднак розныя думкі ўсё ж лезлі ў галаву.

Дырэктар, калі, нарэшце, у двары запанавала цішыня, што нават нечы здушаны кашаль успрымаўся як вялікае парушэнне дысцыпліны, раптам загаварыў:

— Школа наша заклеймавала сябе ганьбай, якую ніколі і нічым не змыеш...— Ён зрабіў паўзу, наглядаючы, які эфект зрабілі яго словы, затым цяжка, гэта было бачна па яго твары, уздыхнуў. Павярнуўшыся ўжо да шарэнгі, дзе стаялі сямікласнікі, працягваў далей: — У сёмым «В», відаць, ці заўважылі, што не прыйшлі на ўрокі двое вучняў...

У Вадзіма ліхаманкава пранеслася ў галаве: «Хіба з-за гэтага трэба было збіраць усіх, каб чыхвосціць? Мо і Люську...»

— Яны больш не прыйдуць, іх месца не за партай, а за турэмнымі кратамі. Так, так, я не агаварыўся — за турэмнымі кратамі. Хто ж гэта такія, вы спытаеце, якое злачынства ўчынілі, тым самым абнясславіўшы нашу школу?..

Вадзім стаяў ужо ні жывы ні мёртвы: цяпер ён толькі заўважыў, што няма Генкі і Рылы. Але што, што яны ўтварылі? Няўжо і праўда ўкралі акардэон?

А голас дырэктара па-ранейшаму грымеў на ўвесь двор:

— ...дайшоўшы да сёмага класа, Рыла і Шакута палічылі, што граматы з іх хопіць і можна ўжо ўволю гуляць, аціраца ля ларка, дзе прадаюць і п'юць віно, набіваць папяросамі кішэні, да ночы тырчаць ля Дома культуры. Але ж такое вясёлае жыццё патрабуе сродкаў. А дзе іх узяць? Вот і пайшлі на злачынства. Учора іх абодвух схапілі за руку на гароднінай базе — прыйшлі з падробленымі квіткамі атрымліваць грошы. Яны даўно ўжо займаліся такой ганебнай справай, але дасюль ім неяк сыходзіла. І ўсё ж, як кажуць, колькі вяроўчцы ні віцца... Цяпер турма ім будзе родным домам...

Ашаломлены, Вадзім амаль нічога больш не чуў з таго, што далей гаварыў, чым страшыў астатніх дырэктар. Механічна (відаць, напароў памылак) напісаў кантрольную, ледзьве выседзеў астатнія ўрокі. Ішоў дадому з адчуваннем нейкай сваёй віны ў гэтай гісторыі. Усё ж ён, Вадзім, ведаў, што Шакута маніў наконт багатага дзядзькі з Гродна, які нібыта падараваў яму футболку, падкідваў грошы на ласункі. Ды і пра квіткі Генка тады намякаў.

Хацеў і яго ўцягнуць з Рылам у кампанію, каб разам махляваць. Чаму, чаму ён не насцярожыўся, не пагаварыў як мае быць з Генкам? Усё ж дзяцінства сябравалі, хоць і рознае між імі было...

Гэты дзень яго зусім даканаў. Дома чакала яшчэ адна навіна, ад якой было хоць стой, хоць падай: Коля надумаў жаніцца. Пра гэта ён сам сказаў, калі Вадзім, паказваючы, што злуецца, не хоча з ім і словам перакінуцца, есці разам нават не хоча, палез адразу на халодную печ, лёг нібыта спаць.

Брат сядзеў, задумаўшыся, за неприбраным ад учарашняга сталом, і Вадзім з-за коміна не-не дый цікаваў за ім. Вось ён падняўся — быў, дзякаваць Богу, не п'яны і чамусьці прыфранчаны, адзеты ва ўсё сваё лепшае,— прыняў, паставіў пад лаву пустую бутэльку, падышоў да печы, вінаватым голасам папрасіў:

— Ты не злуйся, добра? Ну, пагарачыўся, чаго не бывае. Мы ж з табой апошнім дзяліліся, усё аднолькава зведалі. Сёння мне ўжо дзядзька Даўнар мазгі ўстаўляў. Ён, само сабой, праўду кажа. Дурны я, мусіць...— Коля трохі памаўчаў, пасля, замяўшыся, нечакана выпаліў: — Хазяйка тут нам трэба, каб і памыць, і зварыць, што магла. Мішка во ўчора вазіў да сябе, у Заямнае. Кажа, каб жаніўся. Дзеўку добрую паказваў. Сёння зноў будзе ехаць з Радава, забярэ з сабой. У сваты пойдзем. Бацька яе з Мішкам разам робяць. Дык... Ён нам паможа. Кацярына толькі нешта капыліць губу, нічога не кажа...

— Дык, можа, пачакаць, Коля? — не вытрываў усё ж, азваўся Вадзім. Ад гэткай навіны ён ужо не мог улежаць на печы, злез, сеў за стол.— Як жа тады я? Дый і Верка нічога не ведае. Хоць бы ёй сказаць...

Коля чамусьці паморшчыўся, нечакана злосна азваўся пра сястру:

— А яна пытала ў нас, калі замуж выскачыла? Га? Пытала? Як мы ўдвох жыць будзем? Што есці будзем? Насіць што? Сабралася — і як сабе хочаце.

— Дык Юзік жа не мог тут...— хацеў абараніць Верку Вадзім, але не паспеў: у сенцах нехта загрукаў ботамі. Коля кінуўся да клямкі, расчыніў дзверы.

На парозе стаяў Кацярынін Мішка. У руцэ, забыўшыся, відаць, пакінуць на возе, ён трымаў сырамятную пугу.

## 7

Пісьмо ад Казіка прыйшло перад самым Колевым вяселлем і было адной-адзінай за апошні час прыемнай нечаканасцю. Яго прынесла Клава Чапылова надвечар, калі Вадзім сядзеў на антонаўцы, абіраў у кош яблыкі. Гэты год у іх як ніколі мала ўрадзіла, і Коля грязіўся к зіме ссекчы і гэту яблыню, пакінуць хіба толькі дзве маладыя. І летась, і сёлета многія жорнаўцы да апошняга дрэўца спляжылі ў сябе сады, бо бралі за іх падатку куды больш, чым выпадала таго навару. «Урадзіцель, не інакш, недзе прабраўся да ўласці, які выдае такія цыркуляры,— шумеў, бушаваў днямі на ўсю вёску Язэп Ступак.— Вот бы Сталіну хто крэмзнуў. Ён бы знайшоў яго, паказаў, дзе ракі зімуюць. Нявіданае дзела...»

Вадзім прыгадаў зараз гэтыя словы старога Язэпа, горка ўсміхнуўся: «Ага, чакай, перашлюць Сталіну. А дулю не хацеў? Зноў пападзе ў рукі да таго цыркулярншчыка, а то да Рагулі».

Клава Чапылова зайшла ў двор, убачыла Вадзіма на дрэве, паклікала:

— Тут знекуль табе пісьмо. Ідзі вазьмі. Зараз ужо, мусіць, не зблытала...

«Пэўна, зноў ад Веркі,— абрадаваўся Вадзім, хутка саскочыўшы наніз.— Можа, сумее прыехаць. Але ж чаму мне, а не Колю?» Почырк, аднак, быў не Верчын, і Вадзім у нецярпенні разадраў канверт, выняў некалькі дробна спісаных ліісткоў, паглядзеў канец апошняга. Сэрца ў грудзях радасна ёкнула: там стаяў подпіс і адрас Лукашыка.

Чытаць цяпер не стаў, адклаў на вечар, бо з хвіліны на хвіліну можа вярнуцца з мястэчка Коля, а ён яшчэ і палавіны не зрабіў з таго, што загадаў брат. Яблыкі што, іх няшмат ужо засталося. Галоўнае — дровы. Два дні як не да ночы пілавалі яны і сасну, і елку (навазілі, дзякаваць Богу, летам), атрымалася дабрэнная куча цурбакоў. Цяпер іх трэба было ўсе пакалоць, скласці, каб трохі яшчэ абветрыліся, падсушыліся, праз тыдзень, калі будуць усё варыць, пячы, парыць, патрэбна шмат дроў, ды не абы-якіх, якія толькі б смылелі ў печы, а каб давалі спорнага агню.

Колю гэтыя дні таксама хапала. Два разы ездзіў у Мінск, усё шукаў добры, але па грашах, кіцель, новыя, не картовыя б толькі штаны, бо яго дыяганалевыя ўжо сатле-

лі, у многіх месцах зашываліся, цыраваліся. Адзяваць такія на вяселле было б брыдка.

Нічога, аднак, не купіў брат у вялікім горадзе. Яму падказалі ў мястэчку аднаго краўца-яўрэя, і той пад-радзіўся і кіцель, і штаны пашыць са сваёй матэрыі.

Коля сёння і пайшоў да яго на прымерку.

Было цяжка з грашыма. Коля хацеў спачатку ехаць да сястры, прасіць у яе даць трохі ці пазычыць. Аднак не паехаў. Успомніў, як вясной яшчэ яна пісала, што ад нейкай хваробы здох той іхні конь, а наперадзе ж лета, усе работы, і яны з Юзікам не ведаюць, што рабіць, што чыніць. З суседзяў не вельмі хто выручыць, самі захлынаюцца, а купіць новага каня змогуць хіба толькі ўвосень, бо няма зараз за што.

Памог Мішка. Ён прапанаваў — праўда, з агаворкай, каб за зіму сабралі і аддалі — грошай і на апратку, і на вясельны стол. Вось цяпер Коля і насіўся то з тым, то з гэтым: трэба было, апроч сваіх убораў, прыстарацца недзе цялё ці добрага барана, купіць якога подсвінка, выгнаць гарэлкі. Мукі — два мяшкі — таксама пазычыў Мішка, і яе, як разлічваў Коля, павінна хапіць, каб спячы хлеба, развесці бражку. Не было толькі пытляванкі на булкі, але больш прасіць брат пасаромеўся ці пабаяўся: як пасля ўсё гэта вярнуць? І так во залез дык залез у ярмо, за яго працадні ў калгасе і праз усё жыццё не разлічышся. Трэба будзе нешта прыдумваць... Зрэшты, замест булак можна купіць у Мінску калачоў ці так чаго белага. І сыдзе, ніхто не ўпікне.

Вадзіму дык з самага пачатку было ўсё не па нутры: і гэтая раптоўная братава жаніцьба, і што Мішка надта ж ужо добранькім хоча паказацца, але нагвалт узяў Колю ў свой абарот, з якога, каб той і схацеў, ужо не вырвецца, змушаны выконваць яго волю; і яшчэ — а гэта, можа, самае галоўнае — не прыедзе Верка. Тыдзень таму яна напісала, вінілася, што надта ж усё няскладна выходзіць: не справяцца, каб і хацелі, выкапаць картоплю, пасля ў лесе Юзік моцна пасек нагу, і ўся работа, каб яна згарэла, лягла на яе плечы. Сястра вельмі прасіла Колю яшчэ пачакаць, калі толькі можна, з жаніцьбай. Хаця б да зімы. Тады яны абавязкова прыедуць, бо ўжо і перад людзьмі брыдка, гэтак закапалася на новым месцы і носа ў Жорнаўку не паказвае.

Разгублены такім адказам, Коля пазнаёміў з пісьмом Мішку. Той, прачытаўшы, хмыкнуў, з'едліва сказаў:

— Глядзі сам, глядзі. Можам і саўсім нічога не рабіць. Лілька дзеўка ядраная, спраўная, ды шчэ за такім бацькам, што ўмэнт знойдзе сабе. А ты з носам астанешся. Саветаваць Верцы лягчэй лёгкага. А што б памагчы чым дзелавым, дак не. Толькі саветаваць...

Пасля такіх слоў Коля больш не заікаўся аб пераносе вяселля. Вадзім таксама не стаў нічога гаварыць, бо ведаў, што брат усё роўна не паслухаецца. А вось Мішку вельмі хацелася кінуць проста ў твар: «А вы, вы многа памаглі? Што, забыліся, як з пенай у роце прымчаліся, забралі той няшчасны мяшок? Не пакінулі хоць жменьку белай мукі на зацірку. Зараз і Верку чапаеце. Муляе вам. А яна ж сястра, хоча як найлепей. Можа, хацела б спачатку паглядзець на вашу хвалёную Ліньку. Калі ўжо такая спраўная, то чаго ж дагэтуль не выскоквала? Колю чакала?..»

Не, ён не сказаў тады ўсяго гэтага, што стрэмкай сядзела ў ім, не давала аніякага спакою. Коля мог бы цыкнуць на яго, сказаць, каб не ўмешваўся.

Дровы калоліся лёгка, бо сукоў было не вельмі, дый тапор Вадзім навастрыў у дзядзькі Даўнара як ніколі дагэтуль. Пакуль падцямнела, ён амаль і скончыў, засталося адно заўтра скласці, як хацеў брат: пад паветкай, але каб з бакоў прадзімалася ветрам. Цяпер можна сесці за ўрокі, бо паліць стаяк і гатаваць што на вячэру Коля падрадзіўся сам. Толькі чаго ён так затрымліваецца?

Найперш карцéла даведацца, што піша Казік.

Ліст яго ўразіў ужо амаль з першых радкоў: «Сум мой, боль, душа мая — з вамі, у вашым далёкім адсюль і ціхім гарадку...» Вадзім адарваўся на хвіліну ад чытання, адчуўшы, як пачынаюць вільгатнець вочы, а да горла падкочваецца здрадлівы камяк. Падумаў яшчэ: «Усё ж недарма ён пісаў вершы. Не проста гэтак выкласці, што адчуваеш, што робіцца ў душы. Мучышся, мучышся, носіш у сабе, а каб перадаць каму свае пачуцці, ды яшчэ на паперы... не ўсякі зможа».

Церануўшы рукавом вочы, ён чытаў далей: «Пражыў там адзін толькі год, а здаецца, што ўсё жыццё. Часта начамі бачу ў сне свой інтэрнат, хлопцаў, якія дзялілі з табой апошнюю скарынку, а доўгімі зімовымі вечарамі расказвалі кожны пра сваё. Калі ехаў туды, да вас, думаў: у мяне горш, чым у каго, мае балячкі самыя цяжкія, самыя невылечныя. А паслухаў іншых — было ж, было часу не толькі слухаць, але і бачыць,— як брыдка стала каму

прызнавацца, што ты гэтакі разняшчасны, з усіх бакоў пакраўджаны лёсам. Ну, з маці так усё выйшла, ну, з бацькам. Шкода і яго, і яе таксама. Але яны ж хоць жывыя, бачаць хоць сонца, дрэвы, дыхаюць гэтым паветрам. А колькі не вярнулася з вайны, колькі загінула ад яе! Вось і ў цябе, Вадзім. Ты сам не расказваў, але я чуў пра цябе, пра тое, што перанёс. А думаеш, не бачыў, які ты сядзеў на ўроках, пра што часам думаў? Твае галодныя вочы гаварылі пра ўсё. Таму так і хацеў неяк пасябраваць, каб хоць чым падбадзёрыць цябе. Але ты не менш, сам таго, мусіць, не ведаючы, падбадзёрваў і мяне. Ніколі не плакаўся, не жаліўся, як, мусіць, ні было табе цяжка, і мне было на каго раўняцца.

Цяпер вельмі не хапае цябе, Вадзім, павер майму слову. Каб не бацька — ён зусім ужо інвалід, сам не ў сілах і кроку ступіць, а ў шпіталі наадрэз адмовіўся ляжаць,— я тут жа прымчаўся б да вас, зноў сеў бы за парту, хоць стаў мо і перастаркам для сёмага класа. Але... Няма мне як хадзіць у школу. Жывём толькі на бацькаву інвалідную пенсію, і ўвесь мой час, сілы ідуць на яго. Нешта ж трэба рабіць, падрабляць, а як і дзе? Пакуль што гэта не проста...

Часта ўспамінаю Вераніку Васільеўну, той вечар у яе пад акном... Ведаеш, не хапала смеласці нават табе ва ўсім прызнацца, як па вушы ў яе ўкляпаўся. Нечым яна напамінала маму, толькі была многа маладзейшая і ўся пасівелая. Але ж ты ведаеш яе гісторыю, што перажыла яна ў той лясной палескай вёсцы... Кожны б ад такога, мусіць, пасівеў. Калі прачытаў пра яе, пасля ўбачыў на свае вочы, я зразумеў: лёс мой зараз у палоне дзвюх жанчын — маёй мамы, за якой я так далёка пабег з патаемнай думкай (каюся і прызнаюся хоць зараз) неяк адбіць ад таго афіцэра, вярнуць да сям'і, і да гэтай дачасна ссівелай, маўклівай настаўніцы малодшых класаў. Яна ж мала чаго старэй за мяне, і закахацца ў такую было зусім няцяжка нават шасцікласніку.

Я і закахаўся. Але хіба яна магла здагадвацца аб гэтым? Часта ці ў школьным двары ў часе перапынак, ці так дзе я толькі назіраў за ёю, марачы, што яна неяк прыкмеціць мяне, гляне ў вочы. Яны, вочы мае, пра ўсё сказалі б ёй... Смешна, праўда? Трохі астыўшы, я і сам зараз смяюся з сябе. Помніш, як чытаў я ў пустым інтэрнаце, калі хлопцы збеглі на выхадны дадому, верш «Вераніка». То ж быў пра яе, Вераніку Васільеўну. Дзе яна

зараз, ці бачыш у школе? Нікому з нашых не расказвай, што я табе тут нагарадзіў. Палічаць яшчэ нейкім ненармальным, не ў меру чуллівым, а то і слюнцяем...

Цяпер пра галоўнае. Мама нядаўна напісала (дачулася ж, бачыш, ад некага), што рыхтуюцца судзіць двух нашых аднакласнікаў. Аднаго з іх успомніла — Рыла, а вось другога не ведае, хто ён такі. Ці не Шакута? Яны ж разам усё былі, пра нешта шапталіся, нешта вымудроўвалі. Шукалі, відаць, сабе гуза. І знайшлі. Хто ён, Рылаў напарнік? Як можна было да такога дакаціцца — пайсці на махлярства, красці ў дзяржавы? Усе ж вучылі нас нечаму добраму, чыстаму, вучылі любіць зямлю сваю, за якую столькі праліта крыві, любіць людзей. Няўжо для некаторых — гэта пустыя словы, і няма, няма нічога святога? Страшна ж тады жыць...

Часта спрачаюся з бацькам. Ён дык зусім на ўвесь свет злуецца. Кажа, што ўсюды сядзяць, камандуюць адны нягоднікі і пустабрэхі, якія толькі пра сябе дбаюць, падпяваюць адзін аднаму і заплюшчваюць вочы на тое, як жывуць іншыя, што робіцца далей іхняга носа. Усё паўтарае ад некага, мусіць, чутае: «Рыба з галавы гніе». Я не раз дапытваўся, што ён гэтым хоча сказаць, на каго намякае. Але бацька маўчыць, толькі сапе, нават часам скрыгоча зубамі. Я ненавіджу (во дажыўся да чаго!) яго ў гэткія хвіліны, і ён, адчуваючы, відаць, што я зараз узарвуся, а то магу і заплакаць, пераключаецца на іншую гаворку...

Відаць, на гэтым спынюся, бо трэба бегчы ў аптэку па каплі — бацьку зноў хапіла сэрца. Пішы, Вадзім, як ты, як усе нашы. Усё мне цікава ведаць, прырос я да вас, і кожнае тваё пісьмо будзе мне найлепшай падтрымкай. І яшчэ: ці працаваў летам там, куды цябе рэкамендавалі, ці падзарабіў што? Моцна цісну руку і чакаю адказу. Твой Казімір».

Вадзім мо з паўгадзіны сядзеў, уталопіўшыся невядома куды, абмазгоўваў прачытанае. Развярэдзіў Казік яму душу, яшчэ як развярэдзіў, нібы адгадаў і ягоныя думкі, ягоны настрой. Хацеў тут жа пісаць адказ, але зразумеў: пакуль не зможа, бо ў галаве рабілася чортведама што, была там сапраўдная каша. Лепш ён збярэцца з духам і тады ўжо пастараецца гэтак жа талкова выкладзець на паперу сваё, тое, што перажыў, адчуў, успомніць найбольш цікавыя з навінаў. А іх жа сабралася з часу ад'езду сябра нямала.

Ён схамянуўся, толькі калі ў двары пачуліся крокі, ды

не аднаго чалавека, а, мусіць, двух ці трох. Братавы пазнаў адразу, а вось хто з ім — невядома. Па тым, як Коля лэпаў, шукаў клямку, пасля адчыняў дзверы, Вадзім зразумеў, што той зноў наглюгаўся. Цяпер яму не да стаяка і не да іхняй разам вячэры. Яшчэ з сабой некага прывалок. Мусіць, недабралі і тут (чаго ж, выгнаў-ткі самагонкі, купляць не трэба) пастараюцца заліць вочы да канца.

Як і меркаваў Вадзім, другім аказаўся Жоржык Галенда. Па голасе яго пазнаў. Жоржык, адчувалася, таксама быў «цёпленькі».

Коля, бы Вадзім і не існаваў для яго, нават не зазірнуў у залу, не пацікавіўся, як ды што. Адразу пасунуўся ў кладоўку ў сенцах, зашнарыў у цемнаце па паліцы, дзе стаялі налітыя бутэлькі, нарабіў звону. Пасля лазіў на печ, вырваў з вянка некалькі цыбулін.

Хочаш не хочаш, а давялося слухаць, пра што яны гаварылі.

— Ну, то будзьма! — Гэта ўжо Галенда, відаць, падняў кружку, стукнуўся з Колевай, выпіў і пасля кароткага маўчання прадоўжыў нейкую сваю думку: — Эх-х-ма! Усё ж лепей воля, чым гэты хамут. Я дык і не думаю яшчэ пра бабу так, каб даць зацугляць сябе. От, пагуляць — яно пажалуста, можна і на сенніку...— Ён смачна хіхікнуў, папярхнуўся, пасля, закашляўшыся, сціх.

Не адзываўся таксама і Коля. Нешта, відаць, муляла яму з гэтым скараспелым вяселлем, таму і пацягнуўся да дружка, каб пагаварыць, а то і развітацца назаўсёды са сваім халасцякоўствам. Аднак брат нечакана загаварыў пра другое — зноў пра тую крыўду, якую нанёс яму Рагуля. Наструнены і дагэтуль, Вадзім наструніўся яшчэ больш. «Усё ж свярбіць яму яго болька,— падумаў пра Колю.— Відаць, таму і глушыць яе гарэлкай. Пакуль не пайшоў ні на якую другую работу, хоць Давэцька ўжо грозіўся».

Жоржык нешта мямліў сваё, але Вадзім мала ўжо слухаў абодвух. Ён раптам як ніколі яскрава зразумеў: трэба штосьці рабіць, мяняць і для сябе, бо так не вытрывае, не зможа ні вучыцца далей, ні наогул жыць. Брат, як толькі прывядзе ў хату жонку, яшчэ больш адыдзе, адчужыцца, калі і цяпер во не стала як пазнаць яго. А яшчэ гэтая атрута, да якой усё больш і больш прыкладваецца...

Галодны, ён лёг сёння ў пасцель, даўшы зарок хай не

заўтра ці паслязаўтра, то ўжо адразу пасля вяселля з'ездзіць да Веркі і Юзіка, каб пра ўсё пагаварыць. Калі трэба, то і стане перад імі на калені. Іншага выйсця ён не бачыў.

## 8

Усе апошнія дні перад вяселлем, у часе самога вяселля і пасля ён толькі і жыў сваёй марай, яна давала хоць трохі настрою, грэла душу. Каб не гэта, то, пэўна, захварэў бы, зваліўся б з ног ці так што з ім сталася б. Да ўсіх іншых непрыемнасцей — з Рагулем, з братам, няхваткай аднаго, другога, клопатам, што дзе дастаць, прынесці, пазычыць — дадала галаваломак і Люська, таксама ўзвінціла нервы.

Ён такі падпільнаваў яе, хоць дзеля гэтага прапусціў адзін, апошні, урок. Дзяўчына пасля сваіх заняткаў заглянула ў краму, і тут, калі ёй важылі камсу, Вадзім падышоў збоку, ціха павітаўся, спытаў, ці ідзе дадому. Люська пачырванела, замялася, але, расплаціўшыся, выйшла на вуліцу і ўжо не ўздумала ўцякаць ад яго.

— Ты нечага сярдуеш? — Вадзім не стаў доўга маўчаць, папытаў без усякіх лішніх хітрыкаў.

— З чаго ты ўзяў? — Люська нават і не падняла галавы, не глянула на яго.

— Бачу ж. Хаваешся, уцякаеш. Бы я ў чым вінаваты перад табой.

— Не перада мной...

Вадзім ажно спыніўся, уражаны гэткім адказам. Выходзіць, нешта ж яна трымае наўме, трымала ўвесь апошні час, толькі не хацела сказаць. Але што, што ёй маглі нагаварыць? Не будзе ж яна абараняць старшыню, Давэцьку, і яшчэ таго-сяго, на каго ён напісаў у тую мінскую газету. Вось перад імі ён вінаваты, але вініцца і не падумае.

Люська, аднак, агламошыла як не напавал.

— Цётка Надзя, ну, Генкі матка, дык яна ўсім кажа, што ты іх выдаў. Каб не ты, то... Яна злегла, выклікалі доктара. На ўколах зараз і трымаецца...

Такога павароту ў гэтай брыдкай гісторыі з Шакутам і Рылам ён аніяк не чакаў. Да болю стала крыўдна, што Люська паверыла, быццам ён можа некаму нашаптаць і гэтак подла з некім расквітацца. Яны самі сябе пакаралі, але ж пры чым тут ён?

— І ты, ты...— Вадзім ажно задыхаўся, падшукваючы патрэбныя словы.— Ты напраўду пра мяне так... пагана?!

Сам таго не чакаючы, ён пакінуў Люську адну, як не пабег назад, у бок школы. Глухімі завулкамі, каб не трапляць нікому на вочы, выкружыў у поле, невядома куды і колькі брыў па раллі, пасля па канюшынішчы, зноў па раллі. Мінуўшы нейкі лясок, выйшаў яшчэ на большае поле, таксама ўжо зааранае, набраў поўныя чаравікі зямлі, іншага друзу, але не захацеў нікуды зварочваць, шукаць якую сцежку ці дарогу. Зноў прыгадаў тое, што гаварыла Люська Міронава. Цяпер толькі да Вадзіма дайшло, скуль цётка Надзя ўзяла гэтую пра яго плётку. Ну, вядома ж, сам Генка ўвёў ёй у вушы, каб хоць неяк апраўдацца. А мо Шакута і напраўду падумаў, што ён, Вадзім, выдаў іх? Тады ж, пазалетась, у іх была гаворка. Генка ўжо тады адкрыў свае карты...

Удалечыні Вадзім згледзеў бярозавую грыўку і, павагаўшыся, усё ж скіраваў туды. Па шляху падняў, спудзіў шарака, і той, наструніўшы, наставіўшы вушы, высока выкідваючы заднія лапы, даў некуды добрага драпака.

Падышоўшы бліжэй да дрэў, Вадзім зразумеў, што гэта ніякая не грыўка, не суцэльны зялёны гаёк, а чыйсьці былы хутар, толькі па краях абсаджаны бярозамі. Пабудоў ужо не было, на іх месцы ляжалі разварочаныя камяні, драўляная трухля, бітая цэгла. Усюды раскашавалі лапухі, крапіва, якія скрадвалі рэшткі нечага жытла. Сіратліва непадалёку глядзелася старая каржакаватая груша, якая шырока раскінула па баках галіны і чымсьці нагадвала мудрую птушку, што крыллем прыкрывала, бараніла сваё гняздо. «Не ўбараніла ўсё ж...— з жалем да чужога, невядомага яму селішча падумаў Вадзім.— Знеслі хутар ці мо пажар усё спляжыў? Але ж тады і грушу не пашкадаваў бы агонь... Няўжо і чалавек гэтак? Жыве, жыве, ірве жылы, радуецца, маркоціцца з-за любой драбязы, а пасля, не ўспее і агледзецца — усё ўжо ззаду, усё тваё скончана, наперадзе адно змрок, небыццё?»

Нешта бы ўдарыла яму ў голаў, і Вадзім абліўся ажно халодным потам, зняможана прысеў на кукішках на зямлю. «Ці не Матэцкага гэта хутар? — абпаліла мазгі раптоўная згадка.— Але як, як я трапіў сюды?»

Ён асцярожна агледзеўся ва ўсе бакі, нібы за ім хто сочыць, пасля, трохі пасмялеўшы, стаў нагамі на адзін з камянёў, спрабуючы ўбачыць, пазнаць удалечыні Заямнае, мо і тую дарогу, кудой яны з Колем вярталіся дадому,

каб першымі пачуць жахлівую вестку пра маці і Лёву...

Удалечыні і напраўду віднеліся прысады нейкай вёскі, і цяпер Вадзім ужо ніколі не сумняваўся, дзе ён, куды так неспадзеўкі забрыў. Страх ад гэтага ведання яшчэ больш скаваў цела. Здавалася, што непадалёк прытаіўся падстрэлены нейкім гадам, але недабіты ваўкадаў, і ён зараз кінецца, пашкуматае на кавалкі.

Перамагаючы слабасць, Вадзім пабег. Пабег без аглядкі. Сэрца выскоквала з грудзей, але ён і не падумаў, каб хоць на хвілінку прыпыніцца, перавесці дых. Калі мінуў лес і ўбачыў здалёк Жорнаўку, калі ступіў на свой лог, тады толькі пачаў крыху супакойвацца.

У вёску, да сябе дадому, не схацеў пакуль што ісці. Ведаў, што зараз і твару на ім няма. Трэба недзе на сухім пасядзець, ачомацца, упыніць нервы.

Па ржэўніку — поле выглядала па-восеньску пустым і панылым — пабрыў у бок маяка. Няўзнак глянуўшы наперад, Вадзім спыніўся бы ўкопаны і ані нічога не зразумеў: а дзе ж, дзе іхні маяк? Няўжо рухнуў?!

Падышоўшы бліжэй, ён і праўда ўбачыў на зямлі паломаныя ўшчэнт бёрны, пакарожаныя пераплёты. Стала да слёз, да спазмаў у горле шкада, хоць у думках ужо даўно, здэцца, зміры́ўся, што некалі ж гэта здарыцца. Толькі чаму ніхто ў вёсцы не сказаў, калі маяка не стала? Няўжо людзям усё роўна, ёсць ён ці няма? Ці так зашыліся ў сваё, што і голаў падняць некалі, каб убачыць трохі далей свайго двара?

Крыўдна і балюча было Вадзіму. Сённяшні дзень нагул выпрабоўваў яго на гарт, і здавалася, што не вытрымае ён гэтага выпрабавання, сарвецца, наробіць нямала дурнотаў, за якія пасля доўга будзе расплочвацца...

Трэба было б ісці адсюль, але Вадзім адчуваў, як не слухаюцца ногі, як не стала чамусьці сіл. Ён так-сяк нагроб, дзе мог, сухой травы і, нягледзячы ні на што, прылёг, унурыўся тварам у жарству, нават не падставіў да шчок далоняў. Недзе над ім, чуў, ляцелі ў небе гусі, падавалі знаёмыя развітальныя гукі. Але Вадзім не павярнуўся, не праводзіў іх поглядам, не памахаў, як заўсёды рабіў, рукой.

...Праз тыдзень пасля вяселля, як нікога не было дома — Коля і Лілька яшчэ звечара паехалі да яе бацькоў,— ён пакінуў на кухні на стале кароткую пісульку:

«Дарагі брат! Ведаю, што я вам тут толькі замінаю, труся пад нагамі. Я падамся да Веркі і, можа, там астануся назусім. Таму не турбуйся за мяне. А вам усё каб найлепей было. Пасля, як і што, напішу. Вадзім».

Раніца пачыналася з густога, нібы малодзіва, туману, але Вадзіма гэта не засмучала. Наадварот, так яму лацвей было дабрацца да станцыі, каб ніхто не бачыў з вёскі, не стаў дапытвацца, чаго ў нядзельны дзень чуць свет некуды прэцца. Ды раней і поезд мо трапіць які, тады к вечару, калі пашанцуе, будзе ў сястры.

Ён яшчэ раз акінуў поглядам хату, памацаў у кішэні канверт ад Веркі, з яе там адрасам, і, выйшаўшы на двор, замкнуў дзверы, а ключ паклаў у знаёмае Колю месца.

Кажуць, што каб ведаў, дзе гоцнешся, то загадзя саломкі б паслаў...

Каб жа ведаў Вадзім, што яго чакае, калі рызыкнуў выбрацца ў першую ў ягоным жыцці вялікую дарогу, то, мусіць, надоўга яшчэ выкінуў бы з галавы сваю задумку, сваю гэтак цяжка вынашаную, выпакутаваную мару.

А пачалося ўсё з неабачлівага, безразважнага кроку, калі ён, злаўчыўшыся, скокнуў на падножку нейкага грузавога цягніка. Перад гэтым да абеду ажно споўдаўся па станцыі, колькі разоў хадзіў глядзець расклад, аднак нічога суцяшальнага для сябе не знайшоў у тым раскладзе.

Не ўнёс поўнай яснасці і дзяжурны — пажылы вусаты дзядзька з павязкай на рукаве.

— Поезд-то к вечару будзе,— вусаты надта ж неяк падазрона мераў Вадзіма з ног да галавы.— Толькі пінёнзаў у цябе, друг сітні, ці хопіць? Як-ніяк, скоры ж...

Давялося назваць сваю станцыю, куды трэба ехаць, і дзяжурны, бы кожны дзень катаўся туды і назад, адразу сказаў на памяць цану. Вадзім як не прысвіснуў, але своечасова стрымаўся, прыкусіў язык: вядома, такіх шалёных грошай у яго няма і быць не магло, калі вяселле загнала іх з Колем у чортведама якія даўгі.

Ён, надаўшы сабе выгляд, што збіраецца чакаць таго скорага, адышоўся, сеў на фарбаваную лаўку ля чыгуннай агароджы ў сквер. Нешта трэба было прыдумваць. Вяртацца дадому — гэта ўжо адрэзана, назад дарогі няма. Як бы ён пачуваў сябе, каб зараз, нібы пабіты сабака, зайшоў у хату і там заспеў Колю і Ліньку з яго пісулькаю ў руках?..

Тое, што нечакана ўлавіла вуха, прымусіла Вадзіма скінуць санлівасць, борзда ўскочыць на ногі. Ён зноў прыслухаўся і ўжо без усякага сумнення вызначыў: з боку Мінска нешта набліжаецца, нараджаючы гук, акурат хто дужы круціць у ахвоту сячкарню, рэжа сечку — чык-чак-чык, чык-чак-чык, чык-чак-чык. Але гул гэты скора ператварыўся ў суцэльны грукат, і яшчэ здалёк Вадзім убачыў чорны дымны паравоз, а за ім — безліч вагонаў-хатак без вокнаў і дзвярэй. Пры самай амаль станцыі паравоз голасна абвясціў аб сабе, даўшы рэзкі, пранізлівы свісток, і трохі прытармазіў хаду.

Раздумваць доўга не выпадала. Прыкмеціўшы на даху аднаго з такіх домікаў чалавека, здэцца, падлетка, які спакойна і нібы насмешліва нават глядзеў на вусатага чыгуначніка, Вадзім імгненна скокнуў да рэек, перачакаў, пакуль адстукаюць апошнія колы, і мёртвай хваткай учапіўся рукамі за нейкую патырчаку ззаду вагона. Трохі прабегшы, ён спрытна адпіхнуўся ад зямлі, павіснуў у паветры, а тады ўжо лёгка дастаў нагамі прыступку жалезнай лесвічкі. Дзяжурны, толькі зараз згледзеўшы яго, кінуўся быў наўздагон, але адразу ж адстаў. Узамен на яго мацюкі Вадзім паказаў язык.

Вісець на лесвічцы стала цяжка, ад напругі забалелі рукі і ногі, і ён пакараскаўся на дах. Там было ветрана, затое — вольна. Хочаш — сядзі, хочаш — кладзіся ды зіркай сабе наўкруг.

Ён так і рабіў напачатку. І сядзеў, і ляжаў. Далёка ўперадзе горбілася фігурка таго невядомага падлетка. Цікава, куды ён едзе? Мо да адной станцыі? Было б добра.

Цягнік пакрысе прыспешваў бег і нарэшце гэтак зашчыраваў, што ў Вадзіма ажно дух заняло. Слупы, з напісанымі на іх нейкімі лічбамі, цяпер ужо толькі і мільгацелі перад вачамі. Горш, што пачаў даймаць холад. Ён, разам з шалёным ветрам, працінаў наскрозь. Нешта трэба было прыдумваць, бо так доўга не вытрываеш, умомант акалееш і паляціш долу. Тады ўжо не пакажаш нікому язык.

Вадзім паспрабаваў стаць на ногі, каб патанцаваць, памахаць рукамі. Аднак не паспеў трохі выпрастацца, як паветраная хваля кульнула яго на спіну, правезла па гладкім халодным даху. Добра, што ўспеў хапіцца за нейкую трубу і да пасінення пальцаў трымаўся за яе, пакуль не лёг лацвей на жывот.

Счакаўшы, аддыхаўшыся, ён папоўз да краю, да той лесвічкі з намерам зноў спусціцца ніжэй, павісець, затое

ўжо за вагонам, дзе, пэўна, не будзе гэткага ветру. Цяпер ён, здэцца, скочыў бы назад, на зямлю, гарам бы яна гарэла, такая язда. Але ж не скочыш, бо зараз жа скруціш сабе галаву, паломіш косці. Хіба мо калі поезд прытармозіць.

Краем вока Вадзім згледзеў, што па версе хтосьці рухаецца ў ягоны бок. Сагнутая ў тры пагібелі, фігурка тая нагадвала чортведама што. Здаецца, хтосьці цягне на дроце пудзіла, каб напалохаць ці, наадварот, каго насмяшыць. І толькі калі на стыку вагонаў, над саменькай дзіркай, пудзіла рабіла рэзкі галаваломны кідок уперад, тады толькі можна было пазнаць у ім чалавека, прытым чалавека, які нічога не баіцца, прайшоў, мусібыць, ваду, агонь і медныя трубы. «То ж падлетак той, што чыгуначніку ўсміхаўся! — падзівіўся Вадзім.— Во дык умее!»

Ён не стаў злазіць, вырашыў пачакаць, нягледзячы, што зубы выстуквалі ўжо чачотку. Незнаёмы падлетак зрабіў нарэшце апошні ўзмах і апынуўся ля Вадзіма.

— Здароў, шкет,— нібы яны былі даўно знаёмыя, павіталася «пудзіла», прымошчваючыся побач.— Закурыць маеш?

Хоць было зусім не да весялосці, але Вадзім, глянуўшы зблізку на хлопца, расплыўся ў кіслай усмешцы: твар яго акурат хто пісягамі намазаў сажай, адно зубы блішчэлі; на галаве соўгаўся, завязаны пад барадой матузкамі, гэтак жа вываджаны невядома ў што салдацкі шлем з пальцам-пупсікам на макаўцы. Не менш пацяшала і целагрэйка: у многіх месцах прапаленая ці так парваная, з кавалкамі цёмнай злямцаванай ваты наверсе, яна таксама сядзела на хлопцу, бы на карліку, што найбольш і давала яму падабенства з пудзілам.

— Н-н-не к-куру,— ледзьве мог утаймаваць зубы і вымавіць слова Вадзім.— З-з-замёрз во...

— Мяне завуць Жмых,— замест спачування ці якой парады адрэкамендаваў сябе падлетак.— Лёнька Жмых. А ты?

Не вельмі Вадзіму хацелася знаёміцца, але ўсё ж змушаны быў таксама назвацца.

Жмых нібы толькі зараз заўважыў пасінелыя Вадзімавы губы, тое, як ён увесь калоціцца. Прысвіснуўшы, сказаў:

— Хана б табе, каб не я. Гэта точна. Лезь да мяне, грэцца будзеш.— Ён адшпіліў адзіны цэлы гузік, расхінуў крысо целагрэйкі.— Не на печы ў маткі, але і не дасі дубара.

Вадзім трошкі памуляўся, і Лёнька, па-свойму, відаць, гэта зразумеўшы, супакоіў:

— Вошай не бойся, як холадна, яны не шыюцца наверх. Не дурныя. Сядзяць, дзе цяплей. Не тое, што мы...

Ад Жмыха пахла чортведама чым, нос ажно ледзь вытрымліваў: і вогнішчам, і мазутай, і вугальным пылам. Аднак Вадзім, памалу адыходзячы пад чужой целагрэйкай, амаль і не звяртаў увагі на тыя пахі. Галоўнае цяпер — даехаць да патрэбнай станцыі.

Нібы адгадаўшы ягоныя думкі, Жмых пацікавіўся:

— І далёка лыжы навастрыў? Бачу ж — навічок на дарозе...

Вадзім назваў, дзе яму трэба злазіць.

— Не помню такой станцыі,— наморшчыў лоб хлопец.— Ды і не ўсюды таварняк спыняецца. Нават тармозіць. Бывае, едзеш, едзеш, а канца няма...

Вось пра гэта Вадзім неяк і не падумаў. Жмыхавы словы не на жарт устрывожылі. А што, калі прапусціць свой прыпынак і аж у тундру якую прыджгае? Тады хоць што хочаш рабі. Во праветрыцца дык праветрыцца!..

Трывогу яго адчуў Жмых і, як большы меншага, паўшчуваў:

— Не напусці ў штаны. Яны ў цябе яшчэ ніштаватыя...— ён і напраўду пальцамі памацаў, памяў матэрыю на калашыне, пасля дадаў: — Са Жмыхам не прападзеш, не тое бачылі...

Мала-памалу Вадзім супакоіўся і ўсё больш пачаў пранікацца даверам да гэтага вонкава нібы грубаватага, але, адчувалася, душэўнага хлопца. Хацелася ўжо ведаць, хто ён, што змусіла катацца вось так па чыгунцы, адзець гэтыя лахманы. Ці ёсць у яго дзе дом, хто-небудзь з родных — матка альбо бацька?

Ён і папытаў у Жмыха пра ўсё, а праз мінуту пашкадаваў, што не стрымаўся, праявіў такую цікаўнасць. Жмыху бы хто шылам торкнуў у адно месца. Тузануўшыся, ён ускочыў на ногі, едка кінуў:

— Што, пашкадаваць захацелася? Ты ж чысценькі, сыты, відаць, бліны сёння са смятанай лопаў, аж вушы трэсліся. Мамка пастаралася. Вот толькі непанятна, як сюды, на дах, папаў? Ці грошыкі прыберагчы рашыў? А мяне не трэба шкадаваць, такіх шкадаванцаў я пабачыў, пасылаў іх ведаеш куды?..

Жмых смачна мацюкнуўся, хацеў пайсці, але Вадзім, сам ад сябе не чакаючы, раптам захліпаў і са слязьмі

прызнаўся, што ён ніякі не мамчын сынок, што маці і бацька даўно параць косці, і яго зараз прыперла, хоць у пельку тую лезь. Добра, калі сястра возьме, але ж на яе шыі яшчэ і меншы брат...

— Не трэба нічога гаварыць,— перапыніў Жмых, зноў сядаючы побач, зноў акрываючы Вадзіма целагрэйкай.— Не трэба, добра? А то і я пачну пра сябе, а тады слёз і ў двух у нас не хопіць...

Вадзіму стала ўжо брыдка, што гэтак разжаліўся, і Жмых зноў пстрыкнуў яму па носе. Добра, добра, гэта яму будзе навукай.

Чыгунка тым часам пабегла скрозь яловы лес, і адразу неяк пацямнела, нібы насунуўся вечар. Камлістыя, як абхваціць, дрэвы па абодва бакі насыпу нечым нагадалі Вадзіму Гараўкі, і яму зноў захацелася чамусьці плакаць. Плакаць па ўсім страчаным і ўжо незваротным, плакаць ад сваёй зараз бездапаможнасці, няпэўнасці становішча.

— Можа, хоць скарынка якая завалялася? — раптам папрасіў Жмых.— Даўно не станавіліся на фартовай станцыі, дык не разжыўся.

Вадзім лэпнуў сябе па кішэнях, нібы не давяраючы сваёй памяці, пасля вінавата мусіў прызнацца:

— Няма. Неяк і не падумаў, што трэ з сабой узяць.

— Нічога. Кончыцца лес, і нядоўга да Лучына. Там пастаім трохі, нешта памазгуем...

Вадзім ні разачку не чуў нават такой назвы, не ведаў, як далёка яшчэ яму. Зноў захваляваўся: хоць бы і там прыпынак быў! Хай на секунду, на дзве, яму і гэтага хопіць.

Лес скончыўся, зноў пайшло голае поле з рэдкімі сціртамі саломы на ім і яшчэ радзейшымі статкамі кароў ці авечак. Жмых, паўглядаўшыся па баках, папярэдзіў:

— Зараз пад'едзем. Не зявай, мяне трымайся, бо ўміг сцапаюць. У Лучыне ў мяне ўжо было...

Толькі паказаліся першыя будынкі, ён падабраўся, зашпіліў целагрэйку, рукавом цернуў па твары, нібы спрабуючы гэтак ачысціць яго ад бруду, пайшоў да краю вагона, да лесвічкі. Вадзіму сказаў, каб таксама быў гатовы скочыць, калі поезд не зусім яшчэ спыніцца, не дойдзе да саменькай станцыі.

Скаваны незразумелым страхам, Вадзім пакорліва кіўнуў галавой. Цяпер яму не было ўжо калі лаяць сябе за безразважнасць, а то і дурасць, што выперла яго з хаты, піхнула пачапіцца на гэты поезд, каб так во мерзнуць,

мучыцца, рызыкаваць нават жыццём. Нічога ўжо не паробіш. Трэба неяк трымацца да канца. Мо нядоўга засталося ехаць. Мо ў гэтым Лучыне спытае ў каго, як далёка тыя яго Стаўбуны.

Паравоз, нібы радуючыся хуткай перадышцы, зычна абвясціў аб гэтым гудком і нарэшце пачаў збаўляць ход.

Хлопцы былі напагатове. Першы крануўся зямлі, прабег трохі і адарваўся ад вагона Жмых. Вадзім таксама скочыў, але нейкая невядомая сіла цягнула яго ўперад, не давала цвёрда стаць на ногі. У апошні момант ён зразумеў, што зачапіўся за лесвічку крысом пінжака. Баючыся, каб не паваліла, не павалакло, бы падлу, па шпалах, ён з усяе сілы рвануў пінжак на сябе. Штосьці моцна шархнула, адчулася аблёгка, цяпер нішто быццам ужо не трымала. І ўсё ж Вадзім не змог ураўнаважыць свой бег, потырч паляцеў за шпалы, на гальку, адтуль па адхоне скаціўся ў рыжую стаялую ваду.

— Во і першае хрышчэнне,— праз хвіліну якую стаяў і скаліў над ім зубы Жмых.— Гэта яшчэ што! Бывае горш. Паўдня, бывае, ляжыш, адплёўваешся, чухаеш гузякі, а то раны залізваеш. Так што ты яшчэ ўдала.

Вадзім выпаўз з лужыны і ледзьве разагнуўся. Вада цурком сцякала з яго. Ні штаноў, ні пінжака стала не пазнаць. На адным калене свяцілася з кулак дзірка, а ў пінжаку было адарвана паўкрыса. Не ўбачыў наназе і аднаго бацінка, толькі рваная шкарпэтка кішкай спаўзала са ступака.

— Карцінка, у кіно паказвай,— зноў пачаў пацяшацца Жмых.

Гэта было ўжо занадта.

— Пайшоў ты!..— Вадзім мыляў губамі, не мог падабраць патрэбнае слоўца, якое б паўней выказала яго лютую злосць да гэтага пустадомка, бадзягі.

— Ладна, ладна, не выпускай усёй пары. Яшчэ прыгадзіцца...— прымірэнча сказаў Жмых.— А цяпер спяшайся. Праз паўгадзіны, а то і меней, пакоцім далей. Думаў, што ты, чысценькі такі, паможаш мне ля цётчыных сталоў пахадзіць, патаргавацца... Але ж ты...

— Не паеду я нікуды, не паеду! — не валодаючы сабой, закрычаў Вадзім.

Жмых толькі ўхмыльнуўся, ні слова не кажучы, падняўся на насып, знайшоў бацінак і шпурнуў Вадзіму. Адыходзячы ў бок станцыі, усё ж кінуў пагардліва:

— Смаркачы распусціў... Можаш сабе бегчы ў млі-

цыю, яны цябе пашкадуюць, пагладзяць па галоўцы, дадому адвязуць, а спачатку — у дзетпрыёмнік... Што, не чуў пра такі?

Ушчэнт падаўлены і разгублены, Вадзім адноназіраў, як Жмых на хаду скінуў з сябе, згарнуў і ўзяў пад паху целагрэйку, як, параўняўшыся з нейкім скасабочаным цагляным будыначкам, знік за яго вуглом.

Нешта трэба было рабіць і яму. Спачатку як мог выкруціў адзенне, рукой трохі палэпаў, ачысціў ад бруду і твані. Шкарпэткі, зняўшы і другі бацінак, патрымаў на ветры, каб хоць абшэрхлі, бо высушыць іх зараз аніяк не высушыш.

Калі, нарэшце, падняўся на насып, адчуў: на целе, пэўна, не адна драпіна, а верхняя губа дык наогул набухла, ажно напаўзла на кончык носа. Хацелася б глянуцца ў якое люстэрка. Але дзе яго возьмеш? А каб узяў, то што з таго? Не, на людзі яму ўсё ж нельга паказвацца. Засмяюць. Ды і чым памогуць? Складуцца на білет і пасадзяць на той... пасажырскі?

Ён і сам цяпер кісла ўхмыльнуўся, аднак губа адразу нагадала пра сябе непрыемным болем і свербам. Ужо без усякіх хістанняў Вадзім падаўся шукаць той іхні таварняк. Ат, што будзе, то будзе. Трэба цярпець, калі рашыўся без грошай, без цёплага адзення і харчу выправіцца ў няблізкую дарогу.

Канец цягніка ён убачыў, як толькі, ідучы па слядах Жмыха, абагнуў той жа самы лядашчы будыначак. Аказалася, што гэта прыбіральня. Вадзім вярнуўся, зайшоў усярэдзіну. Тут, на шчасце, нікога не было. Зрабіўшы што трэба, хацеў выйсці, але пачуў, як недзе капае вада. У забруджаным цёмным кутку Вадзім прыкмеціў кранік, некім не закручаны да канца. Адкруціў больш і з прагнасцю падставіў рот да халоднага струменя. Ён піў і піў, пакуль не забулькатала ў жываце, пасля даланёю спаласнуў збольшага і твар.

Ад вады нібы палягчэла, нават быў падняўся настрой. Аднак, глянуўшы пры святле на сваю апратку, зноў скіснуў. «Арыштант, яй-бо, арыштант, інакш не скажуць»,— стрэмкай сядзела ў мазгах адно і тое ж.

Трэба было спяшацца, бо таварняк у любы момант мог крануцца з месца. Вадзім выглянуў з прыбіральні і тут жа адскочыў назад: па пероне непадалёк прахаджваўся чыгуначнік, а насупраць высокага, з вялікімі вокнамі дома, мусіць, вакзала, стаялі, размаўлялі двое ў міліцэйскай форме.

Міліцыянеры асабліва палохалі Вадзіма. Чамусьці падумалася: гэта яны, не інакш, на некага палююць. Мо той цыгуначнік з Радава як-небудзь даў знаць, што наверсе вагона без білетаў, без анічога прахалоджваюцца двое і іх трэба абавязкова сцапаць. Мо Жмыха ўжо і сцапалі, цяпер выглядаюць яго?..

Ён цікаваў і цікаваў праз шчыліну ў дзвярах. Цыгуначнік, дзякаваць Богу, доўга на пероне не затрымаўся, памалу паклыпаў у вакзал. Карыстаючыся момантам, пакуль міліцыянеры не глядзелі ў ягоны бок, Вадзім зрабіў некалькі імклівых скачкоў праз рэйкі і шпалы і забег адзаду на другі бок таварняка.

І ў гэты самы момант, калі, здэцца, ніпгто ўжо не пагражала, калі ў двух кроках была знаёмая жалезная лесвічка, па якой, хай толькі кранецца састаў, ён зноў ускараскаецца на дах, якраз у гэты момант нечыя дужыя рукі абхапілі, бы абцугамі, яго цела, што стала ні дыхнуць, ні пракаўтнуць сліну. І Вадзім зразумеў: брыкацца, кусацца, каб неяк вылузацца з тых абдымкаў, было б і неразумна, і зусім марна.

## 9

Скуль яны маглі ўзяць тут карты, Вадзім ніяк не мог даўмецца. Яго ж во адразу абшнарылі, вывернулі ўсе кішэні, прымусілі нават разуцца, каб паглядзець, ці няма чаго і ў бацінках. Мала таго, і адзенне забралі, а пасля гарачага — во дык было асалоды! — душу выдалі гэтыя паласатыя штаны і бэзавага колеру майку. Майка сядзела на ім нішто, яму нават упадабалася, а вось штаны крыкам не хацеў нацягваць на сябе. Але ж дзе дзенешся! Нейкая тоўстая цётка, якой ён злосна кінуў назад гэтую арыштанцкую адзежку, дабрадушна нават сказала:

— Павыдурняйся, мілок, павыдурняйся. У дзетпрыёмніку можна. Вот зараз па двары пойдзем, дык усім пакажы, які ты голенькі красаўчык. Праз вокны будуць зіркаць, асабліва дзевачкі. Ого-го, яны ў нас шустрыя, усё ведаюць, усё бачаць...

Яго прывялі да невысокага, з рашоткамі на вокнах, цаглянага дамка, на дзвярах якога зялёнай фарбай было напісана: «Ізалятар». Вадзім, прачытаўшы назву, зноў стаў на дыбкі.

— Чаму, чаму сюды? — закрычаў, сам нават напалохаўшыся свайго голасу.— Не хачу, не буду!

— Будзеш, мілок, будзеш.— Дабрадушная цётка адамкнула вялізны замок.— Каранцін усе праходзяць. А раптам ты нам заразу якую прывалок? Што на гэта скажаш? Мы пачом знаем-ведаем, у якіх ты памыйках валяўся, з кім спаў, з кім, можа, і мілаваўся...

Нібы аглушаны, ён стаяў на парозе квадратнага, у некалькі крокаў туды і сюды, пакойчыка, слухаў, як шоргае ў замку ключ, як заміраюць у двары крокі жанчыны.

— Ну, гаўрык, ком сюды,— пачуў аднекуль з-за грубкі скрыпучы прастуджаны голас.

Вадзіма ўсцешыла, што ён не адзін, што нехта тут яшчэ ёсць. Таму, пэўна, і прапусціў міма вушэй такі абразлівы зварот да сябе. Заглянуўшы за грубку, ён, аднак, разгубіўся: проста на голай падлозе сядзела ажно трое хлопцаў. Двое, адразу бачна, былі не старэйшыя за яго. Трэці ж, худы і тонкі, бы гліст, з тварыку нагадваў яшчэ дзіця, аднак паводзіў сябе ў кампаніі гэтак самаўпэўнена, гэтак востра прашыў Вадзіма сваімі маленькімі вочкамі-свярдзёлкамі, што міжволі падумалася: ці не ён тут верхаводзіць?

Перад хлопцамі ляжалі на газеціне задрыпаныя, замусоленыя ўшчэнт карты. Прыход новага чалавека толькі на хвіліну, відаць, перапыніў іхнюю гульню, бо кожны веерам трымаў карты ў руках.

Сціпла павітаўшыся, Вадзім, каб нешта гаварыць, папытаў, каторая яго з пасцеляў, бо ўсе яны былі нібы пасля пагрому: байкавыя коўдры пыліліся дзе папала, памятыя, збэйданыя, валяліся на голых, з дзіркамі там-сям, цюфяках прасціны, наўлечкі. Падушак нідзе чамусьці не ўбачыў, і толькі пазней Вадзім выявіў іх у «карцэры», як са злавеснай іроніяй называлі карцёжнікі невялікую нішу ў каменнай сцяне, прыкрытую зверху шырокай, моцна скалочанай негабляванай дошкай на завесах.

Замест адказу яго папрасілі згуляць разам у карты. Вадзім хацеў адмовіцца, бо не было ні жадання, ні сілы: сённяшні дзень выматаў яго дык выматаў, ён ніяк яшчэ не мог паверыць, што ўсё гэта ява, а не жахлівы сон, і хацелася хутчэй кінуцца ў ложак, каб забыцца і прачнуцца ўжо ранейшым, нармальным чалавекам, з якім нічога не адбылося.

Аднак не паспеў ён і рот раскрыць, як адзін з кампаніі, цемнатвары, з надта адтапыранымі вушамі, вокамгненна падсек яго ў нагах, і Вадзім, коратка ўскрыкнуўшы ад

болю, асеў на азадак, пасля згубіў раўнавагу і кульнуўся на спіну.

— Ты, падла, не чуеш, што табе кажуць? — вушасты пасунуўся, даў яму месца каля сябе.— Тут будзеш рабіць, як усе, інакш... Сеня хай пацвердзіць...

Той, з дзіцячым тварыкам, зноў прашыў Вадзіма вочкамі, падтакнуў:

— Інакш чык-брык, і... ніхто не ўзнае, дзе магілка твая.— Словы пра магілку названы Сеня, смешна крывячы рот, нават праспяваў.

Вадзім, хоць і не рашыўся пакуль абурацца за падножку і ўзяў у рукі карты, усё ж здагадаўся, што яго палохаюць, хочуць, каб адразу скарыўся, каб слугаваў ім. А дулю не хацелі? Толькі пакажы сваю слабасць, дык і з карка не злезуць. Не, ён кроўю сцячэ, але не дасць чыніць над сабою гвалт і здзек.

Абыякава, ніколькі нават не ўдумваючыся, Вадзім рабіў хады, нібы ўсё роўна знарок, даваў у масць, прымаў тыя карты, якія можна было б, памазгаваўшы, і пабіць. Атрымаўшы з напарнікам Алесем — трэцім карцёжнікам, чамусьці вельмі маўклівым і задуменным хлопцам — законнага дурня, Вадзім рашуча падняўся. Сказаў адно:

— Гуляйце самі. Я не хачу. Спаць вот хачу.

Ён зноў папытаў, куды яму лажыцца, аднак і гэты раз Факір (так звяртаўся да вушастага яго падбрэхіч Сеня) паспрабаваў Вадзіма падсекчы, зваліць долу.

Хлопец быў зараз напагатове, і толькі Факір занёс руку, каб рабром далоні сekанyць вышэй шчыкалатак, па самым, мусіць, балючым месцы на назе, як Вадзім першы наском бацінка нанёс яму ўдар па пальцах.

Нямая сцэна цягнулася нядоўга. Ужо ў наступнае імгненне Вадзім згледзеў, як спалохана акругліліся вочы ў Алеся, як страпянуўся і ікнуў, акурат падавіўшыся косткай, малы падбрэхіч, і толькі Факір сядзеў, вонкава спакойны і абыякавы да ўсяго, смактаў пальцы.

— Се-е-еня-я,— расцягваючы асобныя словы, нібы вучыў немаўля, нарэшце падаў голас Факір.— Наш новы друг не ведае, хто мы, но-о-ораў свой паказвае. Можа, трэба яму даліка-а-ат-ненька так намякнуць. Як ты, Сеня?

Вадзім здагадаўся, што будзе далей. Зараз гэты ўслужлівы здыхля, азіраючыся назад, пойдзе проста на яго, Вадзіма, можа нават плюнуць яму ў твар. І калі ён хопіць здыхлю за шыварат, падыме і паставіць назад на падлогу, той наробіць на ўвесь свет віску-енку, акурат яго рэжуць

ці жыўцом падсмажваюць на вогнішчы. Тады ўжо валюхавата — маўляў, вельмі неахвотна, але ж што паробіш, трэба наводзіць парадак і справядлівасць — падымецца апякун і разам, з двух аднaчасова бакоў, накінуцца на яго, пастараюцца паваліць. А паваліўшы, зусім азвярэюць і не пашкадуюць ні касцей, ні галавы, ні твару.

Ён памыліўся толькі ў адным. Здыхля не стаў плёваць у твар, зрабіў нешта больш гадкае: наблізіўшыся на патрэбную адлегласць, хутка сцягнуў на калені паласатыя штаны і... пачаў бурыць, мачыць Вадзіма.

Гэта, каб і хацеў, нельга было сцярпець. Такой мярзоты не даводзілася яшчэ бачыць. У адным кароткім скачку Вадзім дастаў паскудніка. Як некалі ў калідорчыку сталоўкі мызгаў тварам у яго блявоціну Мішку Клыпу, гэтак жа за карак нагнуў, даў пакаштаваць са свежай смярдзючай лужынкі свайго дабра і здыхлю.

...Далей Вадзім не ўсё помніў. Ужо лежачы на голым цюфяку (хто, хто яго туды ўсцягнуў?!) і крыху акрыяўшы, адразу адчуў, як яго нудзіць, можа вось-вось званітаваць. Вельмі хацелася піць. У роце язык быў шорсткі, што тарка, і балеў, як балелі сківаіцы, усё наогул цела.

У другім кутку, таксама на ложку, нехта не то стагнаў, не то гэтак хроп. Вадзім з цяжкасцю павярнуў галаву, глянуў у той куток.

І праўда: Алесь з кружкай вады стаяў ля Факіра, мачыў ручнік, прыкладваў яму да вока і лба. «Ага,— зларадна падумаў Вадзім,— усё ж і ты зарабіў на абаранкі. Знай нашых. Больш ці палезеш?..»

Ён, ледзь варочаючы языком, не пазнаючы свайго голасу, папрасіў Алеся прамачыць горла. Той ахвотна адклікнуўся на гэту просьбу, паднёс да яго губ кружку. Ад халоднай вады адразу палягчэла. Вадзім ужо сеў, апусціў долу ногі. Трохі счакаўшы, прайшоўся па пакоі. Яго хістала, кружылася галава, але расло і расло ў душы задавальненне, што не паддаўся, не аказаўся баязліўцам і слабаком. Добра, вядома, што не ўвязаўся, не прыняў іхняга боку Алесь. Тады б была хана. Двое супраць аднаго (здыхлю Вадзім не вельмі прымаў у разлік, той хіба мог спадцішка чым напаскудзіць),— тут ужо не паваюеш. Усё ж Алесь, мусіць, сам рады цяпер, што нехта знайшоўся і збіў пыху з гэтага Факіра (клічку ж даў сабе!), які, адразу было відаць, запалохаў хлопца і трымаў у чорным целе.

Здыхля сядзеў на падлозе ля раскіданых карт і здзічэлымі вачыма сачыў за кожным Вадзімавым рухам.

— Ну, што ж ты не лечыш свайго дружка? — Вадзім спыніўся насупраць малога шкадліўца.— Памачы лепш яго. Яму на рану акурат фартовае лякарства...

Алесь ажно рагатнуў, пачуўшы такую параду. Бы пабіты сабака, не гледзячы ні на кога, падняўся з ложка і Факір. На твары яго, пад вокам і на лбе, набухлі два цёмна-сінія гузякі.

— Прыводзьма ўсё ў парадак, бо зойдзе хто зараз,— параіў Алесь.— Карцэра тады не мінаваць. Патрымаюць па чарзе ўсіх. І вячэры не ўбачыш, як вушэй сваіх...

Напамінак пра нейкі карцэр і яду разварушыў кампанію. Яны, нават здыхля, нехаця пачалі парадкаваць ложкі. Вадзім заслаў акуратна і свой, на які, як цяпер здагадаўся, усцягнуў быў яго Алесь пасля гэтай шалёнай мардабойкі. Добра, што ў пакоі не было (відаць, нехта разумна прадугледзеў) ніводнага цвёрдага прадмета, інакш чортведама чым магло б усё скончыцца.

«Што гэта за кара такая — карцэр? — ламаў галаву Вадзім.— Во с... драбней маку!»

Алесь раптам прапанаваў:

— Трэба, мусіць, зрабіць шуры-муры. Бо ўключаць і ўсё пазнаюць, што мы тут накуралесілі.

Не доўга думаючы, ён выцягнуў на сярэдзіну пакоя ложак, залез з нагамі на яго і вывінціў з патрона адзіную тут, у ізалятары, электрычную лямпачку. Быў паклаў яе ў кішэню, але, падумаўшы трохі, раз і другі ляпнуў шклом на сцягне, пасля паднёс да вачэй і, калі пераканаўся, што валасок збіты, завінціў назад.

— Халеру яны што ўгледзяць. Будуць пшыкаць-пстрыкаць выключальнікам, а святла — дудкі. Сёння ўжо і не заменяць лямпачкі. А за ноч, можа, і вы заліжаце сваё...

Сцямнела ўвачавідкі.

У той вечар так да іх ніхто і не завітаў — ні начальнік, ні ўрач. Прынеслі адно дзяжурныя з кухні вячэру: у алюмініевых місачках прасянай кашы, па лусце хлеба і ў вялікай — на ўсіх — кварце ледзь-ледзь цёплага чаю, у якім амаль і не адчувалася цукру.

Яду дзяжурныя падалі праз зарашочанае акно — жалезныя прэнты з горам напалам дазвалялі прасунуць невялікі посуд. Каб адчыніць дзверы, зайсці ўсярэдзіну — гэта не, на гэта яны не мелі ні права, ні ключоў.

— Чаму электрыку не паліце? — спытала нейкае дзяў-

чо (на вуліцы, пры цьмяным на слупе ліхтары, Вадзім добра яе і не разгледзеў).— А раптам у кашы прусак ці мухі?

Алесь, які прымаў з яе рук яду, знайшоўся што адказаць:

— А нам гэта і нада: больш тлушчу... Са святлом, можа, брыдзіліся б, а так — дабаўкі яшчэ гатоўце.

— Не будзе ніякай дабаўкі. Не заслужылі... Чаго, глядзі, надумалі? — Дзяўчо, адчувалася, хацела пакакетнічаць, бо не спяшалася, стаяла і стаяла пад акном.

Яе, аднак, паклікалі, і, адыходзячы, яна кінула:

— Пасуду самі памыеце. Вада ў вас ёсцека. Вот і мыйце. Чуеце? Заўтра забяруць.

Елі пры блеклым, рук амаль не бачна было, святле з двара. Вадзім сядзеў на сваім ложку, Факір з малым за грубкай. Алесь, хоць і дзьмула з акна, не адыходзіў ад падаконніка, на якім трымаў і місу.

Калі вычарпалі ўсё лыжкамі, пасля вылізалі языком, ён абышоў усіх, наліў у місы, стараючыся, каб выйшла пароўну, з кварты чаю.

Пасля бойкі ніхто не размаўляў, і як Алесь ні стараўся памірыць бакі, колькі ні звяртаўся то да Вадзіма, то да хлопцаў за грубкай, нічога не выходзіла. Факір зацята маўчаў, пэўна, нешта новае абмазгоўваў. Сеня час ад часу шморгаў носам і таксама не падаваў ні гуку.

Гэтак, бы набраўшы ў рот вады, ляглі і ў пасцелі, акрамя Алеся, які па-ранейшаму сядзеў ля акна, цяпер таксама сцішаны, задумлівы.

Вадзім не ведаў, ці засне сёння. Нервы былі напятыя да звону. Здаецца, вось-вось сарвецца, пачне плакаць, крычаць, у істэрыцы біцца галавой аб сценку. Але хто, хто пачуе, каму нешта дакажаш? Душыла крыўда, што так па-дурному ўліп і замест таго, каб начаваць ужо, можа, у Веркі, трапіў у гэтае пекла. Жмых жа намякаў, але хіба ён, Вадзім, мог падумаць, што гэта такое — дзетпрыёмнік. Затое зараз, з першага дня, адчуў нават на сваёй скуры...

Наракаў на сябе Вадзім і за тое, чаму ў дзяжурцы адразу, як схапілі, не сказаў міліцыянерам, якое ліха выгнала яго ў свет. Няўжо ж яны не людзі, няўжо не зразумеў бы хто, не паспачуваў? Дык жа не, артачыўся, маніў, баяўся прызнацца, адкуль і да каго едзе, ці вучыцца дзе. Думаў: патрымаюць, патрымаюць трохі і, дзе дзенуцца, выпусцяць. Што з яго возьмеш? Штрафу? Дык жа вецер у кішэнях свішча. Нават размоклы канверт з Верчыным

адрасам (вот даўбешка!) выкінуў неўпрыкмет, калі вялі ў тую іхнюю дзяжурку на станцыі. Добра хоць, што запомніў сельсавет і назву вёскі. А так калі і выберацца якнебудзь адсюль, змушаны быў бы паварочваць назад аглоблі...

Ход яго невясёлых думак перапыніў нягучны свіст. Вадзім услухаўся і зразумеў, што высвіствае нейкі матыў Алесь. Узлакоціўшыся на падаконнік, ён, мусіць, і не думаў ісці спаць, усё глядзеў і глядзеў у двор, нібы каго чакаў.

І раптам хлопец заспяваў, заспяваў такое, што Вадзім ніколі ў жыцці не чуў, не здагадваўся нават, што ёсць людзі, якія складаюць, якім патрэбны гэткія песні.

За решеткой сижу
И с тоскою гляжу
На свободу.
Ходят люди внизу,
И сдержать не могу я
Слезу.

Я мальчишка седой,
Я совсем молодой —
Мне пятнадцать.
Посадили в тюрьму,
А зачем и за что —
Не пойму.

Есть хотел, хлеб украл,
А закон покарал
Так жестоко.
Восемь лет мне сидеть,
Кудри темные стали
Седеть.

Здесь баланду дают
И за правду нас бьют
Очень больно.
Ты меня не забудь,
Передачу пришли
Как-нибудь...

Слёзы ажно душылі Вадзіма — гэтак расчуліўся і ад матыву, і ад слоў. Хацелася пáдысці да Алеся, папытаць, якая нагода прывяла яго ў дзетпрыёмнік, калі і чаму звязаўся з Факірам і яго дружком. Адчуваецца ж, што душою ён не з імі, душа яго нашмат чысцейшая і больш спагадная. Толькі страх вось пасяліўся ў ёй, і яна плача гэтай песняю, выплёсквае боль і скруху.

Вадзім, можа, і падышоў бы — усё роўна ж не ляжалася,— каб не цыкнуў са свайго ложка Факір:

— Заткнешся ты ці не? А то памагу... Хлебагрызку сваю раззяпіў...

Вадзіма зноў закалаціла, зноў шалёна запульсавала ў скронях кроў. Няўжо Алесь не агрызнецца, не скажа таму вырадку, каб пакінуў яго ў спакоі, не лез, не плёваў у душу?!

Алесь, аднак, бы папярхнуўся, адразу сціх і паплёўся да свайго ложка, бухнуўся на скрыпучы матрац. «Ну і чорт з табою, калі ты такая авечка,— ледзь не вылаяўся ўголас Вадзім.— Ліжы яму адно месца».

Раніцай Вадзім вырашыў напрамілы Бог прасіць, каб адвялі яго да начальніка. Ён раскажа яму ўсё-ўсё, назаве і адрас сястры. Хай, калі не паверацъ, напішуць ці з'ездзяць самі. Яны пераканаюцца, што ён не маніць, што сястра ў яго ёсць і толькі да яе, а не куды-небудзь так, ён гэтак няўдала дабіраецца.

Раніцай дадалося яшчэ больш прычын убачыць начальніка. Тое, пра што ён даведаўся, не на жарт устрывожыла.

У той вечар, які ні быў расстроены, Вадзім усё ж заснуў. Колькі праспаў, невядома. Прачнуўся ад нечага асцярожнага шэпту. Прыслухаўшыся, адразу ж пазнаў голас Факіра:

— ...каб пазней толькі... Можа, расчынім акно, пашумім маненька. Нехта пачуе, быць не можа такога, на кухні, тут бліжэй, шантрапа бульбу да ночы абірае. Папросім — паклічуць яе. Яна ж камендант. Усе ключы з ёю. Калі адна будзе, то... Ручнік намочым — і ў зяпу. Астатнімі звяжам. На пузе не папаўзе...

— А ён? — гэта ўжо падбрэхіч пытае.— Памяшаць можа. Шалёны, падла.

— Не памяшае. Яго мы таксама...— Факір, чутно, скрыгатнуў зубамі.— Цяпер дурнямі не будзем. Падушку на галаву... Удваіх навалімся — доўга не набрыкаецца...

— Лепш без гэтага. Ногі яшчэ выпрастае, тады нам не тое прыпішуць. Добра, што не ўсё ведаюць... Згнілі б у цюразе.

— Ф'ю-ю-ю! — Факір хацеў прысвіснуць, ды паасцярожнічаў.— Шукай ветру ў полі. Мы ўжо далёка будзем, пакуль агледзяцца. Алесь, слюнцяй гэты, з намі, мусіць, не пабяжыць болей. Але чорт з ім. Квакаць не асмеліцца...

Нейкі час было ціха. У Вадзіма сон бы рукою зняло. Ляжаў, баяўся нават шавяльнуцца. «То во яны што, мярзотнікі, плануюць! — усё ажно гарэла ў ім.— Скуль такія пачвары і бяруцца? Гэта ж на старую жанчыну хочуць падняць руку, каб самім толькі вылузацца. Але як яны думаюць уцячы? Хіба ў яе і ад варот ключ? Праз сцяну ж дудкі скочыш...»

Трымаўся б мацней на нагах, Вадзім, здэцца, зараз жа кінуўся б на абодвух, каб правучыць іх за гэту змову. Як і што магло б быць з самім, ён не думаў.

Развага, аднак, паступова ўзяла верх. У гэткім стане, калі ные яшчэ ўсё цела, калі кружыцца галава (нечым, мусіць, Факір сумеў-такі разбіць, бо ад крыві закарэлі

каля вуха валасы), ён не ваяўнік. Толькі напсуе. Не, лепш папярэдзіць каго трэба...

Яму пашанцавала. Раніцай, яшчэ і снеданне не давалі, тая ж тоўстая цётка («Ці не яна і камендант?» — падумаў раптам Вадзім) адамкнула дзверы, прасунула галаву ў пакойчык, нюхнула, скрывіла нос:

— Ну ж і нагазавалі! Чыркні запалку, то агнём выбухне. Зараз жа праветрыце! — Яна глянула ў нейкую ў руцэ паперку, строга спытала: — Хто Гурко? А-а, гэта ты, мілок. Пайшлі са мной...

У Вадзіма як што абарвалася ўсярэдзіне. Ён быў і рады, што яго некуды клічуць, і брала трывога: а мо вынюхалі пра ўчарашняе і першага зараз упякуць кудынебудзь яшчэ? Карцэрам жа во нейкім палохалі...

Яны доўга ішлі па двары, абмінулі даўжэзную трохпавярховую камяніцу, нырнулі ў вузенькі калідорчык такога ж, як і ізалятар, цаглянага дамка. На адных з дзвярэй Вадзім яшчэ здалёк прачытаў шыльдачку «Начальнік» і трохі супакоіўся.

Акурат туды, да тых дзвярэй, і скіравала цётка.

— Заходзь, мілок, заходзь, не ўкусяць,— яна прапусціла Вадзіма наперад.— Кусацца вы лепшыя спяцы. Пальца вам не пакажы.

У пакоі нікога не было, і цётка сказала:

— Пагодзь трошкі. Я адно гляну, дзе Фёдар Фёдаравіч. Не ўздумай толькі чаго вытварыць. Сядзі і не рыпайся.

Не паспеў Вадзім і дых перавесці, як зайшоў, адразу пакіраваўся да стала сівы, з такою ж сівою бародкай, мужчына, мусібыць, Фёдар Фёдаравіч.

— Во, Фёдаравіч, ён, навенькі,— адрэкамендавала Вадзіма цётка.— Прашу любіць і жалаваць.

Яна не затрымалася. Спаслаўшыся, што ў яе мільён клопатаў, некуды пабегла.

Якога хочаш Вадзім чакаў пытання ад барадача, толькі не гэтага:

— Дык куды твой дружок пуць-дарожку трымае? А? Прызнаешся, паглядзім тады, што з табой рабіць.

Вадзім лыпнуў вачыма, нічога не разумеючы. «Што ён чаўпе? Які дружок? З некім, пэўна, блытае. А мо проста на мушку бярэ...»

— Не знаю. Пра каго вы?

Фёдар Фёдаравіч падняўся з крэсла, памераў туд-сюд крокамі шырокую фарбаваную масніцыну.

— Не хочаш, значыцца, выдаваць? Думаеш, дасі дра-

пака, а пасля сустрэнецеся і падзеліце барыш. Не будзе гэтага, не будзе. Шкода мне цябе, Гурко. Бач, нехта ўжо і галаву разбіў, і губа расквашана, а што ж далей? Зусім прападзеш, папомніш маё слова...

Вадзіма гэткі тон зусім не расчуліў, наадварот, узлаваў. Сам не чакаючы, ён роспачна закрычаў:

— З'ешце мяне, калі не верыце. Не знаю я ніякага дружка. Я да сястры ехаў, а мяне схапілі. Во і ўсё!

Начальнік узяў са стала графін з вадой, наліў у шклянку.

— На, выпі, Гурко. Пі, пі, чаго ж. Ніхто цябе не з'есць, не бойся. Але ты ўсё роўна маніш. Ты ж не адзін наверсе таварняка ехаў. З табой быў нехта яшчэ, сышоў у Лучыне. Бачылі людзі, не думай...

— А-а-а, вось вы пра што!..— цяпер толькі дайшло да Вадзіма.— Адразу б так...

Ён, ані не тоячыся, расказаў пра Жмыха, як той не даў яму замерзнуць, акрываў сваёй целагрэйкай, пасля, калі пад'язджалі да станцыі, клікаў пайсці разам, каб расстарацца чаго з харчу.

— Каб жа з харчу...— Фёдар Фёдаравіч быў нібы засумняваўся, гаварыць ці не, пасля ўсё ж раскрыў карты: — Ён рыдыкюль выхапіў з рук касіркі, а там — грошы для рабочых, зарплата іхняя. Разумееш хоць, галава твая садовая?!

Вадзім, пачуўшы такое, ажно пабялеў:

— Скуль жа я ведаў, што ён гад такі? Ён сам па сабе, я — па сабе. Скуль жа ведаць?..

— Зараз магу паверыць, што ты праўду кажаш.— Фёдар Фёдаравіч ужо больш спагадна глядзеў на яго.— Але хоць абмалюй словамі, які ён, той Жмых. Трэба гэта чым хутчэй ведаць...

Мала-памалу Вадзім, асвойтаўшыся ў кабінеце, пачаў прыгадваць кожныя рысачкі твару Жмыха, яго зубы, нос, вочы — тое, што запомнілася. Дырэктар запісваў. Калі скончыў пісаць, папытаў:

— Дык дзе дасталося галаве? Таксама гавары.

І вось зараз прыйшла чарга паспавядацца пра сваё. Па тым, як уважліва яго слухалі, у Вадзіма ўсё больш і больш крэпла надзея, што гэты чалавек яго зразумее, паверыць, мо нават паможа дабрацца па адрасе. Больш ён нічога б на свеце не жадаў.

— Ты добра зрабіў, што папярэдзіў пра... як яго?.. Факіра. Мы самі здагадваліся, які ангялок трапіў да нас.

Адзін ужо быў такі. Стаіўся спачатку, а пасля накуралесіў. З міліцыяй брацъ давялося.

Ён не дагаварыў. Зазваніў тэлефон. Вадзім толькі тут упершыню ўбачыў, якая гэта штуковіна — тэлефон. Фёдар Фёдаравіч кінуўся да сцяны, зняў трубку, гучна, зрываючы ажно голас, заалёкаў:

— Алё? Алё?

Нешта, мусіць, не атрымалася, і ён з жалем павесіў трубку назад, на чорную скрыначку, папярэдне крутнуў толькі ручку. Сказаў Вадзіму:

— Ідзі пагуляй у двары. Зараз цябе пакормяць, а там — нешта прыдумаем...

Бы на крылах вылецеў Вадзім у калідорчык. Аднак яго гукнулі, вярнулі назад. Дырэктар пасадзіў Вадзіма за свой стол, даў аркуш чыстай паперы, сказаў:

— Напішы ўсё пра сябе. І адрас, дзе жыў, а цяпер куды і да каго едзеш. Зразумеў? Эх, Гурко... Раней часу пасівееш з вамі...

## 10

— Можа, і няма такой назвы? Можа, ты зблытаў?

Яны ў пятага ці шостага чалавека са Стаўбуноў пыталі, як дабрацца да Галабродаў, дзе гэткая вёска, але кожны пацiскаў толькі плячыма.

— А сельсавет які? — нарэшце нахмурыў бровы акуратна апрануты ў самшыты суконны фрэнч з дзвюма кішэнькамі на грудзях і гэткія ж суконныя штаны дзядзька, які стаяў непадалёк ад будынка вакзала, трымаючы за руль веласіпед: відаць, некага чакаў.

Вадзім назваў сельсавет. Дзядзька прыцмокнуў:

— Го, то ж велькі шлях туды, да Мікулічаў. Паўдня, мусібыць, тэпаць нада, калі ніхто не падвязе. І ўсё праз лес. Велькі шлях...— Ён пільна агледзеў двaіх падарожнікаў: яе, не першай ужо свежасці дзяўчыну ці маладую жанчыну з лёгкім вандзэлкам у руцэ, і віхрастага бледнатварага хлопца гадоў трынаццаці-чатырнаццаці, у чорным сацінавым касцюмчыку, сіняй кашульцы з паліняльм, надта ж мятым каўняром, у шапцы. На брата і сястру яны аніяк не былі падобныя, а для маці такога падлетка ёй таксама яшчэ зарана. Так і не здаволіўшы сваю цікаўнасць, дзядзька выказаў меркаванне: — Недзе тамачы

і вашыя Галаброды. Дзе ж яшчэ ім быць? Тамачы шукайце...

І праўда ж: як яны не дадумаліся адразу! Трэба было пытаць спачатку сельсавет, тады ўжо, можа, хто і вёску ўспомніў бы.

З дапамогай гэтага ж дзядзькі яны выбраліся на дарогу, якая вяла ў бок Мікулічаў.

Неўзабаве за Стаўбунамі, не прайшлі і кіламетра, пачаўся малады вясёлы саснячок. У Вадзіма ажно захлынулася ад хвалявання сэрца. Няўжо, няўжо гэта тая дарога, па якой першы раз ехала сюды Верка са Славікам, ехала ўжо назаўсёды, пакінуўшы іх з Колем удвух у вялікай пустой хаце? Няўжо скора ён убачыць іх усіх — сястру, Юзіка, Славіка? Коля быў у іх, гасціў трохі, а яму, Вадзіму, ні разу не выпала хоць слоўцам перакінуцца з кім-небудзь, пабачыць, як жывуць яны на сваёй, без калгасаў яшчэ, зямлі.

Ён, не заўважыўшы таго, прыспешыў крок, як не бегма ўжо бег, і Ліна Сяргееўна задыхана азвалася далекавата ззаду:

— Ты ж не ўцячы, можа. Мне тады не вяртайся назад. Прагоняць і з работы, і пакойчык адбяруць. Я за цябе галавой адказваю...

Вадзім прыпыніўся, пачакаў. Калі яна параўнялася, пайшлі поплеч. І ўсё ж, хоць шкода стала яе, выхавацельку, гаварыць ні пра што не хацелася. Было прыкра, што яго, бы дзіцё малое ці, яшчэ горш, катаржніка якога, нехта пільнуе, будзе перадаваць з рук у рукі.

Фёдар Фёдаравіч, зноў праз колькі дзён пасля першай размовы паклікаўшы яго ў кабінет, і абрадаваў бясконца, і засмуціў:

— Дык вот, Гурко. Шчасце тваё, што ты не зманіў. І наконт Жмыха, і адрасы напісаў правільна. Мы адпускаем цябе. Выдадзім іншы касцюм, бо твой ужо ў сметнік трэба выкінуць, і...— Ён хвіліну памаўчаў, нібы прыгадваючы што, пасля дадаў: — І з суправаджаючай паедзеш. Ліна Сяргееўна яе завуць.

Вадзім, ашалелы ад радасці, не адразу ўцяміў, пра якога такога суправаджаючага гаворыць дырэктар. І толькі калі Фёдар Фёдаравіч, развітваючыся, нагадаў, што білеты да Стаўбуноў ужо куплены, яны ў Ліны Сяргееўны, Вадзім апомніўся, папытаў:

— А яна чаго? Я адзін...

— Шчаслівa, Гурко,— не стаў больш разводзіць з ім

спрэчкі начальнік.— Мне некалі, ідзі. І заўсёды ведай, што ў цябе ёсць галава, а ў ёй — мазгі. Давай ім работу. Не шкадуй.

Зараз, ідучы па бязлюднай лясной дарозе, ён думаў, як у гэткай кампаніі заявіцца да Веркі. Яна можа яшчэ раскрычацца, запсіхаваць. Перад Юзікам жа, перад суседзямі будзе брыдка, што брат аказаўся гэткі шалапутны, трапіў ажно ў дзетпрыёмнік і яго на вяровачцы змушаны вадзіць. Вядома, можна было б без вялікай цяжкасці збегчы, пазбавіцца гэтай апекі: Ліна Сяргееўна вунь нават пры няхуткай хадзьбе дыхае, бы паравоз, не кажучы ўжо, каб некага даганяць, лавіць. А чаму начальнік паслаў у дарогу яе? Хіба не знайшоўся б хто дужэйшы і больш спрытны?

Ліна Сяргееўна нейкім чынам адчула яго настрой. Дакрануўшыся да ягонага пляча, сказала:

— Не захочаш — і не пакажуся тваім. Бачу ж, што перажываеш. Не бойся, нікому нічога не скажу. Дабярэмся толькі да сельсавета, мне распішуцца, што я там была, а ты тым часам сам пойдзеш у свае Галаброды. Я неяк пабяруся назад. А мо з сельсавета хто падкіне да станцыі.

Вадзіму акурат камень хто зняў з душы. Ён нічога не сказаў, толькі ўдзячна глянуў у вочы сваёй апякунцы. Тая ўсё зразумела і больш не заікалася на гэту тэму.

Сасняк тым часам скончыўся, падлесак перайшоў у стары ядраны бор з адных гонкіх сосен. Акурат намазаныя мёдам, яны вылучалі гэтулькі паху і святла, што нават у хмурны дзень тут хацелася ўсміхацца і бясконца піць гаючае паветра.

Пасля яны адпачывалі. Не вытрывала Ліна Сяргееўна. Упадабаўшы невялікі прагал між дрэў, пакрыты чыстым мохам, яна спынілася, папрасіла:

— Пашкадуй ты мяне, а то сканаю на тваіх вачах. Хоць трошкі дых перавесці, ды і падсілкавацца пара.

Сеўшы, яна разулася, расцерла трохі ступакі, пальцы, затым палезла ў вандзэлак, зашамацела паперай. Пачастунак аказаўся не вельмі багаты, але смачны: па лусце хлеба з ліверпай каўбасой, па два кружочкі пячэння. Запіць не было чым. Ліна Сяргееўна спадзявалася ў Стаўбунах купіць бутэльку якога квасу, але буфет на вакзале аказаўся зачынены, і яны змушаны былі пайсці ні з чым.

Здалёк пачуўся гул машыны. Вадзім скоранька ўскочыў на ногі, выбег на дарогу. Але тут жа вярнуўся, расча-

раваны, сеў зноў. Машына, гружаная бярвеннем, трымала кірунак на Стаўбуны.

— Нічога, яшчэ трохі — і дойдзем,— супакоіла і яго, і сябе Ліна Сяргееўна.

Ім усё ж пашанцавала. Толькі выправіліся далей, як іх нагнала падвода, запрэжаная маладым шустрым каняком. У падводзе на дошцы, пакладзенай папярок драбін, сядзела, трымала лейцы дзябёлая цётка ў плюшаўцы, у даматканай, да пят, спадніцы. Ззаду ляжаў ахапак саломы, прыкрыты зверху рабой посцілкай.

Ліна Сяргееўна выставіла руку, але цётка, дзіка зіркнуўшы на абаіх, з усяе моцы сцёбнула каняку пугай, і той, бы хто торкнуў яму пад хвост галавешку, шалёна рвануўся наперад.

— Ну, цётачка, ну й працiўная,— ледзь апамяталася Ліна Сяргееўна.— Жалка табе людзей падкінуць?

Праз метраў сто цётка, аднак, спынілася, стала чакаць, зноў жа дзіка зіркаючы на незнаёмых.

— Можа, да Мікулічаў? — папытала, падышоўшы да падводы, Ліна Сяргееўна.

Цётка нарэшце праяснела, неяк нязвыкла працяжна сказала:

— Анё ж куды... Да Мікулічаў. А вы хто будзеце? Ці не новая вучыцелька?

— Можа, і вучыцелька. Там паглядзім...— хітра гэтак выкруцілася Ліна Сяргееўна.— Дык падвезяце?

— Анё ж не падвязу. Масцецеся. А я, грэшна прызнацца каму, падумала ўжо: бандзіты. Дула, не іначай, зараз шчэ наставяць...

Ліна Сяргееўна ажно выбухнула рогатам:

— Хіба мы гэтакія... ну, за бандзітаў каб нас?..

Цётка збянтэжылася, але знайшлася што адказаць:

— На лобе хіба ў іх намалёвана? Вунека, кажуць, і дзеўка якаясь пекная ім стрэнчыць, таксама выходзіць на дарогу...

— Выдумкі ўсё,— усаджваючыся на салому, даючы месца Вадзіму, ужо спакойна заключыла Ліна Сяргееўна.— Калі хто і быў, усіх палавілі. А людзі языкамі толькі менцяць.

— Не менцяць, не менцяць,— не здавалася цётка.— Вы не тутэйшыя, дык нічога не ведаеце. Вот...

Вадзім, натапырыўшы вушы, гатовы быў слухаць, аднак Ліна Сяргееўна чамусьці не схацела падтрымліваць такую гаворку, перапыніла возчыцу:

— Ай, не хочацца пра гэта... Вот вы лепш скажэце, дзе яшчэ і Галаброды? Ці далёка?

— Чаго ж далёка? Праз Нёман трэ толькі, а тамака кіламетры са тры. За горкаю. А вы і туды?

— Можа, і туды...— зноў жа няпэўна адказала Ліна Сяргееўна.

Цётка, адчуўшы, відаць, што ёй не хочуць адкрывацца, нешта круцяць-муцяць, сама не стала больш настырняць з роспытамі, сядзела роўна, бы падпёртая, і час ад часу нокала на каняку, хоць таго не трэба было падганяць: дадому ён бег шустра.

...У Мікулічах, на спарахнелым, нават там-сям наскрозь дзіравым мосце праз раку яны яшчэ трохі пастаялі, паглядзелі на цёмную густую ваду ўнізе, паслухалі запознены журботны крык жураvoў, шкадуючы, што з-за нізкіх сёння хмар іх не давялося ўбачыць.

— Ну, вот...— нарэшце падала Вадзіму руку Ліна Сяргееўна.— Як гаварыла, так і выйшла. Сельсавет пячатку паставіў, больш мне нічога не трэба. Абяцаў старшыня хутка і ў Стаўбуны падкінуць. У яго, сказаў, матацыкл. А ты ідзі. Хай у цябе ўсё добра будзе. І сёння, і заўтра...

Вадзім стаяў нейкі спустошаны, нібы і не рады ўжо быў, што, у рэшце рэшт, канчаецца яго такая цяжкая дарога і два крокі застаецца да сястры. Як сустрэнуць яго? Ці знойдзе сабе тут прытулак?

Ён прайшоў выбрукаванай каменем грэбляй праз усю пойму, падняўся на горку. Толькі тады спыніўся, агледнуўся назад. На мосце нікога ўжо не было. Зараз Вадзіму падалося, што мост той назаўсёды падзяліў на два берагі яго жыццё — мінулае і будучае. Мінулае засталося ззаду, яго не вернеш. А што чакала наперадзе, ён не ведаў.

# ШТО ПАСЕЕШ...

*Аповесць*

*Маме, светлай памяці яе*

# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## 1

Сёння яна зноў наважылася прасіцца дадому. Яна мала спадзявалася, што адпусцяць, але ж і тут не ставала болей сіл ляжаць, ведаючы, што ніхто і ніпто ёй не паможа. Сёння наведаецца Лёшка, і як добра было б, каб ён забраў яе з сабою.

Гэты непакой, гэтае нецярпенне не давалі Вользе спаць ужо каторую ноч запар. Яна і дагэтуль спала, як птушка, а зараз і зусім амаль не змружвала вачэй. Рашучасці зноў гаварыць з урачом ёй надаў і пачатак новага дня.

Яшчэ ноччу Вольга згледзела — ложак яе стаяў ля акна,— як з-за рванай хмары высунуўся ражок бліскучага, нібы вымытага, месяца. Не чутно было і ветру, які скавытаў, некалькі дзён біў у шыбы дробнымі кроплямі дажджу. «Божачка,— падумалася тады Вользе,— хоць бы ўжо цяпло, сонейка... Гэта ж, на добры лад, са́ма і сеяцца.

Яна соты, тысячны раз спрабавала ўявіць, як там Лёшка адзін, без жаночай помачы. Недзе яшчэ поцемку падпальвае ў печы, ставіць чыгуны з бульбай бліжэй да агню, пасля замешвае і нясе ў вядры свінчаці, скідвае з вышак бярэмя сена Зорцы... Зрабіўшы ўсё па гаспадарцы, похапкам бярэ сёе-тое ў рот і спяшаецца на сваю работу, на калгасны двор, дзе стаіць уся тэхніка. Днём і вечарам зноў поіць, корміць скаціну, бегае ў склеп, цягае ваду. І так вось ужо амаль чатыры месяцы — лічы, усю зіму, пакуль яна тут, у бальніцы, адлежвае бакі... «Сынок... А як жа яно будзе далей? За што ж гэта мне такая кара?»

Раніца не абманула Вольчыных надзей. Сонечная, цішана-лагодная, як бы падабрэлая пасля густога туману і частых дажджоў, яна абяцала добры дзень, устойліваe цяпло, як і павінна ўжо быць у такую пару.

Разам з гэтым пачуццём кволай радасці ад змены надвор'я расла, шырэла прыглушаная за доўгія бальнічныя дні трывога за сябе, за сваю бездапаможнасць.

Чаго яна зараз вартая? Што можа рабіць? Нічога яна зараз не можа. Ні каровы падаіць, ні ў печы выпаліць, ні ў агародзе кінуць што-кольвечы расці ў зямлю. Калека, немач... Хто б мог падумаць, што яе так схопіць, скруціць, адбярэ левую руку і нагу, сагне ў крук хвароба, якой не далі рады ніякія лекі. І не дадуць. Не тыя гады. Усё, яна ўжо сваё ўзяла ад жыцця, яно адмерала ёй поўнай меркай...

За дзвярыма палаты пачаўся звыклы бальнічны рух: нехта, моцна налягаючы на адну нагу, прашлэпаў у канец калідора, відаць, у туалет; праз мінуту-другую гукі сталі загусцейшыя і спарнейшыя. Ля століка, дзе санпост, забразгалі, зазвінелі колбачкамі — у некага збіраліся ўзяць аналізы. У іхнюю палату, расхрыстаўшы насцеж дзверы, зайшла санітарка з вядром і швабрай, абматанай мокрай анучай, пачала церці лінолеум.

Пасля сняданку, як і заўсёды, чакаўся абход. Вольга вельмі непакоілася, каб хаця ж быў Барыс Іванавіч, яе лечачы ўрач. Апошнія дні ён не з'яўляўся ў бальніцы, казалі, што грыпаваў. Але ўжо ўчора, надвечар, яго бачылі ў бальнічным калідоры, і таму Вольгу не пакідала надзея, што сёння на абходзе ён будзе, абавязкова павінен быць. І сёння ж, падказвала сэрца, павінна нешта вырашыцца наконт яе. Колькі ж тут валяцца, мазоліць усім вочы? Калі наканавана ёй памерці, то толькі дома, на сваім ложку, а не ў гэтых чужых і абрыдлых ужо сценах.

Не, яна не сказала б, чаго браць грэх на душу, што тут ёй увесь свет засланіўся, што яе не кармілі, не паілі, абыходзілі ўвагай. Наадварот, было неяк нават няёмка, што каля яе гэтулькі круціліся-вярцеліся, бы яна якая важная тут пані, каторай толькі таго і трэба, каб падавалі, прымалі, фукалі, дагаджалі, як той скуле... Яна да такога не прывыкла. Гэта не па ёй.

У палату зайшлі ажно ўчацвярых — Барыс Іванавіч, медсястра Жанна і нейкія двое незнаёмых, у новых, з іголачкі, халатах, у такіх жа бялюткіх шапачках. Няйнакш, практыканты, бо дужа былі яшчэ маладыя, мала чаго старэйшыя за Жанну. А можа, і новыя ўрачы, хто ведае. Бальніца ж вялікая...

У Вольгі ажно дыханне звяло, яна ліхаманкава шукала патрэбныя словы, якія скажа, павінна сказаць, толькі вось няхай падыдуць да яе ложка, бо пасля яна сабе не дарус, калі змоўчыць, не развяжа, як часта бывала, язык.

Але ніякія асаблівыя словы не спатрэбіліся.

Барыс Іванавіч першы загаварыў да яе, бы даўняй знаёмай:

— Ну што, маці? Бачу, па вачах бачу, што дужа карціць, не церпіцца. Учора вечарам і сын званіў... А можа, яшчэ і паляжалі б, як?

— Ой, доктарак, даражэнькі,— Вольга не магла паверыць, што так удала складваецца размова,— занудзілася я... Хай ужо лепей дома... Адпусціце ўжо, доктарак!

Ён заўсміхаўся, нешта шапнуў Жанне, і яны падаліся да наступнага ложка, дзе хваравіта-нямогла сцішылася, затаілася новенькая — маладзіца гадоў каля трыццаці, якая толькі ўчора паступіла ў бальніцу.

Вольга ж не магла дачакацца канца абходу, каб папытаць у Жанны, які прысуд вынес ёй Барыс Іванавіч. Чамусьці яна ўжо не сумнявалася, што ўсё скончыцца як мае быць — сёння з Лёшкам паедзе дадому. Ёй стала цёпла і добра ад таго, што Лёшка паклапаціўся пра яе, бач вунь, узяў ды пазваніў у бальніцу. А то хто ж яго ведае, ці схацеў бы яе самую паслухацца Барыс Іванавіч. Не вельмі яны, урачы, слухаюцца. «Сынок, бедны,— зноў са шкадобаю і пяшчотай падумалася пра Лёшку.— Забегаўся, нябось, змарнеў недзе. А яшчэ ж я на ягоную шыю...»

І вось, седзячы ўжо побач з ім на заднім сядзенні старэнькай «Пабеды», якую ўступіў дзеля такой нагоды старшыня калгаса Маляўка, Вольга цішком паглядвала на сынаў твар і з сумам заўважала, што ён сапраўды трохі паблажэў, апалі шчокі, толькі вочы тыя ж самыя — добра і радасна-здаволена блішчаць.

Машына бегла лёгка і плаўна, хоць дарогу за вясну, як лілі дажджы, нямала пабіла на калдобіны, а грэйдэр пакуль яшчэ не прайшоўся. За рулём сядзеў чамусьці не Мішка Лыкаў, што вазіў Маляўку гадоў ці не пятнаццаць, а малады, вушаты, з доўгімі кудламі, якія звісалі ажно на каўнер пінжака, незнаёмы хлопец. Вольга хацела спачатку нават папытаць, хто ж гэта такі, а пасля толькі ўспомніла — ну, што за дзіравая галава! — як Лёшка ў адно з наведванняў казаў пра Лыкава, нібы той нечага ўзбурыўся, не паладзіўшы са старшынёй, і адмовіўся яго вазіць, папрасіўся на грузавую машыну. «Дык хто ж гэта замест яго?» — Вольга зноў паўзіралася на хлопца, сілячы памяць, і хутчэй усё ж па вушах, чым па твары, пазнала ў ім сярэдняга Веркі Лосевай — Петрыка. Ага, ён, Петрык. За два гады ў арміі як пасталеў, як памяняўся! Відаць, толькі нядаўна вярнуўся.

Колькі, аказваецца, змен у вёсцы, калгасе, пакуль яе не было. І не дзіўна! Гэта ж амаль усю зімачку правалялася чортведама дзе. Ды хоць бы які толк...

Яна зноў, каторы раз, падумала пра сваю нямогласць, пра смерць, якая дала ёй нейкую перадышку, адтэрміноўку. А ці надоўга? Сёння — Вольга з ціхай радасцю гэта адзначыла — думалася пра сябе трохі іначай. Дзён колькі яшчэ назад ёй было амаль што ўсё роўна — памрэ зараз вось ці трохі счакаўшы. Найшла нейкая спустошанасць, абыякавасць да ўсяго і ўсіх. Толькі скрозь гэтую спустошанасць, адрынутасць ад зямных спраў і клопатаў прабівалася яшчэ адно, запаветна-некранутае, жывое, што торгала сэрца болем і жалем,— шкадаванне дзяцей, Лёшкі і Дзімы, якіх трошкі, зусім ужо трошкі трэба падтрымаць, не даць зламацца. Асабліва меншага, Дзіму, пакуль ён вучыцца, пакуль не стаў ёмка на нogi. А тады ўжо няхай будзе тое, што ёй наканавана. Ат, ніхто гэтага яшчэ на абмінуў, не абхітрыў. У кожнага па-свойму і кожнаму сваё...

Сёння ж, аднак, настрой у яе быў інакшы. Ці таму, што едзе дахаты, ці, можа, цяпло, сонца бралі сваё,— ёй пакуль што не хацелася думаць пра благое. З'явілася нават цікавасць вось і да Петрыка, і да таго, як там зараз у калгасе — ці ж сеюць хаця на вышэйшым і сушэйшым? Пра многае, вельмі многае, не кажучы ўжо пра ўсё сваё, хатняе, роднае-кроўнае, хацелася спытаць у сына. Але тут, у машыне, пры староннім чалавеку, яна трывала, ведаючы, што нідзе ад яе гэтыя навіны не падзенуцца. А зараз тым больш можна і патрываць, памаўчаць, бо ўсцяж, за шклом, гэткае хараство — любуйся і век не налюбуешся.

На двары сапраўды раскашавала вясна. Дарога бегла то полем, ужо зверху падсохлым, над якім трымцела цёплае мроіва і ў ім маленькімі чорнымі кропкамі віселі жаваранкі, то залаціста-вясёлымі, ажно хацелася зажмурыцца, сасняковымі ўзлобкамі, прапахлымі смалой і ігліцай.

Сасня́кі непрыкметна, як паніжэла мясцовасць, змяніліся густым ельнікам пасляваеннай пасадкі. Дрэвы былі ніштаватыя, але ні ў якое параўнанне не ішлі з разлапістымі векавухамі-елкамі, што там-сям, уцалеўшы ад парубак, узвышаліся над усім лесам. А вось зараз, за павароткай пакажацца і балотца, летам скрозь зарослае асакой, аерам, розным кустоўем. Там, пад палатном дарогі, упоперак яго, цяперака шырокая цэментаваная труба-

сцёк, а тады, у сорак трэцім, быў драўляны мосцік. Адсюль усё і пачалося...

Вольга ажно страпянулася, адчула, як у грудзях сашчаміла, як звяло дыханне. Яна ціха папрасіла Петрыка спыніцца, а Лёшку — каб прыадчыніў дзверцы.

— Што, мама, дрэнна? — занепакоіўся Лёшка.— Зараз, зараз палягчэе, вось падыхай паветрам...

Ён вылез з кабіны сам, Петрык таксама, пра нешта загаварылі, трохі адышоўшыся, закурылі. Лёшка адразу ж кінуў папяросу, зноў памкнуўся да машыны, спачувальна глянуў на маці.

— Нічога, сынок,— супакоіла Вольга.— Гэта я так. Успомнілася вот тое-сёе... Ідзеце разамнецеся, пакурэце. А я каліва адна пасяджу. Вы ўжо мне даруйце, не зважайце...

І зноў, каторы ўжо раз за многія гады, калі яна на чым ехала ў гарадок па якой сваёй патрэбе, гэтае вось, ля мастка, месца прымушала яе ўсю сцяцца, нанова перажыць і жахлівую — ворагу свайму не жадала б такое — і адначасна хвалюючую мінуту...

## 2

Восець уверсе свіцілася, што рэшата, і скрозь латы, на якіх там-сям трымцелі яшчэ касмылі ўчарнелага акалоту, з шэрага нізкага неба падала снежная пацяруха. Сцены таксама аселі, скасабочыліся. У дзіркі, дзе некалі быў мох, шастаў, прабіраючы да касцей, сыры настырны вецер. Не ставала ўжо ніякай сілы бараніцца ад холаду, і жанчыны малілі Бога хутчэй паслаць ім збавенне-смерць, чым цярпець такія мукі. Збіўшыся ў куток — там ляжала жменя нейкай старой, сточанай мышамі саломы,— яны стараліся хоць трохі засланіць ад сцюжы дзяцей, знімалі з сябе што цяплейшае і хуталі іх.

Вользе было, бадай, горай, чым каму. На анямелых, нягнуткіх руках яна другія суткі апантана, без пярэдыху трымала, як мага бліжэй туліла да сябе невялікі скрутак-канверцік з нятоўстай ватняй коўдрачкі, у якой, знясілены ад крыку, зараз сцішыўся, падазрона стаіўся яе першынец, яе Лесік. Грудзей ён ужо не ўзяў, ды Вольга і не спрабавала болей дражніць яго, бо ведала, што ні адной кроплі малака не засталося.

У восеці іх было ўжо недзе чалавек за шэсцьдзесят.

Большасць баб і дзявок Вольга ведала — з суседніх вёсак Садкі і Чубаўка. Аднак былі і зусім незнаёмыя, відаць, адкульсьці здалёку. Нават у твар ніколі не бачыла. Сёння раніцай, прачыніўшы на хвіліну рыпучыя дзверы, упіхнулі яшчэ некалькі жанчын і аднаго сівога дзядка. І зноў скрыганулі на ржавых круках цяжкія дзверы, і гэты скрыгат аддаўся ў сэрцы цяжкім пякучым болем.

Той-сёй з новенькіх, як толькі асвойтаўся ў стылым паўзмроку, адразу ж загаласіў — слёзы іхнія былі яшчэ не ўсе выплаканы.

— Людзі, ратуймася, спаляць жа, жыўцом спаляць,— ірвала на сабе валасы распэтланая маладзіца з вялікім чорным гузяком на лобе.— За што ж яны нас так, ірады, душагубы?..

Яна кінулася да выхаду і штомоцы рукамі і нагамі загрукала ў дзверы.

— Маня, адыдзі, зараз жа,— крыкнула на яе жанчына з запалымі, хваравіта бліскучымі вачыма і белым, што мел, тварам.— Вазьмі сябе ў рукі, чуеш!

Але Маня яшчэ болей раз'ятрана грукала ў дзверы, ад чаго зверху густа пасыпалася саламяная гніль, перамешаная са снежным пылам.

Вольга, занятая сваім горам, думкаю пра мужа, пра Лесіка — хоць бы яшчэ трошкі патрываў, крывіначка родная, радасць яе ненаглядная,— адразу і не ўцяміла, што гэта коратка і рэзка, як усё роўна хто чыркнуў палкаю па штыкетніку, затрашчала на дварэ. І толькі калі Маня, неяк дзіўна войкнуўшы і захрыпеўшы, спачатку павольна ўкленчыла, а пасля чмякнулася тварам у руды пыл, Вольга на якую хвіліну выйшла са свайго здранцвення, зразумела, што здарылася з гэтаю незнаёмаю маладзіцаю, што ў любы час можа стацца і з кожнаю з іх. Хто яны тут для гэтых вылюдкаў, забойцаў? Што ім яе жыццё, яе Лесіка, жыццё вось гэтай маладзіцы, якая зараз, прашытая кулямі, курчыцца ў рудым пыле? Яны — нявольнікі, з якімі можна рабіць што хочаш: спаліць жыўцом, забіць, павесіць, змарозіць, як яны, ужо другія суткі гібеюць у гэтай лядоўні, завезці на катаргу на чужыну. Усё можна з імі зрабіць. Толькі яны, безабаронныя, нічога не могуць. Папомняцца ім, душагубам, людскія слёзы, ой як папомняцца. Усе здзекі над людзьмі бокам ім выйдуць, хай на лепшае не спадзяюцца.

...Увесь той дзень і ноч, як іх з Лесікам забралі, Вольга жыла чаканнем бяды.

Перад гэтым, у глухую поўнач, калі за сценамі шалеў вецер, біў у шыбы сухімі жменямі снегу, а недзе ля лесу вылі ваўкі — была якраз піліпаўка,— на хутар завітаў Іван. З ім прыйшлі яшчэ трое партызан.

Вольга больш чым месяц не бачыла мужа і вельмі ўзрадавалася, кінулася ў сенцы ўзяць што-кольвечы з кубельца і пакарміць мужчын. Хацела нават запаліць у грубцы, згатаваць чаго цёплага, каб людзі з двара, з гэтай снежнай стыласці каліва абагрэліся. Аднак Іван сказаў, што яны зараз вельмі спяшаюцца, што ў іх пільная справа і ён наведаецца, калі ўсё будзе добра, пасля, дзён праз колькі.

Перахапіўшы мёрзлага сала з цыбуляй і бульбай — хлеба не было,— партызаны закурылі і пачалі збірацца. Сцягнуўшы набрынялыя боты, якія адхадзілі сваё: падэшва правага была абвязана вяроўчынай, ды і левы ледзь-ледзь трываў, Іван абуў свае старыя, залатаныя, але яшчэ даволі цёплыя валёнкі і пайшоў у бакоўку, дзе ў калысцы ля грубкі спаў Лесік. Цмокнуўшы сына ў ружовенькую кнопку-носік, палюбаваўшыся, пацешыўшыся ім, ён прыхінуў на хвіліну і горача ў падатлівыя вусны пацалаваў і яе, сцішаную і паніклую...

Вольга хацела іх трохі правесці, але Іван далей за падворак яе не пусціў. Снегу было ўжо вышэй плота, тамсям навіслі брылі, амаль да каленяў накідала і на расчышчаную звечара дарожку да варотцаў за хлявом. Аднак мяцеліца і не думала сунімацца — сыпала і сыпала. Вольга стаяла, сцяўшыся, ля варотцаў, да болю ўваччу ўглядалася ў густую, што аўсяны кісель, шэрань, якая праглынула яе Івана.

Па абедзе прыбегла Адоля з суседняга хутара і сцішана, амаль шэптам, нібы іх мог тут хто пачуць, сказала, што ноччу на чыгунцы нехта падарваў цэлы фашысцкі эшалон з танкамі і гарматамі...

І з самага ранку ў Чубаўку наехала поўна немцаў, паліцаяў. Што ім трэба, што яны ўдумалі рабіць, ніхто не ведае. Божачка, хоць бы якой бяды не ўтварылі! Чаго іх прыперла сюды нячыстая?

Пабедаваўшы, павойкаўшы, Адоля, смешна грэбаючыся ў глыбокім снезе, патрусіла напрамкі дадому. Вольга, закусіўшы да крыві губу, збялелая, стаяла ля акна і не ведала, што рабіць. Вестка пра ўзарваны эшалон яе абрадавала, яна добра ведала, хто ноччу прыклаў да гэтага руку, аднак тое, што сказала Адоля пра немцаў у Чу-

баўцы, устрывожыла не на жарт. Дарэмна яны сюды не пасунуцца, не.

Ёй карцела самой схадзіць у Садкі — суседнюю з Чубаўкай вёску, дзе жыла яе стрыечная сястра Верка. Мо што болей даведалася б. Але хіба ў такую замець з малым дзіцем куды высунешся? Аднаго ж Лесіка таксама не пакінеш і на гадзіну. Што ж, прыйдзецца жыць у няведанні, спадзявацца, мо ўсё абыдзецца добра...

Ноччу яна і не змружыла вачэй. Усё стаяла і стаяла ля акна на кухні, якое глядзелася ў той бок, дзе была Чубаўка, напружвала слых: здавалася, што недзе блізка гудзе машына... Тады яна бегла ў бакоўку, дзе соладка пасопваў Лесік, абарочвалася, засланяла сабою калыску, гатовая ўчапіцца ў горла любому, хто мусіць падысці да дзіцяці. Так паўтаралася колькі разоў.

Толькі пад саменькую раніцу, зусім ужо знясіленая, яна кінулася апранутая на ложак і раптоўна заснула. Пабудзіў яе Лесік, які захацеў есці. Вольга накарміла яго, памяняла мокрыя пялёнкі і пайшла пад паветку па дровы, каб запаліць у печы і грубцы — Лесіку ж трэба цяпло.

Занятая работай — секла ў карыце буракі карове,— яна і не ўчула, як зайшлі ў хату двое немцаў і паліцай. Вольга як не абамлела. Але ўжо ў наступную хвіліну з секачом у руках яна кінулася ў бакоўку, адкуль пачуўся плач Лесіка.

Паліцай — Вольга трохі ведала яго ў твар, добры, казалі, быў гад — не рашыўся кінуцца за ёю следам, стаў на парозе і гучна, каб чуваць было, загадаў збіраць малога і самой апранацца: пойдуць у Чубаўку.

— Нікуды я з дзіцем грудным не пайду,— у адчаі закрычала Вольга.— Што рабіцьме там, у той Чубаўцы?

— Пойдзеш, як міленькая пойдзеш,— працадзіў скрозь зубы паліцай.— Хопіць, насядзелася ў сваім асіным гняздзе...

Вольгу як не апяклі ягоныя словы. Няўжо хто віжаваў і данёс, што яе Іван у партызанах і тады-сяды наведваўся дадому? А мо іх злавілі, мо ўжо яе Івана і ў жывых няма? Як жа тады жыць ёй самой?

Астатняе, што было пасля, пакуль яе з Лесікам і іншымі кінулі ў тую восець, Вольга помніла зараз вельмі цьмяна,— усё засціла тады думка пра Івана: дзе ён, што з ім? Цьмяна, нібы мінула цэлая вечнасць, нагадалася дарога да Чубаўкі, глыбокі, вышэй каленяў, снег, тое, як паліцэйскі піхнуў яе, каб не плялася, бы нежывая, і яна

з Лесікам, пад гыгыканне фашыстаў, гоцнулася ў снег. Добра, што было мякка, і Лесік, бадай, ці адчуў гэтае падзенне. Ва ўсялякім разе, не заплакаў. Затое яна, Вольга, набрала поўна снегу і ў рукавіцы, і ў валёнкі. Атрэпацца ж не было як — і рукі былі занятыя, і паліцай з немцамі падганялі што на пажар.

У восеці — будыніна гэтая паныла горбілася ля шляху, метраў якіх за дзвесце ад Чубаўкі,— калі сагналі жанчын з дзецьмі і таго-сяго з нямоглых старых мужчын, толькі там са скупых размоў Вольга з жахам пераканалася ў сваёй нядаўняй згадцы: усе яны сем'і партызан, усіх выдаў нейкі вылюдак.

Неўзабаве пасля таго як забілі Маню, іх пагналі ў бок гарадка, дзе мясціўся нямецкі гарнізон. Акалелыя, знясіленыя ад усяго, што перажылі, людзі ледзь валаклі ногі. Тут, на шляху, было цвярдзей, чым на полі, але снегу ўсё роўна хапала. Паперадзе ехала, пакідаючы глыбокія каляіны-сляды, паўнюткая машына фашыстаў. Паліцаі — іх было таксама нямала — ішлі ззаду, таўхалі прыкладамі тых, хто адставаў, пакрыквалі і мацюкаліся.

Мінулі поле, дарога пайшла спачатку праз малады сасняк, які неўзабаве змяніўся высокімі гонкімі соснамі. Вецер тут так не круціў, не даймаў, і стала цяплей.

Калі ногі пры хадзе трохі адышлі, дык рук Вольга паранейшаму амаль не чула. Але зараз меней за ўсё думалася пра сябе, пра тое, дзе яна, што з ёю, куды разам з іншымі гоняць. Як магла, гарнула да сябе Лесіка, спрабавала злаўчыцца, каб адхінуць коўдрачку і зазірнуць у ягоны тварык. Аднак каляныя рукі зусім не слухаліся, і Вольга кінула гэтую спробу, бязгучна, пасінелымі губамі прасіла яго, каб ён яшчэ патрываў... На што яна спадзявалася, Вольга не думала, была як у цяжкім, пакутлівым да забыцця сне, у нейкім незразумелым трызненні. Яна мала чула, што казалі жанчыны, няўцямна глядзела на тых, хто прапаноўваў помач — паднесці трохі, пакуль адыдуць рукі, Лесіка,— амаль не даходзілі да яе слыху выкрыкі, пагрозы, брыдкая лаянка бобікаў.

І толькі калі ўперадзе, метраў якіх за сто, грымнуў выбух, яна ўздрыгнула ўсім целам, няўцямна ўзняла галаву, быццам скінула здранцвенне. У адно імгненне згледзела, як невядомая сіла падкінула высока ўгору дубовыя плашкі мосціка, як цяжкая машына, пад енк фашыстаў, задам гоцнула ў глыбокую канаву.

З-за кустоў, злева ад шашы, хтосьці амаль адначасова

з выбухам штомоцы крыкнуў: «Бабы, лажыцеся!» Вольга, нарэшце ўсё ўцяміўшы, з радаснай надзеяй ацаніўшы, што гэта азначае, хуценька кінулася ўбок, разам з Лесікам на руках з'ехала па снезе з крутога схілу.

І амаль у тое ж імгненне паветра працялі кулямётныя і аўтаматныя чэргі...

## 3

Дзімка прыехаў надвечар.

Сёння Вольга яго нават і не чакала. Чакала заўтра, як было ў пісьме. Яшчэ тыдзень таму назад Дзімка напісаў, што ледзь купіў білет на поезд — на святы, а тым болей на майскія, вельмі цяжка з білетамі, і ён ажно прапусціў заняткі, цалюткі дзень тоўкся ў чарзе да кас. Затое білет, і нават плацкартны, у ягонай кішэні. Пытаўся, ці трэба што прывезці з Мінска.

Вольга хацела папрасіць Лёшку напісаць, каб прывёз ножак на студзень і трохі, калі будзе, «Доктарскай» каўбасы на салату. Гарошак дома ёсць, і як добра было б зрабіць свежай салаты з яйкамі і маянэзам. Аднак перадумала. Па-першае, пісьмо можа не дайсці да ягонага ад'езду; падругое, Лёшка, заняты сяўбой, вяртаўся дадому поцемку і адыходзіў на працу ледзь свет. Як ён толькі і на нагах трымаецца?

Таму Вольга і не стала яго турбаваць. Аксану, якая часта хоць на паўгадзінкі забягала яе адведаць, таксама пасаромелася прасіць аб такой паслузе. Ат, неяк абыдзецца. Можна зарэзаць пеўніка — за зіму, сама нядаўна бачыла праз акно, добра такі падгадаваліся і цяпер цалюткі дзень дзяруць на вуліцы горла. Ды і навошта ёй ажно два пеўнікі? Хопіць аднаго. Вольга яшчэ прыкінула, што ў іх амаль нечапаны кумпяк, а Уляна да таго ж паабяцала трохі цяляціны — зарэзалі толькі ўчора. Так што будзе чым і заўтра пачаставацца, і святы сустрэць не горай, чым хто. Увесь гэты клопат са сталом узяла на сябе Уляна.

Дзімка зайшоў у хату, што Вольга нават і не пачула. Гучна гаварыла радыё, мо таму яна і не пачула, як ляпнула клямка, як адчыняліся і зачыняліся дзверы. Убачыла яго, вясёлага, усмешлівага, без шапкі, у лёгкім светлым, яшчэ ўвосень купілі, плашчыку, з невялікім жаўтлявым саквояжам у левай руцэ, і ажно праслязілася ад радасці:

— Ты, сынок?! А мы ж заўтра чакалі...

— Пашанцавала пад'ехаць на легкавушцы, мама.— Дзімка паставіў саквояж у куточак ля шафы, распрануўся, плашч акуратна павесіў на цвік і толькі тады падышоў да маці, пацалаваў яе ў шчаку.— Разумееш, Валерка Хамяк, ну, сын нашага старшыні райвыканкома, адбіў бацьку тэлеграму, што нечым даехаць дахаты,— а ў іх там нейкае вяселле — вось Іван Кірылавіч і паслаў на выручку свайго шафёра. Так што пяць гадзін з ветрыкам — і я тут.

— А як жа білет? — спытала Вольга.

Дзімка бесклапотна махнуў рукой:

— Ат, падумаеш, сем рублёў... Не паспеў здаць назад.

— То і добра, сынок, што прыехаў,— змяніла гаворку Вольга, каб часам Дзімка не падумаў, што ёй шкада тыя сем рублёў.

— Ну, як ты, мама? Што ў вас тут? — Дзімка прайшоўся па хаце, зазірнуў у люстэрка, якое вісела на сцяне ля рамкі з карткамі, выняў з задняй кішэнькі штаноў расчоску, дзьмухнуў на яе і пачаў папраўляць разбэрсаныя валасы.

Вольга моўчкі любавалася сынам. Даўнавата ўжо не бачыла. Гэта ж з зімовых канікулаў не быў дома. Пэўна ж, не блізкі свет, тая сталіца, а ўзімку тым болей часта не наездзішся. Ды і вучоба... Паспрабуй пасушы тыя мазгі... Шкада, што і ў канікулы яна не нацешылася ім. А ў бальніцы — здаецца, два разы Дзімка наведаўся — хіба доўга нагаворыш? Ды ці тое адчуванне, той настрой у яе быў тады? Добра што, во, трохі ачуняла, хоць і прыкута да ложка. А тады ж і зусім свет нямілы быў...

Вольга адзначыла сама сабе, што Дзімка адгадаваў яшчэ большыя валасы і калі стаяў да яе спіною, яны спадалі, як і ў Петрыка. на каўнер пінжака. Але яна не стала нічога казаць. Ат, хай сам глядзіць. Яго дзела маладое. А цяпер каго з маладых хіба пераканаеш? Ды, калі добра паглядзець, не так ужо і псуюць яго тыя валасы. Вунь, калі прычасаўся, які прыгожы! Дзіва што Аксана ажно млее. Пэўна ж, гэтакі хлопец!

Цёплая хваля радасці зноў агарнула яе.

— Ты, сынок,— сказала Вольга,— пэўна ж, галодны? Зараз, во, прыйдзе Уляна, зробіць што. Яна цяпер, бедная, на два двары ўвіхаецца, пакуль Лёшка на тым севе...

— Нічога, мама, я сам мо чаго памазгую.

— Ну, то і добра,— абрадавалася Вольга.— Недзе там, у кладоўцы, яйкі, а на сцяне вісіць кумпяк. Падсмаж

яечню. На керагазе ж хутка. А ў шкапчыку і малако кісленькае ёсць, і хлеб там.

— Знайду, знайду, не турбуйся.— Дзімка, весела мармычучы нешта сабе пад нос, падаўся на кухню.

Вольга чула — дзверы на кухню былі прачынены,— як Дзімка палез спачатку ў шкапчык, трохі памарудзіў, пасля, бразнуўшы посудам, выняў, відаць, гладыш з кіслым малаком. Яна ведала, як ён любіць такое малако, і таму папрасіла Уляну не ціснуць сёння сыр, пакінуць пару збанкоў кіслага.

Лёшка прыйшоў раней, як і абяцаў. Вольга згледзела, як постаць яго мільганула паўз вокны. «Ну і добра,— падумалася з палёгкай.— Пэўна, скончылі той, у Выселках, клін. А мо напарнік, Венька, раней сёння змяніў? Але ад гэтага не надта дажджэшся».

Яна затаілася, чакаючы, як зойдзе ў хату Лёшка, неспадзеўкі ўбачыць Дзімку,— пэўна ж, яшчэ не ведае, калі хто часам не сказаў,— як яны абрадуюцца адно аднаму, як паздароўкаюцца...

— Мама, я схаваюся,— раптам, на хаду жуючы, убег з кухні Дзімка.— Не кажы, што я тут.

Ён пашукаў вачыма, куды б схавацца, кінуўся быў за грубку, але, хутка перадумаўшы, па-змоўніцку прыклаў палец да губ і на дыбачках пайшоў у закутак, ушыўся між шафай і сцяной.

Вольга здагадалася, што Лёшка падаўся нечага ці не ў хлеў — праз акно ў кухні Дзімка яго і ўгледзеў.

— А плашч,— прымаючы Дзімкаву гульню, з усмешкай шапнула Вольга.— Плашч жа вунека... Ды і сакваяж навідавоку.

Дзімка хутка схапіў з цвіка плашч і, адчыніўшы шафу, шпурнуў яго ўсярэдзіну. Туды ж схаваў і сакваяж. Вольга здаволена пасмейвалася. Даўно, ой як даўно яна не была так радасна ўзбуджаная.

Лёшка зайшоў у кухню з бярэмем дроў. Кінуўшы іх на падлогу ля печы, ён, чуваць было, распрануў сваю замасленую брызентавую куртку, занёс яе ў сенцы,— ён заўсёды, як стала цяплей, пакідаў яе ў сенцах,— затым зазірнуў у пакой, дзе ляжала яна, Вольга.

— Ты не галодная, мама? — стомлена спытаў ён.

— Не, сынок. Толькі нядаўна пайшла Уляна. Яна мне тое-сёе падала... Ну, як вы там, у Выселках? — Вольга старалася як мага болей гаварыць, каб не выдаць сябе, бо ёй так і карцела засмяяцца.

Але Лёшка нічога не заўважаў, па-ранейшаму быў заклапочаны і сур'ёзны.

— Кончыў, мама, кончыў. Усё зрабілі. Заўтра новае поле пачнём араць. Маляўка на заўтра мяне адпусціў. І каня загадаў брыгадзіру даць. Хоць на цэлы дзень. Так што ўходзімся... Вось пайду зараз гной растрасу, засталася латка нерастрэсенага.

— Перадыхнуў бы каліва,— са шкадаваннем сказала Вольга, як бы ўжо і забыўшыся на гульню, якую ўдумаў меншы.

Дзімка, як малое дзіцяня, стоена сядзеў у сваёй хованцы, нечага чакаў, нешта вымудроўваў. Вользе, бачачы такога стомленага, заклапочанага Лёшку, не хацелася болей гэтай гульні, аднак і падводзіць Дзімку не хацела. «Што ж ён там вымудроўвае? Ну, хіба ж не дзіця яшчэ горкае?»

Яна неўпрыкмет кінула вока ў закутак, дзе стаіўся Дзімка, і ледзь не самлела. З-за шафы па локаць вытыркалася голая рука, і ў ёй... настаўлены на Лёшку пісталет. Вользе ажно млосна стала, перад вачыма паплылі кругі. Падумалася, што нервы ўжо зусім нікуды нявартыя. Добра, што такое цягнулася нядоўга, і Лёшка, бадай, ці заўважыў, як змянілася была яна ў твары.

Дзімка між тым нечым з усяе моцы грукнуў у шафу, і Лёшка хуценька абярнуўся на гэты грукат. «От зараза, ото ж і зараза»,— падумала Вольга, цяпер ужо з цікавасцю пільнуючы, як жа яно будзе далей. Лёшка, засцігнуты знячэўку гэтым грукатам і тым, што ўбачыў, якое імгненне павагаўся, у вачах яго, адагнаўшы стомленасць, успыхнулі нейкія вясёлыя чорцікі. Не паспела Вольга і слова сказаць, як Лёшка імкліва схапіў з ложка падушку і штомоцы шпурнуў у закутак, адкуль вытыркалася рука. Дзімка, як блазнюк, з гіканнем выскачыў са сваёй хованкі і накінуўся на брата. Яны пасярод хаты счапіліся барукацца.

— Хопіць блазнаваць, хопіць,— строга, як некалі, хацела прыкрыкнуць на іх Вольга, але зараз гэта ў яе не атрымлівалася.

Строгасці ў голасе не было. Гэта адчувалі і хлопцы. Яны ніяк не хацелі паддавацца адзін аднаму. Лёшка, хоць быў і старэйшы і шырэйшы ў касці, уступаў Дзімку ў спрыце — той вюном выгінаўся, нібы апантаны, гарцаваў па хаце, усё наравіў як лепей злаўчыцца і даць большаму падножку. Нарэшце Лёшка схапіў яго ў абярэмак і кінуў

на ложак, ажно жалобна скрыганулі недзе ўсярэдзіне матраца спружыны.

— Здаю-ю-ю-ся! — завішчаў Дзімка.— Ой, не магу, не казычы.

— Ну, во, гэта ўжо іншы кампот,— ажно засвяціўся ад радасці Лёшка.— Кішка яшчэ слабая, каб са мною барукацца. А цяпер пакажы, што гэта ў цябе за цацка такая.

Дзімка палез у кішэню, выцягнуў пісталет, раз-другі нечым пстрыкнуў — і над «пісталетам» узвіўся роўненькі, як у свечцы, агеньчык. З задняй, крыху адтапыранай кішэнькі штаноў ён выняў пакамечаны пачак цыгарэт і прыкурыў ад таго агеньчыка.

Вольга ажно вачам сваім не паверыла.

— Ты што гэта ўдумаў — курыць?! Зараз жа кінь, чуеш! Вось надзяру вушы...

— Не, маменцыя, ужо не кіну, крычы ці не крычы. У нас усе кураць, нават дзяўчаты. А я што — лысы?

— Ну як жа,— пакпіў Лёшка,— паказаць тады каму гэтую заморскую пстрыкаўку, калі не курыць.

— Ай, ну вас,— трохі пачырванеў Дзімка.— Нападуць на чалавека...

У гэты вечар у хаце Вольгі Лагацкай ажно за поўнач зіхацела ва ўсіх вокнах святло. Лёшка, перш чым зачыніць нанач на засаўку дзверы, выйшаўшы на хвіліну на двор, чуў, як дзявочы голас з вуліцы (ці не языкастай Сёмачкавай Кацькі?) весела некаму зазначыў:

— Кажуць, Дзімка прыехаў з Мінска. Чаго ж гэта ён у кіно не прыйшоў? Ой, дзевачкі, ці бачылі, якая Аксана сядзела сама не свая?..

## 4

Бульбу пасадзілі яшчэ да абеду, на што Лёшка нават і не спадзяваўся. А столькі ж было гаворкі, столькі хвалявання! Без маці ён адразу не ведаў, як і падступіцца да гэтае работы: колькі трэба нацягаць з пограба бульбы, як рэзаць, каб лепшыя палавінкі, з вочкамі, пайшлі для пасадкі, а пустыя — карове і парасятам,— дзякаваць Богу, парасяты, парсючок і свінка, якія ён нядаўна купіў на рынку ў райцэнтры, елі добра, раслі проста на вачах і круглелі, што бочачкі. Трэба было паклапаціцца і пра каня, пра кашы...

Малайчына Уляна. Каб не яна, яе помач, ой як цяжка

давялося б ім з маці. А так, калі ён вельмі заняты ў калгасе, Уляна і скаціну дагледзіць, і згатуе што-кольвечы, і матцы падасць-прыме. А зараз, во, і з бульбай памагла ўхадзіцца, і абед пасля такой важнай работы іх ужо чакае, ажно слінкі цякуць, і на майскія святы яна мудруе тым-сім смачным парадаваць.

Лёшка сёння зноў падумаў, як жорстка і несправядліва ставіўся ён да Уляны.

Яны былі суседзямі, жылі насупраць, праз вуліцу, але многія гады, амаль да апошняга часу, пакуль не злегла маці, Лёшка ні разачку не ступіў у двор да Уляны. Нават калі спраўлялі праводзіны ў армію яе сына Веціка, таксама не прыйшоў, хоць і маці, і Уляна, і сам Вецік вельмі яго прасілі. Уляна ажно са слязамі на вачах маліла ёй, дурніцы, прабачыць, зусім не хацела яна тады пакрыўдзіць яго...

А было гэта адразу, як ён, Лёшка, скончыўшы школу механізацыі, назусім прыехаў сюды, у Мошына, у новую сваю сям'ю. Тады ён незнарок падслухаў словы Уляны:

— Авоечкі, хіба ж мала аднаго на тваю шыю? А гэты, Ляксей яшчэ...

Маці тады, помніцца, заплакала, накрычала на Уляну, каб не плявузгала абы-што, не лезла ў душу са сваімі парадамі.

І Уляна, пасаромленая, прыкусіла язык, заўсёды пасля гэтага, сустракаючыся дзе з Лёшкам, вінавата апускала вочы, колькі разоў прасіла Вольгу пагаварыць з ім, каб не злаваўся, даравftў дурной бабе. Маўляў, гэта будзе ёй навука да скону дзён.

Спатрэбілася, аднак, нямала часу, пакуль адтаяла яго сэрца, пакуль канчаткова не пераканаўся, што Уляна баба хоць і са стрэмкай на языку, але шчырая і спагадлівая.

Абедалі ў зале, у Вольгі на вачах. Ды і яна, можна сказаць, нароўні з усімі піла і ела. Стол, зняўшы з яго вазоны і паслаўшы чысты абрус, Лёшка з Дзімкам спецыяльна паставілі ўпрытык да ложка. Седзячы ў пасцелі, абклаўшыся падушкамі, Вольга правай, трохі яшчэ паслухмянай рукой магла зараз дацягнуцца да ўсяго, што было смачнага, згатаванага і пададзенага Улянай.

Па каліву і выпілі, а хлопцы дык і добра-такі. Лёшка яшчэ загадзя купіў пляшку «Сталічнай», бо перад саменькімі святамі ў іхнім магазіне не заўсёды бывае гарэлка, а кагор Дзімка прывёз з Мінска — ведаў, што маці калі і брала ў рот якую кроплю, дык толькі кагору.

— Ой, Уляначка,— гаварыла расчырванелая ад віна і наогул павесялелая Вольга,— што ж гэта я рабіла б без цябе? Гэта ж такі клопат з рук! Толькі вось яшчэ грады неяк агараць...

— Авоечкі, чаго ўжо там — і грады падсобім, бяды не было б большай,— ва Уляны, якая таксама выпіла паўшклянкі віна, твар пабраўся нейкімі ружовымі плямамі. вочы ж не хавалі здаволенасці ад пахвалы.

Яна лёгка, увішна паднялася, дадала ўсім у талеркі закусі.

— Што ж хаця піша Вецік? — спытала Вольга.— Гэта ж, глядзі, увосень, калі, дасць Бог, будзе ўсё ціха, то і прыйдзе ўжо.

— Ага, во якраз учора атрымала ліст. Занудзіўся, піша, па доме. І дранікаў, піша, надта ж хочацца, ды яшчэ каб са скваркамі, з кілбасой.

— Чаго яшчэ ў арміі захацеў? — гыгыкнуў Дзімка.

— Памаўчаў бы ўжо лепей,— асадзіў яго Лёшка.— Сам, во, як упісваеш хатняе. А чалавек колькі ўжо не быў дома...

Вольга, бачачы, як засвяцілася ад Лёшкавых слоў Уляна, зноў парадавалася за большага, за яго сённяшнюю тактоўнасць, абыходлівасць.

Пасля яды Уляна памкнулася памыць пасуду, але Вольга рашуча запярэчыла:

— Дармо ўжо, Уляначка, неяк папарадкуем. Не вялікі клопат. Табе і так не ведаем як аддзячыць.

Маці падтрымаў і Лёшка:

— І самі не зломкі. У вас жа сваёй работы хапае...

Калі Уляна пайшла, Лёшка загадаў маці легчы, па яе просьбе прачыніў акно, бо на дварэ было досыць цёпла, а ў хаце застаўся цяжкі дух (ці мо ад віна ёй так падалося?).

Дзімка, памогшы Лёшку ўхадзіцца па гаспадарцы, папілаваць і накалоць дроў, к вечару, калі сонца павісла амаль над саменькім лесам, пачаў некуды збірацца.

Толькі ён памыўся і хацеў на кухні пераапрануцца ў чыстае, як завітаў, пастукаўшыся ў дзверы, Барыс Гонта.

— Го, Барыс! — радасна ўсклікнуў Дзімка.— Вось дык нечаканасць! Калі, якім ветрам занесла ў бацькоўскі кут?

— А такім, якім і цябе,— таксама расплыўся ў шчаслівай усмешцы Барыс.

На ім была новая, з іголачкі, лётчыцкая форма, якая вельмі статна і зграбна сядзела, надавала ўсёй Барысавай фігуры нязвыклую важнасць, саліднасць.

— Што, мо ўжо лятаеш? — спытаў Дзімка, пільна і з пачуццём як бы нейкай зайздрасці аглядаючы з ног да галавы свайго нядаўняга аднакласніка.

— Пачынаю,— проста адказаў Барыс.— Хутка буду трымаць экзамены.

Праз адчыненыя дзверы з залы падала голас і Вольга:

— Барыс, дзіцятка, як жа ты жывеш? Пакажыся хаця. Гэта ж колькі ўжо не бачыла.— І праз мінуту, калі Барыс падышоў да яе ложка: — А Божа, і не пазнала б нават. Які ж гожы, ладны стаў! Вось маці ды бацьку радасці!

Хлопцы неўзабаве пакінулі Вольгу адну.

Лёшка яшчэ раней, падаіўшы карову, пайшоў у поле — нешта, казаў, трэба разам з Венькам пакорпацца ў трактары, бо аднаму ніяк не асіліць.

Вольга спрабавала трохі падрамаць, каб развеяўся тлум у галаве, аднак сон не браў. У хаце пачало ўжо шарэць. Як бы хацелася ёй на двор, на лавачку, што ўтульна мясцілася пад ліпай на вуліцы!

Да болю знаёмыя гукі вёскі, з якімі яна звыклася за доўгія гады і па якіх сумавала, лежачы зіму ў бальніцы, яшчэ не думалі глухнуць, аціхаць. Вось бразнулі пустыя вёдры — нехта запознена спяшаўся да студні. Прашаргацелі, уз'ехаўшы на кучу жвіру, акаваныя жалезам калёсы. У Ганніным завулку, чуваць было, дагульвалі ў вайну хлапчукі. А трохі далей, з канца вёскі, данёсся пошчак бубна, затым паплылі, набіраючы моцы і пяшчоты, гукі трубы. Вольга здагадалася: гэта ж Макарчукова Аня, іхняя цялятніца, сёння распісалася, выходзіць замуж за шафёра з суседняга калгаса. Стары Макарчук, расказвала яшчэ ўчора Уляна, гэтулькі ўсяго нагатаваў, што тры дні і ночы можна будзе гуляць. І музыкантаў, казала, не схацеў сваіх, бо ўжо ўсім прыеліся свае, згадзіў аднекуль здалёку,— зяць цалкам палажыўся ў гэтым на цесця. Сёння, вядома, на поплаве ля Макарчукоў, калі будзе гэтак жа цёпла і суха, ажно да раніцы не аціхнуць гулі. Недзе, пэўна, зараз там і Дзімка аціраецца. А мо пайшоў спачатку ў бібліятэку, да Аксаны...

Вольга ўжо даўно ўпадабала Аксану. Добрая дзеўка, нічога благога не скажаш. Прыгожая і разумная. Нездарма ж бібліятэкаркай прызначылі. Абы-каго не прызначаць, не. Яна таксама паступала ў Мінск, на настаўні-

цу, але зрэзалася на экзаменах. Ды хіба ж лёгка цяпер адразу паступіць? Як каму пашанцуе. Перажывала дзяўчына спачатку. А зараз як быццам нічога сабе. Во, колькі разоў, як хвароба прыкавала яе, Вольгу, да ложка, Аксана прыбягала ў хату, прыносіла пячэнне і кансервы, весела шчабятала, памагала тое-сёе зрабіць.

Вольга добра ведала: кахае Аксана гэтага баламута Дзімку. І нікога болей да сябе не падпускае. Колькі ўжо да яе сваталася, прыязджаў нейкі афіцэр з райцэнтра, але дзяўчына ўсім паказвала на дзверы. Нават бацька — людзі ўжо пераказвалі — не раз лаяў яе за капрызы, пераборлівасць, упікаў, што не інакш хоча застацца векавухай. А яна неяк адбівалася і ад жаніхоў, і ад настырнасці бацькі.

Недзе ў глыбіні душы Вольга недалюблівала Аўдзея, Аксанінага бацьку, хоць, здэцца, чалавек нічога благога нікому не зрабіў. Пчаляр — пашукаць такога, не п'е, не валяецца ў гразі на вуліцы. Гаспадар таксама што трэба, хата ў яго — бы лялька: ашаляваная, размаляваная яркай фарбай, дах з ацынкаванага жалеза, сядзіба ўся абнесена раўнюсенькім, пад шнурок, гэтак жа размаляваным дашчаным плотам. Высокія, на падворак не зазірнеш, вароты і брамка — з жалеза. І ў хаце, казалі, дабра лічыць не пералічыць.

Не, не толькі з-за прагі да багацця недалюблівала Вольга Аўдзея. Недалюблівала перш за ўсё за яго круты нораў, няшчырасць, вечную хітрынку на вуснах і ў куточках вачэй. На людзях, асабліва дзе пры начальстве, Аўдзей выстаўляўся такім ужо правільным, што хоць ікону з яго пішы. А сам, нябось, заўсёды сабе наўме. Нічога не міне і не ўпусціць.

Ведала яна, Вольга, ведалі і іншыя, што не ўсё, далёка не ўсё прыдбаў Аўдзей сваім мазалём, хоць, чаго хлусіць, і сам ён быў жадны да працы, і жонцы сваёй Марылі пярэдыху не даваў. Але ж каб тое багацце грэла, давала якое шчасце — наўрад ці скажаш такое. Колькі ні працавала Вольга на розных калгасных работах разам з Марыляй, дзе б так не сутыкалася з ёю, ніколі не чула яе вясёлага смеху, ніколі не мела тая ў кішэні вольнага рубля, калі бабы скідаліся, каб самім, сваім, як яны казалі, кодлам, без мужыкоў, без іншых сведак адзначыць тую ці іншую падзею.

Добра, што Аксана не пайшла ў бацьку. У гэтай няма ніякіх хітрыкаў. Во, сама ж расказвала, што бацька вы-

твараў, як вытанцоўваў, калі яна наадрэз адмовілася, каб ён вёз нейкаму выкладчыку ў інстытут, куды паступала, ладнаваты бітончык мёду...

Зараз, лежачы ў пасцелі, слухаючы ў вечаровай цішыні трохі нязвыклыя, з падвываннем, саладжава-цягучыя гукі вясельнай музыкі, яна зноў і зноў думала пра Аксану і Дзімку. Хай бы ўсё ў іх было добра, хоць бы ён ужо яе не крыўдзіў. Гэта ж, як канчаў дзесяты клас, ды і пасля, на першым і другім годзе вучобы ў Мінску, ажно шалеў, калі доўга не бачыў дзяўчыну...

Думкі яе перапыніў стук брамкі. Па кроках у двары і ў сенцах Вольга здагадалася, што гэта Лёшка.

— Ляксей, Ляксей,— гукнула яна з цемнаты, калі шчоўкнуў на кухні выключальнік.— Запалі святло і тут. А то нешта спаць не хочацца.

— Хораша надта ж на дварэ,— бадзёра азваўся Лёшка.— Пачакай, разуюся, бо ў рове ў гразь па халявы ўбіўся. Усюды суха, а там і кладкі не памаглі.

Ён прачыніў сенцы, крэкчучы, аб парог пачаў сцягваць кірзачы. Праз хвіліну, шлэпаючы нагамі па падлозе, зайшоў у залу. Ад зыркага святла лямпачкі Вольга спачатку ажно зажмурылася.

— То, можа, і ты б схадзіў, глянуў, як там, на вяселлі,— улавіўшы добры сынаў настрой, асцярожна сказала Вольга.

Яна баялася, што Лёшка зноў, як бывала не раз, сцепанецца ўвесь, унурыць галаў і, нічога не сказаўшы, пойдзе на кухню ці ў сенцы, будзе нечага там калупацца...

Аднак сёння, наўздзіў, Лёшка ахвотна згадзіўся, як бы нават чакаў гэткай прапановы. Ён хуценька памыўся, апрануў свой цёмна-сіні, мала яшчэ ношаны касцюм, абуў чаравікі, прычасаўся. «Вось што робіць апратка з чалавекам,— падумалася Вользе.— Хлопец як хлопец стаў, а то ўжо быў зусім звяў. Чорт яе бяры, з той Нюркай. Хіба ж на ёй адной свет клінам сышоўся?»

## 5

Нюрка ўвайшла ў яго жыццё зусім неспадзявана, увайшла як стрэмка, як балячка, як салодкая атрута.

Тры гады назад, толькі Дзімка паехаў у горад вучыцца, і адбылася з ім, Лёшкам, гэтая гісторыя.

Восень тады выдалася халодная і дажджлівая. Усё

лета — і старыя такога не помняць — смажыла, пякло сонца, дзьмуў сухавей, а на трэцім тыдні верасня раптоўна і рэзка захаладала, з нізкіх цёмных хмар цадзіла і цадзіла, усё роўна што з рэшата.

З работай у калгасе была няўпраўка. Даставалася ўсім, а механізатарам асабліва. Кідалі іх то на бульбу, то на асенняе ворыва, то на сілас — усюды, дзе без тэхнікі не абысціся.

У адзін з такіх дзён, вечарам, пакінуўшы на машынным двары свайго «Беларуса», Лёшка стомлена, намацваючы нагамі дзе сушэйшае, плёўся дадому. Зверху пакуль не ліло, але паветра было тугое, вільготнае. Змрочная, зольная стыласць вісела над вёскай, над палеткамі, над усім, здаецца, светам.

У гэтую хвіліну ўпершыню ён пазайздросціў Дзімку. Сядзіць там сабе ў цёплым, утульным інтэрнаце, і яму анігадкі. А ты вось тапчы гэтую гразь, з цямна да цямна высільвайся на рабоце, а прыйдзеш дадому — і там толькі паспявай. Маці адна, як ні стараецца — таксама ж ходзіць у калгас,— без мужчынскае рукі не абыдзецца. Жыў дома Дзімка, як вучыўся ў школе, усё ж было лягчэй. Хоць і шанавалі яны меншага, не загружалі рознымі хатнімі справамі, але нават і маленькая яго падмога была ой як прыкметная.

Цяпер у яго, Дзімкі, адзін толькі клопат — вучоба. Ні пра што іншае галава не баліць. Ды і з вучобай не вельмі яны там, у тым яго інстытуце, шчыруюць, убіваюцца, як думае маці. Але хіба ёй гэта скажаш? Бачыў ён сам, пераканаўся, нябось. Толькі заўчора вярнуўся адтуль, з Мінска.

Падахвоціла яго з'ездзіць у горад, да Дзімкі, маці. Адпрасіся, маўляў, у брыгадзіра Адамейкі, а то і самога нават Маляўкі і з'ездзі. Завязі хлопцу трохі грошай, пакуль тая першая стыпендыя, кус сала, ёсцека, во, яшчэ кольца каўбасы, сабрала слоічак і свежай смятаны. Ён жа там, беднае дзіцятка, можа, галодны. А то яшчэ, о гарачка, занядужаў? Хто ж яго там дагледзіць, хвораму падасць-прыме? (Перад гэтым Дзімка прыслаў ліст, што быў на бульбе разам з іхняй групай, але прастудзіўся, і яго з тэмпературай адпусцілі назад, у інтэрнат.)

Вось і выправіўся Лёшка ў няблізкую дарогу. Ехаў не вельмі з вялікай ахвотай. Па-першае, муляла на душы, непрыемна напаміпала пра сябе кіслая міна Адамейкі, хоць на словах той і не сказаў нічога супраць. Па-другое,

ніколечкі не ведаў хлопец Мінска. Быў там усяго адзін раз, і то на вакзале, праездам, як служыў у арміі. А бегаць, шукаць, пытацца на кожным кроку ў незнаёмым горадзе для яго горай як што.

Мінск, наўздзіў, падаўся Лёшку не такім ужо тлумным, грымлівым, як уяўлялася: ні днём, ні ноччу не платаўхнуцца ад людзей, няма ніякага паратунку і ад машын, аўтобусаў, ад іхняга курадыму, візгату тармазоў.

Усё зараз бачылася не так. Поезд ягоны прыбыў у Мінск недзе адразу а дзесятай раніцы, і ці ўжо таму, што пачаўся рабочы дзень, ці мо што халаднавата было, павет-ра набрыняла вільгаццю, хоць і не дажджыла, але народу і на вакзале, і на вуліцах, і ў тралейбусе, які порстка імчаў, мякка шаргацеў коламі, было не надта густа.

Ад прыпынку тралейбуса да інтэрната, дзе, як значылася на канверце, жыў зараз Дзімка, трэба — так падказаў міліцыянер — трохі прайсціся пешкі. Гэтыя дзвесце ці трыста метраў прыпалі на нешырокую, добра ўходжаную алею ліпаў, клёнаў, каштанаў. На гладкай асфальтаванай дарожцы, проста пад нагамі — відаць, за ноч нападала — валялася нямала лісця, якое, нягледзячы на сырое надвор'е, гарэла залаціста-барвовым полымем. Там-сям шакаладна льсніліся, атрэсеныя ветрам, вылузаныя з цвёрдай абалонкі, плады каштанаў. Лёшка не ўтрымаўся, падняў некалькі такіх пладоў, сунуў у кішэню палітона.

Настрой у хлопца, нягледзячы, што спаў у поездзе кепска, быў бадзёры, турбавала адно — заспець бы Дзімку ў інтэрнаце. А то, чаго добрага, мо пацёгся куды. Ведама, вольнаму воля.

І толькі калі дзяжурная, папытаўшыся, да каго ён прыехаў, сказала, што са 113 пакоя ключа не здавалі, відаць, нехта там ёсць, Лёшка супакоіўся: ну, пэўна ж, хто яшчэ можа быць, акрамя Дзімкі.

Ён не абмануўся. Дзімка сапраўды быў адзін, валяўся ў ложку, чытаў нейкую кнігу. Адгукнуўшыся на стук у дзверы, убачыўшы на парозе брата, Дзімка радасна гагокнуў, нібы апантаны, ускочыў з рыпучай, на драцяной сетцы, пасцелі і кінуўся ў абдымкі.

«Усё роўна што дзіця,— нагадаўшы іхнюю сустрэчу, сам сабе ўсміхнуўся Лёшка.— Маркотна, нябось, на першым часе. Хоць і не так даўно паехаў з дому. А наперадзе ж яшчэ пяць гадоў вучобы...»

У той дзень ім абодвум было як ніколі добра. І зараз, месячы кірзачамі вясковую гразь, Лёшка перабіраў у па-

мяці ўсё, што яны рабілі, куды разам хадзілі. Перш-наперш, вядома, абышлі патрэбныя магазіны і купілі што трэба было, што прасіла маці. Пасля — самае, вядома, прыемнае — гадзіны дзве ці тры пасядзелі ў рэстаране. Ні Дзімка, ні ён, Лёшка, ніколі дагэтуль не былі ў рэстаране, і калі, пасля беганіны па горадзе, падцягнула жываты, вырашылі — у рэстаран, і болей нікуды. І хоць давялося добра-такі раскашэліцца, але ён, Лёшка, ані не шкадуе: і цяпер, здаецца, завярнуў бы куды хочаш, каб гэтак жа ўтульна пасядзець, выпіць бутэльку гэткага ж — ніколі не думаў, што такое ёсць,— смачнага віна, так, як там, хораша і апетытна павячэраць.

У салодкіх успамінах Лёшка не заўважыў, калі, просцячы сабе шлях, збочыў на поплаў, на вузкую, ледзь прыкметную ў цемнаце сцежку, якая вяла на гравійку. А там, ужо па сухім, яшчэ з паўкіламетра — і дома.

Здалёку кінулася ў вочы, што ў іхнім сельмагу, пры саменькай дарозе, ва ўсіх вокнах ярка гарыць святло. «Няўжо такі адчынілі?» — падумалася з надзеяй. Сёння, праўда, краем вуха ад некага чуў, што адчыніўся магазін, але Лёшка неяк не надаў значэння: ці мала пра які магазін ідзе гаворка?

Больш як два месяцы сельмаг быў на замку. Час ад часу прыязджала аўталаўка, але хіба гэта тое, што магазін? Не, вядома. Ды і паспрабуй, калі ты цалюткі дзень на працы, упільнуй тую аўталаўку.

Падумалася, што дома апошні карабок запалак. І солі якая жменя, не болей. Хлеба таксама не шкодзіла б прыкупіць буханак колькі, калі завезлі.

Лёшка наддаў ходу. Цікава ўсё ж паглядзець, каго паставілі замест Міхаліны Барута. Вось папалася кабета дык папалася! Божыцца, клянецца, што і капейкі для сябе ніколі не ўзяла, і скуль тая нястача на восемсот рублёў, хоць рэж, хоць забі — не можа даўмецца.

Міхаліне верылі і спачувалі. Нават той-сёй прапаноўваў сваю помач, хацелі ўжо па ўсёй вёсцы сабраць тую суму, каб, крый Божа, не судзілі чалавека. Аднак Міхаліна, паплакаўшы, пажаліўшыся на свой лёс, усё ж горда адмовілася. Выклікала брата з Варкуты — там ён шахцёрам — на тэлефонную размову, і ўжо праз дзень тэлеграфам ён прыслаў ёй пяцьсот рублёў. Трыста ў яе даўно свае ляжалі на кніжцы — збіралася сыну купіць акардэон. Бабы хацелі, каб Міхаліна зноў, нягледзячы ні на што, працавала ў магазіне. Пісалі ў райком, з канторы калгаса

званілі старшыні райспажыўсаюза. Там як быццам згаджаліся, ішлі насустрач людзям, але сама Міхаліна наадрэз адмовілася зноў станавіцца за прылавак. «Гарыць яна хай гàрам, тая работа»,— казала яна жанкам, а ў Маляўкі папрасілася даяркай на ферму — якраз не хапала падменнай.

І вось ужо два месяцы ці то чалавека не маглі падабраць, ці то іншая якая трасца, але магазін увесь гэты час быў апячатаны.

Лёшка яшчэ за колькі метраў убачыў: усярэдзіне, нягледзячы на святло, ні аднае душы няма. Падумаў спачатку, што лямпачкі, няйнакш, забыліся выключыць, і цяпер усю ноч будуць гарэць. А мо так зараз вырашылі, каб гарэлі і ноччу?

Ён хацеў пайсці далей, але між паліц мільганула жаночая постаць, і хлопец спыніўся, закасаў левае рукаво, глянуў на гадзіннік. Бралася на дзевятую вечара. Ніколі Міхаліна так позна не затрымлівалася ў магазіне, а вось новая прадаўшчыца... А мо ўсё ж зачынена? Ён ступіў на ганак, торкнуў за ручку дзвярэй, яны лёгка падаліся ўперад.

— Добры вечар,— нерашуча топчучыся ў парозе, гукнуў Лёшка, бо не ведаў, як паставяцца да яго позняга візіту.

— Заходзьце, чаго ж вы,— выйшла з-за паліцы, дзе ў беспарадку грувасціліся розныя рэчы, невысокая бялявая, досыць гожая маладзіца. Адразу кінуліся ў вочы яе ёмкія тугія грудзі, далікатныя шаўкавістыя валасы, якія трошкі неахайна спадалі на каўнер бэзавага колеру вязанага світэра, поўныя, але зграбныя ногі ў карычневых боціках на маланцы.

— Вы яшчэ працуеце? — спытаў ужо весялей Лёшка, не зводзячы вачэй з новае прадаўшчыцы. Яму чамусьці хацелася глядзець і глядзець на яе, і ў душы, чаго ўжо даўно не было, нехта быццам нацягнуў тонкую струнку, ударыў па ёй малаточкам, і яна цененька і трывожна-шчымліва зазвінела.

— Што ж мне яшчэ застаецца,— неяк разгублена адказала маладзіца.

Лёшка падумаў, ці не здарылася што, ці не патрэбна помач. Адно слова — бывае ж такое! — і ён стрымгалоў кінуўся б выконваць любую яе волю.

Жанчына ўбачыла Лёшкаву збянтэжанасць, нават трывогу, якая адбілася на ягоным твары, і растлумачыла:

— Запазнілася я на аўтобус. Толькі выбегла, а ён і хвост паказаў. А больш і не ведаю, чым заехаць. Ды і надвор'е такое...

— Скуль жа вы? І куды ехаць?

— Мо вы шафёр, зможаце выручыць? — у сваю чаргу спытала яна, кінуўшы хуткі позірк на Лёшкавы заляпаныя гразёю, заплямленыя боты, даволі-такі замусоленыя куртку і штаны.

— Не, я на трактары...— зніякавеў хлопец, не рады ўжо, што ўвязаўся ў гэтыя роспыты.

— А я падумала, што выручыце, падкінеце мяне дадому. Цяпер вось хоць начуй тут, у такой лядоўні.

З далейшай гаворкі Лёшка дазнаўся, што маладзіцу завуць Нюрка,— яна сама так назвала сябе,— што сёння толькі першы дзень, як прыняла магазін, пасля абеду завезлі, во, тавар, згрузілі, скінулі абы-як; яна тут, парадкуючыся, забылася пра тое, што ёй жа няблізка, ажно ў Навасёлкі, што і на работу і з работы думала пакуль ездзіць аўтобусам. І вось у першы ж дзень так кепска атрымалася...

— А за вас вельмі будуць дома хвалявацца? — Лёшка адразу адчуў, што спытаў няўдала, і баяўся, каб Нюрка часам не высмеяла, не асекла яго.

Але Нюрка быццам і не заўважыла хітрынкі ў яго словах, проста і даверліва сказала:

— Не, я жыву адна. Мама нядаўна памерла... А там жа хата...

Яна змоўкла, пра нешта задумалася. Вочы яе, трошкі, ледзь прыкметна падсіненыя, патухлі, нібы нават пасуровелі.

Лёшку нечакана натхніла, і ён, усё ж не зусім упэўнена, прапанаваў:

— Ведаеце што? Пераначуеце ў нас. Месца знойдзецца. Яй-Богу ж.— І, каб не даць ёй апамятацца, сказаць сваё катэгарычнае «не», дадаў: — Мама таксама будзе не супраць, пабачыце. Недзе грубку зараз паліць, бо халаднавата. А вам жа чаго матляцца? Ды і чым у такое паганае надвор'е дабярэшся?

Нюрка, наўздзіў, лёгка і весела згадзілася. Яна пайшла ў бакоўку, вынесла адтуль чысты цёмна-сіні халат, кінула яго Лёшку і загадала:

— Калі так, то адзявайце... Спачатку паможаце мне. Усё ж удваіх спарней.

— А што рабіць? — зашпіліўшы на ўсе гузікі халат

паверх пінжака — замусоленую куртку ён зняў,— радасна спытаў Лёшка.

— Уга, хопіць што рабіць. Бачыце, колькі ўсяго навалена... Трэба ж неяк раскласці.

— Ну, тады камандуйце. Я як салдат.

— Паглядзім,— усміхнулася Нюрка.

Тавару сапраўды завезлі шмат. Некалькі цюкоў туга перавязаных шпагатам целагрэек, ялавыя боты розных памераў, туфлі і жаночыя боцікі, рулоны нейкай матэрыі, мяшкі круп, цукру, солі, картонныя скрынкі з рыбнымі кансервамі, нямала чаго іншага. Лёшка падносіў усё гэта дабро, развязваў, распакоўваў, падаваў у рукі Нюрцы, а яна, на сваё меркаванне і густ, раскладвала, расстаўляла што на паліцы, што на прылавак, што хавала ў бакоўку.

Калі праз якую гадзіну трохі папарадкаваліся, нават падмялі, павесялелая Нюрка сказала:

— І пагрэцца не шкодзіла б: папрацавалі ж. А то чым я яшчэ аддзячу?.. Ёсць нядрэннае віно. Як?

— То давайце я куплю, і мы ў нас дома вып'ем,— ахвотна згадзіўся Лёшка.

— Ой, неяк жа няёмка. А што дома скажуць? Прывёў, нябось, некага, яшчэ і віно п'юць...

— Ну што вы?! — Лёшка ажно не скакаў ад радасці, яшчэ ніяк не даваў веры, што гэтая зграбная маладзіца, якую так нечакана ўпадабаў, згадзілася пайсці да іх. Ну, і што ж тут такога? Другая б нешта вымудроўвала б, хітрыла, а Нюрка, бач, не паглядзела, што ён і мурзаты, і зусім чужы, а вось і папрасіла памагчы, і шмат чаго расказала пра сябе.

Маці, калі Лёшка з Нюркай зайшлі ў хату, якраз таўкла ў чыгунку бульбу, рыхтавала вячэру. Смачна, востра пахла смажаным салам з цыбуляй. Вольга, убачыўшы на парозе незнаёмую маладзіцу, ды яшчэ так позна, неяк збянтэжылася, нават чамусьці пачырванела. Лёшка добра не пачуў, ці адказала яна, калі Нюрка прывіталася.

— Мама, гэта наша новая магазіншчыца,— каб выручыць трохі маці, не трымаць яе доўга ў няведанні, прамовіў Лёшка.— Ёй далёка ездзіць дадому, а на аўтобус не паспела...

— А Божачка, ну пэўна ж...— невядома што хацела сказаць Вольга.

Лёшка як не рассмяяўся, бо ўпершыню ўбачыў маці такой разгубленай.

Нюрка, на шчасце, нібы нічога і не заўважыла. Яна неяк па-свойску, быццам была тут дзесяткі разоў, распранула і павесіла на цвік ля вушака на кухні свой лёгкі для такой пары плашчык. Аднекуль выняла расчоску і паправіла валасы.

— То праходзьце ж у залу,— Вольга адчыніла дзверы ў чысты пакой.— Тамака цяплей, паліцца яшчэ грубка. Пагрэйцеся, во хутка і вячэра будзе.

Пакуль Лёшка мыўся на кухні, пераапранаўся ў чыстае, Вольга, завіхаючыся па гаспадарцы, крадком не-не дый кідала на яго вострыя цікаўныя позіркі, сэрцам чуючы, што нешта ў сыне не тое, нейкая незнаёмая загадкавасць з'явілася на твары, у вачах, хоць, бачылася, і быў ён стомлены, зняможаны за цэлы дзень.

Вячэралі на кухні. Вольга хацела накрыць абрус у зале, але Нюрка якраз выйшла папіць вады — вядро свежай вады стаяла на табурэтцы на кухні,— пасля, загаварыўшыся, як села там на шырокім, свежагабляваным услоне ля стала, дык ужо і ўпрасіла Вольгу ні аб чым не рупіцца, нічога асаблівага не мудраваць.

Выпілі трохі і віна. Яно было вельмі смачнае, у магазіне на прылаўку ніколі такое не стаяла. Лёшка падумаў, што, бадай, не горшае, як у тым мінскім рэстаране, дзе яны абедалі з Дзімкам.

Паслалі Нюрцы ў зале на нікеляваным ложку, слаславаным лепей, чым у бакоўцы,— новенькая ватняя коўдра, чыстая прасціна, дзве мяккія пуховыя падушкі. Апошні час тут спаў Дзімка, а як той паехаў у Мінск, ложак ні разачку і не разбіралі.

Вольга і Лёшка прымасціліся ў бакоўцы, на сваіх звычных пасцелях. Лёшка ля акна, Вольга на нізенькім, жалезным, Бог ведае якой даўнасці, лежаку ўпрытык да грубкі, дзе заўсёды цяплей.

Было пасля адзінаццаці — за вячэрай, размовай засядзеліся мо як ніколі позна. Але чамусьці сон не браў Вольгу, хоць другія дні, толькі кінецца, не чуючы цела, у пасцель, як вочы самі зліпаліся.

У агародчыку шоргаў голлем аб сцяну, бы хто драпаўся, стары, сухаваты ўжо вяз, дробненька дзынкала на кухні — ці то ад дажджу, ці то ад ветру — аконная шыба. Падумалася, што трэ было б закітаваць нанова на зіму ўсе вокны, ранейшая замазка няўдалая і амаль адлупчылася.

Лёшка, адчувалася, таксама не спаў, хоць і ляжаў ціха. Звычайна — Вольга ведала — ён злёгку, калі засынаў, пасопваў носам, а зараз стаіўся, як усё роўна яго і няма там. У зале, за дашчанай перагародкай, сцішана дыхала Нюрка. «Прыгожая»,— у думках адзначыла Вольга. Але хтосьці як бы шаптаў ёй: ці той Нюрка чалавек, які быў бы патрэбны Лёшку, вельмі сарамліваму, даверліваму, рахманаму? Яна ж, пэўна, збалавана мужчынскай увагай. І наогул невядома, як жыла дагэтуль. Ужо адно тое, што некалькі гадоў працавала ў Карэліі на лесараспрацоўках, ды яшчэ касірам на ўчастку, а там жа мужчын тых — процьма, гаварыла — каго абманеш? — само за сябе. Слава Богу, яна, Вольга, пажыла ўжо на свеце, трохі ўмее разбірацца ў людзях, а жанок, і маладых, і пажылых, ведае уга як. Наскрозь бачыць!

Яна была пераканана, што і Нюрка, хоць і сама, ніхто за язык не цягнуў, расказала пра сябе, пра маці, якая нядаўна памерла ад раку, усё ж нешта ўтойвала, недагаворвала, нейкая няўлоўная пячатка трывогі і разгубленасці не-не дый з'яўлялася ў яе на твары. Лёшка — той глядзеў на Нюрку зачаравана, верыў кожнаму яе слову, ніколечкі не ўмеў хаваць свае радасці.

Вольга ніяк не пазнавала старэйшага. Не раз думалася, што добра было б ажаніць яго, займець унукаў, на старасці год пацешыцца імі, ды і жаночая падмога ў доме, у гаспадарцы, зусім не зашкодзіла б. Ужо ж не тыя сілы, каб усё самой: і скаціну дагледзець, і ў агародзе даць рады, і зварыць, і спячы, і абмыць, абшыць,— хіба ўсё пералічыш, колькі кладзецца на яе плечы толькі па доме, не кажучы пра тое, што і ў калгасе не хочацца быць апошняй. Вось чаму яна часта засмучалася: Лёшка, нягледзячы, што ўжо далёка не маладзён, такі абыякавы і да вячорак, і да дзявок, хай і найлепшых. Не ў прыклад меншаму. У таго ажно скура гарыць..Той свайго не ўпусціць. Не. А Лёшка — дамасед дамаседам. Будзень гэта ці свята, калі ўсе гуляюць, весяляцца, а ён поркаўся б толькі дома, нешта рабіў, нешта майстраваў бы.

Вось чаму такой нечаканасцю было для яе, Вольгі, з'яўленне ў хаце гэтай вабнай маладзіцы, той бляск у вачах сына, якога раней ніколі не заўважала. І цяпер, у пасцелі, яна не магла не думаць, як жа ўсё абернецца далей. Ну, спадабалася яму, Лёшку, Нюрка. Гэта ўжо нічога не скажаш — відаць адразу. А яна як? Можа, у яе хто ёсць на прыкмеце? Пра гэта ж яна нічога не казала...

## 6

Лёшка ж з тае першае сустрэчы з Нюркай як ачмурэў. Ужо назаўтра, яшчэ Нюрка спала, усхапіўся разам з маці — дагэтуль якое на паўгадзінкі, але паднімаўся пазней,— прычыніў з кухні дзверы, цыкнуў нават, каб не шумела, калі яна, Вольга, незнарок бразнула вечкам каструлі. У маленькі чыгунок, толькі разгарэлася ў печы, паставіў грэць ваду, сказаў, што трэба ж пагаліцца, бо ўжо аброс шчэццем, хоць у буднія дні ён рэдка калі галіўся. Прымусіў маці, падахвоціўшыся сам, нацерці на тарцы бульбы, спячы дранікаў. Хай, маўляў, пакаштуе Нюрка, якія бываюць у іх смачныя дранікі.

Нюрка выйшла на кухню свежая, ружовашчокая, з трохі прыпухлымі пасля сну вуснамі, з яшчэ не ўходжанымі як мае быць валасамі — яны, як і ўчора, мякка, хораша, ажно Лёшку закарцела чамусьці дакрануцца да іх, пагладзіць, а то і запусціць пяцярню, спадалі на плечы. Нюрка далікатна і нібы вінавацячыся, што так моцна і доўга спала, прывіталася, спытала, як бы гэта памыцца.

Лёшка зачэрпнуў з вядра на табурэтцы конаўку халоднай вады і хацеў даліць з чыгунка трохі вару, але Нюрка рашуча запярэчыла:

— Не, што вы, я мыюся толькі халоднай.

— Ну, то я палью,— выклікаўся ў помач Лёшка.

Вольга ўгаварыла Нюрку не ісці мыцца на падворак, бо халодна і золка, а прынесла з сенцаў алюмініевы таз, зняла з табурэткі вядро з вадою і паставіла на яе таз.

— Во, цяперака ўмывайцеся,— сказала і падалася сама ў хлеў: там ужо вішчалі, просячы есці, свінні.

Нюрка складвала лодачкай далоні, Лёшка напагатове стаяў трохі збоку, і, як толькі «лодачка» навісала над тазам, акуратна, крый Божа каб не трапіла Нюрцы на світэр, ліў з конаўкі.

— Ву-у-ух, здорава,— плюхала сабе ваду ў твар Нюрка, гучна, як дзіця тое, фыркаючы і пырскаючыся.

— Мо падаць мыла? — не ведаў, як услужыць, што яшчэ прыемнае зрабіць для Нюркі, Лёшка.

Нюрка засмяялася:

— Ото ж і памочнік здагадлівы мне трапіўся! Калі ён мыла прапануе... Мо хоць пра ручнік не забудзеш?

Лёшка таксама гучна засмяяўся і хутчэй, адчуўшы, што і сапраўды даў прамашку, пачаў шукаць, чым выцерціся. Як на тое, ручнік, якім яны з маці карысталіся,

быў ужо досыць брудны, і Лёшка, цяпер ужо згараючы ад сораму, кінуўся ў залу, дзе стаяла шафа. Хоць бы там было што чыстае!

На шчасце, на паліцы для бялізны Бог ведае з якога часу ляжаў бялюткі льняны, з арнаментам і васількамі, ручнік.

— Ого! — здзівілася Нюрка, калі Лёшка кінуў ёй на плячо гэты даматканы цуд.— І не шкада? А маці што скажа?

На хвіліну якую сумеўшыся, Лёшка ўсё ж знайшоў патрэбныя словы:

— А маці скажа вось што: для добрага чалавека нічога не шкада, а тым болей для прыгожай жанчыны.

— От дзякую, ну і дзякую,— гарэзліва засмяялася Нюрка.— Прыемна чуць такое ад тваёй маці. А што мой кавалер думае?

— Які кавалер? — вырвалася ў Лёшкі. Ён тут жа спахапіўся, што з галавой выдаў сабе, але было позна.

— А той, які надта ж баіцца жанчын, асабліва прыгожых,— Нюрка весела бліснула вачыма.

Зайшла якраз маці, і Лёшка трохі пашкадаваў, што так цікава пачатае «высвятленне адносін» давядзецца адкласці. А мо і добра... Нюрка, як здалося Лёшку, падавала нейкую надзею, і цяпер трэба не схібіць, усё спакойна абмазгаваць, каб не зрабіць якое глупства, не выставіць сябе ў смешным выглядзе. З Нюркай — гэта не тое, што з іхнімі вясковымі дзяўчатамі: ніякай асаблівай дыпламатыі не трэба.

Пасля сняданку яны ішлі разам па вуліцы; і Лёшку было і прыемна, што вось поруч з ім такая гожая, акуратная маладзіца, і трошкі няёмка за свой несамавіты, павэдлуг з Нюркай, выгляд. Ён ведаў, што бабам будзе сёння гаворкі — нябось, усё бачаць, хоць ні адной на вуліцы яшчэ і не сустрэў. Пэўна, і матку сёння на бураках у полі будуць даймаць пытаннямі: як, што, чаго? Іх жа не кармі, не паі, а дай толькі памянціць уволю языкамі...

Яшчэ не даходзячы да магазіна, хлопец ліхаманкава думаў: што сказаць Нюрцы, як жа зноў пабачыцца? У яго нібы язык адняло, ён не ведаў, як сябе трымаць, як паводзіць. Якоесьці насланнё найшло, не інакш. Гэта ж ніколі ў такім стане не быў і не думаў, што будзе. Ніколі дагэтуль, ці то ў кампаніі дзе, ці то сам-насам з бабамі, дзяўчатамі — усялякае надаралася! — ён не быў такой авечкай, не лез у кішэню па слова. А зараз...

Выручыла Нюрка, якая нібы глядзела ў яго душу, чытала ягоныя думкі. Ужо ля саменькага магазіна, як Лёшку пайсці далей, яна затрымалася, кінула на яго хуткі цікаўны погляд і з малапрыхаванай смяшынкай у вачах сказала:

— Дык мне ж зноў к вечару патрэбна помач... Калі не затрымаешся на рабоце, загляні: сёння зноў абяцалі падкінуць тое-сёе з тавару.

— Угу,— абрадаваўся Лёшка.— Зайду.

Ён завярнуў на сцяжынку на поплаве і ўжо напрасткі, не чуючы ад радасці ног, ледзь стрымліваючы сябе, каб не пусціцца подбегам, пашыбаваў на машынны двор.

Так яно ўсё ў іх пачалося...

Хто ж тады мог сказаць, мог бачыць наперад, які будзе канец?.. Адзін Бог зараз ведае, колькі перадумала, чаго нацярпелася яна, Вольга, пакуль трохі прайшоў у Лёшкі чад, пакуль акрыяў ад таго ўдару, каторы, нібы абухом па галаве, аглушыў яго, адняў мову, абрынуўся на хлопца нечакана і жорстка.

Гэта сталася трохі пазней, а тады Лёшка яшчэ нічога не ведаў.

Неяк, вярнуўшыся з работы, ён сказаў:

— Мама, Нюра просіцца да нас на кватэру. Зімою, ды і цяпер, увосень, на аўтобус сама ведаеш, якая надзея...

Што яна магла тады сказаць сыну? Сказаць, што не пусціць, бо людзі будуць чортведама што плявузгаць. А каму гэта хочацца? І так, во, ужо галаву адурылі... Падзяліцца з ім сваімі сумненнямі, сваёй насцярогаю? Сказаць, каб не ішоў на злом галавы, пачакаў трохі, разабраўся? Давесці, што прыгажосць яшчэ далёка не ўсё, каб жыць у радасці і згодзе?

Яна нічога гэтага не сказала. Бачыла ўжо, што яго лепей зараз не чапаць, што нічым яго зараз не перакачаеш.

На другі дзень, толькі сцямнела, яны зноў прыйшлі ўдваіх. Яна была з сумачкай, Лёшка трымаў у руцэ чорны, на маланцы, ладны чамаданчык.

— А вось і мы,— гукнуў Лёшка яшчэ з парога.

Вольга, бачачы сына такога ўзрушанага, такога здаволенага, сама неяк адразу абмякла, скінула напружанне, якое гнятліва даймала яе апошнія дні. Ну, чаго яна нагатняе на сябе нейкія страхі, малюе будучыню сына такімі змрочнымі фарбамі? Якія падставы ў яе нядобра думаць

пра Нюрку? Сын вясёлы, шчаслівы — дык чаго ёй кіснуць, забіваць галаву рознай дурнотай? Іх дзела маладое, яны самі разбяруцца, што да чаго. А на людзей таксама ці варта аглядвацца. Іншы нават з зайздрасці можа чаўпці немаведама што. А мо Нюрцы і сапраўды абрыдлі ўсе яе бадзянні па свеце і хочацца нейкага ціхага прыстанку, спакойнага, надзейнага поруч чалавека? Хіба толькі апошняя дурніца не можа не разгледзець у Лёшку таго, што так патрэбна ў сямейным жыцці кожнай жанчыне: пяшчотнасць, клапатлівасць, адданасць, гаспадарлівасць. Гэты ветрагонам не будзе. Не. Жыццё многаму яго навучыла, пакінула на ім свае рубцы...

Такія думкі ў якое імгненне суцешылі яе, і яна, ужо з непадробнай шчырасцю і гасціннасцю, прывеціла Нюрку, вызваліла ў шафе куточак, дзе тая магла б пакласці ці павесіць што з апраткі, сказала, каб не саромелася, адчувала сябе як дома.

У той вечар, узбіўшыся ўсе ўтраіх на шырокую, досыць цёплую яшчэ печ, яны многа гулялі ў карты, смяяліся. Нюрка басанож, у лёгкім квяцістым сарафанчыку, расчырванелая ад цяпла, усё пацвельвалася з Лёшкі: дурняў ён нахапаў болей за ўсіх. Вольга ведала — Лёшка ў карты гуляць умее, умее запамінаць, хто чым б'е, хто як ходзіць, і таму зараз здзівілася, што, пры ўсім, здаецца, старанні, у яго нічога не выходзіла. А мо ён знарок паддаецца, каб дагадзіць Нюрцы? Хто ж яго ведае.

Спаць Вольга пайшла першай, пакінуўшы іх дагульваць адных. Яна бачыла — вось жа хлопец: што на душы, тое і на твары! — як Лёшка абрадаваўся, хоць і стараўся не паказаць віду, утрапёна глядзеў у карты.

Колькі яны яшчэ гулялі і калі ляглі, Вольга ўжо не чула — сон гэты раз быў наўздзіў моцны і спакойны.

А пасля, тыдні якія праз тры, калі Лёшка, ззяючы ад шчасця, сам прызнаўся маці, што вельмі ўпадабаў Нюрку, не можа без яе жыць, што Нюрка згаджаецца, хай вось толькі міне год пасля смерці яе маці, запісацца з ім, стаць яго жонкай, калі пра будучае вяселле дружна загаварылі ў вёсцы, усё нечакана абарвалася, даўшы козыр зласліўцам колькі хочаш сыпаць солі на Лёшкаву рану.

...Таго разу Нюрка раней зачыніла магазін. Вольга ўгаварыла яе — якраз быў жаночы дзень — пайсці разам у калгасную лазню памыцца. Лёшка нешта бавіўся на

рабоце, і Вольга з мінуты на мінуту чакала яго, бо не кінеш жа запаленую грубку без нагляду.

У гэты час на вуліцы завуркатала машына, ляпнулі дзверцы, і Вольга падумала, што, не інакш, Лёшку нехта падкінуў да саменькай хаты — такое было не раз. Але ўжо па кроках і ў двары, і ў сенцах — цяжкіх, няўклюдных — яна зразумела сваю памылку: сын так ніколі не хадзіў. З сенцаў пачуліся — ці мо падалося? — грубыя, брыдкія мацюкі, яна сама, не чакаючы, піхнула насцеж дзверы, каб хутчэй глянуць, хто ж гэта такі, набраўшыся, бы гразі, прэцца, ломіцца да іх.

Зыркае святло з кухні выхапіла дзябёлага мардатага дзецюка ў расхрыстанай замшавай куртцы, у вузенькіх, дудачкай, трохі караткаватых штанах, з непакрытай галавой, з якой спадала доўгая рыжая грыва. Ён спыніўся ў сенцах што ўкопаны, быццам не сам прыйшоў, быццам прынёс яго хто, гоцнуў, як куль саломы, на гэта месца і наказаў стаяць не варухнуўшыся.

— Вам чаго? — не вытрывала, першая спытала Вольга, адчуваючы, як расце, шырэе не ўсвядомленая яшчэ трывога ў сэрцы, як здрадліва шэрхнуць, дранцвеюць ногі.

Дзяцюк абыякава слізгануў па ёй позіркам і раптам востра, утрапёна, перасмыкнуўшы сківіцамі, кінуў яго некуды ўбок. Вольга, ловячы гэты позірк, павярнула галаву і ўбачыла ля мыцельніка спалатнелую Нюрку, якая мыляла губамі, сілячыся нешта сказаць, але нічога ў яе не выходзіла. Усё ж з грудзей яе вырваўся кволы, сіплы не то стогн, не то крык:

— Ты?!

Мардаты, не сыходзячы з месца, пазыбаўся трохі туд-сюд, цыркнуў пад ногі слінай і працадзіў:

— Думала не знайду, с-с-сука? Жывога пахавала?! Чысценькай схацела быць?.. Кватэры адраклася? — Ён зноў павёў сківіцай і коратка, як усё роўна чыркнуў брытвай, загадаў: — Збірайся!

— Гэта ж чаго прычапіўся да чалавека? — апамяталася трохі Вольга.— Чаго бельмы вылупіў? Думаеш, спалохалася, дрыжу? Вось як вазьму зараз палена...— яна сапраўды ступіла да печы, дзе на падлозе ляжала, падрыхтаваная на заўтра, бярэмя бярозавых дроў.

Але мардаты яе астудзіў:

— Не квакай, карга. А то бэбухі выпушчу. Мне што плюнуць...

— Вольга Адамаўна, не чапайце яго,— залямантавала Нюрка.— Вы яго не ведаеце.

— Во-во,— нахабна ўхмыльнуўся дзяцюк.— Яна ведае... Ну, доўга яшчэ чакаць?! Жыва хапай свае мэтлахі!

Ён ступіў у кухню і ля парога грузна бухнуўся на нізкі ўслончык, на якім абуваліся.

Нюрка, бязвольна апусціўшы рукі, не сказаўшы больш ні слова, падалася ў пярэдні пакой. Чуваць было, як з-пад ложка яна выцягнула чамаданчык, пачала кідаць туды спачатку тое, што ляжала на падаконніку і ля вазона на стале: мыльніцу, зубную шчотку, расчоскі, бутэлечкі з духамі, крэм, затым рыпнула шафай — відаць, здымала з вешалкі адзежу. «Божачка,— роспачна думала Вольга,— што ж гэта такое, што ж гэта творыцца! Хоць бы скарэй Лёшка прыйшоў ці хто з суседзяў заглянуў. Нешта ж трэба рабіць, бараніць чалавека. Хто гэты мардаты і чаго прычапіўся да дзяўчыны?.. Што яму ад яе трэба! Няйнакш, бандзюга нейкі... Такому і матку родную забіць — сапраўды як раз плюнуць...»

Яна хацела шмыгнуць на двор, каб паклікаць каго, але ў гэты момант з залы выйшла Нюрка, ужо апранутая, з чамаданчыкам у руцэ, нейкая спустошана-абыякавая, з блеклым тварам, з запалымі, акурат пасля цяжкай хваробы, вачамі.

— На, нясі,— кінула яна чамаданчык на калені дзецюку і, хвіліну аддыхаўшыся, амаль ужо істэрычна крыкнула: — Ну, чаго расселся ў чужой хаце! Зямля б цябе не насіла, брыдота, як ты на галаву маю навязаўся...

Мардаты, надзіва, адразу ўсхапіўся на ногі і паслухмяна ступіў у сенцы, але на вуліцу не пайшоў, чакаў Нюрку там.

Вольга ўсё яшчэ спадзявалася, што гэта насланнё зараз мінецца, што гэта нейкая недарэчнасць, непаразуменне, і вось зараз чужак пойдзе, згіне з вачэй, Нюрка распранецца, яны дачакаюцца Лёшку, той будзе ў грубцы рыхтаваць ім вячэру, а яны з Нюркай пададуцца ў лазню, сёння ж добрая, казалі, лазня...

— Даруйце,— данесліся як скрозь сон словы Нюркі.— Такі ўжо, відаць, мой лёс: не было і не будзе мне шчасця...

Праз хвіліну зноў ляпнулі дзверцы легкавіка (з ганка Вольга згледзела, што легкавік быў з шашачкамі, за рулём нехта сядзеў), узроў, пыхнуўшы ззаду дымком, матор, і машына адразу, брызнуўшы з-пад колаў гразюкаю, ірванула з месца...

## 7

— Мама, дык ты мо спі, мо выключыць святло,— збіраючыся ўжо выходзіць з хаты, спытаў Лёшка.

— Хай пабудзе, сынок. Сёння ж — ведама, перад святам — не ўсе лягуць рана. Можа, яшчэ Уляна загляне. Яе ж тут каструлька засталася. А ты ідзі, ідзі. Глянь, што там. Я, каб магла, даўно прыбегла б. Чуеш жа, якая музыка. Раскажаш пасля, як там Макарчукова Аня... Хай Бог дае ёй шчасця. Добрая дзеўка. І рабацяшчая.

Музыка і сапраўды, калі прыцішэла, трохі знемаглася за доўгі дзень вёска, зараз чуваць была яшчэ выразней, яшчэ больш кранала і трывожыла, ажно даўка падкочваўся камяк пад горла, нешта цёплае, даўно забытае расло, шырэла ў грудзях, і ўжо не ставала сіл не адгукнуцца на яе шчымліва-зманлівы покліч.

Лёшка, перш чым ісці туды, дзе ўсе, дзе вяселле і танцы, сеў на лаўку ля плота, не могучы адвесці вачэй ад поўні, якая раскашавала ў бяздонным, сёння без аднае хмурынкі, небе. Мяккая, прыемная парнасць ішла ад зямлі, пахла карой, свежай, кволай яшчэ лістотай на ліпе, пад якой тулілася лаўка, да гэтага паху прымешвалася і нешта больш густое, цягучае, што бывае, бадай, толькі вясною. Было невыказна хораша вось так сядзець, ні пра што не дбаць, ні аб чым не трывожыцца, адмежавацца ад усяго мінулага і сённяшняга, і толькі, зліўшыся ў адно з прыродай, слухаць і запамінаць тое, што дадзена табе мо як найвялікшы дарунак у жыцці.

Зачараваны ноччу, музыкай, поўняй, якая зараз віселa ледзь не над саменькай галавой, Лёшка схамянуўся, калі адчуў, што добра такі ахаладаў, невядома колькі седзячы вось так, нерухома, на адным месцы. Ён падняўся, памахаў трохі рукамі, і праз колькі мінут стала зноў цёпла, цела налілося бадзёрай пругкасцю.

Па вуліцы, хістаючыся туд-сюд, нехта плёўся. Лёшка прыгледзеўся і пазнаў Петрыка Лосева.

— Здароў,— выйшаў Лёшка са свайго зацененага зацішку на сярэдзіну вуліцы, і калі Петрык параўняўся, ляпнуў яго па плячы.

Петрык не ўстаяў на нагах і, каб Лёшка не схапіў яго за крысо пінжака, гоцнуўся б на дарогу.

— Т-т-ты што?! — ледзь варочаючы языком, працадзіў Петрык і, раптам напружыўшыся, выкінуў наперад кулак і пацэліў, праўда, нямоцна, Лёшку ў падбародак.

— Не дуры, Петрык,— Лёшка абедуч схапіў яго, прыўзняў, патрымаў трохі ў паветры і далікатна, як усё роўна дзіцёнка, паставіў на зямлю.

— А-а, Ляксей,— Петрык кісла усміхнуўся.— А я думаў, гад які. Расквасіў бы яму нюхаўку...

— Ну, ужо ж так і расквасіў бы. Храбры заяц... Скажы лепей, дзе так насцёбаўся?

Замест адказу Петрык нечакана хліпнуў носам:

— Усе яны... аднакія...

— Хто? Ты пра што кажаш?

— За дурня лічыш, га, за дурня? — набычыўся Петрык.— Далікатнічаеш? А сам забыўся, які хадзіў, калі гэтая... як яе... Нюрка, магазіншчыца твая, пяткі паказала? — Петрык хвіліну памаўчаў, зноў хліпнуў носам і яшчэ раз заключыў: — Усе яны аднакія, усе!

Толькі цяпер да Лёшкі дайшло, з чаго Петрык сёння такі, і, хоць той, напомніўшы пра Нюрку, развярэдзіў яго рану, усё ж ледзь стрымаўся, каб на ўсю вуліцу не рассмяяцца. Усплыло на памяць, як мужчыны на машынным двары пацвельваліся з Петрыка, што гэтулькі перавёў паперы за два гады службы ў арміі, гэтак папасушыў мазгі, пішучы Макарчуковай Ані ліст за лістом, і ў кожным — усё пра любоў, а яна, Аня, дзеўка, як і ўсе дзеўкі: мала, маўляў, хто што чаўпе на паперы, папера ж усё сцерпіць, а вось калі трапіўся пад руку ладны хлопец, прапануе распісацца — чхаць на ўсе охі ды ахі, на ўсю тваю папяровую любоў. Лепей сініцу ў руцэ, чымся жураўля ў небе...

Помніцца, мужчыны ажно курчыліся на зямлі ад кепікаў, кожны высільваўся як мага лаўчэй укалоць Петрыка, і, хоць у гэтых іхніх кепіках і ўколах не было злоснага намеру — от, абы толькі парагатаць,— Лёшка, гледзячы на разгубленага, зніякавелага Петрыка, падумаў, якія людзі, нават і неблагія ўвогуле, бываюць часам жорсткія. Хіба ж і яго абышлі ўвагай тады, як усё гэтак недарэчна атрымалася з Нюркай? Ого, з паўгода мо, калі не болей, толькі і скалілі зубы, выдумлялі чортведама што: быццам Нюрка самая апошняя б..., была недзе на Поўначы, звязалася з бандытамі і па іх заданні ўцерлася прадаўшчыцай, дзе яе ніхто не ведае, каб пасля, пры зручным выпадку, хапянуць кругленькую суму і зматаць вудачкі. Алёшка спатрэбіўся ёй як шырма, за каторай можна часова прытаіцца: і жыць ёсць дзе, і хлопец свежанькі ды яшчэ такі цнатлівы, усё ж якая ні ёсць, а ўцеха бабе...

Лёшка тады, нягледзячы што смылела душа і гняла крыўда на гэтых балбатуноў, маўчаў і сам пасміхаўся, бо добра ведаў: варта толькі завесціся, агрызнуцца, пачаць даказваць што-небудзь, як зусім зачаўпуць, не дадуць продыху.

Тому двух- ці трохмесячнай даўнасці пацвельванню з Петрыка Лёшка не надаў асаблівага значэння: думаў, што мужчыны ад няма чаго рабіць прычапіліся да хлопца, прыпісалі яму Макарчукову Аню. Аказваецца ж, не. Відаць, і праўда нейкія надзеі меў Петрык на Аню, нешта ж між імі было, калі ён зараз вось так, не тоячыся, пакутуе. Ці мо толькі сп'яна даў волю сваім пачуццям?

— Нічога, браце, нічога,— усё, што толькі і мог сказаць у гэтым выпадку, сказаў Лёшка.— Будзе ж некалі і на нашай вуліцы свята. А зараз пайшлі, глянем на тое вяселле.

Петрык пакорліва пайшоў побач.

Ля Макарчукоў тоўпілася як не ўся вёска. Нягледзячы на даволі позні час, тут аціралася, таўклася пад нагамі і дзятва. Ля плота, на лавах, лаўках і проста бёрнах, сядзелі, пільна цікавалі за ўсім пажылыя жанкі. Мужчыны групкамі стаялі трохі збоку, смалілі цыгаркі, гаварылі пра сяўбу, пагоду, палітыку,— адным словам, ім было пра што пагаварыць, сабраўшыся разам.

Макарчук зрабіў добра: папрасіў калгаснага электрыка Толіка Шмыгу, і той на слупе, побач з хатай, пачапіў дзве лямпачкі-дзвюхсоткі. Святла зараз хапала і на падворак, і на выган ля хаты, дзе моладзь пад музыку зацята таптала зямлю. А самі музыкі, відаць, ужо добра падвесялелыя, задобраныя гаспадаром, стараліся яшчэ лепей, чым напачатку: не давалі і хвіліны пярэдыху ні сабе, ні танцорам.

— Ай хараша ж граюць, ну і хараша,— не-не дый уздыхаў хто-небудзь з жанок.— Здэцца, сама пайшла б у скокі, ногі так і свярбяць.

— А чаго ж, давай пакажы, што і мы шчэ на нешта здатныя,— рашуча выпіхалі наперад тую, што ўздыхала, іншыя бабы.— Глядзі ж, во, як Клёцка шчыруе...

З Сонькі Лазінскай, па мянушцы «Клёцка»,— нехта лоўка прыклеіў ёй гэтую мянушку за нос, які і праўда нагадвае клёцку,— смяяліся ўсе. Не дурная ж увогуле баба, а вось як вып'е, дык зусім мазгі не вараць. Хлапчукі-падшыванцы нават дражняць яе: «У нашай Клёцкі не хапае клёпкі».

Сонька сёння ўжо к вечару недзе добра прычасцілася, кінула-рынула на свайго нямоглага, сівога прымака Болеся ўсю гаспадарку, сама ж, як была днём у гумовіках, з налепленым на іх, закарэлым гноем, у няўклюднай, не па плячы жакетцы, так, нават не пераапрануўшыся ў што лепшае, і прыперлася на падворак да Макарчукоў. А калі пачаліся танцы, ніводнага з іх не прапускала, ушывалася ў цесны гурт маладых хлопцаў і дзяўчат і, нягледзячы, што на яе паказвалі пальцам, стараніліся, без пары, адна, як не да самага поту адбівала сваімі гумовікамі няхітры такт.

Лёшка, на хвіліну прыпыніўшыся, пaздароўкаўшыся з хлопцамі, упусціў з вока Петрыка і забаяўся, каб ён часам што-небудзь не адмачыў. Ад яго зараз можна чакаць усяго. Таму, не затрымаўшыся ў кампаніі, Лёшка ў пошуках Петрыка неўпрыкмет зайшоў на другі бок хаты, у зацененае і ад месяца, і ад лямпачак месца, каб праз адчыненае акно, праўда, захінутае цюлевай фіранкай, зазірнуць усярэдзіну, адкуль чулася жвавая, падагрэтая чаркай, гамана, раз-пораз неслася настойлівае гарэзнае «Го-ор-ка-а-а!».

Лёшка адразу прыкмеціў ля другога акна, бліжэй да вугла, некага яшчэ. Хто ж гэта такі? Ціха падышоў бліжэй. Ну, вядома, ён, Петрык. Вось жа дзівак чалавек!.. Што ўжо можна змяніць, што паправіць?.. Прыліп тварам да шыбы — і ні з месца.

Лёшка стаў поруч. Адсюль і праўда добра бачны сталы з гасцямі-вясельнікамі, покут з другога, ад двара, боку, а ў тым покуце расчырванелая, у белым вэлюме, сёння яшчэ больш гожая, Аня.

— Слухай, пайшлі адсюль,— шапнуў Лёшка.— Ну, нельга ж так...

— Ідзі, Ляксей, ідзі,— Петрык на хвіліну адарваўся ад акна, умольна, ужо зусім цвяроза глянуў на Лёшку, і той пераканаўся, што хлопец нічога благога не ўчыніць.— Я яшчэ трошкі пагляджу...

Лёшка і не здагадваўся нават, што Петрык, такі чуллі-ва-ўражлівы, так моцна можа кахаць і балюча перажываць няўдачу гэтага кахання. Падумалася, што варта было б зблізіцца з хлопцам, бо ў іх характарах ёсць, бадай, нешта аднолькавае, што магло б, нягледзячы на нейкую розніцу ў гадах, перарасці і ў сяброўства. А сябра яму, Лёшку, вельмі патрэбны. Неяк так сталася, што не завёў ён сабе сапраўднага сябрука. У арміі быў — Мішка Бар-

коў з-пад Харкава. Во і зараз, хоць пасля службы мінула нямала гадоў, не-не ды і шлюць адзін аднаму паштоўкі. Але час і адлегласць, што б там ні казалі, прыглушаюць ранейшыя пачуцці.

З гэткімі думкамі ён усё ж пакінуў Петрыка аднаго — не трэба зараз лезці чалавеку ў душу, сам тое добра адчуў. Зноў пайшоў у кола, дзе танцавалі, пашукаў вачыма Дзімку. Аднак таго нідзе не было бачна. Не паспеў трохі яшчэ агледзецца, як падскочыла Валя Белая, сакаўная, паўнагрудая маладайка, гулліва засакатала:

— От і мне кавалер знайшоўся, будзе з кім павесяліцца, а то ўсіх ужо расхапалі.

— Ну, табе, Валя, заўсёды хопіць.— Лёшка ўсміхнуўся, давольны, што яго прыкмецілі, звярнулі ўвагу, аднак звязвацца з Валяй не вельмі хацелася. Баяўся злых языкоў.

Пра Валю многія гаварылі нядобрае. Валя працавала ў ваенным гарадку, за дваццаць кіламетраў адсюль, афіцыянткай у афіцэрскай сталоўцы. Там недзе і пакойчык знімала. Да бацькоў, якія гадавалі яе байструка, прыгожага, шустрага хлапчука гадоў чатырох-пяці, наведвалася толькі ў выхадныя дні або на святы.

— Пайшлі от танцаваць.— Валя рашуча ўхапіла Лёшку за руку, і ён у думках адзначыў, якая мяккая, гладкая і гарачая яе рука. Адчуў: у скроні, у галаву, дурманячы, ударыла шалёная кроў. Ледзь стрымліваючы сябе, каб не выдаць хвалявання, спытаў:

— А што танцуюць?

— Вось табе і на! Нібы на свет толькі вылузаўся... Ці ты ніколі факстрота не танцаваў?

— Хіба ж гэта факстрот? Гэта ж крыўлянне нейкае, а не факстрот.

— Ой, памру з цябе, далібог, памру,— Валя закаціла густа падмаляваныя вочы, паказваючы, як яна збіраецца «паміраць».— Табе адно крылы, і ты б анёлам стаў. Якія ж вы, браты, розныя! Дзімка, той на хаду кабыле хвост прышчэміць. Бачыў бы, як ён тут нядаўна выкаблучваўся, гэты ж самы факстрот па-гарадскому паказваў танцаваць... Усе раты паразяўлялі.

— А дзе ён зараз? — пацікавіўся Лёшка.

— Хто? Дзімка? З Аксанай недзе пайшлі. Мо да яе. Яна ж адна-аднюсенькая сёння. Бацька з маці ў госці паехалі... Во лафа дзеўцы!

Валя з хітрай усмешачкай зірнула на Лёшку, чакаючы,

што ён скажа, як зрэагуе на яе словы. Аднак хлопец пастараўся не падаць выгляду, што яго кальнула, пакінула на сэрцы непрыемны астой гаворка пра Дзімку.

Адзін з музыкаў, той, што біў у барабан, танклявым, нейкім скрыпучым голасам выкрыкнуў жаночае танга.

— Во, цяпер не скажаш, што гэта такое і з чым яго ядуць,— Валя зноў злавіла Лёшкаву руку і, як толькі спакойная, пяшчотна-сцішаная мелодыя паплыла наўкола, гарэзліва, але зграбна прыкленчыла і запрасіла на танец. «Ну, чортам падшытая баба»,— нязлосна, з ноткай захаплення і адначасна страху падумаў Лёшка.

Валя не танцавала, а ажно, здэцца, млела. Прыляпіўшыся да хлопца, паклаўшы абедзве рукі яму на плечы, яна вяла перастаўляла ногі, акурат яны ў яе адзервянелі. Лёшка паспрабаваў вадзіць яе трошкі шпарчэй, але Валя не далася. Шчыра прызнацца, Лёшку і самому прыемна было ў адбымках, можна сказаць, такой вось спакуслівай маладзіцы ледзь-ледзь валюхацца, аднак у голаў усё ж цюкала: за табой жа сочаць дзесяткі цікаўных вачэй, недзе вунь ужо крывяцца ў хітраватай ухмылцы вусны: во дзеўка дык дзеўка, сама на шыю вісне, а той жа, большы Вольчын — чым ён лепшы за другіх? — бачыце, ужо і раскіс, сам улез у лоўка раскінутыя цянёты, ой жа ўлез! Ад такой заразы нялё-ё-гка выблытацца...

Лёшка зараз прыкідваў, якую гэта пасля танца выдумаць прычыну, каб пакінуць Валю адну. Успомніў пра Петрыка. Дзе ён? Няўжо яшчэ стаіць пад акном, назаўжды развітваецца са сваёй каханай?.. Трэ было б пашукаць яго, прайсціся разам, мо нават заскочыць да іх і ўзяць па чарцы. Свята ж, як-ніяк, заўтра...

Валю, аднак, як хто раптоўна падмяніў. Яна зняла рукі з Лёшкавых плячэй, трохі адхінулася ад яго, зрабіла вочкі-шчылінкі, халадна і жорстка кінула проста ў твар:

— Каціся ты, боўдзіла, ведаеш куды... Думаеш, дурніца апошняя, не здагадваюся, чаму мазгі сушыш, чаго насцярожана аглядваешся? Думаеш, калі дзіцёнка маю, дык ужо і кожнаму г... кланяцца стану, каб пашкадаваў, прыгалубіў, не даў прапасці адной... Цьфу!..

— Ды не-е...— Лёшка нічога больш не мог ды і не паспеў сказаць у апраўданне.

Валя, хоць і не скончылася яшчэ танга, адпіхнула яго і пайшла прэч. Разгублены і агламошаны, хлопец не ведаў напачатку, што і рабіць: ці то дагнаць Валю, спытаць, якая яе муха ўкусіла, ці то плюнуць на гэты яе выбрык.

— Што, Ляксей, расцуглялася кабылка, брыкаецца?— нахабна гігікнуў проста ў вуха Міцька Грабар. Азызлы, вечна пад градусамі, ён якраз ішоў у пары з куртатай, мо на паўметра ніжэйшай за Міцьку, дзеўкай-векавухай Анцяй. На Міцькавы словы яна ахвотненька азвалася едкім, удушлівым смяшком.— А ты дагані, дагані. Нідзе не дзенецца. Пабрыкаецца для прыліку, а пасля...— Ён зноў, яшчэ грамчэй, гыгыкнуў, давольны, відаць, сваёй дасціпнасцю.

Лёшка, каб дапячы Грабару, хацеў назваць яго «кілуном», але неяк стрымаўся, рашыў не звязвацца, бо ведаў, што той на такую ганьбу ажно шалеў, мог, выхапіўшы з плота кол, з пенай на губах гнацца за чалавекам хоць кіламетр, хоць два, пакуль з ног не звальваўся. Толькі тады, паляжаўшы з паўгадзіны, адыходзіў, выветрываліся з галавы хмель, дурасць, і ўжо нармальным чалавекам плёўся назад.

З сапсаваным настроем пакінуў Лёшка гулянне, пайшоў, хоць і не хацелася яшчэ спаць, дадому.

Каб не пабудзіць, не патрывожыць маці, пастараўся не грукаць, клямку на вушка апусціў амаль нячутна. У кухні, перш чым намацаць і пстрыкнуць выключальнікам, прычыніў на хату дзверы. Дзімкі, па ўсім відаць, таксама не было дома. Цікава, калі ж той прыпрэцца? Чамусьці закарцела залезці на печ, трохі пасядзець. Ён не замёрз, не, але ногі не мяшала б на чаране прапякчы, бо апошні час — хоць бы раматус не ўбіўся? — нешта нылі косці.

Печ, дармо што палілася зранку, лічы, хутка і суткі цэлыя мінуць, была досыць цёплая, а на сярэдзіне, пад рыззём,— па-сапраўднаму гарачая. Цэгла тут гладкая, вышмальцаваная да бляску, з шастка ля коміна звешваліся два ладнаватыя вянкі цыбулі, гаркава пахлі ўторкнутыя ў шчыліны бэлек пучкі якойсьці травы, яшчэ летам назбіранай і насушанай маці, тады, калі яна пачувала добра і гадаць не гадала, што хутка так безнадзейна зляжа. Было чамусьці як ніколі самотна. З чаго ўсё гэта, ён і сам не мог даўмецца. Ведаў толькі, што не з-за Валі і не з-за Грабара такі сёння настрой. Нешта зрушылася ў ягонай душы. Спакваля падкрадвалася нейкая неўсвядомленая трывога. Мо віною таму музыка? Яна і зараз, у начной цішыні, праз адчыненую фортачку чулася чыста і хораша, брала ў палон сэрца, дзіўным суладдзем гукаў пераварочвала ўсё ўнутры, будзіла нязнаныя, нязведаныя дагэтуль думкі і пачуцці...

Падумалася, што трэба ўсё ж ачалавечвацца. Маці, пасля выпадку з Нюркай, ужо нічога яму не кажа, каб не зрабіць балюча, але ж вочы яе хіба не выдаюць, як прагне яна пабачыць у хаце нявестку. Асабліва зараз, калі сама стала нямоглай, а гаспадарка так патрабуе жаночых рук. Можна яе, вядома, зразумець. Ды і самому стала як ніколі цяжка, узваліўшы ўсё на адны плечы. Ці доўга так выцягнеш? А калі б удваіх, ды яшчэ з любым чалавекам... Няўжо ўсё ж давядзецца з Адамейкам ехаць нешта як бы ў сваты ў тыя яго Карачуны, да тае хваленай-перахваленай ім белашвачкі, нейкай далёкай яго родзічкі, якая больш чым год назад аўдавела, мала і пасмакаваўшы сямейнага жыцця? Мужык яе, не ўмеючы плаваць, выехаў на возера з лодкі парыбачыць, невядома чаму перавярнуўся і патануў.

Адамейка яшчэ ўвосень, толькі маці забралі ў бальніцу, прабалабоніў яму ўсе вушы: маўляў, лепшай жонкі не знойдзеш — і шыць умее, і гатаваць, і іншай ніякай работы не цураецца, і добрая, і ласкавая, і тварам хоць куды. І чаго яшчэ ён толькі ёй не прыпісваў!..

Лёшка напачатку пасмейваўся, лічыў словы брыгадзіра пустой балбатнёй, пасля ўсё часцей і часцей пачало тачыць: а чаму і дапраўды не завітаць як-небудзь у Карачуны, глянуць усё ж, што там за краля такая, якой і цаны нямашака?..

Аблашчаны цяплом і цішынёй, ён не прыкмеціў, як задрамаў. Прачнуўся толькі тады, калі прыйшоў Дзімка. Лёшка спрасонку не адразу і ўцяміў, дзе ён, што з ім — вытарашчанымі вачыма вадзіў туд-сюд, пасля ўталопіўся на Дзімку, як бы ўпершыню бачыў яго. Дзімка нягучна рагатнуў.

Лёшка нарэшце выйшаў з ачмурэння, глянуў на гадзіннік і сам заўсміхаўся:

— Ото ж і смачная печ! Даўно ўжо не валяўся.

— Можа, і мне трохі пагрэцца? — Дзімка выпіў кубак кіслага малака, зняў пінжак, разуўся і ў стракатых, нейкіх надта ж кідкіх шкарпэтках паставіў ногі на гарачае.

— Хіба ў Аксаны не нагрэўся?..

Дзімка чамусьці пачырванеў.

— А скуль ты ведаеш, што я з Аксанай быў?

— З кім жа табе яшчэ быць? Што, можа, прыелася ўжо? Глядзі, хлопец, Аксана не тая дзяўчына, з якой можна толькі ў бірулькі гуляць, мазгі ёй пудрыць.

— Ладна,— Дзімка перасмыкнуў плячыма, даючы

зразумець, што не трэба больш гаворкі на гэтую тэму.

Памаўчалі. Музыкі ўжо не было чуваць. Відаць, усе вясельнікі разышліся спаць, набірацца сіл на заўтра. Недзе лена і нязлосна, так, дзеля прыліку гаўкнуў раздругі сабака.

— Пара класціся,— зяўнуў Лёшка.— Неўзабаве і днець пачне.

— Лёшка, мне трэба...— памуляўся, заглядваючы ў вочы старэйшаму, Дзімка.

— Што, зноў грошы?

— Ага. І скуль ты ведаеш? Няйнакш, думкі чытаць можаш...— Дзімка хацеў надаць сваёй просьбе жартаўліва-вясёлы тон.

— «Скуль ты ведаеш, скуль ты ведаеш»,— перадражніў Лёшка.— Завёў, як шчарбатую пласцінку. Хіба мала таго, што кожны месяц пасылаю? Стыпендыю заваліў, дык шчэ дадаткова доіш і доіш. Пэўна ж, не галодны сядзіш. І апрануць ёсць што, не горай, як у другіх.

— Ну, Лё-ё-ёшка,— Дзімка напусціў на сябе жальбы,— ты ж зарабляеш, а я пасля, як скончу, колькі скажаш — аддам. Во, каб я так жыў!

— Цішэй ты трохі,— шыкнуў Лёшка.— Барані Бог маці пачуе. Яна ж усё думае, што ты там хутка прафесарам нос падатрэш, што з кніжак тых і не вылазіш. Ведала б, што і стыпендыі нават не заслужыў, не тое што...

— А праз каго? Праз каго? — не вытрываў, капрызна надзьмуўся Дзімка.— Усё твая нейкая прынцыповасць, твае дурныя выбрыкі. Узяў бы даведку з сельсавета, што бацька на вайне загінуў, у зямлі костачкі парыць, і як міленькія далі б стыпендыю. Не я першы, не я апошні... Дык ты ж упёрся, ажно закалаціўся ўвесь, каб я і на парог сельсавета не ступіў...

— І нечага. Сам умей за сябе адказваць...

— Во-во,— узвіўся Дзімка.— Я ж кажу, што табе як пад хвост солі хто сыпнуў. Была б тая паперка, не прыйшлося б у цябе клянчыць.

Лёшка прыклаў палец да губ, прыслухаўся і зноў папрасіў гаварыць цішэй.

— Думаеш,— палагоднеў ён,— тут грошы дармовыя з неба валяцца? Не ведаеш часам, як і латаць усе дзіркі. А цяпер, во, з маці бяда такая... Лякарствы трэба, і смачнейшага хацелася б ёй што прыкупіць... А тут хата пацякла, шыферу трэба дзе старацца, нанова перакрыць дах.

— Усёк, усёк,— меншы ўмольна глянуў на брата.— Але ж такую фартовую куртку пакінулі мне ў магазіне. Японскую. З маланкамі, паяском. Не прамакае. І, як пушынка, лёгкая-лёгкая. Век такой больш не дастану... Там адна знаёмая працуе...

— І чаго ж яна вартая?

— Што? Куртка? — Дзімка знарок цягнуў, каб брат «перагарэў», выказаўся, тады можна без рызыкі і агламошыць яго, назваць суму.

— Ну, не знаёмая ж твая, пэўна,— Лёшка засмяяўся.

Дзімка, радуючыся, што старэйшы не так ужо ўбіваецца, ахвотна падхапіў гэты смех. І ўсё ж, калі Дзімка мусіў назваць цану, Лёшка ажно за галаву хапіўся:

— Згарэла б яна, з курткаю той. Гэта ж падумаць — столькі загнуць! Дзе я грошы такія вазьму?

— Ну, Лёшка-а-а...— зноў заенчыў меншы.— Болей не буду прасіць... Пазыч у каго-небудзь. Табе ж дадуць. А я дзе там вазьму? Ого, і рубля ні ў кога не дапросішся.

— Ладна, пайшлі спаць,— прапанаваў Лёшка.— Галава ўжо сёння нічога не варыць. Там відно будзе...

## 8

Вольга не хацела падслухоўваць, што гаварылі між сабой сыны, ды само сабой так сталася.

Звечара, калі пайшоў Лёшка, заглянула яшчэ Уляна, прыхапіла каструльку, а пасля слова за слова — і не агледзеліся, як па радыё прабіла поўнач. Уляна пабегла дадому, а яна, крыху паляжаўшы, нечакана лёгка і моцна заснула. Нават не чула, чаго даўно не было, як вярнуліся хлопцы. Абудзілася ад таго, што кальнула нешта пад сэрца. Асцярожна, з дапамогай здаровай рукі і нагі, павярнулася трохі на бок. Стала лягчэй.

Дзімкаў смех, хоць і прыглушаны сцяной і прычыненымі на кухню дзвярыма, канчаткова выбіў яе са сну. Прыслухалася і здагадалася, што хлопцы на печы. Хацела паклікаць каторага, каб прынёс кубак халоднай вады — чамусьці сушыла ў горле, ці не ад той кроплі кагору, якую днём прыгубіла. Аднак спрэчка сыноў насцярожыла, прымусіла стаіцца, сцяць дыханне.

Пачутае пра Дзімку было для яе, Вольгі, нечаканасцю, якая болем і трывогай адгукнулася ў сэрцы. Яна думала, што ведае пра сыноў усё, да самай апошняй макулінкі.

Асабліва пра меншага. Лічы, жыццё хлопца прайшло ў яе на вачах. Няўжо ж за тры з хвосцікам гады, як з'ехаў з дому, ён так памяняўся? Ці мо яна сама ўпусціла што, не папярэдзіла, не адвяла тое нядобрае, што, нібы ліпучка, прыклеілася да яго і ніяк не хочаададрацца? Калі і якую зрабіла яна прамашку? І як зараз што паправіць у яе такім вось становішчы? А можа, страхі дарэмныя, мо яна ўсё перабольшвае?..

Хапіла галава, зноў нядобра кальнула пад лапаткай. Вольга чула, як хлопцы злезлі з печы, зусім побач, за нятоўстай дашчанай перагародкай моўчкі распрануліся, леглі ў свае пасцелі і хутка па-здароваму засаплі насамі. Яна таксама сілілася заснуць, бо ведала: раніцай будзе зусім разбітая, яе хваравіты выгляд устрывожыць сыноў, будуць дапытвацца, што з ёю, і свята будзе ўжо не свята.

...Тады, шмат-шмат гадоў назад, вось гэтак жа трывожыўся, дапытваўся, што з ёю сталася, Іван, яе Іван.

Ні час, ні ўсё тое, што звалілася пасля, ні нават цяперашняя яе хвароба не прыцьмілі памяць. Вольга здзівілася, як многаму здзіўляецца чалавек мо перад апошнім сваім жыццёвым парогам, як абвострана, кожнай клетачкай нерваў, чыста і ясна ўбачылася ёй мінулае, нават тое, што дасюль было затулена нейкай цьмянай плёнкай, а то і абрывалася чорным правалам.

Спачатку была радасць сустрэчы з Іванам, самым дарагім, самым любым чалавекам. Ужо глыбока ў лесе, калі мінула ўсялякая пагроза, яны, не саромеючыся, пры ўсіх цалаваліся, і ён, і яна ажно плакалі, не хацелі хаваць сваіх слёз. Іван, пасадзіўшы яе ў сані, ахінуўшы цёплым кажухом, трымаў адной рукой скрутачак з Лесікам, другой, такой роднай, шурпатай і цёплай, гладзіў яе шчокі. У гэтай гарачцы прытупілася трывога за Лесіка: думалася, што ўсё самае страшнае скончана і для яе, і для сынка, вось зараз трапяць куды-небудзь у цёплае, і яны, маці і бацька, ужо не дадуць прапасці свайму маленькаму...

Чага-чаго, а вось таго свайго дзікага, нечалавечага крыку, калі, пасля чатырох гадзін шалёнае гонкі па лесе, ужо ў лагеры, у партызанскай зямлянцы выявілася, што Лесік нежывы, яна ніколечкі не помніць. Пра гэта пазней, праз які месяц, расказаў Іван.

Спачатку, як хавалі Лесіка, хоць і прыглушыла, прыбіла яе гора, усё, здавалася абыдзецца добра. Яна сама

паказала непадалёк ад лагера месца для магілкі — невялікую круглую палянку, дзе густа раслі, цягнуліся ўгору бярозкі, а на самай сярэдзіне ўзвышаліся два пракаветныя дубы-волаты. Скрозь тоўстым белым пластам ляжаў снег. Але ўгадвалася, як ціха і зялёна будзе тут вясной, калі і бярозкі, і вось гэтыя дубы апрануцца ў новае ўбранне.

Лесіка паклалі не ў труну — не было якраз дошак, а ў глыбокія драўляныя начоўкі, якія пасля зверху забілі фанерай. Івана ўжо тады насцярожыў жончын выгляд, нейкі спустошана-абыякавы, тое, што ні аднае слязінкі нават не капнула з яе вачэй, быццам хавалі не іхняга сынка, а зусім чужое, невядомае дзіця...

Пасля яна злегла, не мела сіл болей стаяць на нагах. Шклянымі зрэнкамі зацята глядзела некуды далёка-далёка, не ела, не гаварыла і амаль нікога не пазнавала. Фельчар, што быў у атрадзе, стары, з бародкай чалавек, бяссільна разводзіў рукамі, не мог даць ніякае ні рады, ні парады. Яна схуднела, зжаўцела ў твары, засталіся скура ды косці. Іван дні і ночы праседжваў у зямлянцы ля яе палка. Камандзір атрада, шкадуючы Вольгу, пакуль што не даваў яму ніякіх заданняў.

Хто ведае, як яно было б далей, каб нехта не падказаў Івану звазіць жонку ў Ярцы, глухую лясную вёсачку ў некалькі ўсяго хат, што ў суседнім раёне, за паўсотні якіх кіламетраў ад іхняга лагера, да адзінокай, сагнутай у крук, але шустрай бабулі Агаты; яна, казалі, умела шаптаць і ўсе нервовыя хваробы як рукой здымала. Іван спачатку і слухаць не хацеў ні пра якіх шаптух, не верыў ім, але, прыбіты горам, выпрасіў каня і павозку, ухутаў жонку і ноччу павёз.

Агата, толькі паглядзеўшы на Вольгу пры блеклым хісткім святле газоўкі, прапанавала пакінуць хворую, прыехаць недзе праз тыдні тры, не раней.

Тыя тры тыдні хапіла Івану. Была цяжкая аперацыя — ушчэнт разбілі фашысцкі гарнізон, затым з групай хадзілі на жалезку, і толькі пасля гэтага задання ён змог, учарнелы ад напружання і думак пра жонку, выбрацца ў Ярцы.

Радасць перапоўніла яго, калі ўжо з вуліцы, праз шыбу ўбачыў Вольчын твар, пакруглелы, з добрымі жывымі вачыма, у якіх, праўда, таіліся яшчэ і боль, і смутак...

...А праз год, акурат у такую ж пару, знаёмыя і незнаёмыя дарогі вялі яе дадому.

Балючым было расстанне з Іванам. У той, апошні іхні вечар, ён многа і горача гаварыў, як прыгожа зажывуць яны, хай толькі даб'юць усю немчуру, што вужакай палезла на нашу зямлю, во і зараз, хоць турнулі яе далёка, яшчэ крэпка ашчэрваецца, забівае, паліць, рабуе. Таму ён не можа, не мае права скласці зброю. А яна, Вольга, хай як-небудзь дабіраецца дадому, у вызвалены, ачышчаны ад фашысцкай погані родны кут, прыгледзіць хату, калі тая яшчэ цэлая, мо што-небудзь пасадзіць, пасее, пакуль ён вернецца. Трэба ж дбаць ужо і пра заўтра... З яе ж досыць, наваявалася, хапянула ўсяго пад завязку. І так, во цэлы год разам рызыкавала жыццём, хадзіла на заданні, вырывалася з блакады, разам, зацкаваныя аўчаркамі, па горла сядзелі ў балоце. Усё было. Але, дзякаваць Богу, неяк ацалелі. Цяпер што!.. Самае страшнае — ззаду, у мінулым...

Іван усё ж папярэджваў, каб асцерагалася, ішла люднымі мясцінамі, абы-дзе не начавала, бо ці мала можна напароцца на якую брыдоту: недабітага фрыца, бобіка, а то і зграю згаладалых ваўкоў — развялося ж іх за вайну процьма...

Надвечар, калі пашарэла, а густое, адліжнае паветра працяў лёгкі, нанач, марозік, як часта бывае такое пад канец сакавіка, яна набліжалася да свайго хутара. Елкі і сосны паабапал гравійкі, набрынялыя за дзень вільгаццю, стаялі маўкліва і задуменна, ажно вусцішна рабілася ад гэтае іх маўклівасці.

Ветру зусім не чулася.

Восеці, куды іх з Лесікам кінулі летась фашысты, ужо не было. На тым месцы горбіліся над зямлёю кучы асмолкаў. Прайшоўшы яшчэ трохі, Вольга як не самлела, ногі, што і так ажно гулі ад нялёгкай, трое сутак амаль запар, хады, падагнуліся, і яна толькі велізарным намаганнем волі прымусіла сябе ўтрымацца, не ўпасці на дарогу.

Вачам, хоць на дварэ і пацямнела, адкрылася жахлівае: Чубаўкі болей не было, не засталося ні аднае цэлае хаты. На іх месцы чарнелі комінамі-шкілетамі паўразбураныя печы. Недзе, ці не адчуўшы чалавека, нема, па-дзіцячы заенчыў здзічэлы кот. Дзе ж усе людзі, што зрабілі яны, фашысты, з людзьмі? Няўжо нікога няма жывога? Якім жа лютым, крыважэрным зверам трэба быць, каб вось так руйнаваць, паліць дашчэнту, хадзіць па чалавечых касцях?!

Вольга адчула, што ёй не хапае паветра, вось-вось

задыхнецца. Не помнячы нічога, яна нагнулася, хапіла жменю снегу, прыклала да твару, мокрую, ахаладзелую руку сунула за пазуху, бліжэй да сэрца. Каліва адлягло. Але ногі, каб ісці далей, не слухаліся. Яна зняла з плячэй свой хатуль, куды з Іванам паклалі ўсё, што ў іх было,— паўкулідкі хлеба, некалькі звараных неабіраных бульбін, два кавалкі мыла, трохі ў торбачцы солі, карабок запалак, яшчэ тое-сёе з драбязы,— і села на гэтае дабро, якое за дарогу, хоць і важыла няшмат, намуляла, адабрала ёй плечы.

Куды ж цяпер ісці, да каго падацца? Калі знішчылі, не пакінулі нічога ад такога селішча, як Чубаўка, дзе былі і школа-сямігодка, і сельсавет, у якім яны з Іванам распісваліся, і крама, то, пэўна ж, ад хутара іхняга і попелу не засталося.

Падумалася пра Садкі, пра стрыечную сястру Верку. Мо хоць яны ацалелі? Аднак Вольга адчула, што сёння ўжо ніякіх чалавечых сіл не хопіць дабрацца да Садкоў. Пасядзеўшы яшчэ трохі, яна з цяжкасцю, нібы налітая свінцом, паднялася, так-сяк злаўчыўшыся, ускінула на плечы хатуль. Чамусьці не схацелася ісці праз Чубаўку, ці, лепш сказаць, праз тое, што ад яе ўжо асталося, і Вольга, мінуту павагаўшыся, рашуча звярнула набок, ступіла ў аселы, але глыбокі яшчэ снег...

Стала ўжо цёмна, але яна не баялася, пайшоўшы напрасткі праз поле, што заблудзіцца. З заплюшчанымі вачыма магла б трапіць адсюль на свой падворак. Кожны пагорачак ці лагчынку, кожны камень-валун, кожны кусцік, хоць і расплываліся, гублялі зараз свае абрысы, Вольга ўсё ж пазнавала па вядомых толькі ёй адной прыкметах.

Пацягнула дымком, і ў яе ў шчымлівай надзеі ёкнула сэрца: няўжо абышла іх бяда, няўжо ногі ступяць на родны парог?

Да рэзі ўваччу ўглядалася наперад. І калі трохі злева, па ходу, блекла пазначыўся агеньчык, яна ўжо ніколькі не сумнявалася: гэта свеціцца ў хатах, там ёсць жыццё, там людзі! Вольга наддала ходу.

Першы зачарнеўся ўсімі будовамі Тамашоў хутар. Над комінам віецца, нават поцемку відно, белаваты дымок. Пэўна, Адоля майструе на вячэру свайму бязногаму Тамашу яго заўсёдныя клёцкі. А вунь і яе хата!.. Толькі што ж гэта?.. Чаму з кухні цэдзіцца ў цемнату, у ноч, кволае, як бы чым прыглушанае, святло? Хто мог пасяліцца там?

Яна спынілася, рукавом караткаватага, ужо добра паношанага кажушка выцерла спацелы твар, зноў утаропіла позірк туды, скуль ішло гэтае святло. Не, яна не памылілася: нехта там, у яе хаце, ёсць.

Нарупіла думка — зайсці спачатку да Адолі. Карцела хутчэй даведацца пра Чубаўку, што і як там сталася, што з людзьмі, заадно Адоля раскажа і пра ўсе іншыя навіны. Пра тое, хто і па якому праву ўбіўся ў яе хату — найперш, вядома...

Адоля кешкалася на кухні, у шчарбатай кадцы, нагнуўшыся, мыла і накладвала ў пузаты гаршчок дробненькую, што арэшкі, бульбу. На Вольгу, калі тая, не пастукаўшыся — ніколі па-суседску яны гэтага не рабілі,— пераступіла парог, нават і не зірнула. Вольга хацела гучна павітацца, але Адоля, не падымаючы галавы, усё гэтак жа занятая работай, апярэдзіла, буркліва кінула:

— Трасца цябе недзе ўвесь вечар ганяе! І дроў на заўтра нават палена не прыцёг. Выстранчы тут адна...

Вольга кашлянула, і ў Адолі як спружынай выпрастала спіну. Не даўшы Вользе апамятацца, яна загаласіла:

— Во-о-лечка, ты?! Жывая?!. А я думала, то цюхцяй мой... Яшчэ завідна пайшоў да Гараша запалак пазычыць і во — усё няма і няма. Што можна гэтулькі рабіць? — Яна, разгублена-радасная, абняла Вольгу, мокрым ад слёз носам тыцнулася ёй у шчаку.— Мала ўжо надзеялася, што зноў пабачымся... Ведала, праўда, што вас тады, бедных, ля мастка партызаны ўратавалі. Але ж гэтулькі часу... Гэткі год жахлівы быў...

Яны, сеўшы на ўслон, зараз абедзве плакалі. Трохі, збольшага, Вольга расказала пра сябе, пра смерць Лесіка, пра тое, што было пасля. Адоля смаркалася ў падол рудога, бруднага фартуха, ім жа выцірала і слёзы.

— Чубаўка... Як гэта... усё? — выдыхнула нарэшце Вольга. Яна баялася такога пытання, знарок цягнула, ведала, што, хочаш ці не, усё роўна давядзецца спытаць.

Адоля стаілася, бы здранцвела, твар спалатнеў, рукі, якія яна паклала на калені, дробна трымцелі.

— Ну, кажы, што ж ты,— як не крыкнула, не пазнаўшы свайго голасу, Вольга.

— Ты ж, пэўна, бачыла, ішла тудэю... Не так даўно... усё гэта... Два месяцы назад... Наехала іх у чорным, што гругання якога. Ды ці першы раз? Але гэтыя... Чулі, гады, свой скон. Усё дапытваліся, хто старасту прыкончыў. Хто ж мог тое бачыць?.. Але сабаку сабачая смерць...— Адоля

памаўчала, у вачах у яе адбіліся і страх, і гідлівасць, затым, памыляўшы губамі, працягвала далей: — Ага, яшчэ ж пры табе адшукалі яны сабе паслугача — таго, большага з сыноў Боўтача, Харытона, п'яніцу і распусніка. Колькі папіў ён людской крывіцы, колькі маладых дзяўчат загубіў, злыдзень, са сваімі хаўруснікамі. Хай яму і на тым свеце мулка будзе!.. Але і сам у сваёй крыві захлынуўся: нехта позна вечарам упільнаваў яго, тапаром расквасіў галаву. Вось пасля таго і наехала іх у чорных мундзірах. Сагналі ўсіх чубаўскіх у восець і падпалілі. Жыўцом. І дзяцей, і старых. І вёску спалілі. Не з-за Боўтача толькі, не. Усё прыпомнілі людзям: і што партызанам памагалі, і воўкам глядзелі на іх новую ўласць, і што амаль усе мужчыны, хлопцы былі ў лесе ці ў войску, білі, нішчылі іх, душагубаў...

Вольга сядзела скамянелая, у невідушчых вачах яе адбілася гэтулькі гора, пакут і адчаю, што Адоля ажно спалохалася. Яна раптам спахапілася, пляснула рукамі:

— Што ж гэта я не прывеціла цябе па-людску, распрануцца нат не сказала?.. Адно ўсё страхоцце на языку... То распраніся, Волечка, у мяне ж цёпла, слава Богу, а зараз мо і Тамаш надыдзе, павячэраем заадно. Клёцкі там, у грубцы, даварваюцца.

— Трэба ж ісці...— схамянулася Вольга, і Адоля ўчула ў яе голасе: суседка калі не ўсё ведае, то здагадваецца і зараз да канца хоча яснасці, што і як з хатай.

Нібы вінавацячыся, Адоля ўсхліпнула, зноў засмаркалася ў падол:

— Паліцаіха... там... з дзіцёнкам. Знекуль далёка самі. З немцамі беглі, ад кары ўцякалі. Я ж ім казала, што прыйдзеце вы, вернецеся. Ён сам, паліцай, чуць мяне не забіў, калі заікнулася. Бегаў усё, пісталетам размахваў, гразіўся, як з чубаўскімі ўчыніць. А сам калаціўся ад страху: пяткі падмазваць пара, нашы ж напіраюць, продыху ім, гадам, не даюць. А тут жонка ягоная... Хвароба нейкая ўбілася, з ног зваліла. А яшчэ цяжарная. Ён і кінуў яе адну з дзіцёнкам, хлопчыкам. Скуру сваю ратаваць жа трэба.

Вольгу як токам трасянула:

— У маёй хаце... паліцаіха?!

Яна мала помніла, як выбегла ад Адолі, калі ўхапіла хатуль. Не чула ні стомы, ні гуду ў нагах. Цяжкімі, рашучымі крокамі, амаль подбегам, там-сям па калена яшчэ ўвальваючыся ў снег, яна пакіравалася да свайго двара.

Адна думка, адно жаданне агнём паліла ўсё нутро: хутчэй у хату, хутчэй хапіць мэтлахі няпрошанай кватаранткі і выкінуць, к чортавай матары шпурлянуць усё на вуліцу, каб нічым і не смярдзела, паказаць на дзверы і самой чужаніцы — ідзі, скуль прыйшла, бяжы, даганяй свайго бобіка-дружка, мо яшчэ і дагоніш... Іч ты, аблюбавала сабе цёпленькі куток! І ад людскога вока далей... На ўсё гатовенькае спакусілася? Палічыла са сваім паліцаем, што з яе сабачае ласкі і костачкі гаспадароў сапрэлі ў зямлі, можна смела шыкаваць, распараджацца чужым? А скулу не хацелі, вырадкі! Хопіць, нашыкаваліся... Была ваша крывавая пара́.

Сенцы былі на засаўцы, і Вольга штомоцы загрукала ў дзверы, укладваючы ў гэты грукат невядома адкуль узятую сілу. Праз хвіліну з кухні данёсся знаёмы рып, кволы жаночы голас насцярожана спытаў:

— Хто там?

— Адчыняй! — Вольга зноў, ужо нагой, нецярпліва саўганула ў дзверы, ажно гулка затрымцела ў акне шыбіна.

Там, усярэдзіне, як бы стаіліся, анямелі... Але вось па падлозе мітусліва затупацелі, зашоргалі ў нейкіх атопках ногі, той жа, праўда, добра ўжо напалоханы, разгублены голас выдыхнуў зноў:

— Я зараз, зараз... Ой, што ж гэта?..

За дзвярыма, чуваць было, хтосьці ўпоцемку нервова залапаў, зашнарыў рукой, шукаючы засаўку. «Што, не патрапіш? — гняўліва падумала Вольга.— А сюды, у чужую хату, дык патрапіла?»

Засаўка, нарэшце, азвалася ўвушшу цяжкім жалезным скрыгатам. Вольга трохі счакала, затым піхнула дзверы і, пакінуўшы за сабою ўсё наросхрыст, амаль услед за жанчынай ступіла на кухню.

Вока адразу выхапіла нияркую з укручаным кнотам лямпу на стале, у блеклым яе святле збялелую, без аднае крывінкі ў твары, невысокую маладзіцу з пакутліва-застылымі вачыма. Прыхінуўшыся да сцяны і як бы баронячыся ад каго, яна растапырыла, выставіла наперад рукі, за якімі ўгадваўся вялікі жывот... Побач, учапіўшыся за спадніцу, басанож на голай падлозе стаяў, ціха румзаў русявы хлапчук гадоў пяці-шасці.

Вольга, нічога не кажучы, паклала на зэдлік хатуль, распранула і павесіла на цвік ля парога кажушок, зазірнула ў пярэдні пакой, нібы правяраючы, ці ўсё, што было

ў хаце год назад, зараз на сваім месцы, ці не прапала часам што. У цемнаце нічога не пабачыла. Зноў вярнулася на кухню. Адчуўшы, як з двара цягне холадам, пайшла і зачыніла ўсе дзверы. Нешта трэба было сказаць, кінуць у твар гэтай чужаніцы выспелыя словы, якія толькі што агнём пяклі, вярэдзілі душу, прымушалі да хрусту, да болю ў пальцах сціскаць кулакі. Але, надзіва, чамусьці захраслі на губах тыя жорсткія, але справядлівыя словы. Яна зноў змерала позіркам нерухомую, зараз з грымасай болю на ўсё гэткім жа збялелым твары, постаць маладзіцы, русявага хлапчука і адчула, як тая, нядаўна ўплеценая ў нервы, напятая да звону струна рэзка абарвалася. І мо больш ужо для прыліку — толькі б не раскіснуць і не маўчаць — Вольга нахмурыла бровы, працадзіла скрозь зубы:

— Ну, дык што рабіцьмем?!

— Мы зараз, зараз... пойдзем куды...— хуценька залепятала маладзіца і, выйшаўшы са свайго здранцвення, замітусілася, зашастала па ўсіх кутках.

Яна хапала і кідала ў адну кучу пасярод кухні апратку, сваю і хлапчукову, тое-сёе, што пад руку трапляла, з іншых рэчаў. Аднекуль выцягнула стракатую даматканую посцілку, нагнулася, каб звязаць усё ў клунак, і... дзіўна неяк войкнуўшы, асела на падлогу.

Вольга не на жарт спалохалася. Увесь выгляд маладзіцы — тое, як да крыві закусіла губу, як цяжка лавіла ротам паветра, курчылася, лапала за ніз жывата — гаварыў, што ёй нядобра, што вось-вось могуць пачацца, калі не пачаліся ўжо, роды. Трэба нешта рабіць, не стаяць вось так, разгублена апусціўшы рукі. Што б там ні было, а ўсё ж чалавек, жанчына, зараз ёй мо як ніколі ў жыцці блага і без нечае дапамогі ніяк не абыдзецца. А тут яшчэ нема закрычаў, кінуўся да маці хлапчук. Размазваючы кулачком па твары слёзы, ён ажно надрываўся:

— Мамачка... ставай! Мамачка, мне стлашна... Ставай, мамачка!..

Вольга ўзяла за руку хлопчыка, шурпатай даланёю правяла па мяккіх русявых валасах і адчула, як нейкі даўкі камяк здрадліва падкаціўся да горла. «Божачка, што ж гэта дзеецца на свеце?»

Хлапчука яна пасадзіла на лаве ў покуці, наказаўшы яму не злазіць і не румзаць, пабольшыла язычок агню ў лямпе і нахінулася да маладзіцы. Той, бачна было адразу, рабілася ўсё горай і горай. Вольга падклала пад галаў

маладзіцы першае, што трапіла пад руку,— невядома з якога пляча картовы пінжачок, затым вырашыла, не бавячыся ні хвіліны, бегчы да Адолі. Удзвюх мо як і падсобяць, аблегчаць жанчыне пакуты. Тым болей Вольга ведала, Адоля не навічок у гэтай бабскай справе.

Адоля, на шчасце, яшчэ не спала, якраз з Тамашом вячэралі. Убачыўшы суседку на парозе сваёй хаты, без кажушка і нават без хусткі, яна першая занепакоена спытала:

— Што, што там у цябе?

Вольга, нягледзячы на разгубленасць, не забылася паздароўкацца з Тамашом. Мелькам адзначыла ў думках, як ён за год згорбіўся, асунуўся, павэдлуг з Адоляй пастарэў і пасівеў. Яна паклікала Адолю бліжэй да сябе, шапнула як не ў вуха:

— Гэтая... кватарантка... кепска ёй.

— Яшчэ ж зарана,— адразу здагадалася Адоля і, болей не пытаючыся, выцягнула з печы гаршчок цёплай вады — балазе стаяў і не астыў з раніцы,— наліла вялікі гліняны гладыш, выняла з куфэрка чысты не то ручнік, не то якую анучу. Завіхаючыся, апранулася і разам з Вольгай падалася на двор.

...Апоўначы, выбіўшыся з сіл, зрабіўшы ўсё, што толькі можна, яны апусцілі рукі, зразумелі: маладзіцу ім не ўратаваць. Кровацячэнне пасля родаў ніяк не спынялася. Адоля два разы яшчэ бегала дадому, грэла ў грубцы на вуголлі ваду, бо ў Вольчынай хаце чамусьці было няпалена, запарвала нейкія зёлкі і бясконца клала прымочкі.

Вольга, прыняўшы дзіця, таксама хлопчыка — адразу кінулася ў вочы, што ён неданошаны,— чым магла памагала Адолі. Улучыўшы хвіліну, схадзіла да хлява, упоцемку пашукала дроў, але не знайшла ні палена і ні з чым вярнулася ў досыць настылую ўжо хату. Пабаялася за нованароджанага: хаця б не азябнуў, яго ж і не ўхуталі як трэба — паспрабуй знайдзі што людскае ў гэтай гарачцы! А тут яшчэ плакаў, не перастаючы, большанькі, і колькі ні ўгаворвала яго Вольга, не схацеў ісці спаць у залу, дзе яму была паслана пасцель.

Маладзіца ж сцякала крывёю. Яна амаль увесь час трызніла, парывалася некуды бегчы, кляла нейкую Фаіну (з гарачых і блытаных яе слоў Вольга ўсё ж здагадалася, што Фаіна тая ці то старэйшая сястра маладзіцы, ці то іншая блізкая родзічка).

Пад раніцу, калі Адоля скрыпнула дзвярыма, зноў, стомленая і спустошаная, паплялася дадому, каб узяць кроплю якую газы, бо ў лямпе ўжо канчалася, а без святла ім ніяк нельга, маладзіца трохі ачуняла. Глыбока запалымі вачыма, у якіх раптам бліснулі слёзы, яна дала знак Вользе нахінуцца бліжэй, ціха і як бы вінавата папрасіла паказаць дзіця. Папытала, хто ж хаця нарадзіўся. Даведаўшыся, што хлопчык, пабачыўшы яго жывым і здаровенькім, маладзіца раптам затрэслася ў плачы, істэрычна забілася галавой аб падлогу. Каб Вольга не ўспела падкласці ватоўку, невядома, як магло б скончыцца. Зноў губляючы памяць, мыляючы сухімі, асмяглымі губамі, яна ўсё ж знайшла яшчэ сілы спытаць:

— Дзеці ж не вінаватыя?.. Не? Дзецям жа не будуць помсціць?..

## 9

Дзімка збіраўся на апошні рэйс аўтобуса, які пайшоў ужо на Калоднае і праз гадзіну з нечым павінен вярнуцца сюды, у іхняе Мошына, да канторы калгаса, дзе па шляху ў райцэнтр звычайна робіць кароткі прыпынак. Калі ўдасца сесці, то, прыкінуў Дзімка, ён з немалым яшчэ запасам часу паспее на вакзал, на начны поезд да Мінска і раніцай будзе ў сваім інтэрнаце. Трохі непакоіла, хаця б толькі сесці, бо ў вялікія святы набівалася шмат народу, асабліва моладзі, і аўтобус, няхай сабе спыняўся дзеля прыліку, не заўсёды мог забраць усіх жадаючых.

Вольга была маркотная. З якой надзеяй чакала яна Першамай! Здавалася, за тры дні (да майскіх свят, так сёлета пашанцавала, далучылася ўпрытык і нядзеля) гэтак набудзецца з сынамі дома, гэтулькі папарасказваюць яны ёй цікавага, асабліва Дзімка,— як ні кажы, а хлопец жа жыве і вучыцца ў сталіцы, аціраецца сярод важных людзей,— што пасля ўсё тое доўга будзе цешыць і грэць ёй душу.

Аднак жа сталася так, што болей яна праляжала адна. Лёшка, акрамя хіба першага дня, свету белага не бачыў на тых палявых работах, меншы ж, нібы чортам падшыты, гойсаў недзе па вёсцы, з Барысам Гонтам хадзілі ў госці да некага з аднакласнікаў, а вечарамі, сам казаў, бавіў час з Аксанай. Вольга спадзявалася, што Дзімка, хоць ненадоўга, прывядзе Аксану і да сябе ў хату, дасць уцеху пабачыць іх разам. І ці то Аксана пасаромелася разам

прыйсці, ці мо Дзімка не вельмі ахвотна запрашаў, толькі Вольга не дачакалася іх. Гэта чамусьці трывожыла. Але яна вырашыла не назаляць роспытамі. Ні адным словам не выдала Вольга і таго, што выпадкова пачула, што старанна хавалі ад яе сыны,— наконт Дзімкавай стыпендыі. Адразу засмуціла, вядома, што ад яе нешта ўтойваюць, аднак пасля, разважыўшы, прыйшла да цвёрдага перакананння: проста яе, хворую, шануюць ад лішніх перажыванняў, турбот.

Дзімка, ужо апрануты, пакаваў свой саквояж. Лёшка быў таксама дома, прынараўіўся з напарнікам так, каб мець магчымасць развітацца з братам, праводзіць яго ў дарогу.

— Ляксей, сынок,— час ад часу непакоілася Вольга,— ці ж паклалі хаця яйкі! І кумпяка не шкадуйце, адрэж болей... Хай есць, тамака ж не накупляешся за кожным разам.

— Усё паклалі, мама, ага, хопіць,— смяяўся Дзімка.— Наемся, аж распераджуся. Цэлы інтэрнат накарміць можна.

У Дзімкі быў добры, гуллівы настрой. Учора Лёшка, нарэшце, расшчодрыўся, даў яму грошай і на куртку, і на харч. Абяцаў пазней выслаць яшчэ колькі чырвонцаў. Дзімку карцела зараз хутчэй апынуцца ў Мінску, выхапіць, пакуль не позна, тую куртку японскую. Вось дык будзе зайздрасці хлопцам, як апране, прагуляецца па праспекце!

Трэба было ўжо спяшацца. Дзімка, саззяючым тварам, падышоў да маці, каб развітацца, і сумеўся: ну, які ж ён свінчук! Маці прыкута да ложка, так маркотна глядзіць на яго, адчуваючы доўгае расстанне, а ён у гэтую хвіліну ледзь не скача ад радасці. Хлопца адразу як бы што скаланула. Напусціўшы на сябе суму, ён ужо шчырым, цёплым голасам сказаў:

— Вы неяк тут мацуйцеся... Я буду пісаць, мама. Пасля сесіі, ужо ж нядоўга засталося, прыеду... На цалюткае лета.

— Хай жа ўсё ў цябе будзе добра, сынок,— квола ўсміхнулася Вольга.— А цяпер ідзеце, а то спозніцеся.

Дзімка цмокнуў маці ў шчаку і ўслед за Лёшкам, яшчэ раз на парозе абярнуўшыся, энергічна махнуўшы рукой — маўляў, бадзёрцеся, не вешайце носа,— падаўся на вуліцу.

На прыпынку, наўздзіў, людзей было нягуста. Хлопцы

даведаліся, што нядаўна ішоў нейкі выпадковы нярэйсавы аўтобус, і калі нехта падняў руку, «прагаласаваў» на ўсякі выпадак, шафёр спыніў машыну і забраў усіх, хто жадаў трапіць у райцэнтр.

Дзімка пашукаў вачыма, ці не едзе часам хто з колішніх сяброў. Нікога не было. Барыс Гонта развітаўся яшчэ ўчора — спяшаўся на нейкія спаборніцтвы ў сваё авіявучылішча.

Яны адышліся трохі ўбок. Дзімка выняў з кішэні папяросу, сваю запальнічку-пісталет, прыкурыў.

— Ты там... вось што — у вучобу болей улягай,— сказаў Лёшка.— Не выцягнеш летам на стыпендыю — няпроста і нам тут давядзецца. Сам разумееш.

Дзімка супакоіў:

— Гэты раз лёгкія экзамены. Выцягну... Можна не хвалявацца.

— Толькі не будзь такі самаўпэўнены...

Гаворка неяк не клеілася. Лёшку хацелася сказаць штосьці больш значнае, падзяліцца з братам непакоем за маці, недзе ў глыбіні яго душы тлела нездаволенасць сённяшнім сваім неўладкаваным жыццём, у якім адна работа, бясконцыя хатнія клопаты і трывога і так мала цяпла. Што рабіць, што змяніць у гэтым яго жыцці — парай, падкажы ты, блізкі, родны чалавек. Каму ж яшчэ можна даверыцца і выказаць свой боль, хто лепей павінен зразумець адзін аднаго, як не кроўныя браты?!

Але патрэбных слоў чамусьці не знаходзілася. Нейкая дзіўная мяжа, думаў Лёшка, падзяліла зараз яго і Дзімку. Мяжа, якую нялёгка заўважыць, можна адчуць хіба толькі сэрцам. З чаго гэта? Адкуль што ўзялося? Думай не думай — не знойдзеш пэўнага адказу...

На горцы зараўло, паказаўся аўтобус і імкліва пакаціўся ўніз, да канторы. Дзімка падняў з зямлі сакваяж, і хлопцы падаліся бліжэй да ўсіх, каб не быць апошнімі, калі пачнецца пасадка.

У аўтобусе стаялі, але бачылася, што гэты раз усе ўмесцяцца. Шафёр пускаў толькі праз пярэднія дзверы, адразу ж, хто ўваходзіў, і абілечваў. Дзімка паціснуў брату руку і, болей нічога не сказаўшы, ступіў на прыступку, падаў вадзіцелю грошы.

Неўзабаве аўтобус крануўся. Селі ўсе, хто збіраўся ехаць. Болей, аказалася, прыйшло праводзіць. Лёшка, пастаяўшы хвілін колькі ў нейкім незразумелым здранцвенні, схамянуўся і напрасткі, праз поплаў — за майскія

дні добра-ткі ўсохла — пакіраваўся дадому. Трэба было паспець нямала чаго зрабіць яшчэ па гаспадарцы, перакусіць з маці што-кольвечы і збірацца ў начную змену.

А праз гадзіны дзве, калі сонца накалолася на зубчыкі лесу, ён ужо мераў кірзачамі знаёмае, сотні разоў хаджанае-пераходжанае ўдоўж і ўпоперак, поле.

Ісці было няблізка. Участак, дзе зараз араў Венька, знаходзіўся ажно за Выселкамі, нізкім, нядаўна адваяваным ад хмызу, месцы, якое прымыкала да не асушанага яшчэ балота. Да яго кіламетры чатыры, не меней. Але гэта не палохала Лёшку. Любой парою — вясной, летам ці ўвосень — любіў ён поле, любіў з ім быць сам-насам, і, як ні дзіўна, асабліва вечарамі, ноччу, калі надаралася па-трэба працаваць у начны час. Адзінота ніколькі яго не прыгнятала. Наадварот: тут, на прасторы, ды яшчэ калі ніхто не мяшаў, не назаляў, Лёшка адчуваў у сабе нейкі незвычайны прыліў сіл, бадзёрасці. Колькі разоў заўважаў такое: дома ўжо валіцца з ног, пасля дзённай мітусні, розных іншых клопатаў гудам гудзе галава, здэцца, лёг бы, дзе стаяў, і да раніцы не прачнуўся б. Але варта толькі апынуцца за вёскай, падставіць твар свежаму ветру, на поўныя грудзі ўдыхнуць водар зямлі, травы, кветак, як паступова развейваліся ўсе горкія думкі, лёгкай і пругкай рабілася хада, а на сэрца невядома адкуль наплывала ціхая пяшчотная музыка.

Вось і зараз, ідучы змяніць Веньку, ён ніколькі не думаў пра тое, што наперадзе бяссонная ноч. Ад той гаркоты, якая нечакана была падкралася да яго, калі праводзіў брата, не засталося і следу. Жыццё зноў давала надзею, што ўсё мо добра абыдзецца з маці, адпусціць не можа не адпусціць яе хвароба, і тады ў іх стане, як было многія гады дагэтуль, а то і лепей. Ён жа нямала зарабляе, а калі скончыць вучобу Дзімка і адпадзе патрэба памагаць яму, змогуць на зароблена́е ім, Лёшкам, зусім няблага жыць, нават прыкупіць таго-сяго ў хату. Маці ж ён ні ў якім разе не пусціць на цяжкую працу: годзе, напрацавалася за свой век і за іх, і за сябе. Каму, як не ёй, адпачыць на старасці!

У гэтую яго надзею ўплятался і самае галоўнае, самае светлае і шчымліва-радаснае: у нейкі дзень і час і ён сустрэне тую, хто шчыра, цёпла і аддана гляне яму ў вочы, сваёй усмешкай і пяшчотай абудзіць у самых глухіх куточках яго душы, што паспела ўжо калі не ачарсцвець, то

задрамаць, вялікую прагу кахання, блізкасці, усяго таго, без чаго не мае сэнсу чалавечае існаванне...

У думках-мроях Лёшка і не прыкмеціў, як большая палавіна дарогі асталася ззаду. Наблізіўся да пясчанага ўзлобка, дзе ўперамешку з бярозкамі, што выпусцілі ўжо клейкія лісцікі, гонка цягнуліся ўверх маладыя сосенкі. За імі, трохі лявей, пачынаўся стары лес, які зараз, у вечаровай шэрані, нагадваў суцэльную чорную сцяну. У лесе, у таямнічай яго глыбіні, трывожна раз-пораз крычала, як бы клікала на дапамогу нейкая вялікая птушка. А тут, у полі, над саменькай галавой, цененькім званочкам вызваньваў нешта сваё жаваранак.

Лёшка ажно ўсміхнуўся. Вось жа шчыруе! Дня яму, відаць, мала, каб выліць свае песні, выказаць пахвалу вясне, дык яшчэ ці і ні ночы рашыў частку прыхапіць?

Прастуючы шлях, Лёшка ступіў у падлесак і адчуў, як густа патыхнула ў нос нагрэтай за дзень пад сонцам ігліцай, падсохлай леташняй травой, нечым яшчэ, што, колькі сабе ні нюхай, вызначыць ніяк немагчыма. Усе гэтыя пахі хмельна кружылі галаву, хацелася па-блазенску галёкаць ад радасці, ад той незвычайнай лёгкасці, якой налілося ўсё цела. Ён бы і загалёкаў, каб раптам...

У нешырокім прагале крокаў за дваццаць ад сябе ён убачыў прыгажуна-лася. Лёшка спыніўся як укопаны. Ніколі яшчэ так блізка не бачыў ён ляснога веліканa. Лось, пачуўшы чалавека, не кінуўся бегчы. Грацыёзна павярнуўшы ў бок нечаканага візіцёра галаву, якую аздаблялі галіністыя — як толькі і за дрэвы не чапляюцца! — рогі, ён паварушыў вялікімі вушамі, трасянуў грывай і астаўся стаяць на месцы, быццам гаворачы: ідзі, чалавеча, куды ідзеш, не замінай мне, у цябе свой клопат, у мяне — свой.

Збоку, пад хвойкай, трэснула, Лёшка кінуў туды позірк і здзівіўся, як ён адразу не прыкмеціў ласіхі і ля яе боку маленькае ласяня. Дзіцёнак, ні на кога не звяртаючы ўвагі, няцвёрда яшчэ стоячы на нагах, заўзята тыцкаў пысай у вымя — падсілкоўваўся, відаць, на ноч.

Лёшка хвіліну палюбаваўся, затым асцярожна павярнуў назад. Ён вырашыў як мага далей абысці ласіную сям'ю, каб не патрывожыць, не парушыць гэтую ідылію.

Яго заўсёды здзіўляла і гняла чалавечая жорсткасць да жывёлы. Колькі сябе помніць, ён ні разу не пакрыўдзіў ні ката, ні сабакі, не разбурыў ніводнага гнязда, хоць у дзяцінстве хлапчукі, ягоныя равеснікі, неаднойчы як бы

выстаўлялі напаказ гэтую сваю жорсткасць. Яшчэ і да гэтага часу, хоць мінула столькі гадоў, Лёшку не-не дый пабачыцца ў сне, ад чаго ён усхопліваецца ўвесь мокры, жахлівы малюнак: па вёсцы, па пыльнай, пясчанай вуліцы з дзікім енкам, ажно валасы дыбам станавіліся, куляй нясецца сабака, ззаду ў яго матляецца ці не дротам прывязаная за хвост кансервавая бляшанка, а з бляшанкі той, раздзімаемы ветрам, шугае, пырскае смалянымі іскрамі агонь. «Божа-Божа,— жахаюцца, ківаюць галовамі жанчыны, якія, з выпадку нейкага «святога» дня, густа сядзяць на лаўках, а сярод гэтых жанчын — і Лёшкава цётка.— Гэта ж зноў той Тараскаў злыдзень, вылюдак той. От жа і ўродзіцца! Хто ж, акрамя яго, удумае ўчыніць гэткі здзек над нявіннай істотай? Каб і на ім скура во так дымела...»

Ён не помніў тады, як доўга бег услед і дзе адшукаў ужо мёртвага, абгарэлага, з вырачанымі ад жаху вачыма, з аскаленымі пашчэнкамі сабаку, колькі часу сам ляжаў непадалёку, слязьмі мачыў зямлю, гаіў у сэрцы рану. А ці адна яна была, тая рана?..

Зараз, чытаючы дзе ў газетах аб выпадках злоснага браканьерства ў лесе, ён міжволі сціскаў кулакі, хадзіў сам не свой, і ў такія хвіліны яго лепей было не чапаць, не лезці ні з роспытамі, ні з парадамі. Кожны раз Лёшка парываўся пісаць пісьмо ў рэдакцыю, каб дамагліся і суровым судом судзілі злачынцаў — такіх людзей, браканьераў, інакш як злачынцамі ён не мог назваць — і паведамілі пасля, абавязкова паведамілі, якая кара чакае тых, хто падымае руку на жывое ў прыродзе.

Але чамусьці ніводнага такога пісьма не паслаў, хоць пра многае хацелася сказаць, што немым крыкам прасілася з душы...

Цямнела ўвачавідкі, аднак Лёшка не спяшаўся, тым болей што было ўжо блізка. Вунь, у той лагчынцы, клін, які чамусьці называюць Выселкамі, а трохі далей, праз пагорак, і новы ўчастак, дзе зараз працуе Венька. Цікава, колькі ж ён узараў? Падумалася: хаця б неяк скончыць за ноч і заўтрашні дзень. Сам старшыня Маляўка сёння раніцай пад'язджаў на «газіку», вельмі прыспешваў. У калгасе з сяўбой, казаў, не зусім гладка, з раёна, а то і вобласці начальства вось-вось павінна наскочыць.

На пагорку ў твар дыхнула свежасцю, якую лёгкі ветрык нёс з недалёкага балота. Там жа, чулася, жабы давалі свой вячэрні канцэрт, іхнія песні-кваканне не змаў-

калі ні на хвіліну. Ці не заглушылі яны і гул трактара?

Лёшка спыніўся, прыслухаўся. Не, нічога не чутно. Няўжо сапсавалася што ў машыне? Яшчэ гэтага не хапала!.. Ён не стаў абыходзіць раллю, а папраставаў, цэлячы ступаць на перавернутыя плугам цяжкія скібы, па ўзараным.

Трактар ён згледзеў за невысокім курганком, парослым чэзлым кустоўем. Наблізіўшыся, Лёшка адчуў штосьці няладнае: матор працаваў, але не мякка, як заўсёды, а неяк суха, захлёбіста, з непрыемным, ажно ўвушшу аддавала, металічным стукатам. Венькі блізка не было відаць. «Дзе ж ён? — занепакоіўся Лёшка.— Мо што здарылася, куды адбегся?»

І ўжо за колькі метраў ад трактара Лёшка зразумеў: у радыятары ж няма ні кроплі вады! Ад яго і ад дызеля патыхала агнём. Дымна пахла распаленым маслам. «Што ж гэта такое?» — ужо не на жарты ўстрывожыўся Лёшка і кінуўся да ручкі газа, рэзка тузануў яе ўверх. Трактар канвульсіўна здрыгануўся і замёр.

Толькі цяпер Лёшка па-сапраўднаму агледзеўся. Хоць і ў прыцемку, але ўбачыў, што ўзарана пасля яго вельмі мала, ды і тое зроблена горай не прыдумаеш: на кожным кроку агрэхі, выверты плугоў, баразна там-сям ішла ўлукаткі і была то глыбокая, па калена, то ледзьве значылася. Не работа, а смяхоцце, суцэльны брак, за які па галоўцы не пагладзяць.

Нядобра кальнула здагадка: Венька, пэўна, п'яны. Але ж дзе ён? Няўжо кінуў-рынуў машыну і пацёгся куды? Ці мо спіць?

Веньку і праўда Лёшка знайшоў непадалёку, на курганку. Падкінуўшы пад галаву целагрэйку, ён разлёгся на сухой леташняй траве і соладка хроп, ажно нешта булькала ў горле. Побач валялася таўстарылая, цёмнага шкла бутэлька з-пад віна. Трохі далей — яшчэ адна. На разасланай газеце — горка розных аб'едкаў, пустая кансервавая бляшанка. Адразу відаць было, што баляваў Венька не адзін. Нехта прыходзіў да яго ў помач. А дзе ж той, другі?

Абышоўшы ўвесь курганок, Лёшка нікога не знайшоў. Разабрала злосць на Веньку: напсаваў, насвінячыў з ворывам, дык яшчэ і трактар ледзьве не ўходаў. Што цяпер сказаць, як заўтра глянуць у вочы Маляўку? А ён жа пад'едзе, не паспее і сонца вылузацца з-за лесу, як завітае. Той не праспіць, праверыць.

Лёшка нагнуўся і тарпануў Веньку за плячо. Хлопец адразу ўсхапіўся, памыляў губамі і зноў лёг, павярнуўся на другі бок.

— Уставай, чуеш? — ведаючы, што ўсё роўна трэба чалавека будзіць, гукнуў Лёшка і яшчэ мацней затармасіў яго.

— А ідзі ты...— злосна вылаяўся Венька, і ў голасе яго не пачулася, каб быў надта п'яны ці нічога не кеміў са сну.

Таму Лёшка больш рашуча сказаў:

— Хопіць выдурняцца, сумленне трэба мець, во што...

Веньку як спружынай ускінула на ногі. Дзе дзяваліся і хмель, і санлівасць! Вочы яго гарэлі лютасцю, якой Лёшка ніколі дагэтуль у хлопца не бачыў.

— Т-т-т-ты, перадавік,— скрозь зубы цадзіў Венька,— абрыдзеў ты мне са сваімі натацыямі. Што, яшчэ адзін ордэн меціш палучыць? Дык выслужвайся, палучай, а мяне пакінь у спакоі... І выпіць у свята чалавеку ўжо нельга?

— Ну і брыдота ж ты,— нязлосна сказаў Лёшка, хоць усярэдзіне ўсё ажно кіпела.— Пі сабе, хоць захлыніся, а навошта ж у такім разе на трактар садзіцца? Паглядзі, як ты наараў, чаго нарабіў. І матор ледзь не заклініла. Яшчэ мінут колькі — і было б па трактары...

— Адрамантавалі б, дзе дзеліся б. Альбо далі б другі. Што, мала тэхнікі? — выскаліўся Венька, яўна стараючыся ісці на канфлікт.

Лёшка ліхаманкава думаў, якая муха ўкусіла напарніка. Справа тут была, адчуваў, не ў выпіўцы, не таму, што Венька адпіў мазгі. Ён і раней неаднойчы прыкладваўся да рыльца ў час работы, але каб вось так нашкодзіць ды яшчэ выскаляцца... Лёшка, аднак, не стаў высвятляць адносіны. Плюнуўшы сабе пад ногі, ён павярнуўся і пайшоў да трактара. Трэба ж прынесці вады і, калі астыне радыятар, заліць вёдраў колькі.

Добрага, прыўзнятага настрою як і не было. Лёшка выняў з кабіны вядро, паправіў сагнуты вочап і падаўся ўніз, да балота, над якім вісеў полаг туману і дзе ўсё гэтак жа дралі горла жабы. Толькі зараз іх няспыннае кваканне чамусьці раздражняла.

Ён без цяжкасцей адшукаў — яшчэ ўчора днём запомніў месца — жардзяныя кладкі, якія невядома хто і калі перакінуў праз нешырокую канаўку з густой карычневай вадой. Напоўніў цэлае вядро, паставіў побач, ля

ног, зноў нагнуўся і пабоўтаў у канаўцы рукамі, адчуваючы, як гэты занятак, разам з асалодай, нясе заспакоенасць, вяртае раўнавагу.

Захацелася асвяжыць і твар. Лёшка зачэрпнуў быў у прыгаршчы, але, згледзеўшы, што трапіў у рукі ці не апалонік, выплюхнуў ваду назад. Панёс вядро да трактара. Заліваць у радыятар пакуль пабаяўся: ад яго па-ранейшаму аддавала гарачынёй. Шкада толькі, што так марнуецца час. Паспрабуй пасля нагані ўпушчанае.

Венькі ўжо не было, відаць, пайшоў дахаты. «Ну і падумаеш, цаца, нічога яму не скажы. А сам так напаганіць, доўга будзеш чухацца».

Лёшка прымушаў сябе неяк забыцца пра дурную размову з Венькам, аднак яна не лезла з галавы. Бач, прыпомніў ордэн, які ён, Лёшка, атрымаў два гады назад. Вочы яму закалола. Вось не думаў, што і праз два гады зайздроснікі знойдуцца. А чаго зайздросціць? Што ён, спецыяльна дзеля ўзнагароды стараўся? Дык пастарайся і ты! З такой, як сёння, работай не ўзнагароду даваць, а гнаць у тры шыі трэба. Рабі па-людску, дык і цябе заўважаць, дзе дзенуцца...

...Толькі праз гадзіну Лёшка запусціў дызель. Трэ было спяшацца. Ноч жа зараз — не вечнасць. Не паспееш азірнуцца, як заружавее на ўсходзе. Ён вывеў трактар на баразну, дзе кончыў Венька, скокнуў з кабіны, яшчэ раз праверыў плугі, адрэгуляваў патрэбную глыбіню. Прайшоўшы метраў дваццаць, зноў спыніў машыну, пры святле яркай задняй фары пераканаўся, што ўсё ідзе як мае быць.

Настрой паступова паляпшаўся. Мерны гул матора прыглушыў, адагнаў невядома куды маркоту, непрыемнасці сённяшняга дня. І ўсё ж недзе ў куточку душы муляла: што ж рабіць з тым ворывам, якое напсаваў Венька? Пакінуць так, паспадзявацца, што ніхто з начальства не ўбачыць? Але ж пасля, як сеяць пачнуць, абавязкова выявіцца партацтва. Тады будзе горай апраўдвацца. І разам з тым неяк нядобра, калі раніцай наведаецца Маляўка, тыцкаць пальцам: во глядзіце, які ў мяне, напарнічак, параўноўвайце, як ён працуе і як я. Што, ёсць розніца! Ага, дык матайце ж сабе на вус, таварыш старшыня...

Не, так нікуды нявартa. Нешта трэба прыдумаць. Які б Венька сабе ні быў, але ж яны спараны адной работай, ходзяць, лічы, у адной запрэжцы.

З'явілася нечаканая думка: паспрабаваць, як стане віднець, прайсціся з плугам па Венькіных агрэхах, што толькі можна, пастарацца выправіць. Няважна, калі не выканае сваю норму — тут можна хоць сто прычын выдумаць, ніхто цябе не праверыць.

Здаволены прынятым рашэннем, Лёшка з палёгкай уздыхнуў. З сэрца бы хто зняў цяжкі камень.

# ЧАСТКА ДРУГАЯ

## 1

Вецік зноў паклікаў яго на вуліцу. Малышку не хацелася зараз выходзіць на сонца, на спёку з халаднаватага пакоя, і ён не адгукнуўся, удумаў схітраваць. Але Вецік, бы заведзены ўсё роўна, не пераставаў галёкаць, нешта захлёбіста, не разбярэш што, гаварыў, страчыў з «кулямёта» — так яны, хлапчукі, называлі гульню, калі бярэш не вельмі тонкую арэхавую палку, торкаеш яе недалёка ў дзірку-прагал між частаколін ці штыкецін, набіраеш у грудзі болей паветра і куляй зрываешся з месца, мацней прыціскаючы тую палку да плота. Страляе — лепей не прыдумаеш. Ажно сэрца трапеча ад радасці. Толькі чамусьці дарослыя, асабліва цёткі, вельмі не любяць гэтае гульні, як не з дубцом ці крапівой ганяюцца за імі. Што з іх возьмеш, тых цётак? Хіба яны разумеюць?..

Малышок, аднак, рашыў быць цвёрдым да канца. Хай пагалёкае. Будзе ведаць, як зазнавацца, задзіраць свой рабаціністы нос. Падумаеш, бацька зробіць яму самакат. Ну і няхай робіць. Хай Вецік катаецца. Яму, Малышку, і без самаката добра. Во, заўтра мама возьме яго на сенажаць, там іхняе сена, там ён не гэтак пакатаецца. I на возе, і, мо дазволяць, верхам на кані. Ен жа неяк ужо катаўся. Праўда, скінуўся, але тое было летась. Ен жа ніколечкі не ўцяўся і не спалохаўся.

Распірае Малышка радасць не толькі ад заўтрашняй падзеі. Галоўнае — не гэта, галоўная радасць наперадзе. Гэтай яго галоўнай радасцю жыве зараз і мама, і ўвесь, здэцца, свет, толькі вось Вецік бы і не заўважае, хваліцца сваім самакатам...

Дзе, дзе яго самакат? Калі яшчэ будзе? А вось тое, што гэтак цешыць, гэтак хвалюе Малышка,— вось яно, тут, пад рукой ужо, у шафе.

Малышок не вытрымлівае, падыходзіць да шафы, адчыняе — мама ніколі не замыкае ад яго нічога, у куточку знаходзіць і свой новенькі, з блішчастым замочкам, парт-

фель, і гэткія ж новенькія, таксама карычневыя, як і партфель, бацінкі са шнуркамі. А вунь на плечыках вісіць і чорны касцюмчык, які гэтак упадабаўся, што, калі памералі, перш чым плаціць грошы, ніяк той касцюмчык яму не хацелася знімаць.

Малышок бярэ партфель і тут жа, ля шафы, сеўшы на падлогу, вымае з яго не меншае багацце, чым і бацінкі, і касцюмчык, і ўсё-ўсё астатняе, што ў яго ёсць. Скарб той, багацце тое зараз яго, толькі яго аднаго. Гэта і вялікі белы пенал, што так дзіўна, так незвычайна адчыняецца і ў які, калі захоча, можа схаваць і свае значкі, а іх назбіраў ужо нямала, і двух залацістых засушаных жучкоў, і некалькі старых, зеленавата-цёмных, знойдзеных у зямлі, манет. Гэта і алоўкі, яшчэ, праўда, не завостраныя, а то ён хоць трохі памаляваў бы, так жа хочацца. Тут і ручка з пяром, і чарнільніца, і сшыткі, цэлы стосік розных сшыткаў — у клетачку і ў касую лінейку. Гэта і буквар з малюнкамі на кожнай старонцы, на якія глядзі хоць дзень, хоць ноч — не нагледзішся, бо надта ж яны гожыя.

Усё купіла Малышку мама, бо сёлета ж, нарэшце, збудзецца яго мара — ён пойдзе ў першы клас.

А зараз Малышок дома адзін, чакае дачакацца не можа, калі ж бліжэй да лесу нахіліцца сонца. Тады неяк і на вуліцы лепей, і ў гульні розныя гуляць хлапчукоў болей знаходзіцца, і курэй амаль што не трэба пільнаваць, бо к вечару яны не так лезуць у агарод, у грады, болей шыюцца да ганка, чакаюць гаспадыню. А гаспадыня гэтая — яго, Малышкова, мама. Яна цяпер на полі, на калгаснай працы. Хутчэй бы прыйшла, а то надта ж сумна без мамы!

Палюбаваўшыся, пацешыўшыся, ён складвае назад, у партфель, увесь свой скарб, ставіць на ранейшае месца ў шафу, зачыняе. Нейкі час сядзіць проста так, прыслухоўваецца. А Вецік па-ранейшаму ўсё галёкае, усё кліча. Вось жа настыра!.. Трэба, відаць, папытаць, чаго яму так зажадалася.

Малышок выходзіць на ганак. Да ног яго кідаецца Шарык. Шарык становіцца на заднія лапы, а пярэднія кладзе Малышку на грудзі, заглядвае ў вочы.

— Шарык, Шарык! — водзіць рукой па гладкай поўсці свайго любімца Малышок, усчувае: — Што, есці хочаш? А гаўкаць, а курэй пільнаваць то не, га? Абібок ты, вось ты хто...

Нібы ўсё, да апошняга слова, разумее. Шарык апускае

галаву, вінаваціцца, як бы сказаць хоча: «Што-што, а вось гэта... не ўмею, хоць забі, хоць зарэж!»

Малышок, аднак, шкадуе сабаку, ідзе на кухню, адразае ад бохана ладную лусту хлеба, кідае сабе пад ногі. Шарык прытанцоўвае, радасна скавыча, накідаецца на хлеб, але не есць. Спачатку нюхае, ці смачна, ці вартая хоць чаго тая яда. Не разабраўшыся ў гэтым з дапамогай носа, ён каштуе хлеб, каўтае невялікі кавалачак. Пасля трасе пысай — болей не жадаю.

— Ну і не трэба,— дакарае яго Малышок.— Бач, які хітранькі. Хлеб яму ўжо не ўсмак... Мяса захацеў?

Шарык, зноў нібы разумеючы, радасна віляе хвастом.

Яны ідуць у двор. Малышок адчыняе брамку, выпускае спачатку Шарыка, пасля сам выходзіць на вуліцу. Але на вуліцы — ні душы. Адгалёкаў, некуды знік і Вецік. «Мо купацца пайшоў, таму і клікаў?» — падумалася з зайздрасцю. Ого, куды-куды, а вось на рэчку Малышок бегма бег бы. Там, ведаў, зараз як не ўсе яго дружбакі. Недзе купаюцца, гаць папраўляюць, а Барыс Гонта — той, пэўна ж, ловіць сліжоў. Лоўка ў яго сліжы ловяцца, вось бы так яму, Малышку, навучыцца!

Але нельга Малышку пакуль што на рэчку. Мама строга забараніла. Сам вінаваты. Ну, пэўна ж, сам. Мама не сцярпела, рамянём нават аперазала. А пасля цалавала, усё хінула да сябе, усё выгаворвала: «Гэта ж здурнець можна. На таку-у-ую глыбіню палез! І хоць бы плаваць умеў. Яшчэ б трохі — і капцы, з галавой пайшоў бы на дно...»

Добра помніць той дзень Малышок, ой добра. Спёка тады стаяла — не меншая, мо нават большая, чым сёння. Пясок на вуліцы — прысак, а не пясок. Басанож на адным месцы доўга не ўстаіш.

Мама была не на рабоце, і Малышок радаваўся, што не трэба сцерагчы дом, ганяць курэй, каб на іх коршак. Асабліва рабая, з адвіслым, паламаным крылом памаўза ў пячонкі яму ўелася. Вока з яе не спускаеш, а ўсё роўна нашкодзіць...

Яны з Вецікам прыйшлі да рэчкі ў самую макаўку дня. Адразу ж далучыліся гуляць у пікара. Добра спацеўшы, стаміўшыся, з асалодай ляглі на мурог. Некаторыя плавалі. У тым месцы, дзе яны, хлапчукі, загацілі, вады набралася як ніколі. Вельмі радавала, што іхняя работа не прапала дарма. Цяпер і дарослыя з зайздрасцю паглядаюць на купальню.

Малышок не лез на глыбокае. Яго толькі-толечкі навучылі грэбаць рукамі і нагамі, трошкі трымацца на вадзе, таму глыбокага ён пакуль што баяўся. Але ж тут зачапілі яго, па жывым разанулі...

— Г-гы-ы-ы,— выскаляўся, здзекаваўся з Малышка вушаты Петрык Лосеў.— Табе б з курамі толькі грэбацца. Усе ўмеюць плаваць, а ты адзін нейкі недарэка.

— Умею і я,— пакрыўдзіўся Малышок.

— Г-гы-ы-ы,— зноў вышчарыў зубы Петрык.— Чаго ж ты тады пузам пясок шаруеш?.. Вунь зірні, якое чырвонае.

Усе, хто слухаў іх, засмяяліся. Малышок глянуў на свой жывот і гатовы быў скрозь зямлю праваліцца. І праўда ж: жывот пунсавеў, бы крапівой хто адсцёбаў, а ніжэй, ля трусоў, нейкая трава да цела прыляпілася, неададраць.

Брыдка стала Малышку. «А, што будзе, тое і будзе!» — ён хуценька лёг на ваду, з усяе моцы пачаў пляскаць па ёй рукамі і нагамі і паплыў, кіруючы да другога берага.

Спачатку плылося нішто. Ён сам не чакаў ад сябе такога. Ведаў, што пад ім глыбіня — страхоцце адно. Але ж хай глядзяць, хай не думаюць надта, што ён такі ўжо баязлівец. Пасля, як даплыве, ён сам з іх пасмяецца...

— Не плыві болей, назад давай,— чамусьці не сваім голасам крыкнуў Вецік.

І тут Малышок адчуў, што ўсё — сілы скончыліся, рукі і ногі болей не слухаюцца, свінцом наліліся. Адразу невядомая сіла пацягнула ўніз. Задыхаючыся, вырачыўшы ад жаху вочы, Малышок нібы паспеў нешта крыкнуць і...

Як і што далей было, ён ужо не помніў. Апамятаўся, калі ляжаў на траве, а над ім схіліўся дзядзька Лёдзік, іхні брыгадзір, і, вінавата апусціўшы галовы, стаялі шчыльным колам хлапчукі.

— Хіба ж так можна? — расціраючы яму шурпатай даланёй грудзі, нязлосна казаў дзядзька Лёдзік.— Не нарваўся б я — і не жылец ты на гэтым свеце, малец. Біць цябе няма каму. Гэта ж чый будзеш? А-а, ведаю, ведаю... Ну-ну...

Дасталося яму, Малышку, тады ад маці, ой дасталося. З таго часу на рэчку — і не патыкайся нават. Сам сябе гэтак пакараў... Дзе і з кім зараз гуляць?

Ён сеў на лаўку пры плоце, спадзеючыся, што, можа, Вецік аб'явіцца, можа, не пайшоў на рэчку. Ля ног ягоных улёгся, скруціўся абаранкам Шарык.

Раптам увагу Малышка прыцягнуў падлетак, што плёўся сярэдзінай вуліцы, пільна прыглядаўся да кожнай хаты па іхнім баку. «Каго ж ён шукае? — узяла ўжо сапраўдная цікавасць.— Дзіўны нейкі...»

Падлетак, якому можна было даць гадоў трынаццаць-чатырнаццаць, і сапраўды выглядаў дзіўна. Дармо што пякло — гарачыня ўсё не спадала, хоць і пераваліла даўно за поўдзень,— на незнаёмым быў зашпілены картовы, з парваным крысом, моцна зашмальцаваны пінжачок няпэўнага колеру, латаныя на каленях штаны, на лоб насунута брылём трохі набок, відаць, ад сонца, брудная, пакамечаная, акурат пажаваная, шапка. Яна, адразу кідалася ў вочы, была вялікая, не па ім. На нагах — не то з брызентавым верхам ношаныя-пераношаныя туфлі, не то іншыя якія атопкі.

Малышок падумаў спачатку, што гэта пляцецца знекуль здалёку жабрак. Але, прыгледзеўшыся больш пільна, ён адкінуў такую думку. Ну, перш-наперш, жабракі ўжо не ходзяць. Відаць, і няма іх зараз.· Перавяліся ўсе. Па-другое — хіба ж можа такі малы быць жабраком, валачыцца адзін па свеце? А мо цыган?

Параўняўшыся з хатай, ля якой сядзеў Малышок, падлетак спыніўся, паўглядаўся ў вокны, памыляў губамі, бы нешта падлічваў. Твар яго, стомлены, запылены, учарнелы ад сонца, перасмыкнуўся, па ім прабегла нейкая незразумелая грымаса.

— Ты тут жывеш? — хрыпла спытаў ён у Малышка, дагэтуль як бы і не прыкмячаючы таго на лаўцы.

— Я,— смела адказаў Малышок і таўхануў нагой Шарыка: маўляў, які ж ты сабака, можаш толькі спаць ды есці, а пільнасці — аніякай. Гаўкні хоць разочак. Хоць дзеля прыліку. Ну!

Аднак Шарык і не падняў галавы.

Падлетак падышоў бліжэй, з цікавасцю акінуў позіркам Малышка, спытаў зноў:

— А прозвішча тваё як, га? Можа, і не ведаеш нават? Яшчэ ж малы...

— Чаму ж не? Ведаю,— набраўся ўжо смеласці Малышок. Ён сказаў і прозвішча сваё, і як зваць яго.

Падлетак чагось абрадаваўся, яшчэ з большай цікавасцю пачаў углядацца ў Малышка. Прысеўшы на лаўку, з палёгкай уздыхнуў.

— Вось такія яны, дзялы,— невядома які ўкладваючы сэнс у свае словы, па-даросламу сказаў незнаёмы.

— Ага, такія,— падтакнуў Малышок, усё яшчэ насцярожана прыкідваючы ў галаве: хто такі, чаго ён дапытваецца, што трэба?

Аднак з кожнай хвілінай насцярога яго мякчэла, таяла, саступала месца спагадзе да гэтага хлопца. Ён, Малышок, не мог зразумець, адкуль, з якіх глыбінь душы ідзе тая спагада. Адкуль гэты ток, гэта сіла, якія пацягнулі яго да незнаёмца? Мо з цёплых, але чамусьці надта журботных вачэй яго?

Таму, калі той папрасіў вады, Малышок ахвотна падхапіўся з лаўкі, запрасіў разам зайсці ў хату. Прагна выпіўшы цалюткі карэц цеплаватай ужо вады, нечаканы госць спытаў:

— А маці, бацька дзе? Што ж цябе аднаго кінулі?

— Мама на рабоце. Лён полюць,— адказаў Малышок.— Вечарам будзе.

— Ну, а бацька?

Малышок, не ведаў, казаць ці не. Аднак рашыўся, адчыніў дзверы ў пярэдні пакой, паклікаў хлопца і паказаў пальцам на сцяну. Там, у цёмнай рамцы, вісеў павялічаны партрэт мужчыны ў ваеннай гімнасцёрцы, грудзі якога скрозь былі ўвешаны ордэнамі і медалямі.

— Во мой татка,— сказаў горда і ўжо цішэй, са смуткам, дадаў: — Толькі няма яго. Фашысты забілі... на фронце. Мама казала...

— А мама твая?..— хацеў нешта яшчэ спытаць госць, але нібы спалохаўся чаго, прыкусіў язык, журботнымі вачыма, у якіх, здэцца, бліснулі слёзы, зноў паглядзеў на Малышка.

«Дзіўны нейкі,— падумалася Малышку.— Плача нечага... Мо есці хоча? Дык я зараз...»

Падлетак, скалануўшыся, нібы толькі што прахапіўся пасля страшнага, вельмі страшнага сну, усё ж развеяў, адагнаў прэч насланнё, што душыла, мучыла, ірвала на часткі яго цела... Як нічога і не было, ён падзякаваў за ваду, сказаў, што вельмі смачная, падаўся на кухню, каб адтуль выйсці на двор.

## 2

Спіну было ўжо не разагнуць. І яна не разгінала, бо ведала — пасля, калі расхалодзішся, дасі сабе паблажку, стане яшчэ цяжэй зноў уваходзіць у звычны рытм. Тым болей што засталося гэтак мала тае праполкі.

Яна кінула вокам наўкруг. Бабы, усе як адна, таксама шчыравалі, ірвалі і ірвалі пустазелле, здэцца, абмацвалі, папраўлялі кожнае каліва, кожны кусцік, каб яшчэ лепей рос, набіраў моцы і гожасці іх лянок.

Смажыла, гэтак жа шчыравала і сонца, і брала ўжо трывога, хаця б доўга не трымалася суша, хаця б прайшоў цёплы спорны дожджык. Тады б усё пайшло — і тут, у полі, і дома — як на дражджах.

Аднак нішто не паказвала на змену пагоды. Увесь амаль дзень неба, нейкае выцвілае, не такое, як увесну, было без аднае хмурынкі, і толькі к вечару з невядомай глыбіні зусім нечакана з'яўляліся белаватыя, бы воўна, касмылі, якія зусім не мяшалі сонцу паліць і паліць зямлю. А яшчэ гэты сухавей...

Вось і брала трывога за ўраджай. На лён яны, бабы, ускладалі як не ўсе свае спадзяванні. У мінулым годзе ён не вырас, не ўдаўся, і працадні іхнія так і засталіся амаль голымі палачкамі. А гэтак жа трэба капейка! Дзірак тых — латаць не залатаць.

Яна думала пра сына, свайго Малышка. Добра, што хоць змагла хлопцу да школы тое-сёе прыдбаць. Яшчэ ж трэба якую куртачку ці мо і палітончык. Хай у школу ідзе не горай, чым другія, у каго ёсць і бацька... Абы толькі вучыўся, быў, нарэшце, пры справе.

Сэрца зайшлося ад жалю, калі падумала, што ён, Малышок, цэлыя дні адзін дома. Божа, хоць бы зноў чаго не ўтварыў, хоць бы зноў не спакусілі, не зманілі на тую купальню!

Незаўважна, уся ў думках, яна дайшла да саменькага краю. Жанчыны таксама канчалі свае «дзялкі».

— Ну што, бабы,— гукнула звеннявая Раіса Крот.— Па хатах ці на новы ўчастак падамося? Яно яшчэ і ранавата сённячы...

— Годзе на сёння, годзе,— ускліквулі ўсе як не ў адзін голас.

— Хаця б вот тутачкі, побач той участак. А то прыся за свет,— гэта ўжо голас Уляны Ліпень.

Выцершы хто падолам, хто касынкай ліпкі пот, жанкі, перш чым падацца дадому, заскочылі па патрэбе ў беразнячок, які адгаліноўваўся ад лесу, клінам уразаўся ў поле. Тут, павэдлуг з адкрытай мясцінай, трымалася нейкая прахалода, пахла карой, угрэтым лісцем.

Хацелася паваліцца на зямлю, асабліва там, дзе цянліва, і хоць трошкі даць спачын натруджаным рукам і на-

гам, усяму целу. Яна, мама Малышка, мо і зрабіла б так на якую хвіліну. Але ўбачыла, не, пацеркамі самі бліснулі ў траве, некалькі буйных сакаўных сунічын. Абрадавалася, палезла ў самую гушчэчу кустоўя. Нагнулася — і яшчэ большая радасць агарнула. Тут, там, толькі варочай галаву, ніжэй нахіляйся, чакалі, вабілі спелыя ядраныя ягады. «Сапраўды, царскія,— падумалася з уцехай.— Так жа, во, не вельмі і кідаюцца ў вочы, а нагнешся, паклонішся ім, і яны скуль толькі і бяруцца».

Яе гукалі бабы, каб ісці разам, але яна сказала, што дагоніць, што натрапіла на суніцы і трэба ж пабраць. Назбірала, калі прыкінула, амаль прыгаршчы, кінула колькі штук у рот, пакаштавала — смакоцце, нічога не скажаш. А якія вітаміны! «Вот Малышку будзе і гасцінец нечаканы».

Яшчэ з двара, убачыўшы, што адчынены сенцы, яна гукнула сына. Але той не азваўся. «Пэўна, у хаце»,— падумала, нецярпліва заходзячы ў кухню. На парозе нечакана сутыкнулася амаль твар у твар з незнаёмым падлеткам. Падлетак бы спалохаўся чаго, адступіў колькі крокаў назад, даючы ёй прайсці, затым, спахапіўшыся, ціха павітаўся. Малышок стаяў побач, ля стала, таксама неяк разгублена глядзеў на маці. Нарэшце сказаў:

— Мама, ён здалёку. Вады хацеў і я... мы гаварылі...

— Гэта ж адкуль? — Яна акінула падлетка хуткім вострым позіркам, у якім змяшаліся разам і не ўсвядомленая яшчэ насцярога, і звычайная жаночая цікаўнасць да незнаёмага, і жаласць, што ёсць, во, яшчэ на свеце і абарваныя, і знясіленыя, і галодныя. Яшчэ не ўсё ўпарадчылі пасля такой жудасці, такой вайны... «Божа, колькі зла прынесла яна ў кожную хату, кожную сям'ю!.. Колькі яшчэ спароджанага ёю гора ходзіць па зямлі!» — нахлынулі цяжкія, гнятлівыя думкі.

Падлетак, аднак, нічога не адказаў на яе запытанне.

Яна яшчэ раз зірнула на яго і... нібы што абарвалася ўсярэдзіне. Зноў паўглядалася. Сумнення болей не было: гэта ён!.. Адкуль, якім чынам дапяў ён сюды, дазнаўся, адшукаў дом?! Хто ведаў, хто мог навесці на след?!

Першую хвіліну яна хапала ротам паветра, ніяк не магла апамятацца. Дрыжэлі рукі, і яна ледзь не рассыпала суніцы, якія трымала ў ражку касынкі. Хуценька высыпала ягады ў місу, дала Малышку. Каб не выдаць сябе, свайго хвалявання, прысела на зэдлік і, касынкай выці-

раючы пот, які гарошынамі каціўся з твару, усё паўтарала:

— Ото ж і задуха! Гэта ж трэба — нат вечарам не палегчала. Што ж гэта будзе?..

Не хаваўся і падлетак, таксама нейкі час, не адрываючыся, глядзеў ёй у вочы, пакутліва моршчыў лоб, думаў, бы нешта прыгадваў. Твар у яго раптам перасмыкнуўся, ён адвёў позірк, і жанчына здагадалася: хлопец пазнаў яе, толькі сцятыя яго вусны лепш чым што гаварылі, што не выдаў ён тайны, не ўвёў Малышку ў вушы таго, чаго не трэба, ні ў якім разе не трэба таму ведаць.

Стала трошкі лягчэй. А тут і сам Малышок, сваім бесклапотна-здаволеным выглядам, тым, як апетытна пачаў аплятаць суніцы, вымазаў нават і твар, пацвердзіў, што ніхто нічым не развярэдзіў, не параніў яго душу.

— Ты ж бы з госцем падзяліўся,— квола ўсміхнулася ўжо яна, гледзячы на сына.— А то адзін...

Малышок перастаў есці, пачырванеў, затым схапіў ля вядра пусты карэц, сыпнуў у яго ягад і, падаўшы хлопцу, сказаў трохі вінавата:

— Пакаштуй! Сма-а-ачна!

Той не ведаў, як яму быць: хутчэй сысці куды-небудзь, пакуль не здагадаліся ні пра што, ці яшчэ трохі пабавіцца ў гэтай утульнай хаце? Міжволі падумаў: ну куды, куды ён зараз пойдзе? Хто прывеціць яго? Дзе прытуліць галаву? Але ж колькі яшчэ можна затрымлівацца тут? Што сказаць?..

Яго ваганні, яго душэўны разлад адчула, заўважыла жанчына. Каб не даць падлетку апамятацца, прыняць нейкае канчатковае рашэнне, сказала:

— А вот мы зараз і павячэраем разам.— І, ужо звяртаючыся толькі да яго, дадала: — Ты ж, можа, не спяшаешся нікуды? Тады і паначуеш у нас. Куды ж, нанач гледзячы, можна ісці?..

Па тым, што госць не запярэчыў, моўчкі стаяў, унурыўшы галаў, яна зразумела: ён гэтага сам жадаў, нібы чакаў такой прапановы.

Малышок таксама абрадаваўся, пачаў тармасіць хлопца, каб распрануўся, зняў пінжак, бо горача ж, пацягнуў яго ў залу — паказаць свае абновы да школы. «Вось дык хвалько!» — усміхнулася па-мацярынску цёпла.

Рыхтуючы вячэру, жанчына ўслухоўвалася, аб чым яны гамоняць. Уся як наэлектралізаваная, яна баялася прапусціць хоць бы адно слоўца хлапчукоў. «Толькі б не

выдаў, толькі б не прагаварыўся...» — амаль заклінала яна, прасіла літасці ў гэтага, па ўсім бачна, абяздоленага падлетка.

Вечарам, калі добра паелі, калі паслала абодвум на розных ложках, а госцю памяняла чыстыя і прасціну, і наўлечку, перад тым, праўда, угаварыўшы яго і сына памыць у цёплай вадзе твар, шыю, ногі, калі змораныя хлопцы засаплі насамі, яна яшчэ доўга сядзела ў кухні, перабірала вопратку падлетка, нанова латала, падшывала, прымацоўвала гузікі, а дзе іх не хапала — пашукала наўзамен іншыя. «Скуль ён прыйшоў? — думалася штохвіліны.— Не бачна ж, каб быў дзе ў дзіцячым доме. Хіба там да такога дапусцілі б? Вядома ж, не. Быў бы там і апрануты, як другія дзеці, і не такі змардаваны. Як жа склаўся яго лёс, яго доля? Заўтра трэба неяк дазнацца, даваць нейкае рады...»

І зноў пачало тачыць: як, як усё будзе? Як ён адшукаў іх? А мо хто знарок паслаў, каб зманіць, звесці сына, яе Малышка? Не, цяпер ужо хай ірвуць яе на часткі, хай што хочуць робяць, але яна нікому не аддасць яго... Ён стаў ёй даражэй за ўсё на свеце, ён адзіная зараз уцеха яе і надзея, яна выпакутавала права на гэтае сваё жаночае шчасце. Хто ж, хто мае права адняць у яе шчасце?!

І во як зараз зноў убачылася жанчыне тое, што было сем з хвосцікам гадоў назад, тым прадвеснем, калі яна вярнулася на свой хутар...

## 3

Раней, калі хто казаў, што чалавек прадчувае бяду, што нават сны маюць прарочы сэнс, Вольга не вельмі верыла. Ат, ці мала што каму ўзбрыдзе ў галаву...

Таму, прахапіўшыся апоўначы ў халодным ліпкім поце ад жахлівага сну, яна абрадавалася, што гэта ўсяго толькі сон, і зноў неўзабаве заснула. Зноў чаўплося чортведама што. Яна зноўку прахапілася, лежачы з расплюшчанымі вачыма, пастаралася прыгадаць, што ж гэта ёй снілася. Але, як і заўсёды бывала раней, усё выскачыла з галавы.

Злезшы з ложка, Вольга ўпоцемку намацала на шкапчыку запалкі і пасвяціла на ходзікі, што гулка ў начной цішыні цікалі на сцяне. Не было яшчэ і чатырох гадзін. Яна падышла да калыскі, нахінулася, прыслухалася. Дзіця спала, дыхала спакойна і роўна.

Заўчора ўвечары Вольга думала, што ўжо ўсё, яно не выжыве, жыць яму адмерана не дні, а гадзіны. Цельца невядома ад чаго пасінела, дробненькі, з кулачок, тварык, які і да гэтага быў зморшчаны, нібы спечаны яблык, зараз зусім зблажэў, не выяўляў, здэцца, ніякіх прыкмет жыцця. Нешта тады ў Вользе здрыганулася, нейкая жаласная нітачка тарганулася ўсярэдзіне. Адвечны інстынкт жанчыны як бы спытаў: што ж гэта ты, што ты глядзіш, апусціўшы рукі? Перад табой жа дзіця, зусім бездапаможная, безабаронная істота, якая патрабуе ўвагі, сэрца, рук. Хто ж, як не ты, возьме на сябе клопат пра новае жыццё, не дасць на глум, на згубу сляпой хваробе, уратуе ад немачы?

Яна зноў, пажаваўшы мякіша, загарнула яго ў шматок чыстай марлі, макнула ў падсалоджаную ваду і асцярожна ўсунула самаробную суслу дзіцяці ў роцік. Але яно і не думала смактаць. Нават ні адна рыска не варухнулася на ягоным тварыку. Вольга зусім разгубілася. Пасядзеўшы хвілін колькі, яна рашыла схадзіць да Адолі: мо тая што падкажа, дасць якую раду.

Адоля таксама не ведала, што рабіць. Памеркавалі былі разам, каб як паказаць урачу. Але дзе ж возьмеш зараз урача, дзе адшукаеш? Раней, да вайны, было проста — бальніца ў Чубаўцы ратавала іх ад многіх няшчасцяў. Цяпер жа і ад Чубаўкі, і ад бальніцы засталіся адны галавешкі. А везці дзіця ў раён... Па-першае, дарогу зусім расквэсіла, з гразі, балота не вылезеш, а па-другое, каб і вылез, то хіба ж давязеш да таго райцэнтра, за дваццаць кіламетраў, такое хілае немаўля. Не, трэба шукаць нейкае іншае выйсце.

Павагаўшыся, Адоля прапанавала добра памыць, папарыць дзіця ў цёплай вадзе, а яна тым часам заварыць зёлак і паспрабуе сілком, з лыжачкі, трохі папаіць хлопчыка настоем тых зёлак. А што ж іншае могуць яны прыдумаць?

Увечары Вольга добра напаліла печ, каб было цёпла, падрыхтавала начоўкі, чысты абрус, пагрэла коўдрачку. Адоля мудравала над лекамі.

Калі зрабілі ўсё так, як хацелі, і Адоля пайшла дадому, Вольга з радасцю заўважыла, што дзіця і сапраўды паружавела, у сне нават раз-другі перасмыкнула губкамі, як бы просячы есці. Вольга зноў усунула яму ў роцік падсалоджаны ў марлечцы мякіш, а сама пайшла на кухню, каб разбавіць кіпячонай вадой малака: у Гораша ацялілася карова, і Вольга дамовілася браць па літру — для сябе

і дзіцяці, з умовай, каб разлічыцца пазней, недзе летам ці ўвосень.

Гэты раз дзіця зноў не стала нічога есці. Але ўжо наранку — няўжо памаглі тыя зёлкі? — яно выпіла мала не паўшклянкі малака. Увесь той дзень Вольга чатыры ці пяць разоў карміла яго з лыжачкі, бо не было соскі, каб надзець на бутэлечку і карміць з яе.

Нанач, кладучы немаўля спаць, Вольга была ўжо спакойная за яго. І вось зараз, прачнуўшыся ад незразумелых кашмараў, яна спачатку падумала: ці не з дзіцем кепска? Аднак, пераканаўшыся, што страхі яе дарэмныя, Вольга прымусіла сябе страсянуцца, скінуць насланнё, якое навалілася на яе незразумелым цяжарам, душыла ледзь не за горла.

Болей яна ўжо не лягла. Выйшла на двор. Было яшчэ цёмна, хоць па часе і павінна брацца на раніцу. Цёмна найперш ад таго, што неба густа ўслалі нізкія цяжкія хмары, з якіх церушыў дождж уперамешку са снегам І толькі на ўсходзе, за Горашавым хутарам, свінцовазмрочнае неба прачэрчвала вузкая, у палец, светлая палоска, нібыта хто наклеіў там шматок чыстай паперы. Гэты шматок і даваў нейкую надзею, што мо выпагадзіцца, выгляне сонца, вясна, нарэшце, возьме сваё, бо ўжо няма ніякіх сіл чакаць таго цяпла.

З вясной, цяплом Вольга звязвала асаблівыя надзеі. Найперш думалася, вядома, пра Івана. Дзе ты зараз, родны, любы чалавек? Куды закінуў цябе лёс? Па якіх ходзіш дарогах? Яна ведала — сама паспытала, ажно сытая па горла,— як нялёгка быць на вайне, а ў холад, у сцюжу — і тым болей.

Вясной жа, летам, хоць, праўда, бяда можа падсцерагчы чалавека ў любы час, яна не пытае, якая пара́, аднак, апроч таго што не мерзнеш і не тонеш у гразі, неяк весялей на сэрцы ўжо толькі таму, што ўсё ажывае, дыхае, набірае моцы, цешыць вока сваім багаццем гукаў і фарбаў. Абуджаная да жыцця, растармошвае яна, абуджае і цябе самога, хмелем чакання і нейкіх добрых, салодкіх надзей напаўняе кожную клетачку твайго змучанага, змардаванага цела. Па-другое, і гэта для Вольгі галоўнае, яна чакала канца вайны, ведала, што вясной павінна ўсё вырашыцца, вораг зараз загнаны амаль што ў сваю бярлогу і абложаны з усіх бакоў. Толькі б хутчэй яго дабілі, і тады Іван прыйдзе дадому, яны зноў зажывуць зладжана і шчасліва, як да вайны.

Як жа зараз не хапае яго тут, дома! Не хапае яго ласкі, пяшчоты, яго спакойнай разважлівасці. Не хапае яго мужчынскага вока: гаспадарка ж, во, за той час, пакуль яна, Вольга, не была дома, растрэсена, расцягнута невядома кім і калі, усё прыйшло ў поўны заняпад, не ведаеш, як і з чаго пачынаць, за што найперш зачапіцца...

Пастаяўшы трохі на дварэ, Вольга вярнулася ў хату. Газоўкі не стала паліць. Намацаўшы ў куце заржавелую, там-сям з вышчарбленым лязом сякеру, яна пашчапала сухое палена, пачала падпальваць у печы. Трэба ж нешта зварыць, нешта і самой паесці, бо і так ногі ледзьве цягае. Нічога ж няма дома. Ні ў пограбе, ні ў хляве, ні ў кладоўцы. Добра, што Адоля з Тамашом падсобілі ў тым-сім, пазычылі кошык бульбы, рэшата ржаной — свайго, на жорнах, грубага памолу — мукі, нават далі кавалачак здору, хоць і самі больш на нішчымніцы сядзяць. На колькі ж тых прыпасаў хопіць? На тыдзень, ну, два, сама болей. А тады што — зубы на паліцу і памірай? Не, трэба ж нешта прыдумаць. Не такое яна пераэкыла ў лесе, неяк выкруціцца і цяпер, быць таго не можа...

Вольга старалася гнаць ад сябе благія думкі, нейкія незразумелыя, цяжкія прадчуванні. Аднак нішто не памагала. Цэлы дзень яна сноўдалася, як сонная, нешта рабіла пад паветкай, лазіла нечага на вышкі, невядома для чаго перабірала ў хаце рыззё.

Толькі к вечару, пакарміўшы і прыспаўшы малое, яна пайшла да Гораша. Было гразка. Снег ужо сышоў, аднак дождж, які ліў апошнія колькі сутак, ператварыў і дарогу, хоць па ёй мала зараз хто хадзіў і ездзіў, і поле ўзбоч у суцэльнае месіва. Там-сям паблісквалі лужыны, і Вольга старанна іх абмінала, бо хоць і ўссунула на дзіравыя боцікі галёшы — адшукала, на радасць, у кладоўцы амаль новыя, даваенныя,— але вады было многа і можна лёгка набраць праз верх, намачыць ногі. А намочыш — хочаш ці не — зляжаш. Хварэць жа ёй няма за кім і калі. Вясна, во, падганяе, рупіць...

Яна, сама таго не заўважаючы, прыспешыла крок. І ўсё ж, якая ні тлумная была галава, якія ні адольвалі клопаты, вока вылучала многае з таго, што хоць трохі ўсцешвала, давала радасці.

Вунь у небе — пасля абеду яно сапраўды ачысцілася ад хмар, у блакітным яго бяздонні купалася чыстае, як бы вымытае, сонца — маленькай цёмнай кропачкай вісіць жаўранак. Ля валуна, у зацішку, на санцагрэве вылузалі-

ся з зямлі кволыя кветачкі маці-і-мачыхі, ганарыста вабяць, клічуць да сябе: палюбуйцеся, якія мы прыгожыя, якія мы пяшчотныя! Паблізу шчыруе ў пошуках чаго смачнага шпачок. Чаму ж ён адзін? А дзе яго сябар ці сяброўка?

А там, ускрай лесу, у недасягальнай вышыні варушыцца, велічна плыве ланцужок. Па трубных гуках, ад якіх ажно шэрхне цела, якія ўскалыхваюць зямлю і ўсё жывое на ёй, Вольга здагадваецца, што гэта журавы. Але ж чаму такі журботны іх покліч? Што хочуць сказаць яны?..

Загледзеўшыся на журавоў, Вольга аступілася з сушэйшага і правай нагой трапіла ў глыбокую каляіну, выезджаную некалі калясьмі і зараз запоўненую парыжэлай вадой. Імгненна выхапіла нагу назад, але ўсё роўна было позна: праз верх, праз шырокую халяву набрала поўны боцік. Адразу зачмякала ўсярэдзіне, назе стала холадна і непрыемна. Трэба было б, на добры лад, дзе спыніцца, выліць з боціка ваду, выкруціць панчоху, але Вольга рашыла дайсці, балазе блізка ўжо, да Гораша і там пасушыцца.

Сабакі, як і заўсёды, не далі ёй самой зайсці ў хату. Нават удзень яны былі спушчаны з ланцугоў і гатовы, здэцца, разарваць на кавалкі кожнага, хто набліжаўся да хутара. Найбольш у такіх выпадках выручаў сам гаспадар Гораш. Прыгорблены, расхрыстаны, ён з'яўляўся нечакана, нібы стаяў дзе за вуглом і цікаваў, падыходзіў да варот, нягнуткімі, але ўчэпістымі пальцамі адкідваў нейкую адмысловую запору, адчыняў высокую дубовую брамку. Калі чалавек ступаў на падворак, Гораш уладным голасам цыкаў на ваўкадаваў, і тыя, надзіва, адразу падціналі хвасты, шыліся ў свае будкі.

Гэты раз адчыніў брамку і правёў Вольгу не Гораш, а яго прыдуркаваты сын Стасік, які і зімой і летам хадзіў у кажусе, аблавухай аблезлай заячай шапцы і зашмальцаваных, ажно блішчэлі, ватных штанах. І ўсё роўна скардзіўся, што яму холадна. Звычайна ўзімку ды і вясной Стасік не пакідаў печы, там больш за ўсё і еў і спаў, і таму Вольга нямала здзівілася, убачыўшы хлопца на дварэ.

— А дзе ж бацька, маці? — спытала ў яго.

— Гы-гы-гы,— невядома чаго зарагатаў Стасік, паказаўшы жоўтыя вышчарбленыя зубы.— Сечку ў адрыне... чых-чых.

Вольга прысела ў кухні на ўслон пры печы, зняла

правы боцік, сцягнула мокрую панчоху, босую нагу прытуліла да цёплых цаглін. Спачатку ў хату зайшла Зося, а неўзабаве і сам Гораш з бярэмем сухіх бярозавых плашак, якія пляхнуў, ажно падлога здрыганулася, ля саменькага прыполля.

— Нешта ж ты зарана сёння,— сказала, звяртаючыся да Вольгі, Зося, скідаючы з сябе целагрэйку.— Яшчэ не даіла. Пабаўся трохі, падаю.

— Нічога, пачакаю,— Вольга ямчэй села на ўслоне.— А заадно пасушуся — ускочыла ж, во, бачыш. Ды і з гаспадаром хочацца паталкаваць.

— А што такое? — адразу насцярожыўся Гораш.

— Нічога такога,— не ведала, як падступіцца, пачаць гаворку Вольга.— Як там на фронце, мо чуў што? Ці скора тых фрыцаў прыкончаць? Гэта ж як у яме сядзім. Ні радыё, ні газеціны якой, каб пачытаць.

— А мне скуль вядома? Сарока на хвасце прынесла, навасці тыя?

Вольга не стала больш хітраваць:

— Дык ты б свой прыёмнік, суседзе, настроіў. Ён жа ў цябе ага які быў, усе гарады браў. Цяпер жа, можна ўжо, некага баяцца.

Гораша як драцянкай хто сцебануў па голым месцы. Ён узвіўся, забегаў па хаце, запырскаў слінаю:

— Дзе, дзе той прыёмнік, дзе? Хто бачыў? Здаў па загаду ў першыя ж дні. Чакаць, каб кокнулі з-за яго... Мне жыць яшчэ не надаела. А слухаць, дзе хто што брэша па таму радзіву... Яшчэ невядома, як усё абернецца...

«Ну і гад жа ты, змяя падкалодная! — хацелася Вользе кінуць прама ў зарослы шчэццю, чырвоны, што бурак, твар Гораша.— І вайна цябе нічому не навучыла. Які быў, такі і застаўся. Усе ваявалі, крыві, жыцця свайго не шкадавалі, каб вораг не таптаў, не паганіў нашу зямельку, не гвалціў і не здзекаваўся, а ты і пад яго ўмеў падладзіцца, лізаў яму азадак. Цьфу! Таму і не кранула немчура ні цябе, ні твайго багацця, захлынуўся б ты гэтым багаццем, мо і віжаваў яшчэ, даносіў на ўсіх...»

Гэтая думка апякла яе. Яна пачала ліхаманкава нацягваць макраватую яшчэ панчоху, абуваць боцік. Не сцярпела, кінула ўсё ж:

— Кажаш, невядома, як усё абернецца. Ці не чакаеш, што фашысты зноў вернуцца, падкормяць цябе, бо табе ж усё мала, бо Саветы ж гэтак табе ўжо дапяклі, не дагадзілі? Ну, то чакай, чакай, суседзе!..

Вольга сабралася пайсці, ляпнуць дзвярыма, але ў гэты час з вядром пеністага сырадою зайшла Зося. Яна адразу змеціла, што ў хаце быў гром, прыкладна здагадвалася, якая гаворка магла адбыцца між Вольгай і мужам. Пастаралася, як умела, згладзіць непрыемнасць, засакатала:

— Вось зараз сырадойчыку цёпленькага нацэдзім. А ў што ж табе, Волечка, наліць? Ага, вунека гладышык.

Яна памкнулася ўзяць са шкапчыка прынесены Вольгай гладыш, але Вольга апярэдзіла, хапіла пустую пасуду і падалася да парога.

— Дзякуй табе, Зося,— кінула зніякавелай, ушчэнт разгубленай жанчыне.— Абыдуся неяк. Гаспадару ж можа не хапіць... А за тое, што брала, разлічуся, за мной не стане.

Ад сабак яе зноў убараніў, правёў за вароты Стасік, які ўсё поркаўся нечага ля ганка. У Вольгі твар ажно пылаў агнём. Ідучы да Гораша, яна і думаць не думала, каб нешта высвятляць, нешта некаму даказваць, а тым болей сварыцца. Нават пра прыёмнік не думалася спачатку. Гэта ўжо ў дарозе цюкнула ў галаву: а чаму б і дапраўды Горашу не выняць са схованкі тую незаменную зараз скрыначку, не паслухаць усім разам, што дзеецца на свеце? А што новы прыёмнік ён не здаў, а схаваў ці закапаў дзе ў лесе, Вольга ніколечкі не сумнявалася. Занадта добра ведала яна Горашаву натуру! Яшчэ тады, як быў той строгі нямецкі загад. Гораш, расказвалі чубаўцы, першы прынёс нейкае ламачча, якое Бог ведае з якога часу пылілася ў яго на гарышчы: маўляў, парадак ёсць парадак, раз улады загадваюць, трэба выконваць. Яго нават тады пахваліў нейкі нямецкі обер: гут, гут, во гэта панашаму, акуратных, дысцыплінаваных людзей любіць вялікая Германія. Чубаўцы пасміхаліся: ну і Гораш, вось дык малайчына! Так аб'ягорыць фашыста!

«Аб'ягорыў,— думала Вольга зараз, па дарозе, дадому.— Носіць жа зямля вырадкаў. І чорту лысаму такі прадасца, абы самому было добра, абы пуза было напхана».

Яе трохі ўсцешыла, што хапіла і мудрасці, і цярпення не раскрыцца дачасна, не ўнізіцца, як не міласціну папрасіць у Гораша, хоць і ішла сёння раней трохі з такім намерам: каб пасобіў па гаспадарцы, памог што трэба пасадзіць, засеяць, бо ў яе ж ні каня, ні бараны, ні плуга, ні насення тым болей. Не пуставаць жа зямлі, ды і есці трэба

нешта. А за паслугу хай бярэ сабе з таго, што вырасце, выспее, хоць палавіну, хоць болей нават. Ім з Іванам, калі прыйдзе, хопіць...

Пачынала сутонець. Сонца села ўжо, і ў тым баку, над лесам, неяк нязвыкла барвовела, як бы крывавілася неба. Падумалася спачатку: мо гарыць якая вёска? Але ж адкуль узяцца зараз тому пажару? Ды і дым быў бы... Колькі ні ўглядалася, ажно перад вачмі кругі пайшлі, аднак нічога не заўважыла такога, што казала б пра пажар.

Дарога, пакуль яна бавілася ў Гораша, трохі падшэрхла, і ступалася зараз лацвей — ногі не слізгацелі, не тое, як было з гадзіну назад. Непакоіла, што засталася без малака. Сама-то абыдзецца, а вось малое... Недзе ж трэба даставаць. Падумалася: мо і пагарачылася трохі, не ўзяўшы для дзіцяці хоць бы паўлітра сырадою? Не за так жа.

Абышоўшы кручу, дзе, схаваны ад сонца, яшчэ вылежваўся, памалу сыходзіў слязьмі лапік учарнелага наздраватага снегу, а ніжэй, у ямах, у якіх звычайна капалі гліну, было поўна вады, Вольга паднялася на апошні ўзлобак. Адсюль да хаты рукою падаць. Яна зірнула на знаёмыя, прыцененыя ўжо прысады і як не абмерла. Ля частаколу, там, дзе варотцы, стаяў запрэжаны ў брычку худы, ажно здаля бачны пад цёмна-рыжай поўсцю рабрыны, жарабец. Прывязаны да шула лейчынай, ён нецярпліва смакаваў цуглі. «Хто ж гэта можа быць? — Вольга подбегам кінулася да свайго двара.— Няўжо?!»

З хаты выйшаў ссутулены, змардаваны ў твары вайсковец, і ў Вольгі адразу сшэрхлі, падкасіліся ногі, ёкнула сэрца. Вайсковец быў у новым шынялі, на пагонах жаўцела па зорачцы. «Маёр,— мелькам адзначыла пра сябе Вольга.— І пусты рукаў заткнуты за рэмень. Няўжо адтуль, з фронту?! Але ж гэты конь, брычка...»

Вайсковец, калі жанчына падышла бліжэй, сказаў:

— Я з ваенкамата. Вы Лагацкая?

— Я. А што? — Вольга зноў адчула, як нядобра тахкае ў грудзях сэрца, як закрадваецца, страшным холадам ледзяніць душу падазрэнне. Выгляд вайскоўца, яго як бы вінаваты позірк не пакідаюць сумнення: гора, няўцешнае гора прыйшло на яе парог...

Праз мінуту, ужо ў хаце, пустымі, змярцвелымі, без адной пакуль слязінкі вачыма гледзячы на паперку-«пахаронку», якую выняў з палявой сумкі і паклаў на стол маёр, Вольга хоча выціснуць з грудзей крык, але там нібы што захрасла, не дае дыхнуць.

— Нічым, як і другіх, я вас не ўцешу,— акурат з-пад зямлі чуе яна словы вайскоўца.— Мацуйцеся. Калі што трэба будзе, звяртайцеся да нас, у ваенкамат.

Стараючыся не грукаць ботамі, маёр нячутна выходзіць, пакідае яе адну. Скамянелая, Вольга бачыць праз шыбку акна, як адвязвае ён каня, папраўляе нешта ў брычцы, пасля садзіцца і рашуча тузае лейцы.

...А недзе праз месяц Вольга, калі трохі акрыяла, калі на дварэ па-сапраўднаму ўжо раскашавала вясна, паволі ішла ў Садкі. На руках, загорнутага ў лёгкую байкавую коўдрачку, несла хлопчыка, Малышка, як паспела яна назваць дзіця, калі ў галаў не прыходзіла яшчэ ніякае імя.

Малышок соладка спаў, не ведаў, куды і чаго яго нясуць. Свежае паветра, настоенае на пахах ачунялай зямлі, бадзёрыла жанчыну, а Малышку яно — як найлепшы бальзам на моцны здаровы сон.

Прайшла паўз забітыя ўчарнелымі аполкамі вокны Верчынай хаты. (Толькі нядаўна яна дазналася, што стрыечную сястру фашысты сілком звезлі ў Германію, а зусім хворую, разбітую горам маці яе забралі нейкія далёкія родзічы ў Мінск.)

Сельсавет, які мясціўся ў адной з палавін чыёйсьці хаты, куды Вольга скіравала, быў, на шчасце, незамкнёны. Жанчына зайшла ўсярэдзіну, але там нікога не аказалася. Па тым, як тхнула смярдзючым дымам махоркі, а таксама па раскладзеных на стале паперах яна здагадалася: сельсаветчык (Вольга не ведала яго ў твар, казалі, нібы нетутэйшы) ненадоўга кудысьці адвінуўся, зараз, пэўна, будзе.

Каб не давіцца смуродам, яна выйшла на ганак. Малышок па-ранейшаму спаў, нават раз-другі смачна цмокнуў губкамі, бы радуючыся, што зноў у роцік яго пацякло, палілося нешта салодкае, гаючае.

Старшыня сельсавета, маладжавы, у ваеннай гімнасцёрцы, у дыяганалевым галіфэ, сапраўды не забавіўся доўга. Пасадзіўшы Вольгу ў крэсла ля стала, пакалупаўся ў сваіх паперах, пасля, адклаўшы, адпіхнуўшы ўсё ўбок, спытаў:

— Вы хацелі чаго?

— Ага,— Вольга рашуча глянула яму ў вочы.— Хлопчыка, во, запісаць трэба. Сына... Усё некалі было...

— Гэта можна,— як абрадаваўся старшыня.— Тут

прасцей за ўсё. А то думаў — прасіць што. Кожны дзень людзі ідуць і ідуць. А чым, чым я магу зараз памагчы? Хіба лесу выпісаць. А іншага нічога няма — ні насення, ні мукі, ні цвікоў, нічога болей...— Ён зморана адкінуўся на спінку крэсла, паклаў на стол рукі, і Вольга цяпер толькі згледзела, што на правай руцэ ў чалавека замест пальцаў засталіся адны абрубкі. «Божа, як жа ён піша?» — жахнула думка.

Аднак старшыня, неяк вельмі лёгка і спрытна заціснуўшы між тых абрубкаў драўляную ручку з пяром «рандо», макнуў яго ў чарніліцу, адгарнуў, узяўшы з асобнага стосіка, патрэбны журнал, нарыхтаваўся пісаць.

— Прозвішча як? — спытаў глухім, хрыпотным голасам.

— Лагацкая.

— Ды не, хлопчыка, пытаю, як прозвішча... Лагацкі? Значыць, Лагацкі. Так і запішам. А імя?

— Не ведаю яшчэ. Не надумалася. Мо?..

— Ды што тут асабліва мудраваць. Мне вось падабаецца, скажам, імя Дзіма. Харошае імя. То як?

— Во-во,— згадзілася Вольга.— Хай будзе Дзіма, Дзімачка. Я згодная.

— Ну, а па бацьку?

Вольга, каб не даць старшыні апамятацца, нешта яшчэ спытаць, хуценька адказала:

— Іванавіч...

Выпісаўшы метрыку, паставіўшы пячатку, старшыня сельсавета падняўся, сабраўся некуды ісці. Вольга радавалася, што ўсё так проста абышлося, што ад яе не запатрабавалі ніякіх дакументаў, не пацікавіліся нават, хто бацька і дзе ён. Яна аднесла гэта да нявопытнасці ці абыякавасці старшыні. Аднак такая яго нявопытнасць сёння была Вользе на руку.

Выйшаўшы на двор, яна з палёгкай, бы скінула з плячэй вялікі-вялікі цяжар, уздыхнула і яшчэ мацней прытуліла да грудзей сына, цяпер ужо яе сына...

А яшчэ праз колькі часу з дапамогай ваенкамата, усё таго ж маёра (добры, сардэчны аказаўся чалавек), Вольга, кінуўшы-рынуўшы свой хутар, бо нічога яе там ужо не звязвала, нішто не грэла, цёпла, праўда, нават са слязьмі развітаўшыся з Адоляй і Тамашом, пераехала ў іншую, далёкую адсюль вёску, дзе і яна, і яе ніхто не ведаў. Там пуставала хата, з якой усе да аднаго чалавека пайшлі ў партызаны і ніводзін не вярнуўся жывы.

Мошына — так звалася тая вёска. Не параўнаць, вядома, з хутарам, які Вольга з гадамі ўсё радзей і радзей успамінала, ды і то хіба калі думала пра Івана, пра тое, з чаго і як пачыналі там яны сваё сумеснае жыццё...

4

Недзе пад раніцу Вольга забылася ў кароткім сне і не чула нават, як ціха скрыпнулі ў сенцах дзверы, як ляпнула, таксама нямоцна, брамка. Прахапілася ад таго, што ці сасніла, ці мо і напраўду ўчула Дзімкаў плач. У начной сарочцы — яшчэ было попельна-шэра, хоць і бралася ўжо на світанак — яна пайшла да хлопцаў глянуць, як ім спіцца, ці не паз'язджалі ў іх і падушкі, і коўдры. А то мо каторы і з пасцелі, крый Божа, зваліўся. Хлапчуку ж гэта — як раз плюнуць.

Дзімку ўбачыла адразу — ён спаў бліжэй да акна, у перадранішнім блеклым цэдзіве цямнелася на падушцы яго сонная галоўка. Зрабіла крок да другога, кутняга ложка і аслупянела: Лёшкі — а гэта быў ён, тут ужо ніякага сумнення ў яе, Вольгі, не ўзнікала — і след нібы прастыў. Глянула на спінку крэсла, дзе апоўначы павесіла падноўленае, наколькі гэта было магчыма, хлапчуковае адзенне. Так і ёсць: няма і адзення. «А мо выйшаў па пільнай патрэбе на двор і зараз вернецца, зноў кінецца ў ложак?» Счакала мінут колькі, але хлопца не было.

Ажно цяжка стала дыхаць. Усё яшчэ не верачы, яна выйшла на двор, патупала ля хлява, выглянула на вуліцу, паўзіралася на лаўку, якую нядаўна змайстравалі разам з сынам пад густой навіссю вішанніку ля плота.

Нідзе не было ні душы. Вёска яшчэ спала, хоць раніца няўмольна брала сваё: на ўсходзе спачатку квола, а пасля з кожнай мінутай усё смялей і смялей ружавела, набухала чырванню неба, знекуль наляцеў, лёгка, пяшчотна расправіў пасля дрымоты свае крылы дураслівец ветрык, асвяжыў твар.

Аднак Вольга не заўважала гэтай прыгажосці. На душы шырыўся, гусцеў чорны астой: гэта ж такую прамашку зрабіла яна, што не змагла ўтрымаць нечаканага госця, не ўспела пагаварыць з ім, распытаць, пацікавіцца, як і дзе ён жыве, як трапіў сюды, што ў яго наўме. Звечара ж думалася, што не трэба адразу настырна лезці хлопцу ў душу, што не позна будзе і заўтра далікатна неяк пад-

ступіцца да такой нялёгкай размовы. І вось на́ табе!.. «Мо пакрыўдзіўся чаго, мо не дагадзіла чым? — думалася няўцешна.— Куды ж ён зараз пайшоў? Дзе і хто яго, гаротнага, прытуліць?..»

Гнятліва было ў гэты ранні час на сэрцы і ў падлетка. Ён таксама быццам не прыкмячаў, як вясёлкава ўсчынаецца летні дзень, як пахопліва, як бадзёра ўсё навокал абуджаецца да жыцця.

Спачатку, выйшаўшы за вёску, Лёшка адганяў нейкага шчанюка — увязаўся за ім, за колькі метраў адзаду ўсё бег і бег, бы прасіўся ў спадарожнікі. Лёшка спыніўся, выняў з кішэні пінжака загорнутую ў паперку расплясканую, печаную ў прысаку, з жаўтлявай скарыначкай, бульбіну, адламаў трохі, кінуў. Шчанюк, худы, адны рабрыны тырчаць, нейкі аблезлы, прагна пракаўтнуў яду, аблізаўся, бы просячы яшчэ. Хлопец, трымаючы ў руцэ астатні крышанок бульбіны, пазваў сабаку да сябе. Той, дрыжучы ўсім целам, падпоўз да працягнутай рукі. Лёшка пагладзіў яго, пашкадаваў, але цяпер ужо больш рашуча гупнуў нагой, нават прыкрыкнуў, каб не валачыўся ўслед, пільнаваўся дому. Шчанюк нарэшце адстаў.

Лёшка пайшоў адзін, збочыў на дарогу, што вяла да станцыі. Няблізка, ведаў, было, але нeяк дабярэцца. Не прывыкаць яму да дарог... Як стоміцца і як болей угрэе сонца, зверне па шляху дзе ў падлесак ці на лугавіну, трохі паспіць, бо вельмі ж хочацца спаць, вочы самі, нягледзячы што раніца павінна бадзёрыць, зліпаюцца, рады няма ніякай.

Ноччу ж ён ні на хвіліну не заснуў, усё баяўся, што калі не вытрывае, змружыць павекі, то праспіць доўга, і тады невядома, як усё абернецца...

Лежачы ў такой мяккай, чыстай пасцелі, у якой ніколі дасюль не даводзілася спаць, хлопец чуйна ўслухоўваўся, дзе і што робіць жанчына.

Малышок — Лёшка ведаў ужо, што таго завуць Дзімка — амаль адразу, як кінуўся ў пасцель, дык і засоп. Нясцерпна хацелася ўстаць, падысці да яго, прытуліцца шчакой да яго шчакі, ціха шапнуць: «Ну, здароў, брацік! Вот і адшукаў, урэшце, цябе. Не ведаў, дзе ты і што з табою, ці жывы хаця... Цяпер вот і знайшоўся... Але даруй

ужо, што не магу адкрыцца, што ты мой брат, самы блізкі, самы родны мне зараз ва ўсім свеце. Ішоў сюды, думаў: што ж спасцігла цябе, які ты стаў? Добра, што ты не ўведаў таго, што мне давялося... У цябе ўсё па-інакшаму... Лепей табе нічога-нічога і не ведаць. Хай будзе ў цябе і матка, хай і бацька... Хоць нежывы, але ж вунь ён, у рамцы на сцяне, увесь у ордэнах... А што ж я скажу табе, што прапаную ўзамен? Тое ж, што мне выпала? Не, не, не...»

Ён і памкнуўся быў падысці да Дзімкі, нават спусціў долу ногі, але з кухні ледзь чутна скрыпнула, увайшла гаспадыня. Лёшка, стараючыся не нарабіць шуму, хуценька лёг зноў, стаіўся, нават гэтак жа, як і Дзімка, засоп носам. Напалову расплюшчаным адным вокам усё ж бачыў, як жанчына падышла амаль да саменькіх іхніх ложкаў, сцішылася, пастаяла хвіліну, затым зняла са спінкі крэсла ягоную апратку, на дыбачках падалася на кухню, не забыўшыся прычыніць дзверы.

Спачатку яго нямала здзівіла, нават збянтэжыла: навошта спатрэбіліся каму яго рызманы? Няўжо хоча пашнарыць па кішэнях, праверыць, ці ёсць якія паперкі, якія дакументы? Няўжо яна баіцца чаго, не давярае, прымае за злодзея ці мо і за бандзюгу?

Счакаўшы яшчэ крыху, Лёшка ціхенька ўстаў, падкраўся да дзвярэй, праз вузкую светлую шчыліну зазірнуў, што робіцца ў кухні. Жанчына, пачапіўшы на пераноссе акуляры, бліжэй да лямпы выцягнула левую руку, у трох пальцах якой была заціснута іголка, а правай, паслініўшы трохі нітку, кончыкам яе поркала ў вушка іголкі. На прыбраным ужо стале ляжалі ножны, некалькі гузікаў, нейкія анучкі.

У яго ажно захлынулася сэрца. Няўжо, няўжо гэта чужая жанчына, якая і так, во, пашкадавала, накарміла, паслала нанач чыстую пасцель, зараз, замест таго каб легчы адпачываць, бо не гуляла ж цалюткі дзень, возьмецца да позняй ночы чыніць тое, што ён недзе парваў жыўцом, прасмаліў ля вогнішча, што знасілася па даўнасці? Няўжо можна вось так, як Дзімка, спакойна спаць, бачыць нейкія свае дзіўныя сны, а раніцай прачнуцца і ведаць, што цябе чакаюць і смачны сняданак, і старанна выгладжаная кашуля, і клапатлівае цёплае слова? Няўжо, няўжо магчыма такое?..

Ён вярнуўся ў ложак, з галавой акрыўся коўдрай, слёзы душылі яго, і Лёшка баяўся, каб не выдаць сваёй слабасці, сваёй расчуленасці. Зайздрасць да Дзімкі моц-

на, нясцерпна апякла душу, і захацелася хоць месяц, хоць тыдзень, нават дзень-два пабыць на яго месцы, адчуць, што пра цябе нехта думае, клапоціцца, нехта дзеля цябе можа і ноч не спаць, гатовы аддаць табе апошняе.

Не, не быць яму на месцы Дзімкі. Хто ён і што ён? Якое мае права ўрывацца ў чужое жыццё, сваім уварваннем бянтэжыць, парушаць дбайна наладжаны яго ход? Хай усё ідзе так, як ішло і дасюль. Хай хоць яму, брацiку, будзе добра і спакойна. Хай ніколі-ніколі не ўведае ні пра што...

Лёшка не мог дачакацца, калі ж ляжа, забудзецца ў сне гэтая незвычайная, гэтая дзіўная жанчына, да якой неспадзявана адчуў нешта такое, што можа адчуць толькі здарожаны, бясконца стомлены нягодамі чалавек, калі, вярнуўшыся дадому, трапляе пад апеку добрага, клапатлівага, самага дарагога на свеце чалавека — маці.

Але ж...

Што можа даць узамен ён, каб мець гэтую дабрыню, клапатлівасць, спагаду? Што ёсць у яго самога за душой?..

Не, нельга яму тут затрымлівацца. Заўтра, калі толькі прасніць, позна прачнецца, як гляне ён у вочы гэтай жанчыны, што скажа ёй, якія знойдзе словы і для Дзімкі?

Ён чуў, як яна павесіла назад на спінку крэсла яго апратку, нечага глыбока ўздыхнула і пайшла ў залу, разабрала пасцель, лягла. Зноў уздыхнула, затым, павярнуўшыся, відаць, на бок, сцішылася.

Лёшка таксама не падаваў прыкмет жыцця. Ад стомы зліпаліся векі, але ён гнаў сон, цёр шчокі, лоб, каб толькі неяк вытрываць, не заснуць. Нарэшце, калі скрозь дашчаную перагародку пачулася цяжкае, але роўнае дыханне, ён ціха апрануўся, уззуў басанож туфлі, пакраўся да парога. Аднак вярнуўся, падышоў да ложка, дзе спаў Дзімка, асцярожна крануў рукой яго валасы. Зноў адчуў, што можа ўсхліпнуць, таму не стаў болей затрымлівацца, гэтак жа нячутна выйшаў у кухню, памаленьку, затаіўшы дых, прачыніў дзверы ў сенцы, адтуль — на двор. З палёгкай уздыхнуў толькі на вуліцы.

...І вось зараз, калі адагнаў шчанюка, застаўся адзін, калі гэтак вясёлкава ўсчынаўся ранак, на сэрцы ў яго не палягчэла, наадварот, стала яшчэ болей змрочна і гнятлі-

ва. Куды ж, куды зараз падацца? Зноў да цёткі? Што, кола замкнулася і табе, бяздомнаму, няма болей дзе і прыткнуцца?

Яго ажно затрэсла ад такой думкі. Куды заўгодна пойдзе, хоць зноў, сабе на злом галавы, вернецца на тую будоўлю, але не да цёткі. Цяпер, як пабачыў, на сабе паспытаў, што ёсць, ёсць жа на свеце і дабрыня, і спагада, ёсць рукі, сэрца жаночае, якія могуць і боль твой суняць, і ўсё, усё іншае зрабіць дзеля цябе, прыняць на сябе найцяжэйшае, абы аблегчыць твой лёс, цяпер у ім, Лёшку, успыхнула яшчэ большая нянавісць да цёткі, якая, наадварот, вытравіла з душы што толькі можна, атруціла, азмрочыла і тое светлае, што хоць трошкі перападала табе...

Незаўважна адмераў як не паўдарогі. Сонца ўзнялося высакавата, выпарыла расу на траве, ужо добра-такі ўгравала. Ногі пачыналі трымцець, з'явілася вяласць. Да таго ж сушыла ў роце, горле, і Лёшка паглядваў па баках, каб дзе звярнуць на якую лугавіну, пашукаць вады, заадно трохі адпачыць, сагнаць санлівасць.

Яму пашанцавала не адразу. Вакол слалася то поле, засеянае найбольш жытам, аўсом, лубінам, то зноў дарога ныряла ў лес, дзе на пясчаных узлобках пераважаў сасняк, ядловец. Шукаць там вады — пэўна ж, марная трата часу.

Але вось мясцовасць паніжэла, часцей пачалі трапляцца елкі, якія паступова змяніліся нізкарослым беразняком, вольхай, кустамі лазы.

Хлопец збочыў з дарогі, блытаючыся ў густой жорсткай траве, прайшоў метраў сто і адчуў, як пад нагамі смачна зачмякала. Ён разуўся і, падкасаўшы калошы, пачаў прадзірацца далей. Вуха з радасцю ўлавіла вясёлае цененькае бульканне, і Лёшка здагадаўся, што там, трохі ўперадзе, ручэй.

Ён быў зусім вузенькі, у некалькі пядзяў, і мелкі, мо па шчыкалатку, не болей. Вада, адчувалася, ішла знекуль з глыбіні — недзе непадалёку біла крынічка — і вабіла сваёй крыштальнай чысцінёй, празрыстасцю. Смага сушыла горла, няўцерпна зажадалася тут жа легчы, прыкласціся губамі да струменьчыка. Было, аднак, мокра, гразка, і Лёшка не ведаў, як спатоліць гэтую сваю смагу. Хацеў спачатку набраць вады ў прыгаршчы, але перадумаў: не, не той смак. Так з крыніцы ніхто не п'е. Ён агледзеўся наўкруг, убачыў справа ад сябе сухую алешыну, дацяг-

нуўся рукой да большага сука, рэзка пацягнуў. Алешына не зламалася, а, наўздзіў, лёгка выцягнулася з каранямі. Паклаў яе ўздоўж ручайка і, счакаўшы, пакуль адстоіцца, знікне муць — трохі суком зачапіў дно, ускаламуціў пясок,— лёг, абапёрся рукамі на ствол, прыклаўся губамі да вады. Яна апякла сваёй гаючай сцюдзёнасцю, здзівіла нейкай нязвыклай слодыччу. Піў і піў, пакуль не адчуў — хопіць, моцна звяло ўжо зубы, а жывот ажно барабанам напяўся. Пашкадаваў, што няма ніякай пасудзіны ўзяць вады з сабою.

Выбраўся на сухое. Сонца стаяла ўжо над галавой, пякло, як і ўчора. Ён павярнуў брылём шапку так, каб промні меней цалялі ў твар, але палёгкі гэта не дало. Зморанасць зусім валіла з ног.

Згледзеўшы між дрэў невялічкую цянлівую палянку, Лёшка скіраваў туды, зняў пінжак, лёг на траву, адразу адчуўшы, як стаміўся. Заснуў амаль што імгненна.

Колькі спаў, ён не ведаў. Прачнуўся ад таго, што нясцерпна пякло ў патыліцу. Лёшка пасунуўся ў цень, пацягнуў за сабою і пінжак, каб пакласці пад галаву, яшчэ трохі падрамаць. Аднак сон болей не браў. Трэба ж ісці. А куды?

Ён зноў выйшаў на дарогу, ціха паплёўся далей. Ногі чамусьці не хацелі слухацца, падгіналіся, і ўпершыню падумалася: а раптам захварэе, вось зараз хвароба падкосіць, зваліць ушчэнт? Што тады, у каго прасіць якога ратунку, хто паспагадае? Тут жа, колькі, во, прайшоў ужо, ніводнай жывой душы не сустрэў. Праўда, як ляжаў, чуў, што праскочыла, прапылела нейкая машына, толькі ў другі бок, не туды, куды ён ідзе. А куды ж яму, Лёшку, трэба? У райцэнтр, на станцыю? Што, што там рабіць?..

Ззаду, з-за пагорка, пачуўся гуд, жалезны ляскат. Аглянуўшыся, Лёшка ўбачыў: на пагорак выскачыў, даганяе трактар. Хлопец збочыў, саступіў дарогу. У кабіне, раскрыўшы насцеж дзверцы, сядзеў загарэлы да чарнаты, з белымі, выпаленымі на сонцы валасамі юнак у адной саколцы, курыў папяросу. Трактар нечакана спыніўся, ад яго патыхнула распаленым маслам.

— Садзіся, друг, падвязу,— весела крыкнуў юнак.

Лёшка абрадаваўся, скочыў на гусеніцу, з яе ступіў у расчыненую кабіну. Юнак пацягнуў адзін, другі рычаг, і машына, раўнуўшы дызелем, моцна тузанулася, з месца ўзяла ранейшы разгон. Юнак павярнуў галаву ў яго, Лёшкаў, бок.

— Не ездзіў ніколі на такой кабылцы? Наровістая, але толькі трымайся. Пугай не трэба ляскаць, паганяць. Куды хочаш завязе і скуль хочаш вывезе... — Ён засмяяўся і, зацягнуўшыся апошні раз, пусціўшы праз нос кольца дыму, шпурнуў акурак праз дзверцы, спытаў: — А табе куды?

Лёшка не ведаў, як выкруціцца. Пэўна ж, трэба хоць зманіць, бо не будзеш чужому чалавеку прызнавацца: не, нікуды табе не трэба, ніхто цябе не чакае. Яшчэ невядома, што падумае... Ён хацеў ужо сказаць, што ў бальніцу спяшаецца, зуб, во, разбалеўся, хай вырвуць, аднак юнак, забыўшыся, відаць, пра сваё пытанне, нечакана прапанаваў:

— А можа, калі час маеш, са мной давай, га? Тут недалёчка, ля лесу, клін адзін прыкончым. Я і да абеду там араў. Прычэпшчык недзе ўжо зачакаўся, не схацеў ехаць палуднаваць...

...Ніколі, бадай, за ўсе свае трынаццаць гадоў Лёшка не быў такі здаволены, нават шчаслівы. Нібы заваражаны, сядзеў ён з Валодзем — так назваў сябе светлавалосы юнак — у кабіне, глядзеў, як той лоўка тузае туд-сюд розныя рычагі, якая паслухмяная ў яго руках гэтая жалезная аграмадзіна. Не верылася нават, што дробны на выгляд, хударлявы, мала чаго вышэйшы за яго, Лёшку, хлопец можа правіць і машынай, і за прычэпшчыкам і плугамі сачыць, весці роўненькую, як шнурочак, баразну, нават насвістваць нейкі матыўчык, бы не яго рукамі робіцца ўся гэтая работа, бы ён тут зусім ні пры чым: от, сядзіць сабе, глядзіць наперад, насвіствае, і ўвесь на тым клопат. Аднак на першы погляд так здавалася. Прыгледзеўшыся больш пільна, Лёшка ўбачыў, што гэтая лёгкасць і нібыта бесклапотнасць толькі дзеля прыліку, а на самой справе... Вунь жа як саколка ўзмакрэла на Валодзю, хоць бяры ды выкручвай, а на лбе таксама пацеркамі выступіў пот. Затое ж вочы ў чалавека як ззяюць! Што той пот?! Ён, Лёшка, невядома што аддаў бы, каб вось так папацець, так пакіраваць, так падпарадкаваць сабе машыну, каб як міленькая слухалася. Гэта табе не вугаль разгружаць. Там бяры на пуп і асабліва не думай, не напінай мазгі. А тут... Ого-го! А хіба ж толькі араць трактарысту даводзіцца? Не, колькі іншага цікавага за лета, за год цэлы ён папаробіць на сваёй «кабылцы», як кажа Валодзя. Добрая «кабылка»! А кабіна чаго вартая! Табе ні холад, ні вецер, ні дождж не страшныя. Нават калі

і воўк ці іншы які звер выскачыць адкуль. Го, хай толькі памкнецца падысці!.. Куды яму, тому воўку з трактарам цягацца? На, выкусі, ваўкарэзіна, падыдзі толькі, паспрабуй дацягнуцца, нават калі і стаяць той трактар будзе і там ціхенька адпачыць хто надумае. Што, аблізваешся, зубы кароткія? А зараз вось як успыхне фара, як грымне магор, дык ты і хвост падціснеш, пяткі толькі падмажаш, а то са страху і яшчэ большай бяды наробіш...

— Ты чаго смяешся? — раптам даносіцца да Лёшкі, і хлопец ажно ўздрыгвае, шкадуе, што так нечакана перапынілі яго мроі. Ён няўцямна глядзіць на Валодзю, пасля ніякавее, бы злавілі на чым вельмі непрыстойным, адгадалі самыя патаемныя думкі.

— А-а, так, нічога,— кажа ён, а сам адводзіць вочы.

— Што, хацелася б і табе трохі пракаціцца? — Валодзя, нібы чараўнік які, глядзіць у саменькую душу.

— Угу,— кажа Лёшка, бо хавацца ад Валодзі, хітрыць няма ніякага сэнсу.

Узаранага тым часам становіцца ўсё болей і болей, а палоска ўдзірванелай нерушы вузее проста на вачах. «Хоць бы не так хутка,— думае Лёшка.— Яшчэ б трохі пабыць разам, паглядзець, мо Валодзя і праўда дасць правесці трактар. Хай не тут, на ворыве, хай па дарозе, дзе зусім-зусім роўна і нішто не мяшае». Валодзя зноў здзіўляе, зноў на хаду ловіць яго, Лёшкавы, думкі.

— Кончым,— кажа ён,— тады можна, чаго ж. Сам яшчэ нядаўна млеў ажно, у полі, дзе трактар убачу, гадзінамі аціраўся. Урокі закінуў быў. Ну, і выключылі са школы, а маці лупцоўку задала...

— То і як жа... далей усё?..— вельмі зацікавіла Лёшку, што расказваў Валодзя.

— Як?.. А вельмі проста нават — уцёк у школу механізацыі, падказалі мне, дзе такая, вось скончыў, працую, бачыш... Ужо два гады.

— А дзе... ну... школа гэтая самая? — спытаў Лёшка і пачырванеў. Лепей бы ён не пытаўся. Валодзя, не думаючы спачатку ні пра што, назваў адрас, пасля спахапіўся, адразу адгадаў яго, Лёшкаў, намер, астудзіў:

— Табе яшчэ ранавата трошкі. Не возьмуць пакуль што. Трэба пачакаць годзік-другі... А так чаго ж — работка будзь здароў. Усюды патрэбная. Кожны з табой палічыцца. Ды заробак... Жыць можна, адным словам.

Тое, што сказаў Валодзя, абрадавала і адначасова засмуціла хлопца. Зноў, зноў гэтыя гады... Ну, а калі ён,

Лёшка, цяпер, зараз вось, хоча вучыцца, працаваць хоча? Хто гэта выдумаў, каб чалавеку забараніць? Падумалася: а можа, усё ж з'явіцца ў тую школу, добра папрасіць там каго, каб узялі, можа, нават не паказваць сваю метрыку, сказаць, што няма яе, у вайну недзе згубілася, і тым часам дадаць сабе гэтыя два гады. Хай правераць... А дзе, дзе яны правераць?.. У цёткі? У дзетдоме? Уга, каму гэта ахвота будзе важдацца.

— Усё, заклёпана,— сказаў Валодзя, выязджаючы на ўзлесак, спыняючы машыну.

Схамянуўшыся, Лёшка глянуў на поле: ага, усё скончылі. Па свежых скібах хадзілі ўжо вароны, гучна каркалі, нечага шукалі. Валодзя скочыў на зямлю, падышоў да прычэпшчыка, пажылога, маўклівага дзядзькі, памог яму адчапіць плугі. Той, буркнуўшы нешта незразумелае, адразу ж нырнуў у падлесак, знік сярод маладых сосен, бярозак.

— Куды ён? — спытаў Лёшка.

Валодзя засмяяўся:

— Ведаў бы ты яго!.. Прычэпшчык — лепшага не трэба. Але і дзікуна і дзівака такога адно пашукаць. Колькі разам працуем, а ні разу не сеў, каб пад'ехаць, усюды, куды б ні паслалі, толькі пешкі бегае. Не пераносіць ніякіх машын...

— А іх куды? — Лёшка паказаў вачыма на плугі.

— Дзе дзенуцца? Заўтра забяру. А сёння — яшчэ адна работка мяне чакае...

І вось ён, Лёшка, сядзіць ужо на Валодзевым месцы, а Валодзя — побач, паказвае, куды ціснуць нагой, якой рукой і што спярша пакратаць, пацягнуць, каб паставіць патрэбную скорасць, даць машыне ход... Многа ўсяго гаворыць Валодзя, усё тлумачыць. Лёшка адчувае, як шалёна калоціцца, гатовае выскачыць з грудзей, сэрца, але стараецца трымацца, стараецца не прапусціць ніводзін Валодзеў рух, ніводнае слова. Гэта ж не жартачкі, калі табе даверана такая важная справа. Галоўнае — каб не падкачаць, каб не смяяўся Валодзя, што ён такі нягеглы, ні на што далікатнае не здатны.

— Ну, як, усёк? — смяецца Валодзя.

Лёшка рукавом выцірае ўспацелы твар. Трэба ж такое: нічагусенькі яшчэ не рабіў, палец аб палец не стукнуў, а пот ужо засціць вочы. Ён няўпэўнена адказвае:

— Угу...

— То давай цісні, друг, на ўсе педалі.

Лёшка, здэцца, цісне, варочае ўсё так, як паказваў Валодзя, аднак машына, бы наравісты конь, не хоча слухацца, хоць ты плач, хоць каравул крычы. Нарэшце, не вытрымлівае сам Валодзя, рука яго зверху кладзецца на Лёшкаву руку, робіць нешта лёгка, няўлоўна, і... дзіва дзіўнае — трактар магутна ўздрыгвае, быццам, разам з сумленнем, прачнулася ў ім нябачаная волатаўская сіла, панесла іх і панесла невядома куды...

— Кіруй жа, кіруй,— кажа Валодзя, але Лёшка, ап'янелы ад шчасця, нічога не чуе, нічога не бачыць.

Машына збочвае, лёгка падмінае пад гусеніцы, трушчыць старое пнёўе, кусты, маладыя сосенкі, зверам імчыць на тоўстую сухастоіну. Валодзя нахінаецца, крычыць ужо штомоцы:

— Ды гэту, гэту ручку вярні, разява!..

Лёшка і сам бачыць небяспеку, вось яна, насоўваецца на іх, яна ўсё бліжэй і бліжэй, але ні рукі, ні ногі чамусьці не слухаюцца, робяць не тое, што трэба рабіць. Эх...

Невядома, чыя ў тым заслуга, але трактар спыняецца як не ў паўметры ад камля. Лёшка сядзіць ні жывы ні мёртвы. Лепей бы яму зараз скрозь зямлю праваліцца, чым зносіць такую ганьбу. Пракаціўся, называецца... Ледзь трактар не ўходаў. Пэўна ж, сухастоіна такая — не пень гнілы, не куст, не жэрдачка якая-небудзь.

Валодзя, ні слова не кажучы, зноў саскоквае ўніз, абыходзіць трактар кругом, правярае, відаць, ці ўсё цэлае, ці ўсё як мае быць. Можа, яму, Лёшку, непрыкметна таксама выскачыць, уцячы далей у лес? А там...

Але позна ўжо. Валодзя адчыняе дзверцы кабіны з яго, Лёшкавага, боку, нечага ўсміхаецца, просіць пасунуцца, саступіць яму яго законнае месца, дае газу, лоўка выкіроўвае машыну зноў на дарогу. І тады ўжо толькі кажа:

— Нічога, брат, не вешай носа. У мяне напачатку і не такое было. У канаву нат неяк заваліўся. Ледзь вычухаўся. Так што... Дык ты зараз куды? — пераводзіць ён гаворку на іншае.

— Мне... на поезд трэба,— першае, што прыходзіць зараз у галаву, кажа Лёшка, бо пра бальніцу ж не будзеш выдумляць: ну, хто, хто на ноч гледзячы пойдзе ў тую бальніцу? Дурань жа апошні не паверыць. Ніколі не паверыць.

Яны развітваюцца як даўнія знаёмыя, нават трошкі ўжо і сябры. Валодзю трэба ехаць назад, недзе яго, сам так сказаў, яшчэ нейкая «работка чакае». Ён, высунуўшы-

ся з кабіны, махае рукой, дае добрага газу і хутка знікае за паваротkай.

Лёшка ж доўга стаіць на месцы, усё ўслухоўваецца, усё ловіць гук трактара, бы гэта для яго самая найлепшая музыка, якую ён і чуў калі-небудзь.

Ён весялей ужо ідзе на станцыю. Цяпер Лёшка ведае, куды ехаць і што будзе рабіць, да каго стукацца ў дзверы, пакуль не адчыняць, не ўважаць яго просьбу, а то, калі спатрэбіцца, і слёзы...

## 5

Ведаў бы Лёшка тады, тым летам, роўна два гады назад, калі пасля доўгіх просьбаў, малёганняў цётка, нарэшце-ткі, згадзілася ўзяць яго да сябе, куды і чаго ён едзе, што чакае яго наперадзе, то ніколі б не рашыўся на такі крок. Дзетдом, вядома, не родная хата, але ж жыць можна было. Хай не заўсёды ад пуза наядаліся і не кожны раз смачнай была тая яда, хай часта не хапала і таго і гэтага, хай сабе ўшчувалі, а то і каралі строга, нават той-сёй з выхавацеляў асмельваўся і шлёгнуць па маккім месцы, што дай Бог як пачухаешся, але ж і кара, і ўсё іншае, што за многія гады паступова абрыдла, сядзела ўжо ў пячонках, выклікала глухі пратэст, нездаволенасць,— зараз, калі ён пацёрся ў цёткі, пабадзяўся па дарогах, зведаў чортведама што, ворагу свайму не пажадаў бы такога, усё тое, дзетдомаўскае, здавалася яму калі не райскім жыццём, то, ва ўсякім выпадку, вартым, каб успамінаць з добрым, шчымлівым болем і шкадаваннем.

А тады, два гады назад, хіба думаў ён пра благое, калі збіраўся да цёткі, і не ў госці ўжо на які дзень-другі, а назусім, каб там і жыць, і вучыцца ў школе, і мець магчымасць куды хочаш пайсці, з кім хочаш і ў што хочаш гуляць. Хіба не пра гэта пасля адбою, перад сном, марылі дзетдомаўскія хлапчукі: каб у цябе было ўсё так, як і ў іншых дзяцей, у каго ёсць і бацька, і маці, і свой дом. Яны, за рэдкім мо выключэннем, не выказвалі гэта ўслых, а марылі ціха, амаль безнадзейна, мала верачы ў цуды.

А цуды ўсё ж здараліся.

Неяк, у адну з цёплых парных раніц, калі ўсе яны, ад большага да меншага, акрамя, вядома, хворых, якія мясціліся ў ізалятары, выструніліся на лінейцы, а пасярод пляцоўкі, у акружэнні выхавацеляў і дзвюх дужа ўзлава-

ных, як не раз'юшаных жанчын грозна стаяў, насупіўшы бровы, іх добры дырэктар Іван Паўлавіч, да тэрыторыі дзетдома падыходзіў стомлены, учарнелы ў твары мужчына ў ваеннай гімнасцёрцы, без галаўнога ўбору, у заляпаных гразёю ботах.

Мужчына, дарма што выглядаў стомленым, нават змарнелым, адразу ажывіўся, пажвавеў, відавочна захваляваўся, калі ўбачыў на лінейцы дзяцей. Ён гатовы быў, здэцца, кінуцца, пабегчы да гурту, але, учуўшы, хоць і далекавата было, словы дырэктара, спыніўся, перавёў дых. Дзеці яго не бачылі, а калі і ўбачылі б, то асабліва не звярнулі б увагі. Ідзе чалавек па дарозе, ну і ідзе. Хіба мала хто ходзіць? Іх займала зараз іншае: што ж будзе далей, дазнаюцца ці не?

Дырэктар жа не гуляў ні ў якую дыпламатыю, гаварыў прама:

— Дык яшчэ раз паўтараю: хто ноччу рабіў набег у вёску, спляжыў агароды вось у гэтых жанчын, аблаташыў усе агуркі, паабтрасаў яблыкі, паламаў плятні? Хто? Прызнаецеся — улічым, зменшым пакаранне, будзеце ж маўчаць як вады ў рот набраўшы — самі пашукаем. Сляды, нябось, засталіся, дзе дзенуцца. Нават і сабаку пусцім.— Пры гэтых апошніх словах сярод хлапчукоў пракаціўся трывожны шумок, а той-сёй, найперш, вядома, з малечы, нават скалануўся. Іван Паўлавіч тонка адчуў, што трапіў у самую кропку, у «сонечнае спляценне», і яшчэ больш націснуў на апошні козыр: — А як вы думалі? Міліцыя ў бірулькі з вамі не будзе гуляць, не будзе цырымоніцца. Не спадзявайцеся. Сабакі ў іх вучаныя, не такія лавілі. Хай таму-сяму са шкадліўцаў і паабгрызаюць пяткі...

Строй, аднак, акрыяў ад нечаканага ўдару, выстаяў, як выстойваў не раз, цяпер чакаў новай неспадзеўкі ад дырэктара: што, што яшчэ ён прыдумае, якая кара нябесная іх жджэ, калі не прызнаюцца?

Кожны з віноўнікаў ведаў, што прызнавацца, выстаўляць сябе на пасмешышча ўсяго дзетдома ні ў якім разе не трэба. Мо як абыдзецца. Яшчэ невядома, што могуць выкінуць, на што рашыцца гэтыя вось раз'юшаныя жанчыны... Не-е, лепей пакуль пачакаць. Пакуль там яшчэ дойдзе да той міліцыі... А мо палохаюць, як палохалі не раз?

Іван Паўлавіч па-ранейшаму стаяў, грозна звёўшы дужкі броваў ля пераносся, свідраваў вачыма кожнага.

Цяжка сказаць, як яно абярнулася б далей, але здарылася зусім нечаканае.

Невядомы мужчына ў ваеннай гімнасцёрцы не вытрываў, па вузкай, пасыпанай жоўтым пяском дарожцы наблізіўся да ўсіх. Хуткім нецярплівым позіркам акінуў строй дзяцей, пасля дрыготкімі пальцамі выцягнуў з нагруднай кішэнькі гімнасцёркі якуюсьці паперчыну, нешта сказаўшы, падаў яе дырэктару. Той, усё гэткі ж грозны і насуплены, а зараз яшчэ і ад таго, што некаму вось няўцерп пачакаць, пакуль ён тут заняты важнай справай, усё ж узяў паперку, пачаў чытаць. Твар яго паступова мяняўся, святлеў, а праз хвіліну ад строгасці і насупленасці не засталося і следу. Забыўшыся ўжо і пра вясковых жанчын, і нагул пра тое, дзеля чаго яны ўсе тут сабраліся, дырэктар, ступіўшы яшчэ крок наперад, выгукнуў:

— Вова Находкін!

З шарэнгі, дзе стаялі дзевяці-дзесяцігадовыя, высунуў віхрастую галаву, з круглым, нібы пятак, сіняком пад вокам хлапчук, бойка, задзірыста азваўся:

— Не лазіў я. Хай дакажуць. Чаго чэпяцца?

Іван Паўлавіч усміхнуўся, ціхім, нейкім зусім незнаёмым голасам мякка сказаў:

— Ідзі сюды... Не бойся... Ніхто цябе ні ў чым не вініць.

Хлапчук, аглядваючыся на сваіх таварышаў, бы шукаючы ў іх падмогі на выпадак чаго непрадбачанага, падышоў да дырэктара, смела, знізу ўверх, глянуў яму ў ночы.

— Дзеці,— з ноткаю ўрачыстасці ў голасе звярнуўся да дзетдомаўцаў Іван Паўлавіч,— сёння ў нас прыемная нечаканасць. Вы ведаеце, што нарабіла вайна, колькі бед прынеслі фашысцкія вылюдкі на нашу зямлю, колькі загубілі, скалечылі чалавечых лёсаў. І вы таксама, можа, нават болей чым хто,— ахвяры гэтай вайны. Амаль усе, за рэдкім выключэннем,— круглыя сіроты. Добра, што дзяржава не дала і не дасць нікому прапасці, кожнага апране і накорміць, выведзе ў людзі, хоць трохі заменіць і бацьку, і маці. Вялікае шчасце, што ёсць у вас такая маці-Радзіма. А вось для Вовы сёння павінна быць шчасце ўдвайне: гэты чалавек,— дырэктар кіўнуў галавой у бок мужчыны ў ваеннай гімнасцёрцы,— Вовін родны бацька — Дзямід Еўдакімавіч Находкін. Ён доўга ляжаў кантужаны, без памяці, у шпіталях, не ведаў, дзе сям'я, бо вайна разлучыла

іх у першыя дні, не ведаў, ці ёсць дзе хто жывы. І зараз, нарэшце, яму з цяжкасцю ўдалося адшукаць сына...

Што яшчэ гаварыў Іван Паўлавіч, больш ніхто ўжо не слухаў. Усе заварожана, не дыхаючы ажно, глядзелі, як ускрыкнуў, радасна кінуўся, абвіў бацькаву шыю Вова, як, прытуліўшы да грудзей сына, заплакаў, не пасаромеўся сваіх слёз гэты змардаваны незнаёмы чалавек. У тую хвіліну расчуліўся не толькі ён. Цішком выціраў вочы і дырэктар, а вясковыя жанчыны, забыўшыся на свае крыўды, наогул галасілі ўслых.

...У той жа дзень Лёшка ўжо канчаткова пазначыў для сябе — усё, годзе, трэба і яму прыбівацца да нейкага берага, шукаць нейкія свае карані, бо ці ж лёгка жыць на свеце, не ведаючы, хто ты і што ты, не мець побач роднай душы...

Гэтай адзінай, вядомай яму роднай душой была цётка, з якой ён зараз і звязваў усе свае надзеі. Пісьмы, цяпер ужо запар як не два ці тры, паляцелі на яе адрас з настойлівай просьбай: вазьмі, ну вазьмі да сябе, я ж буду слухацца, буду ўсё рабіць, што толькі скажаш, буду пасвіць карову, а то, хочаш, і свіней, буду вазіцца, гуляць з дваюраднымі брацікамі — як добра, што ёсць у мяне дваюрадныя брацікі, буду добра, на адны толькі пяцёркі, вучыцца, а пасля, калі вырасту, аддзячу, вось пабачыш, аддзячу...

Цётка нарэшце накалякала на шматку бруднай, скамечанай паперы, укладзенай у гэткі ж брудны канверт, што так і быць, возьме ў сваю хату, але ж некалі ёй па яго ехаць, хай, калі пусцяць, сам дабіраецца ці з кім, можа, з дарослых з дзетдома...

Ад радасці ў хлопца сэрца як не выскачыла з грудзей: нарэшце і ў яго будзе дом, і ён пажыве ў сям'і, нарэшце і яго жыццё набудзе нейкі сэнс, і ўжо не стане ніхто шчыпаць яго, бы той гарох пры дарозе, бо будзе ў яго і моцная крэпасць, і надзейная абарона...

Некалькі дзён Лёшка насіўся з пісьмом нібы ачмурэлы. Яму хацелася ў той жа дзень, як атрымаў згоду ад цёткі, на крылах ляцець у няблізкі свет, абы толькі хутчэй. І не трэба ніякіх праважатых. Што ён — маленькі, не папытае ў каго, як дабрацца? Уга, хіба ж гэта цяжка?

Але жар ягоны астудзіў Іван Паўлавіч, сказаўшы, што ўсё не так проста, як думаецца, што без афармлення дакументаў, а тым болей адпусціць хлопца аднаго — на гэта хай не спадзяецца, з гэтага нічога не выйдзе. І яшчэ папытаў Іван Паўлавіч, што, можа, усё ж астанецца

ў дзетдоме, бо хто ведае, як будзе ў цёткі, час жа пакуль цяжкі, галодны, толькі чатыры гады мінула пасля такой вайны...

Лёшка, аднак, і слухаць не схацеў ніякіх довадаў, як заведзены нецярпліва паўтараў адно і тое ж: «Хачу да цёткі, да цёткі хачу!»

— Ну, што ж,— як бы са шкадаваннем сказаў дырэктар.— Раз да цёткі, дык да цёткі. Але глядзі...

Што меўся сказаць Іван Паўлавіч гэтым «але глядзі...», хлопца ніколечкі ўжо не цікавіла. Галоўнае, што ён, як і Вова Находкін, якому ўсе вельмі зайздросцілі — кожны паўжыцця аддаў бы, каб быць на яго месцы,— зараз таксама, лічы, ужо не сірата. Хіба ж можна называць сіратой таго, у каго ёсць і брацікі, і свой дом, і блізкі чалавек, каторы бярэ цябе пад сваю апеку, пад сваё крыло?..

...Цяпер, праз два гады, Лёшка ўсё часцей і часцей нагадваў тыя поўныя глыбокага сэнсу словы дырэктара дзетдома, на чым свет стаіць лаяў сябе, што не паслухаў яго добрай парады, кінуўся, на злом галавы, у невядомасць...

Спачатку, праўда, было яшчэ нішто. Цётка сустрэла яго прыезд хай сабе і не з шырокай, на ўвесь твар, шчаслівай усмешкай, але ж і не паказвала адразу свой нораў, усё тое, на што была здатная... Не, на першым часе ён, Лёшка, і сапраўды адчуваў няблага: цётка ні ў чым, ні ў добрым, ні ў дрэнным не вылучала яго сярод сваіх сыноў — дзесяцігадовага, скуластага, зацята-панурага Аркадзі і васьмігадовага сарвігалавы Броніка. Яны аднолькава елі — пасля дзетдомаўскай яда тая была горай не прыдумаеш, але Лёшку, прызвычаенаму да ўсякага, гэта меней трывожыла, хоць часам і зводзіла ад голаду жывот,— аднолькава не маглі дагадзіць у рабоце, і цётка на ўсіх драла горла, хапалася за дзяркач, кляла апошнімі словамі, што спачатку вельмі бянтэжыла, а то і раніла балюча хлопца, але Аркадзя і Бронік угаворвалі яго пляваць на ўсё, не браць да галавы тыя праклёны.

Былі і зусім добрыя дні. Неяк вечарам, ухадзіўшыся з гаспадаркай, цётка расшчодрылася, напякла ўсім на алеі аладак, пасля, седзячы на табурэтцы, пачала вох-

каць, упершыню ўспомніла добрым словам, пашкадавала сваю малодшую сястру — Лёшкаву маці. Хлопец ужо і да гэтага трохі чуў ад цёткі, як жылі яны, сёстры, тут да вайны і ў часе вайны. Расказвала і пра сваіх бацькоў, Лёшкавых дзеда і бабу, якія за чатыры гады да вайны нечакана, адно за адным, памерлі ад сухотаў, не закончыўшы будаваць гэту вось хату, і ім, дзвюм сёстрам, ой як нялёгка давялося, пакуль зрабілі ўлазіны. Змушаны былі прадаць усё — і карову, і кабанчыка, і з адзення ўсё лепшае, абы толькі мець людскае жытло. А тут яшчэ неспадзеўка...

Цётка замялася, і Лёшка змушаны быў спытаць:

— Якая гэта неспадзеўка?

— А вось такая,— цётка паглядзела яму прама ў вочы.— Ты нарадзіўся... без бацькі.

— Як гэта? А дзе ж ён?..— аглушаны пачутым, зноў спытаў, пачырванеўшы, Лёшка.

Цётка болей нічога не ўтойвала:

— Думаеш, маці твая прызналася каму, хто ён? Упартая была, маўчала, як рыба... Сказала б — дзе дзеўся, ажаніўся б. Прымусілі б...

— Дык, значыць, бацька мой не... не...— ён не мог выказацца да канца, словы як перастралі ў горле, адчуў, што яму не хапае чым дыхаць.

— Ведаю, ведаю, што ты хочаш спытаць,— здагадалася, прыйшла на дапамогу цётка.— Можаш скакаць, радавацца: той чалавек, які кінуў вас недзе на хутары, сярод чужых людзей, а сам збег з немцамі — не твой бацька, не... Гэта пасля, ужо вайною, маці выйшла замуж...

— Як жа яна магла... такое? — болей не слухаючы цётку, цяпер ужо пабялеў, сарваў голас Лёшка.— Як жа яна магла?! За паліцэйскага...

— Ты вунь смаркачы пайдзі вытры,— узлавалася цётка,— а то крычаць тут удумаў. Куранё курыцу вучыць будзе... Многа надта знаць стаў...

Вечар, так добра пачаты, быў сапсаваны. Цётка выгнала пляменніка з кухні, пачала грымець гаршкамі, тазікам, вёдрамі, нешта пад нос сабе бурчаць.

Лёшку ж распіралі, радавалі і гнялі адначасова самыя розныя пачуцці. Хацелася галёкаць, крычаць на ўсю вуліцу, на ўвесь свет белы крычаць, каб усе чулі, усе ведалі пра тое, пра што даведаўся ён толькі зараз: не, не сабачае ён адроддзе, як кінуў яму неяк у твар, незразумела адкуль узяўшы звесткі пра яго, былы дзетдомаўскі повар Капітон,

якога прагналі з работы за п'янства і зладзейства. Яму, Лёшку, невядома, хто яго сапраўдны бацька,— крыўдна, пэўна ж, і балюча быць бязбацькавічам,— але ў сто, у тысячу разоў лепей, каб цябе абазвалі, калі пойдзе ўжо на тое, калі язык каму ўжо надта засвярбіць, байструком, чым варожым, сабачым адроддзем. Ну, як, як, які ж сэнс тады жыць на свеце, хадзіць па гэтай зямлі, увесь час тоячы, носячы глыбока пад сэрцам няўмольна-жорсткую праўду аб сабе?!

Усю тую ноч у цёткі ён не мог заснуць і цалюткі дзень назаўтра сноўдаўся, бы ў сне, быў рассеяны, некалькі разоў рабіў не так і не тое, што загадвала цётка, ад чаго яна злавалася, пырскала нават слінай, бы помсціла невядома за што...

І гэтак цягнулася не месяц і не два.

Пасля, калі Лёшка пайшоў у школу, у чацвёрты ўжо клас, і сапраўды пачаў прыносіць амаль адны пяцёркі, чым не маглі пахваліцца ні Аркадзя, ні Бронік, яна трохі сцішылася, не стала прыдзірацца да любой драбязы, да самай нязначнай макулінкі. На яе калі як находзіла, тады-сяды цётка была нават вясёлай, добрай. Але гэта чамусьці здаралася вельмі рэдка.

Лёшка разумеў, па-свойму шкадаваў цётку. Нясоладка ёй даставалася, нічога не скажаш. Ён жа бачыў, не сляпы можа, як цяжка жылі нават тыя, да каго ў хату вярнуўся з вайны цэлы і здаровы мужчына, гаспадар. І то трэба было высільвацца, ірваць жылы ў рабоце, каб звесці неяк канцы з канцамі. А тут яна адна, ды яшчэ з такімі сынкамі-неслухамі, ды яшчэ ён, пляменнік, навязаўся на яе шыю... Паспрабуй выстранчы, выхавай гэткую плойму без цвёрдае мужчынскае рукі...

Да нядаўняга часу цётка таксама мела ў хаце мужчыну, мужа, бацьку Аркадзя і Броніка, але невядома, чаму кінуў-рынуў чалавек сям'ю, гаспадарку, падаўся ў прымы ў суседнюю вёску да старэйшай ад сябе салдацкай удавы. Лёшка, калі цётка надта ўжо разыходзілася з праклёнамі і лаянкай, бэсціла без разбору ўсё і ўсіх запар, быў упэўнены, што цётку точыць, не дае спакою здрада мужа. Таму і выпальвае яна злосць на тым, хто першы трапляе пад руку. Першым чамусьці трапляў пад цётчыну руку пляменнік.

Так мінулі зіма, вясна. У тым годзе Лёшка трымаў іспыты за пачатковую школу. Не было чаго есці, душыліся крапівой, лебядой, святам лічылася, калі перападаў кава-

лак праснака. Ад таго, што вельмі кружылася галава, што ўвесь час чамусьці хацелася спаць і як ватныя былі ногі, іспыты тыя ён здаў з вялікай цяжкасцю.

Летам, каб неяк аблегчыць цётчына і сваё жыццё, прыдбаць капейку на абновы да школы, Лёшка згадзіўся пайсці ў падпаскі да калгаснага пастуха Мікіты Боруха. Пацягнуліся доўгія, як сама вечнасць, дні, з адным нязменным клопатам: не прапала б якая збродлівая карова, лепей бы напасвіць жывёлу, не пусціць у шкоду, хутчэй бы канчаўся гэты бясконцы дзень...

Неяк, ужо амаль перад самай школай, калі рэзка захаладала, з неба імжыў дробны, бы сеяўся праз сіта, дождж, а ён, Лёшка, скурчыўшыся, падабраўшы пад сябе босыя акалелыя ногі, сядзеў на ўгрэтым лапіку зямлі, молячы Бога, каб каровы яшчэ хоць трохі пабавіліся на адным месцы, не беглі наперад, незаўважна падышоў Борух, пастаяў моўчкі, пацмокаў языком, сказаў:

— Не па мне гэта, хлопча, умешвацца ў чужое жыццё, але ж не магу, гледзячы на цябе, і цярпець. Ты вось што: скажы як-небудзь цётцы сваёй, каб не скнарнічала, не выдурнялася болей, не прыкідвалася бядней за ўсіх. Захоча, дык і абуць знойдзе што, і на плечы накінуць, не калець жа, во, так, і пакарміць можа лепей. Зарабляеш жа, не за так цэлы дзень гібееш у полі... Пастухам калгас плоціць лепей чым каму.

Лёшка, якому ўжо неаднойчы даводзілася ад самых розных людзей чуць непрыемныя для яго, незразумелыя намёкі на нейкую незвычайную сквапнасць і жорсткасць цёткі, ваўкавата зіркнуў на Боруха, памаўчаў трохі, пасля едка адказаў:

— Чым яна не дагадзіла каму, ну чым? Усе гатовы з'есці яе... А ёй лёгка адной, га? Дзе яна набярэцца на траіх нас, дзе?

— Ты, малец, не гарачыся,— Борух, у гумовых ботах, у шырокай выцвілай, ажно бялёсай брызентавай накідцы, прыкленчыў побач, не думаў адставаць.— Людзі ведаюць, не сляпыя былі, колькі той паліцай цягаў ёй нарабаванага, усё задобрываў, купляў яе, каб з яе дапамогай затлуміць галаву тваёй мацеры. І цётка бясконца піліла, з хаты яе выжывала, абы толькі тая пайшла за паліцая... Пасля ж, калі немцы ўжо драпалі, маці твая і пісьмо аднекуль прыслала, пракляла ў тым пісьме сваю старэйшую сястру. Усе ж ведаюць пра гэта.

— Ніхто нічога не ведае, брэшуць усё, брэшуць,—

падхапіўся, бы ўджалены, Лёшка.— Цётка добрая, толькі няшчасная. Цяжка ёй адной.

— Ну, не буду нічога табе казаць. Але ж... шкада бачыць цябе такога...

— Не трэба мяне шкадаваць,— кінуў ужо на хаду, адыходзячы далей ад Боруха, хлопец.— Мне добра ў цётκі.

На тым размова і скончылася. Борух ніколі болей, хоць і расказваў пра вайну, пра вясковыя навіны, не кранаўся Лёшкавай балячкі...

І зноў пайшоў Лёшка ў школу, і зноў пацягнуліся дзень за днём, месяц за месяцам. Напрадвесні ён так абнасіўся, так дарваліся яго картовыя штаны, так разяпіліся, раскідаліся чаравікі — брыдка стала з'яўляцца не толькі ў класе, але і на вуліцы. Лёшка неяк заікнуўся цётцы, каб што пашыць ці купіць з абутку і адзення, бо ўжо ж і пальцам пачалі на яго паказваць, ды і ў Аркадзі з Бронікам мо знайшлася б якая непатрэбная апратка і падышла б яму. Аднак хлопец не рады быў, што і заікнуўся. Цётка як ашалела, на Лёшкаву галаву пасыпаліся гарачыя словы-камені:

— Вот як ты загаварыў, вот! Палюбуйцеся, людцы, як пляменнічак дзякуе мне, што прыгрэла ў сябе, выратавала яго, выбавіла з тога пекла...

— З якога пекла? — перапыніў Лёшка цётчына галашэнне, не зразумеўшы, пра што яна кажа.

— А з тога, з якога ты не ведаў, як уцячы, у кожным пісьме плакаў, каб выбавіла. З дзіцячага дома свайго... Скуль жа яшчэ. Ужо забыўся, памяць адабрала?

— Ніякага там не было пекла,— агрызнуўся Лёшка.— Ведаў бы, дык...

Цётка ажно вочы вырачыла ад здзіўлення, пасля хапілася за сэрца, цяжка плюхнулася на лаву:

— Дык што ж ты не бяжыш туды, што?! Яму, бачыце, ужо кепска ў цёткі. Горай, чым усім. А мне як, ты не падумаў?

Яна зноў загаласіла, заламала рукі, і Лёшка выбег на двор, каб не злаваць цётку яшчэ больш, каб жанчына неяк астыла.

Пасля тае размовы хлопцу зусім жыцця не стала. Хто ведае, як было б далей, калі б не адна неспадзеўка, якая праясніла ўсё тое, што і людзі казалі, і што ён сам адчуў, спазнаў на сваім карку.

Неяк, калі скончыўся першы ўрок, іхняму класу аб'яві-

лі, што будуць саджаць дрэўцы ў школьным двары, пойдуць усе ў лес, таму трэба, каб кожны прынёс лапату.

Лёшка, убачыўшы на дзвярах хаты замок, падумаў, што цётка недзе на калгаснай рабоце, і нямала абрадаваўся: не трэба будзе прасіць дазволу ўзяць тую лапату. Пакорпаўшыся ў звычным месцы — у застрэшшы ля дрывотні — і не знайшоўшы яе там, хлопец падаўся да хлява. Здзівіўся, што хлеў трохі прачынены, і адтуль, разам са спалоханым курыным квохканнем, чуецца яшчэ нейкае незразумелае бурчанне. «Мо хто ўбіўся, курэй палохае, а мо і нішчыць?» — падумаў з трывогай і, ціхенька падкраўшыся, зазірнуў у нешырокі прагал дзвярэй.

Адразу і вачам сваім не паверыў. Убачылася чортведама што: недалёка ад загарадкі, дзе звычайна стаяла карова, быў рассунуты ў бакі гной, зверху на ім ляжалі пачарнелыя тоўстыя плашкі, а між дзвюма кучкамі гною зеўрала чарнатой падполле.

Блізка ад дзіркі на свежай чыстай саломе стаяла спіной да дзвярэй цётка, трымаючы ў адной руцэ вялікі белы мяшок, другой рукой, нагнуўшыся, брала з-пад ног зваленыя як папала кофты, пінжакі, блузкі, штаны, шапкі, зімовыя і летнія, шчыблеты, боты — карацей кажучы, усё, што носяць і насілі на сабе людзі, і, паглядзеўшы, пакруціўшы кожную рэч перад носам, піхала ў мяшок, спачатку ў адзін, пасля ў другі. «Адкуль, дзе ўзяла яна гэтулькі ўсяго?» — не ўспеў падумаць яшчэ Лёшка і адчуў, як усярэдзіне ўсё апякло ад страшнай згадкі: дык гэта ж, пэўна, нарабаванае паліцаем і падараванае цётцы «дабро»?! Ці не пра тое намякалі яму, Лёшку, шмат хто з вяскоўцаў, ці не пра тое ж казаў і Мікіта Борух?..

Ужо не помнячы сябе, хлопец з сілай, на якую быў толькі здольны, ірвануў дзверы, расчыніў іх на ўвесь мах. Коратка і прарэзліва войкнуўшы, цётка імгненна абярнулася, выпусціла мяшок, які, паваліўшыся, паляцеў у дзірку і глуха чмякнуўся вобзем у глыбіні падполля. Спалатнелая, з дзіка вырачанымі вачыма, яна колькі хвілін стаяла нерухома, трымаючы ў адной руцэ нейкую анучу. Пазнаўшы пляменніка, злавесна ўхмыльнулася, памкнулася да яго. Лёшка адступіў крок назад, пасля згледзеўшы побач вілы, схапіў іх, нацэліў на цётку, крыкнуў:

— Закалю-ю-ю! Не падыходзь, чуеш?! Во якая ты, во!.. Людзі не манілі, праўду пра цябе казалі. З'еш, падавіся сваім барахлом. Кроў людзей на ім, а ты...

Цётка, убачыўшы перад сабой вілы, адышла на ранейшае месца, рашыла прыкінуцца нявіннай авечкай.

— Лёшачка, дзіцятка, ды што ж гэта з табою? Ты што ж гэта плявузгаеш на цётку родную? — Яна пастаралася нават усхліпнуць, выціснуць слязу, каб выклікаць у хлопца жаласць да сябе.— Ды гэта ж усё — і адзенне, і абутак — ад дзеда твайго і бабы засталося. Яны перад смерцю неяк схавалі, закапалі во тут, а я і забылася... Зусім галава ўжо здурнелая стала... Вот зараз мы знойдзем і для цябе што лепшае...

— Брэшаш ты, брэшаш,— не выбіраў болей слоў Лёшка, кідаў цётцы проста ў вочы тое, што думаў пра яе.— Усе дурныя, адна ты разумная?

Цётка перайшла ўжо на енк:

— На з'еш, закалі, загубі сваю цётку, душагуб ты няшчасны. Пашкадавала, думала, што чалавекам стане, а ён, бач, як загаварыў... Дык што ж ты стаіш, на, во, закалі, вілы ж вострыя...

Шпурнуўшы вілы ў агарод, Лёшка плюнуў і як не бегма падаўся з двара, далей ад усяго таго, жахлівага і пачварнага, з чым давялося сутыкнуцца, каб ужо болей ніколі не вярнуцца сюды.

## 6

Удзень, каб не паролі, не ганялі праваднікі, ехаць было б нішто, нават і добра. А вось ноччу... Ноччу ж горай не прыдумаеш. І адкуль браўся гэткі халодны вецер? Здэцца ж, калі на крутых паваротах ці на станцыях поезд сціпваў ход, а то і зусім прыпыняўся на хвіліну-другую, ні ветру, ні холаду быццам і не адчувалася. А варта было ўзяць разгон — і працінала наскрозь, холад ледзяніў кожную клетачку цела. І ўжо не памагала тое, што яны насоўвалі шапкі ледзь не на самыя вочы, зашпільваліся на ўсе, якія толькі ёсць, гузікі, настаўбучвалі каўнерыкі сваіх лёгкіх пінжакоў, ціснуліся адзін да аднаго як толькі маглі.

Затое раніцай, калі падымалася сонца, яны весялелі. Ведалі, што наперадзе дзень, цяпло, «жытуха», як любіў казаць на кожным кроку Славік. Цяпер найпершы клопат быў — здабыць харч, каб замарыць чарвячка, бо за ноч, хоць і халадна было, чарвячок гэты рос, звярэў, рабіўся ненажэрным, гатовы быў на што заўгодна піхнуць хлопцаў, падбухторыць на любы нечаканы ўчынак. Ніякага ратунку не было з ім. Ён, чарвячок, прымушаў іх злазіць

з верхатуры вагона, ісці на рызыку быць схопленымі праваднікам, міліцыянерам, кім хочаш з дарослых, каб затым трапіць у дзетпрыёмнік. А як жа тады з іхняй марай? Калі яшчэ ў жыцці выпадзе такая магчымасць пабачыць вырай, куды кожнае восені, як становіцца холадна і голадна, ляцяць птушкі? Калі яшчэ змогуць убачыць яны запаветнае мора, якое разлеглася ад краю да краю зямлі, што ні сокал яго не пераляціць, ні вокам яго не акінуць?..

Лёшка ўдзячны лёсу, што звёў яго са Славікам. Што ён рабіў бы без Славіка? Дзе дзеўся б?

Тады, у той дзень, калі, не помнячы, куды і чаго бяжыць, Лёшка прыбег усё ж на вакзал, абы толькі далей ад ненавіснай цёткі, ён і думаць не думаў ні пра якое мора, ні пра якое вялікае падарожжа. Проста сядзеў на лаўцы ў прыстанцыйным скверыку, астываў пасля няблізкай дарогі, у галаве валюхаліся цяжкія гнятлівыя думкі. У гэты момант не радавалі ні вясна, ні шчодрае сонца, ні чаромха, што густа кусцілася над галавой і ўжо — раней чым дзе — цвіла, дурманліва пахла мо на сто метраў наўкруг. Недзе побач весела цілікалі, славілі жыццё, бездань блакітнага неба вераб'і, іншыя птушкі.

У гэты момант Лёшка як ніколі раней пазайздросціў птушкам, хоць бы тым жа вераб'ям: ну чаго, чаго ім можа не ставаць? Чаму ім не цешыцца, не радавацца? Ні пра што ім няма клопату. Ні пра адзенне, ні пра сваю хату — начлег птушка заўсёды знойдзе, а болей нічога і не трэба,— ні пра харч нават. Харчу летам птушцы таксама колькі хочаш. А вось чалавеку... Ого-го, чалавеку зусім не тое. Чалавеку многае трэба. Яму нельга так, як птушцы — сёння тут, заўтра там. Паспрабуй ты пражыві, калі не прыбіўся ні да якога берага, і няма табе з кім ні параіцца, ні каб хто падказаў, што і як рабіць...

Ён не адразу прыкмеціў, як побач на лаўцы прыткнуўся, смачна зачмякаў ротам, аплятаючы хлеб з лівернай каўбасой, падлетак. Толькі калі знекуль прыляцелі, пачалі расхаджваць ля ног два, а пасля да іх далучыўся і трэці, галубы, спрабавалі шукаць крошак, Лёшка ўзняў галаву, глянуў, хто гэта прысуседзіўся да яго. Хлапчына — ён быў апрануты лепш, чым Лёшка, але надта змятай выглядала ўся яго апратка, бы валяўся чортведама дзе,— таксама пільна акінуў поглядам свайго равесніка, нават перастаў жаваць, усміхнуўся добрай вінаватай усмешкай.

— Ты адкуль? — спытаў смела, як быццам яны даўно былі знаёмыя, толькі не ведалі такой-сякой драбязы адзін

пра аднаго і цяпер, седзячы разам, рашылі перакінуцца словам-другім, усё да канца высветліць.

— Я?..— разгубіўся Лёшка, думаючы, што адказаць, пасля нечакана, паддаючыся нейкай невядомай прыцягальнай сіле гэтага незнаёмага хлапчука, сказаў: — Я ні скуль...

— Яно і відаць,— падлетак пасунуўся бліжэй, разламаў папалам хлеб, падзяліў на роўныя часткі ліверную каўбасу, працягнуў Лёшку: — На вось, жуй пакуль што. Цябе як завуць?

— Лёшка.

— Ну, а мяне Слава, хочаш — Славік,— хлапчук, як дарослыя робяць, падаў сваю закарэлую вузкую далонь, неспадзявана моцна ціскануў Лёшкаву руку.

Больш нічога не кажучы, ён зноў апетытна пачаў жаваць, пакуль не скончыў і хлеб, і каўбасу. На зямлю не ўпала ніводнай крошкі. Галубы, спадзеючыся на ласунак, яшчэ трохі пацерліся ля ног і, пераканаўшыся, што марна патрацілі час, што нічога ім так і не дастанецца, нездаволена завуркаталі, лопнулі крыллем, паляцелі некуды за пуці.

Лёшка таксама з'еў усё да апошняга каліва і толькі цяпер адчуў, які ён галодны і стомлены.

— Вады хочаш? — спытаў Славік.

— Ыгы,— Лёшка і сапраўды ўжо да гэтага думаў, каб дзе напіцца, спатоліць смагу, бо, пакуль бег да станцыі, можа, з кацялок поту выцекла, кашуля і пінжак і цяпер мокрыя, хоць ты бяры ды выкручвай.

— Сядзі тады тут,— сказаў Славік.— Я хутка...

Ён не забавіўся, прынёс у нейкай бутэльцы вады, напіўся сам, даў Лёшку.

— Во, цяпер самы раз, жытуха,— сказаў Славік.— Можна ехаць і далей.— Ён хвіліну памаўчаў, пасля, нібы што радаснае цюкнула ў галаву, засвяціўся тварам.— Давай разам, га? Во здорава будзе!

— Гэта куды... разам? — спытаў Лёшка.

— Куды ўсе птушкі ляцяць. Да саменькага мора. Там і цёпла, накупаемся ўволю, там і яблык, і сліў тых, і яшчэ многа чаго — хоць пуза распяражы. Жытуха!

— А скуль ты ўзяў, што там... усё гэтак?..— Лёшка шукаў нейкага паратунку ў сваім становішчы, гатовы быў хапіцца хоць за саломінку, але каб вось так, адразу...

— І не сумнявайся,— па-сапраўднаму загарэўся ўжо Славік.— Я ведаеш колькі кніжак чытаў пра тое мора, пра

поўдзень. Птушкі ж не дурныя. Ведаюць, дзе ім зімой добра будзе.

— Цяпер жа не зіма,— слаба ўжо запярэчыў Лёшка.— Яны ж, птушкі, зараз і сюды ляцяць.

— Ну, і няхай ляцяць. А мы ж не навек туды. Вось паглядзім мора, пажывём трохі і таксама вернемся.

— А ў цябе таксама бацькі, маці няма? — спытаў Лёшка.

— Чаму ж няма — ёсць! — весела адказаў Славік.— Во недзе яны цяпер палётаюць, папашукаюць мяне... Бацечка будзе ведаць, як размахваць сваёй папругай...

— Ну, а маці? — не стрываў Лёшка, адчуўшы, як зайшлося сэрца ад незразумелага болю і смутку.

Славік на хвіліну спахмурнеў, наморшчыў лоб, не стаў хітраваць:

— Мамы шкода. У яе нервы... Яна настаўніцаю. А я яшчэ і са школы сарваўся... Але ж бацечка... Будзе ведаць...

Лёшку гэтая шчырасць спадабалася, і ён, памаўчаўшы трохі, нібы прыкідваючы, як быць, сам ужо працягнуў Славіку руку, даючы зразумець, што гатовы з ім хоць на край свету.

...Сонца нарэшце пачало прыпякаць у спіну, нагрэла бляху, і яны цяпер, пасля бяссоннай ночы, з асалодай выцягнуліся на ўвесь рост, паклаўшы галаву на рукі, драмалі. Гаварыць не хацелася. Каб не голад, не пусты жывот, можна было б вось так ляжаць хоць суткі, хоць двое, пакуль не прыедуць да таго мора. Аднак кожны, нават і ў сваім салодкім забыцці, воляй-няволяй змушаны быў думаць, калі ж, нарэшце, поезд спыніцца на якой вялікай станцыі. А тут ужо ўсё ад цябе залежыць. Ад тваёй кемлівасці, спрыту, нават хітрасці. Перш-наперш трэба хоць трохі ачысціць рукі, твар, а збольшага і адзенне ад бруду, бо пакажыся толькі замурзаны, як чорт той, сярод людзей — схопяць, адразу ж пазнаюць, хто ты і што ты. Тады ўжо прасіся не прасіся, бажыся не бажыся, што табе вось так, да зарэзу, трэба ехаць, што ў цябе там, на тым поўдні (нават і адрас назавеш) памерла цётка ці, скажам, братунька твой адзіны, ніхто не прыме пад увагу тваю просьбу, тваё малёганне, толькі пасмяюцца яшчэ, скажуць, што ты не першы такі разумнік, былі і хітрэйшыя, і мудрэйшыя за цябе, аднак жа... Што азначала гэтае «аднак жа», табе не трэба доўга тлумачыць, ты сам усё разумееш...

Вось чаму пры набліжэнні да вялікай станцыі яны рыхтаваліся загадзя. Найбольшы клопат браў на сябе, вядома, Славік. Ён слініў брудную насоўку, выціраў ёю твар, рукі, далонямі разгладжваў, размінаў штаны, пінжачок і, падноўлены, сачыў цяпер, каб не напароцца на праваднíка, неяк непрыкметна, пакуль поезд яшчэ не затармазіў канчаткова, злезці, а то і скокнуць на зямлю, бо пасля, на самой станцыі, навідавоку ва ўсіх, рабіць гэта рызыкоўна. Лёшка ж, каб не прыцягнуць да сябе ўвагу, зашываўся то ў пустую скрыню з-пад акумулятара, часам курчыўся ў «шпакоўні», калі там не было вугалю, а то саскокваў таксама на зямлю, каб цябе толькі, бронь Божа, не бачылі тыя, у каго вельмі пільнае на такіх, як ты, бадзяг, вока і каго на мякіне не правядзеш.

Калі ж усё ішло так, як намецілі, як загадзя спланавалі, яны, варта было поезду крануцца, ад'ехаць трохі ад станцыі, ужо зноў сядзелі на даху вагона, сілкаваліся тым, што ўдалося здабыць, ухапіць Славіку.

Гэты раз здабыча аказалася як ніколі шчодрай — цалюткая смажаная курыца, што не ўспела нават астынуць пасля печы. Шкода, хлеба толькі малавата асталося на дваіх, а так можна было б наесціся ўволю, ды яшчэ такой смакаты, пра якую найбольш у сне і марыш.

Разадраўшы курыцу на дзве палавінкі, Славік падзяліў і кавалачак ачарсцвелага хлеба.

— Бедная цётка,— жуючы мяса, ад якога цяклі слінкі, сказаў Лёшка.— Не далічыцца гэтулькі грошай.

— Не бедная яна, не бядуй,— засмяяўся Славік.— У беднай бы я не браў. Бачыў бы, колькі ў яе жмені грошай і якая раскормленая, расфуфыраная сама...

— Во, пэўна, ляманту нарабіла? — дапытваўся Лёшка.

Славік зноў засмяяўся:

— Крычала, уга, бы рэзаў хто. Ды пад вагон таварнягі, які крануўся быў, ніхто не асмеліўся кінуцца. Лаві момант...

— Ты ж таксама мог... астацца пад тым вагонам.

— Х-хе. Трэба ўмець і не зяваць толькі,— хваліўся Славік, і Лёшка каторы ўжо раз падумаў, што з гэтым хлопцам нідзе не прападзеш.

Не ведаў ён, што праз якое паўгадзіны недарэчны, жахлівы выпадак назаўсёды разлучыць яго са Славікам, абарве іх мару, нажом наласне па сэрцы бяда...

Паеўшы, улагодзіўшы свайго чарвячка, які перастаў назаляць у жываце, смактаць сокі, яны з задавальненнем расцягнуліся на даху. Цягнік імчаў хутка, і вецер біў у галаву тугой хваляй, але яна, гэтая хваля, паводлуг з начной была зараз нейкая надзіва пяшчотная, добрая, хіліла на смачны сон.

І яны, перакінуўшыся словам-другім, заснулі, угрэтыя знізу і зверху. Спалі невядома колькі, аднак прачнуліся амаль аднагасова ад нясцерпнае гарачыні. Бляшаны дах пад сонцам, хоць і авяваўся ветрам, ажно патыхаў агнём, і трэба было шукаць нейкай рады. Лёшка, увесь мокры ад поту, бачыў, як Славік стаў на ўвесь рост, каб трохі ахаладацца, са сну няўпэўнена, бы п'яны, зыбаецца на нагах. «Асцярожна!» — хацеў сказаць яму Лёшка, аднак слова захрасла ў горле, і замест яго з грудзей вырваўся нечалавечы не то крык, не то стогн: усярэдзіне ўсё анямела, калі краем вока згледзеў, як на іх з шалёнай хуткасцю наплывае нешта цяжкае, сталёвае. Не адразу і ўцяміў, што гэта мост, маставіна. А ўцяміў, было позна — тупая жалезная сіла раз'ятрана ўдарыла, шпурнула хлопца ад сябе, і той не ўспеў нават войкнуць...

— Сла-а-а-ў-к-а-а-а! — нарэшце прарэзаўся ў Лёшкі голас, і хлопец сам не пазнаў яго: гэтулькі было ў ім жаху, роспачы і болю.

Хацелася тут жа скокнуць на хаду з поезда, бегчы туды, да таго моста, дзе зваліўся Славік. Але нейкі непадуладны яму інстынкт самаахове спыніў, нібы сказаў у саменькае вуха: «Ну чым, чым ты паможаш?! Сябру твайму ўсё роўна, а сам, калі скокнеш на такой шалёнай хуткасці, таксама можаш развітацца з жыццём. Эх, дзеці вы, неразумныя дзеці...»

Ен, цяпер ужо не зважаючы ні на спёку, ні на пот, які мяшаўся разам са слязьмі, горка, надрыўна плакаў, уткнуўшыся тварам у далоні. А поезд, нібы нічога не здарылася, нёсся і нёсся, паглынаючы кіламетр за кіламетрам, і Лёшка быў абыякавы цяпер, куды і чаго ён едзе. Толькі б хутчэй і далей ад таго праклятага месца, ад таго страшнага моста! У гэтую хвіліну ён пакляўся, што ніколі-ніколі ў жыцці, як бы туга ні давялося, ён не возьме чужога, не зробіць таго, што ганьбуецца, асуджаецца людзьмі. Яму здавалася, не, ён быў чамусьці перакананы, што Слаўку пракляла тая тлустая цётка, у якой ён пажывіўся курыцай. Ну, навошта, навошта было гэта рабіць?! Хай бы

лепей яны апухлі ад голаду, пілі адну ваду... За што такая кара?!

У няўцешным сваім горы Лёшка не прыкмеціў, як поезд падышоў, спыніўся на вялікай станцыі. Недзе ўнізе крычалі, гаманілі людзі, але ён нікога не бачыў, нічога не чуў. Не адразу ўчуў ён і вокрык пажылога вусатага дзядзькі ў міліцэйскай форме, які стаяў на пероне і глядзеў у яго, Лёшкаў, бок:

— Ну, каму кажу?! Злазь! Вось я зараз...

Лёшка схамянуўся толькі тады, калі вокрык гэты, набыўшы больш грозную інтанацыю, быў паўтораны яшчэ і яшчэ раз. Ён канчаткова ўжо зразумеў, што папаўся, што аніяк не выкруціцца, бо калі павярнуў галаву ў другі бок, убачыў чыгуначніка, які таксама махаў рукой, нешта казаў яму, нечым пагразіўся. «Ат, цяпер мне ўсё адно...» — падумаў вяла, абыякава і пачаў злазіць уніз, на той бок, дзе міліцыянер. Вядома, каб не няшчасце са Славікам, ён гэтак лёгка не даў бы каму злавіць сябе, ён бы яшчэ паказаў, на што здатны, чаму навучыўся за кароткі час ад сябра. Яны яшчэ пабегалі б, папацелі, пакуль злавілі б. І ці злавілі б? А зараз хай радуюцца, хай будзе паіхняму, хай думаюць, што ён апошняе цялё, якое спалохалася вокрыку і само ідзе ў рукі... Эх, Славік, Славік... Што ты нарабіў? Хай бы ўжо заадно і яго, Лёшку, спасцігла тая кара, было б, можа, лепей, чым вось так мучыцца...

— Пайшлі са мной,— уладна загадаў міліцыянер і ўзяў Лёшку пад руку.— Хто ж ты будзеш і куды пуцьдарожку трымаеш?

Лёшка, аднак, маўчаў. Яму ніколечкі не хацелася гаварыць, адказваць на нейкія там пытанні. Хай робяць што хочуць, толькі каб не лезлі ў душу са сваімі роспытамі, яму і без іх млосна, моташна, здэцца, не жыў бы ні дня на свеце.

— Што, нямко ці не чуеш? — заўсміхаўся нечага ў вусы міліцыянер.— На гэта ваш брат здатны. Але ў нас таксама нюх, не думай сабе. Вашага брата мы знаем як аблупленага, можаш не сумнявацца.

— А я і не сумняваюся,— проста адказаў Лёшка, і вусач, здзіўлены, што хлопец вось так адразу, без прынукі, загаварыў, ажно спыніўся, паўглядаўся ў ягоны твар, нават прыцмокнуў языком.

У прывакзальным жа пакоі міліцыі Лёшка не стаў болей нічога казаць, як у яго ні дапытваліся і наконт прозвішча, і ўсяго астатняга, што ў такіх выпадках пы-

таюць у затрыманага. Зноў успомніўся Славік, тая хвіліна, калі на яго, паўсоннага і разамлелага ад гарачыні, насоўваецца жалезная аграмадзіна, і Лёшка, забыўшыся, дзе ён, зноў нема ўскрыкнуў, чым нямала збянтэжыў і вусача, і яшчэ аднаго, малодзенькага міліцыянера ў новенькай, з іголачкі, форме з пагонамі і дзвюма зорачкамі на кожным.

— Ты што, малец, баішся гэтак нас ці захварэў? — спагадліва ўжо спытаў малодзенькі міліцыянер.— Мы ж дабра табе толькі жадаем. Паглядзі на сябе, які ты змардаваны, абарваны і брудны. А мы цябе, калі не маеш каго з родных, не ўцёк часам з-пад бацькавай апекі, кудынебудзь устроім, там хоць накормяць і апрануць, чалавекам зробяць.

«Во дае, як па пісанаму,— яхідна падумаў пра новаспечанага лейтэнанціка Лёшка.— Ну, старайся, старайся, табе за гэта і зорачкі давалі, і грошы немалыя, відаць, плоцяць. Тваё дзела пытацца, а я пагляджу, адказваць ці не...»

Як ні біліся міліцыянеры, хлопец, аднак, не выціснуў болей ні слова.

— Ну, што ж, Хромчанка,— сказаў лейтэнанцік,— давядзецца зноў табе ціснуць на педалі...

Вусаты, якога назвалі Хромчанкам, моўчкі, бы неахвотна, пайшоў у цёмную бакоўку і вывалак адтуль заляпаны гразёю, абшарпаны веласіпед.

— Паехалі,— вусаты ляпнуў Лёшку па плячы.

На дварэ ён, трымаючы дзвюма рукамі руль, загадаў хлопцу садзіцца на раму, сам жа, трохі разагнаўшыся, лоўка скочыў на сядло, пачаў «ціснуць на педалі».

Спачатку ехалі па брукаванай вуліцы, добра-такі трэсла, задняе кола, відаць, слаба надзьмутае, вобадам біла аб камяні. Па тым, як хутка запыхаўся, пачаў кехкаць вусаты, Лёшка здагадаўся, што возчык ягоны, з яго сэрцам, не вельмі разгоніцца на веласіпедзе. За горадам, праўда, калі брукаванка скончылася і яны вывернулі на вузкую, добра ўбітую сцяжынку ўсцяж гравійкі, машына пакацілася шпарчэй. «Куды ж ён мяне вязе?» — падумалася нечакана, бо да гэтага Лёшку было ўсё роўна, як абыдуцца з ім, куды піхнуць.

— Куды едзем? — асмеліўся, нарэшце папытаў ён.

— Іч ты яго,— вусаты перастаў кхекаць, трохі выраўняў дыханне,— а я думаў, ты так напалохаўся нашай канторкі, што і мову адняло... Ну, то й добра, што язык

у цябе цэлы... Спатрэбіцца. А едзем мы ў дзетпрыёмнік. Яшчэ пяць кіламетраў пацярпі. Там будзе табе добра.

Лёшку раптам стала сумна. Ён ведаў, што ў дзетпрыёмніку ўжо не выкруцішся, там патрымаюць столькі, колькі трэба будзе, і ўцячы адтуль горай нават, чым з міліцыі. Славік расказваў, як яго запраторылі, яшчэ ў самым пачатку свайго падарожжа, у адзін з такіх дзетпрыёмнікаў. Нацярпеўся ён там! Не, не ад начальства, а ад самой шантрапы. Усякія там сустракаліся... Найбольш, вядома, траплялі туды няшчасныя, разгубленыя ў жыцці дзеці з пакалечаным за час вайны лёсам, але ж да іх дамешваліся — паспрабуй, разбярыся спачатку! — і апошнія нягоднікі, якія падміналі пад сябе слабейшых, гатовы былі на ўсё, абы самім было добра.

Славіка, калі ён яшчэ адбываў свае дні ў ізалятары, такія вось падбухторвалі напасці ноччу на вартаўніка, звязаць, а то і затаўкчы чалавека да паўсмерці, калі стане лямант узнімаць, адабраць ключы ад кладоўкі, пераапрануцца ў сваё ашмоцце і даць дзёру. Славік наадрэз адмовіўся. Тады яны, скруціўшы ручнікі, білі яго, нарабілі на целе сінякоў, пагражалі нават, хай толькі выдасць ці паскардзіцца каму, ноччу падушкай задушыць. Можа, вядома, палохалі, але ж... Цудам удалося хлопцу вырвацца з таго дзетпрыёмніка.

Пра гэта ён амаль усю дарогу, як ехалі разам, расказваў, вучыў на ўсякі выпадак. Дык няўжо ж яму, Лёшку, каторы не адзін год еў дзетдомаўскі хлеб, давядзецца паспытаць і таго, што даюць у дзетпрыёмніках? Які ж з іх смачнейшы і саладзейшы?

Дарога зноў пайшла ўверх, і Лёшка спадзяваўся, што вусаты выдыхнецца, павядзе веласіпед у руках, тым часам дасць магчымасць і яму трохі размяцца, бо сядзець болей на раме, на гэтай вузкай жалязяцы стала пакутліва. Аднак міліцыянер, як цяжка ні даводзілася, і не думаў спыняцца. «Вось жа настыра,— узлаваўся ўжо хлопец.— Гэтак баіцца, каб не ўцёк».

І раптам нібы стрэліла ў галаву: так, ён павінен уцячы. Павінен! Яму абавязкова трэба даехаць да таго сіняга мора, да якога імкнуліся разам са Славікам, пра якое гэтак марылі, дрыжучы ноччу ад холаду на даху вагона. Можа, не так дзеля сябе, як дзеля Славіка трэба даехаць. Як далёка адсюль былі б яны ўжо разам з ім, калі б не такая раптоўная і жахлівая смерць...

Цяпер жа трэба нешта рабіць...

Лёшка ліхаманкава пачаў думаць, што зрабіць, каб выбавіцца з учэпістых рук міліцыянера. Бо трохі яшчэ прамарудзіш — і будзе позна. Недзе ж, пэўна, блізка той дзетпрыёмнік...

Рашэнне прыйшло нечакана: калі сцяжынка крута пабегла ўніз і міліцыянер, здаволены, перастаў круціць педалі, расслабіўся. Лёшка штомоцы рвануў руль улева, туды, дзе канаўка. Веласіпед, бы стрыножаны, кульнуўся ўніз, кульнуліся праз галаву, рассыпаліся ў розныя бакі і яны. Лёшка, па́даючы, запознена пашкадаваў вусатага: пэўна, нялёгка таму дастанецца, чалавек жа ён немалады, прытым, адчуваецца, з хворым сэрцам. Навошта было так жорстка! Яму ж, Лёшку, нічога кепскага не сказалі, тым болей не зрабілі... Але ж як інакш уцячэш?

## 7

На той станцыі, дзе яго ссадзілі, ён і не думаў паказвацца. Ведаў, здагадваўся, што вусаты міліцыянер і маладзенькі, з зорачкамі на пагонах, не будуць драмаць, зробяць усё, каб злавіць яго. Пэўна ж, дзе ім шукаць найперш, як не ў сябе пад носам. «Хіцер Зміцер, але ж і мы не дурні»,— нагадаліся словы Славіка, сказаныя ім аднаго дня, калі яны ўцякалі ад кантралёраў і праваднікоў, а тыя, як ніколі дагэтуль, заўзята ганяліся за імі.

Лёшка прайшоў усцяж чыгункі, дзе па шпалах, дзе полем, лугавінай кіламетраў пяць, ногі падкошваліся ўжо ад стомы і голаду, але новай станцыі, на якой, па яго меркаванню, маглі б спыняцца цягнікі, не было і ў паміне. Бралася на вечар, сонца — цэлы дзень яно шчыравала ў чыстым, без аднае хмурынкі небе — зараз садзілася ў густую попельна-шэрую хмару. Памацнеў вецер. Лёшка затрывожыўся. Трэба было думаць, каб і адпачыць дзе знайсці, і ўберагчыся ад навальніцы, а па ўсім адчувалася, што ідзе навальніца, і каб перахапіць што на зуб, бо кішкі і так ужо марша граюць. Аднак нічога яму пакуль не свяціла: вакол не было ніякага жылля, дзе можна папрасіцца на начлег і падсілкавацца. Адыходзіцца ж далёка ад чыгункі таксама не хацелася, ды не ставала і сілы. Чым болей набрыньвала сінькай паветра, чым бліжэй насоўвалася хмара, тым большы непакой і трывога закрадваліся ў душу. Лёшка, перасільваючы сябе, наддаў ходу — тлела надзея, пакуль разгрымiцца над галавой, патокамі вады

абрынецца на яго і зямлю неба, усё ж дабрацца да якой-небудзь станцыі ці хоць будкі чыгуначніка. А там ужо — як будзе, так і будзе. Болей выбару яму няма.

Яшчэ здаля ён угледзеў сярод палявой роўнядзі невысокі грудок, на якім, сплёўшыся густымі кронамі, раслі магутныя не то дубы, не то клёны. Лёшка, абрадаваўшыся,— усё ж не на голым месцы заспее яго ноч! — папраставаў да таго грудка. Падышоўшы бліжэй, убачыў, што гэта нейкія іншыя дрэвы, якіх ён ні разачку нідзе не сустракаў. «Відаць, паўднёвыя,— здагадаўся хлопец.— Пэўна, і да мора ўжо не так далёка». Адно з дрэў-волатаў аказалася, на шчасце, з вялікай і глыбокай чорнай дзіркай-лазам у самым камлі, выпаленай не адным, пэўна, пастуховым вогнішчам.

Пакуль яшчэ не пачаўся дождж, Лёшка кінуўся рваць рукамі траву, якой тут, на грудку, было не так і багата. Аднак праз хвілін пятнаццаць—дваццаць ён ужо сядзеў у неспадзяванай сваёй хованцы на мяккай травяной пасцелі, і калі па густой лістоце спачатку нясмела зашпокалі, а пасля спарней зашасталі буйныя кроплі, усё набіраючы і набіраючы тэмп, калі ўверсе раз-другі магутна вухнула, высекшы ў небе асляпляльную маланку-змейку, хлопец па-сапраўднаму ўжо радаваўся жыццю, волі, прасторы, быццам з навальніцай і сам ад нечага ачышчаўся, пераходзіў у нейкую новую, невядомую нават для самога сябе якасць. У гэтую хвіліну ён нібы забыўся і на тое, што цэлы дзень нічога не еў. Сапраўдны голад Лёшка адчуў трошкі пазней, калі, адвухаўшы громам, адшумеўшы ліўнем, адбліскаўшы агністымі маланкамі, навальніца пакацілася далей, за невядомы небакрай, калі ў душу, разам з цеплатой, парнасцю ночы, палілася лагоднасць і замілаванасць да ўсяго, што ёсць за зямлі. Вось тут, у такі непрымальны момант, і прачнуўся яго, Лёшкаў, закляты вораг, зверам выпусціў свае кіпці ў жываце, патрабаваў харчу. Ну, а дзе, дзе ўзяць зараз чаго, што можна было б трымаць у роце, хай сабе і не вызначаўся б той харч асаблівай далікатнасцю і смакам?

Цяпер ужо не холад, а пусты страўнік успароў яго ледзь свет з цёплай і досыць утульнай хованкі і пагнаў шукаць жыллё, людзей, якія, ён ведаў, не дадуць яму прапасці. Быць такога не можа, каб чалавек прапаў сярод людзей!

Раніцай, пасля кароткага, але глыбокага сну ішлося лягчэй і весялей і, каб не вось гэтая непрыемная пустата

ў жываце, можна было б бегчы хоць дваццаць, хоць трыццаць кіламетраў.

Станцыя, якая стрэлася на шляху, выглядала меншай за тую, адкуль ён з такімі прыгодамі дабіраўся, аднак, па ўсім бачна, цягнікі тут рабілі прыпынкі. Вунь на запасным пуці і зараз стаіць нейкі таварняк. Цікава, у каторы бок ён і ці хутка пойдзе? Лёшка не стаў падыходзіць да самеңькага вакзала: баяўся, што мо блізка дзе ціраюцца грозныя чыгуначныя начальнікі і загадаюць яго затрымаць. Адзін раз выкруціўся, а ці ўдасца другі? Не, лепей быць асцярожным і абачлівым. Але зноў жа: як тады разжыцца харчамі? Вядома, вяліся б грошы, то знайшоў бы спосаб купіць што-небудзь у буфеце, а то і з рук у цёткі. А без капейкі ў кішэні... Ці, можа, як Славік? Не, у яго, Лёшкі, так не атрымаецца, гэта ён добра ведаў. А што ж тады рабіць? Падысці да каго, працягнуць руку, разжаліць?..

У ваганнях, роздуме, як быць і што рабіць, Лёшка прабавіў нямала часу. Сонца паднялося ўжо высакавата, выпіла дажджавую вільгаць на траве, лісці, дабралася і да лужын, у якіх весела купаліся, дурэлі вераб'і.

— Гэй, хлопец! — раптам пачуўся аднекуль ззаду гучны мужчынскі голас.

Лёшка, скалануўшыся, імгненна абярнуўся, глянуў, адкуль ішоў той голас, аднак, акрамя адзінокага таварнага вагона, што прыткнуўся ўскрай заваленай вугалем платформы на заржавелым запасным пуці, нічога не ўбачыў. А голас пазваў зноў:

— Ну, табе, табе кажу, чаго каленкі дрыжаць? Ідзі сюды, памажы.

Лёшка нарэшце згледзеў у вузкай шчыліне акенца вагона чыйсьці цёмны твар, руку, якая махала яму. «Ага, грузчыкі,— здагадаўся хлопец, смела кіруючыся да вагона.— А вунь жа і вугаль ляціць на зямлю, сыплецца пад колы».

Ён зайшоў з другога боку, зазірнуў у рассунутыя дзверы вагона, які быў яшчэ больш чым напалову запоўнены. Там, у чэраве, нехта заўзята шоргаў шуфлем, чэрпаў поўны і з сілай шпурляў вугаль у праём, далей ад сябе.

Лёшка кашлянуў, шорганне прыпынілася, і чалавек, у адных трусах і голы да пояса, увесь у чорным ліпкім брудзе, паказаўся ў дзвярах.

— Лезь сюды,— грузчык падаў Лёшку руку і, калі хлопец апынуўся ўсярэдзіне вагона, коратка сказаў: — Памагай. Запарыўся, бачыш. Паясніца каб не балела, то

даўно ўжо адзін справіўся б. Хапіла ж вот нечакана...— Ён пайшоў у другі куток, узяў яшчэ адзін шуфель, з адпаліраваным да бляску дзяржальнам, працягнуў Лёшку.— Цябе як завуць?

— Аляксей,— салідна, як дарослы, адрэкамендаваўся хлопец.

— Ну, Аляксей, Алёша, Лёшка — гэта ўсё адно, гучыць, адным словам. А мяне можаш зваць Сцяпанам. Раскідаем гэты вагончык — нейкая і манета, глядзі, у кішэні зазвініць. Згода?

— Ага,— Лёшка радасна кіўнуў галавой, маючы намер адразу ж пачаць працу.

Але Сцяпан спыніў яго, змераў поглядам з ног да галавы, хмыкнуў, прапанаваў:

— Ты вось што, Аляксей,— гэтак жа, як і я, скідай усю сваю апратку. Тут, брат, не ў канторы, работка наша хоць і добрая, грашовая, але ж у атмасферы не азонам будзе пахнуць. Пылку, адным словам, наядзімся ўволю... Адзежу схаваем, выбіваць, выпыльваць пасля не давядзецца.

Лёшка спалохаўся гэтай прапановы, разгублена стаяў, не ведаючы, як выкруціцца, што адказаць. Не скажаш жа чужому чалавеку, што трусы ягоныя — адна толькі назва, смяхоцце, а не трусы. Цётка з нейкіх старых пярэстых анучак сама скроіла, пашыла яму, строга наказала яшчэ шанаваць, бо дзе ж яна, маўляў, накупляецца крамнага, гэтак жа можна і па свеце з торбай пайсці... Карацей кажучы, пярэстыя тыя трусы ўжо не трусамі сталі, а чортведама чым, каб дзе пры староннім скінуць штаны — сораму не абраўся б. Таму ён панура маўчаў. Сцяпан, відаць, адгадаў яго думкі, пакінуў у спакоі, адышоўшыся, папляваў на далоні, пачаў заграбаць на шуфель вугаль, зноў кідаць у праём. Лёшка ж зняў толькі свой картовы пінжачок, які і так быў ужо забруджаны — горай не прыдумаеш, скруціў яго, паглядзеў, куды можна кінуць.

— Давай сюды,— працягнуў руку Сцяпан.— У мяне тут рэчавы мяшок, туды не наб'ецца пылу.

Удвух пайшло спарней. Лёшка стараўся як толькі мог. Вельмі не хацелася яму, каб Сцяпан, чаго добрага, расчараваўся ў ім, падумаў, што ён абібок які, бадзяга, беларучка, не ўмее і не хоча нічога рабіць. О, Лёшка яшчэ паказаў бы, на што здатны, каб не мучылі голад і смага. На работу ён заўсёды — і ў дзетдоме, і ў цёткі — ішоў без прынукі, не цураўся, не палохаўся нічога з таго, што яму ні даручалі б.

Вугаль, праўда, разгружаць не даводзілася, аднак шуфель ён трымаў у руках неаднойчы: як снег зімою раскідалі, калі вельмі намятала, ці то як калгасу дапамагалі на таку ў часе ўборкі. З вугалем, ды яшчэ ў пыльным вагоне, было, вядома, цяжэй, але ж неяк вытрывае, пастараецца не горай за Сцяпана кідаць.

Спачатку ўсё гэтак і было. Увайшоўшы ў імпэт, Лёшка, мусіць, не пачуў, таму і не адгукнуўся на прапанову каліва перадыхнуць, хапіць свежага паветра, і Сцяпан таксама працягваў кідаць шуфель за шуфлем, раз-пораз насмешліва зіркаючы на хлопца. Лёшка ж з кожным новым махам адчуваў, як усё болей і болей дранцвеюць рукі, ногі, як незразумелым гудам наліваецца галава. Каб быў адзін, каб на яго ніхто не глядзеў, ён тут жа кінуўся б, дзе стаіць, і даў бы паслабку зняможанаму целу. Але ж нельга, нельга паказваць, што ты нейкі слімак, што ў цябе ніколечкі няма сілы волі. Сцяпан жа, во, хоць і сцякае ўвесь потам, хоць і чорны, нібы той негр, толькі вочы і зубы блішчаць, хоць і паясніца, як сам прызнаўся, нясцерпна ломіць, усё ж не пасуе перад цяжкасцю. А табе хіба можна? Цярпі з апошняга...

Ён, Лёшка, ужо і не помніў, калі і як выслізнуў з рук шуфель, млосна самі падагнуліся, падкасіліся ногі... Апамятаўся трохі толькі тады, калі Сцяпан вывалак яго з вагона, паклаў на ўгрэтую ўжо зямлю, паднёс да губ салдацкую біклажку з вадою. Лёшка, расплюшчыўшы вочы, прагна пачаў піць, і вада, свежае паветра паступова вярталі сілы, а разам з імі і брыдкасць, сорам за самога сябе: ото ж і выкінуў штучку, цяпер жа куры і тыя засмяюць!

Сцяпан, аднак, і не думаў смяяцца. Твар яго быў сур'ёзны, вочы добрыя, спагадлівыя.

— Хіба ж можна адразу так браць на пуп? — ціха ўшчуваў ён, седзячы побач.— Што, гарыць у нас, ці так ужо хто ў карак гоніць? Зробім, выгрузім. Ужо ж, во, мала і асталося. А здорава мы з табой маханулі! — Ён памаўчаў, пасля ажно хапіўся за галаву: — Ну ж і ёлуп я! Нават не папытаў, еў ты сёння што ці не. Пэўна ж, не еў яшчэ. У мяне і ў самога ўсё звяло ўсярэдзіне, трэба падсілкавацца.

Лёшка маўчаў, яшчэ адчуваючы няёмкасць. Сцяпан тым часам нырнуў у вагон, скокнуў адтуль з рэчмяшком, нечым туга напакаваным. Развязаў вяровачкі, паклаў на траву спачатку Лёшкаў пінжак, пасля — у хлопца ажно

дух заняло, гулка затахкала сэрца, а з рота нястрымна пацяклі слінкі — выняў аднекуль са споду вялікую бляшанку свіной тушонкі, паўбохана чорнага хлеба.

— Салдацкі яшчэ паёк,— павёў Сцяпан вачыма на сваё багацце.— Што далі паложанага, што сябры-таварышы са свайго скінуліся, ведалі, дарога не блізкая.

— А вы... вы ў арміі, салдатам? — Лёшку было цікава слухаць, што гаварыў Сцяпан.

— Быў, цяпер ужо быў,— задумліва сказаў Сцяпан.— Сяржантам. Адслужыў сваё. Каб не паясніца, яшчэ б пакінулі.

Ён выняў складанчык, пакроіў спачатку хлеб, затым другім, нейкім закрыўленым лязом роўненька, спрактыкавана распаласаваў жалеза, адкінуў убок верх бляшанкі. У нос ударыла такім густым, такім нязвыкла смачным, што Лёшка нават адхіснуўся, баяўся, каб зноў не страціць прытомнасць.

Елі моўчкі, бляшанка пусцела проста на вачах. Хлеб таксама, хоць парадкам і зачарсцвеў, быў пахкі, здэцца, ніколі такога не еў.

— Ты ж, бачу, таксама некуды едзеш? — спытаў нечакана Сцяпан, і Лёшку меней за ўсё хацелася, каб пыталі пра тое. Але ж каму-каму, а гэтаму чалавеку можна смела сказаць, няма чаго баяцца.

І ён, дзіва-дзіўнае нейкае з ім стала, пачаў, збіваючыся, часта чырванеючы, расказваць пра свой дзіцячы дом, дзе нямала гадоў быў разам з тымі, у каго бацькі-маці няма, пра злосную скупую цётку, ад якой збег куды вочы глядзяць. Калі ж прыгадаў, якая жахлівая, дурная смерць падпільнавала Славіка, ягонага напарніка ў дарозе, не вытрываў, часта-часта пачаў церці кулаком вочы, каб неяк стрымаць няпрошаныя слёзы.

— Да-а, няпроста ўсё ў гэтым жыцці,— па-філасофску сказаў Сцяпан, адразу панікла апусціўшы галаву, рукі.— У мяне, брат, таксама нікога няма. Бацька пад Берлінам ужо загінуў, а маці, як я ў арміі служыў, памерла.

Яны, нагаварыўшыся, зноў кідалі вугаль. Лёшка цяпер больш эканомна траціў сябе, стараўся, як і Сцяпан, трымаць нейкі рытм. Не было гэткай задышкі, гэтак млосна не кружылася галава. Наадварот, рукі, ногі з кожнай хвілінайналіваліся пругкасцю, працавалася не тое што лёгка і прыемна, але не з такім і высільваннем, як напачатку.

Скончылі разгружаць да абеду. Знайшлі вады, памыліся, апрануліся.

— Ну, цяпер і папалуднаваць не грэх,— весела бліснуў зубамі Сцяпан.— Не, ты пакуль пачакай тут, папільнуй рэчы, а я пайду палучу грошы. Абяцалі ж адразу разлічыцца.

Ён і сапраўды вярнуўся хутка, не забавіўся. У руках трымаў грошы і нейкую паперчыну.

— На во, трымай,— сказаў рашуча.— Гэта білет і заробленае табой. Паедзем разам.

— Куды? — глуха спытаў Лёшка, нічога не разумеючы.

— Туды, куды і я. На будоўлю адну. У газеце вычытаў аб'яву. Вельмі шафёры патрэбны. Я ж у арміі асвоіў...

— А мне што там рабіць? — Лёшка і абрадаваўся такой прапанове і адначасова спалохаўся: быць нахлебнікам нават у самага найлепшага ва ўсім свеце чалавека яму не хацелася.

Аднак Сцяпан канчаткова развеяў яго сумненні.

— Не хвалюйся. Знойдзецца што рабіць. Не прападзём. Будзем разам трымацца. Зрэшты, там жа, у той газеце, чытаў, і школа ФЗН адкрываецца, вучыць будуць розным прафесіям. Во, ідэя! — ён радасна ляпнуў хлопца па плячы.

...Вечарам, ужо ні ад кога не хаваючыся, яны садзіліся ў поезд. Ніколі не думалася тады Лёшку, што трохі меней чым праз месяц зноў апынецца ён на гэтай жа станцыі, зноў будзе хавацца, аднак жа ўлучыць момант, каб зазірнуць на пошту, прысесці непрыкметна ў куточку, на лістку паперы напісаць Сцяпану тое, што мучыла, што трэба было сказаць. Ён жа зразумее, павінен зразумець. Ну-што, што іншае яму, Лёшку, заставалася?..

А спачатку ішло ўсё лепей і не трэба. Ужо назаўтра ў абед яны прыбылі туды, куды намецiў, куды падахвоціўся прыехаць Сцяпан. Пасялілі іх, праўда, не вельмі каб шыкоўна — у доўгім змрачнаватым бараку ўсяго ў адзін толькі пакой. У пакоі тым стаяла, можа, з пяцьдзесят жалезных ложкаў. Сцяпан быў нездаволены, бегаў некуды да начальства будоўлі, аднак адтуль вярнуўся пакуль ні з чым. Лёшка ж, наадварот, радаваўся: яму, як і ўсім дарослым, выдзелілі асобны ложак, побач са Сцяпанавым, далі падушку, коўдру. Ну, чым не жыццё? Казаў нехта, што і мора тут недзе не так ужо і далёка. О-о-о, ён палюбуецца яшчэ тым морам — за сябе і за Славіка...

Са Сцяпанам было добра. Кожнаму, хто настырна лез з роспытамі, як ды што, чаму з пацаном, куды дзенеш яго,

на работу ж пакуль такіх не бяруць, Сцяпан рашуча адказваў:

— Не тваё дзела. Брат мой малодшы гэта, разумееш, брат. Неяк самі тут разбяромся...

Хлопец радаваўся, чуючы такое, і за давер, за клопат не ведаў, як і чым адплоціць. Што ён зараз мог? Праядаць Сцяпанаву першую палучку і сноўдацца без справы? Колькі ж так можна? Праўда, яны са Сцяпанам пыталіся ўжо наконт тае школы ФЗН, ім сказалі, што будуць прымаць, абавязкова будуць, а калі дакладна — трэба чакаць, цярпець. У Лёшкі адразу прапаў добры настрой. Сцяпану спатрэбілася нямала дзён, каб угаварыць хлопца, абнадзеіць. Можа, і было б так, як яны задумалі, калі ехалі сюды, на будоўлю, каб не тая размова ў бараку, якая вырашыла ўсё...

Сцяпана, толькі прыняў ён машыну, сеў за руль, ажно на два тыдні паслалі ў нейкі далёкі рэйс. Лёшка застаўся адзін. Даводзілася нялёгка. Не, ён не галадаў. Хоць і туга было з грашыма, Сцяпан, аднак, усё да капейкі падзяліў папалам, каб ён, Лёшка, мог купіць хлеба, кансерваў, схадзіў, калі трэба, у сталоўку. Нялёгка найперш было адчуваць сябе непатрэбным, блытацца ва ўсіх пад нагамі, не ведаць, куды дзець сябе.

У той дзень у бараку, як усе пайшлі на працу, заставалася двое: пажылы лысы дзядзька — у яго чатыры дні ўжо трымалася вялікая тэмпература, і чалавека з дня на дзень абяцалі забраць, завезці ў бальніцу — і каржакаваты, з бычыным каркам здаравяка. Лежачы на спіне, ён смачна хроп, і раніцай, колькі яго ні катурхалі, не маглі ніяк дабудзіцца. «Зноў цёпленькі»,— сказаў пра яго нехта. «Бычыны карак» пакінулі ў спакоі. Хай, маўляў, спіць, карысці з яго як з казла малака.

Лёшка, перахапіўшы тое-сёе, што заставалася яшчэ ў іхняй са Сцяпанам тумбачцы, зараз сядзеў на ложку, гартаў кнігу — сёння ўзяў яе ў аднаго рабочага паглядзець. Кніга вельмі захапіла, зацікавіла, і хлопец з прагнасцю, бо даўно не даводзілася нічога людскага чытаць, накінуўся на яе. У гэты момант застагнаў хворы, папрасіў піць. Лёшка, паклаўшы кнігу на тумбачку, кінуўся да стала, каб наліць з графіна вады. Але ў ім не было ні кроплі — усё выпілі раніцай. Не было вады і ў вядры, якое стаяла на табурэтцы ў парозе.

— Я зараз збегаю прынясу,— нахіліўся хлопец над лысым.

Той, аблізнуўшы асмяглыя, патрэсканыя губы, з удзячнасцю кіўнуў галавой.

На дварэ смажыла, пякло, і Лёшка яшчэ ніколі ў жыцці не бачыў гэткага пекла. Міжволі думалася: а як жа тым, хто працуе на сонцы, у такой задусе? Хто падносіць на насілках цэглу, ломам, лапатай дзяўбе цвёрдую, нібы камень, зямлю, стаіць на рыштаваннях з кельмай? Як ім? А Сцяпану? Дзе ён зараз?

У той трубе ля суседняга барака, дзе яны звычайна мыліся раніцай і пасля работы, набіралі поўнае вядро дадому, зараз чамусьці было пуста. І ніводнай душы побач, нібы вымерла ўсё. У каго ж спытаць, дзе яшчэ можна знайсці якую студню ці трубу, каб набраць вады? Ён ішоў і ішоў, адчуваючы, як сонца да ачмурэння напякло непакрытую галаву, але ж і вяртацца з пустым вядром не хацелася. Там жа, у бараку, хворы, мо яму кепска, і трэба хутчэй чалавеку напіцца.

Калі, знайшоўшы нарэшце ваду, ён вяртаўся назад, убачыў «бычыны карак». З прыпухлымі, асалавелымі яшчэ вачыма той сядзеў у адных трусах на парозе барака, курыў самакрутку. Лёшка папрасіў пасунуцца, даць праход, але «бычыны карак», нічога не кажучы, выхапіў з рук хлопца вядро, узяў аберуч, нахіліў, прагна пачаў піць, выплюхваючы цэлыя струмені сабе на ногі. «Хай, хай жлукціць,— чамусьці нядобра падумалася пра яго.— Ад гарэлкі не захлынуўся, то ад вады...» І тут «бычыны карак» зусім ужо нахабна павёў. Падняўшы вядро над галавой, ён лінуў ваду на сябе. Лёшка, не на жарты ўзлаваўшыся, выхапіў вядро з яго рук, але там ужо амаль нічога не засталося. Сэрца калацілася ад крыўды. Ён, аднак, стрымаў сябе, кінуўся хутчэй у барак, узяў з табурэткі жалезную кружку, выліў тое, што пакінуў «бычыны карак». Вады было кот наплакаў, і хвораму дасталося толькі два ці тры глыткі.

— Я прынясу яшчэ, прынясу,— вінаваціўся, адчуваў сябе вельмі няёмка Лёшка.— Пацярпіце трошкі.

І тут позірк яго ўпаў на стол, дзе, побач з капшуком, ляжала пашкуматаная, з вырванымі старонкамі для курыва кніжка, якую ён толькі што пачаў чытаць. «Ах ты, гад печаны!» — Лёшка адчуў, як самі сабою сціснуліся кулакі, як шалёная нянавісць да «бычынага карка» расла недзе ўнутры, з кожнай секундай шырэла, распірала грудзі. Схапіўшы пустое вядро, ён куляй выскачыў на двор. «Бычыны карак», як ні ў чым не бывала, сядзеў на ганку,

ляпаў сябе па голых валасатых сцёгнах, жмурыўся на сонца.

— Т-ты, т-ты,— не знаходзіў Лёшка патрэбных слоў, каб выказаць усё сваё абурэнне.— Т-ты... Як ты мог парваць кніжку?

«Бычыны карак» ашчэрыў гнілыя зубы:

— Кніжку? Якую кніжку? А-а-а, тую, на ложку... Ну і што ж? У самы раз для курыва... А ты, маляўка, хто тут такі, што раскрычаўся? Падумаеш, кніжка... Хоць сто магу прынесці.— Ён заўхмыляўся, відавочна здзекуючыся.

— П'яніца, п'яніца горкі, вось ты хто! — сарвалася з языка ў Лёшкі тое, што думалася, што кіпела на сэрцы.

«Бычыны карак» глуха, утробна хаўкнуўшы, нечаканым рухам злавіў хлопца, рэзка пацягнуў да сябе, падмяў, заламаў назад рукі, а галаву заціснуў між валасатых сваіх ног.

— Ну, вот, шчанюк, цяпер яшчэ раз паўтары, хто я такі. Ну, што ж ты маўчыш? Давай, давай выкладвай... А я паслухаю. Мне часу хопіць, уга! — Ён, абцугамі сціснуўшы адной сваёй пяцярнёй дзве Лёшкавы худыя рукі, другой рукой пачаў шчоўкаць пстрычкамі дзе папала: па спіне, па мяккім месцы, і пстрычкі тыя джалам упіваліся ў цела. Але не гэтак балела ад пстрычак, як ад слоў «бычынага карка».— Думаеш, я не ведаю, які ты брацец Сцяпану? Нахлебнік ты, а не брацец. Лоўка ж ты падкаціўся пад яго, слёзку, відаць, добрую пусціў, расчуліў. А чалавеку надрывайся, кармі двух. І ў рэйс ён той далёкі падахвоціўся, каб болей зарабіць, хоць туды, у тыя пяскі, не кожны асмеліцца ехаць...

Хлопцу не хапала паветра, ён ажно задыхаўся.

— Ну што, будзеш болей гаўкаць? А то яшчэ патрымаю, мне часу хопіць.

Лёшка, каб толькі мог, зноў крыкнуў бы на ўсю вуліцу: «Бандзюга ты, п'яніца, табе толькі б жлукціць...» Але, акрамя кволага піску, ён нічога не здолеў выціснуць з сябе.

«Бычыны карак» адпусціў яго, і Лёшка, забыўшыся пра вядро, пра ваду, паплёўся ў барак, зняможана кінуўся ў пасцель, ушчэнт спустошаны, абыякавы да ўсяго на свеце. Спаў ён ці так ляжаў у нейкім здранцвенні, і колькі гэта цягнулася, хлопец не ведаў. Слаба, праўда, чуў, як прыязджалі з бальніцы па хворага, як лысы (шкода, што ён, Лёшка, не запомніў яшчэ, як каго звалі) заклапочана

ў некага пытаўся, перш чым пайсці з доктарам да машыны: «Што з нашым хлопцам? Ты, часам, не пакрыўдзіў яго?» Той нехта хмыкнуў (ну, пэўна ж, хто мог болей тут быць, акрамя «бычынага карка»!) і, скрыпнуўшы ложкам, заваліўся спаць.

Лёшка канчаткова абудзіўся, сагнаў з сябе ачмурэнне, калі паўз саменькія вокны прапоўз, узнімаючы клубы едкага карычневага пылу, цяжкі гусенічны трактар, а на стале закалаціўся, дробненька задзвынкаў пусты графін. Адчыніўшы тумбачку, Лёшка знайшоў там яшчэ ладнаваты кавалак хлеба, паклаў яго ў кішэню, зняў з цвіка, кінуў на руку свой замусолены пінжак, насунуў на галаву шапку. Пастаяўшы хвілін колькі, хлопец рашуча пераступіў парог барака...

## 8

Ён доўга ляжаў сярод густога высакаватага ўжо ячменю, што падступаў да саменькага хлява, і не ведаў, ці дачакаецца, калі цётка адвінецца куды. Раз-пораз асцярожна рассоўваючы сцябліны, Лёшка цікаваў, што робіцца ў двары. Хлопцаў нікога не было відаць. Праўда, большы, Аркадзя, ледзь золак пагнаў пасвіць карову, а вось Бронік... Броніка і не бачна нідзе. Няўжо дасюль спіць? Не можа быць, каб цётка не ўспарола, не прыдумала якой работы.

І раптам пачуўся яе бурклівы голас:

— Трасца б цябе ела, як ты ўсё не наясіся. Усё табе мала, усё табе не дагодзіш...

«Пра каго ж гэта яна?» — напружыў слых Лёшка.

Нарэшце з сенечак высунулася голая, стрыжаная няўмела, пад ножніцы і, відаць, самой цёткай, Бронікава галава з адтапыранымі вушамі, затым на ганак ступіў і ён сам, агледзеўся, патупаў нецярпліва, хацеў, відаць, тут жа, ля ганка, памачыць зямлю, але, ці то збаяўшыся мацеры, ці перадумаў сам, рушыў, свецячы голымі пяткамі, да хлява.

Лёшка, скрыжаваўшы далоні рук, у цёмную дзірачку між двух пальцаў мацнавата хукнуў: атрымаўся нязвыклы, бы крыкнула ў глухім цёмным лесе драпежная птушка, гук. Бронік раптоўна спыніўся, павярнуў туд-сюд адно, другое вуха, і Лёшка, цікуючы за ім, ледзь не засмяяўся. Але добра, што стрымаўся. Якраз з хаты выйшла цётка,

крыкнула Броніку, каб пільнаваў гаспадарку, сама, бразнуўшы веснічкамі, некуды падалася.

Цяпер Лёшка ўжо нічога не баяўся. Жадаючы напалохаць Броніка, які зайшоў у дашчаную перагародку за хлявом, ён падняў цвёрдую, закамянелую груду і шпурнуў у тую перагародку. Падцягваючы на хаду порткі, Бронік маланкай выскачыў з уборнай, зноў, паглядаючы на ячмень, натапырыў вушы. Лёшка не стаў больш выдурняцца, ціха паклікаў Броніка да сябе. Той, пазнаўшы голас браценіка, пашыбаваў у ячмень.

— Т-т-с-с, а то яшчэ пачуе хто,— прыклаў палец да губ Лёшка, калі Бронік занадта горача пачаў выказваць радасць сустрэчы.— Толькі матцы нічога не кажы, што быў я, добра?

— А ты з таго дзетдома ўцёк, га? Ты зноў будзеш у нас?

Лёшку кранула Бронікава шчырасць, нават на якое імгненне мільганула думка: а можа, і праўда ўзяць ды застацца? Аднак ён тут жа адкінуў гэтую думку прэч, яскрава ўбачыў усё, што нечакана адкрылася яму, пацвердзілася наконт цёткі з таго, аб чым колькі разоў намякалі людзі. Таму ён не стаў маніць Броніку:

— Не, я зусім-зусім ненадоўга. Я зараз жа зноў пайду, паеду.

— Чаму? — скрывіў ужо губы малы, смешна пачаў малёгаць: — Астанься, га, Лё-ё-ёшка, астанься! Чуеш?

Лёшка загадаў яму сесці побач, сказаў чутыя ад некага словы:

— Тут, брат, куды ні кінь, усюды клін... Трэба мне, ведаеш. Вы ўжо як-небудзь самі... А вось каб ты мне адну штучку пашукаў у хаце... Пашукаеш?

— Якую штучку? — спытаў Бронік.

— Ну, ведаеш... Канверт адзін, стары такі канверт. Ён быў там, дзе дакументы ўсе — у рыдыкюлі на шафе. І метрыка мая. Дастанеш?

— Ты лепей сам,— прапанаваў Бронік.— Не бойся. Мама няскора будзе.

— Куды ж яна?

— У краму пайшла, а крама ж уга дзе.

— Ну, калі так...

У хаце за той час, як ён, Лёшка, не быў, нічога не змянілася. Стала, праўда, яшчэ болей мух. Яны роем гулі ў кухні, абляпілі шыбкі вокан, усе сцены ў пакоі, сляпіцаю лезлі ў твар, джалілі, бы восы.

Рыдыкюля на шафе чамусьці не аказалася, і Лёшка занепакоена павёў вачыма па хаце: дзе ж яшчэ шукаць? Хоць бы не забавіцца і не напароцца на цётку... А раптам яна выкінула, спаліла дзе той канверт? Тады ўсё рухне, тады ні да чорта ўся гэтая задумка, яго план, якім жыў, якім дыхаў ён, Лёшка, апошнія некалькі дзён, калі з такой цяжкасцю, з такімі пакутамі ехаў назад, ледзь зноў не трапіў у дзетпрыёмнік, але выручылі гэты раз набытыя за дні бадзяння спрыт, кемлівасць, рашучасць.

— Ты не ведаеш, куды дзеўся адсюль чорны рыдыкюль? — павярнуў ён галаву да Броніка, які стаяў побач, гатовы выканаць любую просьбу.

— Н-н-не-е,— задумаўся, наморшчыў лоб Бронік.— А можа, за іконаю?

Лёшка паставіў у кут табурэтку, засунуў руку за ікону і абрадаваўся: рыдыкюль сапраўды быў там. І, на шчасце, метрыка і канверт таксама аказаліся там. Склаўшы акуратна канверт папалам, Лёшка паклаў яго і метрыку ў кішэню пінжака, з палёгкай уздыхнуў. Бронік спытаў:

— А нашто табе, га, Лёшка? Там грошы?

Лёшка засмяяўся:

— Не бойся, няма там грошай.— Ён выняў канверт, паказаў Броніку, што пусты, зноў схаваў.— Тут, брат, зусім другое... Патрэбны мне гэты канверт, во так патрэбны,— чыркнуў Лёшка пальцам па шыі.— Ну, а метрыка само сабою. Метрыка ж мая.

Затрымлівацца ў хаце ён болей не рашаўся, хоць і вельмі хацелася яшчэ пабавіць час з Бронікам. Ды і есці нясцерпна хацелася. Але чым, чым у цёткі пажывішся? Відаць, нясоладка і хлопцам жывецца. Вунь які худы, адны дэрбы тырчаць, Бронік. А цётка, відаць, усё яшчэ лічыць сваё багацце...

Напіўшыся ад пуза вады, Лёшка яшчэ раз наказаў Броніку ні аб чым не заікацца матцы, развітаўся з ім падаросламу за руку, зноў шуснуў у ячмень і, каб ніхто ненарокам не ўбачыў, дзе паўзком, дзе прыгнуўшыся пакраўся на загуменне. Адтуль наезджаная калёсная дарога вяла да саменькай станцыі, дзе ўпершыню пазнаёміўся ён са Славікам. Эх, Славік, Славік...

...Праз два дні ўжо другая дарога, яшчэ даўжэйшая, слалася перад хлопцам. Спачатку, ад раённага цэнтра, дзе злез ён з таварняка, дарога гэтая бегла полем, далей

перасякала нейкую нават у такую сухмень гнілую, забалочаную мясціну, пасля, падняўшыся на вышэйшае, сігала ў чысты сасновы лес.

Лёшка распытаў, як ісці: адзін сівы дзядок яшчэ там, ля сваёй хаткі на ўскраіне гарадка доўга і падрабязна, паўтараючы: «А да каго ж хоць там?», тлумачыў усе павароткі, усе перакрыжаванні, нават маляваў дубцом на пяску, жахаўся, што адзін выправіўся ў гэткую далечыню. У яго, у дзядка, Лёшка добра і пажывіўся. Шчодры аказаўся чалавек. Пасадзіўшы хлопца на нейкае бервяно, пайшоў у хату, вынес адтуль у місе некалькі бульбін, добрую лусту хлеба, кубак малака. Сам, прысеўшы побач, усё маўчаў, толькі бясконца смаліў самасад. А ён, Лёшка, ніяк не мог здаволіцца. Надта ж смачнай была бульба, сопкая, разварыстая, а пра хлеб і малако і казаць не трэба. Малако было густое, цягучае, ці не казінае.

Падсілкаваўшыся, Лёшка падзякаваў і рушыў у няблізкую дарогу, так і не сказаўшы дзядку, што вядзе яго туды, у тую вёску Чубаўку, што згубіў там, чаго шукае. Лепей пакуль што маўчаць. Ды што, што адкажаш? Ён жа і сам яшчэ не ведае толкам, чаго шукае...

Тады, як збег з будоўлі, як у жорсткіх, балючых, бы сцёбаў хто бізуном, словах «бычынага карка» адчуў горкую долю праўды пра сябе, тады, як таварняк, на які ён пачапіўся, выпадкова зрабіў супынак на той станцыі, дзе яны са Сцяпанам разгружалі вугаль, як, надумаўшы ўсё ж з дарогі паслаць Сцяпану хоць невялічкае пісьмо, падзякаваць за грошы, за клопат,— настаў такі момант, што, здэцца, ні хвіліны не жыў бы болей на свеце. Куды, куды яшчэ падацца, дзе прыхінуцца? Вярнуцца зноў у свой дзіцячы дом? Вядома, там і вучылі б, і сыты быў бы, і не насіў бы такія транты. Але ж брыдка зараз. Гэтак прасіўся, гэтак малёгаў у Івана Паўлавіча, каб адпусціў да цёткі, да «роднай душы». Гм-м, «родная душа»... А ён, Іван Паўлавіч, нібы і адчуваў, чым кончыцца. Чаго ж бы казаў такое: «Але глядзі...» Бы ведаў усё наперад, як будзе... Глядзі цяпер ужо ці не глядзі, а вяртацца назад, у дзетдом, ніяк нельга. Засмяюць жа, пальцам кожная маляўка будзе паказваць. А дзе ж тады выхад?..

У гэткі вось момант найбольшага свайго адчаю, найбольшай роспачы раптоўна і стукнула ў галаву: а ў яго ж, Лёшкі, ёсць, павінен быць недзе і родны брацік, самы сапраўдны родны брацік! Вельмі і вельмі цьмяна, але ж помніцца, як усё роўна было гэта сто, тысячу гадоў

назад: халодная, чужая, закінутая хата, толькі ў кухні, ад вялікай патрэсканай печы, і маглі так-сяк пагрэцца, а на грубку, што за сцяною, дроў не хапала. Дый па тыя няшчасныя паленцы маці выходзіла, як і па ваду ў калодзеж, чамусьці вельмі позна, калі насоўвалася густая, што сажа, цемната, а вакол — нідзе нікога, ні людзей, ні хат, акрамя хіба што двух-трох будынін, якія і то стаялі няблізка, увечары блекла свяціліся якім-небудзь акном... Калі ж гэта было? Ага, помніцца, ляжаў яшчэ снег, днём угравала ўжо сонца, капала са страхі і гэтак нясцерпна хацелася на вуліцу. Але маці нізавошта не пускала, сядзела сама найболей ля акна, усё гладзіла яго, Лёшку, шурпатай далоняй па галаве, часта некага кляла, называла нягоднікам, душагубам...

Ён, Лёшка, хоць і помніў зараз тое-сёе з праклёнаў, аднак тады не разумеў яшчэ нічога, не разумеў прычыны матчынага галашэння, яму было проста шкода маці, шкода яе слёз...

Увесь глыбокі і жахлівы сэнс тых праклёнаў і каму пасылала іх маці дайшоў да яго толькі цяпер... Помніцца, ой як добра помніцца і той вечар, калі раптоўна ў дзверы з двара нехта моцна загрукаў, аж шыбкі закалаціліся, як хапілася за вялікі свой жывот маці, як спалатнела ўся... Пасля былі ў іх нейкія жанчыны, адна з іх тая, якая гэтак моцна грукала і якой маці хуценька адперла, адчыніла сенцы. Жанчыны нечага мітусіліся, нешта ўстрывожана гаварылі, а ён, Лёшка, моцна плакаў, бо бачыў маці на падлозе, на цёмнай посцілцы... Што, што гэтыя цёткі робяць з маці, што ім трэба? Чаго яны тут, у гэтай хаце?.. Далей — яшчэ горай было. Яшчэ больш страшна... Помніцца, як няўцямнымі, застылымі, выплаканымі ўжо вачыма глядзеў ён, малы, неразумны хлапчук, на белую, нерухомую маці, якая зусім стала не такая, якой была ўчора... Пасля прыйшло двое дзядзькоў, прывалаклі цёмных, негабляваных дошак, збілі дамавіну, паклалі туды маці, сказалі яму пацалаваць яе, зачынілі вечка і некуды тую дамавіну панеслі. Яго, Лёшку, не пусцілі за парог, хоць ён і плакаў, крычаў, некага, помніцца, нават укусіў за руку...

Зараз, ідучы на Чубаўку, Лёшка ўсё болей і болей успамінаў з таго, пра што ніколі дасюль не думаў, што ніколі і не прыходзіла на памяць. Нейкі момант не верыў нават самому сабе, здавалася, што гэта ён сасніў ці нехта некалі расказаў. Аднак жа ўсплывалі — і адкуль толькі

што бярэцца! — новыя і новыя малюнкі, якія так і стаялі перад вачыма і ад якіх нідзе не дзенешся. Убачылася як наяву: лядашчы рыжы конік, у павозцы трохі саломы, а на той саломе, гатовыя ў дарогу, ён, Лёшка, ухутаны ў стары кажух, нейкую яшчэ ватоўку, бо якраз пакрапчэў марозік, і бязногі дабрадушны дзядзька. Лёшку да слёз не хочацца нікуды ехаць з цяпла, ехаць у невядомасць. Тая жанчына, якая грукалася, якая гаспадыняй прыйшла ў хату, аказалася не такой і страшнай і злоснай. Наадварот, усе дні яна асабліва добрай і клапатлівай была і з ім, і з той піскляй, з тым зморшчаным, непрыгожым хлопчыкам, што, як сказалі, нарадзіла яго, Лёшкава, маці, ад чаго і сама памерла, бо не было адкуль узяць доктара... Не хочацца, ой як не хочацца Лёшку нікуды ехаць, хоць раней, каб сказалі яму, што на дварэ чакае конь, павозка і можна ехаць хоць на край свету, ён і паехаў бы, гэтак хацелася пакатацца. А зараз не хочацца. Куды яго павязуць? Чаму так старанна яго збіралі, шукалі нейкія паперы, нейкія дакументы, у вузялок звязвалі ўсё яго небагатае адзенне? Няўжо не будзе бачыць ён брацікa? Што ж ты, добрая цёця, адварочваешся, чамусьці не глядзіш у вочы?.. Але, хочацца табе ці не хочацца, а трэба ехаць, цябе ж ужо чакаюць. І ён выбягае з хаты, лезе на павозку, яшчэ раз глядзіць у вокны, на дзверы, бы спадзяецца, што нехта выйдзе, нешта скажа, нешта зменіць... І яна, гэтая жанчына, выходзіць, акрывае яго, хутае, гаворыць бязногаму дзядзьку: «Ты ж там хоць не блудзі, папытайся ў каго, дзе размясціўся савет, а то, можа, раяно. Яны ж нехта там сірот збіраюць, пасылаюць у дзетдом. І падмацуйцеся, пакуль што ды якое, трохі, не марнуй хлопца...» Яна яшчэ нешта гаварыла, але Лёшка тады не разумеў сэнсу сказанага, толькі на душы тлела цьмяная трывога...

Няўжо ўсё тое, што прыходзіла зараз на памяць, ніякі не сон, а было сапраўды некалі з ім? Няўжо? Чаму ж раней амаль нічога не ўспаміналася, бы нехта знарок перагарадзіў глухой засланкай яго сённяшняе і ўчарашняе? І толькі дарога, па якой ён зараз ідзе, падштурхнула, падахвоціла на ўспаміны, адкінула прэч усякія там перашкоды.

Лесам ішлося лёгка, лёгка дыхалася. Пасля доўгага бадзяння, язды на чым папала і як папала, абы рухацца наперад, не трапіць нікому ў рукі, пасля едкай паравознай гары, пылу, куродыму, нярэдкіх начных дрыжыкаў і дзённай спёкі, асабліва на поўдні,— пасля ўсяго, што давялося

зведаць, зараз было адчуванее незвычайнай лёгкасці ва ўсім целе, як і тады, у чэраве старога камлюкаватага дрэва ў часе навальніцы. Не прыглушылі гэтай лёгкасці ні ўспаміны, што неспадзеўкі абрынуліся на яго, ні той галоўны клопат, дзеля якога чортведама колькі кіламетраў бег да цёткі шукаць стары змяты, склеены сваёй рукой канверт, ні іншыя нягоды. Наадварот, гэты клопат, гэта надзея зноў ускалыхнулі яго, абудзілі прагу нешта рабіць, некуды імчацца, нечага шукаць. А ці знойдзе ён тое, што ўдумаў шукаць?

Лёшка спыніўся, адчуўшы, што надта ўжо хутка бяжыць, звярнуў са сцежкі трохі ў лес, убачыў свежы пень, прысеў, перавёў дых. Выняў з кішэні канверт, яшчэ раз паўглядаўся ў крываватыя, відаць, у вялікім нервовым напружанні пісаныя літары, прачытаў адрас, той адрас, куды ён зараз кіруецца. Цікава, што пісала маці ў сваім апошнім пісьме? Бездапаможная, седзячы, як мыш, на чужым хутары, прасіла яна чаго ці, не здаволіўшыся вуснымі праклёнамі, пасылала іх старэйшай сваёй сястры, яго, Лёшкавай, цётцы, яшчэ і на шматку паперы... Дзе тое пісьмо? Куды запраторыла цётка? А мо спаліла, пабаялася, каб не папала каму ў рукі, каб ненарокам не прачытаў хто чужы?

Канверт жа зусім выпадкова трапіў Лёшку на вочы яшчэ з год назад. Цётка папрасіла неяк пашукаць у рыдыкюлі якісьці патрэбны квіток. Вось тады, седзячы на шафе, ён і спытаў, што за канверт, чый гэта напісаны хімічным алоўкам адрас унізе. Цётка спачатку паморшчылася, пасля неахвотна адказала: «Ну, чый жа яшчэ можа быць? Маці тваёй, як на хутары нейкім гібелі. Недзе ж там і пахавана... А адрас у яе быў мой, пасля з сельсавета паперку мне выслалі...»

Лёшка, як ні дзіўна, чамусьці тады нічога амаль не помніў, нішто вельмі не ўскалыхнула яго. Таму хутка і на канверт забыўся, і на тое, што адкрыла яму цётка. Затое зараз... Што чакае яго зараз там, куды ён так імкнецца? Ці знойдзе, ці пазнае хоць той хутар? У адрасе, праўда, усё напісана: «в. Чубаўка Чубаўскага сельсавета. Хутар Лагацкіх». Напэўна, прозвішча гаспадыні такое — Лагацкая. І хутар, відаць, недзе побач з вёскай. А ў каго папытаць? Ён жа, Лёшка, нічога-нічога тут не знае.

У Чубаўку прыйшоў ужо надвечар. Да заходу сонца, праўда, было яшчэ далекавата, і гэта хлопца ўсцешыла: мо пакуль змеркне, ён дабярэцца куды трэба, усё-ўсё

разведае, а там бачна будзе... Губляць дарма часу не схацелася, і, стрэўшы ў агародзе ля новага, відаць, толькі што зрубленага дома тоўстую цётку, Лёшка спытаў:

— А дзе тут хутар, цёця? Як ісці?

Жанчына, перастаўшы корпацца ў градах, разагнулася, пачмякала губамі:

— А які ж табе трэба хутар, дзіцятка? Няма тут ніякіх ужо хутароў. Ссялілі ўсіх. — Яна хвіліну падумала: — Хіба, можа, што Горашаў... Ага, Гораш яшчэ толькі астаўся...

— Н-не, мне, мне...— разгубіўся Лёшка, затым хуценька назваў прозвішча, што пазначана было на канверце.— Мне Лагацкія дзе жывуць.

Жанчына здзівілася:

— А Божа! Ты ж скуль гэта, чый будзеш?.. Вольга ж Лагацкая з'ехала яшчэ тады, як пахавальная на мужа прыйшла. З хлопчыкам з'ехала. Недзе ў другім сельсавеце жывуць, а хутара ўжо няма, няма,— яна яшчэ раз, ужо больш дапытліва, аглядзела Лёшку, хацела нешта спытаць, ды, бачна было, перадумала, толькі зноў пачмякала губамі. Лёшка памкнуўся ісці далей, хоць адчуваў: ісці, спяшацца болей няма куды. Аднак жа не будзеш вось так, без дай прычыны, стаяць, паказваць, што ўсярэдзіне ў цябе ўсё нібы сшэрхла, змярцвела. Трэба ж нешта рабіць. Толькі ступіў крок-другі, думаючы, у які ж бок зараз падацца, як жанчына спыніла яго:

— А ты, дзіцятка, калі надта трэба Лагацкую, хочаш уведаць, дзе яна зараз, то ў Адолі Варывончык папытай. Яна вунека жыве,— цётка паказала рукой уздоўж вуліцы.— Хата ля саменькага калодзежа. Адоля з Тамашом неяк, казалі самі, ездзілі, адведвалі Вольгу...

У Адолі з Тамашом Лёшку давялося і паначаваць. І слухаць не схацелі старыя, каб нанач адпусціць хлопца аднаго, як ён ні аднекваўся. Тамаш дык адразу пазнаў Лёшку. Толькі той ступіў на падворак, толькі папытаў пра хутар, а стары адразу, без усялякай дыпламатыі:

— Дык гэта ты, абармот гэткі? Бач, як ужо падрос! А быў жа... Што, збег са свайго казённага дома? — Ён, падцягваючы адну, на драўляным пратэзе, нагу, другой дачыкільгаў да варотцаў, дзе спыніўся Лёшка, падаў сухую, зморшчаную руку, запрасіў у хату.

Адоля, прыйшоўшы з калгаснай работы, заспела іх удвух ля грубкі, дзе булькала ўжо, варылася ў чыгунку бульба. Яна слязлівымі, слепаватымі вачыма паўглядала-

ся ў госця, але, не пазнаўшы, пайшла на кухню, адкуль ужо спытала:

— Гэта ж хто такі на нас не забыўся?

Лёшка не ведаў, як трымаць сябе, як паводзіць, што каму адказваць. Адкуль у гэтых старых такая дабрыня да яго? Ну, чым, чым ён заслужыў яе? Раніцой, во, дзед расшчодрыўся, накарміў ад пуза, даў яшчэ з сабою, зараз гэтыя людзі ходзяць ля яго, бы ля госця якога важнага... Ад сораму можна памерці, далібог, можна.

Пра гэта думалася Лёшку ўвесь вечар, калі і за сталом сядзелі, вячэралі разам, думалася і тады, як ляжаў на тапчане, акрыты стракатай, самаробнай коўдрай, услухоўваўся ў цішыню, што была за акном і ад якой успеў ужо адвыкнуць.

...А назаўтра, збіўшы ўшчэнт ногі, прайшоўшы пешкі невядома колькі кіламетраў, падыходзіў Лёшка да вёскі Мошына, дзе, як сказалі дзядзька Тамаш і цётка Адоля, жыве са сваім сынам Дзімкам Вольга Лагацкая.

## 9

Мінулі восень, зіма, лета, зноў зашастаў жоўтым лісцем верасень, і Малышку, якому ў час канікулаў давялося дзень пры дні пасвіць свінні — дзе дзенешся, пасвілі ж і Вецік, і Петрык Лосеў,— цяпер свайго ўжо клопату уга як хапае. Другі ж клас не першы. Тут адна арыфметыка чаго толькі вартая, гэта не тое, што раней было: тыя прыклады, тыя задачкі, што рашаў ён яшчэ паўгода назад, зараз — цьфу, смяхоцце адно, бяры толькі ды, як арэхі, шчоўкай. А вось у другім класе... Ого-го, паглядзі, мама, ты толькі паглядзі! Тут памазгаваць трэба, ды яшчэ як трэба. А вершыкі якія доўгія трэба вучыць! І колькі пісаць кожны дзень!

— Старайся, Дзімачка, старайся, сынку,— кажа мама Малышка. Яна і праўда заглядвае ў той яго новенькі задачнік, ківае галавой, спачувальна ўздыхае: — І праўда ж цяжкія. І мне не рашыць, мусіць, ніяк. Ты глядзі! Вот жа разумныя людзі ёсць. Гэтулькі напрыдумляюць...

Малышка пасля такіх слоў яшчэ больш нешта падбівае даказаць, што яму недарэмна паставілі і адну, і другую пяцёркі, што на сходзе ў школе, куды запрашалі ўсіх бацькоў, яго, Дзіму Лагацкага, хваліла настаўніца.

— Мама, я пагуляю трошкі,— згортвае сшытак, паклаўшы акуратненька на напісанае прамакатку, Малышок і падымаецца з-за стала.

Маці згаджаецца, але папярэджвае:

— Толькі ж далёка не бяжы нідзе. Зараз, во, і вячэраць пара.

Вольга застаецца адна. На дварэ сёння ўжо халаднавата. І яна спачатку загараецца жаданнем запаліць у грубцы, змяніць у зале трохі волкае паветра. Аднак перадумвае: стамілася, на сёння хопіць. Цэлы ж дзень і не разагнулася, лічы, бульбу ў агародзе капалі. Затое ўся ўжо ў склепе, толькі як-небудзь яшчэ пераараць ды забаранаваць, падабраць, што засталося ў зямлі. Гэта лягчэй. Некага яшчэ папрасіць. Восіпа ж, Улянінага мужыка, які дасюль мог яшчэ рабіць і сабе, і ёй, Вользе, памагаў тымсім, зараз ужо, вядома, не папросіш: у чалавека нечакана выявілі сухоты, і ён, грэх нават думаць такое, бадай што і не жылец на гэтым свеце. А яшчэ такі ўпарты! Хацелі яго некуды забраць, каб паспрабаваць лячыць, але наадрэз адмовіўся: дома, маўляў, калі не вылечуся, то і нідзе болей не вылечаць...

Пра ўсё думаецца Вользе. Во падрастае хлопец, Дзімка. Гэта ж на яго колькі адно трэба! Але неяк жа выкручваюцца. А сёлета, калі ўсё добра будзе, калі ўвесь іхні лянок пойдзе найлепшым гатункам, то і добра адхопяць. Можна тады і цялушачку купіць, гадаваць яе, каб сваё малако было. Не будзеш жа век па літру купляць...

Нехта пастукаў у дзверы.

— Заходзьце,— кажа Вольга, думаючы, хто б гэта мог быць.

— Добры вечар у хату,— звычна вітаецца Клава Лабыцька, іхняя паштальёнка, маладая дзяўчына, можна сказаць, яшчэ дзяўчо, якая не схацела вучыцца і напрасілася ў паштальёнкі.

— Добры-добры,— адгукаецца Вольга, а саму свідруе думка: дапамогу ж за Івана ёй нядаўна прынеслі, атрымала, распісалася, а што яшчэ? Пісьмо? Дык ёй жа дасюль ніхто не пісаў і не піша. А мо хто знаёмы з партызан даведаўся, дзе яна, і напісаў? А можа, Адоля з Тамашом вестку якую шлюць?

— Вам, цёця, пісьмо,— адразу ўсё прасвятляе, ставіць на месца Клава.— Нейкае ж тоўстае...

Яна вымае са сваёй пахудзелай ужо торбы канверт,

працягвае, бы ўзважвае ў руцэ, Вользе. Вольга ажно палохаецца: у канверце і сапраўды нешта дужа тоўстае. І адраса зваротнага няма.

— Дзякую, Клавачка,— кажа яна дзяўчыне, стараючыся не выдаць вельмі свайго хвалявання.

Клава ж не спяшаецца, яна чакае, ёй таксама надта цікава было б глянуць, што там, у канверце, хто гэтак многа напісаў ці так чаго паклаў. Аднак, бачачы, што нічога не дачакаецца, паштальёнка ўскідвае на плячо сваю торбу, развітваецца і, як усё роўна пакрыўджаная чаго, выходзіць. І толькі калі ляпае за ёю брамка, Вольга бярэ са стала канверт, у выцягнутай перад сабой руцэ разглядвае на святле, мяркуе, дзе, з якога боку падступіцца да таго пісьма, дзе разарваць або нажніцамі абрэзаць краёчак. Нарэшце рашаецца, адкрывае, выцягвае... у некалькі столак складзеную газеціну. А дзе ж, дзе пісьмо? Яшчэ, не верачы сваім вачам, зноў засоўвае пальцы ў канверт, затым разгортвае газету, прыглядаецца: можа, што збоку, на чыстым, напісана? Але, акрамя яе адраса на канверце, нідзе ні аднаго слоўца, ні адной літаркі каб было ад рукі. Хто ж так пажартаваў з яе, каму і навошта ўдумалася слаць гэтую газету? Ды во, не свая яшчэ, не свайго раёна, а суседняга.

Вольга перачытала,ўсе загалоўкі, усе подпісы. А раптам чыё знаёмае прозвішча сустрэнецца? Мо хто ўспомніў іхняе партызанскае жыццё, сяброў сваіх баявых, якія і жывыя і нежывыя зараз?.. Не, прозвішчы пад заметкамі, пад большымі ці меншымі матэрыяламі былі ўсе чужыя, нічога не паяснілі, не сказалі.

Вечарам, калі перад сном елі з Дзімкам згатаваную на керагазе зацірку, і тады, калі хлопец ужо спаў, а яна, Вольга, усё яшчэ кешкалася, нешта рабіла на кухні, з галавы ні на хвіліну не выходзіла гэтае загадкавае пасланне. Парабіўшы ўсю работу, яна зноў узяла газету, вырашыла прачытаць яе ад пачатку да канца. Лямпачка сёння свяціла як ніколі слаба, таму, пахукаўшы, пачысціўшы анучкай шкло, Вольга запаліла лямпу, выкруціла, колькі можна было, кнот.

Раёнка была гэткая ж, як і іхняя. Каб не розныя назвы, дык ці і адрозніла б.

Вольга пашамацела трохі, пашукала, за што б там зачапіцца вокам, што знайсці цікавае. Погляд чамусьці спыніўся на фота на трэцяй старонцы. Трактар, мужчына ў замасленым, зашмальцаваным, ажно блішчыць, камбі-

незоне, побач, з усмешкай на ўвесь твар, хлапчук, падлетак...

Яна хацела ўжо скласці газету, як зноў чамусьці спыніла ўвагу на хлапчуку, быццам бачыла недзе ўжо гэты нос, гэтыя вочы, добрыя, засяроджана-ціхія, задумлівыя. Божачка, дык то ж... Няўжо?

Яна бліжэй пасунулася да лямпы, яшчэ больш пільна паўглядалася ў здымак. Далібог жа, ён! У гэтым не было ўжо ніякага сумнення. А што ж там, пад здымкам, напісана? Ага, во: «Рыхтаваць вартую сабе змену — няўмоўны закон нашага жыцця. Перад вамі — ветэран калгаснага руху, адзін з лепшых механізатараў МТС Платон Сямашка. Яшчэ да вайны ён быў трактарыстам, у дні суровай бітвы з фашызмам служыў у танкавых часцях, давёў сваю грозную баявую машыну да сцен Берліна, за што мае шматлікія ўзнагароды. Сёння П. Сямашка зноў на трактары, зноў засявае мірную ніву. Побач з ім — яго юны памочнік, выхаванец дзіцячага дома, зараз навучэнец Загорскай школы механізацыі Аляксей Суднік. У час летняй практыкі ў калгасе «Перамога» юнак даказаў, што ўмее працаваць, не баіцца цяжкасцей, бясконца любіць тэхніку і марыць хутчэй атрымаць пасведчанне механізатара шырокага профілю, з тым каб раз і назаўсёды звязаць свой лёс з зямлёй, вырошчваць ураджай, прыносіць як мага болей карысці людзям».

У Вольгі ажно слёзы на вочы нагарнуліся. Цяпер стала зразумелым, хто прыслаў газету. Значыць, ён не забыўся ні пра яе, ні пра Дзімку, ён усё ведае і ўсё помніць. Помніць пра іх, пра тое сваё наведванне. А яна, Вольга? За год з хвосцікам і яна колькі разоў успаміпала хлапчука, як перад сабой бачыла яго нібы вінаватую ўсмешку, нярэдка дакарала сябе за сваю чэрствасць, няўвагу да сіраты. Але ж хіба думалася, што ён тады, ноччу, так нечакана збяжыць, уцячэ невядома куды. Чым жа, чым яго хто пакрыўдзіў? Мо Дзімка што непатрэбнае сказаў? Але ж не — назаўтра, калі прачнуўся, сам як не плакаў, што госць недзе прапаў. Мо сэрцам адчуў у ім родную кроў? Хто ведае... Чаго ж бы гэтак пацягнуўся да незнаёмца, такога яшчэ няўходжанага, абарванага, зацята-маўклівага?

Спаць, хоць бралася пад поўнач, не хацелася. Яна не клалася ў ложак, бо ведала, што дарэмна толькі стане муляць бакі, усё роўна не засне, не змружыць вачэй. Апранулася, выйшла на двор. Пастаяла колькі хвілін на

ганку, паўслухоўвалася. Усюды было ціха. Пасля лямпы напачатку нічога не бачыла, нават грушы за два метры ад сябе. Затым трохі абвыклася. Вунь ужо і хлеў чарнее саламянай страхой, і склеп горбіцца пры плоце.

Вольга чамусьці злавіла сябе на думцы, што хацела б некага бачыць, некаму выгаварыцца, прасіць у некага парады. Вось бы не спала зараз Уляна... Каму ж лепей даверыцца, як не ёй, суседцы? Аднак узяў одум: ну хто, хто табе лепей падкажа, чым ты сама сабе, чым тваё сэрца?..

Яна зноў вярнулася ў хату. Адчуўшы, што трохі азябла, бо на вуліцы было сыра, золка, да касцей працінаў вецер, Вольга палезла на печ, разгрэбла анучы, падкурчылася на саменькім чаране. Усцешыла, што ад раніцы яшчэ трымаецца дух. А паліла ж не вельмі каб багата. Думаючы пра сваё жыццё, у якім гэтулькі было ўсяго — і добрага, што, дзякаваць Богу, не абмінула яе, і горкага, бы той палын,— яна непрыкметна заснула, так і не знайшоўшы адказу на самае важнае, самае галоўнае зараз для сябе.

Ноччу яна прачыналася некалькі разоў, аднак не пайшла ў халодную пасцель, рашыла прабавіцца на печы да раніцы, хоць і ведала, што пасля цэлы дзень будзе як разбітая, нечага будзе не ставаць.

І праўда: да абеду ў яе ўсё валілася з рук, не хацелася нічога рабіць, у галаве стаяў нейкі тлум. Даўно яна не пачувала сябе так пагана. А яшчэ гэтыя думкі, ад якіх нікуды не схаваешся, якія цяжка, бы камяні, навальваюцца адна на адну, не даюць спакою...

Апоўдні, калі Дзімка прыйшоў са школы і яны папалуднавалі, калі прыбрала ўсё са стала, памыла посуд, Вольга стомлена прысела на зэдлік, паклікала сына да сябе.

— Чаго, ма? — гукнуў той з пярэдняга пакоя.— Я ўрокі буду рабіць.

— Пачакай трошкі, зробіш яшчэ. Хадзі вось сюды...

Дзімка быццам не пазнаваў маці. Строгая, задумлівая, з незразумелым бляскам у вачах, яна павярнула яго да сябе, пачала шурпатай далоняй гладзіць валасы.

— Ну што, мама? — не вытрываў Дзімка, вылузаўся з рук, як бы засаромеўся матчынай пяшчоты.

Вольга не ведала, з чаго пачаць гаворку, не знаходзіла патрэбных слоў.

— Сынок... Як бы гэта лепш сказаць?.. Ну, калі ў ця-

бе... знойдзецца раптам брат, старэйшы твой брат?.. Ну, будзе жыць з намі? Га? Як?..

Убачыўшы на яго твары адбітак няўцямнасці, разгубленасці, змешаных не то з радасцю, не то са спалохам, Вользе захацелася хутчэй супакоіць сына, сказаць штосьці такое, каб ён мог паверыць і неяк лягчэй падрыхтаваўся да гэткай неспадзеўкі. І адзінае выйсце, якое бачылася тут,— зманіць, як маніла неаднойчы, калі Дзімка дапытваўся пра бацьку, пра тое, дзе ён загінуў, за што заслужыў той ці іншы медаль, ордэн. Яна ведала, што гэта нядобра — маніць. Не верачы ў Бога, яна ўсё ж лічыла гэта вялікім грахом, грахом душы, і заўсёды абуралася, калі хто казаў няпраўду. Але ў яе падмане была найвялікшая мудрасць Маці, якая ахоўвае сваё дзіця ад усяго, што можа зрабіць яму балюча, прычыніць зло, параніць кволае безабароннае сэрца.

Вось і зараз, зноў прыцягнуўшы да сябе сына, які нечакана абмяк, перастаў вылузвацца з абдымкаў, яна, каб папярэдзіць яго пытанні, хуценька загаварыла:

— Я ж толькі цяпер даведалася, сынку, што ён, твой брацік старэйшы, жывы і здаровенькі. Дагэтуль нічога не ведала... У вайну ж згубіла яго, як у партызанах былі, з блакады калі вырываліся. Думала, што ён загінуў, што немцы яго забілі... Я ж расказвала табе пра тую блакаду... Ну, калі фашысты нас з усіх бакоў аблажылі, з кулямётаў секлі, сабакамі цкавалі. Многа, ой многа тады і палягло назаўсёды, пра многіх і цяпер невядома, дзе яны і што з імі...

Дзімка падняў галаву, глянуў у вочы маці:

— А ты скуль ведаеш, што ён жывы?

— Можа, і не ведала б, ды ён жа сам нас з табою неяк адшукаў... Помніш жа таго падлетка... ну, што начаваў летась у нас, а ноччу ўцёк?

— Гэта ён?! — не стрываў, усклікнуў Дзімка, і цяпер у голасе яго пачуліся шчаслівыя ноткі, якія ўсцешылі Вольгу.

— Ён, ага, ён! Лёшачка наш,— Вольга адчула, як адразу палягчэла на сэрцы, бы хто зняў з яго вялікі-вялікі цяжар.— Я тады адразу і не пазнала яго... А ён, відаць, пазнаў, ды чамусьці пабаяўся прызнацца... А ўчора вось газету прыслаў.— Яна схадзіла ў пярэдні пакой, на паліцы ў шафе, сярод бялізны, намацала газеціну, разгарнула перад Дзімкам, паказала здымак: — Во, бачыш, і ў газеце нават пра яго. На трактарыста вучыцца.

— Вот здорава! — Дзімка цяпер ажно заскакаў ад радасці, засвяціўся тварам.— І ён прыедзе да нас і мы будзем разам на трактары катацца? Га, мама?

— Ну, вядома ж, будзеце... Абавязкова, сынку!

...Вечарам, калі Дзімка ўжо спаў, яна вырвала з чыстага сшытка адзін лісток, узяла ручку, памакала пяро ў чарніла і адчула, што не зможа адразу напісаць ні радка: пальцы чамусьці не слухаліся, дрыжэлі, бы асінавы ліст, і Вольга, як ні прымушала сябе, ніяк не магла стрымаць свайго хвалявання. Прамучыўшыся так з паўгадзіны, яна адклала пісьмо да раніцы, хоць у душы выспелі тыя шчырыя, тыя адзіныя словы, якія можа і ўмее сказаць свайму сыну толькі маці.

# ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

## 1

«...Прабач, любы, што я ўрываюся ў тваё жыццё, парушаю твой спакой. Але ў мяне зараз такі сумбур у галаве, столькі нявыказанага, што я не вытрывала, рашылася на гэты крок. Душа крычыць, ірвецца на часткі... А каму тут, у вёсцы, калі ўсе мае лепшыя сяброўкі зараз, як і ты, недзе далёка, каму іншаму даверышся, выкажашся да канца, каб хоць трошкі прыйсці ў раўнавагу, бо так жа можна, далібог, і звар'яцець, не інакш. Я ніколі б не стала пісаць першая, каб не здарылася тое жахлівае, чаго не чакала... Не, я недзе трохі разумела, што трэба асцерагацца, але ж мы былі зусім адны, ва ўсім белым свеце адны і, аглушаныя новым, нязведаным, што звалілася на нас, зусім згубілі галаву, нікога і нічога не хацелі ні бачыць, ні чуць, ні думаць ні пра якія вынікі... Ой, што я ўсё кажу «мы», гэта я згубіла галаву, а ты ж хлопец, табе малы клопат... І вось зараз я добра адчуваю, як недзе пад маім сэрцам нараджаецца новая часцінка цябе і мяне. Спачатку, у першыя дні, калі мне было блага, я не ведала, што гэта такое, што са мною робіцца. Пасля пачытала ў медыцынскім даведніку — і спалохалася, як ніколі не палохалася ў жыцці. Мо ад таго, што кончылася маё бесклапотнае дзявоцтва, пяройдзена нейкая мяжа, і звароту ўжо назад няма і не будзе... Вельмі баялася, каб не заўважыла чаго мама. Выдумвала розныя прычыны, толькі каб не садзіцца разам за стол — снедаць, абедаць ці вячэраць. Для мяне было няпроста — выдумваць гэтыя прычыны. Я нават прытваралася, што атруцілася, што нешта, відаць, нясвежае з'ела, і таму мне нядобрыцца.

Бедная мама! Я ніколі ў жыцці яе не ашуквала. А вось зараз змушана. Праўда, мне здаецца, што яна пра ўсё здагадваецца, але не рашаецца спытаць, каб часам мяне не пакрыўдзіць, не сказаць што-небудзь недалікатнае. І глядзіць такімі сумнымі, такімі добрымі вачыма, што ў мяне ажно ўсё ўсярэдзіне пераварочваецца ад жалю да

яе. Ты ж, можа, ведаеш, якое яе жаночае шчасце, колькі яна выцерпела ды і цяпер церпіць... Не, адкуль табе гэта ведаць?..

Я ўсё спадзявалася, што вось-вось атрымаю ад цябе вестачку, каб тут жа даць адказ, падзяліцца з табою навіной, параіцца, як быць. Думала, наша майская сустрэча, тое, што адбылося між намі, неяк зноў ускалыхне, сагрэе, ажывіць тваё каханне, якое за той час, як ты стаў студэнтам, пасяліўся ў вялікім горадзе, вельмі і вельмі прыглухла, асабліва ў апошні год. І не па маёй віне, сам добра ведаеш... Мая радасць і мая бяда, што я так моцна, яшчэ як ты быў у дзесятым, а я толькі ў восьмы бегала, прывязалася да цябе, пакахала. Якая я была шчаслівая! Сяброўкі мне зайздросцілі ды і цяпер яшчэ зайздросцяць. Яны ж, не ў прыклад табе, і пішуць, і прыязджаюць часцей, ну і, вядома, не мінаюць мяне, пытаюць, як у нас з табой. Вядома, я адказваю, што ўсё выдатна, хоць на сэрцы скрабуць кошкі. А тут яшчэ бацька ўсё ка́пае і ка́пае, каб выходзіла замуж, бо векавухай застануся, бясконца ўпікае, што я заўпарцілася, не паслухалася яго, таму і вучыцца ў інстытут не паступіла, а цяпер многім выгадным, на яго думку, жаніхам дала ад варот паварот. Цябе ж ён чамусьці ні раней, ні зараз не прымаў і не прымае ўсур'ёз. Лічыць, што гэта была наша дзіцячая забава, блазенства. Ведаў бы ён, чым такая «забава» часам канчаецца?!

Калі бывае асабліва маркотна, я тады бяру твае пісьмы, вядома, самыя лепшыя, самыя цёплыя, яны ў мяне асобна складзены, і іду да нашай ракіты, той, што недалёка ад старога млына. Доўга сяджу і гляджу ў цёмную, глыбокую ваду, часам пачынаю лічыць, колькі разоў за гэтыя гады мы з табою сядзелі тут. Калі збіваюся з падліку — паспрабуй падлічы такое! — я пачынаю перачытваць твае пісьмы, хоць кожнае з іх ведаю амаль слова ў слова. Асабліва тыя радкі, дзе ты прызнаваўся, як сумна табе аднаму ў чужым горадзе, як імкнецца твая душа сюды, як хочацца мяне бачыць, чуць, цалаваць мае вусны...

Вось і сёння тут, ля ракіты, начытаўшыся тваіх старых пісьмаў, трохі паплакаўшы,— даруй, гэта ўжо слабасць кожнай дзяўчыны ці жанчыны,— я рашылася на такое нялёгкае прызнанне табе ва ўсіх маіх зямных грахах і ў тым, што я не магу выкінуць цябе з галавы. Не думай, што я наракаю на свой нейкі няскладны лёс, хачу разжаліць цябе, вярнуць тое, што ўжо, мусіць, страчана назаў-

сёды, што грэла нас абоіх некалькі гадоў. І, урэшце, павер, я ніколечкі не жадаю паставіць цябе перад фактам, тым, што здарылася са мною, маёй дзявочай бядой, прымусіць цябе на нейкі ўчынак. Не, любы мой, гэта не ў маіх правілах. Са сваёй бядой я сама спраўлюся і нікога не хачу ўблытваць у тое, што тычыцца зараз мяне адной. Проста я яшчэ не прыняла канчатковага рашэння, як быць.

Ёсць надзейны сродак пазбавіцца ад усяго, сродак, якім карыстаюцца тысячы і тысячы такіх, як я, і ты пра гэта добра ведаеш. Я таксама рашылася была і зайшла ў раённую бальніцу — якраз дарэчы праводзіўся семінар сельскіх бібліятэкараў — і выдажыла ўрачу ўсё. А ўрач трапілася старэнькая, нейкая вельмі стомленая і сумная. Яна паслухала мяне, пільна паглядзела ў вочы і сказала: «Твая справа, мілая. Мы не маем права табе адмовіць. Але і не гарантуем, што калі-небудзь, калі ты будзеш вельмі шчаслівая і табе надта захочацца стаць маці, што ты ёю станеш. Добра падумай. Ты ж ужо дарослая, табе не шаснаццаць гадоў, а ўсе дваццаць».

Вось, любы мой, я і думаю, вось ад гэтага думання і трашчыць мая бедная галава. Таму ў нейкім трансе і пішу табе, каб трохі аблегчыць душу. Час яшчэ пакуль цярпіць, каб паламаць галаву, на нешта пэўнае рашыцца... Мяне меней за ўсё турбуе, што скажуць вяскоўцы, нават і бáцькі, павер, не вельмі палохаюся. Што да мамы, дык яна, як, можа, ні будзе ёй балюча, усё ж зразумее мяне, даруе. Палохае другое: як давядзецца той, самай дарагой мне істоце, калі яна толькі з'явіцца, як будзе ёй на гэтым белым свеце? Ці не знойдзецца які нягоднік і не пакажа на яе пальцам, не скажа крыўднае і брыдкае слова, не параніць яе маленькае нявіннае сэрца?

Не ведаю, ці зразумееш ты мяне. Мне так зараз не хапае тваёй пяшчоты, тваёй усмешкі, тваёй парады! Зноў не падумай, чытаючы гэтыя радкі, што я нахабна, насуперак тваім жаданням, хачу «зацугляць» цябе. Проста само нешта рвецца з душы, і я не магу, не ў сілах стрымаць свае пачуцці. Ты ўжо не крыўдуй за маю такую слабасць. Зноў жа, паўтараю, яна ад таго, што я ніяк не магу выкінуць цябе з галавы, і часам не-не дый мільгане думка, што ты, можа, быў вельмі заняты сесіяй, таму і не пісаў ні радка, а вось зараз, калі пачынаюцца канікулы, ты зноў прыедзеш, зноў у нас усё будзе па-ранейшаму. Божа мой, як бы я хацела гэтага! Усяго табе найлепшага, любы! Аксана».

Дзімка атрымаў гэтае пісьмо раніцай, калі ішоў на апошні экзамен. Ён не ведаў, колькі яно валялася, чакала яго, бо даўно не заглядваў у сваю ячэйку паштовай скрынкі, якая вісела ўнізе, у вестыбюлі, насупраць стала дзяжурнага. Штэмпель на канверце таксама нічога не гаварыў, быў нейкі цьмяны, размазаны.

Амаль цэлы дзень хлопец не мог выкраіць хвілінудругую, каб паглядзець, што хаця піша Аксана. А што гэта яна, Дзімка нават не сумняваўся, хоць на канверце не было зваротнага адраса. Аксанін почырк роўненькі, акуратны, літаркі адна да адной, са своеасаблівымі загагулінамі, ён мог бы пазнаць сярод тысячы. Аднак Дзімку раніцай было не да пісьма. Спачатку, пакуль пачнецца той экзамен, пакуль зойдуць першыя, ён рашыў пасядзець трохі ў чытальнай зале. Вельмі нерваваўся — гэта ж амаль палавіны пытанняў не ўспеў падрыхтаваць. Як ніколі,наракаў зараз на Сашку, які ўчора падбухторыў паехаць у тыя Ждановічы, на мора. Маўляў, заб'ём двух зайцаў: і загарым да чарнаты, надыхаемся свежага паветра, накупаемся і заадно вызубрым усё назубок. Вызубрыў... Смяхоцце адно.

Спачатку яны і вучылі, нічога не скажаш. Выбралі ціхае, недалёка ад вады і разам з тым амаль з трох бакоў атуленае кустамі месца, на ўгрэтай, добра-ткі ўтаптанай, але незабруджанай траве паслалі газеты, распрануліся да плавак.

— Лахва! — здаволена скокнуў, ляпнуўшы сябе па голых сцёгнах, Сашка і нечакана, бы падкошаны, кінуўся на газеты, падставіў сонцу рабацінiстую спіну.

Дзімка лёг побач, таксама прылаўчыўся, каб лепей грэла. З паўгадзіны яны маўчалі, толькі шасталі старонкамі падручнікаў. Сашка, смешна высунуўшы кончык языка, на маленькім шматку паперы пачаў пісаць новую шпаргалку. Дзімка спытаў, як ён думае скарыстаць свае «шпоры». Усе ж добра ведалі: каго-каго, а Лазара Львовіча яшчэ ніводзін студэнт ніколі не абвёў вакол пальца. Сашка іранічна хмыкнуў, даўшы зразумець, што для яго гэтая справа — як плюнуць. Дзімка паверыў, бо сапраўды чуў ад некага, што Сашка і з-пад сучкі можа выняць яйкі.

Прыпякала ўсё болей і болей. Дзімка павярнуўся на спіну, але так чытаць было кепска. Сонца сляпіла вочы, і ён пасунуўся бліжэй да кустоў, куды падаў цень. Сашка таксама не выцерпеў, падняўся. Прапанаваў асвяжыцца.

Дзімку пакуль што не хацелася лезці ў ваду, і ён адмовіўся.

Сашка пайшоў адзін. Не было яго недзе з гадзіну. Дзімка пачаў ужо непакоіцца, каб хаця што не здарылася. Але Сашка неўзабаве з'явіўся — вясёлы, з таямнічай ухмылкай на ўвесь пляскаты твар. «Няйнакш, нешта адмачыў»,— падумалася Дзімку. Сашка з ноткай урачыстасці ў голасе пахваліўся:

— Ну і чувіх адкапаў! Пальчыкі абліжаш. Збірай шмаццё, пойдзем да іх. Чакаюць.

— Ты што, з глузду з'ехаў? — Дзімка не прыняў энтузіязму напарніка.— Заўтра ж экзамен.

— На халяве выедзем.

— Не будзе ніякай халявы. Ты ж ведаеш Лазара Львовіча. Мне б выцягнуць неяк да «добра». А то зноў застануся без стыпендыі. І так, во, траяка ледзь не сцапаў. Па палітэканоміі. Шчасце, што ўгаварыў Траяноўскую праз два дні пераздаць.

— І здасі, і пераздасі,— гнуў сваё Сашка.— Чалавеку патрэбны крылы, тады ён з лёгкасцю ўсе перашкоды скрышыць. А крылы сёння і ў цябе вырастуць, калі пабачыш гэтых чувіх... Хавай толькі далей свае талмуды. Слухайся мяне...

— Ды ну цябе! Заладзіў — чувіхі, чувіхі... Не хачу, тым болей калі яны чувіхі.

— Каралевы! — рагатнуў Сашка, паляпаўшы Дзімку па плечуках, якія ўжо набылі бураковы колер і зараз непрыемна свярбелі.

Дзімка, як ні аднекваўся, усё ж спакусіўся адным вокам глянуць на дзяўчат. Хлопцы, не апранаючыся, у плаўках пайшлі ўдоўж берага. Тут знекуль дзьмуў лёгкі прыемны вецярок і добра асвяжаў. Пахла водарасцямі, як на сапраўдным моры. Вада пад сонцам зіхацела мірыядамі іскрынак, ажно рэзала ўваччу. Сашка выняў са штаноў, якія нёс у руках, цёмныя акуляры, пачапіў іх на пераноссе і стаў яшчэ болей піжоністы.

— Дзе ж твае кралі? — пачаў ужо злавацца Дзімка, што не хапіла сілы волі адбіцца ад настырнасці напарніка.

Сашка нічога не сказаў і ўпэўнена скіраваў да яркааранжавай палаткі, якая прымасцілася на невялікім пагорку, між дзвюх сосен. Ля палаткі кешкалася, нешта рабіла стройная паўнагрудая дзяўчына ў купальніку, уся бронзавая, нібы толькі што з поўдня вярнулася.

— Прывецік, вот і мы,— як даўно знаёмай кінуў дзяў-

чыне Сашка. Ён павярнуўся да Дзімкі і голасам, у якім адчувалася абыякавасць стомленага ад цяжару славы чалавека, адрэкамендаваў: — А гэта мой пратэжэ, малады паэт Змітрок Хрушч. Калі не чулі, то яшчэ пачуеце...

— Клава,— першая падала маленькую зграбную, усю ў пярсцёнках, руку паўнагрудая.— Як цікава!

Дзімка, нічога не разумеючы, ціскануў Клаве пальцы, ад чаго тая войкнула і, відаць, задаволеная яго сілай, залівіста засмяялася.

З палаткі вылезла і другая дзяўчына, прыкладна равесніца Клавы, таксама прыгожая, досыць зграбная. Яна назвалася Ленай, гэтак жа павіталася з Дзімкам за руку. Дзімка падумаў спачатку, што Сашка пажартаваў наконт яго і зараз са смехам прызнаецца ў гэтым. Аднак той, неўпрыкмет падміргнуўшы, працягваў гарадзіць такую несусвеціцу, ад якой Дзімку хацелася скрозь зямлю праваліцца. Ён нават заліўся чырванню. Гэта заўважылі дзяўчаты.

— Ой, вы, Дзіма,— можна так вас называць? — не саромцеся,— сказала Лена.— Мы ж разумеем... Таленавітыя людзі ўсе, відаць, такія...

Яе падтрымала і Клава. Бліснуўшы гарэзліва вачыма, склаўшы крыж-накрыж рукі, ад чаго грудзі яшчэ больш панадна-спакусліва напяліся пад вузкай палоскай матэрыі, яна засакатала:

— Ну, вядома ж. З намі можаце быць ва ўсім шчырымі. Мы тут за паўмесяца, што адпачываем, зусім здзічэлі, засумавалі па цікавых людзях.

«Ото ж і дурніцы»,— падумаў Дзімка.— Буду я яшчэ чырванець».

Сашка, усеўшыся ўжо на траве ля палаткі, глыбакадумна наморшчыўшы лоб, пачаў як бы выручаць Дзімку:

— Не звяртайце на яго ўвагі. Ён зараз акліматызуецца... А наогул ён у нас у рэдакцыі самы... ну, як вам лепш сказаць?.. самы сціплы і нясмелы. Напіша цудоўны верш, надрукуюць, дык ён нават ганарар саромеецца палучыць. Па сто разоў звоняць з бухгалтэрыі.

— Як цікава! — зноў усклікнула Клава.— Можа б, вы нам, хлопчыкі, што пачыталі сваё. Жах, як люблю вершы, асабліва калі пра каханне.

— Гэта можна.— Сашка абыякава, з хрустам, пацягнуўся, глянуў на гадзіннік.— Дык, можа, куды збегаць і градусаў пашукаць? І за знаёмства, і гладчэй лірыка пойдзе. Я якраз учора добры ганарар адхапіў...

«Во брэша,— з захапленнем адзначыў сабе Дзімка.— Ну і прайдзісвет! У самога ж і рубля за душой, пэўна, няма».

Дзяўчаты дружна падтрымалі ідэю разам павесяліцца. Яны ахвотна прызналіся, што ў іх тое-сёе ёсць — пляшка каньяку і бутэлька віна. Маўляў, у Клавы праз дзень круглая дата — вось і запасліся на ўсякі выпадак.

— Гэта ж цудоўненька! — Сашка ажно зацмокаў языком, адразу неяк згубіўшы сваю «саліднасць».— Можам пачаць, а пасля і мы збегаем. Можа ж, тут недалёка?

— Хіба ў доме адпачынку,— няпэўна паціснула плячыма Лена.— А больш не ведаем дзе.

Сашка катэгарычна замахаў рукамі:

— Няма. Акрамя ліманаду, нічагусенькі няма. Яшчэ як сюды ішлі, па дарозе заглядвалі. Во халера! — ён пакутліва ўздыхнуў.

Дзімка ледзь не пырснуў ад смеху, але ў час стрымаўся. «Артыст, далібог, артыст»,— цяпер ён з цікавасцю чакаў, як жа будзе далей, што яшчэ адмочыць напарнік.

Дзяўчаты пачалі рыхтаваць закусь.

...Першы ачухаўся трохі Дзімка. І не дзе-небудзь, а ў палатцы, на пругкім і коўзкім надзіманым матрацы. У палатцы было ўжо цемнавата. Побач, цесна прытуліўшыся да яго сваім гарачым целам, спала Клава. З другога краю палатнянай хаткі, таксама ў абдымку, прымасціліся Сашка з Ленай. «Ну ж і карцінка!» — Дзімка ажно жахнуўся. Ніколі яшчэ ў такую сітуацыю яму не даводзілася трапляць. Але шавяліцца чамусьці не хацелася. Было нават, як ні дзіўна, прыемна. Хлопец прыслухаўся. Хтосьці непадалёку гучна ўключыў транзістар, і грудны жаночы голас цягнуў:

Зачем вы, девочки, красивых любите,
Непостоянная у них любовь...

Адтуль жа, заглушаючы спявачку, чуліся смех, крыкі, валтузня. Дзімка здагадаўся, што гэта з палатак, якія стаялі крыху далей і ў якіх, акурат як і Лена з Клавай, знайшлі прытулак адпускнікі.

Дзімкава галава ўсё яшчэ была тлумная. Ён не ведаў, як Сашка, а сам адчуваў: не, яшчэ не выветрыліся «градусы», якімі частавалі іх дзяўчаты. Здзіўляла толькі, што ўсе так сп'янелі ад дзвюх бутэлек. Мо гарачыня таму прычынай, а больш за ўсё, відаць, тое, што пілі запар, мяшалі каньяк і віно. Лена і Клава таксама мала чаго адставалі

ад іх. Так ці інакш, а што было пасля чацвёртай чаркі, Дзімка дрэнна помніў. Цьмяна нагадалася, як яны з Клавай пілі на брудэршафт, пасля доўга, ажно ў засос, цалаваліся. Сашка ў ролі самазванага паэта бубніў чыесьці вершы, блытаўся, але казаў, што на хаду іх складае, і дзяўчаты ажно папісквалі ад захаплення.

Вярталіся яны дадому ў Мінск амаль апоўначы. Электрычак ужо не было — позна, а заставацца на моры да раніцы, хоць дзяўчаты і прасілі, не выпадала — раніцай жа трэба на экзамен. Сашка прыдумаў, што ім рана заўтра трэба ехаць у камандзіроўку па важных рэдакцыйных справах, што яны недзе праз два дні вернуцца і зноў завітаюць сюды.

Яны пляліся па шашы ў бок горада, «галасавалі» рэдкім легкавікам, якія з запаленымі фарамі на шалёнай хуткасці праносіліся міма і думаць не думалі спыняцца. У Дзімкі падкошваліся ногі. Ісці станавілася нясцерпна, невядома, як яны і дабраліся б, каб не пашкадаваў шафёр выпадковага запозненага аўтобуса. Умасціўшыся на запыленым заднім сядзенні, Дзімка толькі зараз па-сапраўднаму адчуў, як на сэрцы ад усяго, што адбылося, брудна і пагана. З сарказмам усміхнуўся, нагадаўшы Сашкавы словы: «А крылы сёння і ў цябе вырастуць, калі пабачыш гэтых чувіх...» Выраслі... Цьфу ты!

Нейкая віна гняла Дзімку, не давала як след засяродзіцца і ў чытальні, за гадзіну-другую да экзамену, калі ён спрабаваў ухапіць тое-сёе з таго, чаго зусім не ведаў, і ў часе самога экзамену, як выцягнуў білет і з радасцю пераканаўся, што пытанні больш-менш знаёмыя, якраз з тых, якія яшчэ заўчора вучыў. Аднак Лазар Львовіч якімсьці сёмым чуццём здагадаўся, у чым ён, Дзімка, слабак слабаком, і лёгка злавіў яго. Дзімка чырванеў, плаваў, а пасля, калі Лазар Львовіч прапанаваў «пасрэдна», мусіў згадзіцца. У гэты момант яму было чамусьці ўсё роўна, якую адзнаку атрымае.

Адчуванне сваёй віны, а зараз яшчэ і за правал экзаменаў — не стрымаў-такі слова, дадзенае брату! — асабліва балюча сцяла сэрца, калі прачытаў пісьмо Аксаны. Дзімка знарок забрыў у самы глухі, ціхі куток парку, каб ніхто не мяшаў на адзіноце пераварыць усё, што абрынулася на яго, падумаць, як быць далей. Гуляць у маўчанку з Аксанай і зараз, пасля яе такога пісьма? Прызнацца, што вінаваты, што згубіў галаву і трохі загуляў? Ведама, гэтулькі часу ўдалечыні адно ад аднаго... А маладосць,

яна ж не чакае... Але хіба гэта адказ? Што ж канкрэтнае параіць Аксане? Пэўна, дзяўчына спадзяецца на нешта. Па ўсім бачна, спадзяецца... Божа, як усё ў жыцці складана!

Дзімка прысеў на драўляную лаўку, якую хтосьці занарок прывалок сюды, далей ад асфальтавых дарожак, у самую гушчэчу кустоўя, куды амаль не трапляла сонца і рэдка мог завітаць цікаўны. Нечым прыемна запахла. Аглянуўшыся, Дзімка ўбачыў сакаўныя гронкі сінявата-ружовага бэзу, да якога можна было нават дацягнуцца рукой. Ён здзівіўся, што так позна цвіце тут бэз і ніхто яго не чапае.

Дзімка не стрымаўся і адламаў невялікую галінку, паднёс да губ. Адразу нагадалася, як любіла бэз Аксана. Тады, калі Дзімка здаваў за дзесяты, а Аксана за васьмігодку, калі пачалося іхняе каханне, якому, здавалася, ніколі не будзе і не можа быць канца, ён познімі вечарамі цягаў дзяўчыне цэлыя бярэмы самых лепшых, самых духмяных галінак. Як яна кожны раз радавалася! Пасля, праўда, трохі счакаўшы, усё дапытвалася, дзе ён столькі і набраў гэткай прыгажосці. Дзімка чырванеў, ніяк не хацеў прызнацца, што за бэз нямала хто з суседзяў выгаворваў маці, бо, як ні таіся, як ні лаўчы, шыла ж у мяшку не схаваеш. Пазней трохі Аксана, дазнаўшыся пра ўсё, забараніла каханаму рабіць налёты на чужыя агародчыкі, чужыя кветнікі, бо жанчыны пачалі ўжо і ёй дапякаць. Аднак у бэзавую пару Дзімка, бегучы на спатканне, усё ж умудраўся прынесці хоць галінку, каб зрабіць дзяўчыне прыемнае.

Невядома, як доўга ён сядзеў, думаючы і ўспамінаючы. Гадзіннік яго штосьці барахліў, і Дзімка не ведаў, колькі зараз часу. Па сонцу прыкінуў — гадзін недзе пяць-шэсць. Трэба было ісці. Але куды, ён не ведаў. Да сябе ў інтэрнат не хацелася. Хлопцы зараз, пэўна, мазгуюць, каб, перш чым раз'ехацца дадому, на канікулы, адзначыць канец сесіі, павіншаваць адзін аднаго з апошнім курсам. Заўтра ці паслязаўтра, відаць, атрымаюць і стыпендыю за лета. А ён... Зноў цэлага паўгода сядзець на Лёшкавым карку? Не, трэба знаходзіць нейкае выйсце... А вось якое?..

Асільваючы слабасць, Дзімка выйшаў са сваёй зялёнай хованкі на дарожку. На сонцы, нягледзячы на надвячорак, усё яшчэ было горача. Ногі ад доўгага сядзення, ці мо так ад чаго, былі як ватныя. Кружылася галава. Дзімка ўспомніў, што і ў рот нічога не браў. Ён зноў сеў на

вольную лаўку, выняў з кішэні кашалёк, палічыў грошы. Заставалася зусім мала, некалькі рублёў. Вырашыў, што сама дзешавей будзе паабедаць, а заадно і павячэраць на фабрыцы-кухні. Праехаўшы на тралейбусе некалькі прыпынкаў, ён сышоў каля касцёла, абагнуў яго і накіраваўся ў сталоўку.

Там, як заўсёды, было шматлюдна. Дзімка прыладзіўся ў хвасце доўгай пакручастай чаргі. У людскім гармідары ён не адразу пачуў, як нехта раз, другі гукнуў яго імя. За трэцім выгукам убачыў: далёка наперадзе, ужо амаль ля самай раздатачнай, махае рукой Сашка. Дзімка пакінуў сваю чаргу, падышоў да яго.

— Станавіся побач,— прапанаваў Сашка.— Разам падсілкуемся.

Дзімка здзівіўся, што Сашка рашыў паспытаць студэнцкага харчу. Звычайна ён — пра гэта ведала паўінстытута — і абедаў і вячэраў у рэстаране ля вакзала. Адміністратарам працавала там яго маці, і Сашка неаднойчы выхваляўся гэтым.

Нібы адгадаўшы Дзімкавы думкі, Сашка крыва ўсміхнуўся:

— Маменцыя, дазнаўшыся, што сёння схапіў тройку, раз'юшылася і сказала, каб у рэстаране і нагі маёй не было. Кінула, во, капейкі на абед...

— І ў цябе тройка?! — усклікнуў Дзімка.— А як жа твае «шпоры»?

— Не выгарала гэты раз. Во гад! Здагадаўся. Ніколі не думаў... Ты праўду пра яго казаў.

— І што будзе? — спытаў Дзімка, вяла сёрбаючы з жалезнай міскі халаднаваты, нясмачны, напалам з буйнымі крышанамі бульбы, боршч.

Пытанне сарвалася больш для сябе, чым для Сашкі, бо Дзімка добра ведаў, што той не прападзе і без стыпендыі. Ведама, маці ў рэстаране працуе, бацька нейкім трэнерам, маюць у Мінску шыкоўную кватэру. Аднак Сашка нібы і чакаў гэтых слоў.

— Есць ідэйка... Я ўжо думаў і пра цябе. Можна за лета, за два якіх месяцы, набыць капіталец, што і на год хопіць.

— Вагоны пайсці разгружаць? — укалоў Дзімка.

Сашка паблажліва, як гэта рабіў на пляжы ля мора, паляпаў яго па плячы:

— Не тымі катэгорыямі мысліш, правінцыя. Вагонамі няхай зоймуцца, у каго ў чарапной каробцы вецер свішча.

А мы з табой, як-ніяк, без пяці мінут паўнакроўныя настаўнікі...

— Дык што ты прапануеш? — Дзімка не выцерпеў, перапыніў непрыемную балбатню сябрука.

— А тое, што паедзем да самага сіняга ў свеце Чорнага нашага мора. Днём будзем разам з дэльфінамі ў цёплых пяшчотных хвалях плёскацца, ну, а вечарам... Вечарам трохі і папрацуем...

— Кішэні ў зявак чысціць? — зноў з'яхіднічаў Дзімка. Ён адставіў убок недаедзены боршч і прыняўся за катлету, якая чамусьці і не пахла мясам.

Сашка бяскрыўдна адмахнуўся і, як ні ў чым не бывала, працягваў выкладаць свой план далей:

— Тут адзін мой даўні сябрук, Макс, ён у школе фізрук і там запраўляе самадзейнасцю, з музталентаў хеўру збівае. Чалавек пяць-шэсць. Электраінструменты ўсе ёсць і што трэба. Усёк? — Сашка таксама ўзяўся за катлету.

— Дык пры чым тут я? — Дзімку пачала ўжо злаваць гэтая жвачка, якую ў гадзіну па чайнай лыжцы цягнуў Сашка.— Я ж не музталент і ні на якіх інструментах не граю.

— На бубне будзеш. Тут навука невялікая. Патрэніруешся дзён колькі. Якраз нам і трэба на бубен.

— З нашым граннем і без штаноў назад вернешся,— Дзімка ўсё яшчэ ніяк не прымаў усур'ёз таго, пра што талдычыў яму Сашка.— Каму мы там патрэбныя? Хіба без нас няма каму граць?

— Усё ўжо заклёпана. У Макса добрая знаёмая на спартбазе, культарганізатарам там... Так што чакаюць. І жыць там. А весяліць, вядома, не за дзякуй, будзем не толькі іхніх... Усёк?

Дзімка нічога не сказаў. Ні за столікам, як елі, ні тады, калі нейкі час ішлі разам па праспекце. Сашка таксама, бачачы, што Дзімка зараз усё глыбока перажоўвае, пакуль што не настырняў з канчатковым адказам. І ўсё ж, калі развітваліся, напомніў:

— Дык добра памазгуй, не пашкадуеш. І рамантыкі сербанём, і манету будзь здароў адхопім. Што яшчэ трэба?..

## 2

Амаль цэлы тыдзень Дзімка хадзіў як у сне. Бязмэтна блындаўся па вуліцах, магазінах, гадзінамі бавіў час у парку. Трашчала ад думак галава. Але ні на што пэўнае

ён так і не рашыўся. І парады ніхто не мог яму даць. Хлопцы раз'язджаліся хто куды, і кожнаму сваіх клопатаў хапала. Інтэрнат усё больш і больш пусцеў. У пакоі з Дзімкам застаўся толькі Валік Корч, які таксама сядзеў ужо на чамадане. Адзін Дзімка не ведаў яшчэ, што рабіць. На добры лад, трэба было б, вядома, ехаць дахаты, там жа яго чакаюць не дачакаюцца. Але як з такім настроем ехаць? І што скажа ён Лёшку, як гляне ў вочы маці? Пра Аксану ж і казаць няма чаго... Хацеў напісаць ёй пісьмо, некалькі разоў нават браўся за ручку, але чамусьці ў галаву не прыходзіла нічога такога, што магло б і дзяўчыну супакоіць, і задаволіць самога сябе.

Таго дня, як ад'язджаў Валік, Дзімка прачнуўся вельмі рана. Валік спаў, з галавой акрыўшыся байкавай коўдрай, хоць у пакоі, нягледзячы на прачыненае акно, было душна. Стараючыся не нарабіць грукату, Дзімка падняўся, асцярожна наліў з графіна ў паўлітровы слоік з-пад салянкі цеплаватай вады, выпіў колькі глыткоў і кінуў вокам на гадзіннік — Валік, кладучыся спаць, заўсёды клаў яго на край стала, каб можна было дацягнуцца рукой і паглядзець, які час. Стрэлкі паказвалі толькі пятнаццаць мінут шостай. Дзімка зноў лёг, але сон чамусьці не ішоў. Са змружанымі вачыма ён пракачаўся яшчэ з паўгадзіны і, пераканаўшыся, што не засне, узяў у рукі часопіс «Наука и жизнь», пакінуты некім учора на ягонай тумбачцы. Але і чытаць не хацелася. Дзімка паклаў часопіс назад. Зноў наплыло: што ж сказаць Сашку? А сёння па абедзе той завітае ў інтэрнат, прыйдзе пачуць ад яго, Дзімкі, канчатковы адказ: далучаецца ён да іхняе кампаніі ці не.

Вядома, каб не дом, Дзімка ні на хвіліну не задумаўся б. Які дурань адмовіцца два месяцы правесці ля Чорнага мора, загарэць, накупацца ўволю ды яшчэ і зарабіць, як абяцае Сашка, нямала грошай. А з грашыма і ён кум каралю! З імі лягчэй было б і з Лёшкам размаўляць, і перад маці апраўдвацца. Ну, а з Аксанай... Аксане ён адтуль, з поўдня, нешта напісаў бы. Мо Сашка падкажа, як быць у гэткай далікатнай сітуацыі. Той жа ваду, агонь і медныя трубы прайшоў. Не разгубіцца, не здрэйфіць, нябось, не тое што ён зусім раскіс, ператварыўся, як кажа Сашка, у аўсяны кісель...

Дзімка незаўважна зноў заснуў. Заснуў моцным салодкім сном, што нярэдка прыходзіць да чалавека пад раніцу. І таму, калі ў дзверы пастукалі, ён са сну нічога не

мог уцяміць. Стук перайшоў у грукат, і Дзімка ачмурэла сеў на ложку. Усё ж да слыху дайшло, што нехта называе яго прозвішча.

— Хто там? Хвілінaчку...— канчаткова прачнуўшыся, гукнуў ён і памкнуўся адамкнуць дзверы.

— Лагацкі,— Дзімка пазнаў голас іхняе вахцёркі.— Скоранька на тэлефон. Міжгародняя кліча...

Праз паўмінуты Дзімка, пераскокваючы праз адну-дзве прыступкі, бег уніз, на першы паверх. Ужо на лесвіцы не так зглёдзеў, як здагадаўся, што насунуў Валькавы туфлі, якія на яго назе шлёгаліся туд-сюд, гатовыя на хаду зваліцца. Целяпаліся і шнуркі, якія ён не паспеў завязаць банцікам. «Хто ж гэта так рана?» — непакоіла, трывожыла зараз адна-адзіная думка. Ён абагнаў вахцёрку, толькі сказаў ёй: «Дзякую, Марыя Фёдараўна». Спехам узяў, паднёс да вуха трубку.

— Алё, алё,— Дзімка дзьмухнуў у дзірачкі і затаіў дыханне.

— Ты, Дзімка? — данёсся далёкі, трохі глухаваты голас Лёшкі, голас, у якім выразна ўгадваліся ноткі трывогі. Дзімка адчуў, як пахаладзела ўсё ўсярэдзіне.— Добра, што пазвалі... Званю з канторы. Старшыня заказаў... Здаў жа хоць экзамены?

— Ага, здаў... толькі ўчора,— на ўсякі выпадак схлусіў Дзімка.

— Вось што: едзь тады. Хутчэй... З маткай кепска. Вельмі... Ты мяне чуеш?

Дзімка нічога не паспеў адказаць — у трубцы нешта шчоўкнула, трэснула, і халодна-абыякавае «пі-і, пі-і, пі-і» нажом разанула па сэрцы. Патрымаўшы трохі трубку ля вуха, Дзімка зразумеў, што чакаць больш няма чаго. Ён зноў падзякаваў вахцёрцы і нейкі спустошаны падаўся на свой чацвёрты паверх.

Валік усё яшчэ спаў, высунуўшы з-пад коўдры кончык носа. Дзімка ведаў, што Валіка, пакуль той не выспіцца, і з пушкі не дабудзішся. Аднак бралася восьмая гадзіна, і пара было ўжо хлопцу ўставаць. Трэба ж памыцца, пагаліцца, перакусіць што-кольвечы. А ў дзевяць жа яго аўтобус.

На аўтавакзал ішлі разам. Дзімка падумаў, што, калі толькі будуць білеты на аўтобус, ён не стане чакаць вячэрняга поезда. Вядома, поездам было б зручней: ноч сабе пераспаў на паліцы, а раніцай, у пачатку шостай, ужо і на сваёй станцыі. Амаль што дома. А там праз гадзіны дзве

якраз у бок іхняга Мошына і аўтобус. Але ж пакуль той поезд! Карцела, пасля тэлефоннай размовы, не споўдацца яшчэ цалюткі дзень, занепакоена думаючы, што ж там з маці, а зараз жа, неадкладна сесці і ехаць. Не хацелася нават і Сашку чакаць. Можна ж яму, у рэшце рэшт, і пазваніць. Дзімка ўспомніў, што, на шчасце, недзе ў блакноціку запісваў яго хатні тэлефон.

На аўтавакзале рабілася чортведама што, а каля кас — асабліва. Чэргі змяіліся праз усю залу, і цяжка было ў гэткай таўхатні і духаце падступіцца куды з тым білетам. Дзімка пашкадаваў, што няма з ім Сашкі. Той абавязкова б нешта прыдумаў, не можа такога быць, каб не прыдумаў. А зараз давядзецца неяк самому выкручвацца.

Паколькі Валіку мала заставалася часу да ад'езду, Дзімка рашыў, што з білетам ён зоймецца пасля, а зараз трэба хоць колькі хвілін пабыць з сябрам. Гэта ж няёмка кінуць хлопца аднаго, не пасадзіць, не развітацца. Якніяк, цэлае ж лета не пабачацца.

Выйшлі на пасадачную пляцоўку. Народу і тут было шмат. Здзіўляла нават, як толькі і могуць вывезці аўтобусамі гэткую процьму пасажыраў. Найбольш пераважала моладзь, хлопцы і дзяўчаты. Яно і зразумела: пара́ вялікіх студэнцкіх вакацый, і ўсім не церпіцца хутчэй трапіць у абдымкі родных і блізкіх, ад'есціся, акрыяць на смачных бацькоўскіх харчах, адаспацца ўволю. Ды ці мала іншых спакус чакала кожнага дома!

Дзімка недзе ў глыбіні душы быў і рады, што так нечакана скончыліся яго ваганні, няпэўнасць. Вядома, наперадзе, у вёсцы, у яго нямала стане праблем, бо апошнія ж месяцы жыў у нейкім трансе, у незразумелым, бяздумным адключэнні кантролю над сабой: дзень мінуў, ну і добра. А што там далей — навошта сушыць мазгі, хай за нас прафесар думае...

Падалі Валікаў аўтобус. Валік расчуліўся і, перш чым садзіцца, абняў Дзімку, прытуліўся шчакой да яго шчакі.

— Прыедзь калі да нас,— сказаў на развітанне Дзімку.— У нас жа азёр — адно пры адным. Прыгажосць — не налюбуешся. Адрас мой ведаеш.

«А чаму б,— падумалася Дзімку,— не завітаць да хлопца? Утрасецца ўсё, то і можна б было дзён на колькі адвінуцца з дому». Але ён тут жа адкінуў такую магчымасць. Не, з маці і сапраўды, відаць, нешта няладнае, інакш Лёшка не званіў бы.

Валіку ж, каб не маўчаць, каб той ненарокам не пакрыўдзіўся чаго, Дзімка бадзёра сказаў:

— А што, вот вазьму і завалюся на твой парог. Частáваць знойдзецца чым?

Валік прыняў жартаўлівы тон сябрука:

— Летам і самапасам абыдземся. Ва ўсякім разе — з галадухі не памром.

Абодва пасмяяліся.

Валік нарэшце паехаў. Праводзячы поглядам ягоны «Ікарус», пакуль той не знік за рогам высокай камяніцы, Дзімка яшчэ трохі пастаяў, не рашаючыся выйсці на санцапёк. А пякло не па-ранішняму заўзята. Дзень, як і ўсе апошнія дні, зноў меўся быць спякотны.

Дзімка расшпіліў усе гузікі тэніскі, але ўсё роўна гэта дало мала палёгкі. З жахам падумаў, што трэба ж ісці ў вакзал, у тую таўхатню да кас. Але нічога не паробіш. Неяк выцерпіць. Як усе, так і ён.

Яму неспадзеўкі пашанцавала. З цяжкасцю падступіўшыся трохі да аднае з кас, ён хацеў ужо гукнуць у акенца наконт білетаў, ёсць ці не, як касірка апярэдзіла яго, голасна папрасіла каго-небудзь размяняць пяцірублёвую банкнотку.

Дзімка, успомніўшы, што ў яго якраз і засталося каля васьмі рублёў, шэсць з іх рублёўкамі, астатнія — рознай драбязой, хуценька азваўся:

— Ёсць, ёсць! — Ён выняў з кашалька, які трымаў у потнай руцэ, паперкі, сунуў руку ў акенца.— Мне б адзін білет... калі можна...— Дзімка назваў свой раённы гарадок.

Касірка ўзяла грошы, нічога не сказала, ніхто, на шчасце, не запярэчыў і з чаргі, і ўжо праз мінуту-другую Дзімка выйшаў з тлумнай залы вакзала з білетам у кішэні. Да адыходу яго аўтобуса заставалася каля трох гадзін, і марудзіць было некалі. Яшчэ ж нямала трэба зрабіць: здаць каменданту пасцель, сабраць чамадан, пазваніць Сашку, перахапіць чаго ў рот, бо ўжо і так кішкі марш іграюць. Пра тое, каб купіць што з яды дадому, і думаць не прыходзілася: грошай амаль не засталося. А там жа яшчэ спатрэбіцца як не рубель, каб дабрацца да Мошына. Кепска, што ў райцэнтры ён будзе позна ўвечары. Але зараз не зіма, і быць не можа, каб не трапілася якая спадарожная машына ў бок Мошына-Калоднага. Хай сабе грузавая, хай легкавік, але неяк дабярэцца. Не ўпершыню такое...

Абнадзеіўшы сябе, Дзімка заспяшаўся ў інтэрнат. Вахцёркі Марыі Фёдараўны ўжо не было. Яе памяняў бязногі Афон, ці Афоня, як яго звычайна ўсе называлі, хоць чалавеку стукнула за пяцьдзесят. Нярэдка, праўда, Афоня ператвараўся і ў Афона Лук'янавіча, асабліва тады, калі трэба было дастукацца, каб цябе пусцілі ў інтэрнат пасля занадта позняй гулянкі ці проста бязмэтнага блындання па горадзе.

Апошнія месяцы Дзімка мо як ніколі часта хадзіў у Афоні ў штрафніках. «Штраф» Афоня браў своеасаблівы — трэба было не меней як паўгадзіны пакорліва слухаць чарговыя Афоневы скаргі на сваю «старую каргу», якая сапсавала, атруціла яму жыццё, з'ела ўсе пячонкі і цяпер, во, за жывое мяса ўзялася.

Выпрабаванне для віноўніка-штрафніка было не з лёгкіх: па-першае, Афоня, рашуча ігнаруючы жаночы люд, спавядаўся толькі хлопцам, а тым, не ў прыклад дзяўчатам, заўсёды бракавала часу; па-другое, спавядаўся Афоня, як правіла, калі быў добра «цёпленькі», і яго п'яная балбатня набіла ўсім аскоміну, абрыдла да чорцікаў.

Па тым, як Афоня абрадаваўся, шырока заўсміхаўся ўсім сваім шчарбатым, пракураным ротам, убачыўшы ў дзвярах Дзімку, той зразумеў: вахцёр зноў пад мухай, і выкруціцца ад яго будзе няпроста. Трэба было нешта з ходу прыдумваць. Аргументы, што нехта там спяшаецца і ў яго хоць плач няма ні аднае вольнае хвілінкі, для Афоні нічога не значылі і ў разлік не прымаліся.

Дзімка зноў — які ўжо раз! — успомніў пра Сашку: што прыдумаў бы той? Ну, пэўна ж, нешта прыдумаў бы. Каб Сашка ды не знайшоў выйсця!.. Ці было калі такое ў ягоным жыцці?

У галаву «стрэліла» немаведама што, і Дзімка доўга пасля пацяшаўся, як не ўголас смяяўся, што вахцёр клюнуў на яго бязглуздую выдумку. Праходзячы паўз Афоню, Дзімка п'яна хіснуўся, ледзь нават не ўзваліўся на стол і не скінуў на бетонную падлогу тэлефонны апарат. Ухапіўшы Афоневу правую руку, ён ліхаманкава затрос яе, другой рукой па-панібрацку ляпнуў старога па плячы:

— Ну, пр-р-ры-вецік! Й-як, усё чын чынаром?

Ад неспадзеўкі Афоня ажно залыпаў вачыма, нават дзе, здаецца, і хмель у чалавека дзяваўся. Ён патушыў сваю шыракатварую ўсмешку, борздзенька ўсхапіўся з-за стала, як бы жадаючы загарадзіць хлопцу дарогу. Яшчэ хвіліна-другая пасіўнасці — і Дзімку давялося б туга.

Афоня раскусіў бы ўсё. А тады б хто ведае, як абярнулася б для Дзімкі гэтае яго блазенства. Што ні кажы, а чалавек знаходзіцца пры выкананні службовых абавязкаў...

Стараючыся іграць сваю ролю да канца, бо адступаць было позна ўжо, Дзімка зноў пахіснуўся, як бы між іншым кінуў:

— Фу, чорт... І расквэсіла ж. Вось табе і піва!.. Бракаванае... Ха-ха! Гарэлка не дакажа, як піць даць, не дакажа...

Афоня ўвесь насцярожыўся, гатовы слухаць далей, але сам ні пра што пакуль не пытаўся. Бронь Божа выдаць сваю зацікаўленасць! А зацікаўленасць сёння была мо як ніколі. Захацелася пахмяліцца, ажно млосна стала.

Раніцай з суседам, як ні спяшаліся на работу, усё ж далі добрага кругаля да ларка, дзе прадавалася піва. Піва-то было, а вось грошай і ў таго і ў другога аказалася з гулькін нос. Бабы, ліха матары іх, за ноч усе кішэні абмацалі, ледзь не да апошняй капейкі аблапошылі. Толькі і хапіла на два куфлі на дваіх. Цьфу!..

Афоня перасмыкнуў губамі, трохі памуляўся і, не ў сілах больш трываць, асцярожна ўсё ж спытаў:

— Дзе гэта такое піва... бракаванае... лепш за гарэлку? Брашы ды мерку знай. Можа, скажаш яшчэ, што яго скрынкамі на звалку выкінулі? Проста ў бутэльках?

Дзімка толькі гэтага і чакаў:

— Чаму ж на звалку? І чаму ў бутэльках? А хто за бутэлькі разлічвацца будзе? А бочкі ж спаражніць трэба. Вунь, на Юбілейным рынку, іх колькі! Пяць ці шэсць. І ўсе камісія забракавала, сказала выліць. А прадавец, калі камісія тая пайшла, схітрыла, рашыла хоць трохі пагрэць рукі на нашым браце. За капейку куфель — пі, хоць расперажыся, хоць пуза надшывай.

— На Юбілейным, кажаш?.. Хітрая баба, глядзі... Во зараза! — Афоня пачухаў патыліцу, крыху, дзеля прыліку, памаўчаў, моршчачы лоб, пасля сказаў Дзімку: — Ладна, алкаголік, ідзі адаспіся. Толькі на лесвіцы пасцеражыся, бо можаш нос у аладку сплюснуць. А мне адказвай?!

Ужо ў сябе ў пакоі, пакуючы чамадан у дарогу, Дзімка раз-пораз выглядаў у акно. Праз хвілін колькі ён згледзеў, як Афоня, спяшаючыся, гулка стукаючы дзеравяшкай аб асфальт, выйшаў праз жалезную брамку на вуліцу і пачыкіляў на трамвайны прыпынак. Дзімка не сумняваўся, што Афоня ўзяў кірунак на Юбілейны рынак. «Цікава,— падумалася хлопцу,— на каго ён кінуў свой пост, каго ўпрасіў

пасядзець замест сябе?» Яму ўжо стала няёмка, што чорт нейкі падбіў плявузгнуць вось такое, па-дурному разыграць чалавека. Смешна, вядома, аднак Афоню цяпер і на вочы не паказвайся. А яму ж, Дзімку, яшчэ цалюткі год жыць у інтэрнаце...

## 3

Надвечар, стомлены і запылены з ног да галавы, Лёшка вяртаўся з работы. Непадалёк ад дома суседка, гарбатая Марта Кныш, якая сядзела на лаўцы і гушкала на каленях унука, прашамкала бяззубым ротам, калі Лёшка, параўняўшыся, кіўком галавы павітаўся з ёй:

— Лёсацка, там са ў вас сарас дохтар. Уляна бехала ў кантору, сваніла. Матцы тваёй, касала, неста блаха...

Лёшка больш не слухаў, што яшчэ гаварыла Марта. Ён адчуў, як адразу пацяжэлі ногі, скамянела сэрца. Але, перасіліўшы слабасць, што так раптоўна навалілася на яго, скавала ўсяго, ён наддаў ходу і ў свой двор ступіў задыханы і ўстрывожаны. Насустрач, быццам і чакала яго, знарок пільнавала, выйшла з сенцаў Уляна з пачырванелымі, запалымі вачыма.

— Што, што з маці? — не стрываў, гукнуў Лёшка.

Уляна, схамянуўшыся ад нейкіх сваіх думак, агледзелася наўкола, як бы каго шукала, і ціха, хоць ніхто не мог іх чуць у двары, шапнула:

— Заснула. Спіць... Участковы Максімыч прыязджаў на лісапедзе. Паехаў вось толечкі. Даў лякарства, яна і заснула...

Уляна памкнулася некуды адвінуцца, але Лёшка хутчэй хацеў даведацца пра ўсё, таму зноў спытаў:

— Дык што Максімыч гаварыў? Што?

— Авоечкі, хіба ж ён мне спавядаўся. Сказаў, заедзе заўтра... А зараз, казаў, ёй нельга падымаць галавы, шавяліцца.

На дыбачках, басанож, Лёшка зайшоў у залу, наблізіўся да ложка. Ажно скаланула, калі ўбачыў, як змянілася маці за тыя некалькі гадзін, пакуль ён быў у полі. Твар набыў зямлістае адценне, як бы выцягнуўся, на ім застыў адбітак перанесенага болю, на правым павеку самгнёных вачэй раз-пораз торгалася, квола білася маленькая сінявcovатая жылка. Невядома было, спала маці ці проста так, сцішаная, ляжала ў нейкім сваім глыбокім і толькі адной

ёй зразумелым одуме. Лёшку так і карцела пазваць: «Мама». Але не рашыўся. Гэтак жа нячутна, як і зайшоў, ён падаўся на двор. Адчыніў хлеў, па драбінах палез на вышкі. Ядрана запахла свежым сенам: у лесе, два тыдні назад, як ездзіў па дровы, натрапіў на ладнаватую, упрытык з балотцам, палянку, на якой па калена ўзнялася густая сакаўная трава. Змушаны тады быў вярнуцца дахаты, прыхапіць касу. І вось зараз добры вазок сена ўжо на вышках. Радавалася гэтаму нечаканаму набытку і Вольга. Яшчэ калі калгас выдзеліць пасля трохі атавы — глядзі, на зіму і хопіць Зорцы.

Лёшка, закрыўшы твар далонямі, ніцма кінуўся на мяккую, яшчэ не ўляжалую пасцель. На колькі хвілін знерухомеў, сілай душачы ў сабе стогн, што так і рваўся з грудзей. Пасля, схамянуўшыся, папоўз да запыленага закотнага акенца, што глядзелася ў агарод.

У вузкай шчыліне між апошнім вянцом і дошкай намацаў скрутак у цэлафанавай абгортцы. На шчасце, ён быў цэлы, не крануты мышамі.

Выняўшы агульны сшытак, Лёшка разгладзіў яго, тупаватым ужо алоўкам, які таксама быў у скрутку, падправіў, паднавіў літары ў загалоўку. «Дзённік майго жыцця» — так значылася на вокладцы з карычневага каленкору. Перагарнуў спісаныя старонкі.

Сёння, у прадчуванні нейкай бяды, зноў хацелася выказацца, хоць трошкі аблегчыць сябе ад цяжкіх змрочных думак, што настырна лезлі ў галаву.

У акенца заглянула нізкае, амаль над саменькай зямлёй, вячэрняе сонца, касымі промнямі працяла падстрэшша, і тут стала светла, святлей, чым удзень. Лёшка, схіліўшыся над сшыткам, пісаў і пісаў. І з кожным новым радком адчуваў: не, ніякімі словамі не выкажаш усяго таго, што зараз на сэрцы...

Ноччу ён не клаўся спаць, сядзеў ля ложка маці. Два разы наведвалася і Уляна. Да раніцы ў зале гарэла лямпачка. Каб святло не біла ў твар, на шкляны абажур накінуў газеціну. Маці ляжала ў той жа паставе, што і звечара. Лёшку скрозь дрымоту час ад часу здавалася, што маці кволым голасам нечага кліча яго, і тады ён падхопліваўся, нахіляўся над саменькім яе тварам, ціха, шэптам, пытаў: «Што, мама?» Але Вольга не адзывалася. Усё гэтак жа на правым павеку пульсавала кволая сінявата жылка, і Лёшка як не маліўся, каб яна хоць пульсавала, падтрымлівала тонкую нітачку жыцця. Ён з нецярпен-

нем чакаў новага дня. Яму чамусьці здавалася, што самае страшнае пры хваробе — гэта ноч, калі нідзе побач нікога няма, і ты адзін, зусім адзін ва ўсім белым свеце са сваёй роспаччу, са сваёй бядою. Варта толькі пераждыць да раніцы — і ўсё будзе добра, усё стане на сваё месца...

Лёшка, стомлены ад бессані і трывогі, непрыкметна задрамаў і прахапіўся, калі за акном пасвятлела. Ён пстрыкнуў выключальнікам, яшчэ раз паўглядаўся ў твар маці і выйшаў на двор.

У тым баку, дзе павінна ўзысці сонца, цёпла барвовела неба. На вуліцы, пасля хаты, адчувалася свежасць, ядрана паблісквала на траве раса. Усё паказвала, што дзень зноў будзе сухі і гарачы.

На ганку — забыўся ўнесці вечарам у хату — стаяла вядро вады. Лёшка, каб трохі адагнаць вяласць і санлівасць, проста з вядра зачэрпнуў у прыгаршчы і лінуў на сябе. Не хацелася ісці ў хату па ручнік, лішні раз грукаць дзвярыма, і ён, задраўшы падол кашулі, збольшага прамакнуў твар.

Праз вуліцу ляпнулі веснічкі, і Лёшка, павярнуўшы галаву на гэты гук, убачыў, што ў двор да іх зноў шыбуе Уляна.

— Як, спіць? — ступіўшы на ганак, ціха спытала Уляна, і Лёшка кіўком галавы пацвердзіў: ага, спіць.

Уляна падалася ў хату, пабыла там хвілін колькі і выйшла назад з даёнкай у руцэ.

— Мо я сам? — Лёшка памкнуўся ўзяць даёнку ў суседкі.

— Чаго ўжо, не адваляцца і ў мяне рукі. Табе і так хапае...

На брыгадны двор Лёшка не пайшоў. Удалося запыніць брыгадзіра, які імчаў якраз паўз хату на сваёй новенькай ярка-чырвонай «Яве», і папрасіў яго перdesignаказаць Веньку, каб той да вечара папрацаваў адзін.

Пасля дзесяці пад'ехаў на веласіпедзе Максімыч. Паглядзеў маці, памацаў пульс, прыклаў стэтаскоп да грудзей, паслухаў сэрца. Маці ўжо прачнулася, твар яе трохі паружавеў, але вочы былі нейкія тлумныя, няўцямныя, яна нібы нікога не пазнавала, не ведала нават, дзе яна і што з ёю.

На ганку Максімыч вельмі строга, як не афіцыйна, сказаў Лёшку:

— У хворай быў моцны сардэчны прыступ. На шчасце, да інфаркту не дайшло. Ёй патрэбны цішыня і поўны

душэўны спакой. Нешта надта яе ўзрушыла і расхвалявала... Падумайце, малады чалавек, і папярэдзьце ў далейшым усё, што можа гэтак згубна адбівацца на здароўі самага блізкага вам чалавека.

Лёшка, ашаломлены словамі Максімыча, не знайшоўся адразу, каб запярэчыць, сказаць, што ніхто і ніштo не магло маці растрывожыць. Усё ж у іх добра, нiколькi нават не горай, чым у людзей. Дома ўсё параблена, дагледжана скаціна, што трэба пасаджана і уга як буяе ў агародзе. На рабоце таксама поўны парадак. Нават, во, раёнка зноў змясціла ягоны партрэт як аднаго з лепшых механізатараў раёна па выніках веснавой сяўбы. Два дні назад ён прынёс і паказаў маці ладнаватую прэмію, а ўчора ў абед забягала Аксана з газецінай, дзе той яго партрэт надрукаваны.

Аксана чытала нават пра яго, а маці радасна абзывалася і ўскліквала: «А Божачка! Вось жа хораша напісана! А што, так яно і было...» Лёшка слухаў і таксама здаволена пасміхаўся.

Пасля, паабедаўшы, хлопец прынёс яду маці. Аксана ўсё яшчэ сядзела, трымаючы газету на каленях. Спяшаючыся на работу, Лёшка пакінуў іх удзвюх, рады, што маці не адна, што ёсць ёй хоць з кім адвесці душу.

Хіба ў той дзень мог хто думаць, што ўжо вечарам маці стане гэтак кепска? Не-не, Максімыч гаворыць нешта не тое, зусім не тое. Добрыя весткі не маглі так расхваляваць маці, што каб ажно да сардэчнага прыступу дайшло.

Лёшка, аднак, памыляўся. Не ведаў ён, якая нечаканая размова адбылася ў яго адсутнасць між Аксанай і маці.

Вользе ўжо даўно хацелася пагаварыць з дзяўчынай. Сэрцам адчувала яна, што ў Аксаны з Дзімкам нешта апошні час не клеіцца, нібы чорная кошка прабегла між імі. Вядома, ва ўсім яна вінавацiла Дзімку, бо ўжо неаднойчы даходзілі чуткі, што той нешта круціць носам, не пільнуецца адной. Тым болей крыўдна і незразумела было, што Дзімка яшчэ зусім нядаўна гэтак моцна кахаў Аксану. Якая зараз трасца ўбілася яму ў галаву? Хіба ж дрэнная дзяўчына? Ці пабрыдчэла за той час, пакуль ён, Дзімка, у Мінску?

Першыя гады, калі меншы паехаў вучыцца, Вольга была спакойная за яго, не раз уяўляла, як Дзімка з дыпломам настаўніка вяртаецца дадому. Ужо не смаркач які-небудзь, не падшыванец, а паважаны, салідны чалавек.

З ім усе лічацца, пачціва вітаюцца, называюць не інакш як Дзмітрыем Іванавічам.

Вольга марыла, і гэтая мара, здавалася, зусім блізкая да таго, каб збыцца: Дзімка застанецца настаўнічаць у роднай вёсцы, будзе жыць дома, месца ж, уга, хопіць усім. Пасля ў адзін з вечароў, пэўна, гэта будзе субота, бо наперадзе выхадны дзень, ён прывядзе ў хату Аксану, і яны, хвалюючыся і чырванеючы — падзея ўсё ж не абыякая! — разам папросяць у яе, Вольгі, благаславення. Яна абніме Аксану, моцна пацалуе, з маркотай у голасе — так жа трэба, так водзіцца здавён — скажа: «Ну што ж, дзеткі, ваша пара́. Любілі вы моцна адно аднаго, дачакаліся адно аднаго, цяпер жывіце разам, мілуйцеся, хай вам Бог шчасця дае».

Лепшай нявесткі, чым Аксана, яна не жадала для меншага. Прывыкла да Аксаны. Радавала Вольгу тое, што Аксана не мінала яе хаты, часта, ні на кога не аглядваючыся, заходзіла на хвіліну-другую, расказвала розныя навіны, а зараз, калі хвароба прыкавала Вольгу да ложка, гэтыя візіты Аксаны былі як самае найлепшае лякарства.

Таго дня, калі Аксана чытала нарыс пра Лёшку, Вольга заўважыла, што ў дзяўчыны, як яна ні тоіцца, як ні стараецца паказацца вясёлай і бесклапотнай, нешта цяжкім каменем ляжыць на сэрцы. Вочы таксама, калі ўглядзецца, казалі пра тое ж: глыбока-глыбока ў іх хаваліся боль і горыч.

Дачакаўшыся, пакуль яны застануцца ўдзвюх, Вольга рашыла нарэшце пачаць гэтую нялёгкую гаворку. Адкладваць надалей, прыкідвацца, што яна нічога не ведае і не бачыць, было б нядобра. А мо яшчэ можна што паправіць? Вось хутка прыедзе на канікулы Дзімка, яна скажа яму ўсё ў вочы, не паглядзіць, што сын, што вучаным стаў. Хай будзе перш за ўсё чалавекам, вось што. А то ж можна чортведама да чаго дакаціцца!

— Аксаначка, дачушка,— проста, без хітрыкаў, без усялякіх выкрутас звярнулася Вольга да дзяўчыны, бо жыццёвы вопыт не раз казаў, што на шчырасць рэдка хто не адзавецца шчырасцю, а Аксана тым болей,— гэта ж я ўсё вагалася, не хацела вярэдзіць душу, але зараз, даруй мне, не магу ўтрымацца. Скажы ж мне: што сталася ў вас з Дзімкам? Вось адчуваю, што нешта не тое, як было, але ж і ты маўчыш, і з яго, акаянца, слова не выціснеш лішняга. А я ж вам толькі дабра зычу. Божачка, вам жа мала хто не зайздросціў — усе ж ведалі, як вы адно да аднаго...

Мне бабы ўжо даўно вушы пратрубілі, каб рыхтавалася да вяселля... Я што, я радая была б хоць заўтра, ты ж ведаеш, дзіцятка, як я да цябе... Абы толькі ў вас была злагада.

Ніяк не чакала Вольга, што на гэтыя яе словы Аксана, якая спачатку насцярожылася, сядзела скамянелая, з патухлымі вачыма, раптам нібы хто токам яе прашыў, уздрыгне ўсім целам, уткнецца тварам у коўдру, якой Вольга накрывалася, і вострыя плечукі яе ходырам заходзяць ад плачу.

Вольга не ведала, што рабіць і што думаць. Яна выцягнула з-пад коўдры правую руку і асцярожна кранулася мяккіх Аксаніных валасоў.

— Не таіся, дачушка,— толькі і магла яна сказаць, адчуваючы, што і ў самой слёзы нагарнуліся на вочы. Яна не чапала дзяўчыну, не лезла з роспытамі, ведала, што слёзы зараз дадуць ёй хоць маленькую палёгку. І калі захоча сказаць, то не трэба болей цягнуць яе за язык.

Сапраўды, Аксана раптам адарвала твар ад коўдры і, усё яшчэ ўсхліпваючы, давячыся словамі, выдыхнула:

— Не... не піша ён болей. А ў мяне... дзіця... будзе!

Што хочаш рыхтавалася пачуць Вольга, але не гэта. У Аксаны будзе дзіця! Цэлая плойма самых розных думак абрынулася на жанчыну. Спачатку яна ўзлавалася: што ж ты, дурніца, нарабіла, як магла дапусціцца да такога сораму, да такой ганьбы?! Гэта ж лепей скрозь зямлю праваліцца! Затым трохі працверазела: ці ж можна так ужо караць дзяўчыну? Яна ж, пэўна, кахала і кахае Дзімку. А ў маладых зараз усё пераблыталася, перайначылася, не зразумееш іх, па сваіх правілах жывуць, не тое што некалі. Цяпер усё не так...

Праз хвіліну зноў апякло ўсярэдзіне: гэта ж той напаскудзіў і во, бач, нос ужо верне ўбок, пісаць нават не хоча. Ён, бач, ужо вышэй за ўсіх, яму напляваць, што дзяўчына падушку слязьмі мочыць, начамі, пэўна, не спіць. Галава пухне. А яму што?! Ну, нягоднік, пачакай жа...

У гневе на меншага Вольга не згледзела, калі выбегла з хаты Аксана. Вользе яшчэ горай стала: гэта ж ні слоўца не сказала дзяўчыне, нічым не суцешыла, а тая ж, пэўна, і прыйшла да яе, каб неяк аблегчыць душу, раскрыцца, папрасіць парады. Як жа зараз быць? Трэба ж неадкладна вярнуць Аксану! Божачка-Божа, за што ж ты так караеш?

— Аксана, Аксаначка! — на нешта яшчэ спадзеючыся, гукнула раз-другі Вольга, але чамусьці голасу свайго не пачула.

Краем свядомасці толькі адзначыла, як галаву раптоўна напоўніў тупы гуд, у скроні застукалі малаточкі, а ў грудзях нешта сутаргава кранулася, як бы перавярнулася, нечым цяжкім, свінцовым скавала цела.

І дзень, і ўсё тое, што яна бачыла і чула, што непакоіла і трывожыла, чым жыла і чым дыхала, некуды шалёна кульнуліся, зніклі ў невядомым глухім бяздонні...

## 4

Дзімка намучыўся як ніколі. Месца аказалася ззаду, і ўсю дарогу няспынна роў недзе за спіною матор, угравaў сядзенне, нават пах гары добра чуўся ўсярэдзіне. Ад яго тлумам і гудам налівалася галава, казытала ў горле, носе. Хоць адчынілі, акрамя, вядома, дзверцаў, усё, што можна было адчыніць, расхлябіць, найбольш стойка пах гэты трымаўся там, дзе выпала сядзець яму і іншым такім жа пакутнікам. Асабліва цяжка, невыносна рабілася, калі аўтобус — абурала, што ў далёкі рэйс далі такую ламачыну, хоць вонкава ён выглядаў і нішто — узбіраўся на пагоркі або пасля прыпынкаў браў новы разгон. Тады чад — невядома, адкуль ён толькі і цадзіўся ў салон — быў густы, спорны, і ад гарачыні, смуроду хацелася спыніць машыну, выйсці на паветра, плюнуць наогул на такую язду. Але ж другія неяк церпяць, то не памрэ, можа, і ён, тым болей паспрабуй зараз чым іншым заедзь, дабярыся да таго райцэнтра. Не хацелася ні з кім знаёміцца, гаварыць, хоць людзі, выпраўляючыся разам у няблізкую дарогу, маюць добрую звычку, каб, відаць, скаратаць хутчэй час, нешта цікавае расказваць пра сябе, блізкіх, прыгадваць нейкія здарэнні ці гісторыі.

Гэты раз у аўтобусе было нязвыкла ціха. Хто драмаў, у нязручнай позе адкінуўшыся на высокую спінку, хто маўкліва і задуменна глядзеў за акно, дзе млелі пад сонцам усцяж шашы то палеткі збажыны, якая зараз, набраўшы росту і наліўшыся коласам, пясціла-спяліла зярняткі, то гоні цукровых буракоў — там-сям, укленчыўшы, у белых хусцінках працавалі жанкі, відаць, рабілі прапалку,— то бярозавыя ўзлескі з вясёлымі аксамітавымі палянкамі. Малюнкі мяняліся адзін за адным — была ма-

каўка лета, і прырода паказвала ўсё багацце сваіх колераў, фарбаў.

Дзімку, пасля гарадскіх камяніц і тлуму апошніх тыдняў, усцешвала, што наперадзе два месяцы вольнай волі, ні кніг табе тых, ні выстойвання ў чарзе ў сталоўцы, ні вечных дрыжыкаў, каб хаця ж не спыталі на чарговым семінары таго, чаго ён не вучыў і не ведаў. Як жа добра затое ў іхнім Мошыне летам! Лес — з кіламетр, не болей, рака, хоць невялікая і неглыбокая, затое рыбная, наогул падступае амаль да саменькіх агародаў. Купайся, загарай, выседжвай з вудачкай, цікуй за паплаўком!

Нагадаўшы ўсё, Дзімка заўсміхаўся сам сабе, але раптоўна патушыў усмешку: зноў, як ужо не раз за сённяшні дзень, кальнула думка, што гэтая яго паездка дадому не такая радасная і бесклапотная. Маці, якая заўсёды дрыжэла над ім, не падпускала да работы, нават Лёшка на яе сварыўся, што песціць, балуе, зараз ляжыць пластом, а то, можа, і зусім пры смерці. Яна ўжо не стрэне яго, як сустракала раней, не пастрэньчыць, не змудруе што смачнейшае, не возьме на сябе ўвесь клопат па доме, гаспадарцы. І — хочаш не хочаш — закасвай рукавы, увіхайся як толькі можаш.

Не меней вярэдзілі душу адносіны з Аксанай, якія зайшлі ў нейкі тупік. Дзімка не ведаў сам, што рабіцьчыніць, якое знайсці выйсце, бо доўга ў маўчанку не згуляеш, рана ці позна ўсё ж давядзецца сустрэцца з дзяўчынай вока на вока, вырашыць ужо канчаткова, як быць далей. Зараз жа нічога пэўнага ён не мог сказаць не толькі Аксане, але і самому сабе. Сэрца гняла пустата, і ён не мог даўмецца, калі ж і з чаго такое пачалося...

Аўтобус, дарма што рабіў прыпынкі, часам нават і немалыя, на канечную сваю станцыю прыйшоў якраз па раскладу. Сонца ўжо села, і раённы гарадок, нязвыкла, пасля Мінска, сцішаны і маўклівы, рыхтаваўся да сну. Заўтра ж ніякае ні свята, ні выхадны дзень, і людзі тут, бліжэйшыя да зямлі, і кладуцца і ўстаюць раней, амаль як і ў вёсцы.

Невялічкі драўляны будыначак, дзе месцілася аўтастанцыя, хоць і зыркаў яркімі лямпачкамі, ці не двухсоткамі, быў таксама амаль пусты. Толькі на адной з трох лавак сядзела, прытуліўшыся адно да аднаго, маладая пара, ён і яна, а на другой, разваліўшыся, як дома, пахропваў няголены, з густой рыжаватай шчэццю, у замусоленай спяцоўцы дзябёлы дзяцюк. «Гэты ўжо гатовы, недзе

наглёкаўся»,— незласліва падумаў Дзімка, кіруючыся да сцяны, дзе вісеў расклад. Ён ведаў, што сёння рэйсавага аўтобуса не будзе, але на ўсякі выпадак заглянуць у той расклад не зашкодзіць. Што ж, так яно і ёсць: на Калоднае апошні пайшоў гадзіну назад, і цяпер толькі ў сем раніцы можна сесці і даехаць да Мошына.

Дзімка апусціўся на незанятую лаўку, пачаў мазгаваць, як быць далей. Не хацелася цэлую ноч аціраццa тут, бо паспаць усё роўна не паспіш, а сядзець, драмаць, кляваць носам, слухаць густы, сакаўны, з прысвістам, з рознымі іншымі каленцамі храп рыжашчокага дзецюка — невясёлая перспектыва. Ён ухапіў сакваяж і — будзь што будзе — падаўся на ўскраіну, адкуль брала пачатак дарога на Калоднае.

Яму не хутка, але пашанцавала. Пасля некалькіх дарэмных спроб «прагаласаваць» — машыны зараз ішлі вельмі рэдка — адна, з брызентавым капюшонам-паўверхам над кузавам спераду, нечакана збочыла, віскнула тармазамі. З кабіны, прачыніўшы дзверцы, вылез, стаў на падножку, пачаў папраўляць бакавое люстэрка малады чубаты хлопец у тэнісцы. Дзімка хуценька абабег машыну, памкнуўся да шафёра.

— Куды? — першы спытаў той, мелькам зіркнуўшы на Дзімку.

— На Калоднае. Да Мошына падкінеш?

Шафёр як бы чаго завагаўся, хвіліну падумаў, пасля коратка кінуў:

— Ладна. Сігай наверх. Сядзець знойдзеш на чым. На паваротцы на Мошына высаджу, бо мне далей.

— Самы раз,— абрадаваўся Дзімка, борзда стаў ззаду на кола, падцягнуўся і спрытна скокнуў у кузаў.

Машына ў тую ж хвіліну кранулася. «Відаць, нехта ў кабіне яшчэ ёсць»,— зазначыў сабе хлопец. Ён, агледзеўшыся, убачыў спераду прывязаную, каб не тузалася туд-сюд, магутную, мо ў чалавечы рост, пакрышку, на якую кінута была ватоўка і яшчэ якаясьці адзежына. Дзімка сеў на тую пакрышку і адчуў, што самая калдобістая дарога зараз яму ні па чым. Але, як ні гнаў, ні высільваў машыну шафёр, амаль не трэсла. «Відаць, нядаўна падсыпалі, паднавілі шашу»,— успомнілася хлопцу, колькі патросся ён тут, калі прыязджаў перад маем.

Было, нягледзячы на позні, лічы, ужо начны час, вельмі цёпла, і нават брызентавы капюшон, які стрымліваў пругкі напор паветра, настоенага на розных дурманлівых пахах

зямлі, здаваўся лішнім, непатрэбным. Дзімка даўно не адчуваў такой слодычы ад язды, не тое што сёння ў тым смярдзючым аўтобусе.

На паваротцы на Мошына шафёр, як і абяцаў, затармазіў. Дзімка працягнуў скамечаны рубель, але хлопец адвёў яго руку:

— Схавай. Што драць з беднага студэнта? Сам мечу ў гэтую скуру ўлезці... Шчаслівa!

Здзіўлены яго адказам, Дзімка сунуў назад у кішэню грошы, пастаяў трохі, пакуль машына не завурчала, не газанула, затым, аблаяўшы сябе, што нават не падзякаваў чалавеку, які сярод ночы спыніўся, падабраў, давёз, во, як не да самай вёскі, пакрочыў знаёмай, ходжанай-пераходжанай тысячу разоў, дарогай. «І скуль узяў ён, што я студэнт? — прыйшла запозненая думка.— Не напісана ж на лбе. А мо хто знаёмы?»

Ішлося лёгка. Дзімка збочыў на вузкую сцяжынку-пятлянку, якая, аддзеленая ад дарогі неглыбокай травяністай канаўкай, бегла паралельна з ёй і добра пад маладзіком высвечвала, нібыта была пабелена. Чым бліжэй у малочна-залацістым цэдзіве вымалёўваліся абрысы першых будынін, тым большым хваляваннем і адначасова непакоем адзывалася ў грудзях сэрца. Зноў каторы ўжо раз скаланула: як там дома?

Вёска спала. Нідзе ніводным агеньчыкам не свяціліся вокны. З агародчыкаў патыхнула, ажно ў носе заказытала, яго любімым язмінам. Недзе ззаду падаў голас сабака, але, не ўчуўшы нічога падазронага і не атрымаўшы падтрымкі з боку сваіх хвастатых суседзяў, змоўк, сцішыўся, нібыта кажучы: «А што, мне болей за ўсіх трэба?»

Параўняўшыся з хатай, дзе жыла Аксана, Дзімка азірнуўся, падышоў да лавачкі ля плота, спыніўся, наструніў вуха. Вокны, што глядзеліся на вуліцу, зацененыя ад месяца густым, разлапістым клёнам, уверсе зеўралі чарнатой, а знізу блекла адсвечвалі фіранкамі. Мімаходзь кальнула: колькі папасядзелі яны на гэтай вось лавачцы разам з Аксанай! Зараз яна недзе спіць, бачыць сёмыя сны. І не ведае, што ён побачкі, глядзіць у яе вокны. Эх, Аксана, Аксана!..

Яму здалося, што хтосьці як бы адхінуў фіранку, матлянуўся якраз у той шыбцы, дзе яе пакойчык. Дзімку стала ажно млосна. Ён прыгнуўся, счакаў колькі хвілін, пасля зноў асцярожна глянуў з-за штыкеціны: не, усё было, як і раней, яму, відаць, нешта памроілася...

У сваім двары ён ужо не таіўся. Знарок мацнавата ляпнуў брамкай, бязбоязна, не думаючы, што наробіць стукату-грукату, прайшоў паўз вокны. У пярэднім пакоі было цёмна, і толькі праз вузкую шчылінку слаба прычыненых дзвярэй на кухню цадзілася святло. «Лёшка яшчэ не спіць?» — устрывожана ступіў Дзімка на ганак, далонёй нямоцна ляпнуў у дзверы. Пасля, не чакаючы, звычна піхнуў іх ад сябе, і яны адчыніліся. У кухні нікога не было. Патыхнула застаялым, змешаным з нейкім лякарствам, паветрам. На стале стаяла брудная, з рэшткамі яды паліваная гліняная міска, чарсцвеў акраец хлеба. У цішыні дзумкала, білася аб аконнае шкло вялікая, адкуль і ўзялася такая, зялёная муха.

Дзімка, не разуваючыся — туфлі былі сухія, праўда, парадкам запыленыя,— з саквояжам у руцэ падаўся ў бакоўку. Аднак Лёшкі і там не аказалася. І ложак яго, надзіва, стаяў засланы. «Дзе ж ён?» У пярэдні пакой, адведзены для маці, пакуль не пайшоў — чамусьці пабаяўся. А раптам... Вярнуўся зноў на кухню, паставіў у куце ля парога сваю ношу, прысеў на табурэтцы, пачаў чакаць.

Лёшка, калі аднекуль з падворка ўвайшоў у хату, ніколькі не здзівіўся, нават не папытаў, як дабіраўся і чаму позна. Быццам яны ехалі разам, і ён сам на сабе спазнаў усю асалоду гэткай язды. Твар яго, з нездаровым, зямлістым адценнем, не выказаў ніякіх эмоцый.

— Есці хочаш? — спытаў толькі неяк адчужана, бы не сваім голасам.

— Матка як? — адчуў халадок на спіне Дзімка і ўтаропіў гарачы, патрабавальны позірк на брата.

— Ляжыць, не варухнецца... Усё аднялося. Яшчэ гаварыць трохі можа.

— Што ж гэта?.. — нервова перасмыкнуўся Дзімкаў твар.

— Ужо колькі разоў пытала пра цябе, сказаць як бы што меціць.— Лёшка стомлена прыткнуўся на зэдлік ускрай стала, цяжка, па-жаночы паклаў на калені рукі.— Таму я і званіў, каб скарэй ехаў.

— Дык ‘мо зараз? Што ж яна такое хацела?

Лёшка запярэчыў:

— Не, заўтра ўжо хай. Зараз яна спіць. Звечара прыходзіла з бальніцы сястра, укол зрабіла.

Ляглі ў бакоўцы ў поцемках, каб не пстрыкаць уключальнікам і, крый Бог, не патрывожыць матчын сон. Шэп-

там перакінуліся яшчэ некалькімі словамі і аціхлі. Першы здаўся Дзімка. Лёшка чуў, як ён спачатку тоненька, пасля мацней засвістаў, захліпаў носам, мармытнуў нешта, павярнуўся на другі бок і — нібы яго не стала, нібы праваліўся куды. «Здарожыўся, нябось,— падумаў пра брата. Упікнуў сябе: — А я і не спытаў, як жа экзамены здаў». Самога сон пакуль не браў, хоць і адчуваў, як гудам гудзе ўсё цела, ажно расколваецца ад нязнанага дасюль болю галава. Ляжаў доўга з расплюшчанымі вачамі, слухаў гукі начы. Нехта, вяртаючыся з запозненага спаткання ці так якой гульбы, няспешна прашаркаў сярэдзінай вуліцы. У хляве спрасонку, мо напалохалася чаго, кудахнула раз-другі курыца, нясмела і неахвотна ад лёгкага свежага ветрыку тарганулася адчыненая фортка. Бразнуў кручок. А ў агародчыку шаргануў галінай аб сцяну стары, падсохлы ўжо вяз. Зноў усё, атуленае мройным покрывам ночы, чуйна задрамала.

Яму ж, як ні намагаўся заснуць, не спалася. Ведаў: заўтра будзе яшчэ горай, калі хоць трохі не самгне вачэй, не дасць пярэдыху змучанаму целу. Добра, што хоць на работу пакуль не трэба. Старшыня сам папытаў нядаўна пра маці, уважыў яго просьбу, даў зараз водпуск. Мо што з Дзімкам змогуць папарадчыць, пакуль той дома, бо ўсё не ставала часу, ні да чаго не даходзілі рукі. А галоўнае — лепш можна дагледзець маці, хоць цяпер невядома ўжо, як і чым ёй памагчы. Калі дактары аказаліся бяссільнымі, то... Але ніяк не хацелася мірыцца з трывожнай думкай, што гэта можа быць усё. Што не настане таго паляпшэння...

Паварочаўшыся яшчэ колькі, Лёшка не выцерпеў, адкінуў коўдру, злез з ложка і пашлэпаў у кухню, не запальваючы святла, звычна намацаў вядро з вадою, конаўку, набраў поўную, прагна пачаў піць. Вада была хоць і не вельмі халодная, але асвяжыла, трохі адпусціла сціснутыя, нібы абцугамі ўсё роўна, скроні. Сон пасля гэтага змарыў хутчэй.

5

Раніцай Лёшка прачнуўся і ажно спалохаўся. Падалося, што праспаў усё на свеце, не падаіў і не выгнаў разам з усімі карову. Ён выхапіў з-пад падушкі ручны гадзіннік — нанач меў звычку заўсёды класці яго пад падушку,— зірнуў і супакоіўся: не, не праспаў, хоць ужо і вы-

лежвацца не выпадала. Вось-вось аб'явіцца, загалёкае сваё заўсёднае «выган-я-яй-й» пастух.

Калі з поўнай амаль даёнкай пеністага сырадою ён вярнуўся на кухню, пачуў слабы, нямоглы голас маці і прыцішаны, нібы вінаваты,— Дзімкаў. Лёшка хацеў зайсці ў пакой, папытаць, мо трэба чаго, аднак вуха ўлавіла дакорлівыя, з ноткамі адчаю і болю, матчыны словы, якія спынілі яго, насцярожылі:

— Не, не такім я цябе гадавала, сынок, не такім... Хацела, каб чалавекам быў, а ты...

— А я што? — паспрабаваў штосьці давесці Дзімка, але маці не дала яму гаварыць.

— Ты ж яе ашукаў, пасля ў душу, лічы, плюнуў. Хіба Аксана тое заслужыла? А дзіця народзіцца — думаеш, прападзе, калі і адчужаешся? Была б маці... Бач, ён ужо вышай яе, яна ўжо яму не пара... І гэта я чую ад цябе, сына свайго?!

— Я ж так не сказаў,— вяла пачаў апраўдвацца Дзімка, але шчырасці ў яго голасе не чулася.

Было бачна: гэтая размова яму не па нутры, і церпіць ён яе толькі таму, што маці, высахлая і знясіленая, без адзінай, здэцца, крывінкі ў твары, гатова зноў праваліцца ў цяжкае сваё забыццё.

«Дык вось яно што! — апякла Лёшку згадка.— Вось ад чаго ў маці быў сардэчны прыпадак, які зусім зваліў яе, падкаваў ушчэнт... Гэты паскуднік ва ўсім вінаваты! Нашкодзіў, бы той збродлівы кот, а цяпер і носам яшчэ круціць...»

Злосць на брата ўдушліва падступіла да горла, сцяла дыханне. Хацелася тут жа зайсці ў пакой, супакоіць, абнадзеіць маці, сказаць нешта добрае, а тому нягодніку даць па карку, каб ведаў, не забываўся, хто ён і што ён, чым і каму абавязаны...

Але ён спыніў сябе. Падумалася, што сваім уварваннем можа распаліць яшчэ большы, непатрэбны зараз пажар. І ці вытрывае маці сварку? Не, не пры ёй трэба размаўляць з гэтым шкадліўцам, які зусім згубіў усякі сорам, якому напляваць і на маці, і на Аксану, і на ўсё, што ёсць святога...

Ён знарок моцна бразнуў даёнкай аб вядро, даючы зразумець, быццам толькі што ўвайшоў у хату і ведаць нічога не ведае, што тут хто гаварыў і аб чым спрачаўся. Тым болей маці сама, па ўсім бачна, не хацела ўводзіць у яго вушы — мо берагла і яго спакой — гэтую непры-

емную гісторыю, якую вытварыў меншы, ад чаго і дапраўды звар'яцець можна. Як і разлічваў Лёшка, маці змоўкла, сцішылася, а Дзімка, чуваць было, шмыгнуў у бакоўку, зноў лёг у ложак.

Снедалі моўчкі. Дзімка штохвіліны тузаўся на зэдліку, ад скавародкі — на скорую руку Лёшка падсмажыў сала і ўзбіў колькі яек — не падымаў вачэй, быццам так згаладаўся, што і свет белы нямілы.

Лёшка яго не чапаў, хоць і карцела хутчэй сказаць яму некалькі «цёпленькіх» слоў, прапудрыць трошкі мазгі, калі ён такі безгаловы ці занадта ўжо паразумнеў за час, як адарваўся ад дому. Усярэдзіне ажно ўсё кіпела, але, стрымліваючы гнеў, ён знарок гучна, каб чула, калі не спіць, маці, сказаў:

— Ні палена дроў не засталося. Пераапранайся ў што горшае, пойдзем папілуем, парадак такі-сякі на падворку навядзём.

Дзімка, толькі б хутчэй вышмыгнуць з хаты, бо баяўся матчыных вачэй, ахвотна згадзіўся, адразу кінуў есці, палез на печ шукаць будняе сваё адзенне. Лёшка тым часам выцягнуў з хлява, з цёмнага закутка, козлы, з кладоўкі ў сенцах узяў тапор, пілу, панёс усё на дрывотню. Козлы паставіў на звыклае месца — там яшчэ з зімы, калі пілавалі апошні раз, застаўся горбік зляжалых і высахлых зараз апілак. Зверху валяліся трэскі. Аднак, прыкінуўшы, што тут доўга не нашчыруеш, бо ўжо добра прыпякала, ажно сарочка ліпла да цела, перанёс козлы бліжэй пад плот, дзе трымаўся цень ад вішняку, сліў, якія густа, мо нават занадта, месціліся на ўзмежку.

Пілавалі нейкі час моўчкі. Дзімка быў як наструнены, нешта яго ці гняло, ці мо здагадаўся, што Лёшка ведаў усё і зараз пачне таксама перабіраць костачкі. Таму працаваў апантана, ні хвіліны не даючы сабе пярэдыху. І ўсё ж, калі выпадкова з рукі яго выслізнула вышмальцаваная да бляску ручка пілы і тая вужакай выгнулася, вісгатнула, тузанулася туды-сюды, Лёшка не стрымаўся, едка кінуў:

— Работнічак!.. І з рук усё валіцца. Пэўна ж — нарабіў столькі, што ці расхлябаеш, як ні тужся.

— Ты пра што? — адразу ўзвіўся Дзімка.

Лёшка перастаў пілаваць, вочы свярдзёлкам упіліся ў брата, гатовыя прашыць яго навылёт:

— Скажы, ён анёлам сябе дасюль лічыць. Ты чаго мардуеш Аксану? Падбіў дзяўчыну на зман, а цяпер

што — у кусты?! Так? А ці ведае ж гэты анёл, што маці з-за яго — так-так, не чмыхай, не зіркай бельмамі — з-за цябе зусім адкінула, канчаткова паралізавала. Невядома, чым яшчэ ўсё гэта скончыцца. А я дасюль ламаў галаву, з-за чаго ёй так пагоршала, з-за чаго яна ў твары ўсохла, учарнела.

Дзімка адно мыляў губамі, але маўчаў, падцяўшы хвост, і Лёшка нечакана спытаў іншае:

— Экзамены ж як, хоць здаў? Можа, зноў тройку ўхапіў? Дзе ж ужо да той вучобы...

— Ну і ўхапіў. Перад табой спавядацца павінен? Апекуном сябе лічыш? Бачыў я такога апекуна... Пайдзі сам вось і здай. Пазнаеш, як гэта лёгка...

— Ты што — сур'ёзна? — Лёшка зноў быў агламошаны пачутым.

— Не хвалюйся, не папрашу ў цябе болей грошай. Абыдуся неяк.

— Святым духам жыць будзеш? Ці па даведку ў сельсавет пабяжыш? Забудзь пра гэта.

— А ты што мне за ўказчык, што? — прарвала меншага, і голас яго перайшоў на віск.— Другім можна, а мне дык не?! Бацька хіба не ваяваў, не злажыў галавы? Злажыў, і ў героі нават запісаны. Хіба гэта ўжо не цэніцца? Хіба ўжо брыдка ўзяць тую даведку і спакойна палучаць што паложана? Не адзін я такі. Вунь...

— Забудзь пра гэта,— перабіў яго Лёшка і, збялелы, што палатно, ушчыльную падышоў да брата.— Чуеш?! Я не буду паўтараць.

Дзімка яшчэ больш стаў на дыбкі і, каб насаліць Лёшку, плявузгнуў, чаго і сам не чакаў ад сябе:

— Ты чаго тут раскамандаваўся, га? Жылі з маці без цябе і абыходзіліся. А ты вышукаўся. Брат, называецца, мне знайшоўся... А скуль вядома, што ты брат? Скуль? Мама пашкадавала, прывеціла...

Хаўкнуўшы, хапіўшы ротам паветра, Лёшка штомоцы ляснуў даланёй па твары меншаму і, як мага стрымліваючыся, каб не падмяць яго пад сябе, не надаваць сапраўдных кухталёў, ад якіх не так пачухаўся б, рэзка павярнуўся і пайшоў у агарод, толькі паспеў яшчэ кінуць:

— Не думаў, што ты нягоднік такі. Жыццё цябе не круціла, не абламала рожкі...

На сэрцы было пагана. Дзімка як не кусаў сябе за локаць, што ляпнуў такое. Смылела і шчака, агнём, здэцца, пякла. Ён сплюнуў, думаючы, што мо кроў у роце, бо

так моташна ніколі, бадай, не пачуваў сябе. Але крыві не ўбачыў і нават чамусьці пашкадаваў, што яе няма. Схацелася, як калісьці даўно-даўно, калі большыя задзірыхлапчукі крыўдзілі, а то і сіняк дзе пакідалі на целе, убегчы ў хату і, размазваючы кулаком па твары слёзы, яшчэ з парога паскардзіцца, а то і залямантаваць:

— Мама! А Квашня шкельца сіняе ў мяне адабраў, у агарод пульнуў недзе.

Маці, што б ні рабіла, кідалася да яго, укленчвала, выцірала фартухом ці падолам спадніцы слёзы, змешаныя з пылам, вадзіла рукой па грыўцы мяккіх валасоў, казала:

— Не важдайся з ім, з тым шыбенікам, сынку, саступі яму. Ён жа і дужэй цябе, і бандзюга, во, бач, расце. Бацечка п'яніца, свет такіх не бачыў, людзям вочы ажно намазоліў, не прачыхаецца ні днём, ні ночачкай, дык і сынок не жыў будзе, калі не ўчыніць што паганае. А шкельца ты другое пашукай, можа ж, дзе і лепшае яшчэ знойдзеш.

Ён, прылашчаны, супакойваўся, забываўся на крыўду, боль, ішоў зноў гуляць на вуліцу.

Зараз жа, як ні крыўдна і ні балюча пасля ўсяго, што надарылася, не было да каго прыхінуцца, каму паскардзіцца. Была б здаровая маці...

Ён пашукаў вачыма, дзе б схавацца, куды зашыцца, каб нічога і нікога не бачыць, не чуць. Развярэджваючы, расцвельваючы сябе, ён не помніў, як адчыніў хлеў, па драбінках, прыслоненых да загарадкі, дзе стаяла Зорка, узлез на вышкі, як ніцма, закрыўшы толькі рукамі твар, кінуўся на шабуршыстае духмянае сена.

Колькі ляжаў — таксама не помніў. Пасля падняў галаву, агледзеўся, прыслухаўся. На падворку не чулася ні аднаго гуку. «Дзе ж той? — ужо не так злосна падумаў пра Лёшку.— Можа, збег куды, брыдка стала».

Не ведаў Дзімка, які нечаканы ўдар — што там аплявуха! — падпільноўвае яго наперадзе, нават зараз, у гэтую вось хвіліну.

Вока — яно ўжо добра абвыклася, прызвычаілася да мяккага сутоння вышак — выхапіла непадалёк нешта белае. Ён лянотна працягнуў руку, памацаў, наблізіў да сябе тое белае і нямала здзівіўся: перад ім быў разгорнуты недзе на сярэдзіне тоўсты агульны сшытак, да палавіны, да разгорнутага, густавата спісаны дзе чарніламі, дзе алоўкам. Прыгледзеўшыся лепей, Дзімка пазнаў братаў почырк. «Цікава, ці не працадні свае, дзе, калі і што рабіў,

гэтак старанна памячаў за ўсе гады?» — хмыкнуў пра сябе і адгарнуў сшытак далей, глянуў на вокладку. «Дзённік майго жыцця»,— бы першакласнік, прамыляў губамі тлуста выведзенае на каленкоры.

Разабрала цікавасць. «Што ж ён там гэтулькі панапісваў?» — зноў ухмыльнуўся, забыўшыся ўжо на нядаўнія свае крыўды.

З сшыткам папоўз да акенца, зіркнуў у запыленую, заседжаную мухамі шыбку — ці няма дзе побліз Лёшкі. Пераканаўшыся, што па-ранейшаму ўсюды ціха, пачаў чытаць. Была напачатку думка: прачытае, пасмяецца ў ахвоту з братавага дзівацтва — бач, хаваецца, пэўна, няўдалую сваю любоў з Нюркай аплаквае ў кулак, а мо яшчэ што адмачыў,— пасля як-небудзь, калі Лёшка надта будзе выпінацца са сваімі заўсёднымі натацыямі, павучаннямі, ён, Дзімка, сказане яму такое, што ў таго і вочы на лоб палезуць, назаўсёды адпадзе ахвота выстаўляць сябе ў ролі настаўніка-маралiста.

Смешнага, аднак, нічога пакуль не траплялася. Чым далей гартаў старонку за старонкай, тым больш выцягваўся твар, тым з большым напружаннем, ажно, здаецца, лопне ўсярэдзіне туга напятая жылка, учытваўся ў кожны радок, у кожнае слова. Адчуваў: у скроні малаточкамі б'е кроў, трэба было б неяк расслабіцца, але ўжо не ставала болей сілы адсунуць убок гэты дзённік, які раскрыў яму вочы на тое, чаго ён не ведаў і што нават у самым жахлівым для яго сне не мог сасніць. З'явілася на хвіліну жаданне пашкуматаць, на дробныя кавалачкі парваць, развеяць на ветры гэтую пісаніну, крыкнуць роспачна, глуха, утробна: «Не, не! Гэта ўсё мана! Такога не можа быць!» Але ён нічога не парваў і ніводнага слова не выціснуў з засмяглых вуснаў.

Удушша і роспачнасць, якія межавалі з забыццём, кульнулі яго з вышак, вывелі на луг, да рачулкі, пасля — на сасняковы ўзлобак ускрай лесу. Ён ішоў і ішоў, не выбіраў ніякай дарогі, бо нічога не бачыў перад сабой. Ім валодала адно, неўсвядомленае жаданне — бегчы, бегчы ад самога сябе і ўсяго на свеце, усяго таго, што дасюль было поўнае сэнсу, радаснай маладой узрушанасці, большых ці меншых крыўд, засмучэнняў, чакання незвычайнага ў сваім жыцці, было зразумелым і простым, а зараз, у адно імгненне, паблякла, рассыпалася ў пыл і ўжо ніколі не збярэш яго, не звядзеш у адно цэлае, такое, якім бачылася да сённяшняга дня...

...Надвечар хлапчукі, што пасвілі ў лесе каровы, наткнуліся на чалавека ў чорных, залатаных там-сям штанах, у рыжаватай, не новай ужо, тэнісцы з кароткімі рукавамі, у збітых, з рэштткамі ўсохлай гразі, атопках. Падумалі напачатку, што п'яніца які забрыў сюды, на ўлонне прыроды, у зацішнае, заценёнае месца, наглюкаўся да чорцікаў і зараз, расцягнуўшыся на зялёнай траўцы-мураўцы, бавіць час у прыемным сне. Хацелі ўжо абысці яго, пакінуць у спакоі, а то яшчэ, чаго добрага, усхопіцца, хватане які кол і, бы той іхні вясковы кілун, шалёна кінецца наўздагон. Аднак нехта заўважыў, што побач не валяецца ніводнай цэлай ці пабітай бутэлькі — п'яніцы ж заўсёды пакідаюць каля сябе парожні посуд — і што чалавек той вельмі падобны на некага з іхніх, вясковых.

— Ды то ж Дзімка, ну, той, што студэнт,— прыкленчыў, пільна зазірнуў у твар большы з пастушкоў — Санька Кныш, сын калгаснага каваля Мікіты Кныша. А яшчэ праз секунду ён ажно прысвіснуў, махнуў рукой, паклікаў бліжэй астатніх пастушкоў-хаўруснікаў.— Глядзіце, ён жа пакусаў усе губы і ледзьве дыхае. І адзенне такое... Ніколі ж не бачыў яго ў такім.

— А ты панюхай, ці смярдзіць? — падказаў, выглядваючы з-за Санькавага пляча, не па гадах мардасты, з вялікімі, тырчком, вушмі Гена Ворсік, які пасвіў толькі цялушку, бо старую карову-ялаўку здалі нядаўна на мясакамбінат.

Яго падтрымалі іншыя хлапчукі:

— Ага, панюхай, панюхай, напіўся калі, дык запахне, дзе дзенецца.

Санька доўга чмыхаў, уцягваў носам паветра, нарэшце, устрывожана хітнуў галавой: не, ніколечкі нават не пахне, ні віном, ні гарэлкай, ні чым іншым.

Хлапчукі таксама пасур'ёзнелі, задумаліся. Нехта прапанаваў крануць, павярнуць хлопца на другі бок, мо як раскатурхаецца, мо нічога такога страшнага няма — спіць чалавек, а губы пакусаны, дык ад смагі мо ў сне пакусаў.

З ім не пагадзіліся, і найперш — Санька Кныш.

— А што ледзь дыхае, гэта як лічыць? Не-е-е, тут нешта не тое... — Ён хвіліну памаўчаў і, на правах старэйшага, рашуча загадаў Гену: — Бяжы ў бальніцу, чуеш, і на адной назе каб. А мы тут завернем дзе і тваю цялушку. І скажы там каму, што і як. Хай прыедуць, знойдуць на чым, дзе дзенуцца.

Хлапчукі зноў — які ўжо раз — парадаваліся, што ніколькі не памыліліся, выбіраючы Саньку сваім камандзірам, завадатарам усіх гульняў, забаў, даверылі яму верхаводзіць над сабой.

## 6

## З ДЗЁННІКА АЛЯКСЕЯ ЛАГАЦКАГА

*30 снежня*

...Учора, калі ўсе пабеглі ў кіно, я зноў выцягнуў сшытак і перачытаў тое, што паспеў напісаць. Уга! Дзесяць лістоў накрэмзаў. Ото ж і папачырванеў бы, ото і бяды набраўся б, каб хто вынюхаў маю пісаніну! Цяпер трэба хаваць ды хаваць гэты свой дзённік. А ў нашым інтэрнаце не вельмі што і схаваеш. Праўда, у кніжкі і сшыткі не палезуць (хіба ўжо як выпадкова), а вот тумбачку і чамадан хоць ты замыкай чым. Адзін Румба чаго варты! Усё падбярэ, дзе дрэнна ляжыць, усё на сабе прымерае. Грышка Карпік, мусіць, недарма кляўся і бажыўся, што дырэктараву шапку Румба ўсё ж сцягнуў і некаму загнаў. Інакш адкуль ён набраў бы таго «Казбеку», які курыў два тыдні і хваліўся, што лепшых папярос у цэлым свеце няма.

*31 снежня*

Заўтра Новы год. Многія збіраюцца дадому. А мне куды? Да цёткі? Не, болей яна для мяне не існуе. Зайздрошчу свайму брацiку Дзімку. Як бы хацелася пабыць у іхняй хаце! Што зараз робіць ён? Можа, ёлку маці паставіла, і Дзімка ўпрыгожвае яе чым-небудзь? Можа, сядзяць разам на печы ці ў зале ля цёплай грубкі і выразаюць з паперак цацкі? Гэта ж у Дзімкі зараз канікулы. Цікава, як ён вучыцца ў сваім першым класе? Пэўна, стараецца. Ніколі ж не забуду, як ён радаваўся, цешыўся і партфелем, і пеналам, і сшыткамі, і касцюмчыкам. Усё, усё майму брацiку проста і лёгка. А мне? У чым правініўся я?..

Нанач бярэцца мароз. У інтэрнаце нашым хоць ваўкоў ганяй. Добра, што далі па дзве коўдры. У ложку будзе нічога. Але ж сёння не ляжаш рана. У школе сёння вечар — навагодні. Кажуць, і падарункі нейкія дадуць.

*15 студзеня*

Ужо тое-сёе ўмею. Хітрая, аказваецца, машына —

трактар. Думаў спачатку: што рабіць два гады ў гэтай школе? Хіба ўжо так цяжка навучыцца заводзіць, памяняць там якую запчастку, калі часам зломіцца, хіба так мудра ўпраўляцца з плугамі, сеялкай, бараной? Ажно ж гэтага вельмі мала, каб быць добрым механізатарам. Ого, колькі яшчэ трэба ўсяго ведаць і ўмець! Гэта я толькі зараз зразумеў.

Учора дырэктар спыніў мяне на калідоры і спытаў, як мне тут. Я адказаў, што добра. Ён усміхнуўся і сказаў, каб я стараўся, калі ўжо гэтак прасіўся ў іхнюю школу. А хіба я не стараюся? Ніхто ж, здаецца, не скардзіўся пакуль на мяне.

*15 сакавіка*

Учора, калі ляжалі ў ложках, аж да паўночы гаварылі пра вайну, пра тое, хто дзе быў у той час, хто ў каго памёр ці каго забілі фашысты. Такіх, як я, круглых сірот — некалькі чалавек. А найбольш няма ўсё бацькі, радзей — маці. Ці не ў аднаго толькі Румбы і матка, і бацька жывыя. Аднак бацька яго сядзіць у турме. За што — ніхто не ведае. Спытаў неяк Грыша, дык Румба зуб яму адзін вытаўк. Ведама, гэтакі бамбіза. За ўсіх на галаву вышэйшы. І як яго трымаюць у школе механізацыі? Ён жа і вучыцца не хоча. Але хопіць пра Румбу. Калачуся ад думкі, што адкажу, калі і ў мяне пачнуць дапытвацца пра бацьку. Я ж усюды пішу, што прапаў недзе на вайне. Але які ён мне бацька?! Хоць за адно можна было б падзякаваць цётцы, што выбалбатала, як я на свет белы з'явіўся. Горка і сумна, вядома. Але ў сто, тысячу разоў лепей ужо быць байструком, чым сынам нягодніка, сынам паліцая. Добра ж, што Дзімку звезлі далей ад таго хутара, дзе нарадзіўся. А то знайшоўся б хто і ляпнуў бы і пра бацьку, і пра маці... Страшна падумаць такое... Няхай хоць ён, мой брацік, нічога не ведае. Хай усім паказвае партрэт новага свайго бацькі, хоць і нежывога...

*4 красавіка*

Хутка пашлюць на практыку ў МТС. Ура! Буду памочнікам трактарыста. Цяпер па костачках разбіраем і вывучаем «Націк». Можа, на ім і працаваць давядзецца. Няўжо, няўжо я сам, адзін, буду на полі ўсё рабіць?! Цяжка аж паверыць у такое.

А вясна бярэцца. Снегу няма. Праўда, яшчэ халаднавата, але ўжо і шпачкі высвістваюць у нашым садзе, і сок

бярозавы ўчора пілі (хлопцы поўненькае вядро прывалаклі з лесу), і рэчачка, дзе мы коўзаліся на лёдзе, цяпер як мора стала. Адкуль гэтулькі вады?

Часта думаю пра далёкае адсюль Мошына, тую вёску, дзе жыве мой брацік і яго матка. Так хацелася б зараз да іх! Хоць бы дзянёк пабыць разам, расказаць ім пра ўсё, пра ўсё. Нейк сніў нават, што мяне паслалі туды на практыку, у іхні калгас. Вот здорава было! Я напрасіўся да іх на кватэру, а яны і не ведалі, хто я, толькі ўсё здзіўляліся, дзе і калі мяне бачылі. Забыліся ж, пэўна, што я начаваў у іх. Я часта пад'язджаў да іхняй хаты на трактары, і ўсе выбягалі паглядзець, якая гэта цуда-машына. А нейк (сасніцца ж вось такое!) і сам старшыня калгаса перастрэў мяне на вуліцы і пры ўсіх падаў руку, пахваліў, абяцаў нават прэмію даць...

Шкода, што сон гэты перабіў Грыша Карпік. Перапіў вечарам соку і кожную гадзіну поначы грукаў дзвярыма, бегаў на двор, будзіў усіх.

*26 жніўня*

Ніколі не думаў, што гэтак праславімся. Тады, як прыязджаў нейкі вусаты з раённай газеты (са старшынёй калгаса яны на матацыкле да нас, на поле, завіталі), калі вусаты папрасіў і мяне і Платона Пятровіча Сямашку сфатаграфавацца ля трактара, я спачатку напалохаўся. Думаў: чым жа мы правініліся? Няўжо хочуць нас распякчы, на ўвесь свет зганьбіць? Здаецца ж, стараліся, рабілі нядрэнна. Аказалася, што добра мы папрацавалі. Першымі на ўсю МТС выйшлі! Вось не чакаў такога!

А праз тыдзень Платон Пятровіч, які ездзіў у МТС па запчасткі, прывёз цэлы скрутак газет. Усміхаючыся, разгарнуў адну, паказаў здымак. У-у-ух ты! Як здорава выйшлі! А подпіс я ажно два разы перачытаў. Не ведаў дасюль, што Платон Пятровіч танкістам быў. Цяпер не адстану ад яго, пакуль не раскажа пра сябе ўсё-ўсё. Як мне пашанцавала, што трапіў да гэткага чалавека!

*15 верасня*

Лета мінула нібы адзін дзень. Раней не ведаў, дзе дзець сябе. Цяпер — зусім не тое. На практыцы час ляцеў вельмі хутка. І вось зноў мы разам. Зноў у сваёй школе механізацыі. Няма толькі Румбы. Кажуць, знік, некуды з'ехаў з дому. Ну, і няхай. Ніхто чамусьці не заплакаў. Уражанняў у хлопцаў — на год цэлы гаворкі. Смяюцца

ўсе з Карпіка: сам прагаварыўся аднойчы, што ў калгасе, дзе быў на практыцы, цалаваўся з адной васьмікласніцай.

Вось дык Карпік! Цяпер ён і не рады, што адкрыўся. Праходу яму хлопцы не даюць. Усё рагочуць, усё чапляюцца: «Ну, як, Грыша? Смачна было цалавацца? Ты б не мыўся, можа,— шкода, змыеш усе сляды». Ну і балбатуны! А самі ж таксама ціхенька бегаюць у вёску, калі там якое гулянне...

Учора не стрымаўся, паслаў газету, дзе мы на здымку з Платонам Пятровічам, туды, у Мошына — Вользе Лагацкай. Адрас жа ў мяне запісаны. Цікава, атрымае ці не? І ці здагадаюцца, ад каго? Карцела, аж свярбела рука, напісаць і ёй, і Дзімку некалькі слоў пра сябе. Але не адважыўся. Каму, каму гэта трэба?

*24 верасня*

Другі дзень яшчэ не апомнюся. І радасна, і неяк трывожна. Ні яда ў рот не лезе, ні вучоба. Хлопцы ўсё пытаюць, якое такое пісьмо мне падкінулі, што гэтак развярэдзіла. Ну што, што ім адказаць?! Хіба хто зразумее? Хаваюся ад усіх і ўжо, можа, сто разоў перачытваю, вачам сваім не верачы, тое пісьмо з Мошына. Мне пісьмо з Мошына! Ды яшчэ якое пісьмо! Ад адных вось гэтых слоў «Прыязджай, сынок! Прыязджай саўсім. Будзем з Дзімачкам рады» сэрца з грудзей гатова выскачыць. І як яна здагадалася, што гэта я? Няўжо і тады, як начаваў, пазнала? Ну, пэўна ж, пазнала. Хіба інакш паклікала, назвала б сынам? Сню я ці гэта ўсё праўда?..

*9 лістапада*

Даўно ні радка не мог запісаць у свой дзённік. Не ведаў, на якім свеце знаходжуся. На Кастрычніцкія святы, пасля таго як з Мошына прыйшло яшчэ адно пісьмо, адважыўся, паехаў туды. Як цёпла мяне сустрэлі! Не хапае слоў, каб пра ўсё як трэба расказаць на паперы. Цяпер у мяне ёсць дом, ёсць родныя людзі, якія думаюць пра мяне і чакаюць мяне. Хіба гэта не шчасце?! Я — сын, у мяне ёсць гэткая добрая, гэткая незвычайная маці, ёсць родны брацік! Гэтая жанчына, Вольга Лагацкая, якую я ніяк яшчэ не адважваюся, хоць і вельмі хочацца, назваць мамай, прапанавала мне нават і прозвішча памяняць. Яна сама бярэ ўсё гэта на сябе, абы я толькі згадзіўся. А чаму ж не згадзіцца? Гэта хоць трошкі паможа

забыцца на мінулае, а можа, і зусім выкрасліць яго з памяці. О, як бы хацелася мне гэтага!..

На Новы год я зноў паеду да іх, у сваю новую сям'ю. Толькі б хутчэй бег час.

*20 лістапада*

Толькі што ўсёй групай праводзілі на поезд Колю Лінніка. Паехаў хаваць бацьку.

Жорсткая вайна... Што нарабіла яна і робіць нават зараз? Як плакаў Коля, калі ўчора вечарам прынеслі тэлеграму! Цэлую ноч мы, хто з ім разам у пакоі, не заснулі. Засталіся ж у Колі маці і меншая сястрычка.

Коля даўно ўжо непакоіўся за здароўе бацькі. Не раз казаў, як пакутуе ён ад ран. Відаць, яны і даканалі яго.

Мы вытраслі свае кішэні, усё, што сабралася (а сабралася зусім мала), аддалі Колю. Яму ж так трэба грошы! Цікава, ці вернецца ён у нашу школу? Трэба ж некаму дома памагаць. Але казаў, што вернецца.

*21 лістапада*

Часам мне здаецца, што я вельмі-вельмі доўга жыву на свеце, што мне не чатырнаццаць гадоў, а ўсе трыццаць. Чаму такое адчуванне?

*2 снежня*

Ура! Сёння мы ўсім нашым пакоем балюем. Мне прыйшла пасылка ад... (як хораша, як радасна-шчымліва вымаўляць гэтае слова)... ад мамы з Мошына. А ў той пасылцы, у той фанернай скрыначцы аж два вялікія кавалкі сала, кольца кілбасы, некалькі цыбулін. Няўжо ўсё гэтае багацце мне?! Не, я не мог не пачаставаць сваіх сяброў. Хлопцы знайшлі хлеба. Наеліся ад пуза. Мала і засталося. Але затое ўсе ўбачылі, усе адчулі: ёсць, ёсць каму клапаціцца пра мяне.

«Ма-а-а-ма...» Якое пяшчотнае гэта слова! Аж дух займае ад хвалявання...

*11 лютага*

Усё радзей і радзей бяруся за дзённік. Можа, і зусім кінуць гэты занятак? Няма ж часу. Дый хавацца ад хлопцаў усё цяжэй стала. І так ужо заўважылі, што я нешта пішу. Смяюцца, пытаюць, ці не вершыкі часам «габлюю». Адказваю, што пісьмы дадому пішу — маці, брацiку. А каб хто падгледзеў і пачытаў?

Ага, забыўся ж сказаць: цяпер я ужо не Суднік, а

Аляксей Лагацкі. Новая мая мама пастаралася, каб я ва ўсіх паперках, ва ўсіх дакументах новым сваім прозвішчам пісаўся. Нязвыкла адразу, вядома, але як хораша! Цяпер я ўжо на векі вечныя іхні. Як і яны — мае, мае самыя родныя, самыя дарагія на ўсім свеце. Скончу вось школу і напрамілы Бог буду прасіцца ў іхні раён, у іхнюю МТС. А жыць буду ў Мошына. Няўжо ж не згодзяцца, не пойдуць насустрач?

## 7

Яна памерла надвечар.

Перад гэтым, за суткі, у яе зусім адняло мову, нават губамі не магла болей мыляць. Лёшка амаль не адыходзіў ад яе, хоць ля пасцелі хворай, пачаргова мяняючы адна адну, а то і ўсе разам, сядзелі і Уляна, і іншыя жанкі, ціха, журботна, склаўшы на каленях цёмныя, парэпаныя рукі, размаўлялі між сабой, раз-пораз кідалі позірк на Вольчын твар, які з кожнай гадзінай усё больш і больш мізарнеў, завастраўся.

— Вот горачка, вот горачка,— цяжка ўздыхала, смаркалася ў рудую анучку-насоўку сівая што лунь бабка Параска. Яна прыкандыбала, нягледзячы на свае восемдзесят з хвосцікам, ажно з другога канца вёскі, дзе адзінока — дзеці даўно параз'язджаліся хто куды — жыла ў маленькай, у адно акенца на вуліцу, хатцы.

— Кажуць жа недарма: адна бяда не ходзіць, бяда бяду водзіць,— падтакнула ёй, бліснуўшы цэлым радам новых металічных зубоў, дзябёлая Тэкля Кныш, маці каваля Мікіты.

Яна знарок прыйшла расказаць, як унучак яе Санька, пасвячы ў лесе каровы, наткнуўся на ледзьве жывога Дзімку, пазнаў яго, і добра што, во, пазнаў, хоць той і ў адзенні быў нязвыклым, і выглядаў — ну, хіба мог хто адразу сказаць, што гэта Дзімка, свой, вясковы? Дзе там! Так, бедны, расстроіўся з-за маці — пэўна ж, хто не расстроіцца? — што і самога трасянка якаясь нервовая падкасіла, каб трохі, дык і ў магілку б звяла.

— Божачка-Божа,— гэта ўжо ўздыхае Уляна, жаллíва глядзіць на Лёшку.

— Ты ж, дзіцятка, хоць распытай добра ў той бальніцы, што і як, калі ён да сябе дойдзе.

— Не ведаюць яны пакуль нічога, што з ім,— вяла адказвае Лёшка, стараючыся не глядзець нікому ў вочы.

Яму горай як усім. Ён ужо ведае — пра гэта недвухсэнсоўна намякнулі яму і Максімыч, і яшчэ нейкі, спецыяльна выкліканы з раённай бальніцы ўрач, якія прыязджалі два дні назад, што маці ўжо не жылец на гэтым свеце, што трэба рыхтавацца да самага горшага. А тут, бы насланнё якое, новая бяда — гэтая неспадзяваная, незразумелая хвароба Дзімкі. Вось ужо чацвёртыя суткі ён ляжыць у сваёй участковай бальніцы і яшчэ не акрыяў. Глядзіць на ўсіх пустымі вачыма, нікога не пазнае, не выціснуў да гэтага часу ніводнага слова, амаль нічога і ў рот не бярэ, што яму ні падсоўваюць.

У хваробе брата Лёшка вінаваціць сябе, што ён тады, на дрывотні, не стрымаўся, распусціў рукі. Але ж хіба ён ведаў, што Дзімка так балюча зрэагуе на тую іхнюю сварку? Ды ён жа ніколі не стаў бы яго чапаць, хай бы неяк сам разбіраўся ў сваіх прамашках, не маленькі, соску ж у рот не трэба соваць. А цяпер, во, не хапала адной бяды, дык і другая — як пярун на галаву сярод яснага дня. Хаця які там у яго ясны быў дзень?

Ён ужо валіўся з ног, жанчыны адсылалі яго хоць трохі паспаць, ушчувалі, што нельга ж так убівацца, што тое, што Бог наканаваў — ніхто яшчэ ні разачку не абмінуў, не абхітрыў сваю долечку. Лёшка, аднак, слухаўся і не слухаўся. Ён быццам і ішоў ці ў бакоўку, каб на якую гадзіну кінуцца, не распранаючыся, у ложак, ці лез на вышкі, на сена, але, не паляжаўшы і пяці мінут, падхопліваўся, бы апантаны, набраўшы ў галаву, што маці недзе кліча яго, ёй жа там зусім кепска, бег назад, нахінаўся над ёю, услухоўваўся ў дыханне...

Яна памерла, як ён, Лёшка, ні пільнаваў, у яго адсутнасць. Адвінуўся на паўгадзіны ў кантору, каб атрымаць палучку — дома не было ўжо ні рубля, нават хлеба не ставала за што купіць,— як, ступіўшы на свой падворак, пачуў роспачнае, аж мурашкі пабеглі па целе, Уляніна галашэнне:

— А мая ж ты Во-о-олечка-а-а, а мая ж ты ро-о-одная-я, а мая ж суседачка-а-а-а гаро-о-от-ная-я-я... А закрыліся ж тва-ае-е вочачкі-і-і-і назаўсё-ё-ды-ы...

Лёшка ўжо ніколечкі не сумняваўся ў тым, што здарылася. Ён не пайшоў адразу ў хату, стаяў, збялелы, у сенцах, абапёршыся аб вушак дзвярэй, цяжка, быццам бег невядома колькі, дыхаў, і ўсё роўна не хапала паветра, ажно грудзі гатовы былі вось-вось разарвацца на кавалкі.

Ён, не помнячы сябе, мяў, камячыў, ледзь не рваў у кішэні штаноў грашовыя паперкі, ліхаманкава думаў, як будзе ўсё далей, як жа пасля гэтага пойдзе яго і Дзімкава жыццё. Ён неяк не ўяўляў сябе без маці, без яе ласкавага погляду, без яе заўсёднай турботы за дом, за гаспадарку, за іх абодвух, і гэта яе турбота, яе парады, хай нават маці ляжала і прыкутая да пасцелі, надавалі нейкай упэўненасці, устойлівасці, уладкаванасці, без чаго жыццё — нібыта той карабель у пеністым акіянскім бязмежжы, карабель, у якім па той ці іншай прычыне зламаўся, безнадзейна выйшаў са строю руль.

Увесь той вечар, ноч, наступны дзень былі для яго як цяжкі, невыносна пакутлівы сон-паўзабыццё, хоць, калі ўсё скончылася, калі на магільны горбік кінута апошняя жменька зямлі, ён да кожнай макулінкі помніў і хто што гаварыў, і што рабіў, пра што пытаўся. Нягледзячы, што вяскоўцы, праўленне калгаса ўзялі галоўны клопат на сябе, аднак без яго многа чаго не маглі вырашыць, таму і трымаўся ён з апошняга, сам, у хвіліны нейкай прасветленасці, здзіўляючыся, як яшчэ стаіць на нагах.

Пасля, калі ўсе вылезлі з-за памінальных сталоў, разышліся па сваіх дварах, хатах, заняліся звычнымі справамі, а летам у кожнага такіх спраў — процьма, калі, нічога яшчэ не прымаючы, пайшла дадому і Уляна, настала такая гнятлівая цішыня, ад якой можна было звар'яцець. Ён, спустошаны дашчэнту, сноўдаўся з кута ў кут, не ведаў, дзе і прыткнуцца, да чаго прыкласці рукі. Акрамя болю за маці, якой зараз усё роўна, што ты адчуваеш, што за камень лёг на тваё сэрца, скрэблася ў душы, нібы хто кіпцюры запусціў туды, думка-сумненне: а ці правільна зрабіў, не сказаўшы Дзімку, як параілі ў бальніцы, пра тое гора, якое падпільнавала іх, звяло ў магілку самага дарагога ім чалавека? Ці даруе ён пасля, калі акрыяе, вернецца дадому, што хавалі маці без яго? Нарэшце, а ці не мядзведжую паслугу акажа гэта ўтойванне ягонаму здароўю?

Думкі, думкі, ажно галава пухне... Лёшка прылёг на ложак, дзе яшчэ ўчора ляжала маці, і адразу ж, здрыгануўшыся ўсім целам, падхапіўся. Пасцель здалася халоднай, нібы лёд, нібы матчыны рукі, якія ён цалаваў, калі яна ляжала ў дамоўцы. Чамусьці стала нават вусцішна.

Ён зноў, не чуючы ўжо ног ад гуду, захадзіў з кута ў кут, з кухні ў бакоўку, з бакоўкі ў залу, дзе літарай «П», шчыльненька адзін пры адным, стаялі знесеныя ад

суседзяў сталы, поўныя яшчэ закусі, нават гарэлкі — у такую гарачыню мужчыны і тыя, як ні дзіўна, пілі не ў поўную ахвоту. Захацелася чамусьці адкаркаваць адну з бутэлек і проста з рыла спаражніць яе да саменькага донца, каб пасля хоць на нейкі час выключыцца, забыцца, даць перадышку знясіленым і нервам, і целу. Ён ужо адкаркаваў, панюхаў, прымерваючыся, ці зручна вось так, з рыльца, каўтаць, і змушаны быў паставіць бутэльку назад, на стол — нечакана згледзеў, як паўз вокны мільганула чыясь постаць. «Пэўна, Уляна»,— падумалася вяла, абыякава.

Лёшка, аднак, памыліўся. Гэта была Аксана. Яна нічога не сказала, павесіла на цвіку ў кухні сваю незачыненую сумачку, з якой вытыркалі скруткам нейкія паперы, знайшла чысты шыракаваты ручнік і павязала замест фартуха, пачала прыбіраць, зносіць у кухню брудны посуд, мыць у тазіку — балазе, Уляна, калі паліла ўранні печ, рыхтавала што-кольвечы на памінкі, не забылася нагрэць і вады. Лёшка, гледзячы на Аксану, трошкі адтайваў сэрцам, міжволі мільганула нават: якая дзяўчына! Гэта ж марыць пра такую трэба. І станам, і тварам, і характарам, і талковасцю сваёй — усім удалася. Як жа гэта Дзімка мог пакрыўдзіць яе, нанесці рану, зачмурыць сваю галаву чымсьці ці кімсьці іншым? Цяжка і паверыць у такое. Прыгадалася, як горка, надрыўна-няўцешна плакала Аксана і ўчора, калі, даведаўшыся пра іхнюю бяду, прыбегла ў хату, і сёння, у час пахавання. Нібы аплаквала сваю, родную маці. І зараз, бледная, засяроджана-маўклівая, яна рабіла ўсё як заведзеная, а думкамі была недзе далёка-далёка.

Трохі пазней, праўда, калі прыйшла памагаць і Уляна, Аксана разгаварылася, старалася ўжо растармасіць і Лёшку, бо ці ж можна гэтак убівацца, есці сябе поедам. Каму ад гэтага стане лепш? Нікому. А здароўе сваё ўхойдаеш як плюнуць. Яна знарок, каб даць хлопцу нейкі занятак, вывесці са стану зацятасці, паслала яго прынесці колькі вёдзер вады, хоць пільнай такой патрэбы не было — у сенцах яшчэ стаяў поўны бітон з-пад малака тае вады, наношанай сёння кімсьці з памагатых.

Калі Лёшка, бразгаючы пустымі вёдрамі, пайшоў да калодзежа, Уляна, пільна гледзячы на Аксану, сказала:

— Ты ж бы, Аксаначка, схадзіла мо да Дзімкі. Як жа ён, бедненькі, там? Лёшка казаў, што каліва лепей яму. Але ж як даведаецца, што маці не стала, без яго пахавалі,

то можа адкінуць тая трасца яшчэ невядома на колькі... Божачка-Божа, вот жа звалілася ўсё разам, нібы сурочыў хто... Трэба ж неяк падрыхтаваць хлопца, каб не адразачку агламошыць, бо і здаровы ці вычухаўся б ад такога...

Аксана здрыганулася ўся, стаілася, у нервовым ціку тарганулася на шыі жылка, аднак, адолеўшы мінутную сваю слабасць, каб не заўважыла чаго Уляна, адазвалася:

— Ага, добра. Вядома ж, трэба падрыхтаваць яго... Толькі б мо Лёшка сам гэта...

— Не, табе лацвей будзе,— не пагадзілася Уляна.— Усё-такі ж ты лепей можаш уцешыць. Ведаеш сама...

Першы раз Аксану не пусцілі ў палату, дзе ляжаў Дзімка, як яна ні малёгала ў дзяжурнага ўрача Аляксейчыка, хоць той і ведаў добра дзяўчыну, не раз заходзіў у бібліятэку, каб памяняць кнігу. Недзе з паўгода назад, калі расшырылі іхнюю ўчастковую бальніцу, дабудавалі новае прасторнае крыло, Аляксейчыка перавялі сюды з раённай бальніцы. Ен прыжыўся тут, упадабаў месца і нават наняў цесляў, пачаў ставіць хату, каб забраць у Мошына і жонку з сынам.

— Нельга, зразумейце, ніяк нельга зараз яго турбаваць,— ён спачувальна глядзеў на Аксану, мо трошкі нават больш пільна, чым патрабавалася ў такой сітуацыі.— У яго яшчэ, невядома ад чаго, выключана памяць, і калі вы станеце перад ім, хоць і ва ўсёй сваёй пекнаце,— тут Аляксейчык зноў ласа змерыў дзяўчыну з ног да галавы,— то ён, пакуль такі нядужы, можа спахапіцца, успомніць усё і адразу ж, вядома, спытаць, што з маці, як яна там, дома. А што вы можаце яму сказаць? Утоіце ці будзеце рэзаць праўду-матку? Ну, як? Сказаць, вядома, усё трэба, але калі гэта не будзе ўжо пагражаць яго здароўю.

Довады Аляксейчыка пераканалі Аксану, яна змірылася з думкай, што цяжкую размову з Дзімкам давядзецца адкласці на пасля. З сумкі, з якой прыйшла ў бальніцу, Аксана выняла два загорнутыя ў газету пакункі, бутэльку соку, папрасіла ўсё перадаць хвораму.

— Вось гэта іншы сказ,— пагадзіўся Аляксейчык.— Падсілкавацца тым-сім свежанькім, хатнім яму не зашкодзіць.

— Добра, я яшчэ прынясу,— Аксана зніякавела ад таго, што не магла даўмецца да гэтага часу занесці Дзім-

ку перадачу. Там жа, у бальніцы, вядома які харч — не вельмі ўежны.

Яна зноў пайшла да сябе на працу. Дзень яшчэ не скончыўся, і ці мала хто мог завітаць у бібліятэку з той або іншай нагоды. Летам, праўда, ёй было вальней, чым калі-небудзь, бо з-за работы ў калгасе і дома — а яна, работа тая, набягала адна на адну, не ведаеш нават, як і ўвіхацца, за што хутчэй ухапіцца — чыталі людзі, у тым ліку і наезджыя з гарадоў студэнты, а таксама школьнікі, зусім мала. Зойдуць за цалюткі дзень адзін-два чалавекі, пагартаюць газету, часопіс — і за дзверы. Бывала, так апрыкрае сядзець без справы, што бег бы чортведама куды, абы толькі да людзей. Але бяда ў тым, што памяшканне бібліятэкі прымыкала да канторы калгаса. Сюды заглядвала часта рознае раённае начальства, розныя праверяючыя, і старшыня Маляўка строга наказваў пільнавацца раскладу, адлучацца толькі з яго дазволу.

Цяпер, праўда, Аксану гэта здавальняла. Яна нікуды не імкнулася бегчы, бачыць каго-небудзь. Седзячы ў цеснаватым, але ўтульным, дзякуючы яе рукам і густу, пакойчыку бібліятэкі, робячы што-небудзь, яна з незразумелым дасюль пачуццём радасці і адначасна трывогі прыслухоўвалася да сябе, да таго, як недзе блізенька-блізенька ля сэрца нараджаецца, дае аб сабе знаць новае, таямнічае жыццё. Гэта была пакуль што яе таямніца, нават маці яшчэ нічога не сказала, хоць тая ўжо, вядома, пра ўсё здагадваецца, бо часта з трывогай заглядвае ў вочы, але першая загаварыць — мо баіцца незнарок пакрыўдзіць? — не рашаецца. Ну, і няхай трохі пацерпіць. Даэнаецца пра ўсё, і вельмі хутка дазнаецца.

Не сказала Аксана нікому ў хаце і пра тое, што, нібыта па выкліку на нараду культасветработнікаў, ездзіла яна ў раённы аддзел культуры, папрасілася перавесці ў любую іншую бібліятэку, хоць у самы далёкі, глухі куток. Там, праўда, учынілі допыт: чаму ды што, чаго з такога бойкага, пры дарозе, месца, з такога багатага калгаса, а яшчэ са сваёй радзімы просішся да чужых людзей. І як жыць будзеш? Зарплата ж не вельмі вялікая, а зараз, пад крыльцам бацькі ды маці — чаго лепей хацець.

Аднак, адчуваючы, што можа нічога не атрымацца з яе задумкі, калі ўчынілі такі допыт, Аксана як мага ўхапілася за тую нітачку, якую ёй далі. Яна і сказала там, у аддзеле культуры, што даросламу чалавеку лепш усё ж самастойна жыць, часта гэтае бацькоўскае «крыльца» і псуе, не дае

разгарнуцца, не дае адчуць, што і ты на нешта здатны, можаш адолець сам, сваімі сіламі нейкія цяжкасці, нейкія перашкоды, бо чаму ж іх тады вучылі ў школе і якая яна камсамолка, што спалохаецца глушэйшага трохі сяла.

Той-сёй на яе гарачнасць, на яе слоўны пафас неўпрыкмет пасміхаўся, аднак пярэчыць болей не сталі, назвалі адзін з калгасаў ля саменькай пушчы, дзе ёсць у новай, нядаўна адрамантаванай хаце-чытальні вакантнае месца.

— Калі ўжо так жадаеце вызваліцца з-пад бацькавай апекі,— сказаў круглатвары, з бліскучастай лысінай-спадачкам на макаўцы, сярэдніх гадоў мужчына, якога Аксана чамусьці не ведала, ніколі дасюль не бачыла ў твар, не ведала нават, кім ён тут, у аддзеле культуры,— то іншага нічога не можам прапанаваць. Моладзі там не густа, паўцякала і ўцякае ў гарады, але жыць і працаваць можна. Ёсць побач дзесяцігодка. Да райцэнтра, праўда, далекавата, а горш за ўсё, што вясной і ўвосень з-за бездаражы туды і назад ні праехаць ні прайсці. Так што ў гэты час бацька і маці вас не дастануць, як бы ні хацелі.— Круглатвары падвёў Аксану да сцяны, дзе, непадалёк ад акна, вісела карта раёна, паказаў на невялікую кропку ля саменькай звілістай лініі-граніцы з суседнім раёнам.

Аксана прачытала пад кропкай — «Даўгалессе». Яна, надта не думаючы, дала згоду працаваць там, у тым Даўгалессі. Ёй сказалі напісаць заяву, ехаць у сваё Мошына і чакаць, пакуль не прышлюць паперку.

Вось таму і турбавала, засмучала Аксану, што могуць у любы дзень, у любую хвіліну пазваніць ці прыслаць абяцаную паперку з аддзела культуры з прызначэннем на новае месца, пасля чаго трэба будзе неадкладна пакаваць чамадан. А яна ж ні адным яшчэ словам не перакінулася з Дзімкам і невядома нават, пасля ўсяго, што здарылася і з маці, і з ім самім, калі ўдасца з вока на вока перагаварыць з хлопцам, да якога ў яе па-ранейшаму, нягледзячы ні на якія яго выбрыкі, была глыбокая, неадольная цяга.

Амаль усе наступныя дні яна наведвалася ў бальніцу, насіла Дзімку то слоічак спелых-пераспелых суніц, якіх у гэтым годзе было надзіва багата ў іхнім лесе, то свежай смятанкі, то пячэння, то самаробнага соку. Аксана ведала, што ніхто, як яна, не ўгодзіць хлопцу, бо Лёшку, пэўна, не да ўсіх гэтых прысмакаў, ды і хадзіць яму часта некалі, зноў, каб забыцца на гора, апантана ўпрогся ў работу.

Дзімка ж, перадавалі ёй, адыходзіў, папраўляўся, але

занадта марудна, і ўрачы ўсё яшчэ не пускалі да хворага нікога са сваіх.

Але вось настаў дзень, калі Аляксейчык сказаў Аксане:

— Заўтра прыходзьце з Аляксеем удваіх. Хворы пытаўся ўжо, чаму нікога няма з дому... Толькі, папярэджваю, не адразу абухом па галаве.

Аксана позна ўвечары перадала Лёшку тое, што гаварыў Аляксейчык. Дамовіліся: недзе ў абед — пазней яму, Лёшку, не будзе як — яны сустрэнуцца ля бальніцы, затым зойдуць да Дзімкі.

Ніяк не магла прычакаць таго дня дзяўчына. Лягла нават раней, чым звычайна, каб у сне хутчэй мінула ноч, ды, выспаўшыся, і выглядаць спадзявалася лепей, бо апошні час ад усіх перажыванняў, турбот пабрыдчэў, неяк выцягнуўся, завастрыўся твар. Але наранні, яшчэ за вокнамі толькі пачынала на ўсходзе ружовець неба, яна прачнулася і колькі ні намагалася, не магла болей заснуць. Раней у такі час з пушкі яе не дабудзішся, а зараз... Ляжала з расплюшчанымі вачыма ў сваім маленькім пакойчыку, прыслухоўвалася, як побач за сцяной смачна, узахлёб, храпе бацька, як варочаецца на спружынным матрацы маці, відаць, скора ўстане, пойдзе даіць карову, паліць у печы, гатаваць сняданак, ставіць гаршкі на абед. Вечны, нязменны жаночы клопат. Падумалася: няўжо такі ж несалодкі лёс, як у маці, чакае і яе наперадзе? Няўжо жыццё яе затрэ, падбярэ пад сябе, няўжо не вырвецца яна з яго няўмольных цiскоў, каб жыць прыгажэй, вальней, болей раскута? Колькі, будучы ў дзесятым, дзевятым класах ды і раней нават, марыла: вось вывучыцца, птушкай выпырхне з роднага гнязда, і перад ёю развінуцца такія далячыні, такія абсягі, такім непаўторна-светлым, ваблівым будзе ўсё, з чым яна сутыкнецца. Гэта была непаўторная пара яе першага кахання, першага шчымліва-радаснага пачуцця да Дзімкі, і ўсе тыя свае марылетуценні, усе ўзнёслыя надзеі на будучыню яна звязвала, вядома, толькі з ім, сваім каханым, сваім адзіным на ўсё жыццё...

Першую горкую пілюлю адвержання праглынула яна, разам з няўцешнымі слязьмі, калі правалілася на экзаменах у інстытут. І правалілася на вусным прадмеце, каторы ўсе гады вучобы ў школе лічыла сваім, самым любімым. Гэтым прадметам была гісторыя. Аксана разумела, але нічога не магла даказаць, а тым болей нешта памяняць для сябе, што тут крыецца нейкая несправядлівасць, неда-

рэчнасць, бо многія з тых, з кім яна сутыкалася і ў інтэрнаце, куды пасялілі іншагародніх, і ў інстытуцкіх калідорах перад дзвярыма аўдыторыі, на якіх вісела пісанае ад рукі «Ціха! Ідзе экзамен», і ў вясёлым цяністым скверыку, дзе прысаджваліся на хвіліну-другую, каб перавесці дых, што многія з тых яе равесніц, якім яна лёгка адказвала на кожнае іхняе пытанне па праграме, усё ж здалі хто на чатыры, хто на пяць, прайшлі па конкурсе, а яна, адхапіўшы невядома чаму пасрэдна, забрала назад дакументы і з сорамам вярнулася дадому.

Аксана, нягледзячы ні на што, з гневам, нават крыкам адвергла бацькава ўмяшанне, яго жаданне купіць некага там за мёд, бо ёй было праціўным апусканне да такога, і не таму, што нехта там дазнаецца, а ўся натура яе паўставала супраць нізкага, мярзотнага, несумленнага.

Пазней, калі ўжо разлучыліся з Дзімкам, калі яна ўладкавалася бібліятэкаркай і шчыльней стала сутыкацца з рознымі жыццёвымі праявамі, новыя балючыя ўдары абрынуліся на яе не меней жорстка, няшчадна. Аднак усе цяжкасці, усе часам горкія думкі і расчараванні адступалі, забываліся, калі яна марыла пра іх сумеснае з Дзімкам жыццё. Хай вось толькі хлопец вывучыцца, атрымае жаданы дыплом. Што ж да яе самой, то яна яшчэ нечага дасягне, быць такога не можа, каб калі змірылася з тым, што мае зараз, каб яна не была вартая кахання дарагога ёй чалавека...

Баліць, гудам гудзе галава ў Аксаны, хочацца заплюшчыць вочы, яшчэ трохі падрамаць, але не ідзе сон, хоць ты плач. Зноў да горла падступае камяк, даўка перахоплівае дыханне, калі з нядаўняга мінулага вяртаецца дзяўчына ў свой сённяшні дзень. Хіба яшчэ год назад думалася, што і самы апошні яе козыр, які грэў і суцяшаў, выбіты з рук, і яна, спустошаная і разгубленая, застанецца ні з чым? Што ж дасць ёй гэтая сённяшняя размова з Дзімкам? Як павесці сябе перад ім, каб не паказацца няшчаснай, не расчуліць яго сваім няшчасцем і не нарабіць яшчэ большых памылак, за якія ці адкупішся калі?

Дзімка, калі яны з Лёшкам зайшлі да яго ў палату, быў якраз адзін. Сядзеў на засланым байкавай коўдрай ложку, глядзеў у акно, якое выходзіла на поплаў,— там, у метрах якіх ста ад бальнічнага плота, пасвіліся коні, і ўвагу яго больш за ўсё, відаць, засяродзіла гарэза-жара-

бё з вялікай белай плямай на лобе, гэткімі ж бялюткімі шкарпэткамі вышэй капытцаў. Жарабё выбрыквала, вырабляла галаваломныя фінты вакол маці — гладкай, з блішчастай каштанавай поўсцю кабыліцы, якая спаважна скубла сабе і скубла, зрэдку, праўда, косячы вокам у бок свайго неразумнага дурасліўца, як бы кажучы: «Ну, годзе ўжо, годзе, дурненькі. Трэба ж і меру знаць. Так жа і галаву скруціць не штука». І нельга было не залюбавацца, не ўсміхнуцца добразычліва, бачачы такое.

Хворы не звярнуў увагі, што да яго зайшлі, ніколечкі не зрэагаваў на скрып дзвярэй, пэўна, думаў, што гэта напарнік па палаце, пажылы дзядзька з суседняй вёскі, які, перад выпіскай ужо, часта выходзіў у бальнічны двор або на калідоры смяшыў санітарку, медсясцёр. Лёшка кашлянуў, і толькі тады Дзімка адарваў погляд ад акна, павярнуўся і... як маладзенькая дзяўчына, калі яе заспелі за нейкім далікатным, не для старонняга вока, заняткам, набрыняў чырванню.

— Ну, здароў,— паклаўшы на тумбачку сетку з прадуктамі, знарок бадзёра павітаўся Лёшка, быццам бачыліся яны не пазней учарашняга, быццам нічога не адбылося між імі, не было смерці маці, не было ніякай хваробы.

Лёшка баяўся, што брат будзе яшчэ злаваць на яго за аплявуху. Разам з тым брала сумненне, асабліва апошнія дні: ці з гэтай прычыны Дзімка захварэў? Падумаеш, пад гарачую руку магло і не такое здарыцца. Маглі ж, як не раз бывала і раней, павалтузіцца, але ж усё тое, ранейшае — крыўды, спрэчкі, дробная лаянка,— усё тое неяк хутка згладжвалася, забывалася, ніколі ні ў аднаго, ні ў другога не адкладвалася недзе ў запас, каб у патрэбную хвіліну выняць як козыр. Не, гэтага не было. Дык што ж зараз так сцебанула хлопцу па нервах, змусіла злегчы ажно ў бальніцу, і не проста злегчы, а вось колькі ўжо часу, амаль да сённяшняга дня, знаходзіцца ў незразумелым бяспамяцтве? Думалася чамусьці пра ўсякае, толькі не пра дзённік, які трапіў Дзімку на вочы. Так ці інакш, гэта высветліцца, вылезе наверх, і яно, што б там ні было, здароўю яго болей не пагражае, яно ўжо зрабіла сваю чорную справу. А вось што тычыцца маці... Як жа сказаць яму пра ўсё?

Дзімка, аднак, сам прыйшоў на дапамогу. Бачачы, якім змрочным, змарнелым выдаваў Лёшка, ён ціха, бы сам сабе, сказаў:

— Вось і засталіся мы з табою ўдвух... Шкода, што я не мог быць на пахаванні. Бедная мама...

— Ты ведаеш пра ўсё? — Лёшка быў уражаны пачутым, ад неспадзеўкі нават прысеў на ложак.

Дзімка кіўнуў галавой, крыху адвярнуўся, каб схаваць слёзы, якія нагарнуліся на вочы.

Аксана не ведала, як ёй быць. Яна ўжо лаяла сябе, што прыперлася разам з Лёшкам. Трэба было б ёй трохі счакаць, хай бы браты адны, без нікога, выгаварыліся, аблегчылі трохі душу. А так... Яна тапталася ля парога, адчуваючы сябе лішняй, але і выйсці, шмыгнуць у калідор не ставала ніякіх сіл. Ёй няўцерпна хацелася кінуцца да Дзімкі, прытуліцца да яго грудзей і ўзахліп разам паплакаць. Але нешта, нягледзячы на жаласлівасць, стрымлівала яе. Чыйсьці голас знутры як бы казаў: не лезь сляпіцаю, хіба не бачыш, што яму зараз не да цябе, не да тваіх слёз, тваёй жаласлівасці, не да высвятлення адносін. Наведаеш пасля, дай яму трохі аддыхацца, апамятацца, стаць цвёрда на ногі.

Неўпрыкмет яна выйшла, ціха прычыніўшы за сабою дзверы. Хлопцы не заўважылі гэтага. Яны нейкі час яшчэ сядзелі, бы скамянелыя. Першы спахапіўся Дзімка.

— А дзе ж Аксана? — на твары яго, бледным і схуднелым яшчэ пасля хваробы, была разгубленасць, нейкая вінаватасць, якой Лёшка дасюль у ім не заўважаў.

— Нічога, прыйдзе,— сказаў упэўнена.— Амаль кожны ж дзень бегала, насіла перадачы.

— Праўда?! — міжволі вырвалася ў Дзімкі, і ён адчуў, як паўзабытая ўжо, цёплая і пяшчотная хваля накацілася на сэрца.

Ён выглянуў у калідор: думаў, мо Аксана дзе побач, але ў калідоры было пуста. Вярнуўшыся ў палату, сеў на ложак побач з братам.

— Там сёе-тое прынеслі, пакладзі куды,— каб не маўчаць, кіўнуў Лёшка на сетку.

— У мяне і так ужо ўсё забіта, няма дзе дзяваць.— Дзімка адчыніў тумбачку, паказаў, колькі ў яго ўсяго набралася, чаго ён не ў сілах з'есці.— Так што болей не нясі. І Аксане скажы.

— Ты сам ёй скажаш,— Лёшка падняўся, пахадзіў трохі па палаце, глянуў на ручны гадзіннік. Стрэлкі паказвалі палову трэцяй.— Ведаеш, я пайду,— ён падаў Дзімку руку.— Папраўляйся хутчэй. Нечага тут вылежвацца.

— Я што — я хоць сёння гатовы дадому.

Лёшка спахапіўся, што сказаў трохі не так, паправіўся:

— Ды ты не гарачыся. Тут, брат, вышэй бацькі не скокнеш. Урачы ведаюць, што і як. Сабаку з'елі.

— Ат, усялякія ўрачы,— зноў пазмрачнеў Дзімка.— Маму ж, во, не ўратавалі.

— Мы самі кепска шанавалі,— вырвалася ў Лёшкі, і ён зноў пашкадаваў, што распусціў язык, ляпнуў зараз і такое.

Дзімка скалануўся, пасля неяк адразу звяў, вочы зноў затуманіліся, счужэлі.

— Ідзі,— сказаў Лёшку бы не сваім голасам.— Мне паляжаць трэба, нешта галава кружыцца... Ды і ўрач скора загляне, лекі прымаць пара.

Назаўтра Дзімку пагоршала. Аляксейчык зноў ізаляваў яго, прымусіў ляжаць, і Аксану, якая прыйшла ўжо адна, папрасіў дзён колькі пачакаць, не трывожыць хворага.

— А што з ім? — занепакоілася дзяўчына. — Што ж гэта такое? Было ж, здэцца, лепей.

— Усё і будзе найлепей,— супакоіў Аляксейчык.— А пакуль... — ён развёў рукамі.

Сустрэцца, аднак, ім не давялося. Лёс распарадзіўся інакш.

Амаль на сконе таго дня, пасля няўдалага візіту да Дзімкі, калі Аксана падшывала газеты, парадкавала часопісы, яе паклікалі да тэлефона. Дзяўчына здагадалася, сэрцам адчула, што мог азначаць гэты званок. І не памылілася. Сапраўды, званілі з аддзела культуры. На другім канцы провада голас круглатварага — яна добра запомніла яго манеру гаварыць і зноў падумала, кім ён там, у аддзеле культуры,— перадаў, што просьба яе задаволена, падпісаны ўжо загад і заўтра, ну, сама пазней паслязаўтра, трэба быць у Даўгалессі. Там спецыяльна чакаюць, каб перадаць дакументы і ўсю кніжную гаспадарку ў новыя рукі, бо той, ранейшы, чалавек назусім выязджае з Даўгалесся.

— А Маляўка, ну, наш старшыня калгаса, ведае? — спытала Аксана.

Круглатвары пацвердзіў:

— Вядома. З ім загадчык гаварыў. Разам намецілі і кандыдатуру на ваша месца...

Аксану, калі павесіла трубку, кальнула: «Бач, за маёй спіной і перагаворы ўжо вялі. Маляўка ж — ані слоўца,

быццам я тут зусім чужая, нічога не рабіла, не агітавала, не бегала на фермы, на поле, не цягала на сабе кніжкі, часопісы, каб людзям як не на сподачку паднесці, пачытаць, расказаць. Былі ж удзячныя. А зараз, калі такое... Ані слоўца».

Пасля супакоіла сябе, зноў падумала, што, як бы там ні крыўдна і ні балюча было, яна зрабіла правільна, напрасіўшыся ў другое месца. Ведала, што чакае яе наперадзе... Але ведала і сябе, што нічога не пабаіцца, вынесе, выцерпіць. Шкода толькі, што з Дзімкам так атрымалася, нават пагаварыць не выпала. Але так ужо, відаць, трэба. Не наканаваў ёй, пэўна, лёс шчасця. Недзе падсвядома расла і мацнела ў душы перакананасць, што яны не хутка ўжо сустрэнуцца, што дарогі іхнія разыходзяцца надоўга, а мо нават і назаўсёды...

Турбавала Аксану і сённяшняя размова з бацькамі. Уяўляла, колькі крыку, енку, а матчыных і слёз будзе, калі яна скажа пра цвёрдае сваё рашэнне. Але і да гэтага, у рэшце рэшт, яна была ўжо гатова, не раз абдумвала ўсе варыянты сваіх довадаў, асабліва для маці, каб не ўвагнаць яе ў хваробу, бо і так жа ёй хапае...

Яна пачала штохвіліны выглядаць у акно, каб упільнаваць Маляўку, папытаць, як жа ёй быць з перадачай бібліятэкі.

Мо яны з загадчыкам абмазгавалі, што і як? Чаму ж ёй нічога па тэлефоне не сказалі? І ці можна за дзень, у пажарным парадку, зрабіць усё як трэба? Упікнула сябе, што не здагадалася папытаць у круглатварага.

Вырашылася ж усё зусім проста. Маляўка — Аксана яго так і не ўпільнавала — нечакана падрулiў на сваім «газіку» да саменькага ганка бібліятэкі, зайшоў, паздароўкаўся, падаў руку, чаго раней ніколі не рабіў. Аксана адразу здагадалася: будзе размова пра яе. Насцярожана чакала, што ж ён скажа. Мо ўпікаць пачне, што не параілася спачатку з ім і ні з таго ні з сяго ўцякае са сваёй вёскі, з калгаса, дзе людзей, асабліва моладзі, і так кот наплакаў. Аднак Маляўка і не думаў упікаць. Ён быццам нават з разуменнем аднёсся да намеру дзяўчыны, сказаў, што яму ўсё вядома, не адны расказвалі, як нясоладка жывецца ёй з такім крутым бацькам, што, можа, і правільна робіць, вырашыўшы пажыць самастойна, паспытаць свайго хлеба. Многія ж надта ўжо баяцца адарвацца ад мамчынай спадніцы... «Ведаў бы ён сапраўдную прычыну»,— горка падумала Аксана, а ўголас спытала:

— Мне наказалі заўтра ці паслязаўтра быць на новым месцы. А як жа̂ быць з бібліятэкай?

— Найшла аб чым непакоіцца,— хмыкнуў Маляўка.— Едзь спакойна. Ключы ж здай бухгалтару. А спатрэбішся — ведаю, дзе шукаць, прышлю машыну, прывязём на дзень-два, колькі там трэба. І сваіх заадно адведаеш.

Дзяўчыну гэта задавальняла.

І ўжо на другі дзень як не ўсё Мошына гаварыла: Аксана Караблёва ўцякае з дому, едзе ў няблізкі свет. Па-рознаму талкавалі гэтую навіну. Адны жанкі спачувалі ўчарнелай, адразу быццам на пяць гадоў пастарэлай Марылі, казалі, ківаючы галовамі, што такі ўжо зараз век, што дзеці без аглядкі, часам на злом галавы, ляцелі б чорт-ведама куды, абы толькі з вачэй, там жа недзе па-за домам саладзей, сама манка з неба сыплецца, толькі рот паспявай разяўляць; другія, наадварот, суцяшалі, спасылаючыся і на сваіх дзяцей, даводзілі, што іх дзела маладое, не век жа ім, дзецям, таптаць гэтую гразь, дарма што самім ім, бацькам, усю жытку давялося таптаць гразь, не ведалі ніякага продыху, нідзе не былі, не бачылі нават, які ён, свет.

Змрочны быў і Аўдзей. У ім таксама быццам што надламалася ўсярэдзіне, цэлы дзень, не пайшоўшы на работу ў калгас, тупаў у сваім падворку, бясконца курыў, нешта думаў. І думкі тыя, відаць, былі цяжкія, быццам камяні-валуны няспынна варочаліся ў яго галаве.

Дзімка ж дазнаўся пра ўсё ці не апошні.

Амаль два тыдні ў яго ніхто не быў. Лёшка разоў колькі наведваўся ў бальніцу, але ў палату не пускалі, хоць і перадавалі, што хвораму лепей, ідзе на папраўку.

І вось настаў дзень, калі браты зноў убачыліся. Дзімка ляжаў зараз у другой палаце — большай, святлейшай, але і ложкі там мясціліся гусцей.

Хлопцы выйшлі ў калідор, селі на канапку — Дзімку дазвалялі ўжо выходзіць і ў двор, бавіцца трохі на сонцы, свежым паветры.

— Калі ж выпішуць? — спытаў Лёшка, бачачы, што хворы з таго, першага візіту, відавочна падужэў, пакруглеў і пасвятлеў у твары.

— Не ведаю. Сказалі — яшчэ трэба трохі паляжаць.— Дзімка занепакоена глядзеў на брата, і Лёшка здагадаўся, што гэтак непакоіць таго. «Ну, вядома ж, хоча ведаць, чаму не прыходзіць Аксана. Як жа яму сказаць?» Падумаў, што ўтойваць няма сэнсу, усё роўна калі не ён,

то хто-небудзь іншы скажа. Гэта ж мястэчка, тут усё пра ўсіх ведаюць, нават і ў бальніцы.

— А Аксаны няма ўжо ў Мошыне. Табе хіба не пакінула ніякай запіскі?

Дзімка, не хаваючы сваіх эмоцый, выгукнуў:

— Як?! А дзе ж яна?!

— А мне скуль вядома? Казалі, перавялі некуды. Таксама бібліятэкаркай. Неяк нечакана ўсё...

Навіна, якую прынёс старэйшы брат, цяжка адазвалася ў Дзімкавым сэрцы. Яму ні адной хвіліны не хацелася заставацца болей аднаму. Пакуль Лёшка сядзеў у яго, ён аббегаў каго толькі можна, напрамілы Бог просячыся дадому, аднак дарэмна стараўся. Ніхто і слухаць яго не хацеў.

Лёшка пайшоў, таксама засмучаны няўдачай выбавіць брата з бальніцы. Не ведаў ён, што адмочыць, які фокус выкіне малодшы праз колькі гадзін. Назаўтра пра гэты фокус ведала не толькі Мошына, але і мястэчка, дзе знаходзілася бальніца. Людзі, ссумаваўшыся па вясёлым, шчыра радаваліся магчымасці парагатаць, парваць жываты. Праўда, як і заўсёды бывае ў такіх выпадках, усё значна перабольшвалася, кожны стараўся, у меру сваіх здольнасцей, дадаць нешта такое, чаго ніхто яшчэ не чуў, каб ужо напавал зваліць з п'едэстала папярэдняга перасмешніка і тым самым узнесціся туды самому, заваяваць славу лепшага веселуна і зубаскала.

Ніці ж усёй той гісторыі і яе шматлікіх варыяцый вялі ў падворак і хату Аўдзея.

Найбольш праўдзіва, прыпёртая да сцяны сведкамі, якія бачылі ўсё, расказвала пра гэта жанкам, таксама пасмейваючыся, сама Марыля.

— Падаіла я ўжо і Ласку сваю, адна ў кухні поркаюся, святла яшчэ не паліла, толькі ж змерклася, чаго ж дарма паліць, ажно чую: улятае нехта, бы гіз яго ўкусіў, у хату. Абярнулася і... Божухна мілы! Ногі самі падкасіліся. Рыштант, далібог, рыштант, думаю, знекуль збег. Штаны паласатыя такія, ну, як сяннік усё роўна, такая ж расхрыстаная на грудзіне і кохта, ну, мо піжама. У кіно ж не раз бачыла, як рыштанты, ці з гэтага, як яго... дома шалёных, такія носяць. Караву-у-ул! — крычу штосілы, а голасу таго няма, як знямела ўсё ўсярэдзіне. Божа-Божа, думаю сабе, вот мая і смертанька па мяне прыйшла. Зараз пырне нажом ці за горла хватне, і капцы будуць. Зноў сілюся закрычаць, пазваць Аўдзея, недзе ж ля хлява

забавіўся ці мо на вуліцу выйшаў. А рыштант той, адсопшыся, дый кажа: «Чаго вы, Марыля Восіпаўна, так злякаліся, так спалатнелі, калатнеча вас нейкая ўзяла? Хіба ж не пазналі? Я ж — Дзімка. Я ж толечкі, во, з бальніцы. Не пускалі, ліхаімцы, дык я і скокнуў у акно, тры кіламетры з мястэчка бег, больш полем, поплавам, каб не бачыў хто». А чаго табе трэба, усё яшчэ не даючы веры, што гэта і праўда Дзімка, пытаюся ў яго. «Аксана дзе?» — пытаецца ён. Во, думаю, прыперла, ажно з бальніцы ўцёк. А хлопец стаіць, сам ужо, відаць, не рады, што гэтак напалохаў. Адказу майго чакае. Я й узяла, дала яму той канверт, дзе новы адрас Аксанін напісаны, заўчора ж ужо другое пісьмо мела ад яе. Піша, што добра, добра ўладзілася, нават нейкі пусты пакойчык у калгасным доме адшукаўся. Як ні кажы, а свой ужо вугал мецьме...

Так ці прыкладна так расказвала Аксаніна маці, калі ўжо надта насядалі на яе цікаўныя. Але далёка не ўсё расказвала. Нікому не прызналася Марыля, колькі слёз выплакала, пакуль атрымала тое першае, затым другое пісьмо ад дачкі, чаго толькі не перадумала бяссоннымі начамі. Яна ўжо здагадалася, якая бяда пагнала дачку з роднага парога... А доччына бяда, доччын боль — для маці ўдвая бяда, удвая балюча. Яна ж бачыла, не сляпая мо, як тузаецца, мучыцца крывінка яе родная, радасць яе адзіная. Здэцца, магла б — усё ўзяла б на сябе, каб толькі аблегчыць яе пакуты, думкі чорныя яе развеяць. Хто, хто мог падумаць, што такая гожая, разумніца, з характарам такім вось залатым — і будзе няшчасная?! Вунь многія сяброўкі яе і замуж удала павыскоквалі, і вучацца недзе, хоць у школе ні прыгажосцю, ні ведамі не вылучаліся і ўвогуле ні ў чым зорак з неба не хапалі. А глядзі ж — шчасце не абмінула іх, хай ім усё добра будзе. А Аксане як хто наканаваў цярпець, чакаць нечага, як цярпела ўсё жыццё яна сама, а калі і жыла, то толькі дзеля дачкі.

Вядома, ва ўсім, што здарылася з Аксанай, яна, маці, вінавціла тога пустадомка — Дзімку. З самага пачатку іхніх любошчаў яна казала дачцэ: не звязвайся з ім. Ну, хіба мала іншых хлопцаў, якія ўздыхаюць, млеюць ажно па ёй, а яна выбрала як не самага горшага. Але Аксана, бы аслепленая ўсё роўна, і слухаць не хацела. І ў школе, калі яшчэ вучыліся разам, і ўвесь той час, пакуль Дзімка ў інстытуце,— глядзі ж, паступіў неяк! — аціраўся, дачка нікога іншага і прызнаваць не хацела, ні на крок не падпускала да сэрца. З часам усё ж змірылася з доччыным

выбарам і яна, Марыля. Думалася ўжо весялей, калі бачыла, што дзеці сталеюць, планы на будучыню сумесна строяць. У кожны Дзімкаў прыезд, ці на святы, ці на канікулы, Аксана як ружа, як кветачка тая расцвітала... А цяпер, што ж асталася цяпер і ад Аксаны, і ад радасных яе спадзяванняў, і ад усяго іхняга вялікага кахання?! Пустата асталася, і больш нічога. Хіба ж яна, маці, не казала, не папярэджвала? Але што ты зробіш?.. Яна не хацела ка́паць дачцэ на душу, бо ведала, што гэтым не паможаш. Не капала, не лезла з допытамі і тады, калі закралася падазрэнне: Аксана носіць пад сэрцам дзіця. Праўда, каб гэтае падазрэнне перарасло ў поўную перакананасць, то не сцярпела б, папытала б і строга папытала б, як можна быць такой дурніцай, так сябе знячлавіць. Яна ўяўляла, што будзе, які вэрхал учыніць бацька, калі ён западозрыць што. Сэрца ажно захлыналася ад жаху. Цяпер яна маліла Бога, каб у Аксаны з Дзімкам наладзілася, хай бы, во, і пажаніліся, раз так хочуць.

Калі ж памерла Вольга, а Дзімка захварэў, злёг у бальніцу, Марыля ўжо з нейкай шкадобай пачала думаць пра беднага хлопца, бы прыпісвала да сваёй сям'і, сама падахвочвала дачку, каб ішла часцей да яго, несла што смачнейшае.

З ад'ездам Аксаны з дому яна зразумела, што ў дачкі нічога не выйшла. А тут Аксана, седзячы, можна сказаць, на чамадане, і зусім даканала: прызналася ва ўсіх сваіх грахах, пра якія маці пакуль толькі здагадвалася. Не магла, не хацела Марыля болей і думаць пра Дзімку, лічачы яго безнадзейным чалавекам, на якога ніяк нельга палажыцца, чалавекам, які задурыў дзеўчыне галаў, скалечыў, лічы, яе маладое жыццё...

І можна зразумець Марылю, яе, за першым сполахам, нейкую хоць невялікую іскрынку радасці і надзеі, калі ўбачыла яго, Дзімку, у сваёй хаце. Яго разгубленасць, несамавіты выгляд, яго, нарэшце, як не арыштанцкі адзетак, у якім ён не пасароме́ўся вырвацца з бальніцы, казалі пра тое, што хлопец на апошнім узводзе, што нешта ўсё ж да яго дайшло, абудзіла хоць кропельку сумлення. Таму з такой лёгкасцю на сэрцы і дала яму доччын адрас: хай бярэ, годзе ўжо выдурняцца, нашкодзіў, бы той кот, дык мей жа мужчынскую годнасць паправіцца, зрабіць тое, што і належыць рабіць у такім выпадку — бяжы да яе, вось так, як і сюды прыбег, шукай, станавіся на калені, прасі літасці, бо яна ўсім дзеля цябе ахвяравала, а ты...

А ты, шкадлівец, што нарабіў? Яшчэ паглядзім, ці даруе табе Аксана за слёзы, за бяссонныя ночы, за горкія, бы палын, свае думкі...

## 8

## З ДЗЁННІКА АЛЯКСЕЯ ЛАГАЦКАГА

*10 жніўня*

Цэлы век не браўся за гэты свой дзённік. Я ўжо і забыўся нават, што ён у мяне ёсць. Як запраторыў, схаваў разам з канспектамі (яшчэ са школы механізацыі) на гарышчы ў скрыні, калі прыехаў у Мошына, з таго часу і не запісаў ні радка. Колькі ж гэта мінула? Уга, больш чым дзесяць гадоў! А яны, гады тыя, столькі ўмясцілі ў сабе ўсяго, што цяжка ўспомніць хаця б галоўнае. Адслужыў у арміі, атрымаў ордэн за працу ў калгасе, прыжыўся ў новай сваёй сям'і... Здаецца, і не было дзіцячага дома, не было галодных дзён, не было чорных думак пра сябе.

А што ж цяпер? Усё гладка, усе раны зажылі, зацягнуліся тлушчыкам, на сэрцы, на душы — мёд, і болей нічога? Не, не і не! У соты, тысячны раз пераконваюся, якое складанае жыццё, асабліва калі ўсё болей думаеш пра яго, глыбей капаеш...

*25 жніўня*

Бяда з гэтым Дзімкам. Нешта ў ім памянялася, як пажыў у вялікім горадзе, адарваўся ад дому. Вучыўся ў школе — болей памагаў што зрабіць, болей было шчырасці, дабрыні. Цяпер, асабліва пасля трэцяга курса інстытута, яго нібы хто падмяніў. Ён і нібы не ён. Я цэлы дзень у полі, маці таксама не разгінае спіны — ведама, гэтулькі летам клопату! — а Дзімка ўсе канікулы лынды біў. Калі і зрабіў што, дык і то па падказцы, па прынуцы. А паспрабуй што скажы! Закапыліць губу і маўчыць. Горай яшчэ тое, што маці яго абараняе, зусім спесціла. Як жа — вучыўся ж цалюткі год, сушыў мазгі, зусім дзіцятка змарнела, хай жа хоць цяпер волечкай пацешыцца...

*28 верасня*

Трохі палягчэла. Можна пазней пайсці і раней трохі вярнуцца са сваёй работы... Ухадзіліся і дома. Сена Зорцы ёсць, бульбы таксама, хоць і не вельмі ўрадзіла, накапалі паўсклепа. Хопіць.

Шкода, што маці нешта нядужыцца. Кажа, шэрхнуць левая рука і нага. Што ж гэта такое?

*15 кастрычніка*

Маме чамусьці ўсё горай становіцца. Не можа нагнуцца, не можа нічога рабіць. І ўсё адно ж кешкаецца, нешта ёй дрэнчыць. Не хоча спакойна паляжаць. Кажа, што нічога, пройдзе, а заляжышся — яшчэ горай будзе. Зразумей ты гэтых матак?! Касцьмі ляжа, а не палечыцца, не пашануе сябе...

А ўчора гаворку завяла... Вот, як добра было б, каб дачакацца ўнука ці ўнучачкі. Як бы цешылася на старасці, як бы любіла! І гаспадыню маладую як добра было б бачыць у хаце. Бедная мама... Ну што, што я магу зрабіць, што не выходзіць з галавы Нюра? Хіба ж я вінаваты? Хіба ж загадаеш сэрцу? Часта бачу яе ў сне. Дзе яна зараз, што робіць? Няўжо ж не падасць ніякай весткі?..

*10 лістапада*

Дзімка не прыехаў на святы, і мама зусім змаркоцілася. Цяпер яна ляжыць у ложку, не падымаецца. Проста на вачах марнее. Заікнуўся пра бальніцу, дык і слухаць не хоча. Але неяк угавару. Цяпер жа не так многа тае работы. Ухаджуся сам.

А чаго ж Дзімка не прыехаў? Пісаў жа раней, што будзе. Што здарылася? Можа, грошай на білет няма? Дык аказаўся б...

Сёння, ідучы з работы, сустрэў на вуліцы Аксану: Як яна глядзела на мяне! Думала, што скажу што-небудзь пра Дзімку. А што, што я ёй скажу? Сам жа не ведаю, чаму ён не прыехаў.

*7 снежня*

Пуста і неяк вусцішна аднаму ў хаце. Як не хапае мамы, яе рук, нават яе погляду, яе добрага слова! Вось ужо трэці дзень, як адвёз яе ў нашу раённую бальніцу. Яшчэ не ведаю, які дыягназ, але нешта вельмі цяжкае. Нават мяне паўшчувалі, што гэтак зацягнуў, гэтак позна прывёз. Нехта нават, помню, кінуў: «Ну і сынкі цяпер пайшлі! Маці на ладан дыхае, а ім хоць бы што...» Ад гэткіх слоў, балючых і жорсткіх, можна было ашалець, у пельку кінуцца. Вядома ж, вінаваты я, кругом вінаваты.

Трэба было не слухацца, адразу ж, як стала маме дрэнна, нема крычаць, клікаць на помач. А цяпер што ж: сцісні зубы і маўчы, малі толькі Бога, каб усё абышлося, усё стала па-ранейшаму.

Заўтра старшыня наш едзе ў райцэнтр на нейкую нараду. Я з ім таксама напрасіўся. Трэба ж наведаць маму, завезці ёй чаго.

*10 снежня*

Галава пухне ад думак, асабліва вечарамі. Удзень, калі работа, калі і тое і гэта табе трэба, час бяжыць скора. А вось вечары, ды яшчэ зімою — нібы вечнасць цэлая. Ісці ж нікуды не хочацца. Не хочацца, каб лезлі ў душу з роспытамі, як ды што з маткай. Хіба я сам ведаю? Урачы ж, як ні пытаўся, нічога толкам не сказалі, нічым не суцешылі.

Зноў адзін, як некалі... Ноччу пляцецца чортведама што. Ужо некалькі разоў сніў Славіка. Але цяпер жалезная аграмадзіна маставіны з шалёнай хуткасцю насоўваецца на мяне, вось-вось стукне, раструшчыць галаву... Прачынаюся ў халодным поце, пасля доўга не магу заснуць, малю Бога, каб хутчэй тая раніца.

*23 снежня*

Дзімка прыслаў пісьмо. Нарэшце-ткі... Во свінтус! Ён, бачыце, не мог прыехаць на Кастрычніцкія святы, бо ў іх на курсе складчына была, яны весяліліся, і яму няёмка адшывацца ад кампаніі. Нічога сабе апраўданне! Але добра, што хоць шчыра. Пытаецца, што з маці, ці надоўга паклалі ў бальніцу. Ведаў бы я сам!

Дзімка піша, што будзе дома толькі на зімовых канікулах. Хутчэй бы тыя яго канікулы! А то няма з кім душу адвесці. Ды і зрабіць што паможа. Цэлы ж дзень на працы, якраз торф возім на поле, і прыходжу дадому, калі ўжо цямнее, а тут і сечкі нарэж, і дроў накалі, і ў склеп па бульбу схадзі, і вады нанасі, і Зорку напаі-накармі, і ў грубцы напалі, і вячэру згатуй, і ў хаце трохі прыбяры... І хіба ўсё пералічыш? Як добра было за мамінай спіной! Бедная, бедная наша мамачка...

*2 лютага*

Адбыў свае канікулы, паехаў Дзімка. Я зноў адзін, адзін, адзін.

У той дзень, як яму, Дзімку, сесці на поезд, мы пайшлі

ў бальніцу. Як абрадавалася мама, убачыўшы нас разам! Кажа, што ёй ужо палягчэла. А мы ж бачылі, што нікалечкі ёй не лепей. Гэта яна так бадзёрылася. Калі развіталіся, мама так глядзела на нас, нібы мы анёлы якія, з самога неба спусціліся на гэтую зямлю. Чым, ну чым жа ёй памагчы?

А тут задаў задачку і Дзімка. Па двух прадметах адхапіў на экзаменах тройкі. Цяпер будзе без стыпендыі. Хацеў у сельсавет бегчы, прасіць даведку, што бацька на фронце загінуў, і па гэтай паперцы выкленчыць сабе стыпендыю. Але я не дазволіў. Ведаў бы ён, хто яго сапраўдны бацечка, то навекі адпала б ахвота бегаць па даведкі... Але крый Божа і ўведаць калі-небудзь такое. Ну, у чым, у чым яго віна? Хіба што вучыцца трэба як мае быць, а не біць лынды. Але што зробіш?.. Цяпер давядзецца неяк хітраваць, каб не дайшло да маці (прасіў жа, кляўся, што выправіцца) і выкрайваць са свайго заробку тры-чатыры чырвонцы, пасылаць яму. Хоць і дома дзірак — толькі паспявай латаць.

*2 красавіка*

Хутка забяру маму дадому. Гаварыў з галоўным урачом. Згадзіўся адпусціць, хоць палёгкі — аніякай. А мама болей не хоча ляжаць, толькі і думкі, і гаворка — пра дом, пра гаспадарку. Кажа, што ў пячонках ужо ёй гэта бальніца сядзіць, а ў сваёй хаце лепей будзе.

*10 мая*

Мама і праўда дома трохі акрыяла. Не ходзіць, праўда, не ўстае з ложка, але ж пасвятлела ў твары, павесялела, асабліва зараз, калі і бульбу пасадзілі, і грады амаль што ўсе парабілі. А тут зачасціла суседка Уляна, і Аксана як не штодня пачала забягаць. Добра, далібог. Усё ж і помач немалая, і мама не адна. Можа, і наладзіцца што ў Дзімкі з Аксанай. Пара ж ужо і за розум хлопцу брацца, а то зусім адбіўся ад рук. Выкленчыў, во, грошай на куртку нейкую японскую. Жыць без яе не можа. Але дзе ж ты не дасі? Брат жа родны. Ды і студэнт, як-ніяк, без году настаўнік. Пра сябе ж пакуль што не думаю. Няма калі. Як не месяц сеяліся. А тут яшчэ з мамай такое... Цяпер трошкі далі паслабку. І адразу ўбачыў, як цвіце чаромха, як накінулі на сябе белы вэлюм грушы, яблыні, вішні. Хораша зараз у вёсцы. Гэта мая дваццаць сёмая вясна. Няўжо?! Божа, як бягуць гады! Часам аж не верыцца.

Зноў не выходзіць з галавы Нюра. Стараюся і не думаць пра яе, а вось жа думаецца чамусьці. Ну што, што я магу з сабою зрабіць? Той-сёй з мужчын, як збяромся дзе разам, пасміхаюцца: моў, што гэта са мною — не п'ю, не куру, да дзяўчат, жанчын не бегаю. Дзеля чаго тады і жыць?

Не ведаю, губляюся, што ім і адказаць...

## 9

Быў дзень позняе восені. Выплакалася неба маркотнымі, зацятымі дажджамі, выціснула з сябе рэшткі вільгаці, якая нямала прынесла згубы мошынцам, нямала чаго пагнаіла, не дала давесці да ладу; полымем, нягледзячы на слату, адшугала лісце на дрэвах; хай і не прабілася з-за хмар сонца, але яны падняліся вышэй, пасвятлелі, сталі як густая зляжалая кудзеля. На дварэ, на палях, у агародах было пуста і гулка. Нанач браліся ўжо марозікі, і раніцай дзеці, ідучы ў школу, з захапленнем трушчылі нагамі малады звонкі лядок падмёрзлых лужын, а то, разагнаўшыся, маглі і праехацца па ім, нават гоцнуцца задам.

У такую пару людзі больш ля дому, ля сваёй гаспадаркі. Устаўляюць падвойныя рамы, кітуюць расхістаныя, аблушчаныя ў пазах шыбы, пілуюць, рыхтуюць на зіму дровы, уцяпляюць хлявы, каб не мерзла, на выпадак лютых маразоў, скаціна. А знекуль — ці не з падворка суседа? — пацягнула дымком саломы. У ноздры казытліва патыхнула знаёмым і да ачмурэння хвалюючым пахам смаленага шчаціння толькі што заколатага кабанчыка.

Восень, мо як ніякая другая пара, нясе сяльчанам свае радасці і свае дарункі, свае праблемы.

Лёшка сёння таксама не на рабоце. Нарэшце-ткі далі водпуск, якога ён не меў гады тры, калі не болей. Аднак клопатаў у яго мо як ні ў кога. Усё ж даведзена дома да ручкі. Вунь, калі імжылі бясконца дажджы, зноў пацякла гонта, якой крыта хата. Трэба неяк рамантаваць. А дзе, дзе ўзяць зараз той гонты? Хто яе робіць? Ні за якія грошы цяпер не купіш. Класці ж латку толю — непрыгожа. Хіба мужчына, гаспадар, можа сабе такое дазволіць? Куры ж абсмяюць. Жыла б, скажам, адна нямоглая кабета, каторай няма адкуль і ад каго чакаць помачы,— была б іншая гаворка. Акрамя даху непакоіць і тое, як быць

з каровай. Сам жа бясконца ад цямна да цямна на калгаснай працы. А прасіць увесь час Уляну, хоць яна і падахвочваецца памагаць,— нікуды не варта. Трэба ж і меру ведаць. І так жанчына, дзякуй ёй, трымала на сваіх плячах і сваю, і чужую гаспадарку. Колькі ж можна? Давядзецца, відаць, прадаваць карову. Але ж адначасна і шкода. Гэтак цешылася ёю маці, гэтак радавалася, калі ўдавалася накасіць, назапасіць мякчэйшага сена, скласці яго на вышках — хай Зорка толькі есць у ахвоту. І Зорка апраўдвала і цяпер апраўдвае ўсе надзеі: без малака не сядзелі яны ніколі, ды і дзяржаве здавалі болей, чым хто з вяскоўцаў. Таму і думае Лёшка, цяжкую задачу для сябе выраша: што рабіць, што чыніць? Была б маці — усё было б проста і зразумела. А зараз ніхто не падкажа так, як магла б падказаць маці. Хто можа лепей ведаць, як ведала яна, што найважней і найперш трэба ім з Дзімкам, якога кірунку трымацца, каб не трапіць у тупік, у тое становішча, з якога цяжка выкараскацца, зноў цвёрда і надзейна стаць на ногі...

Поркаецца Лёшка ў двары, у хаце, міна заклапочанасці ляжыць на ягоным твары. Зайшоў, пасядзеў трохі ў зале, паслухаў радыё. На вочы трапіла Дзімкава пісьмо. Некалькі разоў чытаў яго, аднак і зараз зноў захацелася перачытаць. Прабег мелькам першыя радкі, нечага заўсміхаўся, пасля вока выхапіла тое, самае галоўнае, самае важнае, што ўзрадавала, усцешыла, перастала пячы на сэрцы нямым дакорам. «...ніколі дагэтуль не думаў,— пісаў Дзімка,— што так цяжка знайсці які куток. Можа, два ці тры тыдні швэндаўся з дня ў дзень па ўскраінах, чытаў на платах, на слупах, на прыпынках аўтобусаў і тралейбусаў усе аб'явы. Думаў: а раптам хто сам прапаноўвае пакойчык, хоць які, хоць самы малюпасенькі, абы было цёпла і суха, бо на раскошу спадзявацца — пустая справа. І думаеш, не было тых аб'яў, ніхто нічога не прапаноўваў? Прапаноўвалі. Людзям жа трэба грошы. І я, як апантаны ўсё роўна, баючыся, каб мяне ніхто не апярэдзіў, з усіх ног бег на тую вуліцу, у той дом — гэта былі найбольш дамы драўляныя ці цагляныя, прыватнікаў — і з заміраннем стукаўся ў дзверы. У многіх выпадках я ўжо спазняўся, знаходзіліся за мяне больш спрытныя, якім таксама патрэбна жыллё. Аднак натрапляў і на незанятую яшчэ плошчу. І вось тут гаспадары гэтай незанятай плошчы, быццам адным грабянцом часаныя, быццам дзе сабраліся і згаварыліся загадзя, дзейнічалі ад-

нолькава, па аднаму прынцыпу: спачатку вялі ў дом, паказвалі вызвалены для здачы такім, як я, бяздомнікам катушок ці бакоўку, на чым свет расхвальвалі гэтае сваё жытло, хоць расхвальваць там не было чаго, казалі цану. Я, вядома, ахвотна згаджаўся. Калі ж справа даходзіла да канкрэтнага: хто, колькі чалавек будзе жыць, калі я казаў, што мы чакаем дзіця,— гаспадар ці найбольш гаспадыня раптам асаджваліся на паўслове, быццам костка захрасла ў горле, нейкі час моўчкі разглядвалі цябе, бы шпіёна ўбачылі. Пасля — зноў жа найбольш гаспадыня — раптам пляскала ў далоні, хапалася за галаву, казала: «Вот жа і дзіравая мазгаўня ўжо стала! Гэта ж і забылася, што пляменнік праз паўмесяца якога з арміі вяртаецца, ужо даўно пісаў, што хоча прапісацца, на работу тут меціць астацца. Як жа не пусціш?.. Так што выбачайце, пашукайце дзе так». І я зноў хадзіў, хадзіў да ачмурэння, забываўся нават, калі еў, абедаў сёння ці не. Так хацелася хутчэй забраць Аксану, быць ужо разам. Яна ж недзе там чакае, спадзяецца... А тут яшчэ і грошы былі на зыходзе, і на работу праз тыдзень ужо трэба выходзіць. Я ж табе пісаў, з якой цяжкасцю давялося пераводзіцца на вячэрняе аддзяленне, колькі таксама папахадзіў, павалёгаў, каб пайшлі насустрач. Ну, а работа як быццам нішто — іду напачатку карэктарам у выдавецтва, а там будзе бачна. Закончу інстытут, мо і ў Мінску застанёмся, калі Аксана таксама паступіць вучыцца, а можа, вернемся ў вёску, у тое Даўгалессе,— я пaглядзеў, харошая вёска, хоць і глухая, атуленая скрозь лясамі і азярынамі, але людзі жывуць добра, а прырода — і казаць няма чаго, рэдка дзе такое ўбачыш... Ага, дык вось, калі я ўжо амаль згубіў усякую надзею займець жаданы куток, хацеў плюнуць на тыя пошукі, лёс усё ж злітаваўся, падаслаў мне бабульку, якую я стрэў ля калонкі на адной з вуліц ускраіны. Механічна, ні на што не спадзеючыся, я і спытаў у яе, хто мог бы тут узяць на кватэру. Бабулька разагнулася, абмацала мяне нейкімі надта ж стомленымі маркотнымі вачыма, са шкадаваннем — гэта адбілася на яе пасечаным баразёнкамі маршчын твары — сказала: «Мой жа ты саколік! Бачу, што ты ўжо збіўся з ног, але ж... Я толькі сямейных магла б пусціць. У мяне ў двары ўрамянка. Там жылі, толечкі, во, выбраліся, сваю кватэрку, дзякаваць Богу, палучылі. Добрыя людзі былі, хай ім шчасця... А ўрамянку тую ж грэць нада, паліць кожан дзянёк у грубцы. Дзе ўжо хлопцу...» Вось тут я не ўпусціў свайго,

сам разумееш. Дзён праз колькі, калі перанясу з інтэрната такія-сякія рэчы, прыстараюся трохі дроў — бабулька наказала самім прыдбаць паліва,— паеду па Аксану. Не ведаю, як яна сустрэне гэту вестку з пераборамі, мы ж яшчэ не пра ўсё дамовіліся...»

Якраз тады, калі Лёшка перачытваў гэтае пісьмо ад брата, у бок Мошына, толькі што вылезшы з кабінкі спадарожнай машыны, ішла жанчына. Ішла дарогай, па якой улетку вяртаўся на канікулы дадому Дзімка, яшчэ тады не ведаючы, што чакала яго наперадзе...

Жанчына не трымала ў руках ні сеткі, ні гаспадарчай сумкі — з імі ж звычайна ездзяць у райцэнтр па той ці іншай патрэбе. Збоку на рамяні праз плячо ў яе целяпалася невялікая скураная сумачка. Жанчына была адзета проста, але з густам, усё на ёй сядзела ладна, хораша, зграбна: і боцікі на не вельмі высокім абцасе, і паліто, ужо, відаць, зімовае, бо каўнер — з норкі, шалікам аблягае шыю, і вязаная адмысловай рукой салатавая, амаль пад колер паліто, шапачка на галаве. Усё быццам выдавала ў жанчыне чалавека ўпэўненага ў сабе, задаволенага жыццём, чалавека, які нямала пабачыў, пацёрся сярод людзей і добра ведае, што яму трэба.

Але, калі прыгледзецца да жанчыны бліжэй, можна ўбачыць, за вонкавай мілавіднасцю і белізной твару, за нейкай нібыта наўмыснай бесклапотнасцю, пячатку стомленасці, якая таілася больш у глыбіні вачэй, нават прыкметы адчаю і бездапаможнасці, разгубленасці, трывожнага чакання нечага...

На выгляд, зноў жа па першым уражанні, жанчыне можна было б даць гадоў дваццаць пяць. Але яна старэйшая, зусім нядаўна перасягнула трыццацігадовы рубеж. Узрост, які да многага абавязвае і прымушае пра многае задумацца...

Жанчыну абагнаў матацыкліст. Ён трохі праехаў уперад, раптам затармазіў, абярнуўся, глянуў на жанчыну, відаць, хацеў прапанаваць, каб садзілася ззаду, падвязе, усё роўна ж па дарозе. Аднак, не пазнаўшы ў ёй нікога са знаёмых, матацыкліст засаромеўся, хуценька нагнуўся, нібыта папраўляў якую няспраўнасць, пасля рэзка газануў і па-хлапечы гарэзна памчаўся далей.

Жанчына ж, наблізіўшыся да Мошына, прыпынілася, агледзелася, ці няма каго побліз, выняла з сумачкі люстэр-

ка, невялікую шаўковую насоўку, ражком гэтай насоўкі павадзіла па вуснах, праверыла, каб не густа ляжала памада, зноў запіхнула ўсё назад у сумачку і ўжо рашуча ступіла на вясковую вуліцу.

Уздоўж платоў, справа, вілася дбайна ўтоптаная сцежачка, і па ёй добра ішлося — ні гразі табе, ні пылу, ні боязі, што дагоніць якая машына, змусіць невядома куды саступаць. Нідзе не было ні душы. Здэцца, вёска, стаміўшыся за дні палявых работ, калі ад напружання ажно пухлі рукі, зараз дабірае тое, чаго не дабрала раней: людзі адсыпаюцца, ад'ядаюцца, грэюцца на печы, лечаць запушчаныя хваробы — летам жа некалі звяртаць увагі на тыя свае балячкі. Між тым толькі на першы погляд здавалася, што вёска нібы вымерла, ніхто са сваіх хат не высоўвае і носа. Жанчына ведала, што гэта далёка не так. Ведала: як не з-за кожнай фіранкі выглядае хто-небудзь, дзівіцца, хто ж гэты невядомы, да каго ідзе, з якой нагоды... А вунь, вынырнуўшы з завулачка, насустрач крочаць дзве кабеты ў аднолькавых чорных блішчастых плюшаўках, пра нешта голасна гавораць, як усё адно спрачаюцца. Амаль параўняўшыся з жанчынай з сумачкай праз плячо, яны змаўкаюць, заўзята свідруюць вачмі невядомую, нават, размінуўшыся ўжо, яны ўсё яшчэ аглядваюцца, моршчаць ілбы, бы што прыпамінаюць. Пасля адна з кабет, нахіліўшыся да другой, здзіўлена-спалохана шэпча:

— Ды гэта ж Нюрка, далібог жа, Нюрка! Ну, якая магазіншчыцай была...

— Во толечкі і я хацела казаць,— гаворыць другая.

— Божа, яе ж той бандзіт звалок некуды, звёз ад Лёшкі Лагацкага. Няўжо зноў уцякла?! Вот долечка!..

Другая кабета пацягнула за рукаво плюшаўкі сваю сяброўку, падштурхнула да плота, дзе стаяла лаўка. Жанчыны, нягледзячы што лаўка чужая і што ў гэтую пару ўжо ніхто на тых лаўках не сядзіць, усё ж прыселі, пачалі цікаваць, куды, да каго пойдзе Нюрка.

Нюрка ж — гэта сапраўды была яна — наблізілася да магазіна, хацела, убачыўшы, што адчынены, заглянуць усярэдзіну, нават на хвіліну прыпынілася ў нерашучасці, але, пераадолеўшы першае жаданне, пайшла далей. Яна ўжо ведала, што яе праводзяць поглядамі ўсцяж усёй вуліцы, што нябачны, бясправадны тэлефон, які так бездакорна асвоілі вясковыя жанчыны, ужо абзваніў усім, каму толькі можна, і цяпер ты пад абстрэлам вачэй яшчэ больш пільных, больш цікаўных. Яна нават усміхнулася куточка-

мі губ, аднак, калі падышла да Лёшкавай хаты, усмешка гэтая сама па сабе звяла, на твары адбілася насцярога: што чакае яе ў гэтай хаце, дзе некалі знайшла прытулак, спазнала кароткае і спакойнае бабскае шчасце? Тое шчасце, якое шчымлівым болем і радасцю, сваёй нейкай незвычайнасцю давала сілы зносіць усё, што звальвалася на яе, круціла і мяла, кідала ў такія пераплёты, на такое дно, адкуль, здэцца, ніколі нельга было выбрацца...

Лёшка, калі пастукаліся ў дзверы, быў якраз у бакоўцы, пераапранаўся ў лепшае, чысцейшае — рашыў схадзіць на пошту, паслаць Дзімку трохі грошай. Таму ён і не бачыў, хто ідзе, хто там стукаецца. Можа, Уляна незнарок што выпусціла з рук? У сенцах жа цёмна і, на добры лад, таксама пара было б падвесці туды электрычнасць, як у многіх гэта даўно зроблена. Таму ён і не адазваўся. Аднак стук, ужо болей настойлівы і рашучы, паўтарыўся, і Лёшка, хутчэй зашпільваючы гузікі ў штанах, гукнуў:

— Можна, можна, заходзьце!

Ён басанож — не паспеў яшчэ абуцца — выглянуў у кухню і... падумаў спачатку, што, можа, памыліўся, можа, памроілася... Разгублена правёў даланёй па галаве, папраўляючы валасы, кінуў зніякавелы позірк на свае голыя ногі.

— Добры дзень, Лёша! — ціха сказала Нюрка, і ён цяпер ужо канчаткова паверыў, што гэта не сон, не насланнё якое, а сапраўды яна, жывая, загадкава-строгая, недасягальная.

— Т-т-т-ты?! — ажно здрадліва задрыжэлі ў яго губы, і ён зноў апусціў галаву, нібы дакараючы сябе: во, прыйшла Нюрка, а ён, бы той ахламон, і непрычасаны, і босы стаіць, і ў хаце — няўтульна і брудна. Хіба ж не мог ужо прыбраць, хаця б дзеля такой госці?!

Нюрка таксама не ведала, як быць. Лёшкава гэткая разгубленасць навяла на думку, што ён мо ўжо не адзін, мо зараз выйдзе адтуль, з залы ці бакоўкі, іншая жанчына, якая ўспела стаць яго суджанай, і папытае ў яго ды і ў яе заадно,— мае права, вядома, папытаць,— хто яна такая і што ёй трэба, чаго і адкуль прыперлася, чаго выстойвае тут, у парозе, бы чакае нейкай падачкі. Што яна, Нюрка, адкажа? Што некалі і яна ледзь-ледзь не стала гаспадыняй гэтай хаты, што і ў яе цеплілася кволая надзея на шчасце і спакой, па якіх ссумавалася?.. Аднак ніхто не выходзіў, ды і абвостраным сваім жаночым чуц-

цём Нюрка паспела ўжо ўлавіць: пагрозы, той пагрозы, якой больш за ўсё баялася, няма. Астатняе будзе залежыць ад іх абаіх...

Яна, пасмялелая і павесялелая, трохі адышлася ад парога, нават зняла з пляча сумачку. Тут толькі Лёшка схамянуўся, спахапіўся, пачаў запрашаць Нюрку распранупца, нават памог ёй у гэтым, затым панёс, шлэпаючы па халоднай падлозе, Нюрчына паліто ў залу, павесіў на цвік. Сам жа шмыгнуў у бакоўку, пачаў шукаць свае новыя туфлі, каб, нарэшце, абуцца і нікога не смяшыць.

Нюрка прайшла ў залу, села, агледзелася. Усё тут было амаль тое ж, што і тады, тры гады назад: тая ж нямодная зараз, квадратная, бы стаяк, шафа з аблезлай там-сям фарбай; той жа нікеляваны, са стосікам падушак, ложак упрытык да перагародкі, клеенай тымі ж абоямі, якія, на стыку дошак, разышліся, парваліся жыўцом; тыя ж фотакарткі ў раме пад шклом на сцяне між двух вокан. Адначасна нельга было не адчуць, што нешта і памянялася, нейкая няўлоўная, на першы погляд, пячатка сіратлівасці, закінутасці ляжала на ўсім, што выхоплівала вока. Гэта лішні раз пацвярджала яе згадку: не, няма ў хаце рукі, здольнай сваім дотыкам да любой з рэчаў неяк адухавіць іх, паставіць ці пакласці так, каб рэч тая, хай самая пасрэдная, была б да месца, грэла і цешыла. «А дзе ж Вольга Адамаўна?» — нібы кальнула нечым у сэрца, і яно тарганулася ад сумнага прадчування...

Лёшка выйшаў з-за перагародкі, пераапрануты ў новую, салатавага колеру, сарочку, дбайна зачэсаны, у начышчаных да бляску чорных пантофлях. «Прыгожы і... добры»,— падумалася з пяшчотай, і тое, даўняе, ужо трохі паўзабытае, зноў наплыло, неадольна ўзяло ў палон, хмельна закружыла ў галаве. Хацелася зараз жа падысці да яго, пакласці рукі на плечы, зазірнуць у яго добрыя, светлыя вочы і ціха-ціха, шэптам, сказаць: «Калі можаш — даруй, што так па-дурному, так жахліва нават атрымалася тады. Даруй, што адразу не сказала ўсяго пра сябе. Не так не паспела, як баялася, ці зразумееш ты, ці не адпіхне маё мінулае, такое заблытанае, недарэчнае, ад якога ўцякала і ніяк не магла ўцячы, якое праклінала, а яно, тое мінулае, чорным ценем хадзіла ўслед, перакрыла ўсе шляхі да адступлення...»

Нюрка, аднак, нічога не сказала. Толькі спытала, бы правяраючы сваё прадчуванне:

— А маці, Вольга Адамаўна?

Як усё роўна чакаючы такое пытанне, Лёшка адказаў адразу:

— Няма болей мамы. Памерла ўлетку... — ён падышоў да стала, ля якога сядзела Нюрка, узяў Дзімкава пісьмо, паклаў у кішэню.

Насцярожанасць, нейкая разгубленасць адбіліся на Нюрчыным твары. Лёшка зразумеў гэта па-свойму, растлумачыў:

— Дзімка пісьмо прыслаў з Мінска. Заварыў ён кашу... Хацеў схадзіць на пошту, грошай трохі яму падкінуць.

— Дык я пачакаю, можна?

Нюрка была ў складаным становішчы: не ведала, як паводзіць сябе, што спытаць яшчэ, як, не вярэдзячы надта чужую рану, чужы свежы боль, дазнацца аб прычыне смерці; як, нарэшце, пачаць самую галоўную для яе гаворку, дзеля якой ехала, імкнулася сюды...

Лёшка выняў з шафы і апрануў паліто, пайшоў, папярэдзіўшы, што ён не забавіцца, хутка вернецца: пошта ж не так далёка, а заўтра там выхадны дзень, таму ён і змушаны адвінуцца зараз, пакуль не зачынілі.

Прыйшоў трохі пазней, чым разлічваў. Затрымалі і на пошце, і ў магазін пакуль завярнуў, купіў кансерваў, бохан хлеба, пляшку гарэлкі, бо добрага віна не падвезлі. Радавала, што ў магазіне нікога не сустрэў. А то не адчапіўся б ад роспытаў — не сумняваўся ж, што паўвёскі ўжо ведае, хто да яго прыехаў.

Ступіўшы на парог кухні, Лёшка здзівіўся: усё было прыбрана, падмецена, выглядала як некалі, пры маці. Стала нават няёмка: чалавек прыехаў з дарогі і навёў парадак. А сам ён хіба не мог? Апусціўся, развёў свінушнік.

— Нюра, ты дзе? — гукнуў нямоцна, дакараючы сябе, што і забавіўся гэтак доўга, і Нюрка немаведама што можа падумаць — яна на парог, а ён, бы знарок, адразу ж з хаты.

Было, аднак, ціха. Заглянуўшы ў залу, ён спалохаўся: Нюркі там не было. Не вісела на цвіку і яе паліто. «Няўжо паехала, не дачакалася?! — ажно халодны пот выступіў на лбе.— Што ж гэта такое?» Згледзеў, аднак, сумачку, якая на почапцы звісала са спінкі крэсла, і з палёгкай пераве́ў дыханне.

Знайшоў Нюрку ў бакоўцы, на ложку. Яна ляжала, падкурчыўшы ногі, зверху акрыўшыся сваім паліто. По-

бач, ля грубкі, стаялі яе боцікі. На падушцы, на шэрай, не свежай ужо навалачцы распушыліся мяккія каштанавыя валасы. Лёшка на дыбачках падышоў бліжэй, нахінуўся амаль да самага твару, паслухаў, як дыхае: прытварылася, каб пасля пасмяяцца, ці мо сапраўды вельмі стамілася, знемаглася ад адзіноты і доўгага чакання? Пераканаўся, што так яно і ёсць: спіць, нават у сне нешта бязладнае сказала.

Ён знайшоў чыстую целагрэйку і паклаў Нюрцы ў ногі, бо аднаго яе паліто не вельмі хапала. Зноў пайшоў на кухню, прычыніў трохі дзверы.

Пара было аглядацца. За вокнамі відавочна шарэла, гусцела паветра, і рупіла хутчэй, пакуль зусім не заспеў морак, зрабіць усю работу.

Лёшка зноў пачаў пераапранацца, але спыніўся ў нерашучасці: а раптам Нюрка прачнецца? Суцешыў сябе, што мо яшчэ паспіць, а ён пастараецца сёння як ніколі.

І праўда: Нюрка спала бы забітая, а ў яго ўжо і бульбы наабірана на вячэру, і ў грубцы ажно гудуць, зыходзяць зыркім полымем сухія сасновыя дровы, і ў зале чыстым абрусам засланы стол. Прахапілася Нюрка, калі ён, Лёшка, нespадзеўку выпусціў з рук гнуты літарай «г» жалезны прэнт, якім шавяліў галавешкі, і прэнт той, упаўшы вобзем, нарабіў нямала грукату. Нюрка нейкі час сядзела на ложку, спусціўшы долу ногі ў капронавых панчохах, няўцямна глядзела перад сабой, быццам нікога і нічога не пазнаючы. Дзверцы грубкі былі адчынены, і адтуль разам з мільгатлівым святлом ішлі цяпло і тонкі смаляны дух.

Нюрка, нарэшце, апамяталася, з дакорам, але мякка, неяк расслаблена сказала:

— І не пабудзіў, бессаромны. Гэта ж які жах — прыйсці ў чужую хату і заснуць!

— Доўга ж чакала,— прыйшоў на выручку Лёшка.

— Ды не, не таму,— Нюрка пацягнулася, прыкрываючы рукой рот, пазяхнула і пачала абувацца.— Я ж суткі амаль не спала па-чалавечы, ехала здалёку. А яшчэ дзіця было хворае, бясконца плакала...

— Якое дзіця, чыё? — вырвалася міжволі ў Лёшкі, і Нюрка з радасцю адзначыла, што ён усё такі ж — непасрэдны і шчыры, без усялякай хітрынкі, што час і гора не ачарсцвілі яго, не выветрылі тое, ранейшае, што вопытным сваім жаночым вокам згледзела ў ім у першыя хвіліны знаёмства тады, тры гады назад. Яна, адвярнуўшыся

крыху, усміхнулася, пасля, як бы нічога не заўважыўшы, адказала:

— Ехалі там нейкія, муж з жонкаю. Суседзямі па плацкарце былі... Пасля ўсё раскажу...

— Добра,— азваўся Лёшка.— Пасля.

Гэтае кароценькае «пасля» таксама не праскочыла міма Нюрчынага вуха, таксама пра многае казала. Значыць, гатовы Лёшка слухаць яе, неяк зразумець, дараваць, хоць яна перад ім ні ў чым і не правінілася.

Па просьбе Нюркі зрабілі таўканіцу, заправіўшы яе смажаным салам з цыбуляй. І на час, пакуль Лёшка адчыняў кансервы, хадзіў у кладоўку і набраў квашанай капусты, таўканіцу тую на скавародцы паставілі ў грубку на вуголле. Вынялі — і Нюрка не стрымалася, усклікнула ў захапленні:

— Якое смакоцце! Сто гадоў не ела такога. Не, маню — мама яшчэ незадоўга перад смерцю гатавала, ведала, што я люблю.

Таўканіца, вынятая з духу, сапраўды выглядала вельмі апетытна: скарыначка зверху стала жаўтлява-залацістай, з украпленымі там-сям цямнейшымі крышанкамі сала. У капусту, халодную з двара, Нюрка дадала алею, памяшала.

— Згаладалася я,— сказала не тоячыся, спрабуючы лыжкай, ці смачна.— У-у-у, пад такую закусь, такую вячэру і вінца б у меру.

— Ёсць калі не вінцо, дык нешта іншае, мацнейшае,— Лёшка паставіў на стол пляшку гарэлкі.

Нюрка зачырванелася:

— Ну ж і язык мой! Узяць бы ды адсекчы. Гэта ж з верша нейкага запомніліся мне тыя радкі.

— Правільны верш, чаго ж.

Нюрка, аднак, першую чарку толькі прыгубіла, спаслаўшыся, што вельмі галодная і можа хутка зап'янець, сапсаваць усю абедню.

— Тады еш,— ён паклаў ёй поўную місу гарачай бульбы, пасунуў бліжэй капусту, кансервы.

— Ой, усё дастану, выпівай сам! — усклікнула Нюрка.

Лёшку сапраўды сёння хацелася выпіць мо як ніколі дагэтуль. Ведаў, што з Нюркай чакаецца нялёгкая гаворка, і, можа, лепей, калі ён сам і яна трохі саб'юць напружанасць, адчуюць сябе раскута.

У вокны густой чарнатой глядзеў позні ўжо вечар, рэдка ў якой хаце гарэлі агні, а яны, атуленыя цяплом

і цішынёй, усё сядзелі і сядзелі. Ім хапала што сказаць адно аднаму. Асабліва Нюрцы, і Лёшка слухаў, стаіўшы дыханне, стараючыся не прапусціць ніводнага яе слова. Яна гаварыла і гаварыла, то абыякава-стомлена, быццам усё ў яе жыцці было прадвырашана, раз і назаўсёды перакрэслена, то гняўліва-горача, асуджаючы і праклінаючы і свой незразумелы нечалавечы страх, які доўгія гады скоўваў кожную клетачку яе цела, трымаў у жахлівым палоне, і сваё бязволле, што ўцягнула яе ў тую дрыгву, з якой, во, толькі цяпер змагла вырвацца, і то дзякуючы хоць і трагічнаму, але жаданаму для яе фіналу... Часам яна перапынялася, прасіла наліць у чарку яшчэ якую кроплю, аднак болей амаль не піла, глядзела Лёшку ў вочы, быццам правярала, ці слухаў ён, ці ёсць у яго вачах хоць іскрынка даверу, без якога ўсё, што яна расказвае,— пустая, марная трата і часу, і нерваў. Упэўніўшыся, што яе настрой неяк перадаўся яму, а словы яе не палі гарохам аб сценку, яна зноў і зноў вярталася да многіх падрабязнасцей, якія лічыла, што трэба, абавязкова трэба яму ведаць.

...Ужо тыдзень запар яны, уся кампанія, амаль не вылазілі з іхняга фінскага доміка там, у далёкай лясной Карэліі, у пасёлку на беразе цёмнага возера. Тут елі, спалі, а найбольш, вядома, пілі. Пілі, што маглі толькі прыдбаць,— гарэлку, віно, нават дэнатурат. Прыходзячы вечарам з работы, яна жахалася. У пакоях — нібы пасля пагрому. На падлозе, стале, на падаконніках валяліся пустыя бутэлькі, акуркі, нейкія недаедкі, усё было аплёвана, загаджана горай не прыдумаеш. Яны ж, кінуўшыся хто дзе, храплі, і з пушкі нікога не дабудзіўся б. Але Нюрка ведала, што трохі пазней яны ачухаюцца, пойдуць да некага гуляць у ачко, прэферанс, зноў будуць піць да паўночы. А назаўтра пачнецца ўсё тое ж, спачатку...

І той раз Кіпець і яго кампанія не здрадзілі сваім звычкам. Нюрка зноў заспела іх соннымі. Усё гэткі ж бруд, смурод — хоць нос затыкай. Але, хочаш не хочаш, закасвай рукавы і, як ні моташна, як ні гідка, чысці, наводзь парадак, бо не зрабі гэтага — муж, як бывала ўжо, азвярэе, можа шпурнуць у твар, у галаву што папала, пусціць у ход кулакі. Яна і пачала прыбіраць, але вока ўпала на сцяну, на шыфаньер ля той сцяны і... Самі апусціліся рукі, нянавісць, лютая нянавісць, якая доўга спела ў душы, пераваліла парог вечнага яе страху і вырвалася на волю.

Не помнячы, што робіць, яна кінулася да спячага, азызлага ад гарэлкі мужа, пачала даланёй, кісцю рукі біць яго па твары, па чырвона-крывавых адвіслых вушах.

— Гад ты, гад, нягоднік!.. — ажно клекатала ў яе ў грудзях.— Мала сцяну, абоі падзяўбалі фінкамі, усё меціліся, усё кідалі, каб вас на той свет кінула, дык і да шыфаньера дабраліся, ушчэнт здзіравілі. Толькі што купіла, апошнія капейкі аддала, а ты... Ненаві-і-і-джу!.. Хопіць, хо-о-опіць. Усё, заўтра ж іду ў міліцыю, хопіць з мяне во так, пад завязку. Хопіць піць кроў маю, сядзець злыднем на карку, бандыт ты крыважэрны. Там разбяруцца, хто ты і што ты...

Ён па-кашачы пругка ўскочыў на ногі, бы і не спаў, бы толькі і чакаў гэтага моманту. Шалёнай сваёй сілай кінуў яе вобзем, пачаў таўчы наскамі чаравікаў, таптаць, люта, азвярэла мянташыць кулакамі. Яна, сцяўшы, закусіўшы да крыві губы, толькі ціха стагнала, бо крычаць, лямантаваць было бескарысна — ніхто яе не пачуе, ніхто, ні адна жывая душа не прыйдзе на дапамогу. Так і забіў бы, каб яго не адцягнулі хаўруснікі...

І вось трэці дзень яна на бюлетэні, не выходзіць на працу ў кантору леспрамгаса, тэмпература — як не трыццаць дзевяць.

Маладзенькая дзяўчына-ўрач, што прыходзіла ўдзень, была яшчэ зялёная, нявопытная, лёгка брала на веру ўсё, што казалі хворыя. Нюрка, калі ўрач прапанавала ёй распрануцца, паслухаць сэрца, лёгкія, рашуча запярэчыла, запэўніла, што і з сэрцам, і з лёгкімі ўсё добра, а вось галава — тая ажно расколваецца, таму так і няможацца.

Хіба магла яна паказаць каму, што ў яе на целе?! Што няма амаль ніводнага жывога месца ад пабояў, сінякоў, якія набрынялі, раздабрэлі, бы іх хто знарок песціў. Ведала, што пагрозы Кіпця — так звалі ў шайцы яе мужа — не пустыя словы, не. Тут ён слоў на вецер не кідаў...

Трэці дзень дома нязвыкла ціха. Кіпець, адразу ж пасля таго, што ўчыніў, знік, бы скрозь зямлю праваліўся разам з хаўруснікамі. Нюрка ведала, што не боязь панесці кару за зверства сваё змусіла яго знікнуць. Яна здагадвалася, што шайка зноў нешта абмазгавала, зноў, каб займець грошы на папойкі, пайшла на нейкае злачынства. Страх, не за іх, вядома, не, яшчэ больш скоўваў гарачае разбітае цела. Цалюткія амаль ночы яна не магла звесці вачэй, усё да нечага прыслухоўвалася, бы нешта чула сэрца...

Пад раніцу, калі забылася ў кароткім сне, ёй памроілася, што нешта там, на ганку чмякнулася, бы хто кінуў куль саломы. Расплюшчыла вочы, прыслухалася, уся напружынілася, падцялася. Было, аднак, ціха. І недзе праз мінутудругую абвостраным слыхам сваім улавіла — нехта бы драпаецца ў дзверы, стогне. «Божа, вось яна, мая пагібель»,— падумала горка, безнадзейна.

Аднак, бойся не бойся, трэба было ісці, пытацца, хто там, адчыняць дзверы, як бывала не раз. Яна, ледзь пераστаўляючы ногі, адчуваючы, што вось-вось можа рухнуць на падлогу ад слабасці і болю ва ўсім целе, неяк усё ж змагла выйсці ў сенечкі, спытала:

— Хто там?

З двара пачуўся ціхі стогн, і яна, паддаючыся нейкаму невядомаму інстынкту, хуценька адчыніла дзверы, вярнулася ў кухню, пстрыкнула ўключальнікам. У яркім электрычным святле, што падала з сенечак і на ганак, убачыла яго, Кіпця. Увесь акрываўлены, у парваным да ашмоцця адзенні, ён, аднак, знайшоў нечалавечыя сілы прыўзняцца на локцях, упаўзці ў сенечкі. За ім шырокай палосай цягнуўся крывавы след. Кіпець павярнуў галаву, шклянымі, амаль пустымі ўжо зрэнкамі пашукаў яе, памкнуўся нешта сказаць, але замест слоў з рота вырвалася густая чорная пена...

Трохі пазней па яго, ужо астылага, прыйшлі людзі ў міліцэйскай форме...

...Ноччу яна, уткнуўшыся тварам у цёплае Лёшкава плячо, ціха і роўна дыхаючы, соладка спала; а ў яго гэтак жа соладка замірала сэрца, але не спалася. Баючыся пашавяліцца, ён ляжаў, нават не спрабаваў і на хвіліну заплюшчыць вочы. Думалася пра тое, што расказала Нюрка пра сябе, думалася пра рознае... Разам з нечаканай такой агромністай радасцю, якая запаланіла яго ўсяго, недзе ў куточку душы кошкай скрэблася і трывога: ці дасць ён Нюрцы тое, што трэба, што ёй хацелася б, ці складзецца з дзвюх вышчарбленых палавінак нешта цэлае і гожае? Як прыжывецца яна тут, ці стане па-сапраўднаму ягоны дом і яе домам, яе надзейным прыстанкам?..

Спала вёска, спала, скутая нанач добрым марозікам, зямля, спалі звяры, птушкі. Не спаў хіба толькі вецер, бо чутно было, як скрэбаўся голым веццем у сцяну, у закот раскалыханы вяз.

## ЗМЕСТ

ТРЭБА БЫЛО ЖЫЦЬ. *Раман* .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. 3

ШТО ПАСЕЕШ... *Аповесць* .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. .. 307

**Рыбак А.**

Р93 Абпаленыя крылы: Раман, аповесць.— Мн.: Маст. літ., 1994.— 518 с., [1] л. партр.

ISBN 5-340-01262-Х.

У ціхім кутку лесу ў страшэнных муках канаў чалавек. Адзін з герояў рамана «Трэба было жыць» дзядзька Даўнар зусім выпадкова патрапіў на гэтае месца і быў ашаломлены ўбачаным: зусім голы мужчына быў прывязаны да елкі, пад якой знаходзіўся велізарны мурашнік. Хто і за што асудзіў чалавека на такую жахлівую смерць?..

Раман, як і аповесць «Што пасееш...», напісаны на вострасюжэтным матэрыяле, які давала наша жыццё ў першыя пасляваенныя гады, калі вёска аганізавала ад невыноснага цяжару падаткаў, бясхлебіцы, здзекаў чыноўных людзей.

Гэтыя лепшыя творы Алеся Рыбака, якія атрымалі шырокі рэзананс сярод чытачоў і ў нашай крытыцы, і склалі кнігу «Абпаленыя крылы».

Р $\frac{8820600000-067}{М\ 302(03)-94}$ 114—94

ББК 84(4Беи)6

Літаратурна-мастацкае выданне

*Рыбак Аляксандр Пятровіч*

**АБПАЛЕНЫЯ КРЫЛЫ**

**Раман, аповесць**

Рэдактар В. М. Хлебавец. Мастак В. А. Губараў. Мастацкі рэдактар А. І. Цароў. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктары К. А. Крукоўская, Я. Ф. Харко.

Здадзена ў набор 15.05.92. Падп. да друку 05.04.94. Фармат $84 \times 108^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Афс. друк. Ум. друк. арк. 27,30+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 27,67. Ул.-выд. арк. 30,76. Тыраж 6000 экз. Зак. 2157

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.